
ПАМЯТЬ



ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ СТВАРАЕЦЦА ПАВОДЛЕ РАШЭННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ШАРКАЎШЧЫНСКІ РАЁН

МІНСК
БЕЛТА
2004

УДК 947.6
ББК 63.3 (4 Беи)
П 15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Л.М.ДРАБОВІЧ (в.а. галоўнага рэдактара выдавецкага цэнтра БЕЛТА), Г.Ф.ВОЛАХ, Г.К.КІСЯЛЁЎ, Л.М.ЛАБАЧЭЎСКАЯ, М.А.МАКАРАНКА, М.В.МОРХАТ, Б.В.УЛЬЯНКА

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

М.В.МОРХАТ (старшыня камісіі), В.К.АРЭХ, Г.Ф.ВОЛАХ (намеснік старшыні камісіі), В.У.ГРЫНЕВІЧ, А.М.КАЛЯДА, К.А.КОЖАН, Л.М.ЛАБАЧЭЎСКАЯ, В.М.ЛУГАЎЦОЎ, У.К.ЛЯСКОЎСКІ, М.А.МАКАРАНКА, Р.П.ПЕСТУН, Г.Л.РАБІЗА, А.А.ЦІТОВІЧ, І.М.ШЫНКЕВІЧ, А.Э.ЯБЛОНСКАЯ

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ:

Б.В.УЛЬЯНКА (кіраўнік цэнтра), М.З.БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст), У.І.ЛЕМЯШОНАК, Р.А.ЧАРНАГЛАЗАВА

Укладальнік
Л.М.ЛАБАЧЭЎСКАЯ

Мастак
Э.Э.ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі
В.А.РАГАЛЕВІЧА

ISBN 985-6302-63-3

© БЕЛТА, 2004

Панарама г.п. Шаркаўшчына.

14—15 тыс. гадоў таму.	На тэрыторыі сучаснага раёна з'явіліся першыя пасяленні людзей.
Пачатак XIV ст.	Тэрыторыя сучаснай Шаркаўшчыны ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага.
XV—XVII ст.	На месцы гарадзішча полацкіх крывічоў у в. Дзіўная размяшчалася феадальная сядзіба.
1503 г.	Першае пісьмовае ўпамінанне Шаркаўшчыны як маёнтка Зяновічаў.

Вялікі Лапуноўскі камень.

1504 г.	Шаркаўшчына ўвайшла ў склад Полацкага ваяводства.
1519 г.	Першае ўпамінанне пра маёнтак Лужкі ў гістарычных крыніцах.
1744—1756 гг.	У в. Лужкі пабудаваны касцёл Святога Міхаіла Архангела пры кляштары піяраў.
1563 г.	Першае ўпамінанне пра Германавічы ў гістарычных крыніцах.
1745—1832 гг.	У Лужках дзейнічаў піярскі калегіум.

Касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў в. Германавічы.

1767 г.	Узніклі мястэчкі Старая Шаркаўшчына і Новая Шаркаўшчына.
1787 г.	У в. Германавічы пабудаваны касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Дзевы Марыі.
1793 г.	Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай Шаркаўшчына ўвайшла ў склад Расійскай імперыі, мястэчка Дзісенскага павета Мінскай, з 1842 г. Віленскай губерняў.
1794 г.	У в. Лужкі пабудавана Свята-Раства-Багародзіцкая царква, помнік архітэктуры пераходнага перыяду ад барока да класіцызму.

Свята-Раства-Багародзіцкая царква ў в. Лужкі.

1825 г.	У в. Шкунцікі пабудавана Свята-Ільінская царква, помнік архітэктуры класіцызму.
1831 г.	Хваляванні сялян на Шаркаўшчыне.
1861 г.	Германавічы сталі цэнтрам воласці Дзісенскага павета.
1862 г.	Адкрыты Лужэцкае і Ігуменаўскае народныя вучылішчы.
1863 г.	Адкрыта Старашаркаўшчынскае народнае вучылішча.

Від на Свята-Успенскую царкву ў г.п. Шаркаўшчына з боку ракі Дзісна.

1897 г.	У м. Новая Шаркаўшчына 1038 жыхароў, 119 двароў, 2 малітоўныя дамы, 23 крамы, аптэка, 2 карчмы. У Старой Шаркаўшчыне 127 жыхароў, 16 двароў, крама, карчма.
1869 г.	Адкрыта Ёдскае народнае вучылішча.
1900 г.	У в. Германавічы ўзведзена Свята-Успенская царква, помнік народнага дойлідства.
1912 г.	У Шаркаўшчыне пабудавана Свята-Успенская царква, помнік архітэктуры стылю мадэрн.

Сядзібны дом у в. Германавічы.

Канец XIX — пачатак XX ст.	Працавалі царкоўна-прыходскія вучылішчы ў вёсках Лужкі, Шкунцікі, Казакі, Сасноўцы, Пялікі.
Пачатак XX ст.	У парку Шаркаўшчыны на левым беразе р. Дзісна пабудаваны сядзібны дом, помнік архітэктуры неакласіцызму.
1905 — 1907 гг.	На Шаркаўшчыне адбыліся сялянскія хваляванні.
4—6 чэрвеня 1917 г.	Удзел прадстаўнікоў Шаркаўшчыны ў рабоце сялянскага з'езда Віленскай губерні ў Дзісне.

Сядзібны дом у в. Дзіўная.

1918 — 1920 гг.	Шаркаўшчына акупіравана германскімі, потым польскімі войскамі.
1921 — 1939 гг.	Тэрыторыя Шаркаўшчыны знаходзілася ў складзе Польшчы.
1921 г.	Лужкі сталі цэнтрам гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства.
1939 г.	Шаркаўшчына ўвайшла ў склад БССР.
15 студзеня 1940 г.	Мястэчка Шаркаўшчына стала цэнтрам Шаркаўшчынскага раёна Вілейскай вобласці.

Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан у г.п. Шаркаўшчына.

12 кастрычніка 1940 г.	Шаркаўшчына атрымала статус гарадскога пасёлка. Германавічы сталі цэнтрам сельсавета Шаркаўшчынскага раёна.
30 чэрвеня 1941 г.	Раён акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі.
Ліпень 1941 г. — ліпень 1944 г.	Дзейнасць Шаркаўшчынскай падпольнай камсамольска-маладзёжнай арганізацыі «За Радзіму».
Ліпень—жнівень 1942 г.	Зараджэнне масавага партызанскага руху на Шаркаўшчыне.

Помнік у гонар савецкіх артылерыстаў у в. Германавічы.

9 чэрвеня 1943 г. — 2 ліпеня 1944 г.	Дзейнасць Шаркаўшчынскага падпольнага РК КП(б)Б.
14 верасня 1943 г. — 2 ліпеня 1944 г.	Дзейнасць Шаркаўшчынскага падпольнага райкома ЛКСМБ.
1 ліпеня 1944 г.	Шаркаўшчына вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У Вялікую Айчынную вайну гітлераўцы загубілі ў Шаркаўшчыне і раёне 2027 чалавек, спалілі 23 вёскі, з іх 10 не адрадзіліся.

Новы пасёлак у сельскагаспадарчым вытворчым кааператыве «Жвіранка».

1945 г.	У в. Ёды пабудавана Свята-Ільінская царква, помнік народнага дойлідства.
8 студзеня 1954 г.	Шаркаўшчынскі раён уключаны ў склад Маладзечанскай вобласці.
20 студзеня 1960 г.	Шаркаўшчынскі раён уключаны ў склад Віцебскай вобласці.
1962 г.	Ліквідаваны Шаркаўшчынскі раён.
1966 г.	Шаркаўшчынскі раён адноўлены.

Народны хор «Спадчына» Шаркаўшчынскага раённага Дома культуры.

21 лістапада 1982 г.	У в. Гарадзец адкрыты музей мастацтва і этнаграфіі.
1985 г.	У Германавіцкай сярэдняй школе адкрыты гісторыка-краязнаўчы музей.
1988 г.	Створаны мемарыяльны музей садавода-селекцыянера І.А.Сікоры ў в. Алашкі.
1990 г.	У в. Германавічы пачаў працаваць музей мастацтва і этнаграфіі імя Я.Драздовіча.

Маляўнічы куточак — любімае месца адпачынку ў Лужкоўскай сярэдняй школе.

1992 г.	Пры рэдакцыі раённай газеты «Кліч Радзімы» створана літаб'яднанне «Світанак».
Жнівень 1992 г.	Самадзейнаму калектыву «Лужкоўскія песняры» пацверджана званне народнага.
28 снежня 1992 г.	Хору Шаркаўшчынскага раённага Дома культуры «Спадчына» прысвоена званне народнага.
1995 г.	Створаны Германавіцкі культурна-асветны цэнтр імя Язэпа Драздовіча.
5 кастрычніка 2001 г.	Створаны раённы Цэнтр рамёстваў.

Да чытача

Шаноўныя чытачы! Чарговая кніга серыі шматтомнага выдання гісторыка-дакументальных хронік Памяці прысвечана Шаркаўшчынскаму раёну — пра яго сівую мінуўшчыну і сучаснасць, пра шматвяковае жыццё і барацьбу людзей за лепшы свой лёс. Наш край мае сапраўды багатую і слаўную гісторыю, у чым найперш пераканаліся ўсе, хто збіраў, сістэматызаваў і рыхтаваў да друку матэрыялы хронікі. Яна вынік нястомнай, карпатлівай, напружанай і адказнай працы многіх людзей — краязнаўцаў, вучоных, журналістаў, настаўнікаў, гісторыкаў, работнікаў культустаноў і адукацыі, супрацоўнікаў дзяржаўных органаў, ваенкамата, ветэранаў вайны і працы — усіх тых, хто нераўнадушна ставіцца да мінулага нашай Бацькаўшчыны і сённяшняга дня роднага краю.

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, у Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці, у архівах Маладзечна і Глыбокага, Расійскай Федэрацыі адшуканы многія матэрыялы, з якімі вы, шаноўныя чытачы, пазнаёміцеся ўпершыню і якія маюць далёка не мясцовае значэнне.

Шмат выпрабаванняў выпала на долю жыхароў Шаркаўшчыны. Кожны раз з попелу і руін адраджаўся наш край, памнажаў свае багацці. Але ніколі не забудуцца дні і ночы 1941—1945 гг. Вялікія матэрыяльныя і духоўныя страты панесла Шаркаўшчына ў Вялікую Айчынную вайну.

У кнізе ўвекавечаны воіны Чырвонай арміі, партызаны, падпольшчыкі, мірныя жыхары, якія загінулі ад рук нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Прыводзяцца спісы воінаўземлякоў, якія вярнуліся з франтоў вайны. Услаўляюцца знакамітыя ўраджэнцы ці жыхары Шаркаўшчыны, якія зрабілі важкі ўклад у развіццё народнай гаспадаркі, навукі і культуры. Значнае месца адводзіцца матэрыяльнай і духоўнай спадчыне, гісторыі населеных пунктаў.

Хочацца спадзявацца, што гэтая кніга дапаможа кожнаму з вас, шаноўныя чытачы, прасякнуцца пачуццём глыбокай удзячнасці мінулым пакаленням. Перакананы, што даследчыкам нашага краю ўдасца аднавіць яшчэ шмат гераічных старонак гісторыі нашай роднай Бацькаўшчыны.



Шаркаўшчынскі раён размешчаны ў паўночна-заходняй частцы Віцебскай вобласці. Мяжуе з Браслаўскім, Міёрскім, Глыбоцкім, Пастаўскім раёнамі. Утвораны 15 студзеня 1940 г. У 1962 г. быў рэарганізаваны, у 1966 г. — адноўлены. Раённы цэнтр — гарадскі пасёлак Шаркаўшчына, размешчаны за 210 км ад Віцебска і 195 км ад Мінска. Плошча раёна 1,1 тыс. км^2.

Працягласць тэрыторыі з захаду на ўсход 60 км, з поўдня на поўнач — 30 км, насельніцтва 22,2 тыс. чалавек (на пачатак 2003), у тым ліку ў Шаркаўшчыне — 7,5 тыс. чалавек.

Паводле нацыянальнага складу пераважаюць беларусы — 89%, рускіх — 6,9%, палякаў — 2,7%, украінцаў — 0,7%.

У раёне 8 сельсаветаў: Більдзюжскі, Валожынскі, Германавіцкі, Ёдскі, Лужкоўскі, Радзюкоўскі, Ручайскі, Станіславаўскі.

Тэрыторыя раёна размяшчаецца ў Полацкай нізіне ў выглядзе даволі шырокай паласы ўздоўж цячэння р. Дзісна і яе прытокаў: Янка, Мнюта, Бярозаўка. Сярэдняя вышыня над узроўнем мора 150 м. З поўначы і паўночнага захаду ўкліньваецца сваімі атрогамі Браслаўская марэнная града (Ёдскі, Більдзюжскі сельсаветы). Рэльеф тэрыторыі пераважна раўнінны, што ўскладняе адток атмасферных ападкаў і стварае вялікія плошчы пераўвільготненых зямель. Сярэднегадавая тэмпература складае +5,5 °С. Найбольш халодны месяц — студзень (-7,0 °С), найбольш цёплы — ліпень (ад +13,0° да +17,5 °С). Ападкаў выпадае ў сярэднім 640 мм за год. Вегетацыйны перыяд 186 дзён. Агульная плошча сельскагаспадарчых угоддзяў 70 959 га, з іх меліяраваных зямель — 36 603 га, ворнай зямлі — 45 775 га. Якасная ацэнка глеб у балах: ворных зямель 36, сельгасугоддзяў — 35.

Па прыродна-эканамічных умовах у гаспадарчай дзейнасці раён адносіцца да 3-й групы і спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, вырошчванні зерневых і кармавых культур, бульбы і лёну, насенняводстве зерневых культур, шматгадовых траў, агародных культур і караняплодаў.

У аграпрамысловы комплекс раёна ўваходзяць 15 сельскагаспадарчых вытворчых кааператываў і 2 сельгаспрадпрыемствы, аграпрамтэхсэрвіс. Ёсць 35 фермерскіх гаспадарак.

У раёне 4 прамысловыя прадпрыемствы: унітарнае прамысловае прадпрыемства (УПП) «Кансерваварадніна-сушыльны завод», УПП «Камбінат кааператыўнай прамысловасці», унітарнае камунальнае прадпрыемства «Камбінат будматэрыялаў», унітарнае прадпрыемства «Каапнарыхтпром». Дзве будаўнічыя арганізацыі: перасоўная механізаваная калона № 68 і прадпрыемства «Рамонтнік», дарожна-эксплуатацыйная арганізацыя ДРБУП-131, унітарнае прадпрыемства меліярацыйных сістэм «Шаркаўшчынскае ПМС».

Працуюць вузлы электрычнай і паштовай сувязі, маецца прадпрыемства аўтатранспарту. Па тэрыторыі раёна праходзіць чыгунка Круляўшчызна — Друя, аўтамабільныя дарогі на Браслаў, Міёры, Глыбокае, Дзісну і інш.

Выдаецца раённая газета «Кліч Радзімы».

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел раёна

Гарадскі пасёлак Шаркаўшчына.

Більдзюжскі сельсавет: вёскі Астаноўка, Барок, Більдзюгі, Ваўчкі, Вішнявец, Гернуты, Грыбаўшчына, Дворышча, Дубоўка, Краснае, Кубелеўшчына, Падбарок, Пестуны, Рымараўшчына, Чарнічкі, Янішкі, Яцкаўшчына; хутары Аўласы, Гарбачонкі, Дравасекі, Канашоўка, Карчы Мількаўскія, Ляды, Мікалаеўка, Петкуноўшчына, Цёплая Гара.

Валожынскі сельсавет: вёскі Альхоўцы, Амбросенкі, Астраўляне, Бабоў'е, Буйкі, Бяседнае, Валожынкі, Галава, Галінова, Глісцёнкі, Дубавое, Загорнае, Казакі, Касцюкі, Лазоўка, Лонск, Навасёлле, Паяныны, Пялікі, Пятровічы, Сасноўцы, Шурпакі, Юзафова; хутары Жытаполле, Зарэчча, Кулагі, Курычонкі, Непрынікі, Пукі.

Германавіцкі сельсавет: вёскі Атокі, Баяршчына, Баяры 1-я, Белы Двор, Брылёк, Буды, Васількова, Вуглы, Вялікае Сяло, Германавічы, Глінаўка, Дзікева, Жукі Горныя, Жукі Ложныя, Зорка, Іванава, Каралева, Крапіўнікі, Красоўшчына, Курылава, Лазовікі, Ліпава, Людвінова, Ляскова, Мікіцёнкі, Навасельцы, Падоршчына, Погары, Прамяны, Сталіца, Цярэшкі, Чарамхова, Шышкі, Юзафова, Ямна 1-е; хутары Бяляны, Вінцэнтава, Гузаватка, Красная Горка, Кукаўка, Маргі, Мар'янполле, Масткі, Мурашчына, Пішчалёўка, Рынполле, Смейна.

Ёдскі сельсавет: вёскі Бліноўшчына, Буда Бліжняя, Буда Дальняя, Буеўшчына, Бярнаты, Варонка, Волкаўшчына, Гізаўшчына, Дубнікі, Залессе, Зябліны, Ёды, Каршункі, Корніца, Кушталі, Лакінаўцы, Лонскія, Марціняты, Мета, Млынарова, Падобы, Пунішча, Свілы, Снегі, Тадуліна, Таўкіні, Трабаўшчына, Шыці, Яцелеўшчына.

Лужкоўскі сельсавет: вёскі Асінаўка, Ахватка, Баравое, Беразнянка, Барсукі, Блізніца, Васілева, Венсамполе, Верацеі 1-я, Верацеі 2-я, Гарадзец, Гаўрыленкі, Грыдзюшкі Вялікія, Грыдзюшкі Малыя, Дворнава, Дубаўка, Жарсцвянка, Залесінкі, Заполле, Зарэчча, Іванава, Ізабеліна, Кавалёва, Кавалі, Казачкі, Канавалава, Каўкі, Клінавое, Красная Гара, Крыўкі, Кушлева, Ламачына, Лапунова, Латышы, Лугаўцы, Лугі, Лужкі, Лучайка, Навасёлле, Пад'ельцы, Падліпкі, Падліпкі, Парэчча, Путраніца, Рубашкі, Стоміна, Стральцова, Ткачы, Тупічына 1-е, Тупічына 2-е, Уліна 1-е, Уліна 2-е, Уліна Падкарчэмнае, Фабіянава, Чаромушкі, Шпікалоўшчына; хутары Багатырова, Сіпаліна, Сомчына, Хоміна, Цераспполле.

Радзюкоўскі сельсавет: вёскі Адамава, Александрова, Антанова, Балбекі, Баўтрамеі, Беляі, Бондары Старыя, Бондары Тулаўскія, Боўкалы, Букі, Дуліна, Жоўніца, Заазерцы, Іванскія, Ляднікі, Малонка Казлоўская, Маркі, Палялейкі, Пашкі, Радзюкі, Савіцкія, Савуткі, Шкунціки; хутары Брыцікі, Выторкі, Казлоўшчына, Каралінава, Кісялёўка, Кляны, Малонка Мосарская, Петрунова, Ружамполь, Скураты, Тулава, Хвастова.

Ручайскі сельсавет: вёскі Азэта, Бардзенцы, Барсучына, Грыгараўшчына, Гуркі, Забор'е, Запруддзе, Зачысцікі, Кадрышкі, Каты, Каўшэлева, Малінава, Мікалаёва, Папкі, Пілаты, Праўдзінскае, Рацькі, Ручай, Рэчкі, Саварына, Сынадворцы, Шкялі, Якубова.

Станіславаўскі сельсавет: вёскі Агальніца, Алашкі, Васюкі, Грыблы, Жданы, Жукоўшчына, Зямцы, Курылавічы, Лабуці, Мельніца, Мішуты, Станіслававо, Сямёнавічы, Чуйкі; хутары Абалонь, Аляксандрава.

Населеныя пункты Шаркаўшчынскага раёна, якія зняты з уліку

Агаполь (1994), Антопаль (1994), Багатырова 2 (1990), Балаеўшчына (1987), Бахіры (1987), Баяры 2-я (1990), Варанчукі (1986), Граўжы (1997), Данілава (1997), Емяльянчыкі (1986), Зуі (1997), Качаны (1986), Красны Луг (1986), Крыс-

цінава (1986), Лапушына (1986), Лебядзіная (1986), Ліпнягі (1986), Мамонаўка (1986), Масты (1994), Мар'янава (1990), Мікіценкі (1990), Мішэльманты (1986), Мяцелі (1997), Нізіна (1994), Новікі (1964), Паўлінава (1994), Плаўна (1990), Пусталеўшчына (1994), Пушчавікі (1994), Слабада (1984), Слабада (1986), Спакойнае (1986), Стрэліца (1997), Сямёнаўка (1986), Шэлдрыкі (1986), Юзафова (1986).

Падрыхтаваў М.А.Макаранка.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

КАМЕННЫ ВЕК

На працягу апошняга мільёна гадоў існавання Зямлі перыядычна адбываліся моцныя пахаладанні, утвараліся ледавікі. Таўшчыня лядовага покрыва на поўначы Усходне-Еўрапейскай раўніны, уключаючы паўночна-заходнюю частку Беларусі, дзе знаходзіцца тэрыторыя Шаркаўшчынскага раёна, дасягала 2 кіламетраў. Ледавікі, што рухаліся са Скандынавіі, зрывалі і раструшчвалі велічэзныя абломкі скал, неслі далей камяні, жвір, гліну і пясок.

Некалькі разоў суровыя ледавіковыя эпохі змяняліся цёплымі міжледавіковымі перыядамі. Апошні ледавік адступіў з тэрыторыі Беларусі 13—11 тысяч гадоў таму. Былая ледзяная пустыня пакрылася рэкамі і азёрамі. Паступова клімат станавіўся больш цёплым. Чалавек рабіў чарговую спробу рассяліцца па далінах Дняпра, Сажа, Прыпяці, а таксама Заходняй Дзвіны.

Неабходна адзначыць слабую заселенасць людзьмі тэрыторыі Шаркаўшчынскага раёна на працягу не толькі каменнага і бронзавага вякоў, але таксама ў жалезным веку і ў раннім сярэдневеччы. Прычыны гэтага трэба шукаць у геаграфічным асяроддзі — сукупнасці прыродных з'яў, якая склалася гістарычна (клімат, глеба, шляхі зносін і інш.). Для Дзісенскай нізіны характэрна была асаблівая забалочанасць. Амаль уся прастора Шаркаўшчынскага раёна мае паніжаны рэльеф. Асноўная тут рака Дзісна. Яна ў значнай ступені дрэнажуе ўсю нізіну, працякаючы пасярод яе. На ўсход і захад ад Дзісенскай нізіны знаходзяцца вялікія забалочаныя лясныя масівы. Такімі прыроднымі ўмовамі тлумачыцца слабая шчыльнасць заселенасці тэрыторыі раёна, асабліва ў больш старажытныя часы. Аднак, нягледзячы на адзначаную асаблівасць геаграфічнага асяроддзя, гісторыя насельніцтва Шаркаўшчынскага раёна непарыўна звязана з гісторыяй заходняй часткі Віцебскай вобласці.

Бліжэйшыя да тэрыторыі Шаркаўшчынскага раёна стаянкі першабытных людзей каменнага веку выяўлены археолагамі каля вёсак Замошша Верхнядзвінскага і Крумплева Полацкага раёнаў і датуюцца 7—6-м тысячагоддзямі да нашай эры. Гэтыя стаянкі адносяцца да кундскай культуры (назва ад стаянкі каля г. Кунда ў Эстоніі). Асноўныя заняткі насельніцтва — паляванне і рыбалоўства. Першабытныя паляўнічыя выраблялі крамянёвыя наканечнікі стрэл, скрабкі для апрацоўкі шкур, прымітыўныя каменныя сякеры, долатападобныя прылады і інш.

На мяжы 5—4-га тысячагоддзяў да нашай эры на тэрыторыі Віцебскай вобласці і ўсёй Беларусі пачалася эпоха неаліту, або новага каменнага веку.



Каменная сякера-клін, знойдзеная каля в. Боўкалы ў 1973 г.

Клімат стаў больш цёплым. Мяккія зімы і цёплыя летнія месяцы спрыялі росту лясоў. Жывёльны свет у той час быў амаль такі, як і цяпер. Людзі, што жылі тады ў лясной паласе, амаль не ведалі земляробства і жывёлагадоўлі. Адзенне і абутак шылі са скур жывёлы. Чалавек браў ад прыроды ўсё ў гатовым выглядзе. Такі тып гаспадаркі называецца спажывецкім, або прысвойваючым. Паляўнічыя, збіральнікі, рыбаловы карысталіся тым, што было ў прыродзе. Старажытным людзям даводзілася часта і падоўгу галадаць. Таму яны імкнуліся знайсці сабе больш устойлівыя крыніцы здабывання ежы.

Невялікія паселішчы з наземнымі або паўзямлянкавымі жытламі размяшчаліся найчасцей у сутоках малых рэк, на берагах старыц і пясчаных дзюнах. Паступова ўдасканальваліся спосабы апрацоўкі каменю, пашыралася шліхтаванне сякер, долат, цяслаў, матык. Ужываліся серпападобныя нажы. Сведкам дзейнасці чалавека ў тыя далёкія часы з'яўляюцца каменныя сякеры, якія знойдзены на тэрыторыі Шаркаўшчынскага раёна. Каля в. Забор'е выяўлена каменная сякера са слядамі прывязкі да чаранка.

Найважнейшая рыса неаліту — з'яўленне керамічнай вытворчасці — выраб посуду з гліны. Яго ляпілі ўручную і абпальвалі на вогнішчы. Пасудзіны ўпрыгожваліся арнаментам. Выраб гліняных пасудзін у Віцебскай вобласці пачаўся 6 тыс. гадоў таму. Такі посуд значна палепшыў умовы жыцця чалавека. Цяпер ён мог варыць ежу і больш надзейна захоўваць харчовыя запасы.

БРОНЗАВЫ ВЕК

У пачатку 2-га тысячагоддзя да нашай эры на тэрыторыі Беларусі наступіў бронзавы век. Медзь і бронза траплялі да нашых продкаў з Прыкарпацця і Каўказа, дзякуючы абмену паміж плямёнамі. Аднак на беларускіх землях доўгі час працягвалі ўжывацца каменныя прылады працы. Яны дасягнулі тут сваёй дасканаласці. Пры іх вырабе яшчэ больш, чым раней, выкарыстоўваліся прыёмы шліфавання і свідраванне.

У Шаркаўшчынскім раёне знойдзены каменныя сякеры бронзавага веку ў некалькіх пунктах. Яны выяўлены каля в. Барсукі Лужкоўскага, в. Заазерцы Радзюкоўскага сельсаветаў. Недалёка ад праточнага возера Клёны (так называўся і былы хутар) знойдзена баявая свідраваная каменная сякера. Каля в. Шкунцікі, недалёка ад возера, выяўлены каменная сякера і іншыя прылады працы. Каменная сякера знойдзена каля в. Шурпакі, дзве сякеры — каля в. Станіславова, сякера-клін — на полі недалёка ад в. Боўкалы.

У бронзавым веку тэрыторыя Шаркаўшчынскага раёна адносілася да арэала паўночнабеларускай культуры. Плямёны гэтай культуры жылі на поўначы Беларусі, займаліся жывёлагадоўляй і земляробствам. Роля жывёлагадоўлі была больш значная ў параўнанні з земляробствам. Пад пасевы

рыхтавалі невялікія ўчасткі зямлі, якую апрацоўвалі каменнымі і рогавымі матыкамі. Жалі крамянёвымі сярпамі, а зерне расціралі з дапамогай ручных каменных зерняцёрак. Жывёлаводы і земляробы самі вырошчвалі тое, што потым маглі выкарыстоўваць для ежы: новыя пароды жывёл, выводзілі новыя гатункі раслін. Такая гаспадарка называецца вытворчай, яна прыйшла на змену прымітыўнай прысвойваючай.

Вытворчая гаспадарка з'явілася ў Еўропе ў неаліце. Таму вучоныя ўжываюць у адносінах да гэтага перыяду яе развіцця тэрмін «неалітычная рэвалюцыя». Яна мела найвялікшае значэнне ў жыцці грамадства. Вытворчай з'яўляецца наша гаспадарка дагэтуль.

ЖАЛЕЗНЫ ВЕК

У VII—VI ст. да нашай эры, з вынаходствам спосабаў атрымання жалеза з распаўсюджаных балотных руд, на тэрыторыі Беларусі пачынаецца жалезны век. У раннім жалезным веку многія каменныя і бронзавыя прылады працы былі заменены жалезнымі. Жалезныя прылады з'явіліся неабходнай перадумовай канчатковага пераходу да земляробства. Ссечаныя дрэвы спальвалі, попел угнойваў глебу. Такая падсечна-агнявая сістэма земляробства характэрна для ранняга жалезнага веку ў лясной паласе, дзе размешчаны Шаркаўшчынскі раён.

У жалезным веку ўтварыліся ўмовы для накаплення багацця ў руках асобных калектываў унутры радавой абшчыны. Гэта вяло да яе распаду і выдзялення патрыярхальных сем'яў. Паміж багатымі і беднымі сем'ямі пачалі складвацца адносіны панавання і прыгнечання. Усё часцей і часцей адбываліся сутычкі паміж асобнымі родамі, абшчынамі і плямёнамі. Людзі імкнуліся захаваць як мага больш здабычы. Па гэтай прычыне ўспыхвалі войны. Яны з'явіліся сродкам узбагачэння племяннай знаці, правадыроў родаў і плямён. Захопленыя ў час войн палонныя выкарыстоўваліся для падневольнай працы. Так з'явілася патрыярхальнае (хатняе) рабства.

У раннім жалезным веку ўзнікла неабходнасць будаўніцтва ўмацаваных паселішчаў — гарадзішчаў. Гарадзішчы ўмацоўваліся земляными валамі, равамі, драўлянымі сценамі. Усё гэта рабілася з прычыны магчымых нападаў суседзяў ці чужынцаў, якія маглі захапіць статкі жывёлы, запасы зерня і іншую маёмасць. На тэрыторыі Віцебскай вобласці захавалася больш за 200 гарадзішчаў ранняга жалезнага веку днепра-дзвінскай культуры, носьбітамі якой былі балты — продкі сучасных літоўцаў і латышоў.

Звычайна плошча верхняй пляцоўкі гарадзішча невялікая — ад чвэрці да паловы гектара. Сустракаюцца гарадзішчы яшчэ меншыя. Іх будавалі на ўзвышаных месцах, каля рэк і азёраў. Усе гарадзішчы, у залежнасці ад месцазнаходжання, археолагі падзяляюць на ўзгоркавыя, мысавыя і балотныя. Узгоркавыя гарадзішчы ўзводзіліся на ледавіковых узвышшах-астанцах, мысавыя будаваліся на высокіх берагах рэк ці азёраў. Балотныя гарадзішчы размяшчаліся пасярод балот. Узгоркавыя і мысавыя гарадзішчы звычайна маюць культурны пласт. Пры археалагічных раскопках у ім знаходзяць рэшткі жытлаў, гаспадарчых пабудоў, розныя рэчы.

Форма пляцоўкі гарадзішча залежыць ад канфігурацыі мыса, на якім яно ўзведзена. Таму мысавыя гарадзішчы выглядалі трохвугольнымі ці чатырохвугольнымі. Узгоркавыя гарадзішчы мелі звычайна пляцоўку круглай ці авальнай формы. На земляных валах гарадзішчаў узводзілі сцены з бярвёнаў. Рэшткі некалькіх гарадзішчаў вядомы ў Шаркаўшчынскім раёне.

Каля в. Пілаты ў Ручайскім сельсавеце размешчана гарадзішча ранняга жалезнага веку. Узгорак, на якім яно знаходзіцца, узвышаецца над мясцовасцю на 6—8 м, схілы крутыя. Гарадзішча



Фрагменты ляпной керамікі прыкладна рубяжа нашай эры з гарадзішча Пілаты.



Косць (фаланга) каровы і чэлюсці дробнай рагатай жывёлы з гарадзішча Пілаты.

ўмацавана двума валамі і двума равамі. Першапачаткова памеры верхняй пляцоўкі складалі 60х38 м. На ўсёй яе плошчы быў культурны пласт таўшчынёй ад 0,5 да 1,5 м. Навокал няма значнага вадаёма. Толькі з паўночна-ўсходняга боку, каля абрывістага краю ўзгорка захавалася глыбокая забалочаная яма дыяметрам каля 10 м, запоўненая вадой. Верагодна, у старажытнасці тут знаходзіўся значна большы па памерах вадаём.

Мясцовы настаўнік-краязнаўца У.К.Ляскоўскі, пачынаючы з 1964 г. неаднаразова наведваў гарадзішча, прыводзіў сюды на экскурсію школьнікаў. З аднаго боку гарадзішча былі бачны два пласты абгарэлых рэштак абарончай сцяны. Ад яе застаўся частакол з бярвёнаў таўшчынёй 14—15 см. У час моцнага пажару бярвёны згарэлі і толькі ў зямлі засталіся завостраныя ніжнія канцы. Каля ўезда ў гарадзішча, з надворнага боку, на глыбіні 0,4 м знойдзены досыць вялікі жмут сена. Магчыма, тут прывязвалі коней.

У культурным пласце гарадзішча Пілаты знойдзена ляпная кераміка (чарапкі ад гаршкоў). Сярод гэтых рэштак гліняных вырабаў сустракаюцца фрагменты пасудзін гладкасценных, слоікападобных, без арнаменту, ёсць так званая штрыхаваная кераміка. Слоікападобная кераміка адносіцца да днепра-дзвінскай культуры ранняга жалезнага веку, распаўсюджанай на поўначы Беларусі.

Культура штрыхаванай керамікі існавала ў сярэдняй частцы Беларусі, на сучаснай Міншчыне. Для яе характэрна кераміка, пакрытая штрыхамі — своеасаблівым арнаментам. Магчыма, на рубяжы нашай эры групы плямёнаў «штрыхавікоў» праніклі на тэрыторыю размяшчэння «днепра-дзвінцаў». Дзве роднасныя групы балцкіх плямёнаў тут пачалі змешвацца. Да такіх развагаванняў прыводзіць наяўнасць штрыхаванай керамікі на гарадзішчы Пілаты. Жыццё на гарадзішчы працягвала-

ся да першых стагоддзяў нашай эры, пра што сведчаць значныя ўмацаванні з валоў і равоў. Больш раннія гарадзішчы такіх умацаванняў не мелі.

На гарадзішчы Пілаты ў культурным пласце выяўлены косці свойскіх жывёл — свінні, каня, каровы, казы — сведчанне таго, што насельніцтва займалася жывёлагадоўляй. Лапатка буйной хатняй жывёлы мае сляды апрацоўкі. Костку хацелі выкарыстаць у якасці матэрыялу для нейкага вырабу.

Знойдзены гатовы выраб з клыка мядзведзя. У ім была прасвідравана адтуліна для ніткі. Гэта тыповы язычніцкі амулет, які насілі на целе і якому прыпісвалі магічныя ўласцівасці: здольнасць засцерагаць ад розных няшчасцяў, прыносіць поспех, ахоўваць здароўе ўладальніка. Амулеты з клыкоў мядзведзя сведчаць, што ў дадзенай мясцовасці пакланяліся мядзведзю, каб задобрыць яго.

Выяўлены фрагмент глінянага грузіка, якія былі характэрны для фінаугорскіх плямёнаў дзякоўскай культуры. Такія грузікі па контуры падобны на шматпялёсткавую кветку, а збоку маюць выступ і нагадваюць грыбок. Магчыма, яны выкарыстоўваліся для нацягвання нітак асновы ў вертыкальных ткацкіх станках.

У в. Вішнявец (былая Жарабцы) прасочваюцца рэшткі гарадзішча непасрэдна пасярод сучаснай вёскі. У сувязі з будаўніцтвам жвіровага кар'ера побач з гарадзішчам археалагічны помнік быў пашкоджаны. Захавалася ўзвышша са спадзістымі схіламі. Рэшткі помніка адкрыў у 1972 г. У.К.Ляскоўскі. Гарадзішча пашкоджана, і цяпер цяжка вызначыць яго памеры. У культурным пласце магутнасцю да 1 м шмат фрагментаў керамікі.

Неўмацаванае паселішча знаходзілася каля в. Грыбаўшчына Більдзюжскага сельсавета. Пасярод роўнага поля выдзяляецца прамавугольная пляцоўка з культурным пластом. Знойдзены вырабы з керамікі і жалеза.



Амулет з клыка мядзведзя і гліняны грузік з гарадзішча Пілаты.

Археалагічныя помнікі пацвярджаюць, што ў жалезным веку на тэрыторыі Шаркаўшчынскага раёна існавалі нешматлікія асобныя гарадзішчы, дзе насельніцтва вяло гаспадарку, у якой значную ролю мела жывёлагадоўля.

КУРГАНЫ КРЫВІЧОЎ

Нашы продкі хавалі памерлых у курганах. Археолаг Ф.В.Пакроўскі выдаў у 1893 г. «Археалагічную карту Віленскай губерні», змешчаную ў працах, прысвечаных IX Археалагічнаму з'езду ў Вільні. Паводле дадзенай публікацыі, на тэрыторыі цяперашняга Шаркаўшчынскага раёна былі курганы каля вёсак Верацеі і Лужкі. Акрамя таго, Пакроўскі пісаў, што прыкладна за 10 км на паўночны захад ад в. Ёды, каля былога маёнтка Замошша, існавала 10 курганоў — валатовак.

Назва курганоў — «валатоўкі» распаўсюджана на Віцебшчыне. Яна звязана са старадаўнім уяўленнем тутэйшага насельніцтва аб тым, што ў курганах быццам пахаваны людзі вялікага росту — волаты. Народная назва курганоў «валатоўкі», мусіць, звязана са старажытным эпасам усходніх славян. Найменне ўрочышча — Валатоўкі — узнікла паводле бліжэйшага курганнага могільніка, які існуе або існаваў раней. Волат — персанаж беларускай міфалогіі, асілак высокага росту. Легенды аб пахаванні ў «валатоўках» волатаў-асілкаў вядомы на значнай тэрыторыі Усходняй Еўропы.

Аднак найбольш яны распаўсюджаны на поўначы Беларусі і суседніх з ёй Пскоўскай і Смаленскай абласцях, усходняй Латвіі, дзе сяліліся крывічы.

ГАРАДЗІШЧА НА РАЦЭ МНЮТА

Надзвычай важным помнікам старажытнай гісторыі Шаркаўшчыны з'яўляецца гарадзішча каля в. Гарадзец (непрацяглы час яна мела назву Дзіўная), што знаходзіцца на высокім беразе р. Мнюта, правага прытока Дзісны. Помнік добра захаваўся. Пляцоўка гарадзішча трохвугольная, плошча 1 га. Вышыня пляцоўкі над узроўнем вады ў Мнюце 20 м. З паўночнага боку яна абкружана валам даўжынёй 100 м, вышынёй 5 м. Гэта тыповае мысавае гарадзішча.

Гарадзішча абследаваў у 1972 г. археолаг Я.Г.Звяруга. Ён паставіў пытанне аб магчымасці суаднесці археалагічны помнік з паведамленнямі летапісаў пра горад Полацкага княства Гарадзец, месца размяшчэння якога пакуль невядома. У 1973 г. правёў невялікія раскопкі Г.В.Штыхаў. Для высвятлення характару помніка былі неабходны далейшыя археалагічныя даследаванні. Магчымасць зрабіць іх з'явілася ў 1981 г. Актыўны ўдзел у даследаваннях прыняў вядомы беларускі мастак А.А.Марачкін.

Раскопкі праводзіліся ў двух процілеглых месцах пляцоўкі гарадзішча. Першы раскоп знаходзіўся каля ўсходняга ўвахода на гарадзішча. Плошча раскопу 52 м². Таўшчыня культурнага пласта 0,3—0,4 м без уліку ям у мацерыку, глыбіня якіх складала 0,4—0,6 м. Усяго выяўлена сем ям, з іх дзве малыя ад слупоў. Культурныя напластаванні даследаваліся пластамі таўшчынёй па 20 см, паводле прынятай методыкі.

Яма № 1 часткова была даследавана ў 1973 г. Тут было знойдзена скроневае крывіцкае кольца. Вывучалася яе ўсходняя частка, дзе было шмат гліны. Яма № 2 — невялікае паглыбленне. У ёй знойдзены два кавалкі верхніх частак ляпных гаршкоў VIII—IX ст. Яма № 3 — вялікіх памераў, раскапана часткова. Яе глыбіня 0,4 м, зверху выяўлена некалькі камянёў. Тут знойдзена шмат керамікі: кавалак гаршка, напэўна, трэцяй чвэрці 1-га тысячагоддзя н.э., два фрагменты начыння IX — пачатку X ст. і 25 кавалкаў з кругавога посуду, у тым ліку 9 венчыкаў XI ст., 12 сценак, 4 донцы, сярод іх 2 з клеймамі.

Яма № 4 даволі глыбокая — 1 м. Раскапана толькі частка. У нізе было вуголле і кераміка трэцяй чвэрці 1-га тысячагоддзя н.э. Тут выяўлена 8 кавалкаў ад гаршкоў IX — пачатку X ст., 36 фрагментаў сценак і адно донца. Яма найбольш ранняя з усіх у раскопе, бо у ёй няма ганчарнай керамікі. Удалося натрапіць на бронзавую трапецападобную падвеску з арнаментам. Бліжэй да ямы № 5 знойдзена бразготка з крыжападобнай прарэзінай. У яме № 5 знаходзілася 7 кавалкаў ляпнога посуду, з якіх 2, напэўна, ад гаршка пачатку X ст., ганчарнага посуду 10 кавалкаў, з іх 2 кавалкі XI ст.

Такім чынам, у першым раскопе кераміка выяўлена не толькі ў ямах, але і ў культурным пласце. У пласце 2 знойдзена 10 кавалкаў ляпнога посуду, уключаючы венца IX ст. Кругавой керамікі ў пласце — 26 фрагментаў. Сярод іх два кавалкі керамікі X—XI ст., 2 фрагменты XII—XIII ст. Адкапана таксама кераміка XVII ст. Усяго знойдзены 72 абломкі ляпной керамікі. Ад кругавой керамікі — 60 вялікіх фрагментаў і яшчэ 211 дробных кавалкаў. Ляпнога посуду амаль у 4 разы менш, чым посуду, зробленага на ганчарным крузе. Акрамя таго, выяўлены 2 гліняныя біканічныя праселкі і жалезны нож.

Асаблівую цікавасць уяўляюць знаходкі сярэбраных манет — дырхемаў. Амаль на мацерыку знойдзена 1/2 дырхема. Паводле вызначэння В.Н.Рабцэвіча, гэта Абасіды, Харун ар-Рашыд (786—809 гг.), Мадынат ас-Салам

(803—804 гг.). Другая манета захавалася цалкам: Саманіды, Наср ібн Ахмад (914—943 гг.), аш-Шаш (933 г.) з імем халіфа ал-Кахіра білаха (932—933 гг.). Вага 3,53 г, дыяметр 2,7 см. Другі дырхем знойдзены на адлегласці 1,5 м ад вышэй апісанага дырхема, таксама ў культурным пласце. Магчыма, гэта манета трапіла ў культурны пласт каля сярэдзіны X ст.

На такім жа ўзроўні, як манеты, знойдзены і жалезныя шлакі. Па вызначэнні М.Ф.Гурына, адзін кавалак уключае буйныя канкрэцыі жалеза. Тут была майстэрня па вырабе крычнага жалеза.

Пры раскопках часта траплялiся косці жывёл, у іх ліку косці свойскіх свінні і быка.

Другі раскоп закладзены ў паўночна-заходнім вуглу пляцоўкі гарадзішча і мае памеры 4х14 м. Магутнасць культурнага пласта да 1 м. У мацерыку выяўлены ямы гаспадарчага прызначэння глыбінёй 0,8—0,9 м.

У заходняй частцы раскопу — авальная ў плане яма глыбінёй 0,8 м. Тут шмат позняй керамікі і адзін гаршчок XV ст., які захаваўся цалкам.

Ва ўсходняй частцы раскопу ў ніжніх пластах выяўлена значная колькасць знаходак. Гліняныя праселкі прадстаўлены чатырма экзэмплярамі. Каменная форма выкарыстоўвалася для вырабу манетападобных падвесак і іншых рэчаў. Ад бронзавага пласціністага бранзалета захаваліся дзве часткі з тонкім прыгожым арнаментам. Упрыгожаны арнаментам таксама абломак, верагодна, шыйнай грыўні. Добра захавалася тыповае крывіцкае бранзалетападобнае скроневае кольца. Знойдзены тры нажы і дзве пацеркі: адна паставая чырвонага колеру, другая шкляная пазалочаная XI ст. Выяўлены жалезныя шлакі.

У другім раскопе знойдзена шмат ляпной керамікі: фрагменты верхніх частак гаршкоў з плечукамі VIII—IX ст., ганчарны посуд — шэрагліняная кераміка XIII—XVIII ст., начынне з зялёнай палівай XVI—XVIII ст. Быў посуд XVIII—XIX ст., абломкі кафлі XVII ст., фрагмент фаянсавага посуду XIX ст.

Керамічны матэрыял з двух раскопаў аднолькавы. Значную частку знаходак керамікі склаў ляпны посуд VIII—XIX ст., характэрны для іншай стадыі культуры доўгіх курганоў Полацкага Падзвіння. Уся астатняя кераміка, зробленая з дапамогай ганчарнага круга, адносіцца да X—XII ст., а так-

Вучні Лужкоўскай сярэдняй школы на археалагічных раскопках гарадзішча Гарадзец у 1981 г.



Рэчы X—XI ст. з гарадзішча Гарадзец: крывіцкае скроневае кольца, фрагменты шыйнай грыўні і бранзалета (усе з бронзы), шкляныя пацеркі.

сама да перыяду позняга феадалізму XV—XVIII ст.).

З мэтай вывучэння абарончых збудаванняў каля ўвахода ў гарадзішча была зроблена зачыстка вала. Заўважаны падсыпкі вала і некалькі бярвёнаў у ім. Бярвёны знаходзіліся ў ніжняй частцы першапачатковага вала. Яны сасновыя. У насыпе вала знойдзены абломак ляпнога посуду з мноствам жарствы ў гліне. Магчыма, умацаванні адносяцца да VIII—IX ст., але для пацвярджэння неабходны далейшыя даследаванні.

Абследавалася мясцовасць каля гарадзішча з мэтай выяўлення прыкмет паселішча. Аднак гэта не мела поспеху. Няма прыкмет старажытнага паселішча таксама на тэрыторыі сучаснай вёскі.

Такім чынам, даныя раскопак дазваляюць сцвярджаць, што ў VIII—IX ст. на беразе р. Мнюта знаходзілася ўмацаванае паселішча полацкіх крывічоў, росквіт якога прыпадае на X —1-ю палову XI ст. Доказаў існавання горада ў XII—XIII ст. не выяўлена. У XV—XVIII ст. тут знаходзілася сядзіба феадала.

ЗАГАДКА ГАРАДЦА

Паводле тлумачэння, якое даюць спецыялісты па тапаніміцы, такая назва ўтворана ад асновы «горад». «Гарадзец» — гэта невялікі горад. Як тып паселішча гарадзец (горад) у мінулыя стагоддзі проціпастаўлены сялу і з'яўляўся ўмацаваным паселішчам са значнай колькасцю насельніцтва, пераважным заняткам якога была не сельская гаспадарка, а рамяство і гандаль.

Па назіраннях прафесара В.А.Жучкевіча, у Беларусі налічваецца 95 тапонімаў з асновай «горад», прычым сустракаюцца дзве формы змяншальных назваў ад асновы «горад»: «гарадок» і «гарадзец». Першая форма гістарычна старэйшая і адносіцца да больш старажытных паселішчаў, другая з'явілася пазней і выкарыстоўваецца значна радзей. Апошняя форма найбольш цікавая і важная для краязнаўства Шаркаўшчыны.

У Іпацьеўскім летапісе пад 1162 г. сказана: «...приходи Рогъволодъ на Володаря с Полотъчаны к Городцю». Прывядзём гэты ўрывак з летапісу поўнасцю ў перакладзе на сучасную беларускую мову. Варта заўважыць, што фактычна падзея была, паводле сучаснага летазлічэння, у 1161 г.: «Хадзіў Рагвалод (Барысавіч) з палачанамі на Валадара (Глебавіча) да Гарадца. Але Валадар не даў яму бою ў дзень, а ноччу (раптоўна) напаў на яго з горада (разам) з літвою (літоўцамі). І шмат ліха прычынілася ў тую ноч: адных палачан пабілі, а іншых рукамі пабралі, іх было больш, чым забітых. Рагвалод жа ўцёк у Слуцк і, прабыўшы тут тры дні, пайшоў у Друцк. А ў Полацк ён пабаяўся ісці, таму што шмат загінула палачанаў. Палачане ж пасадзілі ў Полацку Васількавіча (Усяслава)».

З летапісу відаць, што Гарадзец — добра ўмацаваны горад, магчыма, цэнтр удзельнага княства, належаў мінскім князям Глебавічам. Размяшчаўся горад сярод лясоў, як лічаць некаторыя, недалёка ад Мінска. Розныя даследчыкі атаясамлівалі Гарадзец з Гарадком каля Маладзечна, Сёмкавым Гарадком і Астрашыцкім Гарадком (Мінскі

раён), з Гарадзеяй (Нясвіжскі раён), Гарадзішчам (Баранавіцкі раён), Гарадцом (цяпер Высокі Гарадзец Талачынскага раёна). Аднак у названых пунктах вучонымі-археолагамі не выяўлены рэшткі старажытнага горада.

Мікола Ермаловіч выказваў меркаванне, што Гарадзец наогул не існаваў і спасылаўся пры гэтым на разважанні В.М.Таціщава аб тым, што ў летапісе размова ідзе не аб Гарадцы, а пра Мінск. Г.В.Штыхаў у кнізе «Гарады Полацкай зямлі IX—XIII ст.» (1978) прыводзіць довады аб памылцы Таціщава і лічыць, што Гарадзец сапраўды існаваў і быў цэнтрам удзельнага княства. Звесткі аб Гарадцы ёсць у беларуска-літоўскіх летапісах XV—XVI ст. у аповядзе пра літоўскага князя Мінгайлу. Мінгайла — асоба міфічная, аднак у паданні выкарыстаны даныя аб падзеях, якія апісаны ў Іпацьеўскім летапісе. У «Летапісцы вялікіх князёў літоўскіх» полацкі горад Гарадзец названы тройчы. Прывабна лакалізаваць летапісны Гарадзец на р. Мнюта, як зрабіў Я.Г.Звяруга. Пры археалагічных раскопках было ўстаноўлена існаванне тут зародка горада ў IX—XI ст., але застаецца спрэчным, ці стаў ён горадам у XII ст., калі ўпершыню названы ў летапісе. Загадка летапіснага Гарадца канчаткова не вырашана.

У 2001 г. узноўлены археалагічныя раскопкі на беразе р. Мнюта (кіраўнік С.Д.Дзярновіч), і яны будуць працягвацца ў наступныя гады.

У СКЛАДЗЕ ПОЛАЦКАГА КНЯСТВА (IX—XIII ст.)

«КНЯСТВА РАГВАЛОДА»

Полацк з'яўляецца калыскай дзяржаўнасці на беларускіх землях, а Полацкая зямля — найбольш моцнае княства з усіх, што існавалі на тэрыторыі Беларусі ў IX—XIII ст. Горад і яго акруга ў тыя часы былі непадзельныя ў адміністрацыйных адносінах. Таму назвы Полацк і Полацкая зямля выкарыстоўваліся тады як сінонімы. «Полацкая зямля» — гэта летапісная назва самастойнага дзяржаўнага ўтварэння, якое гісторыкі называюць Полацкім княствам. Пад уладай Полацка, галоўнага («старшага» — так у летапісе) горада, знаходзіліся іншыя, «малодшыя» гарады, ці «прыгарады».

Гістарычным ядром Полацкага княства з'яўлялася Беларускае Падзвінне (тэрыторыя Віцебскай вобласці). Тут у VIII—IX ст. адбывалася фарміраванне заходняй галіны крывічоў, ці палачан, якія разам з дрыгавічамі і радзімічамі сталі непасрэднымі продкамі беларусаў.

Паводле ўяўленняў іншаземцаў — скандынаваў, ці варагаў, як іх называлі на старажытнай Русі, усходнія славяне ў адміністрацыйных адносінах падзяляліся на тры часткі: на чале з Ноўгарадам, Полацкам і Кіевам. Нават у галіне царкоўнага будаўніцтва тры гарады сапернічалі паміж сабой, што знайшло сваё адлюстраванне ў будаўніцтве ў XI ст. трох сабораў Святой Сафіі ў названых цэнтрах усходняга славянства.

Важнае значэнне Полацка ў гісторыі Усходняй Еўропы пацвярджаюць старажытныя летапісы, і ў першую чаргу Пачатковы летапіс, на аснове якога была затым складзена «Повесть временных лет». Полацкія летапісы да нас не дайшлі. Яны былі знішчаны ў часе бясконцых войнаў, пажараў і пры іншых драматычных падзеях. Расійскі гісторык В.М.Таціщаў у 30-я гады XVIII ст. трымаў у руках Полацкі летапіс і зрабіў з яго некаторыя выпіскі. Далейшы лёс летапісу невядомы.

У полацкіх крывічоў у IX ст., паводле летапісу, існавала сваё племяннае «княжанне». Мусіць, ваенная арганізацыя крывічоў налічвала некалькі фарміраванняў, якія ўдзельнічалі ў пахо-

дах кіеўскіх князёў у X ст. на Візантыю. Полацкія крывічы мелі свой асобны цэнтр Полацк і, значыць, самастойнае апалчэнне.

Полацк і яго воласць упамінаюцца ў Пачатковым летапісе пад 862 г., калі Рурык раздаваў гарады ў кіраванне сваім дружыннікам. Летапісец адзначыў, што заснавалі Полацк крывічы, гэтак жа сама як і Смаленск, а варагі — прышлыя. На працягу X ст. Полацк рос, мацнеў і ператвараўся ў буйны цэнтр усходняга славянства, што пацвярджаюць археалагічныя даследаванні. Як пра магутнае ўладанне на чале з легендарным князем Палтэсам, апавядаюць аб ім скандынаўскія сагі. Полацк са сваёй воласцю фарміраваўся як горад-дзяржава.

Кіеў і Ноўгарад сапернічалі паміж сабой за аб'яднанне ўсходнеславянскіх зямель, пры гэтым Полацку надавалася важнае значэнне. Кіеўскі князь Аскольд разам са сваім братам Дзірам у 860-я гады зрабіў паход на палачан і прынёс ім шмат бяды, а затым сам быў забіты Алегам. Пераемнік Рурыка князь Алег у 882 г. здолеў аб'яднаць Наўгародчыну і Кіеўшчыну ў адну дзяржаву са сталіцай у Кіеве.



«Княства Рагвалода» ў X ст. з абазначэннем: а — гарадоў, б — гарадзішчаў, в — паселішчаў, г — курганоў, д — грунтавых могільнікаў (па Г.М.Семенчуку).

Полацк названы ў Пачатковым летапісе пад 907 г. сярод гарадоў, дзе сядзелі свае «велиции» князі, якія прымалі ўдзел у паходзе Алега на Царград (Канстанцінопаль). Адсюль вынікае, што ў пачатку X ст. Полацк быў саюзнікам Кіева. Мясцовыя «вялікія князі» і полацкая знаць дзейнічалі, абапіраючыся на кіеўскага князя. Так частка даніны, што ішла ў Полацк ад грэкаў, выкарыстоўвалася на ўтрыманне полацкай дружыны, якая ўдзельнічала ва ўдалым паходзе.

Да драматычных падзей 980 г. Полацк, мусіць, не быў пад уладай Кіева. У Лаўрэнцьеўскім летапісе ў двух месцах, пад 980 і 1128 гг., гаворка ідзе пра тое, што Рагвалод прыйшоў з-за мора (відаць, са Скандынавіі) і быў зусім незалежным правіцелем у Полацку («держащю и владеющю и княжащю Полотьскую землю»). У 70-я гады X ст. «княства Рагвалода», па вызначэнні Г.М.Семенчука, было значным па плошчы. Заходнія яго межы ішлі часткова па нізоўях Дзісны, поўнасцю ўключаючы цячэнне р. Мнюта. Гарадзішча Гарадзец выконвала ролю адміністрацыйнага і гандлёвага цэнтра воласці на правабярэжжы Дзісны ў X—XI ст.

У 1-й палове XI ст. у склад Полацкай зямлі ўвайшоў Менск са сваёй воласцю ў вярхоўі Пцічы. Полацкая зямля ператварылася ў буйнейшае ўсходнеславянскае княства.

Полацкае княства існавала як самастойная дзяржава. Аднак Уладзіміру Святаславічу, які быў тады наўгародскім князем і змагаўся са сваім братам Яраполкам за кіеўскі прастол, удалося захапіць Полацк. Рагвалод быў забіты, яго дачка Рагнеда прымусова стала жонкай Уладзіміра. Праз некалькі год Рагнеда зрабіла замах на

жыццё Уладзіміра па прычыне патрыятычнага настрою да Полацка і была выдалена з Кіева разам з сынам Ізяславам Уладзіміравічам на сваю вотчыну. Ізяслаў атрымаў у спадчыну Полацкую зямлю — дамен сваёй маці Рагнеды. З гэтым звязана ранняе адасабленне полацкай лініі Рурыкавічаў (па бацьку) ці Рагвалодавічаў (па дзеду і маці Ізяслава). Нашчадкі Рагвалода ад яго дачкі Рагнеды Рагвалодаўны названы ў летапісе «Рагваложымі ўнукамі», у навуковай літаратуры іх часцей называюць Ізяславічамі — ад імя Ізяслава Уладзіміравіча. Па сутнасці, Рагвалодавічы — княжацкі род, прадстаўнікі якога ў X—XIII ст. валодалі Полацкай зямлёй.

Полацкія князі не маглі ўдзельнічаць у пераразмеркаванні зямель разам з князямі — спадчыннікамі Яраслава Мудрага, якія нарадзіліся ад іншай маці і наследавалі бацькавы землі. Князі Полацкага княства вотчыну сваю вялі па спадчыне ад бацькі Рагнеды — Рагвалода, а не ад падаравання кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча. З тае пары, як адзначыў летапісец, «узнімаюць меч Рагвалодавы ўнукі супраць унукаў Яраслава Мудрага» (сына Уладзіміра, які княжыў у Кіеве).

ПОЛАЦКАЕ КНЯСТВА Ў XI ст.

Ізяслаў княжыў у Полацку да 1001 г. У 1003 г. стаў княжыць яго сын Брачыслаў. Зноў пачалася барацьба паміж Полацкам і Кіевам, якая працягвалася з перапынкамі амаль 100 гадоў. Полацкія князі ўпарта абаранялі сваё княства, імкнуліся павялічыць яго за кошт суседніх тэрыторый.

Брачыслаў Ізяславіч княжыў у Полацку звыш 40 гадоў. Пры ім Полацкае княства стала моцным у ваенных і эканамічных адносінах. Для збору даніны і развіцця гандлю Брачыслава вабіла міжрэчча Ловаці і Заходняй Дзвіны, дзе на шляху «з вараг у грэкі» знаходзіліся волакі. У 1021 г. адбылася ўзброеная сутычка полацкага князя з Ноўгарадам. Брачыслава актыўна падтрымала полацкая знаць. У паходзе за Ноўгарад ён выкарыстаў наёмны атрад варагаў. Брачыславу ўдалося ўзяць Ноўгарад, захапіць там мноства палонных і вялікую здабычу. Але на адваротным шляху ён быў разбіты кіеўскім князем Ярославам Мудрым. Нягледзячы на перамогу, Яраслаў аддаў Брачыславу гарады Віцебск і Усвяты, разлічваючы схіліць полацкага князя на свой бок.

Пры Брачыславе да Полацка былі далучаны землі паміж Заходняй Дзвіной і Дзісной, дзе на месцы старажытнага паселішча быў заснаваны горад Браслаў.

Да канца XI ст. у асноўным закончылася фарміраванне абшараў Полацкай зямлі. І ўся тэрыторыя сённяшняга Шаркаўшчынскага раёна ўвайшла ў яе межы.

Найбольш вядомым у раннесярэдневяковай гісторыі Полацкага княства з'яўляецца князь Усяслаў Брачыславіч (1044—1101). У 1060 г. ён разам з паўднёварускімі князямі ўдзельнічаў у паходзе супраць качэўнікаў-цюркаў. Аднак хутка пачаліся яго сутыкненні з князямі Ярославічамі (сынамі Яраслава Мудрага). Празвалі Усяслава Чарадзеем.

У 1065 г. Усяслаў з войскам нечакана напаў на Пскоў. Моцныя сцены



Карта Полацкай зямлі XI—XII ст.

пскоўскага дзядзінца вытрымалі штурм полацкіх дружын. Задаволіўшыся невялікай здабычай, Усяслаў адышоў ад горада. Праз некаторы час, у 1066 г., Усяслаў накіраваўся да Ноўгарада. Наперарэз полацкаму войску рухалася дружына наўгародскага князя Мсціслава Ізяславіча. На рацэ Чарэсе адбылася бітва, у якой наўгародскае войска было ўшчэнт разбіта, а князь Мсціслаў Ізяславіч збег у Кіеў. Усяслаў бесперашкодна авалодаў Ноўгарадам. Полацкі князь абрабаваў горад і частку яго спаліў. У палон былі захоплены жанчыны і дзеці, а з Наўгародскай Сафіі зняты званы і ўзяты іншыя царкоўныя прыналежнасці.

Дзеянні Усяслава не маглі застацца незаўважанымі паўднёварускімі князямі. Трое сыноў Яраслава зімой 1067 г. з войскам з'явіліся пад Менскам — горадам Полацкай зямлі. Менчукі зачыніліся ў дзядзінцы. На дапамогу ім спяшаўся з дружынай Усяслаў, аднак спазніўся — бой усчаўся на рацэ Нямізе. Летапісец так апісаў гэту падзею: «І быў снег вялікі, і войскі пайшлі адно на другое, і быў бой жарсткі, і шмат людзей палягло, і перамаглі Ізяслаў, Святаслаў, Усевалад. Усяслаў жа ўцёк». Але ён не быў канчаткова пераможаны. Войска палачан здолела супрацьстаяць аб'яднаным войскам трох старажытнарускіх княстваў.

Яраславічы вырашылі пакончыць з Усяславам іншым спосабам. Яны запрасілі полацкага князя да сябе на перагаворы, прысягнуўшы перад крыжам, што не зробяць яму нічога благога. Усяслаў Полацкі з двума сваімі сынамі з'явіўся ў лагеры Ізяслава каля Оршы для заключэння міра. Яраславічы, вераломна парушыўшы прысягу, схапілі князя разам з сынамі і пасадзілі іх у «поруб» — турму — у Кіеве. Між тым пашыралася добрая слава пра Усяслава. Зняволены князь карыстаўся народнымі сімпатыямі. Праз год Усяслаў быў вызвалены паўстаўшымі кіяўлянамі з цямніцы і абвешчаны вялікім князем кіеўскім. Княжыў ён у Кіеве 7 месяцаў. Неўзабаве ў час паходу пакінуў кіеўскае войска і вярнуўся ў родны Полацк.

Кіеўскія князі не пакідалі намеру перамагчы Усяслава і падпарадкаваць сабе Полацк. Але гэта не ўдалося ні сынам Яраслава Мудрага, ні Уладзіміру Манамаху, які быў вопытнымваеначальнікам і меў вельмі моцную дружыну. Памёр Усяслаў у 1101 г. У перыяд княжання Усяслава Полацкае княства дасягнула свайго найвышэйшага ўздыму.

У ЧАСЫ ФЕАДАЛЬНАЙ РАЗДРОБЛЕНАСЦІ (XII—XIII ст.)

Пасля смерці Усяслава Брачыславіча Полацкая зямля была падзелена паміж яго сынамі (усяго іх было шасцёра), якія затым сталі надзяляць «валасцямі» сваіх дзяцей. З'явіўся шэраг удзельных княстваў (Полацкае, Менскае, Віцебскае, Друцкае, Ізяслаўскае, Лагойскае і інш.). Прастол у Полацку лічыўся галоўным, і гэты горад працягваў заставацца найбольш важным палітычным цэнтрам. Пачаўся новы, складаны перыяд у гісторыі Полацкай зямлі, перыяд удзельнай раздробленасці, адасаблення самастойных княстваў, які ў XII—XIII ст. быў характэрны для ўсёй Еўропы.

Вострая міжусобная барацьба адбывалася паміж нашчадкамі Усяслава Чарадзея. Тым часам улада князёў у Полацку значна аслабла. Іх выбранне і выгнанне залежала цяпер ад веча — агульнага сходу гараджан, які збіраўся для абмеркавання і вырашэння дзяржаўных і грамадскіх спраў. На вечы ўдзельнічалі ўсе самастойныя гаспадары — жыхары горада, якія звычайна склікаліся вечавым звонам на галоўную плошчу горада. Падліку галасоў не было, большасць вызначалася па сіле крыку.

На вечы вырашаліся пытанні вайны і міру, кантралявалася дзейнасць князя, ажыццяўляўся вышэйшы суд.

Абмяркоўваліся на вечы і справы гандлю. Ад імя полацкага веча заключаліся дагаворы з Рыгай і іншымі гарадамі. Нярэдка гандлёвыя граматы пачыналіся словамі «мы, мужы палачане, даём ведаці». Калі веча не падтрымлівала князя, яму нічога не заставалася, як пакінуць горад. Полацк стаяў на шляху ўтварэння сярэдневяковай рэспублікі, накшталт той, якая тады існавала ў Ноўгарадзе Вялікім.

Полацкія князі па-ранейшаму не жадалі падпарадкоўвацца ні адзін аднаму, ні князю кіеўскаму. Асабліва ў гэтым вызначаўся менскі князь Глеб Усяславіч, які быў узяты ў палон кіеўскімі князямі і памёр у Кіеве ў 1119 г.

Не змянілася становішча і пасля шырока задуманага вялікім князем кіеўскім Мсціславам паходу 1127 г. на Полацкую зямлю, калі былі спалены некалькі яе гарадоў. У гэты час улада вялікага князя кіеўскага прыходзіла да заняпаду на тэрыторыі ўсёй Кіеўскай дзяржавы (Русі). Кіеўскія князі ўжо не маглі падпарадкаваць сабе Полацк. Полацкае княства працягвала існаваць як самастойная дзяржава на працягу ўсяго перыяду феадальнай раздробленасці.

У пачатку XIII ст. жыхары Полацка разам з лівамі, латгаламі, эстамі змагаліся супраць нямецкіх крыжакоў, якія ўварваліся ў Прыбалтыку і захапілі гарады Полацкай зямлі Кукенойс і Герцыке. Дружыны полацкага князя Уладзіміра (Валодшы) не адзін раз выступалі супраць рыцараў (1203, 1206, 1216). Полацкае баярства асцерагалася агрэсіі крыжакоў, таму пайшло на кампраміс з літоўскімі князямі і запрасіла іх у Полацк. У 60-я гады XIII ст. тут княжыў па дамоўленасці з вечам Таўцівіл — пляменнік вялікага князя літоўскага Міндоўга. З 1307 г. Полацкае княства канчаткова ўвайшло ў склад Вялікага княства Літоўскага.

ЦАРКВА І КУЛЬТУРА

Язычніцтва (паганства) мела глыбокія і старажытныя карані на беларускіх землях. Нашы продкі ўшаноўвалі агонь, сонца, месяц, зоркі, птушак, жывёл, камяні і інш. Важнейшую асаблівасць язычніцтва складала мнагабожжа. У славян галоўным богам лічыўся Пярун. Але ў X ст. рэлігійныя ўяўленні пачалі змяняцца.

Найбольш важнай вяхой у распаўсюджванні хрысціянства сярод усходніх славян быў 988 г., калі вялікі князь кіеўскі Уладзімір Святаславіч прымусіў кіяўлян хрысціцца — прыняць хрысціянскую рэлігію. Для кіраўніцтва дзейнасцю царквы ў буйных гарадах і княствах пачалі ствараццa епархіі. Мяркуюць, што ў Полацку епархія ўзнікла ў 992 г. Хрысціянства ў параўнанні з язычніцтвам паляпша-

Святая Ефрасіння Полацкая.

ла маральны стан грамадства. Распаўсюджванне хрысціянства садзейнічала развіццю пісьменнасці і адукацыі.

У XI—XII ст. у Полацкім краі асвойвалася пісьменнасць. Сведчанне таму — чатыры вялікія валуны ў рэчышчы Заходняй Дзвіны з высечанымі крыжамі і надпісамі «Господи, помози рабу своему Борису». Вялікі тэкст змешчаны на крыжы Ефрасінні Полацкай (1161).

Прадстаўніцай хрысціянскага культурна-асветніцкага руху ў Полацкім княстве з'яўляецца Ефрасіння (каля 1104—1167 гг., паводле іншых даных, 1102—1173 гг.). Была яна ўнучкай князя Усяслава Брачыславіча, дачкой малодшага яго сына Святаслава (у хрышчэнні Георгія). Пастрыгшыся ў манашкі, занялася ў келлі Сафійскага сабора перапіскай твораў рэлігійна-маральнага зместу. Гэта, відаць, былі пераклады з грэчаскіх арыгіналаў.

Ефрасіння заснавала каля Полацка, на беразе р. Палаты, жаночы манастыр. Па яе задуме была пабудавана царква Святога Спаса. Архітэктарам з'яўляўся выдатны полацкі дойлід Іаан, заснавальнік новага напрамку ў царкоўным будаўніцтве. Багата ўпрыгожаная цудоўнымі фрэскамі, царква захавалася да нашых дзён і вядома ва ўсім свеце. Пры манастыры Ефрасіння заснавала школу, дзе вучыліся дзеці. Узвіжальны крыж, які выкарыстоўваўся ў дзень хрысціянскага свята «Узвіжанне Крыжа», быў заказаны майстру Лазару Богшу. Мужчынскаму манастыру, заснаванаму таксама Ефрасінняй, асветніца падаравала ікону Божай Маці, прывезеную з Візантыі. Ефрасінню царква абвясціла святой. Вернікі лічаць прападобную Ефрасінню Полацкую нябеснай заступніцай беларускай зямлі. Дзейнасць Ефрасінні Полацкай з'яўляецца яскравым адбіткам духоўных зрухаў, што адбываліся ў грамадска-культурным жыцці беларускіх зямель на працягу XII — у пачатку XIII ст.

Г.В.Штыхаў.

У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

З сярэдзіны XIII ст. цэнтрам збірання зямель на тэрыторыі сучаснай Беларусі стаў Новагародак (Навагрудак) — першая рэзідэнцыя вялікіх князёў Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Так афіцыйна называлася беларуска-літоўская дзяржава, якая ўзнікла і фарміравалася ў барацьбе з крыжацкай агрэсіяй на захадзе і пад пагрозай мангола-татараў з усходу. Першы князь ВКЛ Міндоўг актыўна пашыраў межы княства. Менавіта ён далучыў да Новагародка Браслаў з тэрыторыямі, што ўваходзяць цяпер у межы нашага раёна.

У XIV—XVI ст. частка тэрыторыі сучаснага Шаркаўшчынскага раёна — землі па берагах ракі Дзісны і яе прытокаў Янкі, Мнюты, Бярозаўкі — увайшла ў Полацкае княства, што з'яўлялася паўночным парубежжам ВКЛ. Вядома, што яшчэ ў канцы 1250 — пачатку 1260-х гадоў у Полацку княжыў пляменнік Міндоўга Таўцівіл. Полацкае княства было далучана да ВКЛ у час княжання вялікага князя Віценя (1307), верагодна, на аснове пагаднення полацкіх баяраў з літоўскімі князямі. Гэты саюз быў выгадны абодвум бакам. Ён прадугледжваў асаблівае становішча Полацкай зямлі ў складзе ВКЛ. Нашы продкі падпарадкоўваліся больш Полацку, які меў права на самастойнасць у міжнародных стасунках з такімі магутнымі суседзямі, як Рыга і Ноўгарад. Адасобленасць Полацкага княства пацвярджалася неаднойчы прывілеямі вялікага князя. Найбольш важныя пытанні мясцовага жыцця тут вырашаліся на вечы, пры гэтым выкарыстоўва-

лася мясцовае звычаёвае права. Пры вялікім князю Вітаўце ў 1392 г. палачане прынялі велікакняжацкага намесніка, аднак Вітаўт спецыяльным прывілеем прызнаў тэрытарыяльную і палітычную аўтаномію Полацкай зямлі. Намеснік вялікага князя прызначаўся сюды толькі са згоды палачан. Прывілей абараняў мясцовае насельніцтва ад самавольных паборaў улад, яно вызвалялася ад мытных падаткаў на ўсёй тэрыторыі ВКЛ, было падсудна толькі мясцоваму суду. Абавязковай аднак была гатоўнасць мясцовых баяр ваяваць на баку вялікага князя ВКЛ. Пры Вітаўце ВКЛ дасягнула росквіту сваёй магутнасці.

У 1504 г. утворана Полацкае ваяводства, у склад якога ўваходзілі некаторыя тэрыторыі сучаснага Шаркаўшчынскага раёна. Значная частка нашых зямель знаходзілася ў складзе Браслаўскага павета Віленскага ваяводства.

К гэтаму часу Вялікае княства Літоўскае стала магутнай дзяржавай з поліэтнічным насельніцтвам. Яно ахоплівала землі ўсёй сучаснай Беларусі, заходняй Украіны, Смаленшчыну. У 1323 г. Гедзімін перанёс сталіцу ВКЛ у Вільню. Гэта быў перыяд гаспадарчага і культурнага ўздыму дзяржавы. Нашы продкі мелі добра развітую пісьменнасць, распрацаванае заканадаўства. Усё жыццё дзяржавы рэгламентавалася гэтым заканаўствам (тры Статуты Вялікага княства Літоўскага — 1529, 1566, 1588 гг.) і фіксавалася ў дакументах, многія з якіх захаваліся да нашага часу («Літоўская метрыка»). Дзяржаўнае справаводства вялося на старабеларускай мове, якая з'яўлялася афіцыйнай у ВКЛ. Колькасна дамінавала беларускае насельніцтва, у культурным жыцці пераважаў беларускі элемент.

З увядзеннем ваяводстваў і намесніцтваў у ВКЛ умацоўвалася цэнтральная ўлада, складвалася своеасаблівая форма саслоўна прадстаўнічай манархіі, блізкая да еўрапейскіх дзяржаўных інстытутаў улады, развівалася шляхецкая дэмакратыя. Увесь працэс дзяржаўнага будаўніцтва спрыяў развіццю эканомікі і культуры. Геаграфічнае становішча Вялікага княства Літоўскага «на скрыжаванні Еўропы» накіроўвала гэта развіццё ў агульнаеўрапейскае рэчышча.

Галоўным сродкам вытворчасці на той час з'яўлялася зямля, а сельскагаспадарчая праца была асноўным заняткам абсалютнай большасці насельніцтва.

Пануючае становішча ў Вялікім княстве Літоўскім займалі землеўладальнікі — феадалы. Сярод іх выдзяляліся буйныя феадалы — радавітыя князі і магнаты, якім належалі цэлыя воласці (вотчыны). Далей ішлі баяры, абавязаныя несці вайсковую службу пры князю. Адны баяры валодалі зямлёй з правам на спадчыну, другія — часова, за службу. Трэція, бяднейшая частка, самі апрацоўвалі зямлю, неслі вайсковую службу, іх называлі шляхтай. Да сярэдзіны XVI ст. шляхта дабілася правоў спачатку на зямлю і асабістую недатыкальнасць, а потым і на займанне вышэйшых дзяржаўных пасад. Шляхтай пачалі называць усіх феадалаў.

На працягу XIV—XV ст. уся зямля ў Вялікім княстве Літоўскім перайшла ва ўласнасць феадалаў, а таксама царквы і, часткова, гараджан. Сяляне станавіліся толькі землекарыстальнікамі. У залежнасці ад таго, чыёй зямлёй яны карысталіся, сяляне падзяліліся на дзяржаўных (гаспадарскіх), прыватнаўласніцкіх і манастырскіх. За карыстанне зямлёй сяляне плацілі падатак (рэнту) у розных формах. Даніну збожжам, сенам называлі дзяклом, мясам, прадуктамі бортніцтва і палявання — мезлевам, а тых, што плацілі яе — даннікамі. Сялян, якія плацілі аброк грашыма (чынш), называлі асаднымі, а тых, што адбывалі панщчыну — цяглымі. У сярэдзіне XV ст. пачалося юрыдычнае афармленне прыгоннага права на Беларусі. У 1557 г. у

выніку правядзення вялікім князем Жыгімонтам II Аўгустам аграрнай рэформы, якая атрымала назву «валочнай памеры» (зямля дзялілася на валокі, валока налічвала 21,3 га), і прынятых неўзабаве статутаў аб дзесяцігадовым, а затым дваццацігадовым тэрміне вышуку збеглых сялян, прыгоннае права было канчаткова замацавана юрыдычна.

Развіццю эканомікі і культуры Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага перашкаджалі шматлікія войны. Ваенныя дзеянні разгортваліся на тэрыторыі сучаснага Шаркаўшчынскага раёна.

Па тэрыторыі нашага краю прайшло безліч ваенных паходаў. У XIII—XV ст. Вялікае княства Літоўскае супрацьстаяла безупыннай агрэсіі крыжакоў, аж да поўнага іх разгрому пад Грунвальдам у 1410 г. І кожны раз крыжацкія харугвы праходзілі па землях Падзвіння. Крыжакі прыходзілі сюды ў 1324, 1333, 1343, 1374, 1375, 1377 гг., што адзначаецца ў пісьмовых крыніцах. Рыцары-крыжакі былі пад сценамі Браслава і Дзісны, ішлі яны праз шматлікія вёскі. Зусім абгрунтавана можна сцвярджаць, што не абмінулі яны і тых паселішчаў, якія знаходзіліся ў нашай мясцовасці. Разбуральная вайна пакідала свае сляды па ўсім краі.

Нямала цярпела беларуская зямля ад частых набегаў крымскіх татар. Сваю крывавую даніну плацілі ім не толькі паўднёвыя і ўсходнія землі Вялікага княства Літоўскага. Гістарычныя звесткі даюць магчымасць меркаваць, што ў час некаторых сваіх набегаў у пачатку XVI ст. даходзілі крымчакі і да нашых мясцін. Ускоснае пацвярджэнне таму — назва вёскі Мамаі каля Глыбокага (параўнайце: хан Мамай). У адзін з самых спусташальных набегаў у 1505 г. ішлі яны да Мінска і далей — у напрамку Полацка, Друцка, Віцебска, пакідаючы за сабой абрабаваныя, спаленыя, разбураныя паселішчы, захопліваючы ў палон тых, хто выжыў.

З сярэдзіны XV ст. напружаныя адносіны пастаяннага саперніцтва складваліся паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай. Разпораз успыхвалі войны, у час якіх спрэчныя тэрыторыі пераходзілі з уладанняў аднаго княства ў другое. Такія ваенныя сутычкі неслі гора і разбурэнне беларускай зямлі і яе народу.

У XVI ст. адносіны паміж Вялікім княствам Літоўскім і Рускай дзяржавай вельмі абвастрыліся. Шматлікія войны спустошвалі беларускі край. Гісторыкі падлічылі, што ў XVI ст. у беларускай гісторыі было 40 ваенных гадоў. На працягу 35 з іх ішлі войны з Маскоўскай дзяржавай.

Ваяводы Васіля III вялі баі пад Беразвеччам у 1519 г. У 1558 г. пачалася Лівонская вайна, якая цягнулася 25 гадоў. Іван Грозны сам прывёў войскі да Полацка, у 1563 г. захапіў яго і адразу накіраваў вершнікаў і пешых воінаў па замерзлых рэках Дзвіне, Дзісне (Дзісенцы) і Бярозаўцы да Глыбокага. Гэты вогненны меч разрэзаў наш край. Тут, па рэках, устанавілася часовая граніца паміж Літоўскім і Маскоўскім княствамі. Такое становішча доўжылася да жніўня 1579 г.

Каб умацаваць свае пазіцыі і паспяхова супрацьстаяць агрэсіі з усходу, кіраўніцтва Вялікага княства Літоўскага вырашыла аб'яднацца з Польскім Каралеўствам. У 1569 г. у Любліне было падпісана пагадненне аб уніі. Абедзве дзяржавы аб'ядналіся ў адну — федэратыўную Рэч Паспалітую. Кіраваў ёю польскі кароль, які адначасова станавіўся і вялікім князем літоўскім. У сейме былі прадстаўлены як польскія феадалы, так і магнаты Вялікага княства Літоўскага. За апошнім захоўвалася яго назва, права выдаваць мясцовыя законы, мець унутранае кіраванне і судовыя органы, войска, чаканіць манету. Польскім феадалам і касцёлам цяпер не забаранялася набываць беларускія землі.

Аб'яднаныя войскі Рэчы Паспалітай вярнулі Вялікаму княству Літоўскаму яго былыя межы. 30 ліпеня 1579 г. князь ВКЛ і кароль польскі Стафан Баторый пераможна рушыў з Паставаў на Глыбокае, адтуль — на Дзісну, потым — на Полацк і далей на Пскоўшчыну.

Захаваўся дакумент, у якім размова ідзе аб перадачы каралём Рэчы Паспалітай Стафанам Баторыем некалькіх вёсак полацкім езуітам. У іх ліку — вёска Ігуменава.

Увогуле пісьмовыя звесткі аб землях і пасяленнях на тэрыторыі сучаснага раёна выяўляюцца з пачатку XVI ст. Гэта княжацкія граматы аб надзяленні зямлёй (воласцю) службовых асоб княства, а таксама купчыя на маёнткі, судовыя справы ды іншыя дакументы.

У XVI—XVIII ст. у нашым краі адзначаны рост і бурнае развіццё паселішчаў гарадскога тыпу — мястэчак. У іх канцэнтраваліся рамяство і гандаль. Развіваліся ганчарная, гарбарная, кавальская, сталярная, шавецкая, кравецкая справы. У мястэчках 1—2 разы на тыдзень праводзіліся кірмашы, а ў некаторых бывалі і штогадовыя кірмашы. Гандлявалі лёнам, пянькой, салам, мёдам.

У дакументах тых часоў упамінаюцца некалькі буйных мястэчак на тэрыторыі нашага раёна: Шаркаўшчына, Лужкі, Гарадзец, Германавічы, Ёды.

З XVI ст. да XVIII ст. тэрыторыя сучаснага Шаркаўшчынскага раёна дзялілася паміж Полацкім і Браслаўскім ваяводствамі. Мяжа ішла прыблізна па рэках Дзісенцы (Дзісне) і Бярозаўцы да Глыбокага. Горад Дзісна адносіўся да Полацкага ваяводства, мястэчка Шаркаўшчына — да Браслаўскага. Цэнтрамі адміністрацыйнага кіравання ўсёй падуладнай тэрыторыяй былі маёнткі. Так, уладару маёнтка Шаркаўшчына была падуладна тэрыторыя сучасных Станіславоўскага, Валожынскага і Ручайскага сельсаветаў. Германавіцкім уладальнікам Шырыным была падуладна воласць прыкладна ў межах сучаснага Германавіцкага сельсавета, Гарадзецкаму маёнтку — тэрыторыя сучаснага Лужкоўскага сельсавета.

Дакладная дата заснавання Шаркаўшчыны не ўстаноўлена, аднак вядома, што гэта адно з самых старадаўніх паселішчаў у паўночнай частцы Беларусі.

Упершыню маёнтак Шаркаўшчына згадваецца ў пісьмовых крыніцах у 1503 г. Ён быў размешчаны над ракой Янкай, за 58 вёрст ад Дзісны, адносіўся да Лонскай сельскай акругі, меў 1 дом, 33 жыхары.

У XVII ст. Беларусь заставалася плацдармам ваенных дзеянняў. Ад бясконцых вайсковых сутычак (з непрацяглымі замірэннямі) Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржавы разараліся гарады, мястэчкі і вёскі. Асноўны цяжар гэтых паходаў клаўся на плечы простаму люду. Для вядзення войнаў патрэбны былі сродкі, і ўрад Рэчы Паспалітай павялічваў падаткі і павіннасці насельніцтва. Гаротнымі і беднымі былі беларускія сяляне: сям'я, якая карысталася адной валокай зямлі, павінна была адпрацаваць на паншчыне 6 чалавекадзён кожны тыдзень летам і 4 чалавека-дні кожны тыдзень зімой.

У 1654 г. пачалася цяжкая і доўгая вайна, у час якой маскоўскія войскі зноў пакінулі вогненны след у нашым краі. Цар Аляксей Міхайлавіч, бацька Пятра I, паслаў ваяводу Шарамецева з чатырохтысячным войскам на Полацк, Дзісну, Друю і Глыбокае. Як бачна, шляхі рускага войска зноў прайшлі цераз нашу мясцовасць. Да Глыбокага дайшлі на гэты раз летам, 30 ліпеня. Але ўжо восенню наш край і Глыбокае былі адваяваны ў рускіх атрадам Валовіча. Баі з пераменным поспехам працягваліся яшчэ многа гадоў. Царскія войскі на сваім шляху руйнавалі гарады, вёскі, захоплівалі дабро. Людзей у вялікай колькасці забіралі ў палон. Па загаду цара Аляксея Міхайлавіча ў Маскоўскую дзяржаву вывозілі асабліва шмат рамеснікаў.

У 1657 г. наступілі надзвычайнае разарэнне і голад. Маскоўцы вывезлі

з Беларусі 300 000 палонных, людзей прадавалі ў рабства па 3 рублі за чалавека. Масцеравых людзей, розных умельцаў пакідалі ў Маскве, сялілі ў іншых гарадах. Дваране разбіралі іх сабе ў якасці халопаў.

Усё гэта выклікала на Беларусі адпор, вызваленчую барацьбу. Сяляне і мяшчане ўтваралі атрады самаабароны, каб ахоўваць вёскі і мястэчкі ад царскіх ратнікаў, не даваць людзей у палон.

Часам назіралася адваротнае. Сяляне, пакрыўджаныя ўласнымі землеўладальнікамі, паведамлялі рускаму камандаванню звесткі аб руху і стане ўласных войскаў, бралі ў палон салдат і афіцэраў і перадавалі іх рускім войскам.

У кастрычніку 1661 г. буйная групоўка рускіх войскаў пацярпела паражэнне каля Дзісны. Вядома таксама, што дзісенскія мяшчане ўзнялі паўстанне супраць рускіх войскаў і атрымалі перамогу над імі.

Аднак беларускія сяляне не дачакаліся з боку Масквы вызвалення ад феадальнага прыгнёту. У раёнах, якія занялі рускія войскі, царскі ўрад падтрымліваў мясцовых феадалаў; выдаваліся граматы аб захаванні і надзяленні прывілеямі беларускіх, а таксама польскіх і літоўскіх феадалаў, якія мелі маёнткі ў Беларусі. Сяляне ж заставаліся бяспраўнымі.

13-гадовая вайна пакінула ў Беларусі папялішчы. Дашчэнту былі разбураны і спалены сёлы і вёскі і ў Браслаўскім, Ашмянскім паветах. Моцна пацярпелі мястэчкі, гарады, скарацілася рамесная вытворчасць. Землі пуставалі, палі зарасталі хмызам і лесам, бо іх не было каму апрацоўваць. Загінула ці было вывезена ў палон больш за палову насельніцтва. Разбураную гаспадарку і дэмаграфічныя страты не ўдалося потым аднавіць і за стагоддзе. Памежныя паветы вызваляліся ад падаткаў, каб умацаваць эканоміку.

На беларускай зямлі разгортваліся падзеі Паўночнай вайны (1700—1721) паміж Расіяй і Швецыяй. Нашу мясцовасць яны закранулі таксама.

У 1704—1705 гг. Пётр I са сваім войскам бясчынстваваў у Полацку, забіваючы святароў у самой Полацкай Сафіі, спыняўся ў Глыбокім. У 1708 г. шведскі абоз на чале з Левенгаўптам, кіруючыся з Рыгі, рушыў праз Шаркаўшчыну на дапамогу Карлу XII. У абозе налічвалася 7000 вазоў, калі яго галава была ў Докшыцах, то хвост яшчэ ў Шаркаўшчыне.

Тры апошнія вайны нанеслі непапраўны ўрон беларускай дзяржаўнасці, беларускаму народу. У кожнай з іх гінула да паловы беларусаў, а ў некаторых паветах Полаччыны, Віцебшчыны і Магілёўшчыны не засталося ў жывых амаль нікога. Краіну спустошвалі таксама бясконцыя «магнацкія войны» — разборкі паміж Сапегамі, Агінскімі, Вішнявецкімі, Радзівіламі, Чартарыйскімі. Ворныя землі, дарогі зараслі лесам. На тэрыторыі раёна, напрыклад, у Пілацкім бары яшчэ ў 50-я гады XX ст. былі добра бачны межы, што раздзялялі калісь ворныя паляны. Са старажылаў ніхто не памятае і не чуў, калі на месцы гэтага векавога бору была ралля. Рэшткі межаў захаваліся і ў іншых лясах. Мясцовасць паступова засялялася занава. Пры гэтым месцамі выяўляліся рэшткі пасяленняў і пахаванняў. У Заборскім бары, да прыкладу, былі выяўлены пахаванні з вайсковым рыштункам. З пакалення ў пакаленне перадаюцца ўспаміны аб войнах, якія пракаціліся па нашай зямлі.

Пасля войнаў і спусташэнняў Вялікае княства Літоўскае страціла сваю магутнасць у параўнанні з Польскім Каралеўствам, якое не несла падобных страт. Таму на землях ВКЛ узмацнілася паланізацыя. Беларуская мова была выцеснена з дзяржаўнага ўжытку і заменена польскай. Многія шляхціцы беларускага паходжання пераходзілі ў каталіцтва, каб захаваць свой грамадскі статус. Такім чынам беларус-

кая культура страціла многіх выдатных творцаў — яны траплялі ў сферу польскай культуры.

Пасля заключэння ў 1596 г. Брэсцкай уніі, якая аб'яднала каталіцкую і праваслаўную цэрквы, у ВКЛ значная частка насельніцтва вызнавала уніяцтва. З пачатку XVIII ст. узмацніўся ўплыў каталіцкай царквы на беларускай зямлі. Будаваліся шматлікія касцёлы, манастыры, якія атрымлівалі вялікія зямельныя ўладанні, шмат прыгонных сялян. Асабліва значныя зямельныя ўладанні атрымаў ордэн езуітаў. Каталіцтва насаджалася нярэдка і сілай. Амаль усе школы і друкарні праваслаўных брацтваў былі закрыты ці разгромлены. Законам, выдадзеным у 1697 г., беларусам дазвалялася пісаць толькі па-польску ці на латыні. Забаранялася беларуская мова. Рабілася ўсё, каб апалячыць беларусаў, знішчыць беларускую народнасць.

Незадаволенасць феадальным і нацыянальным прыгнётам нярэдка выліваласяў стыхійныя выступленні сялянскай і гарадской беднаты, у паўстанні супраць феадалаў і тых святароў, што найбольш жорстка ставіліся да насельніцтва. Шматлікія народныя выступленні, паўстанні былі падаўлены. Гэта штурхала прыгнечаных людзей шукаць падтрымку ва ўсходняга суседа, што выкарыстоўвалася расійскім урадам у сваіх інтарэсах.

У гісторыі засталося сведчанне каталіцкага святара Станіслава Гурскага аб тым, што насельніцтва Беларусі цягнецца да пераходу на бок Масквы, таму што мае агульную з ёй мову, звычаі, рэлігію. А вясной 1651 г. з Дзісны ў Маскву прыбыў манах Анфінаген Крыжаноўскі. Ён аб'явіў сябе паслом ад усяго беларускага насельніцтва і паведаміў, што ў Беларусі «ўсіх чыноў людзі» жадаюць далучыцца да Расіі. У гэтым беларускія сяляне наіўна бачылі пазбаўленне ад феадальнага ўціску, які звязваўся ў іх свядомасці з польскімі феадаламі, з уладай Рэчы Паспалітай.

Пэўны перыяд адноснага міру ў XVIII ст. дазволіў адрадзіцца нашым гарадам, мястэчкам, сёлам. Менавіта ў гэты час разгортваецца манументальнае будаўніцтва сядзіб і храмаў на ўзроўні лепшых дасягненняў еўрапейскай культуры. Архітэктары стварылі непаўторную школу Віленскага барока. Каштоўнейшыя помнікі гэтага часу ў нашым краі захаваліся, на жаль, толькі ў Лужках ды Германавічах.

К канцу XVIII ст. Рэч Паспалітая аказалася ў глыбокім крызісе. Знутры яе разбуралі рэлігійныя канфлікты, супраціўленне паланізацыі, слабасць цэнтральнай улады. Аслабленая ў эканамічных і палітычных адносінах, раз'ядаемая канфліктамі, дзяржава не здолела выйсці з таго заняпаду, у якім апынулася на гэтым гістарычным адрэзку. Адбыліся тры падзелы Рэчы Паспалітай паміж Расіяй, Аўстрыяй і Прусіяй. У 1772 г., пасля першага падзелу, да Расіі адышла ўсходняя частка Беларусі, у 1793 г., пасля другога, — землі па лініі Друя — Пінск. Трэці падзел адбыўся ў 1795 г.: усе беларускія землі былі паглынуты Расійскай імперыяй.

Л.М.Лабачэўская.

Дакументы сведчаць

ГРАМАТА КАРАЛЯ СТАФАНА БАТОРЫЯ ДЗІСЕНСКАМУ ПАДСТАРОСТУ АСТРОЎСКАМУ АБ АДДАЧЫ ПОЛАЦКІМ ЕЗУІТАМ СЁЛ ІГУМЕНАВА, КАПАРОВІЧЫ І МАТЫРЫНА

8 лістапада 1583 г.

Стефан... (Т), подстаросте дисеньскому, пану Островскому, или кто на то время Дисну и село Игуменово, Копоровичи и Мотырино держат. Ознаймуем тебе, что мы, государь, имея на то видимости, и то хорошее, которое от продков наших, и. м. вел. кн. литовских и полоцких, также и от других людей добрых и богобоязненных к хвале божей и на службу его

святую поданы, к свецкому уживанью обернуты не были; а их бывший кашталян смоленский, староста дисеньский, небожчик пан Юрей Зенович села вышейменованые аж да живота своего держал; а по смерти его тые села поспол с Дисною к рукам нашим пришли: про то мы с. Игуменово, над р. Дисною лежачое, монастыря Мошонецкого Воскресенского, также с. Копоровичи и с. Мотырино монастыря св. Спаса игуменства Полоцкого, яко есьмо подали и фундовали на костел божий и на колегиум в Полоцку отцом езуитом вси добра игуменские и других все монатырей и церквей замка и мест Полоцких, кроме самого владычества, так и теперь умыслили и постановили, что те села отцом езуитом полоцким и ректором на то время будущим в силе, в держанье и в уживанье их подати и поступити. А для того посылаем вам коморника нашего Василья Ивашковича, которому рассказали, что те села вверху изменены с силы и с держанья вашего взяты и на костел отцом езуитом полоцким и ректорови их на тот час будучому поступить и их в то увязать: и вы бы о том ведаючи, сей воли и росказанью и тому коморнику нашему ни в чем противиться не смели, и те села, через то, больше ничем вступовати не важилися, конечне, под ласкою нашею, иначей того не чинячи.

Писан у Берестью лета 6 (ожьего) н(ароженья) 1583 месяца ноября 8 дня.
Лев Сапега, писарь

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1. С. 160.

Невядомая вайна (1654—1667)

...На наступны дзень мог пачацца штурм. Аднак маскоўскае войска не вытрымала і ўначы, ціха пакінуўшы свае ўмацаванні, стала ўцякаць да Полацка. Частка абозу і 2 гарматы былі кінутыя ў Чарэі. Астатнюю артылерыю пад аховаю дзвюх сотняў дваранскай конніцы і трох ротаў рэйтараў Хаванскі загадаў цягнуць іншай дарогай на Лепель — так бліжэй да Полацка, а сам з галоўнымі сіламі пайшоў на Чашнікі.

Сапега агледзеўся, што непрыяцель пакінуў Чарэю, і, калі Хаванскі адышоў ужо на 15 вёрстаў, паслаў наўздагон 3 тыс. жаўнераў на чале са сваім пляменнікам Крыштапам Сапегам. Яны дагналі непрыяцеля ўжо праз 25 вёрстаў і завязалі з ім бітву. Панёсшы страты, маскоўскае войска выставіла заслону ды паскорыла адступленне, але з тылу на яго ўвесь час насядаў пад'езд Сапегі.

Перад ракой Суя за 20 вёрстаў ад Полацка харугвы Крыштапа Сапегі зноў заатакавалі маскоўскае войска, зламалі рэйтарскую заслону і наляцелі на пяхоту. Толькі тое, што на дапамогу ім прыйшлі ўсе фарміраванні Хаванскага, дазволіла адбіць атаку і давесці пашматаныя палкі да Полацка. Страты апошняга бою былі значныя. Апрача забітых ратнікаў іх складалі і захопленыя ў палон палкоўнік рэйтараў Увараў, і полацкі ваявода ды палкоўнік Касоўскі, і ўся артылерыя, якую адбілі жаўнеры Сапегі. Ахова пакінула гарматы ды, шукаючы ратунку, схавалася за полацкімі ўмацаваннямі. Наогул, за час пераходу з Чарэі да Полацка групоўка Хаванскага настолькі страціла баявы дух, што калі б не выратавальныя сцены, гэтае войска можна было б браць ці не голымі рукамі.

На пачатку сакавіка 1661 г. Хаванскі з часткай войска пакінуў Полацк і пайшоў на Пскоў. Вярнуўся пад Полацк ён толькі ў ліпені. Маскоўскі ўрад тым часам спяшаўся ўмацаваць свае сілы на паўночнай Беларусі, у прыватнасці — полацкую залогу. У Тарапец і Вялікія Лукі быў высланы ваявода Юры Шахоўскі, які меў загад мабілізаваць не толькі служылых людзей і «недарасляў», але нават сялянаў сабраць «колькі можна». Шахоўскі ды Ардзін-Нашчокін з палком мусілі ісці на злучэнне з Хаванскім.

Пры зацішшы на галоўным тэатры вайны партызаны працягвалі дзейнічаць...

У траўні дайшло да пераносу ваенных дзеянняў на тэрыторыю Маскоўскай дзяржавы, прычым выконвалася гэта галоўным чынам сіламі партызанаў. Генерал артылерыі і навагрудскі кашталян Мікалай Юдзіцкі разаслаў лісты жыхарам Полацкага і Себежскага паветаў, у якіх казаў мужыкам збірацца ў аддзелы ды ісці вайною на Апоцкі і Пустаржэўскі паветы. І сяляне ўзняліся. Яны стварылі партызанскія

аддзелы па 500 і больш чалавек ды пачалі хадзіць пад Апочку і Пустаржэў, дзе чынілі значную шкоду краю, займалі сяленні ды нападалі на царскае войска. А Юдзіцкі збіраўся прывесці на дапамогу партызанам сваю конніцу.

Летам 1661 г. Хаванскі зноў зграмадзіў у Полацку вялікую армію. Абапіраючыся на фартэцыю, ён мог цяпер праводзіць мабільныя акцыі на абшарах усяго Падзвіння. Неаднаразова пабіты ваявода прагнуў баявога рэваншу. Войска Міхала Паца стаяла тады каля Друі, а дывізія правага крыла, якой кіраваў Мікалай Юдзіцкі, — паўз Дзісну. Каб здабыць інфармацыю пра баяздольнасць і намеры непрыяцеля, абозны Вялікага княства Літоўскага выслаў у канцы ліпеня пад Полацк моцны пад'езд на чале з ротмістрам Крыштапам Адахоўскім — 15 харугваў панцырных, што складала паўтары тысячы вершнікаў.

Неспадзявана з'явіўшыся каля Полацка, Адахоўскі пабіў ворага і нават узяў шмат «языкоў», ды пры вяртанні сутыкнуўся з маскоўскай пяхотай і пацярпеў паразу. Хаванскі пасля далучэння да яго палка Ардзін-Нашчокіна не стрымаўся і сам рушыў на войска Вялікага Княства. Цяпер ягоныя сілы па колькасці значна пераўзыходзілі дывізіі Сапегі і Паца. Маскоўская армія рухалася правым берагам Дзвіны проста на Дзісну, дзе стаяла войска правага крыла... Наблізіўшыся адна да адной, абедзве арміі гатовы былі да бітвы, але іх раздзяляла Дзвіна. Ратнікі Хаванскага хацелі дабудаваць мост, каб перабрацца на левы бераг, аднак туды паспелі падысці войскі Княства Літоўскага.

Абстрэльваючы іх з мушкетаў і артылерыі, царскае войска цэлы дзень спрабавала адкінуць гэтыя кволыя сілы ды ўсё ж пераправіцца цераз Дзвіну. На шчасце, пад вечар сюды прыйшла ўся дывізія правага крыла. Цяпер пра пераправу Хаванскага не магло быць і размовы. Больш за тыдзень царскі ваявода стаяў перад абозам, абстрэльваў левы бераг з гарматаў, а пасля павёў усю сваю армію назад да Полацка, каб перайсці Дзвіну там. Войска Вялікага Княства рушыла насустрач непрыяцелю і 27 жніўня спынілася на полі каля вёскі Палюдавічы. Праз дзень адсюль да Хаванскага выправіўся моцны пад'езд (блізу 4 тысяч коннікаў), які, аднак, вярнуўся ні з чым. Яшчэ праз колькі дзён ужо Хаванскі прыслаў сюды свой пяцітысячны пад'езд для выведкі. Усё скончылася сутычкай ды палоннымі з абодвух бакоў.

Якраз 6 верасня ў абоз пад Палюдавічы вярнуліся вайсковыя паслы з Варшаўскага сойму... 7 верасня пад Палюдавічамі пачала стварацца канфедэрацыя войска Вялікага княства Літоўскага. Праз 3 дні было абрана кіраўніцтва — маршалак Казімір Жаромскі, віленскі стольнік і 12 ягоных дараднікаў. Новы правадыр адразу выслаў моцны пад'езд конніцы пераймать царскую казну, а 19 верасня сканфедэраванае войска ўзялося дарабляць мост цераз Дзвіну і перапраўляцца на правы бераг — у стары лагер Хаванскага, пакінуты царскімі ратнікамі... Ледзь толькі паспела войска Жаромскага размясціцца ва ўмацаваным лагеры, як адразу з'явіўся і сам Хаванскі. Пасля дробных сутычак маскоўскія палкі адышлі ў бок Полацка. Лагер за час перадышкі быў умацаваны яшчэ лепш. Цяпер канфедэранты адчувалі сябе спакайней. Аднак колькасная перавага непрыяцеля не выклікала аптымізму: Хаванскі, аб'яднаны з Нашчокіным, меў не менш чым 20-тысячную армію, тады як пры маршалку Жаромскім было каля 12 тысяч жаўнераў.

Хутка канфедэранты неспадзявана панеслі значныя страты. Спачатку 14 кастрычніка быў разбіты пад'езд палявога пісара Катоўскага, з сямі ротаў якога тры ўцяклі, страціўшы свае штандары, а са склада астатніх большая частка вершнікаў трапіла ў палон. Затым 18 кастрычніка адбылася бітва галоўных сілаў. Шэсць разоў кідаючыся ў атаку, войска Вялікага Княства пераходзіла праз дзве ручаіны, якія раздзялялі пазіцыі арміяў. Колькасць забітых і параненых жаўнераў, страчаных коняў у той дзень засмуціла канфедэрантаў. Некалькі тыдняў пасля буйнай бітвы 18 кастрычніка Хаванскі не адступаўся ад лагера Жаромскага. Але на пачатку лістапада пад абоз канфедэрантаў падышла каронная дывізія Чарнецкага. Гэта радыкальна памяняла сітуацыю. Далучыліся таксама адданыя каралю роты Вялікага княства Літоўскага, якія ішлі пад Кушлікі з Янам Казімірам.

З прыходам падмацаванняў пад Кушлікі Жаромскі ды Чарнецкі з палкоўнікамі

правялі вайсковую нараду і пастанавілі ў першую ж ноч граміць Хаванскага. Планавалася, што за дзве гадзіны да світання ўся конніца і пяхота правага крыла на чале з маршалкам Жаромскім заатакуе маскоўскі абоз з фронту, а Чарнецкі са сваёй пяхотай і конніцай левага крыла наляціць з тылу. Аднак уначы з 3 на 4 лістапада атаку давялося на якую гадзіну адкласці, бо пяхота Чарнецкага была яшчэ не гатовая да бою. Калі ўжо пачынала развідняць, высветлілася, што маскоўскае войска выходзіць са свайго абозу, каб адступіць да Полацка. Тады маршалак Жаромскі адразу ж загадаў атакаваць. Конніца імкліва панеслася да апусцелага абозу непрыяцеля і праз густы туман не адразу прыкмеціла небяспеку, пакуль па ёй проста ва ўпор не адкрылі стральніны, прыладзіўшыся да рагацінаў, маскоўскія пяхотнікі. Каб адагнаць іх, спатрэбіўся агонь сваёй пяхоты. Магутным націскам харугвы канфедэрантаў і Чарнецкага двойчы спынялі рух усёй групоўкі Хаванскага і прымушалі яе адбівацца, а на трэці раз абарона маскоўскага войска была канчаткова зламана. Паводле словаў удзельніка той сечы Яна Пачобута-Адляніцкага, «нашы без разбору накінуліся на іх, змяшалі і... разарвалі іх шэрагі ды, на шаблі ўзяўшы, гналі іх, сякучы і забіваючы, да самага Полацка». Сам Хаванскі дабег да Полацка і стаў за Палатаю «с небольшими людми». Гэта быў поўны разгром арміі Хаванскага. У рукі пераможцаў трапіла больш за сотню баявых штандараў непрыяцеля, 5 татарскіх бунчукоў, мноства гарматаў і нават славуты абраз Багародзіцы, які быў пры ваяводу Нашчокіну. Сам Нашчокін паранены, выйшаў праз лясы Полацка праз чатыры дні пасля бітвы. Сын баярына і ваяводы Пётра Хаванскі трапіў у палон. Сярод палонных было яшчэ 8 палкоўнікаў, больш дзесяці ротмістраў, многа іншых афіцэраў — агулам блізу 400 чалавек.

Ужо на наступны дзень у абозе канфедэрантаў пад Кушлікамі з'явіліся паслы крымскага хана і ўкраінскіх казакоў, якія прапанавалі разам ударыць па Маскве. Але войска Вялікага княства Літоўскага адмовілася ад паходу. Праз два дні прыехалі каралеўскія камісары і агітавалі за тое самае, але зноў марна. Тым часам да войска вырушыў сам Ян Казімір, які ў дзень бітвы быў у Глыбокім ды там і даведаўся пра вялікапышную перамогу. Ужо 11 лістапада разам з канцлерам ён уязджаў у абоз пад Кушлікамі. Канфедэранты сустрэлі манарха спяваннем гімна ды гарматным салютам. Пад ногі яму кінулі 130 здабытых у непрыяцеля штандараў, татарскія бунчукі, іншыя трафеі. Паказалі палонных, наладзілі вялікі баль. Падставаў для радасці хапала: пасля разгрому Хаванскага і Нашчокіна можна было смела распачынаць паход на тэрыторыю Маскоўскай дзяржавы.

Аднак ні пафас перамогі, ні каралеўскія заклікі не змянілі цвёрдай пазіцыі канфедэрантаў, якія зноў адмовіліся ад паходу «на Маскву».

З Янам Казімірам яны не дазволілі ісці ніводнаму свайму палкоўніку. І збянтэжаны манарх мусіў павярнуць на Глыбокае, ды вяртацца ні з чым, прыхапіўшы з сабой самага важнага палоннага — сына ваяводы Хаванскага. А войска на наступны ж дзень згарнула абоз і пайшло пад Асвею, там размясцілася ротамі па вёсках для адпачынку. Зімой канфедэранты пакінулі Полаччыну і перайшлі на поўдзень Беларусі.

Вайна амаль спынілася. Па-ранейшаму дзейнічалі толькі партызаны ды паасобныя вайсковыя аддзелы, засланыя глыбей на акупаваныя землі. Вясной 1662 года пад Віцебскам быў разбіты значны маскоўскі пад'езд, які вёз хлебныя запасы з Полацка. А ў наступным годзе палачане і сяляне Полацкага павету разам з нейкім вайсковым аддзелам шматразова хадзілі супраць непрыяцеля на Невельшчыну.

Аднак царскія ваяводы валодалі тады яшчэ вялікімі абшарамі на Беларусі. Іхнае войска засталося... і ў Полацкім павеце. Яны ўтрымлівалі... і падзвінскія гарады Віцебск і Полацк.

Пачаліся дыпламатычныя перамовы. Усё, пра што ўдалося дамовіцца вясной 1662 года, гэта абмен палоннымі.

Полацкае ваяводства было адным з самых пацярпелых: тут засталася менш чым траціна ад колькасці даваеннага насельніцтва.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Сагановіч Г. Невядомая вайна (1654—1667). Мн., 1995. С. 99—100, 103—104, 106—112, 130.

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

У выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793 і 1795) спыніла сваё існаванне адна з самых буйных дзяржаў Еўропы. Каля 3 мільёнаў чалавек, якія пражывалі на тэрыторыі Беларусі, аказаліся ў складзе Расійскай імперыі.

Уключэнне беларускіх зямель у склад цэнтралізаванай дзяржавы з моцнай вярхоўнай уладай прывяло да пэўнай палітычнай стабілізацыі.

Адразу была праведзена царскімі ўладамі адміністрацыйная рэформа. Утвораны Дзісенскі павет ахопліваў тэрыторыі сучасных Шаркаўшчынскага, Міёрскага, Браслаўскага, Глыбоцкага і Пастаўскага раёнаў. Цэнтр павета — г. Дзісна. З 1795 г. па 1843 г. павет уваходзіў у склад Мінскай, а з 1843 г. — Віленскай губерняў.

Кожны павет падзяляўся на 6 ключоў на чале з войтамі, абранымі «из людей средних лет, но честных и зажиточных», з асяроддзя землеўладальнікаў або іх аканомаў. Войтам падпарадкоўваліся сотнікі і дзесятнікі, якія выбіраліся сялянскім мірам «из добрых и незазорных» сялян. Сотнікі абіраліся на 100—200 двароў, дзесятнікі — на 1—25. Войт павінен быў насіць знак арла, выбіты на жоўтай медзі і прышыты на правым баку грудзей. Сотнік атрымліваў доўгі кій з меднай круглай булавой на канцы, а дзесятнік — такі ж, але кароткі. Названыя асобы падпарадкоўваліся павятоваму камісару як прадстаўніку ўлады. Камісары прызначаліся з расійскіх афіцэраў і зацвярджаліся ў Сенаце.

У Дзісенскім павеце існавалі Глыбоцкі, Пастаўскі, Плісскі, Пагосцкі, Празароцкі, Лужкоўскі (Лужэцкі) ключы. У 30-я гады XIX ст. паветы былі падзелены на станы на чале з прыставамі. Паступова ў мясцовых органах кіравання ўводзілася руская

Карта Дзісенскага і Вілейскага паветаў Мінскай губерні. 1800 г.

мова, кіруючыя пасады займалі расійскія чыноўнікі. Замена шляхецкіх вольнасцей і самакіравання на самадзяржаўны дэспатызм закранала нацыянальныя пачуцці беларускай і польскай шляхты, прыніжала нацыянальны гонар. Патрыятычныя колы дварянства Рэчы Паспалітай не жадалі мірыцца з такім становішчам. Балюча перажывалі яны знікненне былой магутнай дзяржавы з палітычнай карты свету і бачылі адзіную магчымасць вярнуць былую славу Айчыны — паўстаць супраць расійскай акупацыі і прускай інтэрвенцыі.

У 1794 г. успыхнула паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. Яно было падрыхтавана шляхтай і вайскоўцамі, падтрымана мяшчанамі і сялянамі. У Польшчы на чале паўстання стаў Тадэвуш Касцюшка, у Беларусі — Якуб Ясінскі.

Дакументы таго часу, якія датычаць паўстання, маюць вельмі скупыя звесткі адносна нашай мясцовасці. Вядома, што паўстанцы хутка занялі Браслаў і ваколіцы яго. Як паведамляў імператрыцы Кацярыне II генерал-губернатар «мінскі, ізяслаўскі і брацлаўскі» Туталмін з Глыбокага, яго войскі не дапусцілі паўстання ў горадзе. Для падаўлення паўстання ў Браславе 9 мая з Глыбокага праз нашу мясцовасць былі накіраваны падраздзяленні расійскага войска. Атрад паўстанцаў быў разбіты.

Мясцовая шляхта падтрымлівала паўстанне грашыма і зброяй. Дарэчы, з дакументаў вядома, што Юзаф Мікалай Лапацінскі (1781—1835) быў жанаты з Даротай Марыконі, бацька якой удзельнічаў у паўстанні Тадэвуша Касцюшкі ў званні генерал-маёра. Паражэнне паўстання 1794 г. прывяло да 3-га падзелу Рэчы Паспалітай.

Пасля падаўлення паўстання адбываецца масавае разарэнне і распад вялікіх памешчыцкіх маёнткаў. Гэта сведчыць аб дыскрымінацыйных мерах царскіх улад супраць мясцовай эліты за ўдзел у паўстанні. Ужо ў 1801 г. Лапацінскія вымушаны прадаць Канаплянскім частку зямель маёнтка Шаркаўшчына і фальваркі Дварышча, Камарова, вёскі Забор'е, Каўшэлева і шмат іншых.

У 1802 г. адбыўся падзел маёнтка Шаркаўшчына паміж крэдыторамі на некалькі дробных частак. Узніклі новыя фальваркі: Лонск-Юзафова Рамановіча, набыты ім ад Уладзіслава Лапацінскага; Геленава (Галінова) — Аляксандра Шырына; Юльянова (Ульянова) і Базыльполле — Федаровічаў; Буда — Радзевіча; Мікалаёва — Клёта; Станіславова — Лапацінскага; Себастыянава (Себасцьянава) — Здраеўскіх. Тэрэзіянава (Тарзянова) у 1800 г. набыта баронам Янам Кнабнофам, пазней належала Ізабэле Свянціцкай; Пршэмысль, раней Канцы — Радкевічаў; Камарова — Канаплянскіх; Ракаўцы і Хіны — Багуцкіх, Свяцкія — Казіміра Федаровіча; Рачкі — Шымковіча; Крыўда — Рымшы; Багі — Галіноўскага. Сам Ян Лапацінскі ў спадчыну свайму сыну пакінуў маёнтак Шаркаўшчына з Юзафовам і Хінамі.

У 1807 г. Ян Лапацінскі перадаў Шаркаўшчыну і Юзафова сыну Тамашу, дзісенскаму віцэ-маршалку, а Хіны — Юзафу Лапацінскаму.

У 1814 г. Тамаш сваю частку прадаў Матэвушу (Мацвею) Багуцкаму, пасля смерці якога яна перайшла да яго сына Адольфа, пазней (у канцы XIX ст.) да ўнукаў Аляксандра і Роберта Багуцкіх. Хіны пазней перайшлі ва ўласнасць Фелікса Багуцкага.

Пачатак XIX ст. адзначаны ў гісторыі нашага краю разбуральным нашэсцем Напалеона.

Армія французскага імператара Напалеона I у ноч на 12 чэрвеня 1812 г. перайшла межы Расійскай імперыі паблізу ракі Нёман і пачала баявыя дзеянні. Свае першыя ўдары напалеонаўская армія абрушыла менавіта на тэрыторыю Беларусі. Супраць карпусоў маршалаў Ж.Мюрата, Л.Н.Даву, Н.Ш.Удзіно дзейнічалі дзве рускія арміі: 1-я пад камандаваннем генерала Барклая дэ Толі, якая дыслацыравалася ў Віленскай губерні, і 2-я на чале з генералам П.І.Багаціёнам, якая знаходзілася ў Гродзенскай губерні.

Рускія войскі адступалі. Ужо 16 чэрвеня салдаты корпуса Мюрата занялі Вільню, а 26 чэрвеня войскі маршала Даву ўвайшлі ў Мінск.

Як жа развіваліся падзеі ў нашым краі?

«Отступление 1-й западной русской армии к реке Двине совершено было тремя колоннами: главные силы следовали по дороге, ведущей из Свенцян на Видзы к Леонполю; вторая колонна из Солока — на Браслав к Друе, где переправилась на правую сторону Двины; третья — от Данишева через Козяны, к Старым-Крюкам,

близ Двины. Корпус графа Витгенштейна, переправившись у Друи 28 июня по трем мостам, двинулся вверх по правому берегу Двины и расположился против Леонполя; прочие войска направились к укрепленному Дрисскому лагерю.

На всем пути отступления русских войск от Свенцян к Дриссе французы преследовали их довольно слабо. Мюрат, двигаясь на Видзы, прибыл 1 июля к Замошью и присоединил к своим войскам боковые колонны Нея и Нансути, двигавшихся на Дрисвяты и Поставы; Удино, следуя из Солок, прибыл к Двинску. Вице-король двигался по направлению на Вилейку и Докшицы, куда прибыл 6 июля. Корпус Сен-Сира выступил из Вильны вслед за гвардиею, прибывшею в м. Глубокое в начале июля. Сюда же прибыл и сам Наполеон». (Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии. Витебск, 1896).

У канцы чэрвеня — пачатку ліпеня 1812 г. большая частка тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і наша мясцовасць, была акупіравана войскамі Напалеона. У губернях было ўведзена новае кіраванне. У ліпені Напалеонам было дэкларавана аднаўленне Вялікага княства Літоўскага, у якое ўвайшлі Мінская, Віленская, Гродзенская і Беластоцкая губерні. Тым не менш было ўведзена новае кіраванне. Прызначана новая адміністрацыя на месцах, якая складалася з палякаў і паланізаванага беларускага дваранства. У маёнтках, у тым ліку і ў Германавічах, у гонар Напалеона спраўляліся балі. Прыхільнікі Напалеона актыўна дапамагалі французскім ваенным уладам збіраць правіянт і фураж для арміі. Пастаўкі французскай арміі цяжкім грузам ляглі на мясцовае насельніцтва. Акрамя гэтых, узаконеных паборaў, сяляне цярпелі ад няспыннага рабавання вёсак, якое ўсюды ўчынялі на сваім шляху французскія войскі. Варожыя салдаты забіралі маёмасць і хатнюю жывёлу, коней, сена і салому, спусташалі засекі.

На сваім шляху французы часта спальвалі сялянскія хаты, млыны, іншыя пабудовы. З дамоў, дзе спыняліся на пастой французскія салдаты, яны выганялі гаспадароў, забіраючы ўвесь правіянт. Таму жыхары Беларусі аказвалі ўсебаковую падтрымку рускім войскам. Яны дапамагалі на пераправах цераз рэкі, забяспечвалі харчаваннем і фуражом, даглядалі параненых, збіралі звесткі пра непрыяцеля, былі праваднікамі і разведчыкамі.

Многія палкі і дывізіі рускай арміі былі сфарміраваны на тэрыторыі Беларусі і амаль цалкам складаліся з беларусаў. Праславіліся салдаты-беларусы і ў час Барадзінскай бітвы, і ў іншых баях.

Жыхары нашага краю прымалі ўдзел у будаўніцтве абарончых збудаванняў. Вялікая колькасць насельніцтва Дзісенскага павета была мабілізавана на будаўніцтва Дрысенскага лагера, які размяшчаўся на левабярэжжы Заходняй Дзвіны паміж г. Дрыса і в. Шатрова. Аб гэтым расказваецца ў кнізе Я. Карнейчыка «Белорусский народ в Отечественной войне 1812 года» (Мн., 1962). Сяляне секлі лес і ствалы дрэў з галінамі цягнулі да месцаў загароджванняў, капалі равы, узводзілі насыпы. На работу да лагера штодзён накіроўвалася 2500 чалавек, якія мяняліся праз тры тыдні.

Для стварэння запасаў правіянту ваеннае ведамства адкрыла ў губернях, дзе былі раскватараваны часці расійскай арміі, сетку правіянцкіх магазінаў. Быў адкрыты такі магазін і ў Дзісне.

У Беларусі пачала разгортвацца партызанская барацьба супраць чужынцаў. Многія сяляне пакідалі свае хаты, хавалі маёмасць, а самі ішлі ў лясы. Узброіўшыся сякерамі, віламі, дубінамі ды рагацінамі, яны нападалі на французскія абозы, невялікія атрады, на асобных салдат. Шырокі размах партызанская вайна набыла ў раёне Полацка, дзе былі размешчаны непрыяцельскія карпусы Н.Ш.Удзіно і Л.Гуўен Сен-Сіра і рускі корпус П.Х.Вітгенштэйна. Існуюць цікавыя паданні аб партызанскіх дзеяннях у гэтым раёне, запісаныя этнографам М.Шамішурам у мінулым стагоддзі і апублікаваныя ў 1870 г. Сярод іх і паданні аб смелых дзеяннях партызан на тэрыторыі нашага раёна. Вось адно з іх, якое прыводзіцца ў названай вышэй кнізе Я.Карнейчыка (с. 62).

«У вёсцы Варонках (цяпер Варонка) размясціўся на начлег моцны французскі атрад чалавек у 50. Аб гэтым паведамілі ў іншыя вёскі. Сабраліся самыя дужыя і смелыя мужыкі, узброіўшыся хто чым змог. Французы для свайго начлегу выбралі пуню, развялі непадалёку касцёр, паставілі ружжы ў казлы, паставілі двух вартавых і

самі паляглі на сена спаць. Адзін з сялян узяўся прыслужваць французам, прыносіў ім ежу, ваду і выглядваў размяшчэнне французскага атрада.

Калі наступіла ноч і французы захрапелі, сяляне кінуліся ў пуню, схапілі ружжы і напалі на французаў; толькі вартавы паспеў забіць аднаго селяніна. Ворагі Расіі былі знішчаны».

У лістападзе 1812 г. адступаючыя ў паніцы французскія войскі зноў праходзілі па тэрыторыі нашага раёна. Але гэта быў ужо спустошаны і выпалены вайной край. Жыхары пакутавалі ад нястачы і хвароб, шмат людзей загінула ў час вайны, памерла ад голаду і эпідэмій.

Атрады шляхты, якія выступілі на баку Напалеона, адступалі разам з французамі. У снежні 1818 г. паводле маніфеста аб'яўлялася амністыя жыхарам заходніх губерняў — удзельнікам вайны супраць Расіі — пры ўмове іх вяртання на радзіму на працягу 2 месяцаў (гэты тэрмін пазней быў прадоўжаны). Удзельнікам вайны супраць Расіі вярталіся канфіскаваныя альбо секвестраваныя маёнткі. На радзіму вярнулася многа адукаваных, здольных і энергічных людзей, якія патрэбны былі для ўмацавання магутнасці імперыі.

Надзеі беларускай шляхты на адраджэнне Вялікага княства Літоўскага, аднаўленне беларускай дзяржаўнасці не спраўдзіліся. Не спраўдзіліся і спадзяванні сялян атрымаць вызваленне ад прыгоннай няволі пасля перамогі над Напалеонам.

Сялянскае пытанне заставалася галоўным у грамадска-палітычным жыцці Расійскай імперыі. Прапановы аб вырашэнні яго, аб скасаванні прыгоннага права паступалі цару ад прагрэсіўна настроеных памешчыкаў, ад дзяржаўных дзеячаў. Але большасць памешчыкаў лічыла прыгоннае права асновай рацыянальнага гаспадарання на зямлі і не збіралася ад яго адмаўляцца. За сялянскі кошт жылі і карміліся дзяржава, шляхта, войска, царква. На іх карысць прыгонны адпрацоўваў шматлікія павіннасці. Галоўныя з іх — паншчына, дзякла і чынш. Першая была асноўнай для сялян цяглых (якія мелі коней), апошняя — для чыншавых. Дзякла ж, часцей за ўсё, дапаўняла гэтыя важнейшыя павіннасці.

Паншчыну адбывалі зімой і летам, мужчыны і жанчыны. На працу сяляне павінны былі выходзіць ці з рабочай жывёлай, ці без яе — па неабходнасці для кожнай гаспадаркі. Пачынаўся паншчынны дзень з узыходам сонца, заканчваўся, калі сонца заходзіла. Памешчыкі жорстка каралі сваіх падданых, калі тыя спазняліся ці не выходзілі на працу ў вызначаныя дні. Акрамя штотыднёвай паншчыны, сяляне выконвалі розныя адработачныя павіннасці — гвалты, талокі, згоны-работы, звязаныя са жнівом, сенакосам, узворваннем зямлі памешчыка. На работы гэтыя трэба было выходзіць усёй сям'ёй. Цяжкай для селяніна, яго сям'і, была падводная павіннасць: прыгонны абавязаны быў на сваёй рабочай жывёле ды «на сваёй страве» дастаўляць панскія грузы ці да бліжэйшай прыстані, ці ў гандлёвыя цэнтры, з нашых мясцін — часцей за ўсё ў Вільню, Рыгу. Падводная павіннасць на доўгі час адрывала ад работы на сваёй зямлі. Шмат часу займалі і іншыя адработачныя абавязкі: старажоўшчына (розныя гаспадарчыя работы ў двары памешчыка), начная варта панскага двара, шарваркі (рамонт, будаўніцтва дарог, мастоў, маёнткавых збудаванняў). Прыгонныя сяляне абавязаны былі спраўляць і шмат іншых работ на карысць свайго гаспадара.

Асобнае і даволі значнае месца ў павіннасным абкладанні сялян займалі грашовыя падаткі. Сярод іх на першым месцы стаяў чынш, які быў не лягчэйшым за паншчыну. Чыншавыя стаўкі былі высокімі, нямала трэба было пакласці сіл, каб гэтыя сродкі зарабіць. Акрамя таго, грашовыя ўклады сялян «сваім» панам павялічваліся за кошт самых разнастайных падаткаў. Іх налічваліся дзесяткі. Паншчыну і чынш дапаўняў стабільны прадуктовы аброк — дзякла. Былі і іншыя натуральныя паборы.

Нормы павіннасцей вызначалі інвентары. Але, як правіла, інвентарныя нормы паўсюдна парушаліся арандатарамі і адміністрацыяй маёнткаў. Зразумела, у бок павелічэння, на карысць землеўласніка.

Асноўная маса памешчыцкіх сялян карысталася зямельным надзелам, які на рубяжы XVIII—XIX ст. складаўся прыблізна з дзвюх аднолькавых частак: цяглай і прыёмнай доляў. За цяглую сяляне адбывалі прыгон, за прыёмную плацілі грашовы аброк. У працэсе расшырэння гаспадаркі абедзьве часткі надзелу спалучаліся, і з сялян сталі спаганяцца ў асноўным адработачныя павіннасці.

На працягу 1-й паловы XIX ст. ішоў паступовы працэс сялянскага абеззямельвання. За кошт сялянскіх надзелаў колькасць панскай ворнай зямлі імкліва расла, асабліва ў час падрыхтоўкі адмены прыгоннага права. Землеўладальнікі імкнуліся ў гэты час прысвоіць сабе як мага больш урадлівай зямлі, каб прымусіць потым сялян працягваць апрацоўку зямлі фальваркаў за адработкі ці арандаваць памешчыцкую зямлю на прымусовых умовах.

Землеўладанне на Беларусі мела буйнапамесны характар. Большасць сялянства належала дваранскаму саслоўю (да 80 працэнтаў). У канцы XVIII — пачатку XIX ст. латыфундыі паступова пачалі драбіцца на сярэднія і дробныя ўладанні. Да сярэдзіны XIX ст. памеры ўласнасці латыфундыстаў скараціліся прыкладна ўдвая і на столькі ж выраслa землеўладанне дробных і сярэдніх дваран. Тым не менш палову прыватнаўласніцкіх прыгонных на Беларусі трымала толькі 3,6 працэнта памешчыкаў, а 80 працэнтаў шляхты мелі ўсяго 16 працэнтаў сялян.

Шляхта дзялілася на ваколічную, чыншавую і неаселую. Ваколічная шляхта сялілася асобнымі засценкамі, абрубамі, валодала зямлёй і рэдка — сялянамі. Чыншавая, без сялян, арандавала зямлю ў памешчыкаў, дзяржавы ці духавенства. Неаселая шляхта займалася дробнымі промысламі, наймалася на гаспадарча-адміністрацыйныя пасады. Па свайму сацыяльна-эканамічнаму становішчу яна паступова збліжалася з сялянствам, страчвала некаторыя фармальна-юрыдычныя пазіцыі. Царскі ўрад імкнуўся выключыць незаможную шляхту з пануючага саслоўя дваран, пазбавіць яе саслоўных правоў і прывілеяў. Гэта рабілася шляхам так званага «разбору» праз праверку дакументальных правоў на сапраўднае дваранства, прымусовага высялення ў паўднёвыя губерні.

У 1829 г. былі створаны спецыяльныя камісіі, якія прапанавалі абкласці шляхту 12-рублёвым падымным падаткам, які плацілі сяляне, і прыцягнуць да 8-гадовай рэкрутчыны, неаселую шляхту прадугледжвалася пазбавіць права вольных пераходаў. На доказ саслоўных правоў адводзіўся год. Зразумела, такая палітыка ўрада выклікала незадаволенасць шляхты.

У пачатку XIX ст. у беларускім грамадстве яшчэ жывыя былі балючыя ўспаміны аб падзелах Рэчы Паспалітай і падаўленні паўстання пад кіраўніцтвам Т.Касцюшкі. Не выклікалі падтрымкі наступы царскіх улад на правы шляхты, асабліва дробнай, захады супраць уніяцкай царквы. Закрыццё польскіх каталіцкіх школ пры манастырах у 30-я гады XIX ст., стварэнне рускіх агульнаадукацыйных гімназій, павятовых, а затым і прыходскіх вучылішч прывяло да яшчэ большага аслаблення каталіцка-польскага ўплыву.

У тагачасным беларускім грамадстве расла незадаволенасць існуючымі парадкамі, непаслядоўнай палітыкай расійскага ўрада, у выніку якой многія балючыя пытанні не толькі не вырашаліся, але і паглыбляліся, зацягваліся ў небяспечныя вузлы. Усё больш акрэслена ўсведамлялася неабходнасць палітычных і эканамічных змен і, перш за ўсё, адмены прыгоннага права. Нізы нагадвалі пра гэта сялянскімі хваляваннямі і бунтамі, якія ўспыхвалі на Беларусі. У адукаванай частцы грамадства выспявалі думкі аб магчымасці вызвалення беларускіх сялян ад прыгоннай залежнасці. Абарона шляхтай сваіх правоў насіла антыпрыгонны характар і садзейнічала збліжэнню яе барацьбы з барацьбой сялянства супраць фальварачна-паншчыннага ўціску.

Ідэі нацыянальна-вызваленчага руху, барацьбы з расійскім самадзяржаўем, сацыяльна-эканамічных перамен сталі той глебай, на якой успыхнула паўстанне 1830—1831 гадоў.

Л.М.Лабачэўская.

Дакументы сведчаць

ПРАШЭННЕ ПАМЕШЧЫКА МАЁНТКА ГЕРМАНАВІЧЫ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА І. ШЫРЫНА АБ АДКРЫЦЦІ КІРМАШОЎ І ГАНДЛЮ Ў МЯСТЭЧКУ

4 студзеня 1828 г.

Всепресветлейший, Державнейший, великий государь Император Николай Павлович, самодержец всероссийский, государь всемилостивейший!

Просит Минской Губернии Дисненского Уезда помещик Иосиф Игнатьев сын Ширин, жительствующий онаго уезда в имении своем Германовичах, о нижеследующем:

1. Местечко Новые Германовичи, принадлежащее помещику Юстину Ширину, по прошению его Указом Минского Губернского Правления от 8 августа 1809 года последовавшим, в его существе утверждено, с предоставлением пользоваться служащими оному привилегиями, в отношении производившихся торгов и существования ярмонков.

2. Но как принадлежащая во владение мое другая часть того же местечка, называемого Старые Германовичи, в одной связи с оным состоящая, пресекающаяся токмо речкою Дисенкаю и пользующаяся тем же привилегийным правом, хотя и прежде возымело свое существование, доказывающее названием своим Старыми Германовичами, однако по ныне остается еще без утверждения со стороны Губернского Правления. Для того всеподданнейше прошу,

Дабы высочайшим Вашего Императорского Величества Указом повелено было сие мое Прошение в Минском Губернском Правлении, приняв, где следует, записать, и так как местечко Старые Германовичи, принадлежащее ко владению моему, состоит в половинной части и в одной натуре с утвержденным со стороны Губернского Правления местечком, называемым Новые Германовичи, то не оставить и оную часть, называемую местечко Старые Германовичи в сем его звании, его существование свое давнее еще от Новых Германович возымевшее — утвердить, с дозволением по привилегиям иметь в нем торги и ярмонки так точно, как сие право распространено на утвержденное в половинной части состоящее местечко Новые Германовичи. Для приведения же сего в надлежащее исполнение и для объявления мне, просителю, о том Дисненскому нижнему земскому суду Указом предписать

Ширин

Всемилостивейший Государь! Прошу вашего Императорского Величества о сем моем Прошении решение учинить. Генваря 4 дня 1828 года. — К подаче принадлежит в Минское Губернское Правление. — Прошение сие сочинял и переписал Колежский секретарь Федор Дружиляцкий.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 634. Л. 1, 2.

Паўстанне 1831 года ў Дзісенскім павеце

29 лістапада 1830 г. у Варшаве ўспыхнула нацыянальна-вызваленчае паўстанне супраць расійскага царызму. Яно пачалося паўстаннем школы падхарунжых, да якога далучыліся вайскоўцы, рабочыя і рамеснікі. Паўстанцы захапілі горад. 30 лістапада царскае войска пакінула Варшаву, а ў пачатку снежня і ўсю Польшчу. Значная частка расійскага войска была сканцэнтравана ў Беларусі.

За кіраўніцтва паўстаннем змагаліся розныя плыні польскага нацыянальнага руху: шляхецкія рэвалюцыянеры, якія адстойвалі лозунгі буржуазна-дэмакратычных пераўтварэнняў, і кансерватыўна-арыстакратычныя колы, якія ставілі сваёй мэтай толькі аднаўленне Польшчы ў межах 1772 г. Рэвалюцыйныя сілы Польшчы не змаглі ўзначаліць паўстанне. Падзеі развіваліся пад уплывам заможнай шляхты і арыстакратаў. Падрыхтоўку паўстання ў Беларусі вялі мясцовыя польскія і апалячаныя шляхціцы, інтэлігенцыя, афіцэры і чыноўнікі, каталіцкае і уніяцкае духавенства, спецыяльныя эмісары, высланыя з Варшавы.

Трэба адзначыць, што ў падручніках гісторыі гэтаму паўстанню мала ўдзелена ўвагі, значна менш, чым наступнаму паўстанню 1863 г. Архіўныя звесткі, наадварот, сведчаць, што паўстанне 1831 г. было найбольш масавым. Па Дзісенскім павеце паўстанцаў 1831 г. пайменна зафіксавана ўдвая больш, чым у 1863 г.

У студзені — лютым 1831 г. для падрыхтоўкі і кіраўніцтва паўстаннем на Беларусі і ў Літве быў створаны Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт, у якім пераважалі прадстаўнікі кансерватыўных колаў, у сакавіку 1831 г. паўстанне пашырылася на Літву і заходнюю частку Беларусі: Ашмянскі, Свянцянскі, Браслаўскі, Вілейскі і Дзісенскі паветы. У ім прыняло ўдзел каля 10 000 чалавек. Асноўнае ядро паўстанцаў складалі шляхта, навучэнцкая моладзь, афіцэры-палякі.

У Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Літвы захоўваюцца багатыя матэрыялы Камісіі, створанай для вызначэння ступені віны ўдзельнікаў паўстання 1831 г. На падставе гэтых матэрыялаў можна яскрава ўявіць, як праходзіла паўстанне на тэрыторыі Дзісенскага павета. Цэнтрам паўстання стала мястэчка Лужкі.

Падрыхтоўка да паўстання ў Дзісенскім павеце пачалася ў сакавіку 1831 г. Галоўны сакрэтны начальнік па падрыхтоўцы паўстання — памешчык з Ёдаў Аляксандр Лапацінскі. У мястэчку Шаркаўшчына 10

красавіка 1831 г. адбыўся арганізацыйны сход. Актыўны ўдзел у ім прынялі Адольф Багуцкі, Адольф Хомскі, Антон Корсак і іншыя. 11 красавіка ўсе яны прыехалі ў Лужкі, куды 12 красавіка з'явіліся юнкеры з Дзвінска і ўслед за імі некалькі памешчыкаў. У Лужках памешчыкі склалі першапачатковы акт польскай канфедэрацыі. 13 красавіка ў Лужках сабралася больш за 50 памешчыкаў. Яны склалі канчатковы акт канфедэрацыі (падрыхтаваны ксяндзом піяраў Адамам Татурам), далі клятву на агульнае паўстанне супраць Расіі для аднаўлення Польскай дзяржавы ў межах 1772 г. і ўтварылі ўрадавы (паўстанцкі) камітэт. Старшынёй камітэта быў выбраны былы маршалак дзісенскай шляхты Рамуальд Падбіпента, памешчык з Плісы. У склад урадавага камітэта ўвайшлі граф Аўгуст Бржастоўкі, граф Антон Шырын, памешчыкі Павел Міхалоўскі, Антон Корсак, Бенядзікт Кліёт і Фелікс Багуцкі. Кандыдатамі ў члены гэтага камітэта былі выбраны Фларыян Карказевіч, Ян і Нестар Буйніцкія, Адам Куроўскі, Ян Карпіцкі, Тамаш Мірскі, Канстанцін Валасоўскі, Адам Кастравіцкі.

Праз некалькі дзён быў складзены экзаменацыйны (следчы) камітэт, старшынёй якога быў прызначаны граф Міхаіл Храпавіцкі, але ён захацеў быць у войску, і на яго месца быў выбраны Пётр Вінча. Членамі следчага камітэта сталі Аўгуст Хомскі і Іосіф Корсак.

Для грамадзянскага кіравання паветам былі прызначаны каменданты і камісары.

Галоўным начальнікам паўстанцаў быў назначаны падпалкоўнік у адстаўцы Валенцій Брахоцкі, якога на гэту пасаду ездзілі запрашаць у Глыбокае Казімір Заліўскі і Аляксандр Лапацінскі. Намеснікам Валенція Брахоцкага быў прызначаны памешчык з Лепельскага павета Алёйзій Буйніцкі. Начальнікам кавалерыі паўстанцаў з'яўляўся граф Міхаіл Храпавіцкі, а пасля яго — Мікалай Кліёт.

Са зместу прадпісанняў, пасланых памешчыкам Дзісенскага павета 14 і 16 красавіка, і звароту да яўрэяў мястэчка Глыбокае ад 23 красавіка, бачна, што мэта паўстання заключалася ў аддзяленні ўсіх польскіх правінцый ад Расіі і далучэння іх да Каралеўства Польскага.

У звароце да сялян і іншых саслоўяў паўстанцкі камітэт аб'яўляў, што «в настоящее жалкое положение они приведены управлением России через чиновников, их притесняющих, 25-летнею военной службой и лихоимством во всех отраслях управления».

Для дасягнення мэты паўстання кожны павінен быў даць клятву «посвятить жизнь и имение, исполнять беспрекословно постановления конфедерации и ее повеления и для общего блага устраняя собственную любовь, отрекаясь от всех личных обид, с тем, что не будет желать никаких почестей и отличий, кроме только тех, к которым общее согласие или повеление установленного правительства призывать будет, а иначе поступая, признает себя заслуживающим наказания справедливого суда Божия и вольного народа, подвергая себя всеобщему пренебрежению».

Сродкі для дасягнення мэты паўстання вызначаліся прадпісаннем паўстанцкага камітэта ад 14 красавіка 1831 г. — каб кожны памешчык на другі дзень сам з'явіўся на кані ў Лужкі, са зброяй, даставіў разам з сабой з 7 рэвізскіх душ аднаго чалавека ад 18 да 40 гадоў, апранутага, з двухтыднёвым правіянтам, шляхта вакольчная з двух дамоў — аднаго ўзброенага кавалерыста з правіянтам.

У звароце да яўрэяў мястэчка Глыбокае ад 23 красавіка 1831 г. паўстанцкі камітэт заклікаў іх «к соединению всеми силами и способами к умножению вооруженной силы для упомянутого дела с тем, что и израильский народ, будучи преисполнен теми же чувствами, с нетерпением ожидает минуты воззвания себя к общей помощи и принесению пожертвований, какие в настоящих обстоятельствах суть необходимы». Далей у звароце гаварылася, што калі яўрэі не могуць паставіць са свайго асяроддзя воінаў-добраахвотнікаў, то няхай прынясуць добраахвотныя ахвяраванні ў грашах і рэчах — сукно, палатно, порах, свінец. Яўрэйскаму кагалу Глыбокага прапанавалася на першы выпадак ахвяраваць на ўтрыманне войска паўстанцаў па 30 капеек серабром з кожнай душы і даставіць у Лужкі, колькі можна, пораху, сукна на абмундзіраванне 18 юнкераў, якія паступілі з расійскага войска ў польскае.

Прадпісанні паўстанцкага камітэта, акт канфедэрацыі, клятва і зварот да яўрэяў былі разасланы па ўсім Дзісенскім павеце да камендантаў і камісараў ключоў.

Ім было загадана: «1) развезти или разослать по всем помещикам предписания Комитета и опубликовать акт Конфедерации и обращение к евреям; 2) пригласив священников, привести всех жителей к присяге, а евреев отослать для этого в м. Глубокое; 3) троекратно объявить в церквах и костелах акт Конфедерации, впушать крестьянам и другого сословия людям, что помещики сделали восстание не для иной цели, как только отыскания отечества и святости религии, равно законов, приличных вольному народу, и поправления состояния крестьян, которые приведены в жалкое состояние через рекрутство и вообще притеснительное управление чиновников; 4) высылать вооруженных людей, конных и пеших, по одному с 7 душ всех вообще имений, доставить магазины для содержания войска; учинить воззвание к помещикам и всем жителям о приношении добровольных пожертвований, поставить караулы от всякого ключа до главной квартиры, парядить внутреннюю стражу в отношении повиновения крестьян помещикам; наблюдать, дабы не были передерживаемы бежавшие из службы воинские чины, под ответственностью военного суда».

За невыкананне гэтых прадпісанняў камітэт пагражаў камісарам строгімі пакараннямі, аж да смяротнай кары.

Была выдадзена інструкцыя для вайскоўцаў, паводле якой патрабавалася захоўваць спакой і агульны парадак. Начальнік войска Брахоцкі ў свам загадзе ад 21 красавіка 1831 г. заклікаў усіх памешчыкаў выконваць рэквізіцыі і патрабаванні. Па яго распараджэнні ў Лужках былі пастаўлены шыбеніцы. Памешчыкам, якія знаходзіліся на вайсковай службе, Брахоцкі гаварыў, што ён іх не надзяляе чынам, каб яны былі да часу роўныя.

Вялікую дапамогу Лужэцкаму (Лужкоўскаму) паўстанцкаму камітэту ў арганізацыі войска аказаў Глыбоцкі кармеліцкі кляштар. Са сваіх маёнткаў ён паставіў 300 сялян, выдзеліў 6 ксяндзоў.

Сабраная паўстанцамі ўзброеная сіла была асвячона ксяндзом-піярам Адамам Татурам у Лужэцкім касцеле, тут было праведзена набажэнства. Паўстанцкі камітэт распрацаваў план дзеянняў па захопе Дзісны. 23—24 красавіка 1831 г. паўстанцы ў колькасці да 3000 чалавек выйшлі з Лужкоў на Дзісну. Было вырашана напасці на горад з трох бакоў (ад Дарожкавічаў, ад Мікалаева і з правага боку ракі Дзісна). Войска паўстанцаў было раздзелена на тры часткі. Коннікі Храпавіцкага вырваліся ўперад, але былі адбіты. Яны пацярпелі вялікія страты. 25 чалавек трапілі ў палон, астатнія ратаваліся ўцёкамі, пераплыўшы раку на конях.

Расійскія чыноўнікі і салдаты пачалі ўцякаць за Заходнюю Дзвіну. Многія з іх былі ўзяты ў палон. Горад Дзісна быў разрабаваны. У руках паўстанцаў ён знаходзіўся тры дні. Расійскае войска пад камандаваннем палкоўніка Макарава адбіла горад у канфедэратаў. На падаўленне паўстання сюды былі накіраваны буйныя сілы. Корпус Талстога заняў Друю, Дрысу і Полацк. З Дынабурга ішлі войскі палкоўніка Капеля. З Віцебска былі накіраваны сілы генерала Каблукова. З Відзаў на Новы Пагост ішло войска Кахоўскага.

Брахоцкі вырашыў даведацца аб сіле расійскіх войскаў, размешчаных на тэрыторыі Віцебскай губерні. Асаблівую надзею ён мсў на Лепельскі павет, на памешчыкаўбратоў Антона і Іосіфа Рэутаў, Валадковіча, Шчыта, Забелу і Антона Сяляву.

27 красавіка Брахоцкі паслаў пад кіраўніцтвам Іосіфа Сямашкі 25 вершнікаў у мястэчка Ушачы. Сюды яны прыбылі 29 красавіка і зрабілі разведку аб расійскіх войсках. Атрад быў прыняты з асаблівай радасцю памешчыкамі Забелам, Чаховічам і Любінскім. Сабраўшы неабходныя звесткі, атрад вярнуўся ў Лужкі.

Паўстанцы, выціснутыя з Дзісны Макаравым, а З мая генералам Саф'янавым з мястэчка Глыбокае вілейскія і ашмянскія паўстанцы, злучыліся зноў у Лужках, дзе не мелі ўжо падзеі ўтрымацца ў Дзісенскім павеце. 4 мая яны раздзяліліся на дзве часткі. Частка паўстанцаў пад кіраўніцтвам Ігната Адахоўскага накіравалася на ўсход для арганізацыі баявых дзеянняў каля Лепеля. Ім удалося захапіць Лепель, але ў хуткім часе каля вёскі Камень яны былі разгромлены войскам генерала Каблукова. Адахоўскі быў узяты ў палон.

План Брахоцкага заключаўся ў тым, каб сабраць больш войска і ісці ў Вількамір (цяпер г. Укмерге ў Літве) для злучэння з вількамірскімі паўстанцамі і разам рухацца да Вільні. Лужэцкі паўстанцкі камітэт хацеў трымаць войска на месцы для аб'яднання з паўстанцамі ў Лепельскім і

Барысаўскім павстах. Але Брахоцкі ўзяў войска і пайшоў праз Мосар у Браслаўскі павет, а адтуль далсіі, да Вількаміра, абяцаючы хутка вярнуцца, гаворачы, што робіць гэта для дабра іх саміх, а членам камітэта загадаў разыходзіцца.

Расійскія войскі пад камандаваннем М.М.Мураўёва (магілёўскага генерал-губернатара) у хуткім часе разгромілі паўстанцкія атрады. Прыбыўшы ў мястэчка Глыбокае 18 мая 1831 г., Мураўёў запрасіў туды памешчыкаў Дзісенскага павста, пікому не паказваючы сваіх сапраўдных памераў, з тым, каб даць час з'ехацца больш вінаватым. У Глыбокім было толькі два эскадроны гусар пад камандаваннем генералаў Каблукова і Гудовіча.

Пад старшынствам М.М.Мураўёва ў Глыбокім пачала працаваць следчая камісія вайсковага суда. Мураўёў пісаў, што мала заставалася людзей, не замешаных у паўстанні, што, апрача названых ім «самых злобных мятежников, и прочие помещики действовали с усердием, и хотя чувствовали нелепость своего предприятия, но не смели уже отстать, опасаясь мщения прочих». Правёўшы следства, Мураўёў адправіў у Дынабургскую крэпасць 15 чалавек, у т.л. старшыню паўстанцкага камітэта Рамуальда Падбіпенту, членаў камітэта — графа Аўгуста Бржастоўскага, графа Антона Шырына, Паўла Міхайлоўскага, Антона Корсака, Фелікса Багуцкага і Бенядзікта Кліёта.

У канцы жніўня 1831 г. паўстанне было разгромлена ва ўсіх павстах Беларусі і Літвы, а затым і ў Польшчы. Асноўнай прычынай няўдачы паўстання было тое, што яно не абапіралася на шырокія масы сялян, якія заставаліся ў баку ад паўстання. Большасць сялян і мяшчан былі мабілізаваны ў паўстанцкія атрады сілай. Упэўніўшыся, што паўстанне ім нічога не дае, сяляне пакідалі атрады. Шляхецкае кіраўніцтва не ставіла задачы ліквідацыі прыгонпага права і таму не атрымала падтрымкі з боку сялян.

Пасля падаўлення паўстання многія яго ўдзельнікі былі аддадзены пад суд. Кіраўнікі паўстання Валенцій Брахоцкі, Адам Татур, Аляксандр Лапацінскі былі прыгаворапы да пакарання смерцю. 72 чалавекі былі асуджаны ваеннымі судамі да зняволення ў турме г. Мінска, 23 адпраўлены ў турму г. Пскова. Частка паўстанцаў эмігравала ў Заходнюю Еўропу і Паўночную Амерыку. Сярод эмігрантаў былі 52 удзельнікі паўстання ў Дзісенскім павеце. Большасць з іх ніколі не вярнулася на радзіму.

К.Л.Кожан.

* * *

У «Деле по Дисненскому уезду» дадзены спіс мяцежнікаў, заверапы генералмаёрам Сафапавым і калежскім рэгістратарам Гаховічам. У спісе 116 прозвішчаў, ураджэнцаў нашага раёна 15.

У спісе многа палкоўнікаў пяхоты па капі. І нічога невядома аб складзе саміх палкоў. У дакументах фіксаваліся прозвішчы толькі кіраўнікоў атрадаў і службовых асоб — магнатаў, «урадоўцаў» і шляхты. Не названы прозвішчы 27 юнкераў. Прозвішчы сялян не фіксаваліся. Іх секлі бізунамі, ссылалі на катаргу або высялялі ў Сібір. Лік паўстанцаў па павеце называецца то 2000, то 3000, нават 5000 чалавек.

З азначапых дакументаў вынікае, што змову арганізавалі Лапацінскія, сабраўшы паўстанцаў у Шаркаўшчыне, адкуль накіраваліся ў Лужкі. 12 красавіка прыбыло падмацаванне з Дзісны. 13 красавіка было ўжо 50 камандзіраў (з прыслугай і палкамі). Камітэт у Лужках узначаліў генерал Рамуальд Падбіпента. Збіралі па 2 злотыя з душы па рыштунак і зброю. Здавалі ахвотна, апроч памешчыка Самуйлы, за што яго абрабавалі. Для грамадзянскага кіравання тэрыторыяй былі прызначаны камісары: Глыбоцкага ключа — Іосіф Ляскоўскі, Празароцкага — Ксаверый Твардаманскі, Лужэцкага — Замоскі, Пагосцкага — Ян Канаплянскі, Займоўскага — Флярыян Кліёт, Галомыслаўскага — Гіляры Якавіцкі, Пастаўскага — Мікола Абрамоўскі, Курылаўскага — Якавіцкі, Пліскага — Нестар Буйніцкі.

Пакуль паўстанцы былі ў Дзісне, да іх далучыліся групы пяхоты лікам 3 тысячы і конніцы пад камандай Барткевіча, выціснутыя з Ашмян і Вілейкі генералам Саф'янавым.

Выціснутыя з Дзісны і Глыбокага, 4 мая паўстанцы раздзяліліся на 2 групы: адна праз Мосар і Шаркаўшчыну пайшла ў Браслаў на злучэнне з вількамірскімі паўстанцамі. Другая (2 тысячы чалавек) накіравалася ў Лепельскі павет.

Пасля падзелу, не бачачы перспектывы, мужыкі і шляхта пачалі разыходзіцца па дамах, знішчаючы і хаваючы сваю зброю, што большай часткай складалася з пік і ружжаў. Тыя, што пайшлі ва Ушачы і Ка-

мень, былі разагнаны рускімі палкамі з дапамогай гармат, схаваліся ў лясах Дзісенскага, Лепельскага і Барысаўскага павстаў[1].

Мураўёў паведамляў: «Адольф Багуцкий явился ко мне, сделав чистосердечное признание, обнаружил все тайные заговоры... Доминик, Адольф и Генрих Конопляпские возвратились в имения. Предложено оставить их под надзор полиции на верном поручительстве, сделав соответствующее взыскание»[2]. Далей пералічваецца 30 чалавек з іншых раёнаў.

24 мая 1831 г. 8 чалавек, кіраўнікоў паўстання, «удаляются» з павета (у турмы Дынабурга і Мінска).

Прыняты меры па вышуку паўстанцаў рукамі тых, хто ўжо здаўся. Для гэтага павет раздзелены на кварталы, прызначаны памешчыкі, адказныя за квартал. Яны абавязаны затрымліваць «шапкі» ці паведамляць камендапту аб іх з'яўленні, інакш адкажуць самі па ўсёй строгасці ваеннага часу. Вось пералік начальнікаў кварталаў: «В ключе Лужсковском: начальник ключа подполковник Лопатьев, начальники кварталов: Игнатий Ширин, Гриневский, Замский (управитель имения Игуменово), Антоний Русецкий, Иван Томашевский... В ключе Погостском: начальник Александр Шавман, начальники кварталов: Мазевский, Иван Винча, подкаморий Волоховский, Иосиф Дмуховский, Бернард Федорович[3].

У «Показаниях письмоводителя дисненского исправника Антона Францев сын Святогора» названы прозвішчы 104 паўстанцаў.

14.8.1831 г. Донесение: «Среди крестьян распространен панический слух, что отряды повстанцев собираются сжечь урожай и разграбить села. Крестьяне закапывают в землю хлеб и имущество... Поводом якобы послужило недавнее сборище гостей у помещиков соседних Виленского и Дисненского уездов Шишко, у последнего поводом сборища служило совершеннолетие его дочери, было более 200 гостей, многие из-за границы. У Шишки и Ваттена приготавливаются боевые и обмундированные припасы...»[4].

«Канцелярия Минского губернатора. Дело о розыске шляхтича Лясковского, распространявшего слухи среди польских плепных (паўстанцаў. — *У.Л.*) о жестоком обращении с ними русских властей. Организовал близ Смолевич побег плепных». У справе 11 лістоў. Яна пачата 2.6.1833 г., закончана 15.8.1833 г. Падазраваемы Іван Ляскоўскі, жыхар Дзісенскага павета, а таксама Вікенці, Кароль, Пётр, Андрэй, Фартунат Ляскоўскія. Маюцца паказанні васпапалопнага Войцеха Чарвінскага і інш. Але не злоўлены[5].

У справе сабраны паручыцельствы за кожнага арыштаванага паўстанца.

Так, за Шырыпа Антона, што ўтрымліваўся ў Мінску, сабрана сто подпісаў аўтарытэтных людзей, дзе падпісанты гарантуюць, што Шырып Антон нікуды з Мінска без дазволу адлучацца не будзе[6].

Корсак Антоні з Чарнсвіч з'ехаў у Прусію, адтуль — у Амерыку. Яму забаронена назаўсёды вяртацца ў Расію.

Інструкцыя адносна эмігрантаў прадпісвала:

«Для людей, собственным трудом сыскивающих себе пропитание, то имущество оставить в пользу его семейства, если походит из дворян или другого высшего сословия, то недвижимое имущество и движимое имущество обратить в казну»[7].

«Клёт Леопольд, Николай, Игнатий, Михаил, Генрих — бежали, с раскаиванием к законному правительству не возвратились. Имущество взять в секвестр. Если появятся — арестовать...»[8].

Клёт Рудольф і Іван, Аўгустаў сын, з'ехалі за мяжу. Маёнтак бацькі Аўгуста не канфіскавалі, абавязаўшы яго падпіскаю нічога не перасылаць сынам, «дабы не была часть его имения, причитающаяся сынам, конфискована».

За былымі паўстанцамі здзяйсняўся пільны нагляд. Удзельнік паўстання Казімір Федаровіч звяртаўся да ўладаў у 1840 г. па дазвол паехаць у госці да родзічаў у Гродзенскую губерню. Канцылярыя вілепскага грамадзянскага губернатара паведамляе гродзенскаму губернатару аб паездцы Федаровіча. Канцылярыя гродзенскага губернатара даводзіць заданне персапальна: двум гродзенскім паліцмайстрам, шасці гарадпічым, васьмі спраўнікам павстаў «О слежке за оным». Адказныя штодзённа пішуць даносы: дзе, калі, да каго і ў колькі гадзін Федаровіч зайшоў у дом, у колькі гадзін выйшаў.

Цікавы дакумент, які паказвае, як улады і праз 30 гадоў не забываліся пра з'ехаўшых за мяжу мяцежнікаў.

«О незаконном свершении панихиды 24 мая 1861 г. в м. Деречин под Сапегом Евстафием, умершим за границей.

Панихиду заказали: Станислав Юндзилл (уладальнік маёнтка Юндзілава на мяжы Шаркаўшчынскага і Міёрскага раёнаў. — *У.Л.*) и Яким Чудовский. Совершили 10 ксендзов Слонимского монастыря, на катафалке под балдахином, пустым медным гробом. При гробе стояли 4 молодых ассистента, в черных фраках с трехцветными — ружового, синего и белого цвета — лентами на плечах. Пред гробом был портрет покойного, а под балдахином рисовался вырезной герб его, внизу коего прикреплена трехцветная кокарда, а в середине польский белый серебряный орел. По окончании богослужения помпезит и ксендзы отправились на обед к местному ксендзу, который длился от 1 до 6 вечера»[9].

Пасля задушэння паўстання адразу (у 1832 г.) была закрыта школа піяраў у Лужках, а з 1839 г. забаронена беларуская уніяцкая вера. Маёнткі асуджаных былі секвестраваны і распрададзены.

Крыніцы:

[1]Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 561. Воп. 1. Спр. 1. Л. 16, 18, 20—22.

[2]Там жа. Л. 23, 29.

[3]Там жа. Л. 38, 42.

[4]Нацыянальны гістырычны архіў Беларусі. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 3670. Л. 30.

[5]Там жа. Ф. 215. Воп. 1. Спр. 392.

[6]Там жа. Ф. 561. Воп. 1. Спр. 1. Л. 100.

[7]Там жа. Ф. 561. Воп. 1. Спр. 3. Л. 10.

[8]Там жа. Л. 12—15.

[9]Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна. Ф. 1. Воп. 20. Спр. 302.

[10]Там жа. Ф. 1. Воп. 22. Спр. 1231.

Падрыхтаваў У.К.Ляскоўскі.

Дакументы сведчаць

УДЗЕЛЬНІКІ ПАЎСТАННЯ 1831 г. З ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

Абрамоўскі Мікалай, грамадзянскі камісар Пастаўскага ключа. (Ключ — адміністрацыйная адзінка. — *У.Л.*)

Бржастоўскі (з Мосара), граф, узначальваў камітэт паўстанцаў.

Буйніцкі Ян, в. Акунёва Глыбоцкай воласці.

Буйніцкі, былы прадвадзіцель (маршалак) дваранства.

Буйніцкі Нестар, грамадзянскі камісар Пліскага ключа.

Брахоцкі, з Глыбокага, генерал паўстанцаў.

Баярскі, з ніжняга земскага суда.

Багуцкі Адольф з в. Чырвоны Двор каля Шаркаўшчыны. У сувязі з павіннай М.М.Мураўёў не пазбавіў волі.

Барташэвічы, засядацелі, палкоўнікі на конях.

Вазгірд Пётра, засядацель былога галоўнага суда 2-га дэпартамента названы палкоўнікам, удзельнік захопу Лужкоў, м. Красная Гара.

Вазгірд Зігмунд, удзельнік захопу Лужкоў.

Вінча, з Літоўшчызны.

Вінча, пяхота.

Вінча, пяхота.

Ваініловіч, з Узрэза (Узрэчча. — *У.Л.*), пяхота.

Валынскі Мірка, ксёндз ордэна кармелітаў з Глыбокага, вайсковы капелан паўстанцаў.

Гурскі, клерк Глыбоцкага кармеліцкага манастыра.

Дуніловіч, пржэсар дамініканскага манастыра.

Давсійка, былы суддзя дэпартамента, палкоўнік на кані.

Дамейка, суддзя, пяхота.

Дамейка, падкаморы з ЦІЦ, пяхота.

Дмахоўскі Генрых, маёнтак Забалацце.

Доманд, засядацель, палкоўнік на кані.

Дубашчынскі, з Барышкевіч, пяхота.

Дубашчынскі з Міёр, пяхота.

Дубашчынскі, з Зябак.

Ейсмунд, маршалак (прадвадзіцель) павятовага суда, палкоўнік на кані.

Ейсмунд, засядацель, палкоўнік на кані.

Замскі, камісар грамадзянскай управы Лужэцкага ключа.

Зяновіч Ян.

Казакевіч Адольф Іванавіч, з фальварка Нізіны (за 2 км ад Новага Пагоста), падлетак, пад нагляд паліцыі.

Канаплянскі Генрых Якаўлевіч, падлетак, пад нагляд паліцыі.

Канаплянскі Дамінік Іванавіч, падлетак, пасаджаны ў Дынабургскую крэпасць, вызвалены пад нагляд паліцыі.

Канаплянскі Іван (Ян) Францавіч, з Нізіны, камісар Пагосцкага ключа, пасаджаны ў Дынабурскую крэпасць, вызвалены.

Канаплянскі Бенядзікт Фелікcавіч, падпісаў акт канфедэрацыі. Пад нагляд паліцыі, не дапускаць да службы, да выбараў без высзду. (Фальваркі Канаплянскіх: Забор'е, Бардзенцы, Дварышча, Нізіна).

Клёт Венядзікт, былы прадвадзіцель Дзісенскага межавага суда, член камітэта паўстанцаў.

Клёт (Кліот), засядацель, пяхота.

Клёт (Кліот) Фларыян, грамадзянскі камісар Заімоўскага ключа.

Клёт (Клот) Леапольд. З'ехаў у Паўночную Амерыку.

Клёт (Клот) Мікалаі, удзельнік Дзісенскаі бітвы, з'ехаў за мяжу, маёмасць секвестравана.

Клёт (Клот) Ігнацы. Удзельнік Дзісенскаі бітвы. З'ехаў за мяжу, маёмасць секвестравана.

Клёт (Клот) Міхаіл. Удзельнік Дзісенскаі бітвы. З'ехаў за мяжу, маёмасць секвестравана.

Клёт (Клот) Генрых. Удзельнік Дзісенскаі бітвы. З'ехаў за мяжу, маёмасць секвестравана.

Клёт (Клот) Іван Аўгуставіч. З'ехаў за мяжу. Бацьку яго, Клоту Аўгусту, пазбавілі права дапамагаць сынам.

Клёт (Клот) Рудольф Аўгуставіч, з'ехаў за мяжу.

Корсак Антон, былы падсудак, з Чаркевіч, член камітэта паўстанцаў. З'ехаў у Прусію, затым — у Амерыку. Забаронена вяртанне ў Расію.

Корсак, з Пятроўшчыны.

Корсак, з Дольца, палкоўнік на кані.

Корсак з Узрэза, пяхота.

Корсак.

Корсак, камендант у Глыбокім (сын з Пятроўшчыны).

Корсак, камендант у Лужках (бацька з Пятроўшчыны).

Корсак, клерк Глыбоцкага кармеліцкага манастыра.

Куроўскі Міхаіл, член камітэта паўстанцаў.

Каркузовіч Фларыян, член камітэта паўстанцаў.

Косаў, падкаморы, палкоўнік на кані.

Косаў, харунжы, палкоўнік на кані.

Кіркаговіч Фларыян, пяхота.

Казакевіч, пржэсар Глыбоцкага манастыра. (У яго знойдзена да 200 гарматных ядраў).

Лапацінскія Станіслаў і Людвіг — браты павятовага прадвадзіцеля. Арганізавалі сходку ў Шаркаўшчыне, удзельнікі захопу Лужкоў.

Лапацінскі, граф з Юдзіцыны (6 км ад Ёд), пяхота.

Лапацінскі, граф з Ёд, пяхота.

Лапацінскі, граф з Рафалова, пяхота.

Лапацінскі, граф, прадвадзіцель дваранства Дзісенскага павета, палкоўнік на кані.

Лапацінскі, граф з Забелліна, палкоўнік на кані.

Лапацінскі, граф з Варонкі, палкоўнік на кані.

Ляскоўскі, з Гарадка, зяць Баярскага.

Ляскоўскі Іосіф Фларыянавіч, падпісаў акт канфедэрацыі, грамадзянскі камісар Глыбоцкага ключа, змешчаны пад нагляд паліцыі, не дапускаць да службы.

Міганоўіч Станіслаў, падсудак хомскі, удзельнік захопу Лужкоў.

Міганоўіч, з Мікалаёва, пяхота.

Мазуркевіч, аканом маёнтка ў Лужках, засядацель Яраслаўскага ніжняга земскага суда.

Міхайлаўскі, з Караўшчызны.

Мірскі, былы прадвадзіцель, пяхота.

Мірскі, з Пагоста, пяхота.

Мірскі, камендант у Дзісне.
Мастоўскі, граф з Лучая, пяхота.
Окушка, з Барыл, пяхота.
Падбіпента Рамуальд, генерал, былы дзісенскі прадвадзіцель дваранства, узначальваў камітэт паўстанцаў.
Пілецкі, дазорца, пяхота.
Плятэр, з Лужкоў, сакратар камітэта паўстанцаў.
Плятэрова, памешчыца з м. Лужкі, цэнтр паўстання.
Прэсмыцкі, з Валкалаты, пяхота.
Пятроўскі, з Мінеты, палкоўнік на кані.
Руткоўскі, клерк Глыбоцкага кармеліцкага манастыра.
Самуйла, з Дольца, палкоўнік на кані.
Станілевіч, з Латылі, пяхота.
Станілевіч, з Латылі, пяхота.
Скорык, з Заварта, пяхота.
Святагор Антон Францавіч, пісьмавадзіцель дзісенскага спраўніка. Назваў следству 104 удзельнікаў паўстання.
Татур, ксёндз Лужкоўскага піярскага манастыра, член камітэта паўстанцаў.
Твардоманскі Ксаверы, грамадзянскі камісар Празароцкага ключа, удзельнік захопу Лужкоў.
Тызенгаўз, граф з Паставаў, генерал паўстанцаў.
Федаровіч, з Шаркаўшчыны, пяхота.
Храпавіцкі Міхаіл, граф, былы прадвадзіцель губернскага межавага суда, удзельнік захопу Лужкоў.
Храпавіцкі, былы маршалак, палкоўнік на кані.
Харэвіч, з Карабоў.
Цыбульскі Якаў, удзельнік захопу Лужкоў.
Чарахоцкі, галоўнакамандуючы паўстанцаў, арандатар маёнтка Глыбокае, адстаўны палкоўнік польскай службы.
Чарташэвіч Едвар, удзельнік захопу Лужкоў.
Чумаскі, з Мінеты, засядацель, палкоўнік на кані.
Чумаскі, з Мінеты, рэгент, палкоўнік на кані.
Шырын Антон, былы павятовы харунжы, член камітэта, заключаны ў Мінскую турму.
Шырын (Сірын), з Парсава.
Шырын (Сірын), з Белага Двара, палкоўнік на кані.
Яцкоўскі, засядацель Дзісенскага ніжняга земскага суда.
Ябманава Вераніка, «девица из имения Миколаев». Забіла 2-х і ўзяла ў палон 3-х казакоў.
Яцына, з Варапаева, палкоўнік на кані.
Янушэўскі, з Дунілавіч, пяхота.
Якавіцкі Гіляры, грамадзянскі камісар Галомыскага ключа.
Якавіцкі, грамадзянскі камісар Курылаўскага ключа.
Ксёндз Лужкоўскага дамініканскага манастыра, сакратар камітэта паўстанцаў.
Глыбоцкі уніяцкі святар, шпіён мяцежнікаў, капелан вайсковы.
Глыбоцкі каталіцкі святар, чытаў «возмутительные воззвания» з кафедры.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 215, 295, 299, 561, 694, 1297, 1430.

Падрыхтаваў У.К.Ляскоўскі.

ВЫПІСКА З ЗАГАДУ БРАХОЦКАГА

27 красавіка 1831 г., Дзісна

Г-н Семашко, взяв отряд кавалерии, составленный из 25 человек, выступил с ним на дорогу, проходящую от Дисны на Ушачь. Цель настоящей его командировки есть та: дабы узнать, находится ли в Ушачах или где-либо на дороге оттуда к Дисне неприятель, а потому г-н Семашко никаким другим предметом кроме сего заняться не может, а как сия высылка его довольно важна для общих усилий с ним, определена до отдельной его команды, отданной в распоряжение г-на Семашко из молодых помещиков, а именно г. фердинанда Мирского, Иосифа Лопатинского, Цириана Длужневского и Казимира Лопатинского — г-н Семашко имеет данную от меня инструкцию касательно особого Его действия; поелику же единствен-

ная цель сего отряда есть, дабы узнать о неприятеле, затем повелеваю молодежи помещиков, дабы они никаких других действий не предпринимали, руководствуясь во всем одними только распоряжениями Семашко.

Подписано: предводитель войска Брохоцкий — к сему отряду прикомандировывается еще Михаил Семашко.

Пераклад з польскай мовы А.Глазко.

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 437. Воп. 5. Спр. 81. Л. 3.

ВЫПІСКА З ПАКАЗАННЯЎ ДЗІСЕНСКАГА МЕШЧАНІНА, ЖЫХАРА МЯСТЭЧКА ГЛЫБОКАЕ, ЯЎРЭЯ ЛЕЙБЫ МОЎШАВІЧА ФРУМАНА

4 і 5 мая 1831 г., Віцебск

В Лужецком польском Военном комитете, учрежденном в монастыре Кармелитском, присутствовали тогда: 1-й арендный владелец м. Глубокого, служивший в Варшавском войске полковником, которого ныне называют генералом и командующим мятежническим войском, г. Брохоцкий, 2-й — бывший Дисненский маршал Буйницкий, 3-й — бывший маршал дворянства помещик имения Сельцы и м. Плиссы Подбипента, 4-й — помещик имения Прозороки граф Храповицкий, 5-й — Дисненский помещик граф Бржостовский, 6-й — помещик, владелец имения Петровщизна Корсак и 7-й — некто из фамилии Плятер, которого имени он, Фруман, не знает — сии главные члены Комитета явившимся в оный из местечка Глубокого кагальному школьнику Абраму Шейдеровичу и еврею Хацкелю Янкелевичу предлагали: чтобы означенного местечка еврейское общество для первого случая пожертвовало на содержание польских войск деньгами по 30 копеек серебром с каждой души и доставило, сколько можно, пороху, но когда отозвались Шендерович и Янкелевич, что пороха не могут они нигде достать, а деньгами вспомочь не могут по бедности, в то время предложено было им, чтобы доставлено было сукно на обмундирование 18 юнкеров, поступивших из Российского войска в Польское, почему они, Шендерович и Янкелевич и не смели уже отказать в таком требовании и по возвращении в м. Глубокое объявили о сем еврейскому Кагалу, а оный с тем же школьником сукно в Комитет доставил, но сколько мерою аршин и какого сорта, ему, Фруману, неизвестно, а знает он о том, что по распоряжению упомянутого Комитета, собрано в м. Лужки немалое число шляхты и крестьян, вооруженных саблями, пистолетами, но большею частью пиками и косами, приклепленными к длинным шестам. В состав сего мятежнического ополчения помещики и духовенство католическое из имений своих давали пятого человека из каждого имения — всякий владелец на продовольствие того числа людей, какое поставил в мятежническое ополчение, доставляет для них из собственных магазинов или искупивши провиант вперед на каждые 10 дней.

Верно: Коллежский Регистратор (подпись)

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 437. Воп. 5. Спр. 81. Л. 4.

ВЫПІСКА З ПАКАЗАННЯЎ ІГНАЦЫЯ АНТОНАВІЧА КОРСАКА, ПАМЕШЧЫКА ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

20 мая 1831 г.

Главным начальником был Валентий Брохоцкий, потом назначил заступать свое место Алёёзия Буйницкого. Начальник Брохоцкий говорил всем помещикам, находившимся в военной службе, что он их не производит еще в чины, а чтобы они были до времени равными, — он был и в Дисненском сражении.

Верно: Коллежский Регистратор (подпись)

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 437. Воп. 5. Спр. 81. Л. 7.

ВЫПІСКА З КОПІІ ПАКАЗАННЯЎ ІОСІФА СЯМАШКІ, ПАМЕШЧЫКА ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

20 мая 1831 г.

Прибыли ко мне в имение мое Мнюту из Лужек конфедераты Линевич или Илинич с другим, которого не упомню, с приказанием, ему данным от Брохоцкого, чтобы я сейчас явился в Лужки по объявлении мне сего и стращании пистолетами, отправился я вслед за ними один верхом и, прибыв в Лужки, явился к Брохоцкому; он мне приказал находиться в Лужках. На другой или на третий день после сего мне велено принимать кантонистов и шляхту, поступающих в повстание в находиться мне под командою графа Михайлы Храповицкого.

Когда я не соглашался на сие, Брохоцкий говорил, что вы будете под арестом, а после того знаете, что будет с вами, то я после сего начал принимать сих кантонистов. Брохоцкий по прибытии с повстанцами в Германово (Германовичи) приказал мне следовать в Николаево под Дисну и ожидать его там, куда он прибывши 24 мая и переночевавши, пошли в Дисну и я с ними. В Дисне хотел он меня по просьбе моей отпустить, но после дал приказ от 9 мая (27 апреля) с 25 кавалерийскими повстанцами следовать в Ушачь, как видно из приложенного подлинного приказа Брохоцкого.

Возвращаясь из Ушача, встретили некоторых возвращавшихся из Дисны повстанцев, которые сказывали, что уже наши вышли из Дисны обратно в Лужки, куда и мы пришли. По прибытии Брохоцкого явился к нему и донес об исполнении приказа его и просил об увольнении меня домой, он не соглашался на мою просьбу об увольнении меня, но когда помещик здешний Длужневский начал просить и представлять ему, Брохоцкому, что мой дом только от Лужек в 10 верстах, он отпустил меня только на три часа.

Верно: Коллежский Регистратор (подпись)

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 437. Воп. 5. Спр. 81. Л. 5.

ВЫПІСКА З ПАКАЗАННЯЎ АЛЁЙЗІЯ БУЙНІЦКАГА, ПАМЕШЧЫКА ЛЕПЕЛЬСКАГА ПАВЕТА

23 мая 1831 г.

По присланным ко мне троекратно от Брохоцкого приглашениям явиться в Лужки для учреждения Конфедерации и повстания — я того не исполнил по причине моей в то время болезни, а уже за третею присылкою приехал в Лужки 22 апреля, где по составлении присяги, оную подписал, принял назначенную мне обязанность заступать место Брохоцкого и он мне дал от себя подробные наставления и повелел слушаться комитета, а сам Брохоцкий отправился чрез Германовичи в Дисну, а при отъезде обещал возвратиться чрез четыре дни, сказав только, что едет в Германовичи для усмирения раскольников и вообще бродяг.

Верно: Коллежский Регистратор (подпись)

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 437. Воп. 5. Спр. 81. Л. 9–10.

ВЫПІСКА З ПАКАЗАННЯЎ ПАЎСТАНЦА КАЗІМІРА ЗАЛІЎСКАГА

25 мая 1831 г.

Александра Лопатинского из Иод видел я 3 апреля и вместе с ним ездил в Глубокое к Валентию Брохоцкому для приглашения его принять Главное начальство над повстанцами, ибо я был прежде с ним знаком, чем Александр Лопатинский, который Брохоцкого ещё не знал; пробывши у Брохоцкого часа три, ночью возвратились опять вместе в Игуменово, откуда Лопатинский тотчас поехал в Иоды домой.

Подтвердил сие показание Адольф Богуцкий, со своей стороны присовокупил, что Александр Лопатинский не был знаком с Валентием Брохоцким, пока его Заливский не познакомил.

Верно: Коллежский Регистратор (подпись)

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 437. Воп. 5. Спр. 81. Л. 8.

ВЫПІСКА З РАПАРТА ВІКЕНЦІЯ ВІНЧЫ, ПАМЕШЧЫКА ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА, МАГІЛЁЎСКАМУ ГРАМАДЗЯНСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ

25 мая 1831 г.

В сходство словесного требования Вашего превосходительства, дабы объяснил: по чьему повелению построены в местечке Лужках шибеницы, сим почтеннейше честь имею донести, что шибеницы построены в Лужках чрез экономию Лужецкую по приказанию помещиков: Брохоцкого, Антония Корсака и Ромуальда Подбипенты.

Засвидетельствовал: чиновник для особых поручений Сапковский.

Верно: Коллежский Регистратор (подпись)

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 437. Воп. 5. Спр. 81. Л. 9.

РАПАРТ ДЗІСЕНСКАГА ЗЕМСКАГА СПРАЎНІКА МІНСКАМУ ЧАСОВАМУ ВАЕННАМУ ГУБЕРНАТАРУ КНЯЗЮ ДАЛГАРУКАВУ

10 чэрвеня 1831 г.

Толпа злоумышленников мятежников овладела первоначально м. Лужки помещицы Плятэровой. Был составлен Комитет, в который вошли помещики: граф Бржестовский, быв-

ший Дисненский предводитель дворянства Рамуальд Падбипента, бывший предводитель Дисненского межевого суда Венсдикт Клиот, бывший поветовый харонжий Антон Ширин, б. подсудок Антон Корсак, Михаил Куровский, Флориян Каркузович и Лужецкого пиярского монастыря ксендз Татур. В толпе участвовали лица: арендователи владелец им. Глыбокого отставной полковник польской службы Брахоцкий именуется главнокомандующим, б. предводитель Губернского межевого суда граф Михаил Храповицкий и бывший главного суда 2 Департамента заседатель Пётр Вазгиро (Вазгирд. — *У.Л.*), именующийся полковником, названием Урядов участвуют уездного предводителя родные братья Станислав и Людвиг Лопацинские, Станислав Михайлович подсудок Хомский, Зигмунд Вазгир (Вазгирд. — *У.Л.*), Едвар Чартошевич, Дрисенского повета Ксаверий Твардоманский, Полацкого и Дисенского Яков Цибульский, равно насильно под страхом смерти увлекают протчих помещиков и шляхту, которые не успели из своих поместий устраниться и всех вообще приводят к присяге на верность конфедерации, обучивают к военному действию собранную толпу людей, бежавших из Дисны 18 человек юнкеров, и Дисенского нижнего земского суда заседатель Яцковский.

По слухам известно, что девица Вероника Ябманова была первым орудием к умерщвлению двух и взятию в плен трех казаков. 2-х казаков звала в свои комнаты в имении Миколаев для угощения их вином и там убиты.

Управляющий имением Лужки Ярославского нижнего земского суда заседатель Мазуркевич в многих предметах вспоможествовал мятежникам.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 561. Воп. 1. Спр. 1. Л. 9.

ВЫПІСКА З ПАКАЗАННЯЎ ПАМЕШЧЫКА АДОЛЬФА БАГУЦКАГА

16 ліпеня 1831 г.

Войском командовал Брохоцкий, но имел ли он какой план, не знаю. Во время сражения в Дисне, где находился Храповицкий и Томаш Лопатинский, первый начальником конницы, а другой — пехоты, я не был, а после того же дня и я прибыл с начальником другой части конницы и пехоты Брохоцким.

Верно: Коллежский Регистратор (подпись)

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 437. Воп. 5. Спр. 81. Л. 11.

ВЫПІСКА З ПАКАЗАННЯЎ ВІКЕНЦІЯ ВІНЧЫ, ПАМЕШЧЫКА ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА, СЛЕДЧАЙ КАМІСІІ Ў МІНСКУ

16 ліпеня 1831 г.

В Дисненском сражении не был, а пришел туда после — с Брохоцким, где застали Храповицкого, занявшего Дисну.

Верно: Коллежский Регистратор (подпись)

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 437. Воп. 5. Спр. 81. Л. 11.

АБ КАРНАЙ МІСІІ М.М.МУРАЎЁВА Ў ГЛЫБОКІМ У ЧАС ПАДАЎЛЕННЯ ПАЎСТАННЯ 1831 г.

Здесь (Глубокое) проживал в мае 1831 года Михаил Николаевич Муравьев, занимаясь восстановлением в Дисненском и северной части Борисовского уездов законного порядка и допросами шляхты, затевавшей восстание Речи Посполитой...

О пребывании Муравьева в м. Глубоком сохранилось у дисненских помещиков много преданий, представляющих Муравьева по большей части в виде грозного судьи, наведшего ужас на всех своими суровыми приговорами, и передающих, что с прибытием в местечко комиссии военного суда, бывшей под его председательством, мирное обиталище кармелитских отшельников превратилось в местопребывание страшного инквизиционного судилища. В действительности же дело происходило несколько иначе: никакой комиссии военного суда тут не было, а был один только Муравьев с советником Зайковским и секретарем Лиорко, записывавшим показания, а иногда исполнявшим обязанности переводчика. О пребывании Муравьева в м. Глубоком заслуживает особого внимания рассказ современника, который во время пребывания Муравьева в Глубоком находился безотлучно при нем. «Я присутствовал, — говорит Пиккорнелли, — при многих допросах помещиков, приводимых к Муравьеву, а их перебывало около тысячи. Находясь в полном вооружении и при заряженном пистолете, я обязан был во время допросов стоять в стороне между инсургентом и Муравье-

вым, для охранения его в случае, если бы опрашиваемый вздумал прибегнуть к какому-либо насилию. Но ничего подобного не случилось, а Муравьев не имел надобности в моей защите. Днем и ночью, в котором бы то ни было часу, как только привозили кого-либо из арестованных, нужно было тот час же доложить Муравьеву, а если он спал, то разбудить, и примера не было, чтобы он поленился встать или отложил допрос до утра. Заботливость его и ласковое обращение со своими подчиненными были превыше всяких похвал. Все окружавшие не могли надивиться его неутомимости и долготерпению при разспросах виновных: он видимо бывал доволен, когда отвечали ему смело и откровенно, хотя бы и резко, лишь бы говорили правду, но к несчастью это случалось не всегда...».

Действиями М.Н.Муравьева (бывшего тогда могилевским губернатором и состоявшего при главнокомандующем резервной армией гр. Толстом) законный порядок был возстановлен. Прибыв в м. Глубокое 18 мая, М.Н.Муравьев пригласил туда владельцев, не показывая никому настоящих своих намерений, с тем, чтобы дать время съехаться более виновным. В Глубоком было только два эскадрона гусар. Произвев дознание, М.Н.Муравьев дозволил помещикам разъехаться по домам, отправив 15 человек из оных в Динабургскую крепость.

«Дух в помещиках, — писал Михаил Николаевич Клейнмихелю, — значительно улучшился (после отправления некоторых в крепость); они увидели, что с ними не шутят и вдруг сделались усердны... Дворянство даже собственным своим побуждением просило меня об единой милости: дозволить им изложить в особом акте изображение чистосердечного своего раскаяния».

Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии. Витебск, 1896. С. 109.

З ПАВЕДАМЛЕННЯ МІНСКАЙ КАЗЁННАЙ ПАЛАТЫ МІНІСТЭРСТВУ ФІНАНСАЎ АБ КАНФІСКАЦЫІ Ў ПАЎСТАНЦА АЎГУСТА ХОМСКАГА МАЁНТКА МАЧУЛІШЧА

12 снежня 1834 г.

1. Будынкі. У маёнтку Мачулішча знаходзяцца: жылы дом (3 пакоі), людская, свіран, сцены на млын, пабудовы для вінакурні, карчма, два гаспадарчыя будынкі.

2. Колькасць душ і двароў:

дваровых (прыслуга) — 1 муж., 1 жан.; сялян — 25 муж., 25 жан.; цяглых — 7 двароў.

3. Колькасць і якасць зямлі:

Двараваі ворнай зямлі 1 1/2 валокі, сенажаці 1 валока, пад зараснікам, лесам і мохам — 6 валок 23 1/2 маргі. Разам 9 валок 8 1/2 маргі.

Сялянскай: ворыва і сенажаць — 5 валок 7 1/2 маргі. Глеба зямель наогул нізкая, балоцістая, да ворыва цяжкая і для ўрадлівасці ненадзейная. Лесу 1 валока, асобна дрывянога — 6 маргоў, ды высечанага пад борць — 1 валока. Усяго лесу 2 валокі, 6 маргоў. Разам 16 валок 22 маргі.

4. Асабістыя павіннасці сялян:

а) *Паншчына.* Кожны цяглы дом (замест трох мужчынскіх і трох жаночых дзён на тыдзень) павінен адпрацаваць паншчыны па два мужчынскія пешыя і з запрэжкай па панядзелках і серадах, і два жаночыя дні па аўторках і чацвяргах, з тым, што эканомія можа раздзяліць па чатыры, нават на шэсць дзён тыдня, размеркаваўшы работу, што належыць па інвентару на адзін дзень, у першым выпадку — на два, а ў другім — на тры дні, не пераводзячы аднак дзён паншчыны з аднаго на другі тыдзень і не прымушаць сялян да адпрацоўкі ў другі дзень, калі ў дзень паншчыны якога-небудзь дома здарыцца надвор'е, што не дазваляе весці работу, або каторы захварэе і ў сям'і ягонаі не будзе работніка, які мог бы яго замяніць; наадварот, калі на дзень паншчыны выпадзе свята, то кожны павінен адпрацаваць паншчыну ў першы ж сялянскі дзень, на работу высылаць са скацінай і іншай прыналежнасцю, а для адпачынку работнікаў і жывёлы даецца час на сняданак, палуднак і падвячорак.

б) *Гвалты.* Цяглыя сяляне абодвага полу ад 17 да 50 гадоў, выключаючы наёмных, павінны адбыць за год з кожнага дому (замест 12) шэсць гвалтовых дзён.

в) *Шарваркі.* Шарваркавых дзён (лік якіх не быў вызначаны) назначана з цяглага дому па дзесяць за год з тым, што яны не павінны патрабавацца для гэтага ў час палявых работ, апрача выпадкаў, якія не церпяць ніякага адкладу.

г) *Падарожчына.* Цяглыя сяляне абавязаны даць фурманкі для адвозкі аканамічных здабыткаў да г. Полацка і да іншых месцаў. На адпаведнай адлегласці зімоі па добраі дарозе, укладаючы на параконную фурманку ад 16 да 25 пудоў, а на аднаконную — па адпаведнасці таго, праязджаючы за суткі ад 30 да 40 вёрст, а ўсе дні, што прабудуць у дарозе, залічыць у паншчыну.

д) *Варта*. Цяглыя сяляне павінны быць выкарыстаны на варту па чарзе днём, з залікам у паншчыну; а начны каравул для аховы будынкаў і збожжа павінны адбываць без заліку.

е) *Жаночыя работы*. Жанчыны абавязаны ў залік паншчыны прасці воўну і лён, а без заліку ў паншчыну садзіць, паліваць, палоць агародніну і стрыгчы авечак.

ж) *Земскія павіннасці*. Усякую павіннасць, г. зн. фурманкі для праходзячага войска і іншыя патрэбы, сяляне павінны адбываць па чарзе са сваіх дзён без заліку ў паншчыну.

з) *Рэчавая даніна*. Курамі і яйкамі знішчана. Камісія і палата далі дазвол сялянам, звыш наяўнай у іх зямлі, карыстацца агульнай пашай.

5. Разлік даходу:

а) Ад пасеваў азімага жыта 12 чвэрцяў, лічачы на прыбытак 3 зярняты і ацэньваючы чвэрць жыта ў 2 руб. серабром, налічана за 36 чвэрцяў па 2 руб., за кожную — 72 руб.

б) за ярыну — таксама — 72 руб.
в) за 70 вазоў сена — 20 руб. 50 к.
г) за адзін агарод — 8 руб.
д) арэнды з карчмы — 12 руб.

Усяго — 184 руб. 50 кап.

6. Разлік расходу:

На жалаванне гуменнаму — 3 руб.
На жалаванне гаспадыні — 2 руб. 10 кап.
Харчу ім — на 16 руб. 90 кап.
На канцылярскія прыпасы — 1 руб.

23 руб.

Рэшта чыстага прыбытку — 161 руб. 50 кап.

Па даведцы аказалася:

1. Мінская казённая палата ад 1 кастрычніка 1832 г. прадставіла вопіс фальварка Рожанполь, што знаходзіцца ў маёнтку Мачулішча, для пражывання сястры мяцежніка Рожы Хомскай; з вопісу бачна:

1. Будынкі. Панскі дом (4 пакоі), дом для чэлядзі.

Колькасць душ і двароў.

2. Дваровых (чэлядзі) — 3 муж., 3 жан.

Сялян — 12 муж., 9 жан. Цяглых — 3 двары.

3. Колькасць і якасць зямлі.

Двароваі ворнай зямлі 12 маргоў (апрача гэтага 24 маргі назначаны да распрацоўкі пад ворыва).

Сенажаці — 2 маргі, лесу — 3 валокі. Разам — 3 валокі 14 маргоў.

Сялянскай зямлі: ворыва — 2 валокі 15 маргоў, сенажаці — 1 валок. Разам — 3 валокі 15 маргоў.

4. Асабістыя павіннасці сялян — адпаведныя павіннасцям сялян маёнтка Мачулішча.

5. Разлік даходу.

а) ад пасеваў азімага жыта 3 чвэрцяў 4 чацвярыкоў, лічачы на прыбытак 2 зярняткі, выходзіць 7 чвэрцяў па 2 руб. 75 кап. — 15 руб. 75 кап.

б) за ярыну адпаведна — 15 руб. 75 кап.
в) за сена — 11 руб. 50 кап.
г) за дань — 72 кап.

Разам — 43 руб. 72 кап.

Прытым палата патлумачыла, што як у маёнтку лічыцца 35 душ, што складае 10 двароў, з іх тры двары вызначаны да апрацоўкі зямлі ў фальварку, а тая зямля ў фальварку яшчэ не апрацоўвасцца, то не можа прыносіць трэцяй часткі прыбытку, супраць Мачулішча, але павінны чакаць хоць невялікіх, ды падобных выгод.

З выпадку прад'яўлення Рожаю Хомскай прэтэнзіі на прыданае ёй у суме і ўтрыманне забяспечаных з маёнтка брата, назначаны фальварак Рожанполь, у выніку прадастаўлення Мінскага Гр. Губернатара, прадастаўлены ён Рожы Хомскай з карыстаннем атрыманымі з яго прыбыткамі, надалей да разгляду яе прэтэнзіі.

2. Мінскі віцэ-губернатар ад 23 мінулага жніўня данёс, што канфіскаванаму ў Аўгуста Хомскага маёнтка Мачулішча прэтэнзій прад'яўлена:

казённага спагнання 66 руб. асігнацыямі і частка, якая будзе вызначана Крымінальнай палатай за растрату каробачных збораў з ліку 354 руб. 92 кап. серабром і 1545 руб. 66 кап. асігнацыямі.

Прыватнага доўгу серабром 3256 руб. 50 кап. і асігнацыямі 1400 руб.

Звыш таго, маёнтак значыцца пад забаронай для забеспячэння сумы 1228 руб. 13 кап. серабром за расходы па адміністрацыі Аўгуста Хомскага над маёнткам Мечанентамі.

З ліку гэтых прэтэнзій Ліквідацыйнай камісіяй прызнаны да ўплаты ўсе казённыя спагнанні, а з прыватнага доўгу прызнана да ўплаты серабром 100 руб. Адхілена: асігнацыямі 1400 руб., серабром 1335 руб.

Апрача таго, у прысутных месцах разглядаюцца прэтэнзіі на 1821 руб. 50 кап.

(1 валока=21 га=30 маргоў; 1 морг=0,7 га; 1 чвэрць=210 літраў; 1 чацвярык =26 літраў. Мачулішча — існаваўшы населены пункт на тэрыторыі сучаснага Радзюкоўскага сельсавета. Размяшчаўся паблізу дарогі Васюкі — Дуліна. — *У.Л.*).

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 333. Воп. 1. Спр. 712. Л. 215—220.

Падрыхтаваў У.К.Ляскоўскі.

МАЁНТКІ І ВЁСКІ Ў МЕЖАХ СУЧАСНАГА ШАРКАЎШЧЫНСКАГА РАЁНА ЗА 1838 г.

Назва населенага пункта	Колькасць мужчын	Колькасць жанчын	Колькасць хат	Памешчык-уладальнік
1	2	3	4	5
1. Маёнтак Старая Шаркаўшчына				Багуцкія
хрысціян	141	130		
яўрэяў	246	247		
в. Пятровічы	76	79		Багуцкія
в. Няпранікі	59	60		Федаровіч
засценак Тотры	3	2		Буйніцкі
в. Козлаў Востраў	29	28		Корсак
в. Шондрыкі	31	35		Іцэлевіч
в. Варанчукі	31	37		
Давыдкі	4	2		
Забагі (Багі)	4	3		Русецкі Іван
в. Ракаўцы	32	38		Багуцкі Фелікс
в. Буйкі	35	37		—«—
Дзмітраўшчына	12	15		—«—
2. Фальварак Тэрэзьянаў				Лапацінскія Фама і Ізабелія
в. Саснаўцы	63	72		—«—
в. Важонкі (Валожанкі)	35	41		—«—
в. Крапіўнікі	15	17		—«—
3. Двор Тадулін (вінзавод)	46	51		Лапацінскі Ігнацы
в. Корніца	62	68		—«—
в. Шарпакова	43	51		—«—
в. Корсакі, або Амбразёнкі	34	43		—«—
в. Косцекава	45	49		Лапацінскі Ігнацы
в. Прошкі	25	32		—«—
4. Двор Аншадвор (Ганава)	2	3		Лапацінскі Станіслаў
в. Глісцёнкі	51	57		—«—
в. Шурпакі	17	20		—«—
в. Амбразёнкі	28	38		—«—
Белаброддзе	10	14		—«—
5. Двор Ёды (царква уніяцкая, вінзавод)	65	73		Лапацінскі Марцін
в. Падобы	46	52		—«—

1	2	3	4	5
в. Лакінаўцы	35	41		Лапацінскі Марцін
в. Бярняты	18	23		—«—
Камона, або Віншіца	27	34		—«—
Воўча Воля	9	11		—«—
в. Залессе	48	57		—«—
в. Весялова	20	28		—«—
6. Двор Юдыцын (царква уніяцкая, вінзавод)	7	9		Лапацінскі Аляксандр
в. Мачкі	27	31		—«—
в. Селакузчы	261	273		—«—
в. Свілы	98	104		—«—
7. Двор Рафалова (касцёл, вінзавод) — 22 вёскі, у т.л.				Лапацінскі Іосіф (Юзаф)
Снегі і Рэпішча	82	91		—«—
в. Гізаўшчына	46	51		—«—
в. Варонка	82	91		—«—
в. Бусўшчына	34	44		—«—
в. Буйкі	3	2		—«—
8. Двор Давяты — 4 вёскі разам	39	50		Лапацінскі Іван (Ян)
9. Маёнтак і вёска Більдзюгі	17	26		Стацэвіч Ігнацы
10. Фальварак і вёска Буда	29	32		Радувіч Станіслаў
11. Фальварак і в. Пашы	17	20		Гродзенскія манашкі
в. Жарабцы	5	6		брыгіткі
12. в. Сутокі	10	9		Ёдская уніяцкая плябанія
13. в. Альхоўцы	25	24		Старашаркаўская уніяцкая плябанія
14. Маёнтак Паставы — 98 вёсак і фальваркаў, у т.л.: фальварак Полаў (вінакурны завод) і яго вёскі: Алашкі і Мельніца	76	83		Тызенгаўз Канстанцін —«—
в. Слабода	20	26		—«—
засценак Курылаўшчына	8	10		—«—
в. Грэблы	71	80		—«—
в. Агальніца	64	73		—«—
в. Сямёнавічы	87	94		—«—
15. фальварак Юльянова	72	79		Федаровіч Бернард
16. фальварак Базыльполь	62	68		Федаровічы: Васіль, Францішак, Антон
17. Маёнтак Мачулішча (канфіскаваны ў 1834 г. за ўдзел ў паўстанні)	26	26		Хомскі Аўгуст
фальварак Ружамполь	6	7		Хомская Рожа
засценак Ружамполь	6	5		—«—
в. Дуліна	11	16		—«—
18. Двор Слабада	2	1		Хомскі Усцін
в. Граузы	14	19		—«—
в. Казяны (Казякі)	24	27		—«—
19. в. Непранікі	6	5		Шумберскія: Віктар, Ігнацы, Іосіф
20. Засценак Грыбоўшчына	16	15		Казёны
21. Маёнтак Зялёная Лопка	86	104		Арцішэўскія, адстаўны генерал-маёр

1	2	3	4	5
22. Двор і вёска Аўдзейчыкі	32	43		Багдановіч Антон
23. Двор Мосар, у т.л.				Бжастоўскія: Барбара,
в. Савуткі	39	37		Абдон, Аўгуст
в. Букі	70	68		— « —
в. Рабартова	78	75		— « —
24. Маёнтак Казлоўск (царква уніяцкая, віпакурня, манастыр каменны францысканскі), у т.л.				Князь Любецкі
в. Васюкі	45	46		— « —
в. Васюты	32	32		— « —
в. Чулы (Чуйкі)	11	12		— « —
в. Мішуты	25	24		— « —
в. Лабуці	21	20		— « —
в. Палялейкі	52	51		— « —
в. Ляднікі	9	10		— « —
в. Шаметы	45	44		— « —
25. Маёнтак Гелянова двор Казакова (Казакі)	61	62		Слізнёва Канстанцыя — « —
в. Астраўляны	40	41		— « —
в. Пукі	13	14		— « —
в. Кулагі	10	11		— « —
в. Крачонкі	18	19		— « —
26. Двор Остраў (за Малонкай) (царква ад Мосара)	20	17		Буйніцкі Зіосфрыд
27. Двор Масты	18	14		Вітаўт Адам
28. Двор Радзюкі	12	12		Бароўскі Антон
29. Фальварак Камарова				Канапляпскі Якаў
засценак Запруддзе	6	7		— « —
в. Падзапруддзе (Забор'е)	12	19		— « —
в. Астраўкі	9	11		— « —
в. Барадзінцы	37	42		— « —
в. Каўшэлеўшчызна (Каўшэлева)	17	25		— « —
в. Багаўшчызна (Богаўшчына)	11	13		— « —
в. Зарэчча	9	11		— « —
в. Дальняя Боріць (Старая Боріць)	11	14		— « —
в. Галендэркі (Ляндэрня)	10	13		— « —
в. Сынадворіцы фальварак і	15	20		— « —
в. Камароўшчына	46	57		— « —
30. Фальварак Нізіна				Канапляпскі Іван
в. Дварышча	20	22		— « —
в. Васілеўцы	22	25		— « —
31. Маёнтак і мястэчка Германавічы				Шырыпы Юстып і Канстанцыя
хрысціян	152	157		
яўрэяў	87	90	4	
в. Ліпава	15	16	13	— « —

1	2	3	4	5
в. Навассельцы	40	42	7	Шырыны Юстын і Канстанцыя
в. Жукі Ложныя	75	76	9	—«—
в. Ластаўка	21	23	3	—«—
в. Сталіца	99	97	16	—«—
Мястэчка Сталіца	45	47	6	—«—
в. Маргі	58	60	7	—«—
в. Каралева	25	27	3	—«—
32. Маёнтак Белы Двор	2	3		Шырын Юзаф
в. Цярэшкі	57	59		—«—
в. Страліца	26	27		—«—
в. Васількі (Васількова)	26	29		—«—
в. Мікіцёнкі	89	91		—«—
в. Баяры	77	79		—«—
в. Озеравы	29	31		—«—
засценак Пішчалово (Пішчалёўка)	7	9		—«—
33. Двор Падольшчына	6	7		Шырын Ян
в. Крапіўнікі	19	21		—«—
в. Шышкі	33	37		—«—
в. Шылкі	49	52		—«—
34. в. Рэчкі	26	20		Германавіцкая плябанія
35. в. Кульпеўцы	50	57		Плябанія Полацкага касцёла
36. в. Катова (Каты) — разам з Н. Пагостам належыць да маёнтка Купчалёва				Шауман Аляксандр
37. Маёнтак Красная Гара				Вазгірды
в. Савіцкія або Саўлукі	26	28	6	—«—
в. Погары	73	72	13	—«—
маёнтак Сомчына	6	6	—	—«—
в. Малыны	30	28	3	—«—
в. Рацькі	40	40	6	—«—
в. Лазовікі	6	6	1	—«—
38. Маёнтак Рунуполь				Вазгірдаў, а па традыцыі —
в. Маскалюкі, або Краснае	16	20	3	Хінчыцкіх
в. Кухніцкая	32	37	5	—«—
39. Фальварак Курылава	32	31	7	Вінча
40. Маёнтак мястэчка Лужкі (царква, касцёл, манастыр піяраў, віпакурня)	38	39		Па 1838 г. графіня Плятэрава, пазней Чапская Епіфанія
хрысціян	283	294	64	
яўрэяў	225	240	20	
в. Жыні	23	27	5	—«—
в. Халусва	38	40	6	—«—
в. Тармены	25	27	10	—«—
в. Кукры	48	50	11	—«—
в. Каменшчына	24	25	8	—«—
Дварышча	45	50	6	—«—
Тоўшчыкі	17	16	4	—«—
вёскі: Шабаны	15	17	4	Чапская
Хралова	34	35	7	—«—
Пісанкаўшчына	7	6	1	—«—
Верацеі	138	140	24	—«—
Над'яльскія	8	9	2	—«—

1	2	3	4	5
Зскічы	3	2	1	Чапская
Лучайка	97	93	18	— « —
Краўцы	20	21	3	— « —
Загразьзе	48	57	7	— « —
Клянова	44	45	7	— « —
Путраніца	66	65	11	— « —
Ламачына	36	39	8	— « —
Васілева	20	21	4	— « —
Бор	9	10	1	— « —
Пад'сльцы	25	26	4	— « —
Барсукова	3	4	1	— « —
Каўкі	10	11	2	— « —
Лапунова	66	67	10	— « —
Падапільцы, або Гаўрыленкі	8	7	2	— « —
Лугі	36	37	7	— « —
Кавалі	11	12	3	— « —
Навасельцы	77	79	7	— « —
Ахватка	10	13	1	— « —
Блізніца	15	17	3	— « —
Жарсцвянка	41	39	7	— « —
Крыўкі	70	74	11	— « —
Сілараўка	5	7	1	— « —
Падліпкі	16	17	2	— « —
Паддубкі, або Дубоўка	47	49	11	— « —
Залесінкі	64	61	11	— « —
Калонія	6	5	1	— « —
Казачкі	63	61	9	— « —
Гапоны	37	36	7	— « —
Грыдзюшкі, або Бруднае	50	48	10	— « —
Уліна Закарчэмнае	22	26	5	— « —
фальварак Уліна	33	34	7	— « —
Стральцова	12	14	1	— « —
Пупчанка	4	8	1	— « —
Асіпаўка	14	20	3	— « —
Протасы	23	25	4	— « —
ваколіца Цярасполь	8	7	1	— « —
ваколіца Уліна	9	1	1	— « —
ваколіца Стральцова	1	—	1	— « —
ваколіца Уліна	5	3	1	— « —
ваколіца Дворнае	1	2	1	— « —
Падольшчына	4	—	1	— « —
41. Двор Парэчча (уніяцкая царква св. Троіцы)	21	19		Шырын Антон
вёскі:				
Папізы, або Рубашкі	47	51		Шырын Антон
Лучайка Вялікая	50	44		— « —
Лучайка Малая	39	42		— « —
Вяршкі	21	23		— « —
Кавалёва	16	13		— « —
Дзяпісаўка	8	7		— « —
Рудава	23	26		— « —
засценак Прудзішча	6	8		— « —
Гаршынова	21	23		— « —
засценак Фалькоўшчына	12	11		— « —
Дзішвічы	20	21		— « —
Барцвіпоўка	20	18		— « —

1	2	3	4	5
Мышнікі	15	16		Шырын Антон
Мажая	16	18		— « —
42. Дворнава	1	1		Шыпіла Іосіф
43. Маёнтак Курылавічы, усяго 38 вёсак, у т.л.				Казённы
вёскі: Казачкі	6	5		— « —
Басянкі	49	53		— « —
Жарсцвянка	9	10		— « —
Крушнева	3	2		— « —
Сарокі	2	3		— « —
Падлішкі	27	26		— « —
Стомы	31	32		— « —
Цыганкі	10	8		— « —
44. Ручай	69			Здраўескія
45. Хвастова	44			Сакалоўскі
46. Волкаўшчына	32			Прушынскі
47. Маёнтак Ігумен і вёскі	738			граф Гінтэр

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 1236.

Падрыхтаваў У.К.Ляскоўскі.

З МАТЭРЫЯЛАЎ СУДОВЫХ СПРАЎ

АБ ПАЖАРЫ НА ВІНАКУРНЫМ ЗАВОДЗЕ Ў ВЁСЦЫ ПАЯНЫЧЫ ГРАФА ІГНАЦЫЯ ЛАПАЦІНСКАГА Ў 1840 г.

Па выніках расследавання прычын пажару прыйшлі да высновы, што завод згарэў ад трубкі, якую курыў і пакінуў на заводзе прыгонны Янка Вясна Бурбалка, не паслухаўшы войта Анціпа Мышко, які забараняў курыць. Прыгонныя не столькі стараліся пагасіць пажар, колькі цікавалі, каб нешта ўкрасці.

Сяляне Фелька Палягошка, Сцяпан Мышко, Даніла Мядзведзь і Андрэй Палягошка ў час пажару ўкралі каля фунта свінцу і прадалі яго яўрэю Друйскага кагалу Сімону Зэлікавічу Крапіўніку за 8 грошай. Вінаватыя аддадзены ў рэкруты. Янку Бурбалку прысудзілі 25 удараў плёткай.

Налічана страт ад пажару на 800 рублёў серабром.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 1410.

АБ ВЫПАДКАХ РАБАЎНІЦТВА

У час грамадскіх катаклізмаў — войнаў, паўстанняў, рэвалюцый — заўсёды назірасцца абвастрэнне крымінальнай абстаноўкі, актывізуюцца рабаўнікі, марадзёры і да т. п.

Было такое і ў час паўстання 1831 г. Пацярпеў ад рабаўнікоў удзельнік паўстання ў Лужках Андрэй Юшкевіч, які пасля задушэння паўстання хаваўся ад улад і не мог прыгледзець за фальваркам.

«Губернское правление слушает следующее:

Решение Минской уголовной палаты от 19.2.1832 г. в деле о нападении на фольварок Любинов, содеянном Иваном Нестеровым, Федулой Колосовым и Осипом Савельевым, заключено: Нестерова, Колосова и Савельева за буйственные поступки и название себя казаками, наказать в фольварке Любинов плетьми через полицейских служителей по 25 ударов, оставить на прежних жилищах. И взыскать за причиненные Нестеровым крестьянину Войцелю и Савельевым шляхтичу Андрею Юшкевичу — с первого 2 копы грошей, а с последнего (если он окажется шляхтичем) — 12 рублей грошей и употребленные полгарца орехов, три фунта сахару, полугарцевый сыр, горшок масла и десяток яиц.

Федору Иванову, Филиппу Данилову, Архипу Кондратьеву и Кириллу Васильеву за причиненное ими участие с Нестеровым и Колосовым и за причиненные начальнику Повятского ключа пом. Дорстовскому грубости почесть в наказание содержание под стражей.

Андрей Юшкевич совокупился с мятежниками в Лужках, находился с ними полторы недели и был в военном вооружении, а после якобы от них бежал и скрывался по разным местам, по обнаружении меры вины его и поступлении по законам предоставить постановлению сего Правления, как равно и о незаписке по ревизии вольных хлебопашцев Захара, Алексея и Ивана Нестеровых было учинено особое доследование».

Пазней Дзісенскі земскі суд даносіць, што «приговоренные числом ударов наказаны...».

«В отношении Юшкевича не обнаружено, где он ныне жительствует, предмет принадлежности к мятежникам не обследован, но подходит под действие 1-го пункта Высочайшего Манифеста 16 августа 1841 года, по которому подобные дела прекращаются, означенное дело оставлено без производства».

(Заўвага: вольнымі хлебапашцамі называліся стараверы, якія перасяляліся з Расіі. — *У.Л.*).

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 2219. Л. 1, 2.

СПРАВА АБ УДЗЕЛЕ Ў ПАЎСТАННІ 1831 ГОДА ПАМЕШЧЫКА ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА МІХАІЛА ВІКЕНЦЬЕВІЧА ЦЯШКОЎСКАГА (1806 г.н.)

пачата ў 1837 г., закончана ў 1848 г., на 427 лістах.

Іван Антонавіч Лапацінскі з маёнтка Давяты (нашчадак Мікалая Лапацінскага, першага ўладальніка Ёдаў) меў маёмасныя прэтэнзіі да суседа Вікенція Цяшкоўскага. Суд адмовіў Івану. Больш таго, хросная маці Міхаіла Цяшкоўскага Мар'яна Далецкая пакінула завяшчанне, па якому Іван Лапацінскі павінен выплаціць Міхаілу Цяшкоўскаму 133 рублі 60 капеек з сумы 174 рублі 50 капеек, занятай Іванам у Далецкай яшчэ ў 1829 г.

Праз 6 гадоў пасля паўстання 1831 г. Іван піша данос: «Рапорт бывшего капитана польского войска Ивана Лопацинского о причастности к мятежу Михаила Цешковского... Михаил был секретарем Виленского Дворянского Депутатского собрания... ушел за границу... Скрывается в Царстве Польском».

Васенны павятовы начальнік Вілейскага і Дзісенскага паветаў падпалкоўнік Шэпелеў рапартуе: Іван Лапацінскі не задаволены адмовай суда на іск да Цяшкоўскага, таму ўчыніў ілжывы данос...

Іван Лапацінскі не супакойваецца, шле скаргі на бяздзейснасць мясцовых улад у пошуках дзяржаўнага злачынцы. Высачыў і падказвае, што бацька Міхаіла часта шле пісьмы ў Коўна на імя Рафаіла Завадскага, а пад гэтым імем павінен хавацца сам Міхаіл.

Улады шлюць у Коўна запыт, каб удакладніць асобу Завадскага і перахапіць пісьмы на імя Завадскага. У Коўне нічога падазронага не выявілі. Тады Іван Лапацінскі шле данос на падпалкоўніка Шэпелева аб яго прадузятасці ў гэтай справе, а таксама аб тым, што другі сын Вікенція Цяшкоўскага Канстанцін, які працаваў у казённай палаце, паспеў знішчыць несумненныя доказы ўдзелу Міхаіла і іншых асоб у паўстанні. Справа заходзіць у тупік.

Нечакана ўладам пашчасціла: купец Злотнікаў выявіў у Польшчы Міхаіла Цяшкоўскага і данёс у Дзісну. Дзісенскі прыстаў Кнобельсдорф прывёз Міхаіла з Аўгустоўскай губерні з пашпартам, выдадзеным Варшаўскім васенным губернатарам. Вопіс рэчаў Цяшкоўскага, прыехаўшага на пары коней: адзенне, абутак, 2 кані з вупражжу, сані, грошай 130 рублёў 55 капеек.

Пры вобыску ў Полыпчы знойдзена пісьмо бацькі, высланае з маёнтка Невяліча 5.3.1836 г. на імя Каспара Завадскага, і пісьмо сястры Камілы Шыбекавай. Вобыск у брата Канстанціна, служачага Дзісенскага земскага суда, нічога не даў.

Сведчанне Антонія Ластоўскага: Міхаіл сябраваў з Іванам Лапацінскім і Якавам Канаплянскім, у 1831 годзе Міхаіл увесь час прабыў у Івана.

З завяшчання Мар'яны Далецкай: Міхаілу належаць 50 рублёў серабром з сумы 270 рублёў серабром, што знаходзяцца па заёмнаму пісьму ў члена Віленскай Адукацыйнай Камісіі Аляксандра Лапацінскага (маёнтак Юдыцына, удзельнік паўстання 1831 г., сваяк Івана Лапацінскага). Пачынаецца пошук Аляксандра Лапацінскага, які не дае выніку.

24 лістапада 1841 г. Васенны суд прыгаварыў: пазбавіць Міхаіла Цяшкоўскага ўсіх маёмасных правоў і саслаць на катаргу. Рашэнне губернатара: пазбавіць Міхаіла Цяшкоўскага дваранскага гонару, адправіць шарэнгавым ваяваць на Каўказ.

Судовыя зборы ў казну: з Аляксандра Лапацінскага 27 рублёў 57 капеек, з Івана Лапацінскага — 70 рублёў серабром. У 1843 г. Іван Лапацінскі піша скаргу губернатару на прыстава, які «грубо требует уплаты в казну 35 руб.».

У 1848 г. Віленская палата дзяржаўнай маёмасці прымае рашэнне: прызнаць Аляксандра Лапацінскага мяцежнікам, маёмасць канфіскаваць. У сувязі з адсутнасцю Аляксандра сыскаць у казну з яго доўг Міхаілу Цяшкоўскаму лічыць немагчымым.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 1188.

Падрыхтаваў У.К.Ляскоўскі.

ГРАФІК ПАСТАЎКІ КОНЕЙ ДЛЯ РАЗВОЗУ ПОШТЫ Ў 1839 г.

Адказны гаспадар	Мясцовасць	Колькасць душ	Колькасць коней
Плятэрава	Лужкі	1863	19
		1141	24
		229	6
Яўрэі м. Лужкі		173	11
і Пліса		285	
Лапацінскі Ал-р	Юдыцына	392	3
		278	8
Канфіскаваны маёнтак	Мачулішча	26	1
Яўрэі м. Шаркаўшчына		238	6
Лапацінскі Станіслаў	Ганава	108	3
Стараверы+	в. Варонка	66	2
Ёдская плябанія	Сутокі	10	
Лапацінскія Генрых і Ганна	Багданава	184	4
Лапацінскія+	Тадуліна	255	8
Ластоўскія	Рудава	25	
Канаплянскі Іван	Дварышча	42	1
Канаплянскі Якаў		183	4
Здрасўскі+	Ручай	69	2
Пушкоў		9	
Багуцкі Адольф		182	5
Федаровіч+	Юльянова	72	2
Русецкі	Багі	4	
Федаровіч+	Базыльполь	62	2
Становіч		13	
Багуцкі Фелікс	Ракаўцы	79	2
Лапацінскі Марцін	Ёды	265	7
Шырын Іосіф	Б. Двор	380	10
		228	6
Бржастоўскі Абдон	Букі	266	7
Арцікоўскі+	Зял. Лопка	85	3
Багдановіч Антон	Аўдзейчыкі	32	
Сакалоўскі+	Хвастова	44	2
Прушынскі	Волкаўшчына	32	
Шырын Антон	Рубашкі, Луг	326	8
Гінтэр	Ігуменава	304	8
		304	8
		130	4
Плябанія м. Германавічы	Рэчкі	26	1
Шырын Юстын	Германавічы	378	8

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 299. Воп. 2. Спр. 1236.

Падрыхтаваў У.К.Ляскоўскі.

Эканамічнае становішча ў 40—50-я гады XIX ст.

Разгром паўстання 1830 – 1831 гг. прывёў да адмены аўтаноміі Польшчы і Канстытуцыі 1815 г. Самадзяржаўе пайшло па жорсткія рэпрэсіі, каб не засталося і следу ад бунтарскіх ідэй, вызвалення руху. Адначасова ўлады ўзмацнілі палітыку русіфікацыі.

У заходніх губернях расійскі ўрад правёў некаторыя адміністрацыйныя і палітычныя мерапрыемствы, накіраваныя на ўмацаванне тут свае улады. Рускім дваранам і чыноўнікам раздаваліся канфіскаваныя і казённыя маёнткі ў гэтых губернях. З Расіі перасяляліся казённыя сяляне. Але гэтыя мерапрыемствы не далі чаканых вынікаў. Новыя ўладальнікі маёнткаў звычайна хутка іх прадавалі. Большасць дробнай шляхты не магла даказаць дакументальна сваё дваранскае паходжанне і была пераведзена ў саслоўе аднадворцаў. Яны абкладаліся тымі ж падаткамі і павіннасцямі, што і дзяржаўныя сяляне. Значная колькасць сем'яў аднадворцаў, у тым ліку з Дзісенскага павета, была пераселена ў паўднёвыя губерні Расіі.

Ажыццяўлялася русіфікацыя органаў кіравання, суда, асветы. У адміністрацыйныя ўстановы прызначаліся галоўным чынам расійскія чыноўнікі. У 1840 г. было адменена дзеянне Літоўскага статута 1588 г. На Беларусь распаўсюджвалася расійскае заканадаўства. Усе судовыя адміністрацыйныя і грамадскія акты павінны былі складацца толькі на рускай мове. Забаронена было выкладаць польскую мову як асобны прадмет. У 1832 г. быў закрыты Віленскі універсітэт. У Лужках у маі таго ж года перастала існаваць знакамітая школа пры піярскім кляштары, заснаваная ў 1741 г. полацкім кашталянам Валяр'янам Жабам, у якой займаліся вучні з розных паветаў Беларусі, Літвы, Латвіі, Украіны.

Заканчэнне школы піяраў давала ў свой час права паступаць у Віленскі універсітэт, бо выпускнікі яе атрымлівалі, па сучасных мерках, сярэднюю адукацыю. Такія школы, як у Лужках, былі толькі ў Полацку і Віцебску. Тут вывучалі лацінскую мову, заалогію, батаніку, права, маральныя навукі, вершаскладанне, трыганаметрыю, логіку, гісторыю і геаграфію Рэчы Паспалітай, гісторыю мастацтва, эканамічнае і гістарычнае права. Пасля закрыцця школы піяраў у Лужках засталася царкоўна-прыходская школа, дзе вучылі толькі малітвам, рускаму і славянскаму чытанню, крыху пісьму і арыфметыцы. Нішчылася беларуская культура, мова, адукацыя.

Царскім указам было забаронена ўжываць тэрміны «беларускія» і «літоўскія» губерні, уводзілася назва «Паўночна-Заходні край» (1840). Полацкім царкоўным саборам у 1839 г. уніяцкая царква, якая па сутнасці з'яўлялася нацыянальнай, была гвалтоўна аб'яднана з праваслаўнай, зменшана колькасць каталіцкіх манастыроў.

Усіх уніятаў прымусова запісвалі ў рускае праваслаўе. У Шаркаўшчыне і навакольлі былі спалены ўсе беларускія царкоўныя кнігі. Беларускія школы пры цэрквах былі закрыты. Звольнены святары беларускага паходжання. Іх месца занялі расійскія. Уціск цярпелі беларусы-католікі. Мясцовыя жыхары выступалі супраць гэтага. У Шкунціках, Празароках і іншых месцах адбыліся рэлігійныя бунты.

У 1-й палове XIX ст. ва ўмовах нарастаючага крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы эксплуатацыя сялян яшчэ больш узмацнілася, становішча іх пагоршылася. Памешчыцкая гаспадарка ў сярэдзіне XIX ст. у нашым краі заставалася амаль такой жа, як і напярэдадні 1830 г. Яна асноўвалася на феадальнай уласнасці памешчыкаў на зямлю і на працы прыгоннага сялянства.

Прыгоннічтва стрымлівала развіццё прадукцыйных сіл. У 1858 г., напрыклад, прыгонныя складалі 68,3 працэнта насельніцтва Дзісенскага павета. Да часу правядзення рэформы 1861 г. з 53 583 жыхароў павета памешчыкам належалі 36 510 сялян, дзяржаве — 5787, вольных было ўсяго 188 сялян.

У нашых мясцінах сяляне вырошчвалі азімае жыта, ячмень, авёс, лён, у невялікіх колькасцях — пшаніцу і гарох. Вялі трохпольны севазварот, у якім чаргаваліся азімыя і яравыя зерневыя з папарам. Галоўнымі земляапрацоўчымі прыладамі былі саха і барана. На агародах вырошчвалі бульбу, капусту, моркву, цыбулю, рэдзьку, агуркі, канопліі. Займаліся яшчэ пчалярствам, рамеснічтвам, адыходніцтвам і перавозкай тавараў.

Паводле архіўных дакументаў, на Віцебшчыне на памешчыцкіх сялян былі ўскладзены цяжкія павіннасці. Яны заключаліся

ў тым, што сяляне абавязаны былі працаваць на памешчыка 3 дні ў тыдзень. Рабочы дзень лічыўся ад узыходу сонца да захаду, а з 15 мая да 15 жніўня — з 5 гадзін раніцы да захаду сонца. Каб адпачыць і папалуднаваць, селяніну дазвалялася выкарыстаць 3 гадзіны летам і 2 гадзіны зімой.

Зімой сяляне займаліся малацьбой, дастаўкай на падводах прыпасаў да месца спажывання, вывазам з лесу дроў і бярвёнаў на рамонт і новае будаўніцтва. Летнімі работамі былі вываз і растрасанне гною на палях, апрацоўка пасеваў, сяўба, сенакос, жніво, перавозка сена і збажыны ў гумны. Кожны працаўнік на кані або валах павінен быў выканаць адно з заданняў: узараць сахой гліністай або сугліністай глебы 0,5 дзесяціны; пабаранаваць 2/3 дзесяціны зямлі; перавезці на адлегласць да 25 вёрст у адзін бок рознага грузу на адным кані ад 18 да 20 пудоў; перавезці з поля ў пуню 8 коп (1 капа — 60 снапоў) азімай збажыны, 12 коп ярыны, 8 вазоў сена вагой да 10 пудоў; вывезці ў поле гной; пасеяць зерне на 4 дзесяцінах; зжаць збажыну на плошчы ў 1/4 дзесяціны; абмалаціць азімага збожжа 1 капу, яравога — 2 капы.

Памешчыкі не абмяжоўваліся працай прыгонных сялян. Яны выкарыстоўвалі і наёмных рабочых. З гэтай мэтай былі вызначаны цэны на падзённую працу: на пешага работніка 20—30 кап., з канём — 40—50 і больш капеек серабром.

На год можна было наняць работніка за 12—20 руб., а ў паўночных паветах Беларусі — ад 24 да 36 руб. серабром. Падзёншчык атрымліваў ад наймальніка простую суконную світку, 2 кашулі, ніжнюю бялізну і лапці.

У 50-я гады XIX ст. значна ўзмацнілася маёмаснае расслаенне сялян. Пераважная большасць іх жыла бедна.

У 1846—1848 гг. на 7740 двароў памешчыцкіх сялян у Дзісенскім павеце прыпадала 137 706 дзесяцін зямлі, у тым ліку 101 263 — ворыва і 33 443 — сенакосаў, або па 13,1 дзесяціны ворыва і 4,3 — сенакосаў на гаспадарку. Надзел на рэвізскую душу складаў 3,3 дзесяціны.

Крыху адрозніваласа становішча дзяржаўных сялян. Надзельнае землекарыстанне у іх складала каля 20 дзесяцін. За яго назначаўся грашовы чынш у 12 руб. 50 кап. з цяглавых і 7 руб. 9 кап. з паўцяглавых гаспадарак. Агароднікі плацілі за агарод (сядзібу) і асабісты чынш па 1,5 руб. з кожнага працаздольнага мужчыны. Цяглавым лічыўся двор, які меў двух коней, паўцяглавым — аднаго каня, а агароднікі жылі за кошт агарода.

Сяляне былі абавязаны плаціць вялікія дзяржаўныя падаткі. Каб выплаціць іх, многія мужчыны вымушаны былі ісці на будоўлі, займацца перавозкай купецкіх тавараў, вырабам сох, барон, павозак, розных іншых прылад працы, рэчаў хатняга ўжытку.

Агульнай рэгламентацыі сялянскіх павіннасцей не існавала. Памешчына магла складаць на працягу года да 568, а ў некаторых выпадках і да 1128 дзён з кожнага сялянскага двара. Фармальна сяляне маглі выказаць незадаволенасць памерамі паншчыны, аброку, іншых павіннасцей. Маглі нават адмовіцца іх выконваць. Але пакаранне за гэта было суровым: сяляне атрымлівалі за непадпарадкаванне ад 5 да 30 удараў прутом. У адказ на прыгонніцкі ўціск у вёсках успыхвалі сялянскія бунты.

У 1858—1860 гг. стыхійныя сялянскія выступленні супраць прыгоннай няволі набылі ў беларускіх губернях масавы характар. Сяляне змагаліся за адмену паншчыны і аброку, за перадачу ім зямлі. Многія паўстанні падаўляліся ваеннай сілай.

Узмацненне сялянскага руху прымусіла царскі ўрад прыступіць да падрыхтоўкі адмены прыгоннага права. Правядзенне рэформ пачалося з беларускалітоўскіх губерняў. Ствараліся дваранскія камітэты для падрыхтоўкі праектаў адмены прыгоннага права.

Л.М.Лабачэўская.

У парэформенны час

19 лютага 1861 г. цар зацвердзіў Маніфест аб адмене прыгоннага права і праекты «Палажэнняў аб сялянах, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці». У Беларусі рэформа 1861 г. праводзілася на аснове «Агульнага палажэння» і двух «Мясцовых палажэнняў». Па «Агульнаму палажэнню» сяляне атрымлівалі асабістую свабоду і права распараджацца сваёй маёмасцю. «Мясцовыя палажэнні» вызначалі ўмовы надзялення сялян зямлёй і выканання імі павіннасцей.

Беларускія сяляне былі аб'яўлены асабіста свабоднымі, але ўся зямля заставалася ва ўласнасці памешчыкаў. Сялянам былі дадзены ў карыстанне невялікія надзелы зямлі, за якія трэба было адбываць пэўныя павіннасці — паншчыну ці аброк. Памеры палявых надзелаў і павіннасці за іх вызначаліся ўстаўнымі граматамі. Гэтыя дакументы складаліся памешчыкамі і зацвярджаліся міравымі пасрэднікамі. Сяляне мелі права выкупіць сядзібу, а палявы надзел выкупаўся толькі са згоды памешчыка. Да заключэння выкупнога пагаднення сяляне лічыліся часовааабавязанымі. Яны мелі права са згоды памешчыка выкупляць зямлю.

Рэформа не дала сялянам сапраўднай свабоды. Як часовааабавязаныя, яны ў значнай меры залежалі ад памешчыка, за якім захоўвалася права апекі над сялянамі.

На Шаркаўшчыне, як і ва ўсёй Віленскай губерні, рэформа праходзіла па асобаму палажэнню: за сялянамі замацоўваліся іх дарэформенныя надзелы, якія памешчык па свайму меркаванню мог памяншыць на шостую частку. Да заключэння выкупу павіннасць сялян скарачалася на 10%. Дваровыя людзі два гады пасля рэформы былі залежнымі ад памешчыка, а затым вызваляліся без зямлі. Такім чынам, аграрнае пытанне вырашалася не на карысць большасці сялян.

Рэформа 1861 г. фактычна абрабавала сялян. Не такой волі яны чакалі. Многія з іх паіўпа меркавалі, што памешчыкі падмянілі царскі маніфест, што іх не апавяшчаюць аб «сапраўднай волі», якую быццам бы даравaў цар.

Такія ўмовы рэформы, што служылі перш за ўсё інтарэсам памешчыкаў, выклікалі незадавальненне сялян. Вясной 1861 г. выступленні сялян прайшлі ў многіх паветах Беларусі, у тым ліку ў ваколіцах Шаркаўшчыны.

Сяляне шэрагу маёнткаў адмовіліся адбываць павіннасці, збіраліся разам, выказвалі сваё абурэнне «Палажэннямі». Царскія ўлады пасылалі на падаўленне сяляпскіх хваляванняў вайсковыя камандy і паліцэйскіх, якія бязлітасна распраўляліся з «буптаўшчыкамі».

Хваляванне сялян у маёнтку Ігумепава (недалёка ад сённяшняй в. Пашкі) пачалося, як сведчаць архіўныя крыніцы, 8 красавіка 1861 г. Сяляне сабраліся ў дваровым управуленні і аб'явілі, што «не будуць выконваць інвентарных павіннасцей, акрамя адной паншчыны, якую яны згодныя адбываць не па прызначэнню, а па свайму меркаванню».

Іх падтрымалі сяляне маёнтка Людвінова і іншых. Грамадзянскі губернатар М.Н.Пахвіснёў рапартаваў генерал-губернатару В.І.Назімаву ў Вільню «О подъеме крестьянских волнений в Дисненском уезде и необходимости усиления находящихся там войск».

«В дополнение представлению моему от 4 мая № 345, имею честь довести до сведения, что как видно поданной мне 12 сего мая виленским губернским предводителем дворянства записки и донесений дисненского земского исправника от 3 мая до 10 мая № 14 и № 19, беспорядки в проезуитском им. Игуменово, находящемся в потомственном владении княгини Пузыно, по расквартировании в оном одной роты 4-го резервного батальона Муромского пехотного полка и подвержении 5 главных подстрекателей к аресту, а 13 более ослушных крестьян — исправительному полицейскому наказанию — прекращены.

Что же касается беспорядков в имениях: ...Волыни — Ширина и т. д., то такие не только не прекращены еще, но даже распространились и по другим соседним имениям.., Людвинове — Вериги, Куштеляновщине — Чернявского.

Губернский предводитель дворянства, поясняя, что вследствие неповиновения крестьян приостанавливаются полевые работы, просит ходатайства моего, дабы командированному в Дисненский уезд для прекращения беспорядков между крестьянами полковнику Адамовичу... было поручено восстановление порядка во всех имениях, где таковой нарушен крестьянами, а исправник Флярковский доносит, что, по мнению его, для скорого восстановления порядка в Дисненском уезде необходимо усилить число расположенных в нем войск, так как находящихся там трех рот 4-го резервного батальона Муромского пехотного полка, наличный состав которых не превышает 300 человек, оказалось для сего недостаточным. К сему исправник присовокупил, что виновный в превратном толковании Положений рядовой Копанев арестован, проживающий же в м. Глубоком отставной подполковник Антоновский, за-

мечешный в неодобрительном поведении и занимающийся толкованием крестьянам Положений за денежное вознаграждение, подвержен домашнему аресту впредь до особого распоряжения.

Подписав вместе с сим дисненскому исправнику производство о поступках подполковника Антоновского и рядового Копанева формального следствия и представляя обо всем изложенном, имею честь покорнейше просить распоряжения вашего о скорейшем усилении расположенной в Дисненском уезде команды военной. О последующем же не оставьте почтить меня предложением.

Гражданский губернатор Похвиснев» (ЦДГА Літвы. Ф. 378. Спр. 909. Л. 118—119).

Генерал-губернатар Назімаў аддае загад «Аб прыняцці надзвычайных мер па барацьбе з сялянскімі хваляваннямі і накіраванні ў Дзісенскі павет рэзервовых рот Мурманскага пяхотнага палка». Як сведчаць архіўныя даныя, 300 салдат Мурманскага пяхотнага палка ліквідавалі беспарадкі. Арыштаваны быў не толькі галоўны завадатар іх радавы Капанёў, але і 35 сялян. Іх пратрымалі ў турме некалькі месяцаў. Капанёў быў асуджаны не доўгае турэмнае зняволенне.

А вось яшчэ адзін дакумент-данясенне С.А.Адамовіча В.А.Далгарукаву ад 28 мая 1861 г.:

«...Из числа помещичьих имений Дисненского уезда, названных в донесениях моих в. с. от 10 и 12 сего мая за № 108 и 113, в коих между временнообязанными крестьянами (кр-ми) произошли беспорядки им. Игуменово, 600 душ, владения княгини Гавриилы Пузыно, без особых затруднений при содействии квартировавшей вблизи 1 роты Муромского полка местным исправником Флюрковским приведено к должному отбыванию инвентарных повинностей... Поводом случившихся беспорядков в Дисненском уезде, главное послужило превратное толкование кр-нам Положения о их освобождении из крепостной зависимости отставным артиллерии подполковником Антоновским, который в нетрезвом виде читая им это Положение, уверил, что им следует отбывать изделной повинности только 3 дня в неделю со двора в пользу владельцев имений, за что Антоновский по жительству в м. Глубоком исправником приарестован домашним арестом впредь до распоряжения высшего начальства.

О чем имею честь в. с. почтеннейше донести

Подполковник Адамович» (ЦДГА Літвы. Ф. 419. Воп. 2. Спр. 125. Л. 26—27).

Царскім уладам удалося на пейкі час прытушыць сялянскі рух. Новы ўздым сялянскіх выступленняў наступіў у пачатку 1863 г., праз два гады пасля прыняцця маніфеста. Сяляне адмовіліся прызнаваць уладу памешчыкаў, плаціць аброк, самавольна высякалі лес. Яны спадзяваліся атрымаць сапраўдную волю.

Барацьба беларускіх сялян за зямлю была цесна звязана з пратэстам польскага і беларускага народаў супраць нацыянальнага прыгнёту.

У Дзісенскім павеце паўстанне 1863 г. не дасягнула тых маштабаў, якія мела тут паўстанне 1831 г. Аднак на тэрыторыі павета былі створаны і дзейнічалі некалькі невялікіх паўстанцкіх атрадаў. Дзейнічаў такі атрад паблізу Шаркаўшчыны.

Арганізаваў яго памешчык Вільгельм Лапацінскі, які і кіраваў атрадам. Мясцовыя ўлады называлі атрад шайкай Лапацінскага. У 1863 г. за 5 вёрст ад Старой Шаркаўшыны, ва ўрочышчы Дубавое, адбылася сутычка расійскіх войскаў з паўстанцамі на чале з памешчыкам Вільгельмам Лапацінскім. У маёнтку Юзафова 14 мая 1863 г. быў разгромлены атрад паўстанцаў, якім камандаваў Гепрых Дмахоўскі.

Паўстанцкія атрады ў Дзісенскім павеце не былі шматлікімі і добра арганізаванымі, таму і не змаглі доўга процістаяць войскам. І ўсё ж дзейнасць паўстанцаў у павеце вельмі непакоіла ўлады. Аб гэтым сведчыць той факт, што ў 1863 г. у Глыбокае зноў прыязджаў М.М.Мураўёў, які быў прызначаны генерал-губернатарам. Ён прабыў у Глыбокім некалькі дзён.

Да пачатку верасня 1863 г. у Беларусі і Літве паўстанне было задушана. Супраць удзельнікаў паўстання былі вельмі жорсткія рэпрэсіі: пакаранне смерцю, катарга, арыштанцкія роты, высяленне. Іх сядзібы разбураліся, маёмасць канфіскоўвалася і на льготных умовах прадавалася царскім генералам і чыноўнікам. Пакараны смерцю быў Кастусь Каліноўскі.

Л.М.Лабачэўская.

Дакументы сведчаць

З ДАНЯСЕННЯ АБ ПАДАЎЛЕННІ СУПРАЦІЎЛЕННЯ СЯЛЯН

...С помощью военной силы в имениях: Игуменово, 600 душ, владение кн. Пузыно Гавриилы; Поставы графа Арнольда Константиновича Тызенгауза, 700 душ; Манковичи Каролины Хлевинской, 300 душ — успокоены. Одновременно, им. Козловск, 800 душ, владение князя Игнация Друцкого-Любецкого и жены его, более упорно сопротивлявшиеся по случаю, что в это имение ко дню, в котором полковник Адамович серьезно решил действовать, собралось до 2000 душ из соседних имений, равномерно успокоены при содействии двух рот Муромского и одной Софийского полков, захвачено 35 человек, отправлены в тюрьму г. Дисны, а менее виновные были на месте наказаны розгами.

З ДАНЯСЕННЯ ГЕНЕРАЛ-ГУБЕРНАТАРУ МІНСКАЙ ГУБЕРНІ В.А.ДАЛГАРУКАВУ АБ СПЯВАННІ ЗАБАРОНЕНАГА ГІМНА

30.6.1861 г.

28 мая в Друйском костеле по окончании литургии человек до 20 помещиков обоего пола, одетых в траур, пели на хорах с органом возмутительный гимн...»

11.8.1861 г.

...В Дисненском уезде в Глубокском костеле 16 июля после литургии собравшиеся студенты Московского и С.-Петербургского университетов... пели возмутительный гимн... местный пристав Лакуцевич уговаривал не петь гимн, а настоятель костела велел запереть хоры, но присутствующие не послушались, ссылаясь, что теперь гимн поют везде... Студенты, переезжая с места на место, ведут с жителями какие-то тайные отношения и передают им неблагонадежного содержания бумаги...

З ДАНЯСЕННЯЎ СЛЕДЧАГА ЛОСЕВА В.А.ДАЛГАРУКАВУ

30.7.1862 г.

...Между крестьянами уже в настоящее время обнаруживается более наклонности к полякам, чем к России, теперь устраиваются народные школы, и некоторые волости объявили желание учиться не по-русски, а по-польски, несмотря на то, что они белорусы и русский язык для них понятнее польского... Крестьянский вопрос, кроме своего собственного значения, заключает в себе интерес политический: от благополучного его исхода зависит дать здешнему краю такое направление, чтобы он окончательно слился с русской национальностью.

8.1.1863 г.

Отделить Царство Польское от западных губерний, восстановить границу. Этим прекратится беспрепятственное сообщение здешних поляков с варшавскими и разрешить... с полным правом туда выехать после продажи ими имущества. При упразднении границы Царства Польского, вероятно, имелась в виду цель присоединения Польши к России, по последствиям же выходит, что Польша в сущности не только не присоединилась, а стремится отделить к себе и западные губернии, при таких обстоятельствах лучше предоставить Польшу самой себе, чем давать ей возможность мутить другие племена.

З РАПАРТА ДЗІСЕНСКАГА ЗЕМСКАГА СПРАЎНІКА К.І.ФЛІЯРКОЎСКАГА АБ РАСПАЎСЮДЖВАННІ «МУЖЫЦКАЙ ПРАЎДЫ» СЯРОД СЯЛЯН ДЗІСЕНСКАГА І ВІЛЕЙСКАГА ПАВЕТАЎ

2.2.1863 г.

С 22 по 23 января ночью неизвестно кем прибиты были маленькими гвоздями к домам, на столбах... печатные листки № 5 и 6 «Мужыцкай праўды» в м. Верхнее у крестьянина Ивана Крамича, по дороге в им. Козловск, в м. Глубокое, в д. Верстейках, в м. Осингородке у крестьянина Захария Саковича, в д. Ласицах у кр. Федора Цырука.

ПРАДПІСАННЕ АДДЗЕЛА КІРАЎНІКА ПРАВІНЦЫІ ЛІТВЫ ІГНАЦЫЮ ЛЯСКОЎСКАМУ

6(18) мая 1863 г., Вільна.

Предписание отдела управляющего провинции Литвы Игнатию Лясковскому о возложении на него обязанностей военного начальника Ковенского воеводства и о мерах по обес-

печению транспортировки оружия из-за границы... Отдел заключил договор с бельгийским купцом на 10 000 ружей и винтовочных мушкетов со штыками и на миллион к ним патронов. Оружие купец будет доставлять через Пруссию внутрь края, но не далее 5—6 миль (42 версты)... Чтобы меньшие отряды, не привлекая к себе внимания Москвы, прибывали вовремя для забирания этих транспортов. Поздравления и братство!.

З ДАНЯСЕННЯ СЛЕДЧАГА ПАЛКОЎНІКА ЛОСЕВА ГЕНЕРАЛ-ГУБЕРНАТАРУ М.М.МУРАЎЁВУ

17 жніўня 1863 г.

Формирование шаек производится обыкновенно в больших лесах, в нескольких пунктах разом. В каждом пункте 20—30 чел. сперва обучаются, обмундировываются и вооружаются, тогда соединяются вместе и начинают действия. Получая почти всегда запоздалые сведения о местах шаек, мои распоряжения бывают часто несвоевременными, иногда не исполняются, распоряжения перехватываются мятежниками.

Потом мятежники, имея верные сведения о моих отрядах, принимают бой только когда им выгодно, знают местность, соединяются и противопоставляют неожиданную силу. После боя мятежники снова разделяются. Случается, мы преследуем самую меньшую часть, делая его бесполезным.

З ПАКАЗАННЯЎ М.ЧАРНЯКА НА СЛЕДСТВЕ

Выдававший себя за дворянина Михаила Шишко показал: около 24 мая 1863 г. прибыл ко мне в лагерь ксендз Бышевский и привез мне приказание Ржонда Народового отправиться в Дисненский уезд, где, как говорилось в приказе, я найду радушный прием и много охотников, ожидающих только начальника, чтобы выступить в лес. Вместе с тем, тот же ксендз вручил мне деньги (1000 руб. сер.) для расходов по формированию шайки и паспортный бланк... Подписав этот бланк на имя дворянина Маневского, я отправился на место назначения... В первых числах июня в Глубоком встретил меня какой-то господин и довез меня до шайки, расположенной в верстах 15 или 20 от Глубокого в больших лесах. (Цытавізна. — *Аўтар.*). В шайке было 26 человек. Инсургенты объяснили мне, что в Дисненском уезде крестьяне нас ненавидят, доносят начальству; вследствие этого в деревни отправляться за продовольствием нельзя было... Провианта становилось весьма мало... Я решил распустить шайку, что и сделал 28 июня.

З ПАКАЗАННЯЎ Ф.КАНАПЛЯНСКАГА ВІЛЕНСКАЙ АСОБАЙ СЛЕДЧАЙ КАМІСІІ

Не помню дня, кажется в первой половине июня с. г. я встретился с Дю-Лораном, которого знал только по фамилии, и, остановясь возле своей квартиры, вступил с ним в разговор, последствием которого было предложение с его стороны, чтобы я принял участие в польской организации. На другой же день Дю-Лоран явился ко мне на квартиру с каким-то господином. Предложив мне принять обязанность начальника губернии по организации, Дю-Лоран объявил, что все подробности, объясняющие эту должность, и сведения о лицах, с которыми поставлен буду в обязанность сноситься, я получу от пришедшего с Дю-Лораном господина. Господин этот, назвавшийся Константином (Калиновским), вручил мне номинацию и три печати... Он объяснил, что моя обязанность будет состоять в следующем: 1) Обратить самое сильное внимание на поспешность взыскания податей; 2) Из числа доставленных начальниками уездов податных сборов 1/8 часть оставлять у себя на случай непредвиденных расходов, а остальные передавать ему, Калиновскому; 3) Собирать сколько возможно, точные сведения о находящихся в уездах партиях (так назывались отряды восставших), о средствах их существования, как по части продовольствия, так и относительно их снаряжения... Калиновский... называл мне всех лиц, с которыми я должен сноситься как с начальниками уездов: ...Дисенского — Обрампольский (студент, недалеко от Дисны)... Обрампольский дал знать письмом через доктора Шимкевича, что хотя у него в усзде существуют еще достаточные запасы денег и снаряжения, но, судя по ослабевшей поддержке обывателей и общему упадку духа, трудно надеяться продлить движение без иностранного вмешательства. Обо всех этих сообщениях из уездов я тогда же передавал словесно Калиновскому, ровно и все пись-

менные увєдомления сдавал єму... Встречал С.Чеховича, Жабу, Суходольского, Лавреновича (Лангнера), Гатича, Малаховского...

Франц Яков Коноплянский.

Друкуецца па кн.: Восстание в Литве и Белоруссии в 1863—64 гг. Мн., 1964. Т. 1. С. 25, 33, 60, 311, 320; Т. 2. С. 163, 174, 203, 224.

Падрыхтаваў У.І.Ляскоўскі.

УДЗЕЛЬНІКІ ПАЎСТАННЯ 1863 г. — УРАДЖЭНЦЫ СУЧАСНАГА ШАРКАЎШЧЫНСКАГА РАЁНА

1. Багуцкі Адольф з Чырвонага Двара (каля Шаркаўшчыны). Ён жа і ўдзельнік паўстання 1831 г. Прысуд: пры знятці секвестра з маёнтка спагнаць узмоцнены 10-працэнтны збор з кошту маёнтка.

2. Вярыга, маёнтак Людвінова, удзельнік маніфестацыі супраць Расіі, хваляванняў сялян.

3. Вярыга Іван, арандатар фермы Ластавічы. Вызвалены ад секвестра.

4. Вярыга Эдмунд (1840—1902), студэнт Пецярбургскага універсітэта. Сасланы на катаргу.

5. Здрасёўскі Аляксандр, маёнтак Себасцьянава. Вызвалены на парукі, грашовы штраф 100 руб. серабром і ўзмоцнены 10-працэнтны збор з кошту маёнтка.

6. Канаплянскі Францішак (Франц Якаўлевіч), маёнтак Забор'е. Памёр па дарозе на катаргу. Маёнтак секвестраваны. (У 1831 г. удзельнічалі ў паўстанні яго родны брат Генрых і стрыечныя браты).

7. Пузыніна Габрыэля, м. Ігуменава (каля Шкунцікаў), паэтэса, удзельнічала ў хваляванні сялян.

8. Пузына, студэнт, удзельнік паўстання.

9. Пузына, жыхар г. Вільня, удзельнік паўстання.

(Пералік няпоўны).

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 215, 295, 299, 516, 694, 1297, 1430.

Лужкоўскі піярскі калегіум

Дзейнічаў у 1745—1832 гг. у м. Лужкі. Піяры былі запрошаны сюды ў 1771 г. уладальнікам мястэчка кашталянам полацкім Валерыянам Жабам, які падараваў манахам фальварак Віснік (у 1832 — 13 вёсак і 330 сялян), адвёў месца для пабудовы кляштара, касцёла (узведзены ў 1744—1756) і калегіума. Жонка Жабы ахвяравала на калегіум 1000 злотых. А.П.Сапуноў у кнізе «Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии». (Витебск, 1896) падрабязна расказаў аб рабоце гэтай навучальнай установы. Тут выкладалі прэфект-ксёндз, тры прафесары з ксяндзоў, адзін свецкі настаўнік, усяго 5 выкладчыкаў. Ксяндзы не атрымлівалі платы. Наведвалі калегіум 167 вучняў ва ўзросце ад 9 да 23 гадоў. Былі выпадкі, калі займаліся вучні ва ўзросце 25—33 гадоў. У першым класе вучылі чытаць, пісаць, граматыку, першую частку арыфметыкі. У другім класе вывучалі лацінскую граматыку, пачатковую геаграфію, свяшчэнную гісторыю, мараль; у трэцім класе — лацінскую граматыку, рыторыку, паэзію, логіку, грэчаскую і рымскую гісторыю, права народаў, еўрапейскую геаграфію, палітычную геаграфію; у чацвёртым класе ў першы год навучання вывучалі геаметрыю, алгебру Люліера, практычную геаметрыю ксяндза Забароўскага, астранамічную геаграфію і фізіку, у другі год навучання — эксперыментальную фізіку розных аўтараў: Брысона, Ясінскага і Малета, натуральную гісторыю, гісторыю мастацтваў, садаводства. Апрача гэтага, вывучалі рускую, французскую і нямецкую мовы.

Навучальныя гадзіны ў панядзелак, сераду, пятніцу і суботу былі з раніцы — ад 8 да 10 гадзін, пасля абеду ад 2 да 4 гадзін; па аўторках і чацвяргах вучыліся з раніцы, а пасля паўдня адпачывалі. У нядзельныя і святочныя дні вучні былі на ранішніх і вячэрніх малітвах, разам прысутнічалі «на духоўных навуках і катэхізісах». Навучальны год працягваўся з 29 верасня да 29 ліпеня.

У калегіуме праводзіліся штомесячныя экзамены, іншы раз пры гасцях, старшынях, пры сходзе кляштарных. Гадавы экзамен

праводзіўся ў ліпені пры сходзе гасцей. Ва ўзнагароду за добрыя веды малодшым вучням давалі кніжкі і абразкі.

У калегіуме ў аснoўным вучыліся дзеці памешчыкаў, шляхты Дзісенскага павета — Любецкіх, Бржастоўскіх, Корсакаў, Клётаў, Шырынаў і іншых. Прыязджалі ў Лужкі вучыцца і дзеці памешчыкаў з іншых павстаў — Полацкага, Лепельскага, Браслаўскага, Ашмянскага, Вілейскага, Драгічынскага, Ровенскага, Дынабургскага, Вількамірскага. Навучальныя дапаможнікі выпісваліся з Англіі, Францыі, Германіі і іншых краін. Фізічны кабінет штогод папаўняўся прыборамі з Нюрнбергскай фабрыкі: глобусамі, гальванічнымі машынамі, мікраскопамі, барометрамі, тэрмометрамі, рэтортамі, колбамі і г. д. Дастаткова было прыбораў для правядзення ўрокаў па практычнай геаметрыі. Для ўрокаў прыродазнаўства была «калекцыя натуральных пладоў», «калекцыя птушак». У 1809 г. настаўнік фізікі заклаў батанічны сад. Праводзіліся метэаралагічныя назіранні тры разы на дзень: ціск павстра, тэмпература, напрамак ветру і стан воблачнасці.

З 1783 г. калегіум уваходзіў у Навагрудскую, з 1790 г. у Піярскую навучальныя акругі. У 1782 г. былі 3 класы з тэрмінам навучання 6 гадоў, 4 выкладчыкі, 130 вучняў. Пасля далучэння Дзісенскага павета да Расійскай імперыі (1793) калегіум пераўтвораны ў павятовае 4-класнае вучылішча з 6-гадовым тэрмінам навучання (3-і і 4-ы класы мелі 2-гадовыя курсы).

Выпускнік школы Фердынанд Серафімовіч у будучым стаў доктарам вольных навук і філасофіі. У 1797—1808 гг. ён быў віцэ-прафесарам Віленскага універсітэта. Ён заўсёды падтрымліваў сувязь з навучальнай установай, падарыў ёй больш 300 кніг, а потым перадаў ёй усю сваю бібліятэку. У 1812 г. напалеонаўскія войскі нанеслі школьнай бібліятэцы вялікія страты. Прапала частка кніг і 60 геаграфічных карт.

У пачатку 1816 г. у вучылішчы адбыліся хваляванні, 47 вучняў былі выключаны. У 1825 г. навучальная ўстанова рэарганізавана ў звычайнае 4-класнае павятовае вучылішча. За ўдзел выкладчыкаў у паўстанні 1830—1831 гг. вучылішча 1.5.1832 г. закрыта, маёмасць піяраў канфіскавана. Сярод выкладчыкаў і выхаванцаў калегіума: філосаф А.Доўгірд, прафесар Віленскага універсітэта К.Пасалаеўскі, доктар філасофіі А.Паўстанскі, выкладчык нямецкай мовы Віленскага універсітэта П.Альбрыхт.

Падрыхтаваў К.А.Кожан.

Гістарычная статыстыка

ЗВЕСТКІ АБ НАЯЎНАСЦІ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ

У 60—80-я гады XIX ст. на тэрыторыі Дзісенскага павета былі адкрыты 33 народныя вучылішчы, у тым ліку 4 вучылішчы на тэрыторыі сучаснага Шаркаўшчынскага раёна: Лужэцкае (1862), Ігуменаўскае (1862), Стара-Шаркаўшчынскае (1863), Ёдскае (1869).

На тэрыторыі сучаснага Шаркаўшчынскага раёна ў канцы XIX—пачатку XX ст. працавалі некалькі царкоўна-прыходскіх школ: у Лужках, Шкунціках, Казаках, Саснoўцах, Пяліках. У той час у многіх вёсках былі адкрыты так званыя школы граматы: Рэдзькі (1898), Сталіца (1898), Казачкі (1897), Лугі (1890), Мікіценкі (1897), Погары (1897), Вялікае Сяло (1888), Баяршчына (1895), Бахіры (1892), Жукі (1897), Савіцкія (1894), Малошка (1890), Варанчукі (1900), Саснoўцы (1884), Буйкі (1900), Багі (1901), Грыгараўшчына (1898), Казакі (1884), Астраўляне (1889), Пялікі (1889), Галінова (1897), Каўшэлева (1891), Жарабцы (1901), Більдзюгі (1901), Корніца (1884), Жукоўшчына (1897), Васюкі (1898), Зямцы (1901), Ляскова (1899), Ракаўцы (1900), Слабада (1901).

Падрыхтаваў К.А.Кожан.

ПЕРАЛІК ВАЛАСЦЕЙ ПА СТАНАХ

Уезд Дисненский.

...В 1-м и во 2-м станах: Глубокская, Лужецкая. Во 2-м стане: Богинская, Верхнянская, Иодская, Луцкая, Поставская.

Во 2-м и 3-м станах: Игуменовская, Новопогостская.

Друкуецца па кн.: Волости и важнейшие селения Европейской России / Изд. Центрального статистического комитета. Вып. 5. Губернии Литовской и Белорусской областей. СПб., 1886. С. 26.

Воласці і важнейшыя населеныя пункты

У 2-й палове XIX ст. на тэрыторыі сучаснага Шаркаўшчынскага раёна існавалі тры воласці, якія ўваходзілі ў Дзісенскі павет: Ігуменаўская, Ёдская, Лужэцкая. У кнізе «Волости и важнейшие селения Европейской России» (СПб., 1886) на с. 18 утрымліваюцца падрабязныя звесткі пра кожную з гэтых валасцей.

Ігуменаўская воласць. Яе цэнтр — вёска Ігуменава, існавала недалёка ад сучаснай вёскі Пашкі. У ёй знаходзіліся маёнтак Іваняк, царква, харчэўня, карчма, народнае вучылішча.

У воласць уваходзілі тры больш-менш буйныя паселішчы:

Шкупцікі: 65 жыхароў, царква, піцейны дом, рынак, заезны дом.

Новая Шаркаўшчына: 132 жыхары, царква, яўрэйскі малітоўны дом, 6 крам, піцейны дом, рынак.

Старая Шаркаўшчына: 148 жыхароў, царква, 2 крамы, 2 піцейныя дамы, народнае вучылішча.

Ёдская воласць. Яе цэнтр — вёска Ёды: 116 жыхароў, крама, карчма, прыходскае народнае вучылішча.

Вёска Варопка: 41 жыхар, 2 крамы, карчма.

Лужэцкая воласць. Цэнтр — вёска Лужкі: 924 жыхары, царква, касцёл, яўрэйскі малітоўны дом, народнае вучылішча, паштовая станцыя, бровар, 14 крам, рынак, 5 піцейных дамоў, вадзяны млын.

Вёска Германавічы: 301 жыхар, капліца, касцёл, бровар, крама, ветраны млын, карчма, рынак.

Вёска Клінавое: 95 жыхароў, капліца, карчма, 4 разы ў год кірмашы.

Вёска Парэчча: капліца.

А вось якія звесткі ўтрымлівае тая ж кніга аб колькасці паселішчаў, насельніцтва і размеркаванні зямель па валасцях Дзісенскага павета.

Ігуменаўская воласць: паселішчаў — 53; двароў — 314; насельніцтва мужчынскага полу — 1983; насельніцтва жаночага полу — 2044; колькасць сялянскай зямлі (дзесяціп) — 5678; ворнай — 342; зямлі ва ўладаннях прыватных асоб усёй — 12 717; ворнай — 3531.

Ёдская воласць: паселішчаў — 80; двароў — 513; насельніцтва мужчынскага полу — 3049; насельніцтва жаночага полу — 3017; колькасць дзесяціп зямлі ў сялян усяго — 7274; ворнай — 517; зямлі ва ўладаннях прыватных асоб — 17 820; ворнай — 3061.

Лужэцкая воласць: паселішчаў — 81; двароў — 531; насельніцтва мужчынскага полу — 3277; насельніцтва жаночага полу — 3404; колькасць дзесяціп зямлі ў сялян усяго — 7930; ворнай — 503; колькасць зямлі ва ўладаннях прыватных асоб — 8004; ворнай — 2245.

У Старой Шаркаўшчыне ў 2-й палове XIX ст. было 28 дамоў і 191 жыхар. Да 1881 г. колькасць жыхароў тут павялічылася да 215 чалавек. Мелася ў Шаркаўшчыне некалькі крам, піцейныя дамы, рынак, паштовая станцыя. Існавала і народнае вучылішча, якое было адкрыта ў 1863 г. У канцы XIX ст. у ім навучалася 50 вучняў.

Былы настаўнік Шаркаўшчынскага вучылішча Валяр'ян Кандратавіч Латышонак успамінаў: «У 1905 г. школа размяшчалася ў старым драўляным будынку. Працавалі толькі два настаўнікі. Стаяла 25 парт, за якімі сядзелі 60 вучняў».

Знакамітыя роды, знітаваныя лёсам з Шаркаўшчынай

Значны след у гісторыі нашага краю на працягу XV—XIX ст. пакінулі прадстаўнікі вядомых магнацкіх і шляхецкіх родаў — буйныя землеўладальнікі і дзяржаўныя служачыя ВКЛ і Рэчы Паспалітай Зяновічы, Сапегі, Лапацінскія, Плятэры, Канаплянскія, Шырыны, Вазгірды, Вярыгі, Федаровічы і Багуцкія.

Зяновічы былі першымі з вядомых уладальнікаў Шаркаўшчыны. Шляхецкі род Зяновічаў, або Дэшпат-Зяновічаў, магчыма, паходзіць з Сербіі або Малдавіі. У XVI ст. Зяновіча надзяліў зямлёй Ягайла. Разам з Радзівіламі ў 1514 г. Зяновічы былі асноўнай ударнай сілай у Аршанскай бітве. Да гэтага часу яны ўжо валодалі маёнткамі Паставы, Мосар, Глыбокае, а з 1503 г. — Шаркаўшчынай. Так што нашы продкі не маглі мінуць удзелу ў Аршанскай бітве.



Герб Л.Сапегі.

Дакладна не ўстаноўлены межы маёнткаў, але вядома, што землі мястэчка Мосар даходзілі да берагоў Дзісенкі. Калі ж, па прапанове караля, Зяновічы заснавалі маёнтак Шаркаўшчына, то да яго адышлі абшары левага берага Дзісны, а правы застаўся за Мосарам.

Паводле «Слоўніка геаграфічнага», выдадзенага ў Варшаве ў 1890 г., Шаркаўшчына спачатку належала Юрыю Дэшпат-Зяновічу, пазней — Мікалаю Зяновічу і яго сыну Юрыю, потым унуку Мікалаю, урэшце — дачцэ апошняга Рэгіне. Рэгіна з мужам у 1604 г. прадалі Шаркаўшчыну Льву Сапегу.

А.Сапуноў і В.Друцкі-Любецкі ў працы «Материалы по истории и географии Дисненского уезда...» (Віцебск, 1896) адносяць гэты факт да 25 студзеня 1594 г., калі «земянин господарский повету ошменского его милость пан Юрий Янович Зенович на Мосару... именье свое отчизное, называемое Шарковщину, в повете Ошмянском под р. Дисна лежачье... за певную суму пенезей, то есть за тысячу коп грошей, личби и монеты Вел. князьства литовского, ясневельможному пану Льву Сапезе, канцлеру Вел. княжества литовского, продал».

Крыштоф Зяновіч, кальвініст, у 1540 г. фундуе кальвінскія зборы ў Смаргоні і Глыбокім. Яго сын Мікалай Багуслаў перайшоў у каталіцтва. Ян Зяновіч — удзельнік паўстання 1831 г. у Дзісенскім павеце. Ігнацы Дэшпат-Зяновіч, памешчык маёнтка Пліса, і яго жонка Юстына — удзельнікі паўстання 1863 г.

Сапегі — буйны беларускі магнацкі род, які лічыўся другім па значэнні (пасля Радзівілаў) у ВКЛ.

У XVI—XVIII ст. амаль уся сучасная тэрыторыя раёна належала да маёнтка і замка Сапегаў у Іказні.

Сямён Сапега ў 1440-я гады быў велікакняжацкім пісарам у Казіміра Ягелончыка. Яго маёнткі знаходзіліся ў Смаленскай зямлі, якая тады ўваходзіла ў ВКЛ: Ельня, Гарадзішча, Апакоўскі Пасад. У 1514 г. гэтыя землі заваявала Маскоўскае княства. Багдан Сямёнавіч Сапега (1450—пасля 1512) набыў Белае (сучасны Лепель). Адсюль пайшлі князі Бельскія.

Іван Сямёнавіч (1455—1517) — пісар, сакратар Вялікага княства, выконваў пасольскія і дыпламатычныя даручэнні. За дзяржаўныя заслугі атрымаў ад вялікага князя Друю, Іказнь і Пагост на Браслаўшчыне (1499), а таксама Ёды, Германавічы і Лужкі.

Павел Іванавіч (каля 1490—1579) — дзяржаўца браслаўскі, маршалак гаспадарскі, ваявода навагрудскі, дзякуючы шлюбу з князёўнай Гальшанскай набыў частку Гальшан, Станькава, Жывіцу. Удзельнічаў у вайне з Маскоўскай дзяржавай 1534—1535 гг. і Лівонскай вайне.

Міхаіл Іванавіч (1505—1540) страціў Іказнь, а таксама іншыя браслаўскія ўладанні. Яны адышлі да нашчадкаў жонкі.

Леў Іванавіч (1567—1633) — праўнук Багдана, стаў канцлерам і гетманам вялікім ВКЛ, ваяводам віленскім. Прымаў удзел у стварэнні трыбунала ВКЛ. Быў фактычна стваральнікам знакамітага Статута ВКЛ 1588 г., які дзейнічаў на Беларусі на працягу двух з паловай стагоддзяў. Як дзяржаўны дзеяч адстойваў суверэнітэт ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай, спрыяў развіццю беларускага кнігадрукавання.

Леў Сапега ў 1604 г. набыў Шаркаўшчыну, выкупіў Іказнь і Друю, у 1614 г. — Пагост. Апроч таго, валодаў Чарнобылем, Слонімам, Свіслаччу, Магілёвам, Куранцом, Мядзелам і іншымі маёнткамі. У Шаркаўшчыне Леў Сапега стаў фундатарам царквы, якая была пабудавана ў 1639 г.

Сапегі прадалі Ёды ў 1701 г., Пагост — у 1711 г., Лужкі — у 1734 г. Апошнім уладальнікам Шаркаўшчыны з гэтага роду быў Аляксандр Сапега (з 1713 г. па 1753 г.). Вялікі маёнтак Друю (10 фальваркаў, 1134 двары) Сапегі страцілі ў 1796 г. у выніку рэпрэсій з боку расійскага ўрада за ўдзел ў паўстанні Тадэвуша Касцюшкі. Сапегі разараліся, але ўсё яшчэ адыгрывалі значную ролю ў дзяржаве і ў нашым краі.

У гісторыі вядома імя ўдзельніка паўстання 1830—1831 гг. Яўстафія Каэтана Сапегі. У памяць аб ім у 1999 г. была адкрыта мемарыяльная дошка ў мястэчку Дзярэчын. На адкрыццё яе ў Беларусь з Кеніі прыязджаў нашчадак знакамітых прадстаўнікоў роду — Льва, Аляксандра, Францішка і Яўстафія Сапегаў — Яўстафій Севярын Сапега.

Бацька Яўстафія Севярына, Яўстафій Каэтан, быў палітычным дзеячам ва ўрадзе Пілсудскага. Сядзеў на Лубянцы, прыгавораны да пакарання смерцю. Сам госць 23 гады пражыў у Беларусі, бараніў Варшаву ў 1939 г. ад нямецкіх фашыстаў, трапіў у палон... Пасля вайны бацька і сын сустрэліся ў Афрыцы, дзе і пасяліліся.

Багуцкія ад Лапацінскіх у 1802 г. ва ўласнасць атрымалі фальварак Ракаўцы. У 1814 г. Матэвуш Багуцкі стаў уладальнікам двара Шаркаўшчына і Юзафова. У 1824 г. Матэвуш памёр. Двор Старая Шаркаўшчына і Юзафова перайшлі да яго сына Адольфа. Ён жа ўладальнік і Чырвонага Двара. Пазней маёнткі Адольфа па дзедзічнаму праву перайшлі да яго сыноў Роберта і Аляксандра.

Феліксу Нікадзімавічу Багуцкаму належалі Ракаўцы. Яму перайшлі Хіны (душ 41, дамоў 14). Паводле перапісу 1824 г., Фелікс — суддзя Дзісенскага межавога суда, 48 гадоў, плаціў падаткаў 139 руб. 81 кап.

У 1838 г. Багуцкім належалі Пятровічы (76 душ мужчынскіх, 79 душ жаночых), Старая Шаркаўшчына (хрысціян: 141 мужчына, 130 жанчын, яўрэяў: 246 мужчын, 247 жанчын), Ракаўцы (32 мужчыны, 38 жанчын), Буйкі (35 мужчын, 37 жанчын), Дзмітраўшчына (12 мужчын, 15 жанчын). За Адольфам Багуцкім у 1839 г. лічыліся 182 душы мужчынскія, за Феліксам Багуцкім — 79.

У нацыянальна-вызваленчым паўстанні 1830—1831 гг. прымаў удзел Фелікс Багуцкі, ён уваходзіў у камітэт паўстанцаў. Адольф Багуцкі таксама паўстанец. Калі паўстанне было падаўлена, ён прыбыў у Дзісну да Мураўёва-«вешальніка» з пакаяннем. Яму была даравана воля пад наглядам паліцыі. Але ў 1863 г. Адольф зноў прыняў удзел у паўстанні. На гэты раз пры зняцці секвестра з м. Чырвоны Двор спагналі ў казну ўзмоцнены 10-працэнтны збор з кошту маёмасці.

Герб роду Багуцкіх.

У 1832 г. у ліку паўстанцаў Гродзенскай губерні, якія трапілі пад Псковам у палон, быў Базыль Макарскі, ксёндз, іераманах піярскага ордэна. Ім аказаўся Іосіф Багуцкі. Яго адправілі ў Дзісенскі павет, на радзіму, пад нагляд паліцыі.

Апошнімі ўладальнікамі Чырвонага Двара былі Багдан і Лёля Багуцкія: ён — суддзя, яна — настаўніца. Па ўспамінах іх хатняй работніцы Браніславы Усцінаўны Любінскай, гэта былі адукаваныя і культурныя людзі, якія карысталіся вялікай павагай усіх, хто іх ведаў. З прыходам савецкай улады ў 1939 г. Багдан быў арыштаваны, хоць і сустракаў вызваленне ад Польшчы з вялікай радасцю. Памёр на лесараспрацоўках (у ГУЛАГу). Жонка яго была пазбаўлена работы ў школе, выехала ў Польшчу разам з дачкой Галінай. Сын Алег, у свой час успрыняўшы рэвалюцыйныя памкненні дзеда і прадзедаў, не захацеў з'ехаць з Беларусі, ажаніўся з беднай дзяўчынай, але не змог жыць у Шаркаўшчыне, дзе ўлады глядзелі на яго, як на «ворага народа». Па чутках, з'ехаў у Маладзечна. Сястра Багдана Зося была замужам за віленскім прафесарам Багдановічам, жыла ў драўляным панскім доме Старой Шаркаўшчыны (дзе цяпер сярэдняя школа № 1). Іх сын Кандрат да вайны вучыўся ў Чэхаславакіі, дзе і застаўся. Дачка Зосі Аліна выехала ў Польшчу.

Вазгірдаў род меў маёнткі: Красная Гара з фальваркамі Венсампаль, Лебядзінец, Сомчына, Погар і іншыя (Шаркаўшчынскі раён), а таксама вялікія маёнткі каля г. Дзісна: Галамысль, Горкі, Мікалаёва, Александрыя.

Род Вазгірдаў паходзіць ад беларускалітоўскіх князёў. Радніліся з Дэшпат-Зя-

Герб роду Плятэраў.

А вось лёс яго дзяцей. Вільгельм за ўдзел у паўстанні 1863 г. асуджаны на катаргу, канфіскавана яго доля — 1/3 маёнтка Тадулін. Малодшы, Ігнацы, служыў у царскай арміі з 1849 г. па 1857 г., з іх у 1853—1856 гг. — у Крыме, удзельнік Крымскай вайны.

Нашчадак гэтага роду Крыштоф Лапацінскі — дырэктар турыстычнай фірмы ў Варшаве.

Плятэры. Іх продкі ў сярэднія вякі рассяляліся па Беларусі: у Верхнядзвінскі раён, у Богіна (Браслаўскі раён) і ў Лужкі. У 1823 г. да Плятэраў перайшла Опса. Яе апошні ўладальнік У.Плятэр памёр у 1906 г.

У XVIII ст. маёнтак Лужкі дастаўся па спадчыне ад Тадэвуша Жабы яго дачцэ Апалінарыі Плятэравай. Яна ў 1840 г. прадала Лужкі Пабіяне Чапскай. Сын Пабіяны ў 1880 г. прадаў маёнтак зноў Плятэрам: Войцеху (1842—1900) і яго жонцы Генрыеце з Чапскіх. У 1900—1918 гг. Лужкамі валодаў брат Войцеха Віктар (1853—1918), за ім, з 1918 г. па 1939 г. — яго сын Ян (1908—1980).

Ад Плятэраў у Лужках застаўся палац — помнік сядзібнай архітэктуры, які служыць людзям да гэтага часу.

Апалінарыя Плятэрава прымала ў сябе ў палацы камітэт паўстанцаў 1831 г. Уладзіслаў Плятэр стаў сакратаром камітэта. Удзельнічалі ў паўстанні 1831 г. і Плятэры з маёнтка Вянуты. А найбольш вядомая з Плятэраў — Эмілія — узначаліла конны атрад паўстанцаў. Ёй прысвечаны вядомы верш Адама Міцкевіча «Палкоўнік». Праўда, Эмілія была капітанам у арміі паўстанцаў і памерла не ад ран, як гераіня, а ад хваробы.

У паўстанні 1863 г. на Расоншчыне актыўна дзейнічаў атрад Лявона Плятэра. Яго, 27-гадовага, прысудзілі да расстрэлу.

Федаровічы. Калі ў 1802 г. маёнтак Шаркаўшчына раздзялілі на два дзесяткі фальваркаў паміж крэдыторамі Лапацінскага, Юльянова і Базыльполле дасталіся Федаровічам, фальварак Свяцкія Казіміру Федаровічу.

У спісах дваран 1826 г. па Дзісенскім павеце, тымі, хто мае права ўдзельнічаць у выбарах, лічацца: Бярнард Федаровіч, сын Гілярыя, 38 гадоў, гранічны суддзя Дзісенскага павета, яго брат Станіслаў, 41 год, маёнтак Шаркаўшчына, душ мужчынскіх 73, дамоў 30, плацяць падаткаў 497 руб. 83 кап. Паводле спісу 1838 г. Васілю, Францу і Антону Федаровічам належыць фальварак Базыльполь (62 душы мужчынскіх, 68 душ жаночых). Федаровічам таксама належаць Непранікі (59 душ мужчынскіх, 60 душ жаночых), Бярнарду Гіляравічу Федаровічу, 50 гадоў, належыць Юльянова (72 душы мужчынскія, 79 душ жаночых).

Казімір Федаровіч (фальварак Свяцкія) — удзельнік паўстання 1831 г. Ён узначальваў атрад пяхоты. Пазбаўлены расійскімі ўладамі ўсіх правоў, змешчаны пад нагляд паліцыі.

Бярнард Федаровіч у 1839 г. аднавіў царкву ў Старой Шаркаўшчыне (пабудавана яшчэ ў 1639 г. па фундацыі Льва Сапегі). Царква Федаровіча прастаяла да 1907 г., калі яе наноў пабудаваў святар Жданаў.

У пачатку XX ст. Федаровічы пабудавалі палац у Базыльполлі, які захаваўся да нашага часу, з'яўляецца помнікам архітэктуры. Будынак выкарыстоўваецца пад бальніцу.

Шырыны. Цэнтрам уладанняў графаў Шырынаў стаў маёнтак Германавічы, які ў 1782 г. купіў Ігнацы Шырын ад графа Юзафа Гільзена за 2 млн злотых польскіх. Да маёнтка належалі аддзяленні (фальваркі) Белы Двор, Юзафова, Марыямпаль, Атокі, Падольшчына, Прамяны, Пузаны, Рэчкі і шэраг дробных фальваркаў.

Ігнацы Шырын фундаваў у Германавічах касцёл з кляштарам, надаўшы ім фальварак Рэчкі на 300 дзесяцін зямлі. Касцёл быў узведзены ў 1787 г. у стылі віленскага барока і захаваўся да нашых дзён. Тут размясцілася і фамільная пахавальня Шырынаў.

Чатыры сыны Ігнацыя далі пачатак чатыром лініям, названым па атрыманых у спадчыну маёнтках: юзафоўскай, парэцкай і падорскай. Германавічы з фальваркамі атрымаў трэці сын Ігнацыя — Юстын Шырын (памёр у 1852 г.), дзісенскі падкаморый, які ў 1822 г. купіў ад Віктара Юндзіла Шудзелеўшчыну, ад брата Антона Антопаль. Пабудаваў, ці, дакладней, закончыў у пачатку XIX ст. пачаты бацькам палац, а таксама на правым беразе Дзісны збудаваў капліцу Святых Пятра і Паўла.

Адным з апошніх уладальнікаў Германавічаў і застаўшыхся багацяў быў Уладыслаў Шырын (нар. у 1847 г.), жанаты з Вікторыяй Кажанеўскай (герб «Налеч»). У розны час Шырыным належалі: Галінова (мужчынскіх душ 142, жаночых — 147), Юндзілова (муж. 172, жан. 170), Шудзелеўшчына (муж. 60, жан. 83), а таксама Парэч і Антопаль, набытыя ад Пацеяў.

У 1831—1833 гг. Юзаф (Іосіф) Ігнатавіч Шырын судзіўся з князем Радзівілам аб размежаванні маёнтка Германавічы ад маёнтка Радзівілаў Чэрас.

У 1831 г. чацвёра з Шырынаў прынялі ўдзел у паўстанні супраць самадзяржаўя. Гэта былі: Юзаф Шырын з Белага Двара (меў 307 душ мужчынскіх і 328 — жаночых), палкоўнік на кані; брат Юзафа Юстын Ігнатавіч з Германавіч (380 душ мужчынскіх і 385 — жаночых); Антон Шырын з Парэчча (337 душ мужчынскіх і 343 душы жаночыя), былы павятовы харунжы, член камітэта паўстанцаў, заключаны ў турму г. Мінска.

Апошнім уладальнікам маёнтка Германавічы быў граф Антон Шырын, які памёр у 1938 г.

Падрыхтаваў У.К.Ляскоўскі.

На сумежжы двух стагоддзяў

Канец XIX—пачатак XX ст. — складаны перыяд, у які адбываліся значныя гістарычныя, палітычныя і сацыяльна-эканамічныя падзеі. Яны прынеслі змены ва ўсе сферы жыцця грамадства таго часу. Не засталася ў баку ад іх Шаркаўшчына.

Паступова развіваліся капіталістычныя адносіны. Узнікалі новыя прадпрыемствы па перапрацоўцы мясцовай сыравіны, прадуктаў земляробства. Хутка развівалася вінакурэнне. У Ёдах, маёнтку Казлоўск, у дварах Рафалова, Тадулін, Юдыцын і іншых дзейнічалі невялікія вінзаводы.

Першараднае значэнне надавалася будаўніцтву млыноў на рэках.

У сувязі з капіталізацыяй гаспадаркі пашырыўся рознічны гандаль, вырасла колькасць крам, асабліва ў цэнтры павета. У крамах, як правіла, працавалі яўрэі. Яны былі пераважна купцамі, уладальнікамі майстэрняў самага шырокага прызначэння.

У 1897 г. у Новай Шаркаўшчыне пражывала 1038 чалавек, было 119 дамоў, 2 малітоўныя дамы, 23 крамы, аптэка, 2 карчмы, у Старой Шаркаўшчыне — 127 чалавек, 16 двароў, крама, карчма. У м. Лужкі з 1901 г. працавалі фабрыка па вырабе швейцарскага сыру, сукнавальня, вінакурня, вадзяны млын, паштовая станцыя, народнае вучылішча, яўрэйская школа, лячэбніца, аптэка, 2 карчмы. Па 1—2 карчмы, краме, піцейнаму дому мелася амаль у кожным больш-менш буйным населеным пункце.

Сацыяльна-эканамічныя ўмовы ў мястэчках і вёсках на Шаркаўшчыне ў пачатку XX ст. у аснове заставаліся такімі ж, як і ў канцы XIX ст. Захаваліся буйное памешчыцкае землеўладанне, пережыткі феадальнай сістэмы — адработкі, арэнда з часткі ўраджаю і г.д.

У сельскай гаспадарцы Беларусі ў XIX — пачатку XX ст. капіталістычныя адносіны толькі зараджаліся. У асноўным панавала саслоўна-сярэдневяковае землекарыстанне. Ва ўладаннях 2658 памешчыкаў было 7 477 000 дзесяцін — 84,3 працэнта прыватнаўласніцкіх зямель, ці 46,7 працэнта агульнай зямельнай плошчы Беларусі. Магнаты-землеўласнікі валодалі дзесяткамі буйных маёнткаў і сотнямі тысяч дзесяцін зямлі. Напрыклад, князю Вітгенштэйну належала каля 1 млн дзесяцін, князю Радзівілу — 150 тыс., графу Патоцкаму — 121, графу Паскевічу — 84 тыс.

У нашай мясцовасці адным з буйнейшых землеўласнікаў быў граф Віктар Генрыкавіч Плятэр-Зіберг, уладальнік маёнтка Гарадзец. Графу належалі самыя лепшыя ворныя землі, лугі, пашы, лясы — каля 45 тыс. дзесяцін. Гэта ўдвая больш, чым мелі ўсе сяляне Лужэцкай воласці. Яшчэ большыя маёнткі былі ў яго ў Літве і Польшчы.

Граф Плятэр-Зіберг быў жорсткім эксплуататарам. Аб гэтым ведалі ўсе ў акрузе. Ён шырока выкарыстоўваў пастаянных і падзённых сельскагаспадарчых рабочых. Пастаянныя работнікі — батракі — жылі ў маёнтку, працавалі цэлымі сем'ямі. Сезонныя рабочыя ў вялікай колькасці наймаліся ў летні час для работы ў полі.

Шырока прымянялася і адработачная сістэма ў форме запашніцтва, калі памешчык даваў сялянам зямлю і насенне. Усе работы на гэтай зямлі сяляне выконвалі сваім інвентаром. А ўвосень вярталі графу насенне і аддавалі палову ўраджаю. Практыкаваў граф адпрацовачную сістэму за грашовыя і натуральныя пазыкі, за лес, за выпас жывёлы на сенажацях гаспадара, за збор грыбоў і ягад.

Цяжкім было жыццё рабочых і сялян, якія працавалі ў маёнтку Плятэра-Зіберга. Сяляне плацілі выкупныя плацяжы, пазямельны падатак, падушную подаць. Апрача казённых, яны адбывалі земскія павіннасці: грашовы збор, падводную, дарожную, паліцэйскую. Мірскія павіннасці служылі для ўтрымання валаснога праўлення і для іншых валасных расходаў. Плацяжы і зборы паглыналі большую частку сялянскіх даходаў, часта нават перавышалі чысты даход з зямельнага надзелу. Каб выплаціць падаткі, сялянам даводзілася з восені за бясцэнак прадаваць хлеб, ісці ў заробкі, залазіць у даўгі. За нявыплачаныя ў тэрмін падаткі мясцовыя ўлады часта забіралі ў сялян жывёлу і маёмасць.

Менавіта ў маёнтку Плятэра-Зіберга ў 1898 г. пачаліся хваляванні рабочых і сялян. У мястэчку Лужкі, маёнтку Гарадзец з'явіліся звароты да рабочых ад імя Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі. Яны былі накіраваны на «ўзбуджэнне рабочых супраць паноў». Два звароты-адозвы (на польскай мове) «Сіла рабочых — у саюзе» і «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!» захоўваюцца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве Літвы, у справах «Пракурора Віленскай судовай палаты» (палітычны аддзел, 1883—1917 гг.).

Калі ў маёнтку Гарадзец пачаліся хваляванні рабочых і сялян, з'явіліся адозвы, граф асабіста перадаў уладам дзве з іх. Яны былі зняты з дрэў пры ўездзе ў маёнтак 18 кастрычніка 1898 г. Плятэр растлумачыў начальству, што менавіта 18 кастрычніка, у нядзелю, ён быў у Лужэцкім касцёле, дзе даведаўся, што і тут наклеены падобныя адозвы да мясцовых сялян. Каля касцёла ён заўважыў двух прыезджых, адзін з якіх быў у шапцы студэнта.

У адозве «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!» гаварылася, што нават у самыя цёмныя куткі, дзе «панскае самавольства і царскі бізун былі доляй рабочага, дзе праўда саступае месца фальшу, пранікае святло сацыялізму, абуджаючы дух рабочых да барацьбы з тыраніяй». Адозва растлумачвала мясцовым рабочым і сялянам, што рабочыя ў гарадах крыху палепшылі сваё становішча, бо «салідарна змагаліся з фабрыкантамі, майстрамі, па-брацку падаўшы адзін аднаму рукі, усе разам ішлі на барацьбу, г.зн. кідалі работу, не ўступалі да таго часу, пакуль фабрыканты не згаджаліся на патрабаванні рабочых».

Другая адозва «Сіла рабочых — у саюзе» вучыла, як патрэбна змагацца з прыгнятальнікамі, з тыраніяй. Праграма барацьбы ўключала наступныя палажэнні:

«1. Паміж сабой будзем жыць у згодзе, у вольны час будзем старацца збірацца ўсе разам, каб мець магчымасць пагаварыць аб паляпшэнні нашага быту і параіцца, як і калі мы павінны паступаць са сваімі эксплуататарамі.

2. Створым у сябе касу. Грошы, здабытыя потам і слязамі, прапіваемыя намі, будзем лепш уносіць у агульную касу, заснаваную намі ж, і сабраныя грошы ўнясём у ашчадную касу — тады праз некаторы час збярэцца столькі грошай, што мы будзем у стане браць з гэтай касы на нашы патрэбы ў той час, калі кінем работу ў нашага эксплуататара і будзем дабівацца таго, чаго дабіваемся стачкай, ці, кінуўшы работу, будзем у стане стойка трымацца да таго часу, пакуль прыгнятальнік не пойдзе на ўступкі.

3. Будзем дабівацца абмежавання рабочага дня да 12 гадзін, з адпачынкам у час абеду.

4. Павышэння заработнай платы.

5. Чалавечага абыходжання з намі, г. зн., каб і словам, і справай абыходзіліся з намі, як з людзьмі, а не як з жывёлай.

6. Святочнага адпачынку, каб мы ў святы былі свабодныя ад працы».

Адозвы заклікалі рабочых і сялян да адзінства ў барацьбе за паляпшэнне ўмоў жыцця: «Таварышы рабочыя! Дабром нічога не даб'ёмся ад нашых эксплуатата-

раў, толькі барацьбой паступова можам дасягнуць лепшай долі. Будзем змагацца разам і пераможам!»

З'яўленне адозваў такога зместу ў Лужках і Гарадцы, у Снегах выклікала трывогу ў адміністрацыі Дзісенскага павета. Памочніку начальніка Віленскага губернскага жандарскага ўпраўлення па Дзісенскім і Свянцянскім паветах ротмістру Бардзіну было дадзена ўказанне правесці дазнанне. За ўсімі падазронымі асобамі быў наладжаны тайны паліцэйскі нагляд. Падазраваліся многія, у тым ліку віленскія мяшчане Сцяпан Людвігавіч Петрашкевіч, салдат 51-га драгунскага Чарнігаўскага палка, віленскі мешчанін Міхаіл Ісакавіч Гольдман. Ён быў вызвалены з-пад арышта пад заклад у суме 100 рублёў.

Пад падазрэннем знаходзіліся таксама віленскі мешчанін Цыбульскі і жыхар Барысава Дземідовіч.

Касір маёнтка Гарадзец Аляксандр Зейферт паведаміў мясцовым уладам аб тым, што, магчыма, складальнікам адозваў і распаўсюджвальнікам іх з'яўляецца стараста мястэчка Лужкі Івашкевіч, а таксама ўтрымальнік піўнога склада ў Лужках Аляксандр Вершылоўскі. Было дадзена сакрэтнае ўказанне паліцыі і жандармерыі сачыць за імі. Але з данясення начальніка Віленскага губернскага жандарскага ўпраўлення генерал-маёра Чаркасава пракурору Віленскай судовай палаты бачна, што «не ўдалося выявіць ні аўтара, ні распаўсюджвальнікаў гэтых адозваў, накіраваных на ўзбуджэнне рабочых супраць памешчыка, супраць мясцовага ксяндза ў мэтах дасягнення паляпшэння быту рабочых на агульных сацыялістычных пачатках».

З пачатку XX ст. рух сялянства актывізаваўся. Хваляванні былі звязаны з барацьбой за захаванне сервітутаў. Выступленні сялян падтрымалі іншыя слаі насельніцтва. Так, 13 ліпеня 1902 г. каля г. Дзісна, у лясным урочышчы Куркліншчына адбылася сходка рабочых. Паліцыі ўдалося выявіць месца сходкі. Тут жа ім у рукі трапіла 6 друкаваных выданняў, былі затрыманы 25 чалавек. 5 жніўня ротмістр Бардзін зрабіў агляд знойдзенага. Сярод выданняў быў «Манифест Коммунистической партии» з прадмовай Карла Кауцкага, на вокладцы было надрукавана «Руская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя», а на апошняй старонцы брашуры стаяў штэмпель Адэскага камітэта РСДРП; 2 часопісы «Голос рабочего»; пракламацыя, выдадзеная ў маі 1902 г. РСДРП.

За ўсімі ўдзельнікамі сходкі быў устаноўлены асобы нагляд паліцыі. Хутка і ў іншых месцах павета — Глыбокім, Друі, Язне, Лужках, Германавічах, Новым Пагосце — паліцэйскія знайшлі нелегальную літаратуру, рукапісныя лістоўкі, якія заклікалі да барацьбы з самадзяржаўем.

З кожным годам пратэст сялянства супраць царскіх улад, памешчыкаў, чыноўніцтва станавіўся больш свядомым. У многіх вёсках павета прайшлі сельскія сходы, на якіх сяляне-агітатары выказваліся за непадпарадкаванне ўладам, заклікалі да барацьбы. Заканчваліся такія выступленні, як правіла, арыштам сялян-агітатараў.

Асабліва ўзмацніўся сялянскі рух у Дзісенскім павеце ў перыяд 1-й рускай рэвалюцыі 1905—1907 гг. Сяляне без дазволу пасвілі жывёлу на панскіх сенажацях і пасевах, займалі ўчасткі памешчыцкай зямлі, высякалі панскі лес. У маёнтках Германавічы, Ёды, Гарадзец прайшлі забастоўкі сялян-падзёншчыкаў і батракоў. На валасных сходах сяляне патрабавалі рэзкага скарачэння сумы падаткаў і натуральных павіннасцей і нават поўнай іх адмены. Яны адмаўляліся плаціць жалаванне валасным старшыням, пісарам, суддзям, не сталі выбіраць дзесяцкіх і соцкіх. У шэрагу выпадкаў узнікалі сутыкненні сялян са стражнікамі.

Сялянскі рух увосень 1905 г. быў больш актыўным і арганізаваным, чым у папярэдні перыяд. Значна ўзмацнілася ў гэты час работа сацыял-дэмакратаў. У канцы 1905 г. пры Віленскім камітэце РСДРП былі створаны акруговыя арганізацыі для работы ў вёсцы і па кіраўніцтву сацыял-дэмакратычнымі групамі ў павятовых гарадах і мястэчках.

Сацыял-дэмакраты заклікалі сялян да захопу памешчыцкіх зямель, да стварэння рэвалюцыйных сялянскіх камітэтаў, да актыўнай падтрымкі рабочага класа ў яго барацьбе з царызмам.

Такія камітэты былі створаны ў Германовічах, Ёдах і ў іншых населеных пунктах.

1-я руская рэвалюцыя не вырашыла пастаўленых перад ёю задач, асабліва сялянскага пытання. Сяляне па-ранейшаму пакутавалі ад малазямелля, пераносілі здзекі ад памешчыкаў. Больш таго, захава-

лася шмат павіннасцей. У сялян пераважалі дробныя ўчасткі зямлі, цераспалосіца. Пераход да рыначных адносін патрабаваў рэфарміравання старых парадкаў у вёсцы. Не вырашыла гэтага пытання і Дзяржаўная дума, на якую ўскладаліся вялікія надзеі. Сталыпінская аграрная рэформа ўмацавала сялянскую буржуазію, паскорыла рост капіталізму ў сельскай гаспадарцы, аднак не вырашыла аграрнага пытання і не спыніла нарастання новай рэвалюцыі. У вёсцы і ў горадзе яшчэ больш абвастрыліся класавыя супярэчнасці. Аб падзеях у нашым краі неаднаразова расказвалася ў газетах і часопісах дэмакратычнага і ліберальнага кірункаў. У Шаркаўшчыне, Германавічах, Ёдах выпісвалі і чыталі беларускую легальную штотыднёвую газету «Наша ніва».

На старонках «Нашай нівы» з'яўляліся матэрыялы з нашых месц, падпісаныя псеўданімамі Германавец, Баяравец, Колішні, Шышкавец, Задзісенкавіч. У заметках, артыкулах расказвалася аб жыцці, культуры і побыце сялян у вёсках, размешчаных на тэрыторыі сучаснага Шаркаўшчынскага раёна. На старонках «Нашай Нівы» часта з'яўляліся карэспандэнцыі Язэпа Драздовіча, які падпісваўся псеўданімамі Я. Разора, Язэп Разора, Забыты Язэп, Язэп Народнік, Язэп Нарцызаў. У 1910 г. рэдакцыя «Нашай нівы» выдала першы беларускі каляндар. Яго вокладку аформіў Язэп Драздовіч.

Цяжкім выпрабаваннем для працоўных Шаркаўшчыны, як і ўсёй Беларусі, стала 1-я сусветная вайна. Губерня была аб'яўлена на ваенным становішчы. Частка мужчын была мабілізавана ў дзеючую армію. Астатняе працаздольнае насельніцтва прыцягвалася на абарончыя работы. Напрыклад, праводзіліся яны каля вёскі Васюкі. Адступленне рускай арміі суправаджалася масамі бежанцаў. Вёскі пусцелі, бяднелі, пустошыліся палі.

У краіне і асабліва ў заходніх губернях быў устаноўлены жорсткі ваенна-паліцэйскі рэжым.

Незадаволенасць сялян, салдат (а гэта ў большасці былі мабілізаваныя на вайну сяляне) палітыкай самадзяржаўся выліваласяў своеасаблівую форму пратэсту: пагромы мабілізаванымі памешчыцкіх маёнткаў, а ў зборных пунктах — харчовых і вінных крам.

Стыхійныя пагромы харчовых і вінных магазінаў адбываліся і ў павятовым горадзе Дзісне.

Некалькі гадоў 1-й сусветнай вайны прывялі да разбурэння эканомікі, збяднення насельніцтва. Цэны на прадукты і адзенне ў павеце павялічыліся ў 5—8 разоў у параўнанні з 1913 г. З продажу зніклі многія прадукты харчавання.

Туберкулёз, трахома, рэўматызм, рахіт, тыф і іншыя хваробы «касілі» шмат людзей, асабліва на вёсцы.

Хабарніцтва чыноўнікаў, бяспраўе і нацыянальны прыгнёт нараджалі ў народзе пратэст супраць царскай улады. Апошняя страціла свой аўтарытэт і трымалася толькі на паліцэйскіх дубінках і салдацкіх штыках.

Працоўныя Шаркаўшчыны горача сустрэлі вестку аб Лютаўскай рэвалюцыі, звяржэнні царскага самадзяржаўя. У многіх населеных пунктах, у тым ліку ў мястэчках Лужкі, Германавічы, Ёды, у Шаркаўшчыне прайшлі сходы працоўных і мітынгі ў падтрымку рэвалюцыі.

Перамога Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі прывяла да ажыўлення грамадска-палітычнага жыцця. Ствараліся новыя органы ўлады. У паветы прызначаліся павятовыя камісары, абіраліся выканаўчыя камітэты. У сакавіку такі камітэт быў створаны ў Дзісенскім павеце.

Л.М.Лабачэўская, К.А.Кожан.

Дакументы сведчаць

З АДОЗВЫ «ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!»

...Вясковы рабочы, пакорны і ціхі да гэтага часу, забіты і падуладны, абцяжараны празмернай працай, ноччу ўстае і ноччу кладзецца, з-за непасільнай працы і мізэрнага харчавання з маладых гадоў траціць фізічныя сілы і здароўе, спіць у памяшканнях, перапоўненых смуродам і гніллю, на бярлозе, таму што ўсё гэта заслужаная плата, як гавораць нашы прыгнятальнікі. Шэрая сярмяга, табе і гэтага многа. Ты ўсё стварыў, што сёння мае свет, а за гэта атрымаеш ва ўзнагароду галечу і голад. Першы прыклад агіднага абыходжання з рабочымі дае наш славуты эксплуататар Плятэр у Гарадцы, у якога рабочы лічыцца горш за шалёнага сабаку, той рабочы, дзякуючы крываваму поту якога і стогнам, перапаўняючым усю су-

светную прастору, — ён багаты; рабочы, задаўлены цемрай, нястачай і голадам, поўзае ля яго ног, трацячы рэшткі чалавечай годнасці. А ён працягвае мучыць і спакойна глядзець на нягучасных ахвяр.

З АДОЗВЫ «СІЛА РАБОЧЫХ — У САЮЗЕ»

... Мы рабочыя, без выключэння, беларусы, палякі, рускія, літоўцы, яўрэі і ўсе астатнія народнасці паміж сабой браты, усіх аднолькава эксплуатуюць памешчыкі, станем жа ўсе, маленькія і прыгнечаныя, у адну шарэнгу, пададзім адзін аднаму брацкія рукі і будзем агульнымі сіламі змагацца з крывапійцамі, таму што ніхто не заступіцца за нашы правы, калі мы не заступімся самі.

З ЛІСТОЎКІ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА САЮЗА РСДРП, ЗВЕРНУТАЙ ДА СЯЛЯН

...Вам павінна належаць не толькі ўся ўлада ў воласці, але і ўся зямля. Патрабуйце зямлі і волі, бярыце іх! Для гэтага выбірайце свае сялянскія камітэты, няхай яны разгледзяць пытанне, няхай яны распарадзяцца ўсімі ворнымі і лугавымі землямі... Рабочыя аб'ядналіся і разам вядуць барацьбу супраць царскага ўрада. Вы павінны далучыцца да іх. Разам будзе лягчэй перамагчы праклятага ворага і зрабіць лепшае жыццё. Узбройвайцеся, адымайце зброю ў стражнікаў, ураднікаў, станавых прыставаў, ляснічых і памешчыкаў і са зброяй у руках абараняйце свае справядлівыя патрабаванні!

Падрыхтаваў К.А.Кожан.

Узнагарода — Георгіеўскі крыж

З успамінаў Іосіфа Казлоўскага, жыхара в. Шышкі

... Глыбокай восенню 1909 года я атрымаў позву ў армію. Непакоіўся бацька, хвалявалася маці: сына адрываюць ад зямлі, ад гаспадаркі. Непакоіла іх і іншае: што будзе са мною далей, куды закіне лёс, ці вярнуся наогул жывы? Пяць гадоў мінула, як закончылася вайна з Японіяй, і нават у вясковай глушы ведалі аб разгромах рускай арміі і флоту. А раптам зноў што-небудзь?..

Але людзі тады яшчэ не прадчувалі, што новая навальніца будзе з захаду. Сапраўды, як можна было чакаць адтуль бяды, калі цар Мікалай II радніўся з германскім кайзерам?

Мяне ўзялі ў артылерыю. Служыў у Віцебску, у Казані. Давялося пабываць і на славутым Барадзінскім полі, пабачыць цара. Было гэта ў 1912 годзе. У гонар 100-гадовага юбілею славутай бітвы на Барадзінскім полі ўзвялі помнік, адзначалі яго адкрыццё.

Выстраіліся палкі пяхоты, кавалерыя, застылі батарэі гармат, наводчыкі ля іх. Паказалася світа на конях, пачулася: «Цар едзе». У шэрым мундзіры, на шэрым кані Мікалай II аб'язджаў калоны, віншаваў нас, нашчадкаў герояў вялікай бітвы. Па ўсім полі разносілася шматгалосае «ўра», некаторыя плакалі ад радасці, што бачаць жывога цара. На хвіліну ён прыпыніўся насупраць батарэй, і пад воклічы панёсся далей, акружаны світай генералаў.

Праводзячы вачыма цара, я ўспомніў пра загад, атрыманы ў Казані: дзе затрапеча чырвонае палотнішча, біце па тым месцы баявымі. Загад быў ад самога Мікалая II.

Страляць мне выпала не ў Казані, а пад Рыгай, дзе заспела мяне 1-я сусветная вайна. Служыў тады ў 8-й батарэі 43-й брыгады.

Немцы наступалі. Перавага іх адчувалася і ў артылерыйскіх ударах, і ў бранявым кулаку пяхоты. З гармат артылерысты білі па нас за 30 кіламетраў, а пяхота наступала на бронетранспарцёрах, біла з кулямётаў, нашы войскі неслі вялікія страты.

Мяне двойчы параніла, а пад Маладзечнам моцна кантузіла выбухам снарада. Больш двух месяцаў праляжаў у Вілейцы ў шпіталі. Не столькі ляжаў, колькі ездзіў: шпіталь быў перасовачны.

Пасля папраўкі камандаваў батарэяй, а задно быў казначэем. 35 тысяч царскіх рублёў у маёй сумцы ляжала. Колішняму падлетку-свінапасу такая сума, капітал гэтакі і прысніцца не мог. Выплачваў салдатам зарплату — за ваенную работу.

Кровапралітныя баі падарвалі баявы дух і ў нашых салдат, і ў нямецкіх. Трупы

загінуўшых віселі на калючых загародах, ляжалі на брустверах, у траншэях.

Потым наступіла зацішша. Наваяваліся. Салдаты з абодвух бакоў зразумелі: рускі селянін у шынялі забівае нямецкага селяніна ў шынялі, рабочы ў рускім шынялі забівае рабочага ў нямецкім шынялі. Пачалося братанне. Салдаты нямецкай і расійскай армій хадзілі адзін да аднаго, паціскалі адзін аднаму рукі, мяняліся на памяць рэчамі. Аж не верылася: нядаўна стралялі адзін у аднаго, а цяпер абменьваемся партсігарамі.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі зноў пачаліся баявыя дзеянні. Немцы перайшлі ў наступленне. У той час я ўжо камандаваў батарэяй, адступаў з ёю да Пскова. Атрымаў на вайне Георгіеўскі крыж II ступені.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі служыў у 10-м чырвонагвардзейскім батальёне, потым, як кантужанага, мяне прызналі непрыгодным да страявой службы і прызначылі камандзірам рабочай роты. Рамантаваў чыгунку, завод у Невелі. Працавалі мы з адной думкай: адстаяць заваяваныя свабоды...

Нарадзіўся на Шаркаўшчыне

ЖЫЦЦЁВЫ ШЛЯХ АРХІБІСКУПА В.КЛЮЧЫНСКАГА

Вінцэнт Ключынскі нарадзіўся 30 верасня 1847 г. у м. Шаркаўшчына у сям'і валаснога пісара. Яго бацька Адольф Ключынскі рана памёр, і выхаваннем дзяцей займалася маці Францішка з роду Корсакаў. Вучыўся Вінцэнт у Дынабургу (цяпер Даўгаўпілс, Латвія), а ў 1865 г. паступіў у Віленскую духоўную семінарыю. Як здольны выхаванец семінарыі быў накіраваны для далейшага навучання ў Духоўную акадэмію ў Пецярбургу. Акадэмію закончыў, атрымаўшы вучоную ступень магістра тэалогіі. У 1871 г. быў прызначаны прафесарам Віленскай духоўнай семінарыі. На працягу 28 гадоў працаваў тут выкладчыкам дагматыкі, тэалогіі і маралі. Адначасова выконваў абавязкі інспектара семінарыі, пазней быў залічаны ў склад ганаровых канонікаў, а пазней прэлатаў кафедральнай капітулы ў Вільні. Яго вельмі паважалі каталіцкія іерархі і вернікі. Ксёндз Ключынскі займаўся яшчэ і актыўнай грамадскай дзейнасцю. У 1889 г. у Вільні заснаваў таварыства дабрачынных асоб, якое пазней ператварылася ў аб'яднанне манахаў, дзе выхоўваліся дзеці, пакінутыя бацькамі, і падкідышы. У дзяржаўных прытулках для сірот умовай прыняцця было хрышчэнне паводле праваслаўнага абраду. Ключынскім былі заснаваны інтэрнаты для маладых людзей, якія рыхтаваліся паступаць у Духоўную семінарыю. Тут хлопцы мелі апеку і выхаванне ў каталіцкім духу. Займаўся справай міласэрнасці, апекаваў моладзь, якая рыхтавалася ў школы і майстэрні рамёстваў.

У 1898 г. віленскі біскуп Звяровіч накіраваў ксяндза Ключынскага ў Духоўны калегіум у Пецярбургу ў якасці прадстаўніка Віленскай дыяцэзіі. У 1905 г. у Рыме ён атрымаў ступень доктара тэалогіі. Пасля 12-гадовай працы быў прызначаны Рымскім Папам Піем X архібіскупам магілёўскім. 16 мая 1910 г. у касцёле Святой Кацярыны ў Пецярбургу з рук жмудскага біскупа Гаспара Цыртоўна прыняў біскупскае пасвячэнне. Пачаўся цяжкі перыяд змагання з царскімі ўладамі за правы каталікаў. Хаця і меўся талерантны Указ 1905 г., палітыка расійскіх улад і далей была непрыязнай да каталіцкага касцёла.

Ключынскі шмат увагі удзяляў адукацыі будучых святароў, узяў пад сваю непасрэдную апеку духоўныя семінарыю і акадэмію ў Пецярбургу. Увесь час адчуваў уціск з боку царскай улады ва ўсім, што тычылася касцёла.

Змучаны працай і цяжкасцямі жыцця, архібіскуп Ключынскі ў канцы 1913 г. падаў просьбу аб вызваленні яго ад сваіх абавязкаў. Папа рымскі з апостальскай сталіцы 21 ліпеня 1914 г. паведаміў аб прыняцці адпаведнага рашэння і звальненні Ключынскага. Каб зберагчы здароўе, ён выехаў на лячэнне на Каўказ, а пазней пераехаў у Крым, дзе лячыўся ў Алупцы. Памёр 11 лютага 1917 г. Пасля пахавальнага набажэнства ў Ялце яго цела было перавезена ў Пецярбург. Пахаваны святар на Выбаргскіх могілках.

Друкуецца паводле кн.: Rutkowcki F. Arcybiskup Wincenty Kluczynski .Poznan, 1929.

Пераклаў з польскай мовы І.Бунто.

Па старонках газеты «Наша ніва»

7 лістапада 1908 г.

З ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНІ

Жменька людзей у нас пачала ўжо рупіцца аб паляпшэнні жыцця свайго, закладаючы таварыства сельскай гаспадаркі, арганізуючы выстаўкі і г. д. Апроч таго ў некаторых большых мястэчках (у Дзісне, Глыбокім) ёсць ужо паказальныя хаўрусныя крамы. Больш усяго людзі пачалі ў нас рупіцца аб малочнай гаспадарцы, закладаючы як супольныя, так і прыватныя млячарні. Першую вялікую млячарню адкрылі ў 1905 годзе, каторая цяпер у год перарабляе з малака да 3000 пудоў масла. Цяпер, не лічачы малых прыватных млячарань, што перарабляюць толькі сваё малако, ёсць яшчэ 18 вялікіх заводаў (у гэтай лічбе 5 хаўрусных), каторыя пасылаюць сваё масла ў Англію. Летась паслалі на 175 000 рублёў. Гэтыя млячарні плацяць праз 6 летніх месяцаў па 9 капеек за гарнец (50 капеек за пуд малака), праз 3 зімовыя па 12 капеек (70 капеек за пуд) і праз 3 асеннія па 10 1/2 капеек (60 капеек за пуд малака). Кепска, што ў нас не ўмеюць даглядаць кароў. Вельмі добрай каровай у нас ужо лічыцца тая, што дае 500 гарцаў у год, а гэтакіх па вёсках можна палічыць на пальцах. У Данii з нашых кароў толькі 6 смяяліся. Там кепскай каровай лічыцца ўжо тая, што дасць 1000 гарцаў у год. Але добра будзе, калі каровы дадуць нам і па 1000 гарцаў, а лічачы па 10 капеек за гарнец, значыць па 100 рублёў; 50 руб. трэба адкінуць на корм, то астанецца яшчэ, апроч гною, 50 руб. Але пэўне мы гэтага скора не дачакаемся, бо палепшыць сваю млечную гаспадарку можна толькі тады, як ёсць грошы або танны крэдыт.

А ў нас, вядома, з грашыма цяжка і крэдыту няма.

Янка Алексяёнак.

1 студзеня 1909 г.

ДЗІСНА ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНІ

Ці з кепскага дазору, ці так з якой прычыны зладзеі і грабежцы разгасціліся ў нас, як у сваёй хаце. Вось, напрыклад, у маёнтку Галічыне, меж Полацкам і Дзісной, нядаўна ночкай злодзей вывеў з хлева пекную жаробку трох зім (на 70 руб.). След быў сочэн пад Полацк, але зладзея не злавілі і жаробку не вярнулі! Ізноў у маёнтку Кушліках на полі пры дарозе стаіць старая карчма, а ў ёй сядзіць сабе ціха жыд Лэйзар і трымае крамку і ваўначоску. Вечарам 6 грудня, з суботы на нядзелю, зайшлі да яго неякія незнаёмыя ды разам усе павыймалі рэвальверы, крыкнулі яму: «Рукі ўверх! Ні з месца!» і пачалі тут гаспадарыць па кішэнях, шафах, камодах, растраслі пасцель і адзежу. Знайшлі 80 рублёў, срэбны зэгарак і новую машынку для шыцця. Забраўшы гэты дабытак, прыгразілі Лэйзару, што, калі ён або хто з яго сям'і будзе крычаць, дык вернуцца і заб'юць яго, а самі пайшлі сабе ціха — невядома ў каторы бок...

Таксама ў маёнтку Бяздзедавічах у тамтэйшага каваля ночкай з 7 на 8 грудня злодзеі забралі ўсё, што толькі было (кавадла, жалеззя, шчыпцы і др.). Сцянулі на якіх 200 рублёў. Ні дабра, ні зладзеяў не знайшлі.

І жыві цяпер! Чалавек не можа быць пэўным ні свайго жыцця, ні дабра.

Я.Разора.

21 мая 1909 г.

МЯСТЭЧКА ГЕРМАНАВІЧЫ ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНІ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

Наша мястэчка ляжыць абапал ракі Дзісенкі і хаця абедзве стараны разам становяць мястэчка, і то незаўднае, але розныя маюць названня. Правы бок мястэчка завецца Стары Двор, а левы ўжо проста Германавічы. Стары Двор калісь і запраўды быў адно дваром, належаў ён даўней да Тызенгаўзаў, а пасля перайшоў у рукі Шырынаў. Шырыны адзін па адным згалелі, і вось іх аграмадны маёнтак — гэты самы Стары Двор, за невыплату даўгоў колькі лет назад узяў пад сябе банк, а леташняга году банк парэзаў увесь маёнтак на часткі і распрадаў акалічным мужыкам. Германаўская зямля добрая (падглінак), але надта спустованая. Мужыкі гэтай вясной узяліся за будоўлю, і весела глядзець, як на шырокіх апушчаных палях, на каторых паследнімі гадамі нічога не радзіла, завіхаюцца з плугамі і сахамі мужыкі — кожны каля свайго вучастка і як весела выглядае на сонцы рунь жытняя.

Чутно на свеце, там і сям заводзяць суполкі і хаўрусы. Вось і прыходзіць на мысль, што гэтым гаротнікам, старадворскім пасельнікам, у іх цяжкім змаганні пры будоўлі новых сяліб вельмі б памог хаўрус, каб яны ўсе разам куплялі розныя матэрыялы і тавары, то гэта ім прышлося б і шмат танней, і лягчэй, а цяпер то трудна прыходзіцца.

Даўней у нас у мястэчку саўсім не было ніякай школы. Але колькі лет таму назад местачковыя жыды нанялі вучыцеля і дом і такім парадкам завялі з разрашэння начальства вольную («частную») школу. Цяпер да гэтай школы прылучыліся сяляне. З хрысціянаў. У нашай школе вучаць толькі чытаць і пісаць, добра б было, каб вучылі яшчэ і рэмесла, і сельскай гаспадаркі.

Жыцелі па вёсках кругом Германавіч больш каталікі, праваслаўных мала, а ў самым мястэчку і на землях, купленых ад Старога Двара, жывуць такжа і стараверы; у самым мястэчку шмат ёсць і жыдоў. Гадоў таму 15 назад знайшліся ў нас і літвіны. Яны купілі два двары каля Германавіч і пабілі іх на хутары. Усе беларусы, стараверы, жыды і літвіны жывуць у нас згодне, калі не лічыць пятроўскага кірмашу, на каторым з году ў год ёсць у нас звычай біцца вёска проці вёскі.

Германавец.

10 чэрвеня 1910 г.

З-ПАД ШАРКОЎШЧЫНЫ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНІ

У нас стаіць небывалая спякота, суш такая, што гінуць пасевы і сенажаці, на вышэйшых лугах трава крышыцца пад нагамі — някошаная яшчэ. Дзе-нідзе і лес загараецца, млыны «коламі звоняць»; развяліся пажары па вёсках: між Друяй і Дзісной нядаўна згарэла некалькі сяліб, а ў мястэчку Міёрах (у ноч 24 мая) згарэла 10 хат — самыя багатыя жыдоўскія крамы і манапольна. У вёсцы Шышкі (каля мястэчка Германавічы) малады чалавек, купаючы ў Дзісенцы каня, сарваўся і папаў у ваду. Праз 5 гадзін знайшлі і выцягнулі яго нежывога: меў у руцэ аброць, а на твары і плечах знакі конскіх капытоў. Асіраціў бацькоў і жонку.

І. Разора.

9 верасня 1910 г.

МЯСТЭЧКА ЛУЖКІ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНІ

Мінуўшага тыдня ў нашым мястэчку ўзняўся грамадны пажар, каторы змёў часць мястэчка. Пажарнай дружыны ў нас няма і няма ніякай арганізацыі на прыпадак пажару, дык ніхто не ведае, за што схапіцца пры няшчасці. Кожны бяжыць ратаваць сваё дабро, а тым часам агонь, пакінуты сам сабе, расце. Мястэчка наша дагэтуль было беднае, а цяпер яшчэ горш прыдзецца нашым мяшчанам.

Мікіцёнак.

16 верасня 1910 г.

ВЁСКА ЦЯРЭШКІ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА (КАЛЯ ГЕРМАНАВІЧ)

Завяліся тут такія людзі, што пераймалі на дарозе, вымагаючы «паўрубля на бутэльку». Неяк гэтымі днямі 7 такіх, сабраўшыся ў Германавічах у карчме, пілі і ў карты рэзаліся аж да поўначы, а з поўначы выйшлі на вуліцу і пачалі лупіць вокны — 30 вакон разбілі і пайшлі дамоў, а назаўтра парасхадзіліся хто куды на работу.

Язэп.

ВЁСКА ПЕСТУНЫ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

У нашай вёсцы выйшла такое здарэнне: малады малец (сын аднаго паўвалочніка) зрабіў суседзям коньмі нейкую шкоду. Баба суседка прыйшла да яго ў хату, каб пасварыцца за шкоду і, вылаяўшы мальца, пайшла на гарод капаць бульбу; тады гэты малец са злосці ўзяў стрэльбу і, выйшаўшы на гарод, стрэліў у бабу (нібы па абмылцы, замест у зайца). Збегліся людзі і прывялі к яшчэ жывой бабе хлопца-убійцу; ён прасіўся, каб дараваць яму, але, уміраючы, баба яму сказала: «Забіў ты мяне, заб'еш і яшчэ некага, ты і не адну мяне забіў — ты забіў і маіх трое маленькіх дзетак».

За 2 гадзіны баба памерла. Мальца нікуды не пусцілі. Схадзіліся і з'язджаліся людзі і ўсе лаялі хлопца, а после, зрабіўшы дазнанне, адзелі ў адзёжу нябожчыцу і адправілі, куды трэба.

Разора.

17 лютага 1911 г.

МЯСТЭЧКА ГЕРМАНАВІЧЫ ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНІ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

Мястэчка наша невялікае ды і тое раздзелена ракой Дзісенкай на дзве палавіны. Кругом Германавіч шмат вялікіх вёсак, у каторых жывуць скрозь толькі беларусы

— каталікі ды хат 20—30 перасяленцаў літвінаў. І вось сталася ў нас такая справа. Мы, беларусы, тут адвечныя жыцелі і ніколі для нас не было навукі ў касцелі пабеларуску, заўсёды толькі па-польску, хоць мы і мала што з гэтага разумеем; а як перасяліліся сюды літвіны, то для сваёй малой жменькі зразу дабіліся і песень літоўскіх у касцелі, і ружанца і ўсяго другога. А мы, хаця нам, канешне, патрэбна гэта навука ў нашай роднай мове, маўчым і не маем смеласці дабівацца свайго. Ксяндзы ж самі гэтага зрабіць нам не клапоцяцца.

Даждаліся мы нечуваных рэчэй: у нас ужо наша маладзёж мала што п'янствуе, але яшчэ прабуюць на дарогах грабіць і рэзаць людзей. Дайце ж нам беларускую зразумелую для нас навуку веры нашай у касцелі, можа тады словы нашых айцоў духоўных будуць трапляць да галавы і да сэрца людзей.

Баяравец.

24 сакавіка 1911 г.

* * *

Зямля каля Дзісны добрая, але народ кругом бедны надта, а гэта затым, што вёскі заціснутыя між дварамі, мала маюць пашы і з вузкіх сваіх шнурочкаў чуць-чуць могуць пракарміцца. Апрыч гаспадароў-мужыкоў у нашай старане многа ёсць беззямельнай шляхты, каторая ходзіць па арэндзе і на запашку. Шляхта гэта нічым не розніцца ў спосабе жыцця, як і ў сваім развіцці, ад мужыкоў, хіба толькі тым, што больш выпівае гарэлкі і скарэйшая да звадкі і бойкі. Цяпер з вясной паміж гэтых беззямельных гаротнікаў пачынаецца, як яны кажуць «tosawanniesia»: адны, папрацаваўшы колькі год на арэндзі і за свой крывавы пот не зарабіўшы нічога, апрыч кавалка чорнага хлеба, кідаюць фальварак і шукаюць шчасця ў другім мейсцы, а на іх мейсца ціснуцца новыя, плацячы вар'яцкія цэны за арэнду зямлі. Іншыя ізноў, дрэнна выйшаўшы на арэндзі, ідуць запашнікамі да новых арандатараў, каторыя на іх мейсца садзяцца. У гутарках тутэйшай шляхты толькі і чуеш цяпер: арэнда, запашка — ды сыпяцца цыфры соцен рублёў, каторыя трэба выбраць ім і аддаць у двор. А што самім — спытаеш? Абы пражыць. І дзіва бярэ, скуль столькі ў гэтых людзей цярплівасці і любві да гэтай зямлі: яны ж працуюць ад ранку да ночы — абы толькі пражыць. Дзяцей няма калі вучыць, бо гаспадарка забірае і найменшага ў сям'і да працы, каб толькі пражыць, каб капацца ў гэтай зямлі. Даўно трэба было звярнуць Гасударственнай Думе ўвагу на гэтых беззямельных гаротнікаў і агранічыць арэндныя цэны на зямлю, каб гэтыя белыя нявольнікі маглі вальней дыхнуць родным паветрам, каб апрыч пытання «як пражыць»? магла знайсці ў іх душы і думка, як стацца карысным грамадзянінам свайго краю.

В. Л.

31 сакавіка 1911 г.

МЯСТЭЧКА ГЕРМАНАВІЧЫ ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНІ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

У нашым мястэчку ўсёй інтэлігенцыі — ксёндз, вучыцель, сядзелец ды вураднік, а гандлю — 4 крамы, але ўсё ж такі мястэчка! А цяпер прарочаць, што Германавічы разрастуцца, а гэта дзеля таго, што завялі тут што тыдзень тарговы дзень. Пакуль што ў тарговыя дні ў нас не шмат п'яных часцю затым, што яшчэ не нарыхтаваліся мястачкоўцы прадаваць гарэлку з хат, а часцю затым што ў нас сядзелец вялікі фармаліст і, трэба сказаць, чалавек сумленны, бо ўжо як манаполька зачынена, то за ніякія грошы і нікому, як кажуць, і самому генералу гарэлкі не прадасць.

Каля Германавіч пачалі цяпер асушаць багністыя балоты на пахату. Там, дзе даўней нічога, апрыч журавін ды крывенькіх сасонак, не расло, цяпер такія палі рунеюць, што аж глянуць міла. На гэткіх навінах з-пад імшароў і багна цяпер родзіць усякае дабро: жыта дае па 25—30 зернят. Праўда, што не мала каштавала асушыць гэткае балота, але за колькі год вылажаныя кошты вярнуліся з навязкай.

Баяравец.

28 красавіка 1911 г.

МЯСТЭЧКА ГЕРМАНАВІЧЫ ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНІ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

Надта цяжка стала апошнімі гадамі беззямельным людзям: арэндатарам і запашнікам. Да 1905 году былі ўжо высокія арэнды на зямлю, а цяпер яшчэ пабольшалі. Напрыклад, за фальварк, каторы мае 25 пудоў высеву, у 1905 гаду плацілі арэнды 195 рублёў, а цяпер — 250; за двор, каторы мае 100 пудоў высеву, у 1905 гаду

плаціл 750 рублёў, а цяпер — 1100. Даўней запашнік браў за сваю працу каля зямлі палавіну ўраджаю, а цяпер толькі дзве пятыя часці, а тры пятыя ідуць арэндатару. Ды і арэндатар гэты ад рання да ночы павінен працаваць і аддаць усё за арэнду, нават кусок хлеба жалее з'есці сам, не кажучы ўжо аб малаку і масле, каторыя толькі ў свята бачыць. Наракаюць, што людзі пруцца ў гарады і ў Амерыку, а што ж рабіць гаротнаму беззямельніку, куды дзецца? На падзёншчыну кажуць ісці, а які ж заработак падзённы? Ці ж з гэтага можна пракарміцца? Найдужэйшы работнік падзённай работай можа выгнаць за круглы год каля 100 рублёў, а ці ж гэта грошы ў цяперашнія часы для сямейнага чалавека? Нашы беззямельнікі збіраюцца грамадой падаць прашэнне ў Гасударственную Думу, каб назначыла справядлівую арэнднуюплату за зямлю. Мы памятаем, што на выбарным сабранні ў Гасударственную Думу ў горадзе Дзісне нашы памешчыкі казалі, калі мы аб гэтым заікнуліся: «пагодзімся, браццяа», дык тады нашы арэндатары асталіся на іх старане; тым часам пасля выбараў павысілі цану арэнды ў паўтара раза.

Арэндатар.

9 чэрвеня 1911 г.

МЯСТЭЧКА ГЕРМАНАВІЧЫ ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНІ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

У № 13 «Нашай нівы» нейкі Баяравец пісаў аб парадках у нашым мястэчку і пахваляўся, што тут няма п'янства ні патайной прадажы гарэлкі. Каб гэтак было, было б надта добра, але папраўдзі ёсць саўсім іначы. Ад таго часу, як у нашым мястэчку завялі кірмашы, што тыдзень, п'янства пачало разрастацца, патайных шынкоў развялося больш, чым трэба; кажуць, што нават даюць на павер гарэлку і патайныя местачковыя шынкі, абы толькі найбольш яе выпівалі. Даўней, калі былі корчмы і карчмары плацілі працэнт, то яны самі пільнавалі, каб сяляне не займаліся патайным шынкарствам, а цяпер нечуванае разрастаецца п'янства ў кожнай хаце. П'юць усе: і дзеці, і ўзрослыя, і мужчыны, і бабы, а п'ючы гэтак, прапіваюць і розум, і здароўе, і дастаткі свае. У канцы, праз колькі год, наша вёска дойдзе да поўнай руіны пры гэткіх парадках. Адну толькі маемо тут пацеху з таго, што цяперашні германаўскі ксёндз вучыць народ шанаваць сваю мову і звычаі беларускія, а казанні кажа для беларусаў у іх роднай беларускай мове, і хоць цяжка гаварыць пабеларуску, але стараецца, і за гэта старанне вялікае яму дзякуй.

Германавец.

7 ліпеня 1911 г.

МЯСТЭЧКА ГЕРМАНАВІЧЫ ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНІ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

Тут шпарка разрастаецца пошасць на кароў. Хвароба выяўляецца так: галава гарачая, пухне язык і выпірае вон, гнояцца капыты. Праз тыдзень-другі карова прападае з голаду, бо есці не можа. Малаком ад гэтых кароў адны гаспадары накармілі кабаноў, а тыя праз два-тры дні паздыхалі. (Летась у № 36 «Нашай нівы» было апісана, як ратавацца ад гэтай хваробы, у стацці «Яшчур»).

Паміж Германавічамі і Пагостам ідзе дарога на Зялёнку і Красоўшчыну: дарога вельмі патрэбная, але яе дзесяткі гадоў ніхто не правіў, і яна блізка ўжо саўсім непраезджая. Нядаўна адзін селянін, едучы на кірмаш у Германавічы, адважыўся пусціцца гэтай дарогай, але яго адвага не дала карысці, ён зваліўся з насланага пакоту ў багна і выкруціў сабе руку. Усе акалічныя жыхары страшэнна помстуюць, што не прыціснуць каго трэба, каб папраўіць гэту дарогу.

S. Д.

8 сакавіка 1912 г.

ШКУНЦІКІ ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНІ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

Як я чытаю ў «Нашай ніве» аб тым, што патрэбна казанне ў беларускай мове па касцёлах, то мне, як праваслаўнаму беларусу, хочацца сказаць, што і па цэрквах казанне ў беларускай мове вельмі патрэбна. За маёй яшчэ памяці ў нашых Шкунціках быў стары свяшчэннік, каторы заўсёды пасля імшы выхадзіў на амбону і гаварыў казанне. Але як гаварыў! Усе бабкі, усе мы слязамі заліваліся, слухаючы яго простых-прасцюсенькіх старэчых слоў. Вось мне здаецца, добра было б, каб і цяпер гэтак сама сталася.

Колішні Шышкавец.

22 сакавіка 1912 г.

МЯСТЭЧКА ГЕРМАНАВІЧЫ ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНІ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

Падходзіць Вялікдзень і па нашых вёсках хлопцы рыхтуюцца хадзіць з валачобнымі. Ужо цяпер збіраюцца па хатах і пяюць «Хрыстос». Калі ж прыйдзе вечар Вялікадня, уся акруга ажно дрыжыць ад ноты гэтай старасвецкай песні.

Дзісенка ўжо сагнала лёд, і ганкі паплылі на Дзвіну, а Дзвіною ў Рыгу.

У нашых ваколіцах за зіму нішто зараблялі людзі каля лесу, хоць ужо лясы і звяліся.

Баяравец.

11 кастрычніка 1912 г.

МЯСТЭЧКА ГЕРМАНАВІЧЫ ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНІ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

У вёсцы Шышкі ў панядзелак 17.IX адзін тутэйшы селянін К. Шышка са сваёй дачкой і жонкай адправіліся за вярсты дзве ў наёмку, выбіраць бульбу, пакінуўшы сваю хату з чатырма дзяўчынкамі, ад аднаго да 8 год. Як вярнуліся вечарам дамоў, доўга шукалі дзяцей на вёсцы, пакуль не дадумаліся паглядзець у куфры, там іх усіх чацвёра знайшлі мёртвымі. Відаць, што дзеці, гуляючы, паўлезаўшы, закранулі неяк века, каторае сашчэкаўзнуўшыся, зачынілася, і клямка заскочыла на прабой. Куфар быў шчыльны, і дзеці падушыліся ў ім без паветра.

Д.

ВЁСКА БАБРОЎШЧЫНА ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

Між азёр і некаторых рэчак цягнуцца на колькі вёрст акопы і нейкія даўнейшыя крэпасці. Шмат знаходзіцца карыстлівых людзей, каторыя шукаюць там закапаныя грошы. Дзе ж яны там знойдуць тое багацце, калі не ведаюць, скуль узяліся тыя акопы і валатоўкі, дык нашто раскідаць косці старых ваякаў? Знаходзяць тут, як казалі, медзяныя абручы са званочкамі і рознае аружжа саржавеўшае, жалезнае.

ДВОР КАМЕНПОЛЛЕ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

Калісь даўней каля крыніцы стаяла тут капліца. І людзі кідалі грошы ў гэту бузу на ахвяру. Цяпер, капаючы канавы, уладзелец выкапаў канаву да самай крыніцы і, адправіўшы работнікаў, выдабываў з бузы старасвецкія медзякі. Кажуць, што ўладзелец мае ахвоту пабудаваць тут новую капліцу.

Драздовіч.

23 лістапада 1912 г.

ДЗІСЕНСКІ ПАВЕТ, ЁДЗКАЯ ВОЛАСЦЬ

Ёсць тры манапалькі ў Ёдзкай воласці, давялі яны нашых сялян да голасці. Не кідаюць ў нас прадвечнай моды, што аўторак хадзіць піць гарэлку ў Іоды. У аўторак на кірмашы б'юцца дзецюкі нашы. Ходзяць піць гарэлку да жыдоўкі Сэўкі валасныя суддзі, а такжэ бабы і дзеўкі. Хоць за гарэлку сварыцца ксёндз у касцелі, але п'юць на йгрышчы і на вяселлі; і свяшчэннік кажа: перастаньце гарэлку піць, здароўе і гаспадарку губіць. П'юць жа: Юрка і Мацей, не жалеючы галодных сваіх дзяцей. Хоць другі з п'янства і згіне, але гарэлкі ён не кіне. Ёсць на аднэй дарозе заезд-манапалька завуць: Варонка — гэта для п'яных мілая старонка, а на другой дарозе казёнка ў Замошшы; тут многа прапіваюць грошы; каб гэта вучылішчы на места казёнак, не адзін быў бы святлейшы дзяцёнак; каб пакінулі гарэлку, шнуры і суды — не мелі б мы столькі рознай бяды. На судах ліецца гарэлка-вадзіца, а да іх зачэпка вясковая шахаўніца. Каб гарэлку піць зракліся, з вёсак на хутары разышліся, тады роўнае права слабы меў бы з дужым: не пасвіў бы ніхто каня на чужым, кожны сеяў бы кармавыя травы, не рабіў бы другому шкоды і патравы, толькі як прападзе шахаўніца, гарэлка, суды, жыць людзі будуць без гора і бяды. Хацеў бы я, каб былі лепшыя парадкі, як верны сын Беларусі-маткі. Напісаў рэфарматар гэтага парадка, прозвішча: ад сахі Перакладка. (Псеўданім.)

21 снежня 1912 г.

ВЁСКА СТАЛІЦА ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНІ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА

Ніколі гэта вёска не мела добрай славы. З давён даўна, калі хто на каго меў якую злосць, то наймаў сталічан, а яны за чарку гарэлкі, за залатоўку гатовы былі заўсёды напасці і выбіць чалавека. Праўда, што і з паміж сталічан здараліся людзі спакойныя, справядлівыя і разважныя, але за благімі пайшла на ўсіх адна слава. Але даўней можна было жыць. А цяпер, што тут і ва

ўсёй ваколіцы дзеецца, то крый Божа! Пайшло п'янства ды буянства, якога з вякоў наша старонка не знала. Шынкароў намножылася без ліку-меры, што горшага было па нашых вёсках, усё хапілася за шынкарства. Прадаюць гарэлку, купляюць крадзенае, пасылаюць красці і розныя гэткія справы абрабляюць цяпер па новамодных карчмах «з-пад хвартуха». Ня можна сказаць, каб не было ўжо саўсім каля нас заработкаў, ёсць і такія, і гэткія, але народ бедны, абдзёрты, бо ўсё ідзе на гарэлку ды на карты.

Карты каля нас — гэта ўсё заняцце нашых гаспадароў у вольны час, у будні і ў святы. Рэжуцца ў карты ўсе: і старыя, і малыя. І няма дзіва: ніхто не працуе над нашымі сялянамі. Народ і інтэлігенцыя ў нас — гэта два розныя абозы, не толькі па навуцы, але і па нацыі, па мове. Тутэйшы селянін не верыць ніводнаму інтэлігенту, бо чуе па мове, што гэта чужыя яму людзі, і староніцца іх. Ядыны ратунак нашай вёскі ў інтэлігенцыі нашай роднай, беларускай, але калі ж яна ўзрасце, калі прыйдзе?

Германавец.

Падрыхтаваў К.А.Кожан.

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

Устанаўленне савецкай улады

Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. паклала пачатак усталяванню на Беларусі савецкай улады. Услед за рэвалюцыйнымі падзеямі ў Петраградзе такія ж адбываліся і ў Мінску. 26 кастрычніка тут быў утвораны Ваенна-рэвалюцыйны камітэт. Да 1 лістапада ён ужо моцна забраў усю ўладу ў свае рукі.

У кастрычніцкіх падзеях, якія адбываліся ў Петраградзе, актыўна ўдзельнічалі многія беларусы, у тым ліку і нашы землякі. Адны знаходзіліся ў той час на ваеннай службе, іншыя працавалі на заводах, фабрыках. Гэта былі звычайна выхадцы з бедных, малазямельных ці беззямельных сем'яў, якія адправіліся ў горад у пошуках лепшай долі. У Петраградзе і і ншых гарадах яны далучыліся да рабочага руху. Свядомымі барацьбітамі супраць самадзяржаўя сталі ўраджэнцы нашых мясцін Аляксандр Міхайлавіч Буйка, Берта Іосіфаўна Перэльман, Іосіф Перэльман, Іосіф Васільевіч Лагун, Сцяпан Станіслававіч Грыдзюшка.

Рэвалюцыйныя змены ў Беларусі праходзілі ў неспакойнай, супярэчлівай абстаноўцы. Імкліва і часта мянялася палітычная сітуацыя, ішла барацьба розных палітычных плыней, якія разыходзіліся ў поглядах на далейшы лёс Беларусі. Цесна перапляталіся гістарычныя аб'ектыўныя рэаліі і суб'ектыўныя інтарэсы асобных сацыяльных груп, глыбінныя, спрадвечныя спадзяванні беларускага народа і амбіцыі палітычных лідэраў. Да таго ж працягвалася сусветная вайна, а Беларусь была тэатрам ваенных дзеянняў.

На месцах фарміраваліся органы новай улады. У Дзісне быў створаны павятовы ваенна-рэвалюцыйны камітэт, надзелены ўсімі паўнамоцтвамі рабоча-сялянскай улады. У лістападзе 1917 г. утвараліся таксама валасныя ваенна-рэвалюцыйныя камітэты, на тэрыторыі нашага раёна — у Шаркаўшчынскай, Лужэцкай, Германавіцкай, Ёдскай валасцях. У склад камітэтаў уваходзілі мясцовыя актывісты з ліку беднякоў.

Павятовы рэўком вёў падрыхтоўку да выбараў пастаянных органаў улады на месцах — Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. У валасцях прайшлі агульныя сходы грамадзян, на якіх утвараліся валасныя Саветы. Старшынёй Шаркаўшчынскага валаснога Савета быў абраны М.Ваштаёнак.

Пасля арганізацыі валасных Саветаў Дзісенскі павятовы рэўком склікаў з'езд прадстаўнікоў валасцей. Адбыўся ён 10 снежня 1917 г. На ім быў

выбраны выканаўчы камітэт павятовага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, утвораны галіновыя аддзелы выканкома, у тым ліку савет народнай гаспадаркі павета.

У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захаваліся пасведчанні дэлегатаў ад Шаркаўшчынскай воласці Мікалая Прыстаўкі і Ігната Вярцінскага, а таксама мандаты членаў Савета Аляксандра Аляксеевіча Таболы і Аляксандра Паўлавіча Паляка, вылучаных Ігуменаўскім таварыствам. Яны былі камандзіраваны ў Дзісну для ўдзелу ў выбарах у павятовы Савет 10 снежня 1917 г.

Выканаўчыя органы старой улады (гарадская дума, земская ўправа і іншыя) былі ліквідаваны. Іх функцыі перайшлі цяпер да Дзісенскага Савета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і яго выканаўчага камітэта.

Вось вытрымка з паведамлення «Інфармацыйнага лістка» аддзела мясцовага ўпраўлення НКУС Віленскай губерні ад 18 студзеня 1918 г.: «Улада перайшла ў рукі Савета (Дзісенскага. — *Склад.*) і Саветам вядзецца вялікая арганізацыйная работа ў сэнсе ўмацавання Савецкай улады. Ліквідаваны думы, старыя зямельныя камітэты, земства, казначэйства ў руках Савета. Пры Савеце ўтвораны аддзелы па кіраванню рускай тэрыторыяй на чале з камісарамі. Так, маюцца аддзелы: па ўнутраных справах, ваенны, зямельны, харчовы, юстыцыі, прамысловасці і гандлю, працы, грамадскай дапамогі і культурна-асветніцкі». Аналагічныя аддзелы меліся і ў валасных выканаўчых камітэтах.

Першыя крокі новая ўлада рабіла ў складаных умовах. Разбураная вайной эканоміка, галеча, беззямелле ў вёсках, нярэдка адсутнасць вопыту ў прадстаўнікоў маладой улады ў вырашэнні эканамічных пытанняў — усё гэта складвалася ў няпростае кола праблем, якія патрэбна было вырашаць неадкладна. Валасныя выканаўчыя камітэты найперш прымалі меры, накіраваныя на дапамогу бяднейшым слаям насельніцтва. Адбываліся першыя рэвалюцыйныя пераўтварэнні: канфіскацыя маёнткаў, нацыяналізацыя зямлі. У памешчыкаў рэквізавалі і бралі на ўлік сельгасінвентар, кароў, коней, зерне. Так, член Шаркаўшчынскага рэвалюцыйнага камітэта Вацлаў Ваштаёнак быў накіраваны ў маёнтак Лонск «для описи и принятия под учет имущества владельца означенного имения».

Між тым часу для пераўтварэння жыцця на новы, сацыялістычны лад, у новай улады было мала. Працягвалася сусветная вайна. Кайзераўскія войскі пайшлі ў наступленне ў лютым 1918 г., і неўзабаве Дзісенскі павет быў акупіраваны немцамі. Яны пачалі аднаўляць у вёсках старыя парадкі: вяртаць памешчыкам іх маёмасць, рабаваць сялян.

Павет быў вызвалены ад нямецкай акупацыі ў лістападзе 1918 г. Зноў у нашым краі пачалі дзейнічаць Саветы: павятовы ў Дзісне і валасныя на месцах.

24 студзеня 1919 г. на павятовым з'ездзе Саветаў абмяркоўваліся наступныя пытанні: аб самавызначэнні народнасці і далучэнні Дзісенскага павета да адной з губерняў Беларускай рэспублікі, выбары дэлегатаў на губернскі з'езд у г. Мінск.

Па першаму пытанню была прынята наступная рэзалюцыя: «Не прадрашаючы пытання, да якой губерні павінен быць далучаны Дзісенскі павет, да высвятлення гэтага пытання на Мінскім з'ездзе, заяўляем, што мы, прадстаўнікі Дзісенскага павета, выступаем супраць усялякага нацыянальнага самавызначэння; нашым лозунгам з'яўляецца лозунг камуністаў-бальшавікоў «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!», але ўлічваючы міжнароднае становішча, мы згаджаемся на самавызначэнне Беларусі з тым, каб у выпадку самавызначэння Беларусі на з'ездзе наш Дзісенскі павет быў аднесены да Мінскай губерні Беларускай Савецкай

Федэратыўнай рэспублікі». Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (Ф. 765. Воп. 1. Спр. 36. Л. 12).

На губернскі з'езд было выбрана 20 дэлегатаў: В.Маняк, С.Мурзёнак, Маляўка, Ваўкоў, Шух, Семянковіч, М.Харэвіч, Козел, Гагалінскі, Катовіч, Сабалеўскі, Дземідзёнак, Дуброўскі, Урублеўскі, Барташ, Карпіцкі, Лапідус, Васілеў, Жынь, Тарыкаў (там жа, л. 12).

Па дакументах таго часу можна меркаваць, што мясцовыя Саветы працавалі вельмі актыўна і напружана: імкнуліся наладзіць разбураную гаспадарку, дапамагчы насельніцтву ў вырашэнні надзённых бытавых праблем, разгарнуць у вёсках культурную, асветніцкую работу. Шмат увагі ўдзялялася забеспячэнню насельніцтва прадуктамі харчавання, навучанню дзяцей і дарослых. У вёсках адкрываліся школы, чытальні, бібліятэкі, ствараліся культурна-асветныя таварыствы, гурткі.

Вясной 1919 г. на тэрыторыі Шаркаўшчынскай воласці былі арганізаваны дзве сельскагаспадарчыя камуны: у маёнтках Лонск і Рацькі. Некалькі гаспадароў фальварка Александрова таксама вырашылі арганізаваць сельскагаспадарчую арцель, аб'яднаць свае сілы для сумеснай апрацоўкі зямлі. Накіравалі ў павятовы земаддзел адпаведнае прашэнне, да якога прыклалі «Список душ и инвентаря». З яго яскрава бачна, што аб'яднацца ў арцель вырашылі бедныя сяляне. Толькі адзін з іх меў зямлю для апрацоўкі, каня мелі чацвёра з шасці будучых членаў арцелі, карову — таксама чацвёра, у аднаго была свіння. Не лепш абстаялі справы і з інвентаром: на шэсць сем'яў былі тры плугі, дзве бараны, адна саха, трое калёс. Насенне ж мелася толькі ў аднаго гаспадара. З такім набыткам пачынала жыццё арцель. Яна была зацверджана павятовым земаддзелам.

Павятовы Савет прымаў меры, каб паспяхова правесці веснавую сяўбу. Ён рэгулярна атрымліваў з месц паведамленні аб наяўнасці ў воласці і кожнай вёсцы насення, аб плошчах, якія ўжо засеяны ці неабходна заняць пад сельскагаспадарчыя культуры, і г.д. Жыхары вёсак Качаны, Таболы, Брудныя, Жданы, Пятровічы і іншых былі забяспечаны насеннем на 25—30 працэнтаў, не хапала плугоў, барон, рабочых коней. Дзякуючы намаганням павятовага Савета сяляне гэтых вёсак атрымалі неабходную колькасць жыта, пшаніцы, бульбы.

Павятовы земаддзел прадпісваў Шаркаўшчынскаму і іншым валасным земаддзелам «перш, чым выдаваць зерне з гаспадарак, зрабіць улік наяўнага ў кожнай гаспадарцы зерня, прычым колькасць яго павінна быць вызначана не на вока, а шляхам узважвання...» Ён даводзіў да ведама, што калі не будзе хапаць пасяўнога матэрыялу, то валасны земаддзел будзе прыцягвацца да ваенна-рэвалюцыйнага суда (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 763. Воп. 7. Спр. 1. Л. 10).

На падставе распараджэння Дзісенскага павятовага выканкома ў валасцях праводзілася работа па дакладнаму ўліку коней. Так, у Германавіцкай воласці ў маі 1919 г. налічвалася звыш 1000 коней.

Органы новай улады клапаціліся і пра тое, каб зямельны надзел быў пры кожнай школе. Дзісенскі павятовы аддзел народнай адукацыі ў красавіку 1919 г. прапанаваў Шаркаўшчынскаму валасному Савету «в найскорейшем времени отвести из прилегающей к школе земли участок не менее 1-й десятины для каждой школы, дабы они могли своевременно приступить к обработке ее. Школам, которые имеют землю, но менее десятины, следует додать» (там жа, л. 55).

Не менш увагі, чым сельскай гаспадарцы, удзялялі мясцовыя Саветы лесавыкарыстанню і ахове лясоў. Лес у нашым краі ў той час быў і асноўным будаўнічым матэрыялам (напрыклад, для рамонту млыноў валасны земаддзел прасіў адпусціць 500 пнёў), і галоўнай, а часта адзінай крыніцай паліва.

Плошча лясных масіваў была на строгім уліку, высечкі і водпуск лесаматэрыялаў таксама.

У Шаркаўшчынскай воласці ў той час налічвалася 546 дзесяцін лесу і 404 дзесяціны хмызнякоў. Быў устаноўлены дакладны парадак водпуску будаўнічага лесу. Самавольныя высечкі строга забараняліся, а увесь самавольна высечаны ў час нямецкай акупацыі лес быў узяты на ўлік. Указвалася, што «рубке вовсе не подлежат мелкие лесные дачи, находящиеся вблизи усадеб, эти леса относятся к разряду лесов «защитных» и для рубки нужно специальное разрешение» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 763. Воп. 1. Спр. 2. Л. 15).

У першую чаргу будаўнічым лесам забяспечваліся пагарэльцы, інваліды, удовы загінуўшых на вайне, тыя, што не мелі ў гаспадарцы коней. Была ўстаноўлена норма забеспячэння дровамі — 1 кубічны сажань на адну печ у год. Сухое галлё і сукі бедным людзям адпускаліся бясплатна. Цэны на лес вагаліся ў залежнасці ад пароды дрэва, катэгорыі, даўжыні ствала і г.д. Напрыклад, кубічны сажань бярозавых дроў 1-й катэгорыі каштаваў 75 руб., вольхі — 71 руб. 25 кап.; 2-й катэгорыі адпаведна 30 руб. і 28 руб. 50 кап.; 3-й катэгорыі — 20 руб. і 19 руб.; 4-й катэгорыі — 12 руб. і 11 руб. 40 кап.

Была створана спецыяльная служба па ахове лясоў. На пасады лясных вартаўнікоў у Шаркаўшчынскай воласці былі прызначаны 4 чалавекі: Мяфодзій Сямёнавіч Знорка — Збядзянская лясная дача, Іван Адамавіч Латышонак — Гуркаўская дача, Якаў Зубовіч — Лонская дача, Іван Маркоўскі — Антаноўская дача. Усе яны былі малазямельныя ці беззямельныя сяляне. Плошча абходу ў кожнага вартаўніка складала ад 300 да 700 дзесяцін. Вартаўнік атрымліваў у месяц 300 рублёў. Дваім з іх выдалі драбавыя стрэльбы. Лясны пададдзел павятовага выканкома прасіў шаркаўшчынскую ячэйку камуністаў прыслаць звесткі «о политической благонадежности каждого лесного сторожа» ў сувязі з атрыманнем імі зброі.

У 1919 г. гаспадараннe на зямлі было ў асноўным аднаасобным: кожная сялянская сям'я апрацоўвала свой надзел. На зямельных угоддзях некаторых гаспадароў меліся ўчасткі лесу. Характэрна, што закон ахоўваў іх гэтаксама, як і лес дзяржаўнага фонду. Так, уладальнік фальварка Ракаўцы Філат Фёдараў паскардзіўся ў зямельны аддзел Шаркаўшчынскага валаснога Савета на тое, што жыхары навакольных вёсак вядуць высечку лесу на яго ўчастку. Лясны пададдзел павятовага земаддзела даслаў строгае прадпісанне ў Шаркаўшчыну аб забароне высечкі лесу, які належыць Фёдараву.

Павятовы Савет і валасныя органы ўлады прымалі меры для таго, каб знізіць узровень беспрацоўя, вырашалі пытанні сацыяльнага страхавання, аховы працы. Шмат увагі ўдзялялася паляпшэнню работы харчовага аддзела.

На чарговым пасяджэнні павятовага выканкома 17 лютага 1919 г. абмяркоўвалася шмат розных пытанняў: даклад таварыша Ігнатовіча аб парадку дня павятовага з'езда Саветаў; аб утварэнні палітычнага аддзела, даклад загадчыкаў уліковай камісіі, харчкома і іншыя. На пасяджэнні прысутнічалі старшыня Дзісенскага павятовага выканкома Лазараў, сакратар Александровіч і члены: Сабалеўскі, Сініца, Лапідус, Нямінёнак, Карнацкі, Альхімовіч, Бартат, Паўлоўскі, Мурзёнак, Маляўка, Мяняк, Сінкевіч, Ігнатовіч, Шчарбіцкі, Вязіцкі. Прысутнічаў таксама прадстаўнік віленскай партыйнай арганізацыі Ломаш, Цэнтральнага харчовага камітэта Эпель і Маскоўскага выканаўчага камітэта Кокаў.

Па кожнаму пытанню прыняты канкрэтныя рашэнні. Неаднойчы на пасяджэннях павятовага Савета разглядаліся кадравыя пытанні. Аб гэтым сведчыць, напрыклад, пратакол пасяджэн-

ня павятовага выканкома ад 13 студзеня 1919 г. На ім адзначалася, што «ў 1918 г. начальнік міліцыі Грэер вёў разгульнае жыццё, наладжваў п'янкі. Пры эвакуацыі савецкіх устаноў з Дзісны пры набліжэнні нямецкіх акупацыйных войскаў захапіў з сабой наступныя рэчы: залатыя пярсцёнкі, завушніцы, дываны і іншыя лепшыя рэчы. Грэерам не была выплачана заработная плата міліцыянерам Стэфанпольскай, Мікалаеўскай валасцей, начальніку міліцыі другога ўчастка і акопным вартаўнікам» (там жа, л. 8). Ішла размова і аб тым, што ў 1918 г. памешчык Глазко, з'яўляючыся старшынёй павятовага харчовага камітэта, фактычна бяздзейнічаў. На пасяджэнні выканкома выступілі прадстаўнікі Віцебскага губвыканкома Някрасаў і Трэбелеў. Мяркуючы па тагачасных пратаколах, якія вяліся на пасяджэннях павятовага Савета, у грамадстве ўзмацнялася класавая барацьба. Няпростая эканамічная сітуацыя, сацыяльная напружанасць у вёсках, супярэчлівыя, нарэдка памылковыя дзеянні прадстаўнікоў савецкай улады, разбурэнне касцёлаў і рэпрэсіі супраць святароў і іншых слаёў насельніцтва — усё гэта разам прывяло да мяцяжу.

Паўстанне пачалося 14 чэрвеня 1919 г. у м. Германавічы. Вяскоўцы адгукнуліся на заклік мясцовага ксяндза Буклярэвіча і яго сястры абараніць касцёл ад разбурэння бальшавіцкай уладай. У Міёрах з такой жа просьбай да людзей звярнуўся ксёндз Грынеўскі. У адказ на заклік святароў у вёсках пачалі фарміравацца атрады мяцежнікаў. Да іх далучыліся дэзерціры з Чырвонай арміі і толькі што мабілізаваныя.

З агульнай масы паўстаўшых, акрамя святароў, выдзяляліся афіцэры Бондар-Нарушэвіч, Шумскі, Гірдзюк, Рымяндзёнак, Раевіч, Парфяновіч, браты Шэўчыкі. У шэрагах «зялёных» было нямала моладзі. Паўстаўшыя арыштоўвалі прадстаўнікоў савецкай улады, забілі павятовага ваеннага камісара Маляўку і яго паплечніка Бехера (камуніста з Польшчы), браслаўскага ваенкома Брылевіча, супрацоўніка Дзісенскага рэўкома Альхімовіча.

У Германавічы на падаўленне паўстання быў прысланы Віленскі каравульны батальён. 18 чэрвеня з Полацка прыбыла рота 151-га палка і пачала баі ў вёсках Кругі, Пагост, м. Міёры. Потым на дапамогу ім прыйшоў эскадрон кавалерыі 8-га палка і іншыя воінскія падраздзяленні. Мяцежнікі былі разбіты.

8 ліпеня 1919 г. народным камісарам унутраных спраў Беларусі і Літвы Далецкім была падпісана інструкцыя аб высяленні мяцежнікаў у аддаленыя губерні краіны.

Летам 1919 г. пачалася польская інтэрвенцыя. У Дзісенскім павеце было аб'яўлена ваеннае становішча. Валасныя выканкомы праводзілі запіс добраахвотнікаў у Чырвоную армію. Ствараліся партызанскія атрады. Адным з іх камандаваў вядомы чэкіст С.А.Ваўпшасаў.

Л.М.Лабачэўская.

Ідэі рэвалюцыі распаўсюджваліся ў арміі

З успамінаў Сцяпана Акімавіча Красоўскага

КРАСОЎСКІ Сцяпан Акімавіч. Нарадзіўся 20.8.1897 г. у в. Глухі Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Герой Савецкага Саюза (1945), маршал авіяцыі (1959). Прафесар (1966). Член КПСС з 1918 г. Закончыў Ваенна-паветраную інжынерную акадэмію імя Жукоўскага (1936). У арміі з 1916 г., у Чырвонай гвардыі з 1917 г., у Чырвонай Арміі з 1918 г. Удзельнік грамадзянскай, савецка-фінляндскай 1939—1940 гг. войнаў. У Вялікую Айчынную вайну на Паўднёвым, Бранскім, Паўднёва-Заходнім, Варонежскім і 1-м Украінскім франтах: камандуючы ВПС 56-й арміі, Бранскага фронту, 2-й і 17-й паветранымі арміямі. Удзельнічаў у баявых аперацыях на Каўказе, у Сталінградскай і Курскай бітвах, у вызваленні Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі, у Віслa-Одэрскай, Берлінскай і Пражскай аперацыях. Вызначыўся ўмелым

камандаваннем авіяцыяй і арганізацыяй узаемадзеяння з наземнымі войскамі. Пасля вайны камандуючы ВПС акруг, паветранай арміяй, у 1955—1956 гг. у БВА, з 1956 г. начальнік Ваенна-паветранай акадэміі імя Гагарына, з 1968 г. у Міністэрстве абароны СССР. Член ЦК КПБ у 1956—1960 гг. Член Цэнтральнай рэвізійнай камісіі КПСС у 1961—1966 гг. Памёр 21.4.1983 г.

...Уплыў бальшавікоў у арміі рос з кожным днём. У Шаркаўшчыне, дзе дыслацыраваўся 25-ы авіяатрад, да нас на радыёстанцыю прыбыў новы электрамеханік. Сярэдніх год, бывалы чалавек з вусамі і гладка выбрытай галавой, ён зусім не быў падобны на франтавіка. Ваенная форма зусім не ішла да яго. Здзіўляла яшчэ і тое, што ў навічка не было асабістых рэчаў. У яго рэчавым мяшку ляжалі толькі брытва ды кнігі. Мяркуючы па вялікіх мазолістых руках, можна было канстатаваць, што ён рабочы.

Электрамеханік увесь свабодны час чытаў і пісаў. Гэтым ён адрозніваўся ад іншых салдат. Знаёмячыся з намі, навічок адрэкамендаваўся:

— Бярэзін Сяргей. Піцерскі рабочы.

Гэты чалавек пакінуў глыбокі след у маім жыцці. Яснасць думак, цвёрдая перакананасць у праваце справы рэвалюцыі, — вось што адрознівала яго.

Электрамеханік мог проста і ясна адказаць на любое пытанне. Яго задушэўныя гутаркі захаплялі нас. Усе салдаты радыёстанцыі бачылі ў ім прыклад для пераймання, самі стараліся дзейнічаць так, як паступае гэты чалавек.

Так, летам 1917 г., яшчэ не будучы фармальна членамі РСДРП, мы душой і сэрцам, розумам і справамі былі ў яе радах.

Аднак добрай ідэйнай загартоўкі, вопыту работы ў нас у той час не было. Мы дапускалі памылкі і не задумваліся аб канспірацыі.

У адзін з восеньскіх дзён мяне і піцерскага рабочага Крылова арыштавалі і пад канвоем накіравалі да ваеннага чыноўніка.

— Бальшавіцкая прапаганда за вамі прыкмечана ўжо даўно, камандзір вас папярэджваў! — пачаў ён, паблісквачы акулярамі. — Вы працавалі пад кіраўніцтвам вядомага палітычнага злачынцы Бярэзіна? Дзе ён?

Мы катэгарычна абверглі ўсе абвінавачванні. Але гэта не дапамагло. Праз дзень нас адправілі ў распараджэнне ваеннага пракурора 20-га армейскага корпуса для накіравання ў суд ваеннага трыбунала.

Ішоў дробны восеньскі дождж. У шэрых шынелях, без поясаў, ішлі мы з Крыловым па раскісшай дарозе ў суправаджэнні салдат з вінтоўкамі напагатове. Ніжнія чыны, якія сустракаліся, злосна глядзелі на канваіраў, жартамі падбадзёрвалі нас.

У штабе корпуса мы былі выкліканы да пракурора.

— Бальшавікі? Армію разлагаеце? Зямлю ў памешчыкаў адабраць хочаце? Хто вас гэтаму навучыў — засыпаў ён пытаннямі.

Што можна было на гэта адказаць? Мы маўчалі.

Пракурор загадаў адправіць мяне і Крылова ў Полацк, у армейскі ваенна-палявы трыбунал. Прывялі на станцыю і памясцілі ў купэ для арыштаваных. Суправаджалі нас тры ўзброеныя салдаты, але ахоўвалі дрэнна — надоўга пакідалі, не звярталі на нас ніякай увагі. Перад Полацкам поезд ішоў марудна, канваіры займаліся прыгатаваннем яды. Выкарыстаўшы гэта, мы з Крыловым выскачылі з вагона і схаваліся за чыгуначную будку.

Нас ніхто не шукаў. Абмеркаваўшы становішча, мы рашылі ехаць прама ў Піцер, дзе да службы працаваў Крылоў, а таксама мой брат.

У гэты час петраградскія пралетарыі рыхтаваліся да новых бітваў. Мы пабывалі на многіх сходах і мітынгах. Рабочыя расказвалі нам, што набліжаецца паўстанне, і параілі выехаць у армію, працягваць падрыхтоўку салдат да ўдзелу ў рэвалюцыі. Так мы зноў апынуліся ў Шаркаўшчыне.

Салдаты былі рады нашаму вяртанню. Яны думалі, што нас сама меней пасадзілі ў турму.

Начальства мы падманулі. Далажылі, што армейскі пракурор у Полацку разабраўся ва ўсім і адпусціў нас. Толькі самым блізкім сябрам расказалі аб паездцы ў Петраград, аб рэвалюцыйным уздыме, які панаваў у сталіцы.

...Позняй восенню ў авіяатрад, які паранейшаму размяшчаўся ў Шаркаўшчыне, дайшлі чуткі аб рэвалюцыі ў Петраградзе. Што і гаварыць, вестка аб пераходзе ўлады ў рукі працоўных была сустрэта сал-

дацкімі масамі з глыбокім задавальненнем. Ленінскія дэкрэты аб зямлі і міры паднялі аўтарытэт рабоча-сялянскага ўрада ў вачах усёй салдацкай масы. Бальшавікі сталі карыстацца асаблівай павагай ва ўсіх часцях былой царскай арміі.

Кіраўніцтва жыццём і дзейнасцю атрада ў гэты час перайшло да салдацкага камітэта. Мяне выбралі старшынёй тэхнічнага камітэта. На атрадным мітынгу было прынята рашэнне: поўнасцю падтрымаць новую народную ўладу і бездакорна выконваць усе яе рашэнні.

У загадзе народнага камісара па ваенных справах № 84 ад 25 студзеня 1918 г. гаварылася: «Усе авіяцыйныя часці і школы захаваць поўнасцю для працоўнага народа».

Адданыя справе рэвалюцыі

БУЙКА Аляксандр Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1885 г. у в. Астраўляне. Прафесійны рэвалюцыянер. У 1898 г. прыняты вучнем слесара на Пуцілаўскім заводзе ў Пецярбургу. У 1904 г. уступіў у РСДРП. Прымаў актыўны ўдзел у рэвалюцыі 1905—1907 гг., вёў падрыхтоўку да ўзброенага паўстання, уваходзіў у баявую дружыну. З 1906 г. член Пецярбургскага камітэта РСДРП, у 1907—1909 гг. член яго выканаўчай камісіі. У канцы 1907 г. за ўдзел у рэвалюцыі 1905—1907 гг. звольнены з Пуцілаўскага завода і асуджаны на адміністрацыйную высылку без права пражывання ў пяцідзесяці прамысловых гарадах Расіі. У сувязі з гэтым ён перайшоў на нелегальнае становішча і працягваў партыйную работу ў Пецярбургу ў якасці прафесійнага рэвалюцыянера. Удзельнік V Усерасійскай партыйнай канферэнцыі ў Парыжы (1908). У сакавіку 1909 г. арыштаваны і сасланы на вечнае пасяленне ў Сібір. У 1910 г. яго пасялілі ў сяле Усць-Уда Балаганскага павета Іркуцкай губерні. У 1911 г. удалося пераехаць у г. Чарамхова. У 1915 і 1916 гг. жыў і працаваў у Краснаярску. Будучы дэлегатам кааператыву на з'ездзе прадстаўнікоў сібірскіх гарадоў у Іркуцку, выступіў з дакладам, у якім крытыкаваў царскія ўлады за безгаспадарчасць. Вярнуўшыся ў Краснаярск, быў арыштаваны і зняволены ў турму. Па хадайніцтве арганізатараў з'езда быў выпушчаны з турмы. У канцы 1916 г. разам з сям'ёй пераехаў у г. Верхнеудзінск. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. першы таварыш старшыні (першы намеснік старшыні) Верхнеудзінскага (з 1934 г. Улан-Удэ) Савета. З 1918 г. намеснік старшыні Прыбайкальскага выканаўчага камітэта і старшыня Рэўтрыбунала Прыбайкалля. Пасля захопу Забайкалля белагвардзейцамі эмігрыраваў у Манголію, потым пад прозвішчам Церахаў з пасведчаннем упаўнаважанага кааператыва «Эканомія» выехаў у Кітай. Вярнуўся А.М.Буйка ў Расію 1 красавіка 1920 г. Адзін з кіраўнікоў разгрому войскаў Унгерна. У 1921 г. эмісар Далёкаўсходняй рэспублікі ў Прыбайкаллі, сакратар Далёкаўсходняга Бюро ЦК РКП(б). З 1922 г. старшыня народнага сходу Далёкаўсходняй рэспублікі, пазней намеснік наркома гандлю РСФСР, намеснік наркома забеспячэння РСФСР. З канца 1933 г. працаваў намеснікам Галоўнага арбітра пры Савеце Народных Камісараў РСФСР. Памер 30 студзеня 1941 г.

К.А.Кожан.

ГРЫДЗЮШКА Іосіф Лявонавіч. Нарадзіўся ў в. Лужкі (11.7.1881 — 1973), дзяржаўны дзеяч БССР. З 1902 г. у Вільні, служачы паштова-тэлеграфнага ўпраўлення. У 1905 г. удзельнічаў у рэвалюцыйным руху ў Вільні, звольнены са службы. Двойчы быў арыштаваны. З 1916 г. у арміі. У 1919 г. намеснік наркома поштаў і тэлеграфаў Літоўска-Беларускай ССР. З 1920 г. член Мінскага губернскага рэўкома, ваенны камісар сувязі Заходняга фронту.

А.М.Буйка.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Са снежня 1920 г. нарком сувязі БССР, са снежня 1922 г. упаўнаважаны Наркамата поштаў і тэлеграфаў СССР пры СНК БССР і начальнік сувязі Заходняй ваеннай акругі. Член ЦВК БССР у 1920—1926 гг. З верасня 1926 г. на камандных пасадах у Чырвонай арміі. Беспадстаўна рэпрэсіраваны, рэабілітаваны пасмяротна.

Э.В.Карніловіч.

ГРЫДЗЮШКА Сцяпан Станіслававіч. Нарадзіўся ў 1892 г. у в. Гаўрыленкі. Удзельнік барацьбы за савецкую ўладу ў Кранштаце і Петраградзе. З 15 гадоў грузчык, вучань друкара ў Пецярбургу. З 1913 г. у арміі, салдат, старшы унтэр-афіцэр. Служыў у Кранштаце, вёў рэвалюцыйную агітацыю сярод салдат і матросаў. З лютага 1917 г. бальшавік. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. член першага Кранштацкага камітэта РСДРП, Кранштацкага Савета і ваенна-тэхнічнай камісіі яго выканкома. Адзін з арганізатараў удзелу кранштацкіх маракоў ва ўзброенай дэманстрацыі ў Петраградзе ў ліпені 1917 г. Са жніўня адказны за тэлефонную сувязь паміж Кранштатам і Петраградам. Удзельнік Кастрычніцкага пераваротy. У грамадзянскую вайну ўдзельнік абароны Петрограда, камісар палка. Памёр 14.6.1919 г.

Э.В.Карніловіч.

ЛАГУН Іосіф Васільевіч. Нарадзіўся ў 1894 г. у в. Мікіцёнкі. У 1917 г. працаваў у Петраградзе, уваходзіў у Беларускую сацыял-дэмакратычную рабочую партыю (БСДРП), якую ўзначальваў А.Р.Чарвякоў. БСДРП удзельнічала ў мабілізацыі рабочых Петрограда, маракоў Балтыйскага флоту і салдат Петраградскага гарнізона на ўзброенае паўстанне ў кастрычніку 1917 г. Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі БСДРП вяла арганізацыйную і культурна-асветную работу сярод беларусаў-бежанцаў у Петраградзе і яго ваколіцах, мела школу падрыхтоўкі партыйных кадраў. У снежні 1917 г. было перавыбрана кіраўніцтва Беларускага бежанскага камітэта, у склад якога ўвайшлі члены БСДРП А.Р.Чарвякоў, І.В.Лагун, А.Х.Усціловіч. БСДРП імкнулася праз бежанскі камітэт ахапіць сваім уплывам усіх бежанцаў-беларусаў. У студзені 1918 г. быў створаны Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацком). Загадчыкам аддзела працы Белнацкома быў І.В.Лагун. З красавіка 1918 г. старшыня 1-й Беларускай секцыі РКП (б) пры Пецяргофскім райкоме партыі, пазней загадчык Петраградскага аддзялення Беларускага нацыянальнага камісарыята, член Таварыства аматараў беларускага народнага мастацтва ў Петраградзе. Дэлегат Усерасійскага з'езда бежанцаў-беларусаў у Маскве (1918). На 1-м з'ездзе КПБ выбраны членам Цэнтральнага бюро КП(б)Б. Член ЦВК БССР. У студзені 1919 г. накіраваны ў Дзісенскі павет. З мая 1919 г. у Чырвонай арміі. Загінуў на Заходнім фронце ў 1920 г.

К.А.Кожан.

ПЕРЭЛЬМАН Берта Іосіфаўна. Нарадзілася ў 1876 г. у м. Лужкі ў сям'і саматужніка. Вучылася ў сельскай школе. З дзіцячых гадоў маці прывучыла яе да самастойнай працы. Дзяўчынка стала швачкай, сама зарабляла на кавалак хлеба. Потым працавала на швейнай фабрыцы ў Маскве. У 1905 г. змагалася на барыкадах Масквы, была ўдзельніцай Снежаньскага ўзброенага паўстання. Ратуючыся ад паліцэйскіх праследаванняў, выехала ў Казань, дзе працягвала рэвалюцыйную барацьбу і хутка была арыштавана. Нелегальна вярнулася ў Маскву, дзе ў 1909 г. увайшла ў партыйны актыў Маскоўскага падпольнага камітэта РСДРП. У 1910 г. выслана ў Томскую губерню. Тут, у ссылцы, вышла замуж за рэвалюцыянера П.І.Галашчокіна, сябра В.У.Куйбышава і У.М.Косарава.

Пасля заканчэння ссылкі вярнулася ў Самару, а ў пачатку 1914 г. пераехала ў Екацярынаслаў, дзе хутка ўстанавіла сувязь з мясцовым падполлем. Тут яна выступала на сходах рабочых супраць царскіх улад, распаўсюджвала лістоўкі. 19 ліпеня 1914 г. Б.І.Перэльман была арыштавана і змешчана ў турму, тут правяла шэсць месяцаў. Адсюль за антыдзяржаўную дзейнасць у пачатку 1915 г. была адпраўлена ў ссылку ў Кірэнскі павет Іркуцкай губерні. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі пераехала ў Екацярынбург. Пражыла ўсяго 42 гады.

Э.В.Карніловіч.

Удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны

Андзілеўка Анастасія Сільвестраўна, н. у 1892 у в. Клінавое. У 1914 выехала ў Петраград, працавала да зімы 1918 бракоўшчыцай у 6-й майстэрні трубнага завода. Удзельнічала ў мітынгах рабочых, стачках і дэманстрацыях, у маніфестацыі-пахаванні ахвяр рэвалюцыі, якія загінулі на Марсавым полі.

Бондар Ларывон Пятровіч, н. у 1898 у в. Бондары-Тулаўскія. У 1917 у складзе 17-й артылерыйскай брыгады быў накіраваны на барацьбу з войскамі Урангеля.

Ваштаёнак Вацлаў Паўлавіч, н. у 1897 у м. Шаркаўшчына. У 1917 у Харкаве ўступіў у Чырвоную гвардыю. З-за хваробы вярнуўся дамоў. Восенню 1918 знаходзіўся ў атрадзе, які вёў барацьбу з нямецкімі акупантамі. Са студзеня 1919 працаваў загадчыкам зямельнага аддзела Шаркаўшчынскага валаснога выканкома, быў арганізатарам сельгаскамуны ў в. Лонск. У маі 1919 прызваны ў Чырвоную армію. Атрад знаходзіўся пад Вілейкай, Докшыцамі, затым уліўся у 145-ы полк 17-й дывізіі. У Заходняй Беларусі вёў падпольную работу. Арыштаваны польскай паліцыяй, знаходзіўся ў турмах Лукішкі і Картуз-Бяроза. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі працаваў начальнікам шаркаўшчынскай міліцыі, начальнікам камунальнага аддзела райвыканкома. У Вялікую Айчынную ваяваў на Ленінградскім і Волхаўскім франтах. З 1953 па 1960 працаваў старшынёй калгаса ў Шаркаўшчынскім раёне.

Высоцкі Уладзімір Іванавіч, н. у 1896 у в. Падоршчына. У ліпені 1918 мабілізаваны ў Чырвоную армію. Служыў у Віцебску ў каменданцкай камандзе Заходняга фронту. Вясной 1919 удзельнічаў у баях супраць войск Юдзеніча.

Грыдзюшка Іван Ігнатавіч, н. у 1898 у в. Верацеі. У 1915—1917 працаваў у Петраградзе. Быў камандзіраваны заводскім рабочым камітэтам на работу ў міліцыю. У 1919 прызваны ў Чырвоную армію. У складзе 122-га пяхотнага палка прымаў удзел у ваенных дзеяннях на Мурманскай чыгункі супраць белафінаў, пазней — супраць войска Юдзеніча пад Петраградам. Быў паранены. Пасля выздараўлення ўдзельнічаў у баях супраць белапалякаў, трапіў у палон, уцёк. Служыў у Чырвонай арміі ў 159-й стралковай брыгадзе 53-й дывізіі. Дэмабілізаваны ў 1921.

Грыдзюшка Ігнат Ігнатавіч, н. у 1895 у в. Дубоўка. У час кастрычніцкіх падзей 1917 знаходзіўся на службе ў царскай арміі у 551-м Вялікаўсцюжскім палку. Полк далучыўся да рэвалюцыйных сіл, і ў яго складзе І.І.Грыдзюшка да студзеня 1918 знаходзіўся на лініі абароны Ілуксце — Паставы — Нарач супраць нямецкіх войскаў. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях за Кёнігсберг, у разгроме японскіх войскаў у Маньчжурыі.

Дабравіцкі Міхаіл Мацвеевіч, н. у 1901 у в. Ноўкі Глыбоцкага раёна, жыў у м. Лужкі на Шаркаўшчыне. У 1918—1920 служыў у 4-м Варшаўскім стралковым палку Чырвонай арміі, прымаў удзел у баявых аперацыях супраць белапалякаў пад Слонімам і Баранавічамі.

Дабравольскі Антон Францавіч, н. у 1893 у в. Більдзюгі. З 1914 працаваў на Пуцілаўскім заводзе ў Петраградзе, прымаў удзел у рэвалюцыйнай барацьбе. У 1-ю сусветную вайну мабілізаваны ў царскую

В.П.Ваштаёнак.

У.І.Высоцкі.



І.І.Грыдзюшка.

армію, прымаў удзел у баях з кайзераўскімі войскамі пад Рыгай. Там сустрэў Лютаўскую рэвалюцыю.

Жылевіч Аляксандр Казіміравіч, н. у 1897 у в. Більдзюгі. З 1916 удзельнічаў у баях 1-й сусветнай вайны. У 1919 прызваны ў Чырвоную армію, удзельнічаў у баях з Дзянікіным пад Рослаўлем. Захварэў на тыф. Пасля лячэння ў шпіталі вярнуўся дамоў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, двойчы паранены.

Курыловіч Іван Антонавіч, н. у 1895 на Пастаўшчыне, жыў у в. Азэта Шаркаўшчынскага раёна. У ліпені 1919 прызваны ў Чырвоную армію. Ахоўваў чыгуначныя станцыі ад Даўгаўпілса да Ідрыцы. Служыў у чыгуначным будаўнічым батальёне. Пасля вайны вярнуўся дамоў.

Лук'янёнак Валяр'ян Антонавіч, н. у 1890 на Глыбоччыне, жыў у в. Баяры Шаркаўшчынскага раёна. Са снежня 1917 служыў у Чырвонай гвардыі ў 1-м Томскім палку, удзельнічаў у баях супраць Калчака. Затым служыў у рабоча-сялянскай міліцыі.

Мірончык Іван Ігнатавіч, н. у 1898 у в. Жарсцвянка. Мабілізаваны на фронт у 1917, служыў у пяхоце і кавалерыі. Стаў байцом Чырвонай арміі. У 1919 служыў у Оршы ў 3-м пантонным батальёне. Потым — Украіна, Крым. Удзельнік баёў з Урангелем. Паранены. Працаваў у сельскай гаспадарцы.

Толкач Герасім Спірыдонавіч, н. у 1918 у Баўтрамеі. У 1918 прызваны ў Чырвоную армію. Абараняў Кранштат. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

Хахолка Уладзімір Львовіч, н. у 1897 у в. Бондары. У маі 1916 прызваны ў царскую армію. У 1917 вайсковая часць, у якой ён служыў, перайшла на бок рэвалюцыйных сіл. Быў у складзе 3-га пантоннага батальёна ў Оршы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

Юзэфовіч Альбін Іларывонавіч, н. у м. Шаркаўшчына. Служыў у царскай арміі. У 1-ю сусветную вайну трапіў у палон да немцаў. Летам 1919 прызваны ў Чырвоную армію. Службу праходзіў у Віцебску і Гомелі, пасля быў накіраваны на Урал. Удзельнічаў у баях супраць Калчака. У 1920 з-за хваробы вярнуўся дамоў.

Язёнак Яўген Фёдаравіч, н. у в. Каўшэлева. У пачатку 1918 прызваны ў Чырвоную армію. Служыў ў Віцебску ў батальёне аховы. Потым накіравалі на фронт. Удзельнік баёў з палякамі.

Германавіцкая «Заранка»

У 1919 г. вядомы беларускі мастак Язэп Драздовіч стварыў у Германавічах культурна-асветнае таварыства «Заранка». 10 сакавіка 1919 г. адбыўся ўстаноўчы сход гэтага таварыства. На сходзе былі разгледжаны наступныя пытанні: выбары членаў праўлення таварыства і рэвізійнай камісіі, выпрацоўка статута таварыства і заснаванне бібліятэкі. Членамі праўлення таварыства былі выбраны 11 чалавек: Язэп Драздовіч (старшыня), Канстанцін Піскуновіч (казначэй), Ксаверый Белініс (загадчык бібліятэкі), Кандрат Протас (сакратар), Іван Лагун (член праўлення), Канстанцін Стэфановіч, Андрэй Арлюкевіч, Уладзіслаў Анецька (кандыдаты ў члены праўлення), Алена Лукасюк, Антон Вясна, Пётр Кушнер (члены рэвізійнай камісіі).

Паколькі ў ваколіцах мястэчка Германавічы магло быць некалькі асобных культурна-асветных таварыстваў, устаноўчы сход вырашыў даць свайму таварыству назву. Язэп Драздовіч прапанаваў назваць яго «Заранка». Сход адобрыў гэтую прапанову і прыняў яе аднагалосна. Зрабіць тэкст статута таварыства «Заранка» узяў на сябе Язэп Драздовіч. Сход вырашыў заснаваць бібліятэку з ахвяраваных выданняў і падтрымліваць яе на сродкі таварыства. «Заранка» налічвала ў час свайго заснавання 110 членаў. Найбольш актыўнымі былі Іван Краснадубскі, Пётр і Аляксандр Роўды, Іван Кожан, Мар'ян і Іван Янцэвічы, Кандрат Протас і іншыя.

30 сакавіка 1919 г. быў зацверджаны статут культурна-асветнага таварыства «Заранка», пячатка з надпісам «Германавіцкая культапрасвета «Заранка», з адлюстраваннем пяціканцовай зоркі, ад якой разыходзіліся промні.

Пасля дакладаў настаўнікаў Канстанціна Піскуновіча і Кандрата Протаса, а таксама Язэпа Драздовіча і Аляксандра Роўды аб пазашкольным выхаванні сход пастанавіў заснаваць пры 1-й і 2-й германавіцкіх школах вячэрнія курсы для да-

рослых, «без розніцы полу і нацыянальнасці». Былі дакладна вызначаны дні заняткаў на курсах: у аўторак, чацвер і нядзелю (з 5 да 7 гадзін вечара). Заняткі па навучанні харавым спевам праводзіліся па серадах і суботах у тыя ж гадзіны.

Усе члены таварыства павінны былі заклікаць грамадзян ахвяраваць для бібліятэкі «Заранкі» кнігі і часопісы. Язэп Драздовіч падарыў бібліятэцы 10 кніг. Цікава, што ў Германавічах у гэты час дзейнічала культурна-асветнае таварыства, заснаванае яшчэ ў студзені 1918 г. Яно па колькасці членаў было ўдвая меншым, чым «Заранка». Гэтае таварыства таксама адкрыла бібліятэку і чытальню. Члены абодвух таварыстваў чыталі лекцыі, давалі аматарскія спектаклі, праводзілі літаратурна-музычныя і вакальныя вечары.

К.А.Кожан.

Дакументы сведчаць

З ДАКЛАДА ЗАГАДЧЫКА ДЗІСЕНСКАГА ПАВЯТОВАГА АДДЗЕЛА НАРОДНАЙ АДУКАЦЫІ АБ СТАНЕ НАРОДНАЙ АСВЕТЫ Ў ДЗІСЕНСКІМ ПАВЕЦЕ

21 снежня 1918 г.— 10 сакавіка 1919 г.

Народное образование в Дисненском уезде, бывшем под пятой германской власти, находилось и доныне находится в крайне критическом положении. Большинство школ, хотя и функционировало, но учащие (учителя) за все время оккупации не получали никакой поддержки со стороны общественных местных организаций, а вынуждены были, войдя в соглашение с местным населением, поддерживать свое существование лишь теми скудными приношениями от родителей учеников. Несмотря на такое бедственное положение, они все ж таки работали, подвергаясь иногда гонениям со стороны местных помещиков-поляков и кулаков, которые, опираясь на немецкие штыки, издевались над учительством и через волостных старшин изгоняли из школ. Школьные здания уезда частью разрушены, частью приведены в негодность: печки разрушены, окна выбиты, двери выломаны, школьная мебель поломана или сожжена, школьные библиотеки расхищены (проходил фронт). Занятия проводятся в частных домах и полуразрушенных зданиях. Школьное образование в уезде страдало в течение 5 лет.

Дошкольное воспитание.

Были устроены два приюта, но средства на них ниоткуда не отпускались, содержались они на частные пожертвования. Дети в них нередко голодали и жили в антигигиеничных условиях. Приюты хирели, и один из них сам собою закрылся, а другой еще пока продолжает существовать. Необходимы самые радикальные меры для организации дошкольного воспитания.

По внешкольному образованию в Дисненском уезде никаких шагов не предпринималось. Вечерних и воскресных школ для взрослого населения ни в одном из населенных пунктов не открывалось. В городе и некоторых местечках уезда делались попытки к открытию курсов для взрослых местными учителями, искавшими заработки. Поддержки со стороны общественных организаций эти попытки не встречали.

В уезде действует лишь один кинематограф и то в уездном городе. Работает он неудовлетворительно (недостаточно сеансов, отсутствие картин, средств).

Волшебные фонари со всеми принадлежностями, имевшиеся до войны в некоторых школах, уничтожены и похищены. Народных домов в уезде нет. Народный дом в Дисне приспособлен к театру и кинематографу, а в другой его половине немцами был открыт ресторан. Театров, за исключением указанного, в котором иногда ставились спектакли любительскими кружками, в уезде нет. В некоторых местечках, в солдатских бараках, построенных во время войны, кружками молодежи ставились иногда спектакли. Культурно-просветительные кружки открыто не могли работать (преследовали германские власти). Оркестров и светских хоров в уезде почти что не имеется. В населенных пунктах, у частных владельцев было несколько небольших библиотек. Ввиду военного времени и немецкой оккупации библиотеки недосчитывают многих изданий и вовсе не пополнялись. Библиотеки некоторых частных владельцев частью уничтожены стихийным движением народных масс, сжигавших поместья. Читален и изб-читален в уезде мало, не больше двух. Они не функционировали и не функционируют. Лекции в уезде не устраивались.

Отсюда видно, что внешкольное образование в уезде находится в самом жалком состоянии. Необходимость требует отпуска громадных средств для того, чтобы поставить внешколь-

ное образование на должную высоту и в самом коротком времени обучить грамоте неграмотных крестьян и рабочих, ряды которых пополнились пятью поколениями, не обучавшимися в школе, ненормально работавшей в условиях военного времени.

Намечается ближайший план работы Внешкольного подотдела отдела народного образования Дисненского уезда:

1. Открытие вечерних воскресных школ для взрослых, а также различного рода курсов тех типов, которых пожелает местное население.

2. Переорганизация городских и местечковых библиотек, а также открытие в разных местностях каждой волости не менее трех библиотек обычного типа.

3. Приобретение на уезд двух походных кинематографов и восьми волшебных фонарей со всеми принадлежностями.

4. Организация народных домов на каждую волость не менее двух.

5. Создание подвижного театра на уезд.

6. Организация различного рода культурно-просветительных кружков.

7. Поддержание на местах серьезных любительских театральных драматических кружков, певческих и музыкальных сил.

8. Использование местных сил по изготовлению декораций для театров, с оказанием им денежных пособий.

9. Открытие изб-читален в уезде.

10. Устройство в уезде различных лекций.

(Доклад составлен для съезда в г. Смоленске, декабрь 1918 г.)

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 766. Воп. 1. Спр. 1. Л. 6—7.

ШКОЛЫ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА ПА ВАЛАСЦЯХ

Школы	Место нахождения	С какого числа
1	2	3
I. Германовичская волость		
1. Бахирская	д. Бахиры	
2. Великосельская	д. Великое Село	
3. Германовичская 1-я	м. Германовичи	
4. Германовичская 2-я	м. Германовичи	
5. Жуковская	д. Жуки Горные	
6. Ивановская	хут. Иваново	
7. Игуменовская 1-я	д. Шкунтики	
8. Игуменовская 2-я	с. Игуменово	
II. Иодская волость		
1. Густатская	д. Густаты	
2. Дубникская	д. Дубники	1.12.1918 г.
3. Иодская 1-я	м. Иоды	
4. Иодская 2-я	м. Иоды	
5. Закорьянская	д. Закорье	1.12.1918 г.
6. Замошская	д. Замошье	
7. Корницкая	д. Корница	
8. Мартинятская	д. Мартиняты	
9. Пурвинишская	д. Пурвинишки	
10. Снеговская	д. Снеги	
11. Сосновская	д. Сосновцы	
12. Шавлянская	д. Шавляны	
13. Шурпаковская	д. Шурпаки	
14. Юдицинская	д. Лонские	
III. Лужецкая волость		
1. Веретейская	д. Веретеи	
2. Гридюшкинская	д. Бол. Гридюшки	
3. Дубовская	д. Дубовка	15.2.1919 г.
4. Лужецкая 1-я	м. Лужки	
5. Лужецкая 2-я	м. Лужки	

1	2	3
6. Лучайская	д. Лучайка	
7. Поречская	с. Поречье	
8. Рубашковская	д. Рубашки	15.2.1919 г.
IV. Стефанпольская волость		
1. Стефанпольская		
2. Ямненская		
V. Шарковщизненская волость	д. Болколы	
1. Болколовская	д. Григоровщина	
2. Григоровщинская	д. Жданы	
3. Ждановская	д. Островляны	15.2.1919 г.
4. Островлянская	д. Полилейки	
5. Полилейковская	д. Савицкие	
6. Савицковская	м. Шарковщизна	
7. Шарковщизненская 1-я	м. Шарковщизна	
8. Шарковщизненская 2-я		
VI. Ленинская волость	д. Алашки	
1. Алашковская	д. Жуковщин	1.2.1919 г.
2. Жуковщинская	д. Семеновичии	
3. Половская 1-я	м. Полово	15.5.1919 г.
4. Половская 2-я		
VII. Новопогостская волость	д. Заборье	
	д. Козаки	
1. Заборьевская		1.4.1919 г.
2. Козаковская		
3. Ковшелевская		

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 766. Воп. 1. Спр. 19. Л. 2—4.

ПАВЕДАМЛЕННЕ АДДЗЕЛА НАРОДНАЙ АДУКАЦЫІ ГЕРМАНАВІЦКАГА САВЕТА РАБОЧЫХ І СЯЛЯНСКІХ ДЭПУТАТАЎ ДЗІСЕНСКАМУ ПАВЯТОВАМУ АДДЗЕЛУ НАРОДНАЙ АДУКАЦЫІ АБ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЙ РАБОЦЕ

4 студзеня 1919 г.

В Германовичской волости имеется в Германовичах культурно-просветительное общество, открытое в январе 1918 г. Деятельность этого общества: открыта библиотека, читальня, чтение лекций, даются любительские спектакли и литературно-музыкальные, вокальные вечера.

Библиотека отдела католической демократической партии при костеле.

При Германовичском культурно-просветительном обществе открыта высшая начальная школа, куда принимаются лица обоего пола без различия возраста.

Члены культурно-просветительного отдела

З.Свердиол, К.Пискунович.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 766. Воп. 1. Спр. 8. Л. 11.

8 студзеня 1919 г.

Отдел народного образования Шарковщизненской волости сообщает в Дисненский отдел народного образования на запрос от 26 декабря 1918 года, что в районе волости, к великому прискорбию, не имеется ни культурно-просветительных организаций, ни библиотек, ни читален. Постоянного театра тоже не имеется, лишь два раза в течение нынешней зимы играли любители. В ближайшем будущем предполагается открыть политический клуб и курсы грамотности.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 766. Воп. 1. Спр. 8. Л. 20.

СПІСАК ШКОЛ І НАСТАЎНІКАЎ ШАРКАЎШЧЫНСКАЙ ВОЛАСЦІ

9 студзеня 1919 г.

Народные училища	Учителя	Примечание
1. Полилейковское д. Пялики	Шабловская Екатерина Марковна	Функционирует
2. Савицковское д. Савицкие	Рыбко Дмитрий Емельянович	—«—
3. Григоровщизненское д. Григоровщина	Тарарака Ю.	—«—
4. Шарковщизненское 1-е м. Шарковщизна	Мацук Александр Федорович	—«—
5. Шарковщизненское 2-е м. Шарковщизна	Пугавко Дмитрий Иванович	—«—
6. Болколовское д. Болкалы		Не функционирует
7. Ждановское д. Жданы		—«—

Зав. Шарковщинским ВолОНО М. Плисскин.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 766. Воп. 1. Спр. 6. Л. 54.

СПІСАК ШКОЛ І НАСТАЎНІКАЎ ЁДСКАЙ ВОЛАСЦІ

9 студзеня 1919 г.

Школы и их местонахождение	Учителя	Функционирует или нет
1. 1-е Иодское народное училище	Цитович Мария Никитична	Функционирует
2. 2-е Иодское народное училище	Яхонтова Нина Николаевна	Не функционирует
3. 3-е Иодское в д. Пурвинишках	Лущик Михаил Григорьевич	—«—
4. Снеговское народное училище	Яблонский Юстин Маркович	—«—
5. Шавлянское народное училище	Дятлова Полина Григорьевна	—«—
6. Замошское народное училище	Мисюль Василий Алексеевич	—«—
7. Густатское народное училище	Глушин Михаил Степанович	—«—
8. Корницкое народное училище	Кадушко Михаил Андреевич	—«—
9. Мартинятское народное училище	Фурс Алек. Алек.	—«—
10. Юдицинское народное училище	Мизяная Ольга Ивановна	—«—
11. Шурпаковское народное училище	Бурень Борис Антонович	—«—
12. Сосновское народное училище	Остапчик Степан Андреевич	—«—
13. Закорьянское народное училище	Капусто Меланья Викентьевна	—«—

Зав. Иодским ВолОНО (Остапчик)

Нацыянальна архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 766. Воп. 1. Спр. 6. Л. 20.

З ПРАТАКОЛА VI НАСТАЎНІЦКАГА З'ЕЗДА ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА, ЯКІ АДБЫЎСЯ 9 І 10 СТУДЗЕНЯ 1919 ГОДА Ў МЯСТЭЧКУ ГЛЫБОКАЕ

Съезд открыл председатель Учительской организации тов. Г.И.Матысик и предложил избрать президиум. Председателем съезда избран В.Г.Трушинский. Товарищами председателя: А.В.Остапюк и Г.И.Матысик, секретарями Н.П.Пронько и И.П.Сикора (знакаміты садавод. — *Склад.*)

Председатель съезда оглашает повестку дня, составленную Советом Учительской организации:

1. Отчет Совета о своей деятельности.
2. Выборы Ревизионной Комиссии для проверки сумм Учительской организации.
3. Текущий момент и учительство.
4. Доклады с мест.

5. Пересмотр Устава Учительской организации.
6. Перевыборы Совета Учительской организации.
7. Материальный вопрос.
8. Образование кассы взаимопомощи.
9. Меры к устранению переполнения школ:
а) открытие нефункционирующих школ;
б) развитие школьной сети;
в) улучшение материального положения школ.
10. Текущие дела.

1. После утверждения протокола Учительского съезда от 18—19 августа 1918 года, съезд заслушал доклады Председателя Учительской организации тов. Матысика и товарища председателя тов. Соболевского о деятельности этой организации.

Председатель сказал (по отчету): Совет Учительской организации приступил к осуществлению всех пожеланий, высказанных учительством на съезде 18—19 августа 1918 года.

Чтобы деятельность организации была плодотворной, Совет поставил на первый план две задачи:

1) Озаботиться необходимыми средствами для удовлетворения учащих жалованьем.

2) Получить утверждение Совета от местных властей, чтобы в дальнейшем иметь возможность защищать интересы учащих Дисненского уезда, где только это потребуется.

Учительская организация не имела под руками никаких данных не только о положении училищ, но и о их числе, какие из них функционируют, какие нет и почему.

«Якуць быў тыповы ксёндз-беларус, — піша А.Станкевіч. — Ён глыбока разумеў важнасць беларускага адраджэння, цаніў яго і прыкладаў да гэтай справы ўсе свае сілы. Незвычайна высока стаяў Якуць як чалавек. Нялёгка апісаць характар яго, бо людзей такіх мала на свеце. Невядома, што вышэй было ў асобе ксяндза З.Якуця: яго пастырства духоўнае, яго беларускасць ці яго людскасць? Невядома, што больш хваліць, што больш праслаўляць. Усе гэтыя тры якасці ксяндза З.Якуця станавілі адзін высокаідэальны характар».

Маліўся за мір і шчасце людское

Ільдэфонс Бобіч — тэолаг, доктар філасофіі, празаік, драматург, публіцыст, перакладчык. У літаратуры вядомы як пісьменнік Пётра Просты. Але найперш ён быў святаром, адданым беларускай справе, пашырэнню роднага слова ў касцёле. На жаль, многім з нас мала што гаворыць яго імя. Тым часам постаць ксяндза Ільдэфонса Бобіча, як і пісьменніка Пётры Простага, заслугоўвае ўвагі нашчадкаў.

Нарадзіўся Ільдэфонс Бобіч 22 студзеня 1890 г. у сям'і небагатага беларускага селяніна ў в. Дзедзіна Дзісенскага павета. Вучыўся ў Ковенскай гімназіі, якую закончыў у 1909 г. Менавіта тут ён адчуў вялікую любоў да Бацькаўшчыны, народнай творчасці, культуры, гісторыі. Тут жа далучыўся да беларускага адраджэнскага руху і паспрабаваў пісаць першыя апавяданні. Літаратурны дэбют Пётры Простага адбыўся 25 студзеня 1907 г., калі ў газеце «Наша ніва» было надрукавана яго апавяданне «Слёзы». У тыя дні ён пісаў: «Маё юнацтва сэрца вагасцца — як быць? Пан кліча мяне. Пан хоча, каб я сваё жыццё прысвяціў яму. Як быць? Пэўна, выбар адзін — адказаць згодай». У 1909 г. юнак паступіў у Віленскую духоўную семінарыю, дзе праявіў сябе здольным вучнем, добрым клерыкам. Яго накіравалі на далейшую вучобу ў Рым, дзе ён вучыўся з 1911 г. па 1913 г. Там Ільдэфонс Бобіч атрымаў блаславенне Папы Рымскага Пія X для ўсяго беларускага народа, а таксама для выдання беларускай каталіцкай газеты «Беларус», якая выходзіла ў Вільні з 1913 г. па 1915 г. Рэдактарам-выдаўцом газеты, якая друкавалася лацінкай, быў А.Быкоўскі, а з № 5 за 1914 г. — Б.Пачопка. Эпіграфам для ўсіх нумароў былі словы з Евангелля: «Шкада мне гэтага народу... бо не маюць што есці». У газеце «Беларус» даволі часта змяшчаліся артыкулы І.Бобіча, пераважна на рэлігійныя тэмы. У Рыме ён абараніў доктарскую дысертацыю па філасофіі.

27 ліпеня 1915 г. Ільдэфонс Бобіч быў пасвячоны ў ксяндзы, якраз у той час, калі беларуская мова нарэшце займала сваё належнае месца ў касцёле, у час, калі яна пачала гучаць з амбонаў.

З 1920 г. ксёндз Бобіч служыў вікарыем кафедральнага касцёла ў Вільні. У гэты час у Вільні праходзіў з'езд беларускага каталіцкага духавенства. Сярод яго арганізатараў і актыўных удзельнікаў быў і ксёндз Ільдэфонс Бобіч, які выступаў з рэфератам пра беларускае рэлігійнае выдавецтва. З'езд прыняў шэраг пастаноў, у якіх меркавалася пашырыць выкарыстанне беларускага слова ў касцёле. Прапаноўвалася ўвесці родную мову ў Віленскай духоўнай семінарыі.

Адпачасова са службай у касцёле ксёндз Бобіч выкладаў у Віленскай духоўнай семінарыі. У пастырскай працы ён шырока карыстаўся беларускай мовай, а гэта, як вядома, не падабалася ні тагачасным уладам Вільні, ні многім палякам.

У 1923 г. ксяндза-доктара Бобіча прызначылі пробашчам у Германавічы. Напэўна, ён не выпадкова трапіў менавіта туды, дзе ў суседніх парафіях працавалі беларускія святары (у Задарожжы — Францішак Рамэйка, у Лужках — Язэп Германовіч, у Шаркаўшчыне — Зянон Якуць, у Глыбокім — Антоні Зяцкевіч). Вядома ж, Ільдэфонс Бобіч таксама прамаўляў казанні па-беларуску. Ён навучаў у мясцовай школе, гуртаваў вакол сябе моладзь, стварыў арганізацыю. Яшчэ і цяпер у Германавічах старэйшыя людзі цёпла ўспамінаюць свайго былога святара, памятаюць яго цудоўныя казанні, яго чалавечую дабрыню і абаяльнасць. Айцец Язэп Германовіч згадваў, што пасля Бобіча іншым было цяжка прамаўляць казанні, бо святар меў надзвычайны дар прамоўцы, дар пераканання. На жаль, у гэты перыяд Бобіч перастаў пісаць літаратурныя творы. Цяжка адназначна сказаць, што паўплывала на тое, каб са старонак беларускага друку знік аўтар Пётра Просты.

У 1930 г. Бобіча перавялі ў Іўе, дзе ён служыў адпачасова пробашчам і дэканам Вішнеўскага дэканату. Тут ён склаў 2 кнігі казанняў «Родныя слова ў касцёле» і «Навучайце ўсе народы».

Імя гэтага надзвычай таленавітага, адданага Беларусі чалавека амаль невядомае нашым сучаснікам. Мала хто ведае і пісьменніка Пётру Простага. Між тым, яго творы (апавяданні «Слёзы», «У калядны ціхі вечар», «Воля», «Скарб», «Абразкі» і інш.) атрымалі высокую ацэнку сучаснікаў. Да прыкладу, Максім Багдановіч, гаворачы пра творчасць аўтараў «Беларуса», пісаў: «У аднаго толькі Пётры Простага ёсць праўдзівая здольнасць. Галоўная вартасць яго — у стройным развіцці дзеяння ды ў сціспутасці і гучнасці мовы, надзвычайна пекнай па свайму складу».

Пётра Просты быў аўтарам п'есы «Свякроўка», якая так і засталася непадрукаванай, брашуры «Нашто беларусам газеты». Некаторыя яго празаічныя творы перакладзены на ўкраінскую мову. Сам жа ён перакладаў з рускай мовы.

Памёр Ільдэфонс Бобіч 28 красавіка 1944 г. Пахаваны ў Іўі.

Л.Э.Адамковіч.

Ксёндз Браніслаў Хаданёнак

Ксёндз Браніслаў Хаданёнак, сын Бернарда і Юзэфы з Рагавых, нарадзіўся на Вілейшчыне 17 лістапада 1910 г. у Прамяпах (Дзісенскі павет) у шматдзетнай сялянскай сям'і. Хаданёнкі мелі 7 сыноў.

За рэчкай Плаўня ляжалі Прамяны, даўнейшая ўласнасць Хаданёнкаў. На пачатку XIX ст. тагачасныя ўладальнікі в. Прамяны частку свае уласнасці прадалі стараверам, якія ў Германавічах мелі сваю царкву. Каля лесу была гаспадарка стараверa Філата, а побач — Кубаркі. За імі знаходзілася ўласнасць Хаданёнкаў.

Пачатковая школа была ў в. Сталіца, і, хутчэй за ўсё, яе наведваў Браніслаў. Месцілася яна ў будынку, які арандавала гміна. Пасля хадзіў у сямігадовую школу ў в. Германавічы. Знаходзілася яна ў палацы графа Антона Шырына.

Лаціну Браніслаў вывучаў пад кіраўніцтвам мясцовага ксяндза ў Германавічах самастойна.

У 1928—1931 гг. вучыўся ў ніжэйшай духоўнай семінарыі салезіянаў у Дашаве Львоўскай архідыяцэзіі. У канцы 1930—пачатку 1940-х гадоў вывучаў філасофію і тэалогію ў Віленскай духоўнай семінарыі, якая функцыяніравала як аддзел Тэалагічнага універсітэта імя Стафана Баторыя.

Пасвячэнне ў сан Браніслаў Хаданёнак атрымаў 8 снежня 1941 г. з рук арцыбіскупа Вільні.

Хаданёнак працаваў у парафіяльным пастырстве і навучаў у літоўскіх школах, выконваў святарскія абавязкі ў Вітанах, Салдуцішках, Эйшышках і Парадумёнах каля Вільні.

Пасля вайны, калі большасць каталіцкіх святароў высехала з Вілейшчыны ў Польшчу, ксёндз Браніслаў застаўся, каб весці пастырскую дзейнасць сярод каталіцкага насельніцтва. Хаданёнак усюды, дзе працаваў, прыводзіў у парадак касцёлы, могільнікі.

Восенню 1947 г. ксяндза Браніслава накіравалі працаваць у парафію ў Парадумёнах.

мёны, дзе ён знаходзіўся на пасадзе пробашча каля двух гадоў. У 1949 г. пераехаў у Кішынёў. Пасля 2-й сусветнай вайны аказаўся адзіным святаром лацінскага абраду ў Малдавіі. Служыў вернікам ахвярна. Абслугоўваў блізкія і далёкія пастырскія пункты. Да некаторых дабіраўся на цягніку ці на машыне, да далейшых, аддаленых на некалькі сотняў кіламетраў (Ясы), лятаў самалётам. Акрамя гэтага, выконваў пастырскую паслугу ў шматлікіх мясцовых капліцах.

Ксёндз Браніслаў вызначыўся як таленавіты і дасканалы арганізатар рэлігійных урачыстасцей. Надзвычай старанна рыхтаваў дзяцей да першага прычасця. Гэты дзень святкаваўся надзвычай урачыста. У Кішынёў прывозілі дзяцей нават з Віленшчыны.

Не забываўся і аб роднай старонцы. Прыязджаў у в. Сталіца. Абвянчаў шмат сем'яў. Хрысціў дзяцей. Былі гэта надзвычай цяжкія часы і таму варта было лічыцца з абставінамі. Хаваўся і выконваў святарскія функцыі прыватна. Зацікаўленыя людзі самі ведалі, куды належыць прыехаць.

Цікавіўся таксама музыкай. Прапаноўваў арганістцы падрыхтоўваць песні адна- і шматгалосыя — для хору. Літургічныя спевы выконваліся таксама на лацінскай мове. Пры касцёле існавала музычная бібліятэка. Сваёй працай з'яднаў усіх вернікаў у Кішынёве, якія былі надзвычай прывязанымі да свайго пробашча. Ахвотна выконвалі ініцыятывы ксяндза-пробашча, дапамагалі яму працай пры касцёле і парафіі.

У пачатку 1960-х гадоў улады закрылі касцёл, будынак перадалі пад кінатэатр. Браніславу ўлады дазволілі адпраўляць літургію ў малой капліцы ў армянскім стылі на могільніку, зараз ужо закрытым. У ёй змяшчалася не болей за 50 чалавек. Была гэта капліца адной з трох, прызначаных для набажэнства пад час пахавання памерлых. Напачатку пафарбаваў яе, дбаў пра ўнутраны выгляд. У лісце ад 12 снежня 1969 г. напісаў: «Толькі што закончыў размалёўваць свой касцялок. Праца цягнулася каля паўгода, бо не хапала патрэбнай колькасці маляроў». Туды перанёс з парафіяльнага касцёла арган. На жаль, не змясціўся ён цалкам у капліцы.

26 лістапада 1973 г. ксёндз Браніслаў Хаданёнак памёр. Яго апошнімі словамі былі: «Ужо хутка я ўбачу Бога».

Пераклаў з польскай мовы А.Э.Адамковіч.

Язэп Германовіч — святар і пісьменнік

Язэп Германовіч, сын Станіслава і Ганны з Савіцкіх, нарадзіўся 4 сакавіка 1890 г. у Гальшанах, што на Ашмяншчыне. У 1898—1902 гг. наведваў Гальшанскую парафіяльную школу, а праз наступныя чатыры гады — Ашмянскае гарадское вучылішча.

Юнака вабіла далейшая адукацыя, служба свайму народу, найлепшай формай якой ён лічыў святарства. Паступіў у Віленскую духоўную семінарыю. Гэта быў час ажыўлення беларускага адраджэнскага руху, чаму спрыяла лібералізацыя нацыянальнай і веравызнальнай палітыкі расійскага ўрада пасля рэвалюцыі 1905 г. Выходзіла газета «Наша ніва», пашыралася выдавецкая і культурна-асветная дзейнасць.



Я.Германовіч (В.Адважны).

Адраджэнскі рух будзіў і клікаў маладых патрыётаў, што навучаліся ў Віленскай духоўнай семінарыі. Акрамя Язэпа Германовіча яе студэнтамі-клерыкамі былі ў той час Вінцэнт Гадлеўскі, М.Пятроўскі, Язэп Рэшаць, Адам Станкевіч, Канстанцін Стаповіч, Андрэй Цікота, Віктар Шутовіч і іншыя. Іх намаганнямі быў створаны ў семінарыі беларускі гурток з бібліятэкай, з якога выйшлі выдатныя дзеячы беларускага каталіцкага руху і нацыянальнага адраджэння.

У 1913 г. Язэп Германовіч закончыў семінарыю і атрымаў святарскае пасвячэнне. З таго часу працаваў ён на Беласточчыне

і ў Лужках на Дзісеншчыне. Усюды стараўся перадаваць людзям праўду Божую на іх роднай мове.

У тую пару, асабліва пасля далучэння заходнебеларускіх абшараў да Польшчы, беларуская мова ў касцёлах нярэдка выклікала непаразуменне і супраціў, а таксама ганенні з боку польскай адміністрацыі, якая імкнулася апалячыць беларускае каталіцкае насельніцтва.

У 1924 г. айцец Германовіч уступіў у ордэн марыянаў, якія пачыналі сваю дзейнасць у Друі. Пачаткова выконваў абавязкі пробашча Друйскай парафіі, пазней быў магістрам навіцыяту і, акрамя таго, настаўнікам рэлігіі і лацінскай мовы ў Друйскай гімназіі. Ён быў выдатным выхавацелем моладзі, якой прывіваў прынцыпы хрысціянскай маралі і любоў да роднай беларускай мовы.

Пад націскам адміністрацыйных улад пачаліся ганенні супраць беларускіх марыянаў. У 1932 г. касцельныя ўлады накіравалі Язэпа Германовіча ў далёкі Харбін, даручана была місійная праца сярод расійскай эміграцыі.

Пасля чатырох гадоў знаходжання ў Харбіне, у 1936 г., айцец Германовіч вярнуўся ў Вільню, але хутка быў вымушаны вярнуцца ў Харбін. Тут ён працаваў да 1948 г., потым быў арыштаваны кітайскімі ўладамі і перададзены савецкім органам, якія асудзілі яго на 25 гадоў зняволення ў сібірскіх лагерах.

Пасля шасці з паловай гадоў лагерных пакут, у 1955 г., айцец Германовіч быў вызвалены і апынуўся ў Польшчы.

«Калі вызвалялі нас з лагера, — расказваў айцец Германовіч, — начальнікі патрабавалі падаць жадаемае месца далейшага пражывання. Я адказаў: як беларус і каталіцкі святар жадаю вярнуцца на Беларусь і працягваць пастырскую працу. Начальнік з гэтым не пагадзіўся: «О, в Белоруссии таких не надо. У тебя гражданство польское, вот поэтому мы тебя отправили в Польшу».

Пад канец 1959 г. айцец Германовіч выехаў з Польшчы ў Рым, а неўзабаве прыбыў у лонданскі Дом марыянаў — узгадаваны пасля вайны новы парастак Друйскага манастыра. Тут ён памёр 26 снежня 1978 г. Пахаваны на могілках святога Панкрата ў Лондане.

Нягледзячы на бурлівае, нялёгкае жыццё, айцец Язэп Германовіч пакінуў значную літаратурную спадчыну. Пісаў пераважна пад крыптанімам В.А., псеўданімамі Вінцук Адважны, Лявон Ветрагон і іншымі.

З 1919 г. друкаваўся на старонках «Крыніцы», «Беларускай крыніцы», «Хрысціянскай думкі» і іншых віленскіх часопісаў (допісы, гутаркі на бытавыя, маральна-этычныя і грамадскія тэмы). Працаваў у жанрах дзіцячай паэзіі, пісаў гумарыстычныя і сатырычныя творы, займаўся перакладамі. На эміграцыі ў Лондане цэлае дзесяцігоддзе (1964—1974) рэдагаваў часопіс «Божым шляхам».

Ю.Туронак.

Наша вера. 1996. № 1. С. 49—50.

Жыццё і смерць святара

У царкоўным архіве захавалася першае ўпамінанне пра Свята-Прачысценскі храм і яго прыход, якое адносіцца да 1639 г. Да канца XIX ст. будынак Свята-Прачысценскай царквы ў Шаркаўшчыне знаходзіўся ў бядотным стане. У 1901 г. наспела пытанне пабудовы новага храма. За справу ўзяўся толькі што атрымаўшы прыход дваццацігадовы святар Канстанцін Жданаў.

Да 1906 г. было атрымана благаславенне епархіяльнага архірэя на ўтварэнне будаўнічай камісіі, у склад якой увайшлі ўсе члены прычту на чале з настаяцелем айцом Канстанцінам Жданавым, а таксама дазволы на ўзвядзенне новага храма ад імператара Расіі і Літоўскай духоўнай кансісторыі. Каштарыс будаўніцтва склаў 15 856 руб. У сакавіку 1908 г. прыступілі да разборкі старой царквы, каб на яе месцы пачаць будаўніцтва новага храма. Будынак прадугледжваўся драўляным, на высокім мураваным падмурку, са званіцай у франтоннай частцы.

Шмат клопатаў і асабістай працы ў будаўніцтве новага храма было ўкладзена айцом Канстанцінам. Ён арганізаваў збор сродкаў сярод прыхаджан, кожны з якіх абавязваўся ўнесці па паўтара рубля з кожнай дзесяціны ўласнай зямлі. Айцец Канстанцін арганізаваў збіранне камянёў і дастаўку іх да месца будаўніцтва, што рабілася сялянамі бясплатна. Збіралі ахвяра-

ваші на пабудову царквы сярод сваіх знаёмых — заводскіх рабочых — таксама і тыя прыхаджане, якія знаходзіліся на заробках у гарадах. Для збору сродкаў на іканастас айцец Канстанцін выязджаў у Маскву, дзе звяртаўся да купцоў і іншых заможных людзей. Сабраных сродкаў аказалася дастаткова, каб выканаць іканастас, аздоблены пазалотай, які знаходзіцца ў храме і зараз. Мала каму вядома, што пліткі падлогі ў царкве выкладзены рукамі айца Канстанціна. У 1910 г. будаўніцтва храма завяршылі, і ён быў асвячоны.

За гады служэння ў Свята-Прачысценскім прыходзе айцец Канстанцін праявіў сапраўдны пастырскі талент. У прыходзе з пакалення ў пакаленне аб святары перадасцца памяць, як аб чалавеку строгім у пытаннях праваслаўнай веры, які, аднак, меў добрае, чуллівае сэрца.

Нарадзіўся Канстанцін Жданаў у 1875 г. у вялікай святарскай сям'і, у якой налічвалася дзевяць дзяцей. Атрымаў духоўную адукацыю ў Вільні. У маі 1900 г., пасля смерці бацькі, протаіерэя Дзмітрыя Жданава, быў прызначаны замест яго настаяцелем Свята-Прачысценскага прыхода.

Хутка пасля параджэння адзінага сына, у 1904 г., айцец Канстанцін аўдавеў. На яго руках засталіся, акрамя сына Георгія, непаўналетнія брат і дзве сястры. Можа, таму ён асабліва ўважліва і клапатліва адносіўся да дзяцей. Ён дапамагаў усім абяздоленым.

На працягу 18 гадоў служыў святар прыхаджанам Свята-Прачысценскай царквы ў Шаркаўшчыне, пёс ім слова Божае. Як і многіх іншых асоб духоўнага звання, айца Канстанціна арыштавалі ў маі 1918 г. Вернікі паспрабавалі вызваліць яго з-пад арышту, нават грашовы выкуп прапаноўвалі прадстаўнікам новай улады. Разам з Канстанцінам Жданавым пад арыштам аказаўся святар царквы з в. Язна айцец Міхаіл Сіняўскі. Іх разам адправілі ў Дзісну, якая была тады павятовым цэнтрам.

Упачы іх павялі расстрэльваць. Шлях ляжаў праз густы хмызняк. Айцу Міхаілу ўдалося збегчы, схавацца ў кустах. Святар Канстанцін Жданаў прыняў пакутніцкую смерць.

Тым часам вернікі ў Шаркаўшчыне збіралі подпісы пад прашэннем аб вызваленні святара. Марыя Лявонцьсўна Шаблоўская, якая вяла гаспадарку ў айца Канстанціна, павезла прашэнне ў Дзісну. Аднак святара ўжо не было ў жывых. Тады Марыя разам з Іванам Атрахімовічам і свацёй сястрой Ганнай Цітовіч адкапалі цела настаяцеля і пахавалі яго ў склепе пад алтаром Дзісенскай Свята-Адзігітрыеўскай царквы на могілках.

Памяць пра святара Канстанціна Жданава, які заўчасна і пакутліва загінуў, захоўваюць вернікі Свята-Прачысценскага прыхода.

Алег Садоўскі, стараста
Свята-Прачысценскай царквы
г.п. Шаркаўшчына.

Браніслаў Туронак

Юры Туронак нарадзіўся ў 1929 г. на Віленшчыне, у мястэчку Дукшты. Жыве і працуе ў Варшаве. Доктар гуманітарных навук, журналіст і гісторык. Аўтар многіх навуковых прац па гісторыі Беларусі. Сярод іх — кнігі «Беларусь пад нямецкай акупацыяй» (Мн., 1993), «Вацлаў Іваноўскі і адраджэнне Беларусі» (Варшава, 1992). Юры Туронак прыслаў успаміны пра свайго бацьку Браніслава Туронка.

Браніслаў Туронак нарадзіўся 22 чэрвеня 1896 г. у в. Пестуны. У час рэвалюцыі 1917 г. з дапамогай мясцовай інтэлігенцыі адкрыў на Дзісеншчыне 15 беларускіх пачатковых школ, сам працаваў настаўнікам у Більдзюгах у 1917/18 навучальным годзе, а ў 1918/19 — у Новым Пагосце. Пазней ён закончыў медыцынскі факультэт Віленскага універсітэта і стаў урачом. Стала так, што Браніслаў Туронак, ратуючы хворага, сам цяжка захварэў і памёр, пражыўшчы ўсяго 42 гады.

Невялікая гаспадарка не магла забяспечыць патрэб сям'і, дадатковых заробкаў на месцы не было, а эмігрыраваць у Сібір ці ў Амерыку, відаць, не было ахвоты. У такіх умовах прадзед Сцяпан вырашыў арандаваць памешчыцкую зямлю.

У 1875 г. Сцяпан і Ефрасіння пакінулі гаспадарку ў Гарбачонках старэйшаму сыну Язэпу і перасхалі на арэнду ў недалёкія Пестуны, якія не лічыліся нават вёскай, толькі фальваркам, засценкам. Паводле перапісу насельніцтва 1921 г., тут было ўсяго 10 двароў з 73 жыхарамі. Адсюль прадзедавы дзеці паступова разыходзілі-

ся па свеце, засталіся сыны Казімір і Сцяпан, якія доўгі час гаспадарылі разам з бацькамі.

Каля 1890 г. Сцяпан ажаніўся з Канстанцыяй Баркоўскай з в. Шаўляны суседняй Барадзеніцкай парафіі. Склалася сям'я майго дзеда. Жылі ў Пеступах каля 10 гадоў. Тут з'явіліся на свет першыя сыны: Уладзіслаў (1892), Браніслаў (1896) і Яп (1899).

Сямейным гняздом маіх продкаў лічыцца в. Дзяпісы, якая знаходзілася ў пекалькіх кіламстрах ад валаснога і парафіяльнага цэнтра — мястэчка Новы Пагост. У гэтай вёсцы каля 1824 г. нарадзіўся мой прадзед Сцяпан Туронак — сын прыгонных сялян. Тут жылі яго дзяды і прадзеды. Пасля лістападаўскага паўстання 1831 г., калі расійскі ўрад канфіскаваў маёнткі памешчыкаў — удзельнікаў паўстання, в. Дзяпісы ўжо лічылася «казённашчынай», а яе жыхары адраблялі павінпасць у воласці.

З гэтых Дзяпісаў адлучыўся на парозе свайго сталага жыцця прадзед Сцяпан Туронак. Яго шлюб з Ефрасінняй Гарбачонкавай адбыўся каля 1850 г. у Новапагосцкім касцёле, пасля чаго прадзед пайшоў у прымакі да жонкі ў яе в. Гарбачонкі. Тут каля 1860 г. нарадзіўся іх сын і мой дзед, таксама Сцяпан, адзін з шасцярых дзяцей.

Пасля адмены прыгонпага права прадзед атрымаў у Гарбачонках 4 дзесяціны надзельнай зямлі.

Раслі Казіміравы і Сцяпанавы сем'і, і ў Пеступах пад адным дахам было цеснавата. У 1900 г. Сцяпан з сям'ёй пераехаў у Янопаль, дзе арандаваў фальварак Уладзіслава Козел-Паклеўскага — нашчадка вядомага на Дзісенпшчыне памешчыцкага роду. Была гэта сапраўдная пустка: паводле статыстыкі 1921 г., тут пражывала ўсяго 11 чалавек (усе беларусы-католікі).

У 1908 г. невядомая прычына прымусіла дзеда Сцяпана пакінуць Янопаль і перасхаць на арэнду ў недалёкую Яцкаўшчыну.

На арэндах у Янопалі і Яцкаўшчыне дзед Сцяпан разгарнуў даволі значную гаспадарчую дзейнасць. Трымалі ў сярэднім 5 консй, 12 кароў, 25 авечак, 50 гусей. Дзед сам шыў боты, рабіў бочкі, вёдры ды іншыя хатнія прылады і гаспадарчае абсталяванне. Жанчыны ткалі сукно на адзенне і палатно на бялізну. Увогуле, паводле ўспамінаў цёткі Антаніны, жылося даволі добра, хоць усе цяжка працавалі на гаспадарцы.

Усе сямейныя сілы былі накіраваны на ажыццяўленне асноўнай задумы дзеда — купіць уласную зямлю. Гэтай ідэі падпарадкоўваўся ўвесь сямейны экапамічны рэжым. Усё паказвала на рэальнасць гэтай задумы: умовы арэнды (у Янопалі 200 рублёў у год) былі даволі выгадныя, гаспадарка развівалася і расла. Напярэдадні 1-й сусветнай вайны ў дзедавай касе было ўжо 3300 рублёў, аднак яшчэ зямлі не купіў. Магчыма, спадзяваўся на большыя сродкі і марыў аб вялікай гаспадарцы. Аднак у час вайны і рэвалюцыі грошы абясцэніліся.

Хоць у сям'і дзеда лічылася кожная капейка і кожная пара рабочых рук, значэнне адукацыі разумелі і пасылалі дзяцей у Новапагосцкую народную школу. Браніслаў закончыў яе вясной 1912 г. і з восені працягваў вучыцца ў Вілепскай гімназіі. У верасні 1915 г., у сувязі з набліжэннем нямецкіх войскаў да Вільні, гімназічная моладзь была эвакуіравана ў Віцебск, а праз год — у Яраслаўль. Тут 7 мая 1917 г. Браніслаў атрымаў атэстат сталасці.

Знаходзячыся ў Вільні, Віцебску і Яраслаўлі, Браніслаў паглядаў характэрныя для эпохі кантрасты. У гімназіях навучанне адбывалася на рускай мове і ў духу расійскага патрыятызму. Вучнёўскае асяроддзе складалася ў асноўным з ураджэнцаў Вілепшчыны, большасць якіх лічыла сябе палякамі. Супраць гэтых двух культурных плыняў будзіўся да жыцця трэці — беларускі адраджэнскі рух. Няма сумнення, што маладая Беларусь была ў свядомасці Браніслава-гімназіста з'явай натуральнай, можа, пакуль што не заўсёды зразумелай у дэталях. Затое ўплывала атмасфера бацькоўскага дому — тут і гаварылі па-беларуску і лічылі сябе беларусамі.

Істотнае значэнне для фарміравання нацыянальнай свядомасці мела Лютаўская рэвалюцыя 1917 г., якую Браніслаў сустрэў у Яраслаўлі. Яна натхніла да дзейнасці, чаму спрыяла і немалая група беларускіх дзеячаў, якія ў той час знаходзіліся ў гэтым горадзе. Пад канец мая 1917 г. 21-гадовы Браніслаў вяртаўся праз Маскву і Віцебск на родную Дзісепшчыну.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі актывізавалася нацыянальная дзейнасць на Дзісепшчыне. Найбольш актыўнай была тут Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), якая гуртавала немалую коль-

касць каталіцкіх святароў, такіх як Адам Станкевіч, Ільдэфонс Бобіч, Міхась Пятроўскі, Зянон Якуць, Віктар Шутовіч і іншых. Прапаведавалі яны па касцёлах слова Божае па-беларуску і працавалі над арганізацыяй беларускіх школ на Дзісеншчыне.

У пачатку жніўня 1919 г. Браніслаў перайшоў лінію польска-савецкага фронту і прыбыў у Вільню, дзе адкрываўся курс для настаўнікаў беларускіх школ. Яго кіраўніком быў Янка Станкевіч, які адначасова выкладаў беларускую мову. Гісторыю беларускай літаратуры выкладаў Максім Гарэцкі, які карыстаўся бадай найбольшай папулярнасцю і сімпатыяй курсантаў. Выкладчыкам гісторыі Беларусі быў Вацлаў Ластоўскі. Іншыя прадметы выкладалі А.Дмахоўскі, К.Дуж-Душэўскі, Ждановіч (тэатр), М.Мараўская (псіхалогія), Кахановіч, Н.Ласковіч. Некаторыя выкладчыкі пазней працавалі ў арганізаванай восенню 1919 г. Віленскай беларускай гімназіі.

Аднак да настаўніцкай працы Браніслаў не вярнуўся. Якраз у гэты час адбывалася падрыхтоўка да аднаўлення Віленскага універсітэта і праводзілася рэгістрацыя кандыдатаў. Браніслаў вырашыў паступіць на медыцынскі факультэт. 26.9.1919 г. ён напісаў фармальнае прашэнне і праз месяц атрымаў студэнцкую легітымацыю № 6 і універсітэцкі індэкс (заліковую кніжку) № 12. З гэтага відаць, што Браніслаў Туронак быў адным з першых студэнтаў адноўленага універсітэта.

Матэрыяльнае становішча студэнта Браніслава Туронка значна пагоршылася пасля смерці бацькі ў 1920 г. Канікулы праводзіў дома, працуючы на гаспадарцы. Ад сям'і атрымоўваў саматканую вопратку і бялізну, прадукты. У Вільні стыпендыі не атрымоўваў, займаўся рэпетытарствам. Пастаянна адчуваў нястачу грошай і эканоміў іх на чым мог, між іншым і на чыгуначных білетах. Аднойчы прыйшоў з Вільні дахаты пехатой — гэту адлегласць (каля 200 км) «адмахаў» у чатыры дні.

Браніслаў Туронак быў адным з заснавальнікаў Беларускага студэнцкага саюза (БСС) у Віленскім універсітэце. Ужо ў першыя гады вучобы ён прапагандаваў сярод студэнтаў ідэю стварэння гэтай арганізацыі, удзельнічаў у выпрацоўцы статута, які ў снежні 1921 г. быў зацверджаны універсітэцкім сенатам. На арганізацыйным сходзе, які адбыўся ў пачатку 1922 г., была выбрана першая ўправа БСС, у склад якой увайшлі студэнты-медыкі Антон Абрамовіч, Станіслаў Грынкевіч, Тодар Куніцкі, С.Малафееў і Браніслаў Туронак. Акрамя працы ва ўправе БСС Туронак быў адказным рэдактарам яго органа «Наш шлях», выпуск якога пачаўся ў сакавіку 1922 г.

На пятым курсе дыяпазон яго грамадскай дзейнасці пашырыўся. У лістападзе 1923 г. Браніслаў Туронак увайшоў у склад новай управы БСС і адначасова быў выбраны сакратаром Беларускага таварыства дапамогі пацярпеўшым ад вайны, старшынёй якога быў ксёндз Адам Станкевіч.

У снежні Браніслаў Туронак стаў адказным рэдактарам газеты «Крыніца». Газета была органам беларускай хадэцыі, хоць рэдакцыя не падкрэслівала яе партыйнасці. Аб умовах працы Туронка як рэдактара «Крыніцы» красамоўна сведчыць наступны факт: з ліку 20 нумароў, падпісаных ім да друку, польскія ўлады канфіскавалі 9. У 1924 г. быў ён упершыню прыцягнуты да судовай адказнасці за рэдагаванне газеты. Справа закончылася толькі грашовым штрафам.

Пасля заканчэння універсітэта ў 1924 г. і двухгадовай практыкі 11 ліпеня 1926 г. Браніслаў атрымаў дыплом доктара, а 17 мая 1927 г. дазвол на выкананне лекарскай практыкі.

У 1925 г. значна павялічыліся канфлікты паміж «Крыніцай» і ўладамі, што адбілася як на газеце, так і на яе рэдактары. Асноўнай прычынай канфліктаў была пазіцыя газеты ў справе змагання за беларускую мову ў касцельных набажэнствах. Асабліва востра йрай была рэакцыя «Крыніцы» на правакацыі польскіх ксяндзоў і паліцыі ў Жодзішках, якія закончыліся арыштам і двухгадовым турэмным зняволеннем тамтэйшага пробашча ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага. У выніку далейшы выпуск «Крыніцы» быў спынены, а яе рэдактар прыгавораны Віленскім акруговым судом да трохмесячнага турэмнага зняволення з адтэрміноўкай пакарання на працягу пяці гадоў. Такім чынам, далейшая рэдактарская дзейнасць пагражала б Браніславу Туронку Лукішкамі.

Судовы прыгавор не спыніў грамадскай дзейнасці Браніслава Туронка. Не

змянілася і яго арыентацыя на беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў, у прыватнасці, на супрацоўніцтва з ксяндзом Адамам Станкевічам.

Аб тым, як цеснымі былі іх сувязі, сведчыць між іншым факт, што ў 1926—1927 гг. наймаў ён пакой у доме на вуліцы Полацкай, 4, у якім змяшчаўся штаб беларускай хадэрацыі.

У гэтым «штабе» 24 сакавіка 1926 г. адбыўся першы з'езд Беларускага сялянскага саюза — новай палітычнай партыі, створанай у процівагу растучым уплывам пракамуністычнай Беларускай сялянска-работніцкай грамады. З'езд, у якім удзельнічалі Станкевіч і Туронак, выбраў Цэнтральны камітэт Беларускага сялянскага саюза ў складзе Васіля Рагулі (старшыня), Фабіяна Ярэміча, Тодара Куніцкага, Адама Більдзюкевіча і Браніслава Туронка, які выконваў абавязкі сакратара ЦК і прадстаўляў Беларускі сялянскі саюз у Беларускім нацыянальным камітэце ў Вільні.

Як сведчаць матэрыялы з'ездаў БХД, Браніслаў Туронак ніколі не ўваходзіў у склад яе кіруючых органаў, аднак у хадэкаў лічыўся «сваім чалавекам». Выглядае на тое, што займаючы пост сакратара ЦК Беларускага сялянскага саюза, ажыццяўляў ён штодзённую сувязь паміж гэтымі партыямі. Варта заўважыць, што праграмы БХД і Беларускага сялянскага саюза былі амаль аднолькавыя, а адзіным адрозненнем было тое, што сялянскі саюз менш цікавіўся пытаннямі рэлігіі, вылучаючы на першы план справы нацыянальныя. Яшчэ ў студзені 1926 г. адбыліся перагаворы паміж Рагулем і Ярэмічам з аднаго боку і Станкевічам з другога, вынікам якіх было пагадненне аб супрацоўніцтве і ўзаемнай падтрымцы БХД і Беларускага сялянскага саюза.

Вынікам супрацоўніцтва БХД і Беларускага сялянскага саюза быў Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГіК), заснаваны з мэтай развіцця народнай прамысловасці, рамяства, агратэхнікі, народнага мастацтва, духоўнай культуры і асветы. БІГіК быў арганізаваны 26 мая 1926 г. у Варшаве, а праз месяц адкрыўся яго Віленскі аддзел. На арганізацыйным сходзе аддзела, які адбыўся на вуліцы Полацкай, 4, была выбрана ўправа аддзела. Браніслаў Туронак абраны яе сакратаром, а з лютага 1927 г. — старшынёй.

Віленскім аддзелам БІГіК ён кіраваў да вясны 1928 г. — да часу выезду з Вільні. Акрамя таго, узначальваў разам з Янам Васілеўскім і Адамам Більдзюкевічам Гандлёва-прамысловы банк, арганізаваны БІГіК у Вільні. Акрамя грамадскай працы Браніслаў Туронак займаўся папулярызацыяй аховы здароўя, пісаў артыкулы, выступаў з адпаведнымі лекцыямі, у 1928 г. выдаў невялікую кнігу «Гігіена ўзгадавання дзіцяці».

У гэты час змянілася асабістае жыццё Браніслава. 31 студзеня 1928 г. ён ажаніўся з Марыяй Рэшаць — сястрой вядомага дзеяча на беларускай рэлігійнай ніве ксяндза Язэпа Рэшаця. Неўзабаве атрымаў накіраванне на пасаду раённага лекара ў мястэчка Дукшты Свянцянскага павета, куды пераехаў вясной 1928 г. У 1929 г. нарадзіўся сын Юрый, у 1931 г. — Андрэй і ў 1936 г. — Міхась.

Пасля выезду з Вільні ўдзел Браніслава ў беларускім руху паслабеў. У выніку абвастрэння нацыянальнай палітыкі польскіх улад у 1930-я гады закрываліся беларускія школы і грамадска-культурныя арганізацыі, а іх актыўныя дзеячы высяляліся з роднага краю. Яшчэ некалькі гадоў Браніслаў Туронак дзейнічаў у Віленскім аддзеле БІГіК, выбіраўся ў яго цэнтральную ўправу, аднак гэта яго дзейнасць ужо не мела рэальнага значэння. У 1936 г. БІГіК быў распушчаны польскімі ўладамі.

Заставалася сям'я. Бацька звяртаў вялікую ўвагу на ўзгадаванне дзяцей у беларускім духу, што практычна ажыццяўляла маці. Бацькі гаварылі па-беларуску паміж сабой і з дзецьмі і патрабавалі, каб і сыны так паміж сабой гаварылі. Пад кваліфікаваным наглядам маці дзеці вучыліся чытаць і пісаць па-беларуску, вучылі вершы і песні. Гэтаму спрыяла хатняя атмасфера, партрэты Багушэвіча, Купалы і іншых адраджэнцаў, летнія выезды да дзядзькоў і цётак на Дзісеншчыну і Беласточчыну, частыя візіты бацькавых калег, якія ездзілі праз Дукшты з Вільні на Браслаўшчыну ці назад.

Бацька памёр 19 верасня 1938 года ў Дукштах, на 43-м годзе жыцця. Некалькі дзён раней ён ехаў маторнай лодкай да хворага за Дзісенскім возерам. Пахаваны на невялічкім могільніку каля касцёла ў Старых Дукштах.

Падзеі савецка-польскай вайны 1920 г.

У час савецка-польскай вайны 1920 г. на тэрыторыі нашага раёна ішлі жорсткія баі. У цэнтры актыўных баявых дзеянняў былі мястэчкі Германавічы, Лужкі, Шаркаўшчына. Германавічы па некалькі разоў пераходзілі з рук у рукі. Аб гэтым апавядае наш зямляк пісьменнік Міхась Машара ў кнізе «Ішоў дваццаты год»: «Да мястэчка лепш за ўсё было прабрацца па мосце цераз раку Дзісну, які знаходзіўся пасярэдзіне мястэчка і ахоўваўся вартай з кулямётным гняздом. Варта магла ўзняць перапалох у гарнізоне, аказаўшы супраціўленне, таму атрад вырашылі падзяліць на дзве часткі. Адной трэба было перайсці Дзісёнку вышэй Германавіч і напасці па мястэчак Шырына з захаду. Чырвонаармейцы, дабраўшыся да парку, павінны былі пусціць ракету, якая і з'явіцца сігналам для адначасовага нападу па варожыя гнёзды. Дзякуючы раптоўнаму і неспадзяванаму нападу, белапалякі не змаглі аказаць палётчыкам супраціўлення».

У красавіку—маі 1920 г. конныя арміі Г.Дз.Гая выбілі войска палякаў з Германавіч.

Удзел у баях пад Германавічамі па баку Чырвонай арміі прымаў фінскі полк, які страціў 60 працэнтаў асабовага складу. Адзін з удзельнікаў гэтых падзей, Ільпар Ільмапен, стаў пісьменнікам і напісаў пра падзеі гэтай вайны кнігу «Фінскі полк на польскім фронце». «4.6.1920 г. полк атрымаў загад выступіць на фронт пад мястэчка Германавічы, куды прыбыў 6 чэрвеня. У гэты дзень у 12 гадзін ночы полк уступіў у бой з наступаючымі польскімі часцямі, якія цяснілі чырвонаармейскія часці ад мястэчка Германавічы... Батальёны палка адбілі шматлікія атакі польскіх войскаў, але ў гэты час прыйшла звестка, што суседні полк на левым фланзе пачаў адступаць... У гэтых частых атаках загінула шмат людзей, а таксама многа было параненя. Так, у 5-й роце з 75 чалавек засталося ў страі 11 байцоў і 2 параненыя камандзіры ўзводаў. Частка людзей выратавалася, пераплыўшы цераз Дзісёнку, бо мост пачаў гарэць раней, чым байцы пачалі пераправяцца на другі бераг» — успамінаў Ільпар Ільмапен.

У канцы ліпеня тут адбыўся бой, які стаў лёсавызначальным на Паўночным фронце ў час савецка-польскай вайны. Гэта вясная аперацыя ўвайшла ў гісторыю пад назвай «Малы Седан».

Згодна з планамі М.М.Тухачэўскага, меркавалася акружыць частку польскіх сіл, згрупаваных па лініі Германавічы — Лужкі — Глыбокас. Увесь план меў мэту знішчыць 4 ліпеня некалькі польскіх дывізій. Камандзір 4-й арміі П.Сяргееў распрацаваў графічныя схемы гэтага плана. 15-я армія, якая складалася з найлепшых сіл і была добра ўкамплектавана, павінна была атакаваць палякаў у Германавічах і Глыбокім з фронту, а суседнія дзве арміі, 4-я і 3-я, меліся быць правым і левым плячамі, ахопліваючы поўдзень і поўпач ад Глыбокага і Германавіч для адсячэння дарог адступлення праціўніка.

Згодна з далейшымі планамі М.М.Тухачэўскага, 4-я армія атрымлівала наступнае задапне. На левым крыле 18-я дывізія павінна была затрымаць адыход праціўніка ў тым раёне. Частку сваіх сіл, 12-ю і 53-ю дывізіі, а таксама 164-ю брыгаду, Сяргееў сцягваў на перамычку паміж Дзвіной і балоцістым возерам Ельня з задапнем прарваць там фронт праціўніка і праправіць усю пяхоту па поўдзень Германавіч і Шаркаўшчыны і адначасова рушыць кавалерыю ў глыбокія тылы.

Наступленне распачалося а 8-й гадзіне раніцы пры падтрымцы ўраганным агнём, які цягнуўся паўгадзіны. Першыя, відаць, слабаабаронепыя лініі палякаў былі заняты а 9-й гадзіне. Пасля гэтага наступленне пайшло павольна, бо палякі адказалі цэлым шэрагам контратак. Толькі каля 18 гадзін вечара дывізіі Сяргеева сабраліся ў калоны і распачалі марш па схеме, але ніводная з баявых адзінак не змагла выканаць свайго задання.

Гэты няўдалы бой сарваў аперацыю. На суседнім напрамку 18-я дывізія праводзіла цэлы дзень у бесперапынных атаках на адну з брыгад 10-й дывізіі польскага войска. Першы дзень для 4-й арміі скончыўся няўдала.

На поўдні польскае войска атакавала 15-я армія, якая мела ў сваім распараджэнні 4 дывізіі. Яна была расцягпута на 50 кіламетраў і сустрэла з боку палякаў 11-ю дывізію на паўднёвым напрамку, брыгаду 5-й дывізіі, 7-ю рэзервовую брыгаду і 17-ю дывізію на паўночным. Ход гэтай бітвы

даволі цяжка выявіць. На паўднёвым напрамку войскі Тухачэўскага пайшлі ў наступленне ад чыгункі Полацк — Маладзечна, дайшлі да рэчкі Мнюта, зрабіўшы каля 8 кіламетраў. На поўнач ад чыгункі, дзе змагаліся часці 15-й арміі, савецкія войскі ўтрымліваліся контратакамі 17-й і 10-й дывізій, што і стрымала атакі большавікоў, якія ідзе не прайшлі больш за 3—4 кіламетры. Частка польскага войска была разбіта і пяздолына да вядзення далейшых ваенных дзеянняў. Гэта датычыцца 5-й дывізіі і 7-й рэзервовай брыгады.

Такім чынам, мэтай войска Тухачэўскага было хуткае акружэнне польскай арміі ў раёне населеных пунктаў Германавічы — Глыбокае, мэтай войска Пілсудскага — стрымліванне атак непрыяцеля.

Першы дзень бітвы, 4 ліпеня, для абодвух бакоў аказаўся няўдалым. На поўначы 4-я армія Сяргеева перамяшчалася ў вызначаным напрамку далей безвынікова: два батальёны 33-га палка палякаў, панёсшыя вялікія страты ў баях, перамяшчаліся без сутыкнення з непрыяцелем проста на захад, у далейшых бітвах свабоды дывізіі ўдзелу не прымалі. Першыя сутыкненні з непрыяцелем адбыліся апоўдні пад Пагостам і далей на поўнач. Сутычкі гэтыя стрымлівалі савецкія сілы на маршы. Сяргееў, незадаволены сваёй 53-й дывізіяй, якая ў гэты дзень не дайшла нават да Шаркаўшчыны, як гэта было вызначана, і змяніла напрамак з паўднёвага на заходні. Тое ж самае здарылася і з 12-й дывізіяй.

Пра гэты дзень для 4-й арміі М.М.Тухачэўскі зазначае, што часці 8-й польскай дывізіі былі атакаваны ў часе маршу, разбіты і страцілі ўсялякую здольнасць да вядзення далейшых ваенных аперацый. Сяргееў у дадзеным выпадку больш сціпла сцвярджае, што войскі змагаліся вяла ў напрамку правага крыла і ў рэшце рэшт не выканалі свайго задання на 5 ліпеня.

У той жа дзень польскі генерал Жалігоўскі загадаў 10-й дывізіі займаць раку Мнюту для таго, каб выраўняць фронт з суседзямі справа. Згодна са зводкамі гэтай дывізіі, з раніцы 5 ліпеня яна без усялякіх цяжкасцей рушыла на Мнюту, займаючы ў ваколіцах в. Лужкі абодва берагі.

Цэнтр утрымлівала 5-я армія, якая на працягу 5 ліпеня павольна прасоўвалася наперад. На схеме Сяргеева гэта прадстаўляецца так: 11-я і 33-я дывізіі мінулі раку Мнюта, куды дайшлі напярэдадні. 54-я і 16-я дывізіі ў гэты ж дзень таксама дайшлі да гэтай рэчкі. У зводцы 10-й польскай дывізіі гаворыцца пра цяжкія баі, якія вяліся 5 ліпеня на беразе ракі Мнюты.

Апоўдні кіраўнік 1-й польскай арміі са згоды камандуючага фронтам загадаў адступаць. Загад адначасова не даходзіць да ўсіх камандзіраў, а самая паўночная група пад кіраўніцтвам генерала Жалігоўскага яго не атрымала ўвогуле. Распачалося актыўнае адступленне польскага войска. Першым загад атрымаў генерал Жандкоўскі, наступным — генерал Енджысўскі. Сам Енджысўскі сцвярджае, што загад атрымаў позна вечарам 5 ліпеня. Адступленне планавалася рабіць на захад, па дарозе Глыбокае — Дунілавічы і далей, у напрамку Вільні праз Паставы і Свянцяны ці праз Свір і Міхалішкі. Адступленне ў гэтым напрамку было б найлепшым варыянтам, і армія пад кіраўніцтвам генерала Жалігоўскага не апынулася б у цалкам ізаляванай сітуацыі. Толькі ў 2-й палове дня 5 ліпеня стала бачна, што правае крыло на беразе Мнюты пад Лужкамі аказалася без усялякай падтрымкі. У цэлым жа 10-я польская дывізія на Мнюце і 8-я польская дывізія каля Пагоста адчулі націск наступаўшых даволі моцных сіл 4-й арміі Сяргеева. Генерал Жалігоўскі ў гэтай сітуацыі здолеў адступіць у ноч на 6 ліпеня і выйсці на збліжэнне з групай генерала Енджысўскага. Начное адступленне было цяжкім. Раніцай 6 ліпеня генерал Жалігоўскі разам з 10-й дывізіяй знаходзіўся каля Мосара. Тым часам 8-я дывізія яшчэ адступала ад Шаркаўшчыны па поўдзень. Жалігоўскі апынуўся ў пустцы: побач ні сваіх, ні чужых. Ацаніўшы сітуацыю, ён зразумеў, што апынуўся ў тыле савецкіх войскаў.

Першыя баі 4, 5, 6 ліпеня былі скончаны. Яны паклалі пачатак новай сітуацыі на Паўночным фронце, якая завяршылася праз паўтара месяца разгромам польскай арміі пад Варшавай. Якія выпікі гэтай вайны?

З красавіка па кастрычнік 1920 г. польскае войска страціла 184 246 чалавек — амаль 20% свайго максімальнага складу. Страты Чырвонай арміі афіцыйна не аб'яўляліся. Яна пераможна дайшла да польскай сталіцы, а потым вярталася назад, адступаючы пад націскам польскага войска.

А.Э.Адамковіч.

Дакументы сведчаць

ДЫРЭКТЫВА АРМІЯМ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ АБ НАНЯСЕННІ ЎДАРУ ПРАЦІЎНІКУ Ў РАЁНЕ ЛЕПЕЛЬ — ПОЛАЦК

24 верасня 1919 г., 23 гадз 10 мін.

№ 064/секр. Смоленск

Так как противник продолжает развивать свой успех в районе Полоцка, создавая этим угрозу витебскому направлению, то считаю наиболее соответственным при данных условиях обстановки сосредоточенными частями 52-й дивизии совместно с частями 17-й дивизии нанести удар противнику в районе Витебск — Лепель — Полоцк, для чего приказываю:

1. Передать боевой участок 17-й дивизии из 15-й армии в 16-ю, причем разграничительную линию между армиями устанавливаю: ...До окончания перегруппировки, которая должна быть закончена не позднее 30 сентября, разграничительной линией между армиями остается ныне существующая между 4-й и 17-й дивизиями, а именно: Лужки — Горовое — стн. Боровуха — стн. Клястицы — все пункты для 4-й дивизии включительно...

ДЫРЭКТЫВА КАМАНДАВАННЯ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ АРМІЯМ ФРОНТУ АБ ПЕРАХОДЗЕ Ў НАСТУПЛЕННЕ

12 мая 1920 г., 1 гадз 20 мін.

...Армиям фронта приказываю перейти в решительное наступление, разбить и отбросить польскую армию к Пинским болотам, для чего:

...

2. 15-й армии 14 мая с рассветом стремительно атаковать противника и 18 мая овладеть районом Шарковщизна — стн. Новодруцк — Докшицы — устье р. Сергучь.

Командзап Тухачевский

Член РВС Уншлихт

ДЫРЭКТЫВА КАМАНДАВАННЯ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ КАМАНДАВАННЮ 15-й І 16-й АРМІЙ І ПАЎНОЧНАЙ ГРУПЫ АБ ЗАНЯЦЦІ РАЁНАЎ МАЛАДЗЕЧНА І МІНСКА

19 мая 1920 г., 17 гадз 10 мін.

№ 01249 (оп) сек., Витебск

Войска 15-й и 16-й армий форсировали р. Березину.

Приказываю стремительно развивать успех, для чего:

1. Северной группе, очищая левый берег р. Западной Двины и наблюдая на этом участке границу Латвии, выдвинуть 18-ю дивизию не позднее 24 мая в район Старой и Новой Шарковщизны, имея целью обеспечить правый фланг 15-й армии.

Командзап Тухачевский

Член Реввоенсовета Уншлихт

Наштазап Шварц

З РАЗМОВЫ ПА ПРАМЫМ ПРОВАДЗЕ ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧАГА ЎСІМІ ЎЗБРОЕНЫМІ СІЛАМІ РЭСПУБЛІКІ З КАМАНДУЮЧЫМ ЗАХОДНІМ ФРОНТАМ М.М.ТУХАЧЭЎСКІМ

4 чэрвеня 1920 г.

У аппарата тов. Тухачевский.

Г Л А В К О М: Здравствуйте... как протекают события?

Т У Х А Ч Е В С К И Й: Здравствуйте, Сергей Сергеевич. Пока что дело не улучшается. 53-я дивизия, продолжая отходить, вела бои на линии Ясюки — Свидна — Дроздовщино; 12-я дивизия, которая, кстати, запоздала движением на юг, примерно из района Глубокое двигается вдоль железной дороги на Свенцяны для контрудара. О выполнении Северной группой ее маневров еще сведений не получено. Между прочим, в районе примерно Шарковщизна — Алашки имеются 52-я и 54-я бригады 18-й дивизии...

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ПАЛЯВОГА ШТАБА РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ВАЕННАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ АБ СТАНОВІШЧЫ НА ФРОНЦЕ 15-й І 16-й АРМІЙ

5 чэрвеня 1920 г.

В районе юго-западнее г. Дриссы противник овладел дер. Повято, в 20 вер. юго-западнее Дриссы, но контратакой был выбит. Противник оттеснил наши части к м. Иоды. На свенцянском направлении после боев к западу от Старой и Новой Шарковщизны наши части принуждены были отойти на новые позиции, 5—7 вер. восточнее указанного местечка.

Начоперсовет Шапошников

Военком Клим

ДЫРЭКТЫВА КАМАНДАВАННЯ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ АРМІЯМ ФРОНТУ АБ ЗАДАЧАХ ПА РАЗГРОМЕ ГАЛОЎНЫХ СІЛ ПРАЦІЎНІКА

30 чэрвеня 1920 г., 5 гадз 20 мін.

Полоцк

Противник группирует свои главные силы в районе Докшицы—Глубокое—Германовичи.

...

Приказываю занять исходное положение к предстоящему наступлению, для чего:

6. Разграничительные линии между 4-й и 15-й армиями: Устье Ушачское — оз. Стречно — м. Лужки — оз. Муровщизна.

Приказ о наступлении последует дополнительно.

Начоперсовет Шапошников

Военком Клим

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ПАЛЯВОГА ШТАБА РЭВВАЕНСАВЕТА РЭСПУБЛІКІ АБ СТАНОВІШЧЫ НА ЗАХОДНІМ ФРОНЦЕ

6 ліпеня 1920 г.

На левом берегу Западной Двины наша конница, сбивая местами упорно обороняющегося противника, 5 июля вышла на линию селений Лапина — Каменка и озер. у м. Слободка все пункты в 45 вер. западнее Дриссы. Наши обходящие колонны, наступающие западнее болотистого района, что в 30 вер. западнее Дисны, правофланговыми частями 5 июля достигли линии Линковщизна—Заборье—Мотейки и с боем продолжают наступление на м. Погост. Левофланговые части, заняв 5 июля стн. Погост и Германовичи, к утру 6 июля с упорным боем вышли на линию р. Дисенка, на участке Боярщина — Великое Село, и продолжают наступление в направлении Осино — Городок.

На свенцянском направлении наши войска, заняв с упорным боем м. Лужки, 6 июля вышли на линию селений Марянполь — Лучайка — Сороки — Слобода, что в 6 вер. западнее и в 16 вер. юго-западнее Лужки. Наша конница, брошенная для преследования противника еще 5 июля, заняла м. Глубокое, где имела упорный бой с противником...

Начоперсовет Шапошников

(За)военкома Васильев

ДЫРЭКТЫВА КАМАНДАВАННЯ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ АРМІЯМ ФРОНТУ

14 кастрычніка 1920 г.
18 гадз 40 мін.

Смоленск

Приказываю:

1. Начдиву ВОХР с 6 час. 15 октября начать отход по маршруту Глубокое—Лужки—Дисна и к 12 час, 19 октября, сосредоточиться во фронтовой резерв в районе Борковичи—Дисна—Боровуха, имея ночлеги 15 октября в районе Глубокое, 16 октября — в Велец, что 10 вер. севернее Плиссы, 17 октября — в районе Улина, что 10 вер. восточнее Лужки...

Командарм Тухачевский

Член РВС Уншлихт

Наштазап Н.Соллогуб

Друкуецца па кн.: Борьба за советскую власть в Белоруссии 1918—1920 гг.: Сборник документов и материалов. Мн., 1971. Т. 2. С. 206, 290, 296.

У СКЛАДЗЕ ПОЛЬШЧЫ (1921—1939)

У адпаведнасці з Рыжскім мірным дагаворам, заключаным 18 сакавіка 1921 г., 113 тыс. км² тэрыторыі заходняй часткі Беларусі з насельніцтвам больш за 4 мільёны чалавек адышло да Польшчы. Тут быў уведзены польскімі ўладамі новы тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел. У 1920—1921 гг. тэрыторыя сучаснага раёна часова дзялілася на некалькі гмін і адносілася да Дзісенскага павета Навагрудскага ваяводства. Павятовая адміністрацыя была пераведзена ў той час у Глыбокае, бо Дзісна знаходзілася на мяжы з Савецкай Беларуссю, якая праходзіла па Заходняй Дзвіне. З 1921 г. па 1939 г. Лужэцкая, Германавіцкая і Шаркаўшчынская гміны адносіліся да Дзісенскага, Ёдская і Новапагосцкая — да Браслаўскага паветаў Віленскага ваяводства. Частка населеных пунктаў уваходзіла ў Пастаўскі павет.

Не толькі ў тэрытарыяльных, але і ў эканамічных адносінах Заходняя Беларусь была ўскраінай, аграрным прыдаткам цэнтральных раёнаў Польшчы, крыніцай сыравіны і танней рабочай сілы. Не з'яўлялася выключэннем і Шаркаўшчына. 80 % насельніцтва краю займалася сельскай гаспадаркай. Буйным памешчыкам, якія складалі менш за 1% землеўладальнікаў, належала больш як палавіна ўсёй прыватнаўласніцкай зямлі. У сярэднім на памешчыцкі маёнтак прыпадала 500 гектараў зямлі, а на сялянскі двор — менш за 7 гектараў.

У 1921 г. польскія ўлады правялі ўлік насельніцтва і маёмасці па кожнай гаспадарцы. Перапісу падлягалі: колькасць членаў сям'і, колькасць зямлі, коней, кароў, бугаёў, ялавак, цялят, авечак, свіней, коз, пчаліных сем'яў. Адзначалася веравызнанне гаспадароў. Па Лужэцкай гміне, напрыклад, былі ўлічаны 1743 сям'і, якія пражывалі ў 64 вёсках, засценках, маёнтках, фальварках. Усяго ўлічаны 6043 дзесяціны зямлі. «Амаль кожная гаспадарка мела каня, па адной карове, па пары і болей авечак. Свінні меліся не ва ўсіх, пецелі і цяляты таксама рэдка ў каго былі, бугаёў не было, козы — вялікая рэдкасць, пчол мала». (Запальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна, фонды 479, 509, 441.)

Да нашых дзён не захавалася каля паловы вёсак, адзначаных у тых спісах, зніклі хутары, засценкі, маёнткі. Аднак па Ёдскай гміне ёсць спісы (па кожнай вёсцы) тых гаспадарак, якія мелі рабочую жывёлу. У спісах даецца прозвішча і імя гаспадара, у якога ёсць коні, указваецца колькасць іх, узрост, рост.

Усяго па Ёдскай гміне адзначаны 2284 гаспадаркі (у тым ліку на той частцы тэрыторыі, якая цяпер знаходзіцца ў Браслаўскім раёне).

Межы гмін змяняліся. Таму адны і тыя ж населеныя пункты трапілі ў розныя спісы. Гэта датычыцца вёсак і маёнткаў у памежжы Ёдскай і Шаркаўшчынскай, а таксама Новапагосцкай і Шаркаўшчынскай гмін.

За час 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў (1914—1921) прыйшлі ў запусценне многія землеўладанні. У спіс землеўладанняў, якія страцілі ўласнікаў, па Браслаўскім павеце, напрыклад, увайшла 61 гаспадарка з агульнай плошчай зямлі 3890 дзесяцін. Многія ўласнікі, вярнуўшыся пасля вайсковага ліхалецця, спрабавалі даказаць, што зямля не была пакінутая без нагляду, і прад'яўлялі дагаворы за 1913 г. і 1914 г. на здачу гэтай зямлі ў арэнду, ды гэта мала дапамагала. Палякі павялі канфіскацыйную палітыку ў адносінах да буйных маёнткаў. Напрыклад, на вядомы ў Міёрскім раёне маёнтак графаў Лапацінскіх у Лявонпалі плошчай 242 га налічана падаткаў за час вайны 73 375 марак, уплачана 2000 марак, недаплата склала 71 375.

Падаткі былі непасільнымі для спустошаных гаспадарак, і зямля падлягала-

ла секвестру. (Там жа. Ф. 436. Воп. 1. Спр. 338.)

На канфіскаваных землях польскія ўлады хутка рассялілі асаднікаў — дэмабілізаваных удзельнікаў вайны з Расіяй. Гэта былі пераважна былыя афіцэры і унтэр-афіцэры. Ужо ў 1921 г. у Дзісенскім павеце быў 41 асаднік. Да прыкладу, у Падорцы (цяпер вёска ў Лужкоўскім сельсавеце) пасяліліся Ян Урбановіч, Часлаў Рагальскі, Браніслаў Сініцкі.

На першым часе асаднікі знаходзіліся па паўвайсковым становішчы, былі аб'яднаныя ў 2 камандy. Адна называлася «Брыгада язды», другая — «Група Бенякопа». Дзяржава зрабіла ўсё неабходнае, каб пасяленцы не толькі былі гатовы ў любы дзень стаць у вайсковы строй (на конях), але каб адразу мелі спраўную гаспадарку. Толькі ў 1921 г. выдадзена для «Брыгады язды» бясплатна: коней — 135 галоў, вазоў — 17, упражы — 11 пар, рыдлёвак — 20, плугоў парных — 135, аднакорпых — 15, культыватараў — 3, кос — 153, насення бульбы — 20 840 кг, аўса — 33 420 кг, насення капусты — 7 фунтаў, буракоў — 21 фунт, жыта — 29 407 кг і г.д. Грошай асаднікі атрымалі 7 752 917 марак. Для «Групы Бенякопа» выдадзена: коней — 27, вазоў — 16, упражы — 1 пара, плугоў — 45, кос — 30, жыта — 23 828 кг, аўса — 220 пудоў, бульбы — 400 пудоў і г.д. (Там жа. Ф. 472. Воп. 1. Спр. 3.)

У ходзе так званай камасацыі, пад выглядам барацьбы з цераспалосіцай сяляне гвалтоўна прымушалі высяляцца на хутары. Каб узняць хутарскую гаспадарку, патрэбны былі вялікія сродкі. Таму многія сераднякі і беднякі пры камасацыі разараліся, іх землі захоплівалі асаднікі і кулакі.

Да 1939 г. на хутары было расселена каля 70 % сялянскіх гаспадарак. У асноўным шматлікія хутары размяшчаліся па абодвух берагах Дзісёнкі, паблізу лясных масіваў. Большасць з іх былі невялікімі, пават зусім дробнымі (1—5 гектараў). Былі і больш буйныя хутарскія гаспадаркі — па 10—20 гектараў зямлі. Гаспадар, які меў больш за 20 гектараў, лічыўся ў ваколіцы самым заможным.

Жыццё сяляніна было нялёгкім. Апрацоўка зямлі, сяўба, сенакос, уборка ўраджаю, догляд жывёлы займалі практычна ўвесь светлавы дзень. Тэхнікі ў той час у сялянскіх гаспадарках было вельмі мала, мелі яе толькі самыя заможныя гаспадары. Таму ў пераважнай большасці гаспадарак усё рабілася ўручную: сеялі, жалі, малаціліі, апрацоўвалі лён пры дапамозе адвечных сялянскіх прылад працы. За сельскагаспадарчую прадукцыю на рынку плаціліі мала, а прамысловыя тавары каштавалі дорага. Адзін пуд жыта каштаваў на рынку 2 злотыя, а 1 кілаграм цукру 1 злоты. Каб купіць веласіпед, які каштаваў 100—120 злотых, трэба было прадаць 50—60 пудоў жыта ці карову. Сяляне пакутавалі ад малазямелля, памешчыцкай і кулацкай кабалы.

Польскі ўрад прымаў значныя меры, каб каланізаваць заходнебеларускія землі, паланізаваць беларускае насельніцтва. На гэта была накіравана і палітыка ў галіне адукацыі. Існаваўшыя раней рускія і адкрытыя ў 1918 г. беларускія школы закрываліся, сталі ствараццa так званыя паўшэхныя (усеагульныя) школы. Беларускіх настаўнікаў звальнялі з працы. Замест іх у Заходнюю Беларусь накіроўвалі настаўнікаў з Польшчы. Па вёсках складаліся спісы бацькоў, якія згаджаліся аддаць дзяцей у польскую школу. У спісах пазначалася веравызнанне. Адпачасова складаліся спісы кандыдатаў у настаўнікі з тых, хто валодаў польскай мовай.

Па Ёдскай гміне маецца спіс школ, якія працавалі ў 1920 г.: Запружаны, 25 вучняў, настаўнік Алёйза Буйніцкі; Рудава, 31 вучань, настаўніца Францішка Буйноўская; Забор'е, 31 вучань, настаўніца Вераніка Клок; Цяцеркі, 40 вучняў, настаўніца Марыя Бездзель;

Споруны, 20 вучняў, настаўніца Ядвіга Пухальская.

Па 5 школ існавала ў іншых гмінах, але поўных спісаў не захавалася. Былі школы ў Шаркаўшчыне, Шкунціках, Барсуках, Лужках.

У наступныя гады пачатковыя польскія школы адкрываліся паўсюдна. Моладзь абмяжоўвалася пераважна пачатковай адукацыяй, мала хто меў магчымасць вучыцца далей (у Дзісне або ў Глыбокім, дзе існавалі гімназіі).

За парадак у вёсцы і на бліжэйшых хутарах адказваў солтыс (староста). Як і ў іншых вяскоўцаў, у солтыса была свая гаспадарка. Адначасова ён дапамагаў сялянам дастаць у гміне неабходную даведку, адтэрміноваць падатак, адкупіцца ад секвестратара. Гэта быў найбольш блізкі для сялян прадстаўнік улады.

Вышэй адміністрацыйная лесвіца будавалася наступным чынам: у гміне ўладу прадстаўляў войт, у павеце — павятовы староста, ваяводствам кіраваў ваявода.

У кожнай гміне быў паліцэйскі ўчастак, узначальваемы камендантам паліцыі. Паліцэйскія патрулі штодзень кантралявалі вёскі і хутары, сачылі, каб не было «крамолы», дапамагалі секвестратарам спаганяць падаткі з сялян, шукалі самагоншчыкаў. У абавязкі паліцэйскіх уваходзіў кантроль не толькі за грамадскім парадкам, але і за выкананнем жыхарамі вёсак, мястэчак санітарных патрабаванняў. З гаспадароў, якія забываліся падмесці вуліцу, прыбраць у двары, спаганяліся штрафы. Кожны паліцэйскі на службе павінен быў мець 22 прадметы: аловак хімічны і звычайны, чарніла, ручку, паперу, кампірку, люстэрка, пячатку, свечку, запалкі, метр тасьмовы, ліхтарык, наручнікі, службовую інструкцыю, гадзіннік, сціпорык, компас, лупу, свісток і інш.

Найбольш клопату польскім уладам у першыя гады іх панавання ў Заходняй Беларусі дастаўлялі парушальнікі граніцы. У 1921—1922 гг. па кожнай воласці затрымлівалі па нескалькі соцень людзей, якія пераходзілі мяжу. Часцей за ўсё гэта былі тутэйшыя людзі, што варочаліся дадому з Расіі (бежанцы ад вайны, дэмабілізаваныя з Чырвонай арміі, уцекачы ад голаду з рускіх гарадоў). Сярод затрыманых у той час былі вядомыя на Шаркаўшчыне людзі Вацлаў Паўлавіч Ваштаёнак, Міхаіл Шаблоўскі, Аляксей Заяц і іншыя.

Працоўныя нашага краю, як і ўсёй Заходняй Беларусі, змагаліся за вызваленне з-пад польскага прыгнёту, пад уплывам савецкай прапаганды верылі ў шчаслівае грамадства на ўсходзе, імкнуліся да ўз'яднання з Савецкай Беларуссю. Даходзілі ў наш край звесткі аб тым, як там жывуць людзі. Часцей за ўсё яны абнадзейвалі: па той бок мяжы ў 1920-я гады сялянам раздавалі зямлю. Людзі маглі, нарэшце, выбіцца з беднаты, з малазямелля, умацаваць свае гаспадаркі, наладзіць добрае жыццё.

Некаторыя жыхары нашых мясцін, якія трапілі ў невыносныя ўмовы жыцця пад польскай уладай, пераходзілі мяжу з Савецкай Беларуссю. Іншыя вымушаны былі ў пошуках работы і сродкаў для існавання эмігрыраваць у краіны Заходняй Еўропы, ЗША, Канаду, Аргенціну.

Нацыянальна-вызваленчы рух

Нацыянальны прыгнёт, каланіяльная эканамічная палітыка садзейнічалі росту свядомасці і згуртаванасці людзей, што прывяло да абвастрэння класавай барацьбы. У Заходняй Беларусі разгарнуўся рэвалюцыйны і нацыянальна-вызваленчы рух, у які ўцягваліся шырокія кругі насельніцтва. Нярэдка сяляне палілі маёнткі памешчыкаў, сядзібы асаднікаў, урадавых чыноўнікаў, рабілі налёты на польскія войскі.

Стыхійныя сялянскія выступленні часам перарасталі ва ўзброеныя сутыкненні з паліцыяй. Такія выступленні адбыліся ў

Лужках, Германавічах, Ёдах і іншых населеных пунктах павета.

Сяляне масава адмаўляліся выконваць розныя павіннасці, самавольна секлі лес, які некалі належаў ім, выступалі ў абарону сваіх зямель ад прэтэнзій з боку памешчыкаў, кулакоў, асаднікаў. На тэрыторыях гмін дзейнічалі ячэйкі КПЗБ і КСМЗБ. Асноўнай мэтай іх дзейнасці было вызваленне з-пад улады Польшчы, уз'яднанне краю з Савецкай Беларуссю, вырашэнне эканамічных праблем, у першую чаргу надзяленне ўсіх сялян зямлёй, адраджэнне беларускасці. Актыўнымі камуністамі-падпольшчыкамі ў Шаркаўшчыне былі Міхаіл і Вацлаў Ваштаёнкі, паэт Міхась Машара. Падпольшчыкі распаўсюджвалі лістоўкі, збіралі зброю. У дні рэвалюцыйных свят вывешвалі ў Шаркаўшчыне і іншых месцах чырвоныя сцягі і транспаранты з рэвалюцыйнымі лозунгамі, праводзілі масоўкі, мітынгі. Было ўлічана па Дзісенскім павеце 18 сяброў КПЗБ.

Размах нацыянальна-вызваленчага руху народных мас прывёў да стварэння легальных рэвалюцыйна-дэмакратычных арганізацый. Першай такой арганізацыяй стала Беларуская сялянска-работніцкая грамада. Задачы і мэты яе адпавядалі патрабаванням працоўных мас: перадача зямлі сялянам, 8-гадзінны рабочы дзень, палітычныя свабоды, навучанне на роднай мове, самавызначэнне і аб'яднанне ўсіх беларускіх зямель у рэспубліцы сялян і рабочых і іншыя.

Члены Грамады ў справе нацыянальнага і сацыяльнага вызвалення беларускага народа абапіраліся на сялянства, якое ў пераважнай масе было малазямельным. А таму на першым плане ў іх была зямельная рэформа, барацьба за зямлю для сялянства. Беларускія паслы (дэпутаты) у сейме, а сярод іх прадстаўнікамі Дзісеншчыны былі Пётр Мятла, Язэп Драздовіч, узнімалі на пасяджэннях сейма пытанні, якія датычылі надзённых патрэб жыцця сялянства. Беларускія дэпутаты накіроўвалі міністрам польскага ўрада запыты, у тым ліку і па нашай мясцовасці, уздымалі пытанні аб адкрыцці беларускіх школ, аб неправамерных дзеяннях паліцыі, аб беспадстаўных арыштах сялян.

Актыўнымі грамадскімі дзеячамі з Шаркаўшчыны, якія абаранялі правы сялян, выступалі ў друку з крытыкай існуючых парадкаў, былі Пётр Ластаўка і Янка Пачопка.

Дзякуючы намаганням беларускіх дэпутатаў сейма ў Глыбокім у 1925 г. быў адкрыты філіял Беларускага кааператыўнага банка і кааператыў «Сноп».

У ліпені 1926 г. пачалася актыўная арганізацыя гурткоў Грамады. Гэта работа вялася пад кіраўніцтвам камуністаў.

Актыўным дзеячам нацыянальна-вызваленчага руху ў нашай мясцовасці быў паэт Міхась Машара. На Шаркаўшчыне ён арганізоўваў гурткі Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Яго паплечнікамі былі Вячаслаў Рымдзёнак, Фама Батвінёнак, Марыя Шаблоўская і іншыя.

У першай палове 1920-х гадоў беларускі рух у Заходняй Беларусі абапіраўся на даволі шырокую агульнанацыянальную платформу і, па сутнасці, уяўляў сабой адзіны нацыянальна-вызваленчы фронт. Рухавіком яго былі значныя інтэлектуальныя сілы, сканцэнтраваныя ў Вільні ў папярэднія гады і асабліва на зыходзе 1-й сусветнай вайны і рэвалюцый. Антону Луцкевічу, Максіму Гарэцкаму, Уладзіміру Самойлу, Леапольду Радзевічу, Адаму Станкевічу, Францішку Аляхновічу, Ігнату Капчэўскаму, Пятру Мятле ды іншым належыць стварэнне беларускага перыядычнага друку ў Вільні, якому наканавана было адыграць дзейсную ролю ў палітычнай асвеце народа, фарміраванні вызваленчай грамадскай думкі.

У Вільні са студзеня 1926 г. да 26 снежня 1928 г. стаў выходзіць двухтыднёвы гумарыстычны часопіс «Маланка».

Часопіс падтрымліваў і прапагандаваў палітычную праграму Беларускай сялянска-работніцкай грамады, адстойваў інтарэсы працоўных Заходняй Беларусі, высмейваў польскі ўрад, грамадскую пасіўнасць, мяшчанства.

Друкаваліся вершы Я.Купалы, Я.Коласа, Ф.Багушэвіча, К.Крапівы, М.Васілька, Я.Маразовіча (Я.Маланкі), змяшчаліся фельетоны, эпіграмы, жарты.

Двухтыднёвік «Маланка» карыстаўся вялікай папулярнасцю ў насельніцтва Заходняй Беларусі. Тыраж вырас да 3000 экзэмпляраў. Польскія ўлады часта штрафавалі і канфіскоўвалі «Маланку». І тады замест канфіскаваных нумароў выходзілі сатырычныя аднадзёнкі «Пякучая маланка», «Новая маланка». Усяго выйшла 40

нумароў «Маланкі», 7 былі канфіскаваны.

«Маланку» выпісвалі і чыталі ў нашай мясцовасці. Амаль у кожным нумары часопіса землякі знаходзілі сатырычныя і гумарыстычныя вершы агранома і паэта з в. Летнікі Янкі Пачопкі (псеўданімы Я.Башкір і Я.Шкірба).

У сатырычным вершы «Паправіў» ён едка высмеяў лужэцкага землеўласніка графа Плятэра:

ПАПРАВІЎ

Аднойчы з шпацыру да хаты
па вёсцы нашай ад гумён
Ішлі адзін з адным два фаты
(Двара Лужэцкага паняты)
Па йменню: Янэк і Сымон.
І, як на грэх, бяду якую,
У канцы аж самага сяла
Сустрэлі панічы свінню такую
(Нязвыкла для хлапцоў таўстую),
Што раптам абодвух цікавасць узяла.
У задуменні кажа Сымон брату:
— Глядзі, Янэчак, а я-я!..
Напэўна, аж таўсцей за тату
(Хоць і той наш чуць лезе ў хату)
Ужо будзе гэтая свіння!
— Цьфу! Ты, дурань, — лаяць брата
Пачаў Янэчак тут адразу:
— Ты з кім зраўняў гэту заразу!
Такіх свіней, як ёсць наш тата,
У жыцці не ўбачыш ты ні разу.

Маланка. 1926. № 3.

САМАЎРАД

Войта выбралі — прагналі:
— Беларусі, нельга! — сказалі.
У радзе гміннай ухвалілі,
А ў павеце адмянілі,
Няма войта. Маўчыць рада.
У пастарунку ўся ўлада.
Дык што ж за правы цяпер, брат?
Ці не знаеш? — Самаўрад.

Маланка. 1926. № 9.

Уплыў Грамады на жыхароў Заходняй Беларусі быў вельмі значны. Уздым нацыянальнага руху быў такім вялікім, што да канца 1926 г. у Дзісенскім павеце 198 гурткоў Грамады аб'ядноўвалі 9980 чалавек. Спыніць дзейнасць арганізацыі паставіў сваёй задачай урад Ю.Пілсудскага, які прыйшоў да ўлады ў Польшчы ў маі 1926 г. Адразу ўзрасла «ўвага» паліцыі да Грамады. А ў 1927 г., у ноч з 14 на 15 студзеня, пачаўся планамерны разгром гурткоў арганізацыі, масавыя арышты актывістаў і камуністаў.

Польскай дэфензівай быў арыштаваны і Міхась Машара, які прасядзеў у віленскай турме Лукішкі тры з паловай гады.

Аднак запалохаць народ было нельга. Нацыянальна-вызваленчы рух працягваў развівацца ў Заходняй Беларусі. У дэмакратычнай беларускай прэсе 1930-х гадоў можна сустрэць нямала артыкулаў, у якіх расказваецца аб пашырэнні нацыянальна-вызваленчага руху ў нашым краі.

Ва ўмовах паланізацыі жыхары нашага краю імкнуліся захаваць родную мову, навучаць ёй дзяцей, зберагчы нацыянальную культуру, традыцыі, звычаі.

У 1921 г. у в. Сталіца мастак Язэп Драздовіч адкрыў беларускую школу. Вось што запісаў аб гэтым у сваім «Дзённіку» сам дзядзька Язэп. «У 1921 г. у в. Сталіца, што непадалёку ад Германавіч, залажыў беларускую школу. Ды праіснавала яна не больш як тры месяцы. Польскія ўлады закрылі яе як «нелегальную». Шкадавалі бацькі і плакалі дзеці... вучняў сваіх вучыў па сваёй методыцы без «пастрах і кары», а па зразуменні што ёсць дабро і зло, што прыгожа і непрыгожа. Слухалі мяне не як «господина учителя» ці «пана», а як «дзядзьку пастаўніка».

У гэты час развіваўся і сталеў талент вядомага беларускага мастака, фалькларыста, этнографа, літаратара Язэпа Нарцызавіча Драздовіча. Творчасць яго ўзрасла на глебе нацыянальнага адраджэння, яе жывілі ідэі нацыянальнага і сацыяльнага вызвалення беларускага народа, любоў да роднай зямлі. Шляхі-дарогі вандроўнага мастака нязменна пралягалі праз нашы мясціны. Тут, на берагах Дзісны і Мнюты, ствараліся жывапісныя палотны, занатоўваліся думкі і назіранні.

Міхась Машара, Пётр Ластаўка, Янка Пачопка, Язэп Драздовіч сябравалі паміж сабой, часта сустракаліся, абмяркоўвалі рэаліі існуючага жыцця, шляхі яго змянення, будучыню свайго краю і народа, падтрымлівалі адзін аднаго, па-сяброўску крытыкавалі. Аб гэтым сведчаць старонкі іх дзённікаў, твораў, пісьмы. Месцамі сустрэч былі Лужкі, Германавічы, Пашкі, Летнікі.

У гэту кагорту нашых землякоў — творцаў, беларускіх інтэлігентаў, носьбітаў асветы і культуры на Шаркаўшчыне ўваходзіць і знакаміты садавод-самавук Іван

Паўлавіч Сікора. У 1930-я гады ён ужо актыўна займаўся развядзеннем пладовых і дэкаратыўных культур, ствараў непаўторныя сады і кветнікі, праводзіў доследы.

Усе гэтыя таленавітыя, самабытныя асобы мелі паміж сабой пастаянныя зносіны. Язэп Драздовіч неаднаразова бываў у Алашках у І.П.Сікоры. Міхась Машара вёў з Іванам Паўлавічам цікавую перапіску. На тым гектары зямлі, што меў Машара на сваім хутары Таболы, быў пасаджаны сад з сікораўскіх прышчэпаў.

Гэтых людзей аб'ядноўвала тое, што яны выйшлі з глыбінь народа, увесь час прагна імкнуліся да адукацыі, культуры. Сялянскія сыны, яны сталі адукаванымі людзьмі, дбалі аб развіцці беларускай культуры. Кожны з іх меў свой талент: паэта, агранома, садавода, мастака — і кожны прысвяціў яго служэнню свайму народу.

У 1930-я гады моладзь нашага краю пад уплывам камсамольцаў-патрыётаў часта наладжвала беларускія паказы. Аб адным з такіх у в. Шкунцікі расказаў невядомы аўтар пад псеўданімам Госць у прагрэсіўным часопісе «Шлях моладзі» (1934 г. № 6. С. 19).

«На кожнае такое прадстаўленне збіраецца многа людзей. Шмат іх было і на апошнім, якое адбылося ў першых днях, каторае не магло памясціць усіх прыбыўшых. Гэты раз на сцэне пастаўлена была шырока вядомая п'еска Радзевіча «Збянтэжаны Саўка». Самавукі артысты-аматары ігралі вельмі добра, асабліва ўдала іграў роль Саўкі Вязіцкі, які выклікаў буру воплескаў і цэлае мора смеху. У гэтыя мінуты вясёлага і здаровага смеху прысутныя хоць на хвіліну забываліся аб сваіх клопатах і горы, якіх так многа ў сучасным жыцці нашае вёскі. На паказе даведаўся я, што ў самым «Коле млодзежы вейскай» ідзе змаганне часткі смялейшае і свядомае беларускае моладзі з польскімі ўплывамі, потым моладзь гэта хоча ператварыць «Кола» ў якую-колечы культурна-прасветную арганізацыю беларускую. Гэта ўжо даўно пара зрабіць! Чэсць Вам, хлопцы Шкунцікаўскага «Кола», што вы і ў чужую форму ўносіце свой беларускі змест і памятаеце аб сваіх абавязках. З вас павінны ўзяць прыклад усе іншыя польскія арганізацыі моладзі на Беларусі».

Актыўная барацьба працоўных Шаркаўшчыны з польскімі ўладамі вялася аж да прыходу Чырвонай арміі ў 1939 г.

Л.М.Лабачэўская, К.А.Кожан.

Дакументы сведчаць

СПІС ВЁСАК І СТАН ГАСПАДАРАК У 1921 г. НА ЧАСТЦЫ ТЭРЫТОРЫІ НОВАПАГОСЦКАЙ ГМІНЫ, У ЯКУЮ ЎВАХОДЗІЛІ ВЁСКІ СУЧАСНАГА ШАРКАЎШЧЫНСКАГА РАЁНА

	Зямлі, дзесяцін	Двароў	Жыхароў	Коней	Кароў	Авечак	Свіней	Коз
1	2	3	4	5	6	7	8	9
Пілаты	91	17	130	14	25	47	20	
Кульнеўцы	80	22	94	12	17	38	6	
Кубелеўшчына	48	12	43	10	15	23		
Грыбоўшчына	80	9	57	4	14	33	3	
Гнілыя Балоты	10							
Забор'е	250	8	48	14	15	40	8	
Стара Борце	40	15	44	6	9	19	9	
Зарэчча	50	5	34	5	5	11	5	
Запруддзе-1	50	3	34	5	7	13	3	
Запруддзе-2	50	3	16	3	4	10	1	
Каты	100	9	96	11	18	4	11	
Каўшэлева	176	29	215	23	32	78	29	
Астраўкі	25	6	30	3	9	7		
Кадрышкі	80	9	77	8	16	22	6	
Бардзенцы	40	7	78	5	8	12	4	
Богаўшчына	60	3	21	3	3	10	8	

1	2	3	4	5	6	7	8	9
Бардзенцы, засц.	110	1	12	2	2	5	2	
Бардзенцы-2	51	2	12	2	1	3	1	
Захвашчоўка (Ляды)	40	10	48	5	8	12	10	
Бардзенцы-3	—							
Гірсы	50	5	26	5	7	9	3	
Ляндэрня	60	5	40	6	5	6	—	
Барсучына	144	6	58	х	16	20	6	
Пешчурына	100	9	14	х	11	10	4	
Галубка-1	60	2	14	3	2	2		
Галубка-2	17	1	6	1	1			
Галубка-3	10	2	10	1	2	1		
Гальяшоўка	40	4	20	1	5	6		
Валчкі	147	32	138	20	32	30	25	
Дварышча	130	22	125	16	15	20	15	
Галінова	460	37	169	34	44	51	12	3
Краўчонкі	100	11	44	13	16	22	12	
ф. Васілево	50	4	13	3	4	8	3	
ф. Нізіна	50	3	17	3	3	9	2	
ф. Аўласы	54	5	26	6	6	11	3	
Казакі	263	52	180	36	51	83	33	3
Камароўшчына	120	26	93	7	27	66	17	
Жарабцы	145	16	100	12	32	50	15	
Пашы	105	16	61	13	22	34		
Більдзюгі (яўрэяў 15 чал.)	101	26	122	11	24	26	13	4
Астраўляны	263	32	122	20	36	47	13	
Карчы	27	5	27	3	4	6	2	
Дварышча	90	31	102	23	28	47	14	
Навінка	14	4	20	3	4	4		
Сынадворцы	х	4	17	3	4	8	3	
Янаполь	52	3	11	3	6	6	2	
Жвіранка	40	3	33	4	9	11	5	
Лінія	25	8	32	7	12	14	8	1
з. Більдзюгі	100	11	37	5	12	8		
Пестуны Сівіц.	40	2	10	1	2	4	1	
Пестуны Турон.	40	2	11	2	4	10	3	
з. Пестуны	20	1	7	1	2	3	1	
Пестуны Валяўкі	45	2	10	3	4	6	2	
Пестуны Ярм.	32	1	4	1	2	2	1	
Пестуны Камін.	20	1	6	—	1	2	1	
Падборцы	30	1	12	2	4	6	2	
Буйкі	20	1	4	1	1	1	1	
Камарова	353	5	30	4	5	10	3	
Буда-1	150	6	29	7	8	20	5	
Буда-2	250	5	28	6	7	10	6	

Занальны дзяржайны архіў у г. Маладзечна. Ф. 441. Воп. 1. Спр. 12.

Падрыхтаваў І.К.Ляскоўскі.

Актывіст Грамады

Пётр Ластаўка нарадзіўся 16 лютага 1907 г. у в. Жукі Ложныя Дзісенскага павета (цяпер Шаркаўшчынскі раён) у беднай сялянскай сям'і. Яго родны брат Іосіф Іванавіч расказваў: «Мы рана страцілі бацькоў. Брат Пётр ужо ў 7 гадоў пачаў працаваць на багацеяў. Зямлі наша сям'я мела мала. Голад быў частым госцем. Спачатку брат быў пастухом, а пасля парабкам. Я быў на два гады маладзейшы за брата, але прыпамінаецца, што ўжо ў 14—15 гадоў Пётр прымаў удзел у беларускім на-

цыянальна-вызваленчым руху. Ён распаўсюджваў нелегальныя адозвы, кніжкі, выконваў іншыя даручэнні. У пачатку 1926 г. ён уступіў у Беларускую сялянска-работніцкую грамаду і стаў актыўным яе дзеячам і арганізатарам у Дзісенскім павеце. У канцы гэтага ж года за недазволеную польскімі ўладамі дзейнасць мой брат быў арыштаваны, сядзеў у глыбоцкай павятовай турме, а калі была ліквідавана Беларуская сялянска-работніцкая грамада, яго перавезлі ў віленскую турму. Пасля аб'яўленай ім галадоўкі яго вызвалілі пад нагляд паліцыі. Потым Пётр служыў у войску. У пачатку 1930 г. мой брат вярнуўся ў Жукі Ложныя і працягваў сваю дзейнасць у беларускім нацыянальным руху. Ён часта пісаў карэспандэнцыі ў беларускія газеты аб нялёгкім жыцці сваіх вяскоўцаў, аб крыўдах і радасцях жыхароў сваёй вакольцы...» Са старонак газеты «Беларуская крыніца» (№ 23. 10 ліп. 1931) у заметцы «Пара прабудзіцца» Пётр Ластаўка (псеўданім Пётр Жучок) заклікаў жыхароў Германавіч і суседніх вёсак: «Браты! Стыд і ганьба спаць, калі народ беларускі ўсюды будзіцца ад вечнага сну. Трэба як мага хутчэй ісці наперад, трэба пашыраць свае родныя газеты, кніжкі, закладаць гурткі Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. Ведаю добра з практыкі, што на гэтым шляху сустракаюцца ўсялякія перашкоды. Розныя панкі і асаднікі, панасыланыя з Польшчы, нагаварываюць нашу моладзь у «Кулку млодзежы», у «Стшэльцы», а беларускіх працаўнікоў страшаць Лукішкамі. Але на гэта не трэба зважаць, а ісці наперад. Я веру, што іскра нацыянальнага адраджэння не пагасне... Дык заклікаю вас, браты, да працы, да працы культурна-асветнай на роднай беларускай ніве».

Паліцыя не давала спакою Пятру, часта рабіла вобыскі. Працу яму як «чырвонаму» нельга было знайсці ў межах Дзісенскага павета. І Пётр Ластаўка вымушаны быў пакінуць родную вёску. Ён паехаў у Варшаву, працягваў грамадскую дзейнасць, арганізаваў «Асветнае таварыства беларусаў у Варшаве», якое згуртоўвала ўсе слаі беларускага грамадства ў сталіцы. Самаахвярна працаваў у гэтай арганізацыі сакратаром (аж да пачатку 2-й сусветнай вайны), аддаючы ёй увесь вольны час.

Займаўся Пётр Ластаўка і літаратурнай працай: пісаў апавяданні, аповесці, артыкулы. У 1933 г. выйшаў зборнік апавяданняў для дзяцей і моладзі на польскай мове «Slomiana choinka», а ў 1934 г. аповесць «Bersenne noce».

У час 2-й сусветнай вайны ў 1941 г. Пётр Ластаўка быў вымушаны пакінуць Варшаву. Жыў на Падляшшы. Пасля вайны пасяліўся ў г. Міланувэк пад Варшавай. Прымаў актыўны ўдзел у рабоце Варшаўскага аддзела Беларускага грамадска-культурнага таварыства (БГКТ). Доўгі час ён з'яўляўся членам яго праўлення, а пазней і членам прэзідыума Галоўнага праўлення БГКТ. Калі таварыства вяло гаспадарчую дзейнасць, займаў пасаду дырэктара прамысловага прадпрыемства «Betesca» (1958—1963), працягваў публіцыстычную і літаратурную дзейнасць. Ім напісана многа цікавых артыкулаў аб беларускай літаратуры і культуры.

Памёр Пётр Ластаўка 19 верасня 1968 г. ў г. Міланувэк.

К.А.Кожан.

Важнейшыя апублікаваныя артыкулы Пятра Ластаўкі

Пара прабудзіцца (карэспандэнцыя з Германавіч)//Беларуская крыніца. 1931. 10 ліп. № 23.

Справа арганізацыі Саюза беларускіх пісьменнікаў//Шлях моладзі. 1936. № 9.

Беларуская канцэрт-вечарына ў Варшаве//Шлях моладзі. 1937. № 3.

Беларусы ў Варшаве//Шлях моладзі.1938. № 8.

Аляксандра Гурло//Шлях моладзі. 1938. № 22.

Беларускі літаратурны маладняк (на польскай мове)//Літаратурны штогоднік. 1937. 7 ліст. (Познань).

Развіццё сучаснай беларускай літаратуры ў Польшчы (на чэшскай мове)//Слованскы пжэглед (Прага). 1938. № 8 і 11.

Сучасная беларуская літаратура (на польскай мове)//Атэнэум (Варшава). 1938. № 11.

Беларускі літаратурны маладняк//Рух Словяньскі (Львоў). 1939. № 4.

Вечар беларускай літаратуры ў Варшаве//Беларускі фронт. 1939. 1 жн.

За варотамі (апавяданне)//Ніва (Беласток). 1957. 10 лют.

Беларусы ў Варшаве//Ніва. 1957. 8 сак.

Маладыя ўзрывы//Ніва. 1957. 14 ліп.

Беларускія жніўныя абрады//Ніва. 1957. 18 жн.

Міхась Забэйда-Суміцкі//Ніва. 1962. 7 студз.

Тэхніка працы вялікіх людзей//Ніва. 1967. 7 мая.

Звычайны выпадак (апавяданне)//Літаратура і мастацтва. 1958. 19 ліст.

Спіс склаў Ю.Туронак.

Янка Пачопка — паэт і аграном

На мяжы Шаркаўшчынскага і Глыбоцкага раёнаў была невялікая в. Летнікі. Месца тут маляўнічае. Каля самых хат працякала гаманлівая рачулка Лучайка. З двух бакоў вёскі падступаў густы і прыгожы лес.

Тут 8 лістапада 1890 г. нарадзіўся паэт, фальклярыст Янка Пачопка (Іван Пятровіч Пачопка, псеўданімы Башкір, Шкірба, Праваслаўны). У 1913 г. закончыў Варанецкае ніжэйшае сельскагаспадарчае вучылішча (цяпер у Пастаўскім раёне). Працаваў заатэхнікам дэпартамента земляробства Віленскай губерні. З 1914 г. па 1917 г. служыў у войску. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі працаваў аграномам пры Дзісенскім рэўкоме.

Пасля ўваходжання заходняй часткі Беларусі ў склад Польшчы Янка Пачопка працаваў у Вільні ў рэдакцыях беларускіх газет і ў Варшаве, дзе па прапанове паслоў Беларускай сялянска-работніцкай грамады (Пятра Мятлы, у прыватнасці) быў рэдактарам двухтыднёвіка «Праваслаўны беларус». Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР працаваў аграномам у Глыбоцкім раёне. У пасляваенны час жыў і працаваў у роднай в. Летнікі.

Янка Пачопка, чалавек цікавы і неардынарны, быў не толькі аграномам, але і паэтам. Першы яго верш «Дудар» надрукаваны ў газеце «Наша ніва» (1913 г. 23 мая. № 21), пазней вершы друкаваліся і ў іншых беларускіх выданнях. У 1926—1928 гг. Янка Пачопка быў супрацоўнікам гумарыстычнага часопіса «Маланка», які выдавала ў Вільні з 1926 г. Беларуская сялянска-работніцкая грамада, а з 1927 г. і да канца 1928 г. — іншыя прагрэсіўныя арганізацыі. Часопіс абараняў інтарэсы працоўных Заходняй Беларусі, падтрымліваў і прапагандаваў палітычную праграму БСРГ, крытыкаваў палітыку сацыяльнага і нацыянальнага ўціску з боку польскага ўрада, высмейваў грамадскую пасіўнасць, мяшчанства.

Частка вершаў Янкі Пачопкі, легендаў і народных казак, запісаных на Дзісеншчыне, друкавалася ў «Праваслаўным беларусе», на старонках дзіцячых часопісаў «Заранка», «Пралескі». У 1927 г. Янка Пачопка перадаў кнігавыдавецтву Клецкіна ў Вільні рукапіс «Народныя казкі і апавяданні Дзісеншчыны». Кніга была падрыхтавана да друку, але разгром Беларускай сялянска-работніцкай грамады спыніў работу. З друку выйшла толькі адна казка «Дурнішча». Творы Янкі Пачопкі змяшчаліся таксама ў заходнебеларускіх часопісах «Калоссе», «Хрысціянская думка», газеце «Сялянская ніва».

Многа сіл і ўвагі Янка Пачопка аддаваў напісанню кніг па сельскай гаспадарцы, якіх у той час на Беларусі зусім не было на беларускай мове. Першая кніжка Янкі Пачопкі па садоўніцтве была выдадзена ў Мінску ў пачатку 1920-х гадоў. «Гэта была першая беларуская кніжка па сельскай гаспадарцы не толькі ў Заходняй, але і ва Усходняй Беларусі», — пісаў Янка Пачопка 17 лютага 1967 г. у лісце да Зоські Верас. У 1923 г. у Вільні ў Беларускім выдавецкім таварыстве выйшла кніга Янкі Пачопкі «Пчолы і як вадзіць іх у рамовых вуллях», якая карысталася вялікай папулярнасцю ў сялян. Выйшлі таксама кнігі: «Малочная карова: Як яе выбраць, карміць і даглядаць», «Гародніцтва: Як трэба гаспадарыць на гародзе, каб мець добрае варыва», «Як выбраць добрага каня».

У 1930-я гады ў гасцінным доме Янкі Пачопкі ў Летніках часта бываў, а часам і кватараваў яго блізкі сябра, вядомы беларускі мастак Язэп Драздовіч. Частым госцем у Янкі Пачопкі быў і паэт Міхась Машара, які жыў у Таболах пад Шаркаўшчынай. Доўгімі асеннімі і зімовымі вечарамі сябры чыталі вершы беларускіх паэтаў, легенды, народныя казкі, гаварылі пра таямніцы Сусвету, асваенне касмічнай прасторы.

Усё жыццё Янка Пачопка быў сярод людзей, працаваў дзеля развіцця культуры, асветы. І ў сваіх дзяцей выхаваў любоў да сваёй зямлі, да беларускай мовы, культуры. Сын яго працаваў старшынёй калгаса, адна дачка — аграномам, другая — урачом.

Памёр Янка Пачопка 26 мая 1977 г.

К.А.Кожан.

Доктар Шыран з вёскі Лужкі

Доктар Усевалад Аляксандравіч Шыран з'явіўся ў Лужках летам 1932 г. Яго прыезду ў аддалены рэгіён, «польскую Сібір», як тады часам называлі Дзісеншчыну, папярэднічалі драматычныя падзеі.

Студэнт Віленскага універсітэта, буду-

чы медык не ўтойваў сваіх дэмакратычных перакананняў, беларускасці, прымаў актыўны ўдзел у рабоце беларускіх студэнцкіх арганізацый, якія знаходзіліся пад пільнай увагай дэфензівы і польскіх паліцэйскіх улад. Студэнтам Шыран быў аўтарытэтным дзякуючы несумненнай адоранасці, няўтольнай празе да медыцынскіх ведаў, ярка выражанаму імкненню набыць звышардынарныя веды ў галіне практычнага лячэння, схільнасці да навуковай дзейнасці.

Нястрымна прыцягвала маладога чалавека і барацьба за сацыяльную і нацыянальную справядлівасць, за адраджэнне нацыянальнай самасвядомасці, за ўз'яднанне беларускага народа ў рамках адзінай дзяржавы.

Народны паэт Беларусі Максім Танк успамінаў: «Пазнаёміў мяне з ім адзін з кіраўнікоў камуністычнага падполля вясной 1932 г. Ён тады збіраўся выдаваць прагрэсіўны «Часопіс для ўсіх». У гэтым часопісе, які быў адразу канфіскаваны польскай цэнзурай, былі змешчаны мае апавяданні і вершы. З таго часу сувязі з маім рэдактарам на нейкі час перарваліся...»

Матэрыялы Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы захоўваюць усе перапетыі падзей, што адбыліся тады. Пры праглядзе сігнальнага экзэмпляра «Часопіса для ўсіх» паліцэйскія ўлады арыштавалі і заключылі Шырана ў Лукішкі па падазрэнні ў шпіянажы і прыналежнасці да КПЗБ. Па іроніі лёсу турэмныя выпрабаванні маладога ўрача (да гэтага часу Усевалад Шыран атрымаў урачэбны дыплом) пачаліся 1 мая 1932 г. Марудна пацягнуліся дні, напоўненыя здзекамі турэмшчыкаў, следчых.

Рухнулі планы і надзеі маладога ўрача, не ажыццявіліся перспектывы навуковай работы ва універсітэце. У гэтыя дні асабліва адчуў ён падтрымку таварыша па вучобе і блізкага сябра Браніславы Людвікаўны Смольскай. Яна зрабіла ўсё магчымае, каб вызваліць Шырана. Паводле ўспаміў самой Браніславы Людвікаўны, «...інкрымінавалі яму выданне нелегальнай камуністычнай газеты. Гэта было на самай справе, але пракуратура не мела перакананўчых доказаў. Вядучы справу, пракурор Пятроўскі не захацеў са мной нават размаўляць, вымушана была шукаць пратэкцыі. У канцы канцоў згадзіўся вызваліць Шырана пад залог. Дапамаглі мне прафесары Сенгалевіч і Райхер». Пасля ўплаты 300 злотых (іх пазычыў прафесар Райхер) Шырана вызвалілі. Аднак толькі 30 студзеня 1933 г. віленскім следчым аддзелам справа была закрыта з-за недастатковасці доказаў.

Турэмнае зняволенне не зламала Шырана, ён выйшаў на волю, не страціўшы ні сваіх перакананняў, ні сваіх намераў. Рашылі разам са Смольскай паехаць на работу ў «глыбінку», каб стаць на ногі і адысці ад перажытага. Месцам работы в. Лужкі Шыран выбраў сам.

Пасля закупкі медыцынскага абсталявання ў крэдыт Шыран заняўся прыватнай практыкай. Яго энергія, веды, уменне весці справы хутка далі свой плён. Слава аб доктары Шыране шырока распаўсюджвалася ў Дзісенскім павеце. Вельмі хутка гэта адчулі мясцовыя польскія дактары, якія страчвалі частку сваіх пацыентаў. Пачаліся канфлікты, справа дайшла да «ўрачэбнага суда», пачасціліся сутычкі з прадстаўнікамі ўлад і мясцовага гарнізона, бо афіцэры не маглі перанесці прысутнасць у асяроддзі мясцовай інтэлігенцыі «чырвонага». Ці сапраўды ў гэты перыяд Усевалад Шыран падтрымліваў сувязі з камуністычным падполлем і нацыянальна-дэмакратычным рухам? Вернемся зноў да ўспамінаў Максіма Танка: «... у 1933 г., калі я працаваў у падполлі, зноў сустрэўся з Шыранам у Лужках. Відаць, з яго быў харошы лекар, бо слава аб ім ішла далёка па ўсіх гмінах, бо ён, як тады казалі, «лячыў ад усіх хвароб».

Гэта — адзіны ўспамін, які дазваляе меркаваць, што прыезд Шырана ў Лужкі і яго наступная медыцынская работа маглі быць якімсьці чынам звязаны з яго падпольнай дзейнасцю. Хоць ніякіх архіўных звестак аб удзеле Шырана ў дзейнасці падпольных ячэек КПЗБ, КСМЗБ няма, аднак ёсць нямала ўказанняў на такую магчымасць.

Як бы там ні было, Шырану ў Лужках доўга працаваць не давялося. Праследаванні ўлад адыгралі сваю ролю, хоць урачэбны аўтарытэт яго ў мясцовага насельніцтва быў проста ашаламляльны. Ён мог абыходзіцца практычна без спецыялістаў і выконваў складанейшыя па тым часе хірургічныя, акушэрскія, афтальмалагічныя і оталарынгалагічныя аперацыі. Яго дзівосны дар даследчыка адыграў тут, безумоўна, немалаважную ролю. Вядома так-

сама, што ён праявіў сябе выдатным пчаловодам і селекцыянерам, вырасціўшы ў «польскай Сібіры» незвычайныя гатункі кветак і кавуны. Адно толькі выклікала непрыязнасць з боку мясцовага насельніцтва: вялікі аматар палявання, Шыран іншы раз пастрэльваў буслоў, разглядаючы іх як аб'ект палявання і дзічыну. Гэта таксама выкарыстоўвалі мясцовыя паліцэйскія ўлады для ўхілення палітычна ненадзейнага ўрача.

Па ўсёй верагоднасці ў 1937 г. сям'я Шырана пакінула Лужкі і пераехала ў Высокае Літоўскае, недалёка ад Брэста. З архіўных дакументаў, што захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве Брэсцкай вобласці, можна даведацца, што Шыран падазраваўся ўладамі Брэста ў дзейнасці, накіраванай супраць урада буржуазна-памешчыцкай Польшчы. Па-ранейшаму яму не давалі доступу да афіцыйных пасад, увесь яго магутны талент паглынала прыватная практыка.

Нягледзячы на свой ад'езд з Лужкоў і інтэнсіўную ўрачэбную практыку ў Высокім Літоўскім, Шыран сістэматычна прыязджаў у Лужкі і аказваў медыцынскую дапамогу хворым, якіх лячыў ці наглядаў у папярэднія гады. У Лужках сустрэў ён дзень уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Ужо 17 верасня ён у ліку членаў гміннага камітэта савецкай улады, актыўны ўдзельнік яе будаўніцтва. У хуткім часе сям'я зноў пераязджае ў Лужкі, а жонка — Браніслава Людвікаўна — стала галоўным памочнікам перабудовы мясцовай аховы здароўя, як гаварыў сам Шыран, «на платформе савецкай улады». У кароткі час у памяшканні былога суда, а затым у былым маёнтку Гарадзец быў разгорнуты ўзорны стацыянар на 100 ложкаў, на службу якога было пастаўлена ўрачэбнае майстэрства сям'і Шыранаў і ўсё іх асабістае медыцынскае абсталяванне. Не хапала медыцынскіх кадраў, і Шыран тут жа арганізоўвае курсы медыцынскіх сясцёр. Няспынна клапаціўся аб развіцці санітарнай справы, урачэбнай дапамогі, арганізаваў сістэму барацьбы з інфекцыйнымі захворваннямі.

Вельмі хутка ўзраслі хірургічныя магчымасці Лужкоўскай бальніцы. Таленавіты доктар змог арганізаваць правядзенне ў мясцовых умовах складаных хірургічных аперацый. Ён шчодра дзяліўся сваімі ведамі з калегамі, прапаноўваў арыгінальныя метады лячэння розных захворванняў, аб чым пісаў у рэдакцыю газеты «Медыцынскі работнік». Не застаўся забытым і выведзены сорт кавуноў, які быў прапанаваны Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках.

Непрыкметна праляцеў у справах і клопатах 1940 г. Энтузіязм доктара і веру ў шчаслівае будучае беларускага народа азмрочылі арышты і вывазы мясцовай інтэлігенцыі, якія, дарэчы, закранулі і родзічаў яго жонкі. З пачуццём прыкрасці ўспрыняў канфлікт з новым загадчыкам райздрава Піскуновым, які непісьменна зрабіў спробу ўмяшацца ў арганізацыю лячэбнай справы. Давялося шукаць справядлівасці ў судзе.

22 чэрвеня 1941 г., калі ў лёсе краіны і Шырана ўсё змянілася, у гэты дзень доктар быў арыштаваны органамі НКУС. З успамінаў доктара Шыран-Смольскай вынікае, што прызначаны лужкоўскім ваенным камісарам Піскуноў сфабрыкаваў супраць яго «справу» і тут жа арыштаваў, выкарыстаўшы сваю ўладу.

Шыран загінуў на ваенных дарогах. Аб яго лёсе больш нічога невядома. Ён пражыў толькі 35 гадоў. Але жыве памяць аб цудоўным чалавеку нялёгкага лёсу, таленавітым урачы.

А.Майсяёнак.

Так і жылі мы...

З успамінаў Вікенція Антонавіча Дулінца, жыхара вёскі Радзюкі

Бацькі мае родам з в. Дуліна. Пры Польшчы закончыў 5 класаў Дуліноўскай школы. Школа была ў жылым доме: 75 вучняў вучыла адна настаўніца. Навучанне вялося на польскай мове. Вывучалі матэматыку, геаметрыю, чытанне, пісьмо, польскую гісторыю, гімнастыку, а таксама 1 раз у тыдзень былі ўрокі рэлігіі. У назначаныя дні прыязджалі святар і ксёндз. Настаўніцу вучні паважалі, дысцыпліна была добрая. Калі хто з вучняў парушаў парадак на ўроку, то настаўніца біла па далоні лінейкай, а таксама ставіла на калені. А бывала, што пад калені падсыпала гарох.

У школе была школьная бібліятэка. Настаўніца сама выдавала дзецям кнігі.

Пасля школы давялося працаваць на зямлі. Ад бацькі ў спадчыну засталося толькі 80 сотак. Але працаваў, зарабляў і купіў яшчэ зямлі. За 1 га заплаціў 500 злотых. Пасля ўжо меў 18 га зямлі. Было 6 дойных кароў, 3 кані. Сеяў лён, авёс, азімых сеяў мала. Было дорага ільнасемя, а авёс быў даражэй за жыта і пшаніцу.

Летам увесь час хадзілі босыя. Босыя аралі і касілі. Абутак вельмі бераглі. Абуваліся толькі, як прыходзілі на танцы або ў касцёл ці на кірмаш. Абутак у крамах быў вельмі дарагі. У асноўным чаравікі шылі самі жыхары. Гэта было танней, чым купляць. Падэшва ў абутку часта была з драўлянай калодкі, затым яе абшывалі скурай. Былі ў той час прыватныя магазіны, да прыкладу, у Дуліне і ў Радзюках. Гаспадаром магазіна ў Радзюках быў Іпаліт Лук'янёнак. Ён працаваў кавалём, але, калі патрэбна было каму што-небудзь купіць, ён пакідаў кузню і ішоў прадаваць тавар. Тавары даставаў у яўрэяў з Шаркаўшчыны. У гэтай краме прадаваліся газа, цукеркі, гарэлка, тканіна, крупы. Можна было па дамоўленасці расплачвацца рознымі таварамі — зернем ці чым іншым.

Не было электрычнасці, радыё. Газеты мала хто выпісваў. Яны былі на польскай мове. У вольны ад работы час, пераважна зімой, збіраліся ў кагосьці ў хаце. Наймалі музыканта. Плацілі і музыканту, і гаспадару. На гэтыя вечарыны прыходзілі і пажылыя людзі: мужчыны гулялі ў карты, жанчыны вязалі, пралі. На святы ўсе хадзілі маліцца — хто ў касцёл, хто ў царкву.

У Шаркаўшчыне было 7 паліцэйскіх на ўсю акругу. Яны хадзілі па вёсках, правяралі і патрабавалі, каб усюды была чысціня, каб соткі былі выпалатыя, а печ у хаце адрамантавана. Звярталі ўвагу на тое, каб на дузе быў званок, калі едзеш на кірмаш. На павозцы замацоўвалася дошка, дзе ўказвалася прозвішча, імя і імя па бацьку гаспадара. Той, хто не выконваў гэтыя ўказанні, на першы раз папярэджваўся, а калі зноў — яго штрафавалі.

Чырвоны сцяг на бярозе

З успамінаў Пятра Касцюкевіча, былога жыхара вёскі Шыці

Прыгадваю 1 Мая 1935 г. Здаецца, быў панядзелак. Як звычайна, прыхапіўшы сшыткі і «Чытанку» — так называлася кніга для чытання ў малодшых класах, — я пайшоў у польскую пачатковую школу. Заняткі пачыналіся ў 9 гадзін па мясцовым часе. Праўда, здараліся выпадкі, што пачатак іх пераносіўся і на больш позні час.

Настаўнік жыў у Амбросенках, што каля трох кіламетраў ад нашай вёскі, і летам прыязджаў на веласіпедзе, а ў дажджлівыя дні прыходзіў пяшком.

У тую раніцу ён спазняўся. Дзеці выбеглі за вёску, каб яго сустрэць. Аднак неўзабаве вярнуліся нейкімі сцішанымі. За нашай вёскай Шыці на прыдарожнай бярозе развяваўся чырвоны сцяг. Яго вывесіў ноччу хтосьці з мясцовых камуністаў-падпольшчыкаў. Пачыналіся веснавыя работы. Сяляне выязджалі ў поле. Людзі праходзілі каля гэтай бярозы, з радасцю глядзелі на чырвоны сцяг.

Настаўнік на веласіпедзе з'явіўся неяк адразу, быццам усплыў з-пад зямлі. Хуценька саскочыў з яго і, з нейкай заклапочанасцю, паклікаўшы двух старшакласнікаў-пераросткаў, загадаў зняць сцяг і прынесці ў школу. Вучні хуценька пабеглі за вёску і праз некалькі хвілін з'явіліся з чырвоным палотнішчам на якім было напісана «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!»

Уся вёска гаварыла пра гэта, а сяляне здзіўляліся і называлі таго, хто гэта зрабіў, вельмі смелым чалавекам.

Прайшоў час. У верасні 1939 г. усталявалася ў нас народная ўлада. Выйшлі з падполля камуністы і камсамольцы. Паўсюдна праходзілі шматлюдныя мітынгі і сходы, бурліла новае жыццё. Стала вядома, што сцяг на бярозе вывесіў камуніст-падпольшчык Аляксандр Скавырка, жыхар в. Корніца. Ён жа стаў тады першым старшынёй Куштальскага сельсавета.

У самым пачатку вайны Аляксандр Скавырка быў схоплены фашыстамі і пазверску замучаны.

Даведаўшыся аб гэтым, я вельмі моцна перажываў. Калі-нікалі хадзіў да той бярозы і разглядаў зарубку на ёй, дзе калісьці быў прыбіты чырвоны сцяг...

Дакументы сведчаць

ТЭРМІНОВАЯ ПРАПАНОВА ДЭПУТАТАЎ БЕЛАРУСКАГА КЛУБА ПА СПРАВЕ АБ ПРАСЛЕДАВАННІ БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ

14 снежня 1922 г.

В то время как 109 и 110 статьи Конституции определенно обеспечивают гражданам всех национальностей в Польском государстве полное и свободное развитие их национальных особенностей, а значит, прежде всего — введение родного языка в школьное преподавание;

в то время как 118 статья Конституции и соответственное постановление Совета Министров вводят обязательное обучение в пределах начальной школы для всех граждан Государства;

в то время как согласно 119 статьи, начальное обучение, как обязательное, должно быть бесплатным, а способным, но бедным ученикам Государство выдает стипендии на содержание в средних и высших учебных заведениях;

в то время как белорусский народ, к которому принадлежит огромное большинство населения нашего края, тысячами прошений с сотнями подписей на каждом определенно выражал и выражает свое желание иметь белорусскую школу;

лица, подписавшие это предложение, подтверждают тот факт, что власть совершенно не считается со справедливыми требованиями белорусского населения в деле просвещения, а именно:

1) не обращает никакого внимания на прошения и постановления местного населения и не открывает никаких школ;

2) уже открытые белорусские частные школы — закрывает; Гражданское Управление Восточных Земель закрыло приблизительно 200 белорусских школ, которые возникли еще до того времени, когда польская администрация приняла власть; уже после принятия Конституции и присоединения территории так называемой «Средней Литвы» к Польской республике на этой территории совершенно незаконно закрыта 101 школа, закрыты две учительские семинарии: в) Борунах и Свислочи; не подумали основать, хотя бы одну семинарию или курсы с целью подготовки учительства для белорусских школ на более чем 2 миллиона коренного белорусского населения; зато вывезли 240 белорусских учителей в Краков на польские курсы, где их держат уже целый год, как бы в смягченном только вежливым обхождением концентрационном лагере, и откуда, очевидно, их пошлют в Галицию для ополячения украинского населения;

3) сотни высоко квалифицированных учителей, которые не согласились выехать из родного края, были выброшены из школ, а их место заняло учительство, привезенное, главным образом, из Малой Польши (Галиции) с самой низкой педагогической квалификацией, незнакомое с местными условиями и встреченное коренным белорусским населением с открытой враждебностью;

4) примером школьной политики в области начального школьного образования может служить тот поразительный факт, что на весь Гродненский край, населенный главным образом белорусами, приходится только одна белорусская начальная правительственная школа;

5) вопреки общим правилам о правительственной помощи частным средним школам, произошло то, что только одна белорусская гимназия, именно Виленская, получает минимальное вспомоществование, которое составляет менее чем 1/10 ее бюджета, другие же средние белорусские школы никакой помощи не получают;

6) белорусское население уклоняется от навязанной ему силой польской школы, с ее ярко денационализаторскими стремлениями;

7) в результате препятствий для школьной работы на родном языке, увеличивается неграмотность, население дичает, подрывается вера в силу закона, который так ясно и явно нарушают органы государственной власти, растут национальные антогонизмы и враждебные чувства не только к польской администрации, но и вообще ко всему польскому.

На основании вышеуказанного вносим следующее предложение:

Высокий Сейм соблаговолит постановить: что Министр Религиозных Исповеданий и Народного Просвещения призывается безотлагательно к изданию распоряжений о том:

1) чтобы не ставили никаких препятствий открытию белорусских школ начальных и средних;

2) чтобы расходы на те начальные школы, в которых имеется 40 учеников, были приняты на государственный счет;

3) чтобы школьные инспектора давали письменные ответы по делам о разрешениях на открытие школ не позднее, чем в продолжение одной недели, считая с того дня, когда было подано прошение;

4) чтобы белорусское учительство, которое находится теперь на польских курсах в Кракове, по окончании их, было возвращено в белорусские школы;

5) чтобы немедленно были предприняты шаги с целью основания белорусской учительской семинарии;

6) чтобы средняя белорусская школа получала помощь от правительства наравне с польскими школами.

Друкуецца па кн.: Запросы белорусских послов в польский сейм, 1922—1926 гг.: Сборник документов о панских насилиях, мучениях и издевательствах над крестьянами и рабочими в Западной Белоруссии. Мн., 1927. С. 5—6.

ЗАПЫТ ДЭПУТАТАЎ БЕЛАРУСКАГА КЛУБА СПАДАРУ МІНІСТРУ ЮСТЫЦЫІ І СПАДАРУ МІНІСТРУ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ АБ НЕЗАКОННЫХ АРЫШТАХ У ДЗІСЕНСКІМ ПАВЕЦЕ І АБ ЗДЗЕКАХ ПАЛІЦЫІ НАД АРЫШТАВАНЫМІ

18 сакавіка 1924 г.

После проведения выборов в Сейм и Сенат местные представители власти в Дисненском уезде Виленской области начали в широком масштабе преследование белорусского населения и лучших сынов его за голосование по списку № 16 — кандидатов от национальных меньшинств. С этой целью местной полицией и администрацией начаты были массовые аресты белорусов под предлогом разных политических и уголовных преступлений. Не имея никаких фактических доказательств для обоснования обвинений в этих мнимых преступлениях, политическая полиция приняла систему битья, истязаний и издевательств над арестованными, принуждая их таким способом сознаваться в выдуманных преступлениях. Как доказательство выше сказанного, мы приводим ниже отрывок из письма, написанного З.Михасевичем — одним из тех лиц, над которыми производились эти истязания, мучительства и насилия.

Чтобы избавиться от свидетеля, могущего изобличить провокацию, начали дело против меня. Арестовали меня, а равным образом арестовали и неграмотных: мать, сестриного мужа, дядю и 10-летнего брата, обвиняя в государственной измене лиц, не имеющих никакого понятия в политике.

Допрашивая средневековыми способами мужа моей сестры Антона Парадша и меня, принуждали его подтвердить все обвинения, которые были вымышлены против меня, а меня заставили подписать уже ранее написанный протокол. Мучили следующим способом: ущемляли руки в дверях, а ноги связывали и били по ляшкам, снимали сапоги, были и жгли пятки, между пальцами вкладывали шестигранные карандаши и сжимали руки, зажигали бумагу и клали под мышки, били по зубам, под ложечку, били и головой о стену, после чего истязуемый лишался чувств. Так было и со мною: когда я лишался чувств, то меня обливали водою и я был в полусознательном состоянии, а они, водя моей рукою, подписывали протокол. Делали это агенты: Беляцкий, Улинский и Гофрон. Битьеми по зубам и стуканьем головою о стену занимался комендант Дисненской уездной полиции Лиходзеевский. После таких мучений держали несколько дней под арестом, не допуская к доктору и не принимая никаких жалоб. Когда раны и знаки от истязаний зажили, то сестриного мужа отпустили домой, а меня продержали под арестом еще несколько дней, а потом переслали к следователю, где меня и освободили. Агенты, будучи недовольны постановлением следователя, прикрываясь подложным прокурорским приказом, арестовали меня вторично и из мести избили меня во время этого ареста, а никуда не послали. Когда же опять (в виду отсутствия вины) я был освобожден, то разозлившиеся агенты... подстрекнули против меня полусумашедшего моего тестя Андрея Левикова и при помощи доносов, составленных теми же Монкевичем и Улинским, всякими способами старались выселить меня в Россию. Это им нужно было для того, чтобы избавиться от вредного для них свидетеля их преступлений, свидетеля подкупа чиновников в Старостве и в Правительственной Делегатуре.

Ввиду вышеизложенного обстоятельства, нижеподписавшиеся лица спрашивают Господ Министров:

1. Известно ли им о поступках, заслуживающих наказания?

2. Имеют ли они намерение произвести подробное расследование, чтобы выяснить число лиц, незаконно арестованных в Дисненскому уезде, и число лиц, над которыми совершались преступные мучительства, а равным образом выяснить и самые способы мучительства и истязания?

3. Имеют ли они намерение привлечь к судебной ответственности лиц, виновных в этих преступлениях?

Друкуецца па кн.: Запросы белорусских послов в польский сейм 1922—1926 гг.: Сборник документов о панских насилиях, мучениях и издевательствах над крестьянами и рабочими в Западной Белоруссии. Мн., 1927. С. 56—57.

ЗАПЫТ ДЭПУТАТАЎ БЕЛАРУСКАГА КЛУБА СПАДАРАМ МІНІСТРАМ ЮСТЫЦЫІ І ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ ПА СПРАВЕ АБ АРЫШТАХ У ДЗІСЕНСКІМ ПАВЕЦЕ

21 ліпеня 1924 г.

Общеизвестно, что в белорусских областях, несмотря на окончание войны, все время неспокойно. То в одном, то в другом месте слышно о бандитских нападениях с целью грабежа, об убийствах, как для грабежа, так и из личной мести, и даже об убийствах, имеющих под собою политическую почву. Общественное мнение возбуждено всем этим, благодаря чему польская ежедневная пресса весьма часто на столбцах своих газет критикует администрацию «кресов» (окраин). Администрация в белорусских областях, не умея и не имея возможности изжить это зло, начинает всю вину перекладывать на других, и вот почему после каждого нападения или какого-нибудь другого проступка, всегда находит якобы виновных и предает их суду. Казалось бы, что если после каждого нападения виновные пойманы, то нападения должны были бы уменьшаться в своем числе и дело клонилось бы к полной их ликвидации. Однако жизнь говорит совершенно другое: волнения на белорусских землях продолжаются. Сама собой является мысль, что полиция не ловит действительных бандитов, а только людей совершенно невиновных.

После убийства г. Ширана в ночь с 1 на 2 июля сего года [1924] — в Дисненском уезде государственной полицией 12—13-го июля сего года было арестовано около 30 человек крестьян, спокойно работавших в поле. Из числа арестованных до сих пор содержатся в тюрьме:

1. Яков Гридюшко, хутор Беляны Германовичской волости Дисненского уезда;
2. Сигизмунд Ходаненок, д. Новосельцы Германовичской волости;
3. Александр Ровда, д. Веретеи Лужской волости;
4. Дмитрий Ровда, местечко Германовичи;
5. Василий Римденок, д. Бруйки, Германовичской волости;
6. Адольф Котович, д. Бояры;
7. Иван Ластовский, д. Бояры;
8. Иван Кожан, д. Балбеки;
9. Виктор Римденок, д. Пашки;
10. Николай Рабизо, д. Пашки;
11. Константин Табола, д. Пашки;
12. Иван Лазуновский, д. Стрелица;
13. Матвей Федоров, д. Отоки.

При аресте вышеупомянутых лиц никаких компрометирующих материалов не нашли, и ввиду отсутствия доказательств их вины, полицейская власть приписывает арестованным работу в советских учреждениях до заключения мира. Таким образом, невинных людей оторвали от работы в поле, лишили свободы и отдали в распоряжение судебной власти, которая будет рассматривать дело в продолжение 2-х лет.

На основании вышеизложенного, лица, внесшие запрос, спрашивают у господ министров:

1. Известно ли им обо всем этом?

2. Имеют ли они намерение сейчас же рассмотреть дело арестованных в Дисненском уезде и освободить невинных из тюрьмы?

3. Имеют ли они намерение наказать полицию за лишение свободы невиновных крестьян?

Друкуецца па кн.: Запросы белорусских послов в польский сейм 1922—1926 гг.: Сборник документов о панских насилиях, мучениях и издевательствах над крестьянами и рабочими в Западной Белоруссии. Мн., 1927. С. 145—146.

ЗАПЫТ ДЭПУТАТАЎ БЕЛАРУСКАГА КЛУБА СПАДАРУ МІНІСТРУ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ АБ ПРЫМУСЕ СЯЛЯН РАМАНТАВАЦЬ МАСТЫ, ЯКІЯ НАЛЕЖАЦЬ ПАМЕШЧЫКАМ

27 лютага 1925 г.

В имении Городец и м. Лужки Дисненского уезда имеются водяные мельницы, являющиеся частною собственностью графа Зиберг-Плятера. Около этих мельниц находились мосты через речку Мнютицу, являющиеся необходимою принадлежностью мельниц, — и поэтому заботу об их исправности взял на себя владелец мельниц. Теперь же, со времени занятия белорусских областей поляками Дисненский уездный сеймик (уездное земское собрание), как состоящий исключительно из помещиков и чиновников староста (уездного управления), надзор за мостами взял на себя и всю тяжесть содержания этих мостов переложил на живущих в этой местности крестьян. Во второй половине 1924 года был начат капитальный ремонт этих мостов и к этой работе привлекли крестьян. Крестьяне должны были даром работать, бесплатно доставлять камни и прочие строительные материалы. Одних только подвод Лужковская волость дала без всякой платы более 700. Конечно, подводы эти были доставлены исключительно крестьянами. В связи с производившимся ремонтом случилось интересное происшествие. Имение продало г. Савицкому все материалы, что остались от старых мостов, а Савицкий перепродал часть их Адольфу Драбу.

Таким образом, уездный сеймик насильственно привлек крестьян к работам по сооружению частно-владельческих мостов для того, чтобы увеличить богатство графа. Хотя крепостное право уже давно уничтожено, однако уездный сеймик старается опять его возвратить, вновь заставляет крестьян работать на барина.

Поэтому лица, внесшие запрос, спрашивают Господина Министра: 1) На каком основании уездный сеймик перекладывает на крестьянство бремя содержания мостов, принадлежащих имениям?

2) Имеет ли Господин Министр намерение распорядиться о том, чтобы крестьянам уплатили за работу и за доставку строительных материалов для ремонта мостов?

Друкуецца па кн.: Запросы белорусских послов в польский сейм 1922—1926 гг.: Сборник документов о панских насилиях, мучениях и издевательствах над крестьянами и рабочими в Западной Белоруссии. Мн., 1927. С. 248.

ЗАПЫТ ДЭПУТАТАЎ БЕЛАРУСКАГА КЛУБА СПАДАРУ МІНІСТРУ ВАЕННЫХ СПРАЎ АБ САМАЎПРАЎСТВЕ УЛАНАЎ ПОЛЬСКАЙ АРМІІ, РАСКВАТАРАВАНЫХ У ВЁСЦЫ ЛАПУНОВА

24 сакавіка 1925 г.

В д. Лапунове Лужской волости Дисненского уезда расквартирован отряд польских уланов. Мало того, что эти уланы заняли крестьянские избы, а хозяев вытеснили в углы их жилищ, — они начинают тайком похищать у крестьян продукты, корм для скота и другие вещи и материалы, нужные в хозяйстве.

У Иосифа Кушнера уланы сломали в гумне замок и набрали для своих лошадей столько сена, сколько хотели. Перед рождественскими праздниками уланы самовольно взяли у И.Кушнера сало, колбасу и мясо. Крестьянин подал жалобу поручику Русецкому, который обещал уплатить за украденные продукты. Несмотря на то, что об этом деле был составлен протокол и все похищенное было оценено в 30, 50 злотых, пострадавший до последнего времени никакого вознаграждения не получил; мало того, солдаты взяли у него еще 2 балки, длиною в три сажени и шириною в 10 дюймов, и 2 курицы.

У крестьянина Игнатия Рудака уланы взяли 50 пудов соломы, 150 снопов ячменя, 20 штук лат, 3 стропила по 3 сажени длиною, 40 жердей и 3 курицы. Поручик Русецкий предлагал Рудаку за все это 20 злотых.

Кроме того, уланы на каждом шагу обижают крестьян и распоряжаются, как в оккупированном крае.

На основании вышеизложенного, лица, подписавшие запрос, спрашивают Господина Министра:

1) Имеет ли он намерение избавить жителей д. Лапунова от соседства уланов и их опеки?

2) Имеет ли он намерение распорядиться о вознаграждении за все потери и убытки, которые причинили уланы деревенским жителям?

Друкуецца па кн.: Запросы белорусских послов в польский сейм 1922—1926 гг.: Сборник документов о панских насилиях, мучениях и издевательствах над крестьянами и рабочими в Западной Белоруссии. Мн., 1927. С. 270.

ЗАПЫТ ДЭПУТАТАЎ БЕЛАРУСКАЙ СЯЛЯНСКА-РАБОТНІЦКАЙ ГРАМАДЫ І ІХ ТАВАРЫШАЎ СПАДАРУ МІНІСТРУ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ АБ НЕЗАКОННЫМ УЦЯГНЕННІ АДМІНІСТРАЦЫЙНАЙ УЛАДЫ ДЗІСЕНСКАГА ПАВЕТА Ў ПРЫВАТНУЮ СПРЭЧКУ ПАМЕШЧЫКА З СЯЛЯНАМІ З-ЗА ПАШЫ

22 чэрвеня 1926 г.

В последнее время помещиками в Западной Белоруссии взят новый курс по отношению к крестьянам. Дружно и повсеместно помещики лишают крестьян права пользоваться сервитутом на землях, которые с незапамятных времен были сервитутными.

Майский переворот не только не изменил положения вещей, но еще более обострил его, ибо помещики мало того, что поступают более нагло после 12 мая, но нашли и новые методы для борьбы с крестьянами, а именно — обращаются в случае земельного спора уже не в суд, как было принято до сих пор, а к административной власти. В результате — на место спора является полиция, приказывает крестьянам, чтобы они признали справедливость требований помещика, а в случае сопротивления угрожает арестом и т.п. Когда же крестьяне не подчиняются этим распоряжениям, то полиция избивает их, стреляет, издевается и т.д. Это беззаконие приобретает в Западной Белоруссии характер повсеместный с совершенно определенным поворотом назад — ко временам крепостного права. В сущности, закон не разрешает полиции вмешиваться в дела этого рода и передает их исключительно на рассмотрение суда, но это ни к чему не обязывает нашу полицию. Для оправдания своих незаконных действий и своих насилий у полиции всегда имеются к услугам «политические соображения». Так и в этих случаях — достаточно, чтобы крестьяне не подчинились полиции и не сделали по желанию помещика, — и сейчас же это признают «бунтом, запрещенным собранием, подготовленным покушением» и т.п. — и все насилия полиции будут иметь свое оправдание.

О таких случаях мы уже сообщали Господину Министру в форме запроса.

А вот еще аналогичный факт.

В Дисненском уезде рядом с местечком Лужки находится имение Зиберг-Плятера, которым управляет некий г. Анцен, известный член местного союза помещиков и диктатор уезда. Жители м. Лужки с незапамятных времен пользовались принадлежащим к упомянутому имению пастбищем. Чтобы доказать свою силу и власть, помещик обратился к местному начальнику уезда, который обещал помочь ему своим влиянием в уезде и издал соответственный приказ местному полицейскому посту. В этом деле приняли деятельное участие заместитель начальника уезда Щенснович и местный полицейский пост. Местные крестьяне, убедившись на практике, что право и сила — это две различные вещи, пробовали договориться с комендантом полиции в Лужках. С этой целью 1 июня с.г. они отправили к нему своих делегатов. Но полиция прогоняла крестьянский скот со спорного пастбища, а делегацию не приняла и угрожала в случае сопротивления кандалами. По этому делу крестьяне послали 2 июня телеграмму воеводе, но безрезультатно, ибо насилие продолжается.

В ночь со 2-го на 3-е июня на пастбище явились пьяные полицейские под командой Парафьяновича и разогнали ночевавших со скотом пастухов. При этом полиция избила Степана Латоновского, стреляла над головами стерегших скот детей и, наконец, арестовала упомянутого Латоновского и одного из несовершеннолетних пастухов. Свидетелями этих насилий были: Игнат Каминский, с хутора Корчи Плисской волости, а также Игнат Якубенок, Болеслав Казман и Антон Вершиловский — из Лужков.

На следующий день утром приехал на пастбище комендант полицейского поста Костшицкий. Свое присутствие он отметил тем, что избил пасшего скот Прокопа Кривку и прогнал его с пастбища, а его скот отправил в м. Лужки. Кроме того, он арестовал Ивана и Степана Мацкевичей и, продержавши их полтора дня, отправил под усиленным конвоем в м. Глубокое вместе с арестованными 5-го июня Домиником Гиреем и Игнатом Якубовским. До какой степени эти аресты были беззаконными — свидетельствует тот факт, что прокурор в Глубоком, выслушав рапорт полиции, освободил арестованных, даже не опрашивая их.

Усердие полиции и администрации дошло до того, что даже вызвали на место уланов для подавления бунта. Уланы возвратились ни с чем и даже ротмистр Домбровский, который приехал с намерением припугнуть крестьян, публично выражал возмущение такими провокационными способами действий.

Полиция не может удержаться, чтобы не создать из этого происшествия политического дела. Поэтому она и объявила собравшихся на базаре крестьян «запрещенным собранием», пригласила в местечко несколько полицейских агентов и уже начала создавать материал для политического процесса. Четверо граждан — Юлиан Плиско, Антон Парафьянович, Юлиан Юхновский и Иосиф Метелица — вызваны были 22 июня в управление уездного начальника и приговорены к двум месяцам тюрьмы за организацию собрания на базаре. Мало этого — провокация полиции дошла до того, что заключенным Антону Парафьяновичу и Иосифу Метелице обещали освободить их и дать по 150 злотых жалованья в месяц при условии, если они поступят на службу в политическую полицию и представят данные для дальнейших арестов в м. Лужках.

Нижеподписавшиеся лица спрашивают Господина Министра:

1) Знает ли он о вышеописанных случаях?

2) Намерен ли он указать административной власти всех инстанций на то обстоятельство, что все земельные споры в польской республике подлежат ведению только судебных учреждений?

3) Намерен ли он привлечь к строгой ответственности лиц, виновных в незаконном вмешательстве в споры крестьян из м. Лужков с Зиберг-Плятером?

4) Будут ли лица, виновные в насилиях над крестьянами и в провокации по поводу этого дела, привлечены к уголовной ответственности?

5) Намерен ли Господин Министр издать распоряжение и какое именно, с этой целью, чтобы все чаще и чаще повторяющиеся факты вмешательства полиции в вышестоящей администрации в споры крестьян с помещиками, а также и создания по этому поводу политических процессов в будущем не могли происходить?

Друкуецца па кн.: Запросы белорусских послов в польский сейм 1922—1926 гг.: Сборник документов о панских насилиях, мучениях и издевательствах над крестьянами и рабочими в Западной Белоруссии. Мн., 1927. С. 446—447.

Беларускае пачатковае школьніцтва пад Польшчай

Паводле афіцыйных даных польскіх школьных улад, беларускае пачатковае школьніцтва пад Польшчай выглядала так:

Беларускіх урадавых пачатковых школ з беларускай мовай навучання ў сёлетнім 1930—31 школьным годзе налічваецца 21, утраквістычных, ці г.зв. двуязычных 41.

І гэта ўсё, што беларусы маюць ад польскага ўраду ў галіне народнай прасветы.

А трэба ведаць, што беларусы ў 1926 годзе падалі больш за 20 000 дэкларацый, дамагаючыся адкрыцця 412 пачатковых беларускіх школ з беларускай мовай навучання.

Апрача гэтага, кожны год беларусы, паводле г.зв. языковага закону, засыпалі польскія школьныя інспектары сваімі дэкларацыямі з дамаганнем адчынення для беларускіх дзяцей беларускай пачатковай школы. Вынік змагання беларусаў за родную школу, якое праводзілася на працягу 4 гадоў, г.зн. ад часу стварэння школьнага закону для нацыянальных меншасцяў да часу дэкрэту Прэзыдэнта Польшчы, стабілізуючага польскае школьніцтва на нашых землях, які адначасова ўтрымлівае развіццё беларускага школьніцтва, — вельмі слабы. Беларусы на працягу гэтага часу «выпрасілі» ад польскага ўраду толькі 21 школу з беларускай мовай навучання і 41 школу польска-беларускую.

Пры гэтым не адрэчы будзе разгледзець і самую сетку гэтага беларускага школьніцтва.

Мы маем перад сабою статыстыку беларускіх школ Віленскага школьнага вокругу. Паводле гэтай статыстыкі, ці падлічэння, беларускія пачатковыя школы раскінуты па ўсёй тэрыторыі Віленскага школьнага вокругу на тэрыторыі Беларусі пад Польшчай:

Школы з беларускай мовай навучання ў паветах: Дзісенскім — 2, Вілейскім — 7, Нясвіжскім — 1, Наваградзкім — 6, Слонімскім — 3, Стаўпецкім — 2, разам 21.

Школы ўтраквістычныя, ці польска-беларускія, у паветах:

Дзісенскім — 7, Браслаўскім — 2, Вілейскім — 7, Баранавіцкім — 3, Нясвіжскім — 2, Пастаўскім — 1, Стаўпецкім — 3, Слонімскім — 2, Навагрудзкім — 7, Маладзечанскім — 6, Вільні — 1, разам — 41.

З гэтае статыстыкі мы бачым, што і польскія ўлады знайшлі беларусаў над Дзвіной, Нёманам, Шчарай і Вяллёй, дзе для іх адважыліся адчыніць некалькі школ з беларускай вывескай. Аб беларускасці ж гэтых школ арганізаванае беларускае грамадзянства амаль зусім нічога не ведае. Невядомыя беларускаму грамадзянству таксама і вучыцялі гэтых школ.

Дзеля гэтага звяртаемся да чытачоў нашых, суседуючых з гэтымі школамі, з просьбай паведаміць нас дакладна аб гэтых школах, аб іх беларускасці і аб вучыцялёх гэтых школаў.

Беларуская крыніца. 1931. 9 траўня. № 16.

Язэп Драздовіч. Шлях вечнага вандроўніка

Язэп Нарцызавіч Драздовіч, выдатны беларускі мастак, пісьменнік, этнограф і фальклярыст, нарадзіўся 14 кастрычніка 1888 г. у засценку Пунькі Дзісенскага павета Віленскай губерні ў сям'і збяднелага шляхціца. Застаўшыся пасля смерці бацькі двухгадовым сіратой, маленькі Язэп гадаваўся пад апекай маці, Юзэфы Драздовічавай, і чатырох старэйшых братоў. Драздовічы бралі ў арэнду невялікія ўчасткі зямлі. Ім даводзілася часта пераязджаць з месца на месца (Стадолішча, Станулёва, Кміты, Чаронка, Александрыя).

Маці Язэпа Драздовіча вельмі любіла беларускую народную творчасць, ведала на памяць многа беларускіх казак, легендаў, незлічоную колькасць прыказак. Менавіта яна выхавала ў дзецях нацыянальную свядомасць.

Увосень 1906 г., пасля заканчэння гімназіі ў Дзісне, Язэп Драздовіч паступіў у Віленскую рысавальную школу, якую закончыў у 1910 г. У гэтыя гады ён працаваў у мастацкай майстэрні Яблоноўскага, маляваў шыльды, афармляў розныя выстаўкі, супрацоўнічаў у гумарыстычным часопісе «Вільнянка», у выдавецтве «Нашай нівы», прымаў удзел у выданні першага «Беларускага календара на 1910 год». Паэзія Канстанцыі Буйло натхніла Язэпа Драздовіча на пошукі вобраза маляўнічай курганнай кветкі. Першая кніжка маладой паэтэсы выйшла ў афармленні Язэпа Драздовіча.

Мастак частак бываў на сходках і вечарынках студэнцкай беларускай моладзі, а таксама сярод артыстаў тэатра Ігната Буйніцкага і хору Рыгора Шырмы, на мастацкіх выстаўках, у рэдакцыях беларускіх газет. Гэту сувязь з віленскай інтэлігенцыяй Язэп Драздовіч ніколі не парываў.

Увосень 1910 г. Язэпа Драздовіча прызвалі ў армію, залічылі ў 188-ы пяхотны полк і накіравалі ў Саратаў, у фельчарскую школу пры аб'яднаным шпіталі 47-й пяхотнай дывізіі, дзе ён вучыўся два гады. З 1912 г. служыў ваенным фельчарам.

У 1917—1919 гг. Язэп Драздовіч жыў каля мястэчка Германавічы — яго сям'я арандавала зямлю ў фальварку Лявонаўка. У гэты час Язэп Драздовіч кіраваў арганізаваным ім у Германавічах вялікім кааператывам «Беларус». У 1919 г. ён арганізаваў у Германавічах культурна-асветнае таварыства «Заранка», якое адкрыла ў Германавічах школу, аматарскі тэатр, бібліятэку.

У 1919—1920 гг. Язэп Драздовіч працаваў у Мінску як мастак і настаўнік у беларускай гімназіі і жаночай прагімназіі, ілюстратарам у літаратурных выдавецтвах, дэкаратарам у Таварыстве беларускага мастацтва. У час летніх канікулаў Язэп Драздовіч даследаваў рэчышча ракі Нямігі, рабіў археалагічныя раскопкі ў Заслаўі і яго ваколіцах.

У 1921—1922 гг. Язэп Драздовіч працаваў настаўнікам на Дзісеншчыне. У в. Сталіца мастак арганізаваў у 1921 г. школу з навучаннем на беларускай мове, але праіснавала яна не болей як тры месяцы.

З 1923 г. Язэп Драздовіч жыў у Вільні. У гэтым жа годзе выйшла ў свет яго аповесць з жыцця маладых мастакоў «Вар'ят без вар'яцтва, або Вялікая шышка», пазней аповесць «На Гапонавым млыне».

З 1924 г. па 1926 г. Язэп Драздовіч працаваў настаўнікам у Глыбоцкай павятовай школе, кіраваў самадзейнасцю школьнікаў. А ў канікулы апрацоўваў слоўнікавы матэрыял у трох мовах (беларускай, рускай і лацінскай) для Акадэміі навук БССР. У

гэты час ён інтэнсіўна працаваў і як графік, займаўся вывучэннем этнаграфіі Пінскага Палесся. У 1926 г., атрымаўшы крыху грошай ад беларускага навуковага таварыства ў Вільні, Язэп Драздовіч паехаў у экспедыцыю на Піншчыну, дзе стварыў серыю малюнкаў сялян, запісваў народную лексіку, песні. Беларускі музей у Вільні атрымліваў ад мастака многа альбомаў.

Язэп Драздовіч на адным месцы не затрымліваўся на доўгі час. Ён адпраўляўся ў экспедыцыі па Беларусі, рабіў археалагічныя раскопкі. Летам 1927 г. абышоў ваколіцы Любчы, Шчорсаў, Міра і зрабіў з натуры замалёўкі помнікаў старажытнай архітэктуры, якія ўвайшлі ў альбомы: «Глыбокае», «Мір», «Навагрудак», «Крэва», «Гальшанскае гарадзішча».

У 1930-я гады Язэп Драздовіч праводзіў археалагічныя раскопкі ў Навагрудку, а матэрыялы іх адсылаў у Віленскі беларускі музей.

Актыўны ўдзел прымаў Язэп Драздовіч у стварэнні аматарскіх беларускіх тэатраў пры Віленскай беларускай гімназіі і ў Беластоку. У гэты час ён сабраў багаты этнаграфічны матэрыял, які выкарыстаў пры складанні беларускага этнаграфічнага слоўніка. Адначасова ён працаваў над гістарычна-бытавой аповесцю-легендай «Гарадольская пушча».

Цесную сувязь устанавіў Язэп Драздовіч з Інстытутам беларускай культуры. Ён пасылаў у Мінск свае альбомы з замалёўкамі беларускай архітэктуры, картатэку да напісанага ім «Беларускага этнаграфічнага слоўніка», багатую калекцыю малюнкаў з жыцця беларускай вёскі.

Язэп Драздовіч збіраў, вывучаў і запісваў народныя песні, прымаўкі, прыказкі. У бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі захоўваюцца рукапісныя зборнікі Я.Драздовіча «Народныя прыказкі Дзісеншчыны», «Народныя песні, сабраныя на Піншчыне, Дзісеншчыне і іншых мясцовасцях». Вывучаў мастак у сваім краі гарадзішчы, замкі (каля Сталіцы, Паловіцы, Гарадца, Язна, Псуі і інш.). Апісанне іх знаходзіцца ў рукапісным зборніку «Дзісенская дагістарычная старына».

З 1930 г. ён жыў у Вільні без пастаяннай працы. Тут адна даўняя мара непадзельна завалодала ім. Язэп Драздовіч узяўся за вывучэнне астранамічнай літаратуры. Чытаў вельмі многа. Чым больш ён вывучаў навуковую літаратуру, тым мацней рабілася яго мара аб пранікненні чалавека ў Сусвет. Кожны дзень ён з радасцю чакаў сноў, у якіх пераносіўся на далёкія планеты, блукаў па нейкіх дзіўных краінах з загадкавымі збудаваннямі, нябачанымі раслінамі і жывёламі. Раніцай Язэп Драздовіч запісваў усё ўбачанае ў сне. Так паступова была напісана фантастычная аповесць «Жыццё на Месяцы».

Я.Н.Драздовіч.

Вясной і летам 1931 г. Язэп Драздовіч напісаў шэраг карцін на касмічныя тэмы: «Падкружнікавы краявід на планеце Сатурн», «Астранамічная абсерваторыя на брылявіку», «Касмаполіс», «Сатурнянка» і іншыя.

У канцы 1931 г. мастак выдаў на ўласныя сродкі ў Вільні брашуру «Нябесныя бегі», у якой на падставе скрупулёзных падлікаў імкнуўся высветліць пытанні, звязаныя з вярчэннем Зямлі. Асобна ён спыніўся на абручах Сатурна, якога лічыў самай цікавай планетай Сусвету.

Зімой 1931—1932 гг. напісаў працу «Гармонія планет сонечнай сістэмы». Рукапіс адаслаў у Акадэмію навук БССР. Гэту працу Язэп Драздовіч лічыў найбольшым здабыткам усяго свайго жыцця.

У 1930—1933 гг. Язэп Драздовіч стварыў тры аповесці аб жыцці на Месяцы, Марсе і Сатурне, аб палётах на гэтыя планеты. Жывучы ў Летніках у свайго сябра, агранома і паэта Янкі Пачопкі, Язэп Драздовіч напісаў карціны на касмічныя тэмы: «Луніды», «Жыццё на Марсе», «Жыццё на Сатурне», «Трывеж», «Агентонія», «Артаполіс» і іншыя.

У сярэдзіне 1930-х гадоў на роднай Дзісеншчыне Драздовіч працаваў як вандроўны мастак, зарабляючы на кавалак

хлеба. Польскія ўлады не маглі дараваць яму беларускасці.

На Дзісеншчыне, «паміж Мнютай і Аутай», нарадзіліся многія графічныя і жывапісныя творы Язэпа Драздовіча. Доўгі час мастак жыў у сям'і свайго брата на Антаполлі. Сустракаўся ён са сваімі сябрамі-аднадумцамі паэтамі Янкам Пачопкам з Летнікаў, Міхасём Машарам, які жыў у Таболах. Міхась Машара спрабаваў высмеяць лунанне Язэпа Драздовіча ў бязмежжы Сусвету, бачыў у гэтым марнатраўства таленту мастака. А Янка Пачопка, наадварот, глядзеў на захапленне Драздовіча космасам з вялікай надзеяй. У 1935 г. у Летніках, на кватэры Янкі Пачопкі, Язэп Драздовіч напісаў касмічныя палотны: «Піянеры Зямлі на Месяцы», «Каналы Марса».

Многія ў тыя гады лічылі Язэпа Драздовіча дзіваком і летуценнікам. Высокага, у саламяным капелюшы, з мастацкімі прыладамі, яго бачылі на кірмашах у Лужках ці Германавічах, на фэстах у Шкунціках, Задарожжы ці Чарневічах. Па просьбах вясковых жыхароў Драздовіч пісаў разнастайныя маляўнічыя ўзорыстыя дываны-насценнікі.

У аўтабіяграфіі Язэп Драздовіч пісаў: «Жыву з мастацка-дэкаратыўнай працы ў знаёмых сялян па запросінах на даму ў якасці госця за малазначную аплату, абы фарбы аплаціліся і голаму не хадзіць. А для радні, сваякоў і даўнейшых знаёмых, бацькі якіх зналі маіх бацькоў, — нават і зусім бясплатна, за адны ўгосціны». Гэты перыяд жыцця мастака найбольш цесна звязаны з Шаркаўшчынай. Пяшком абышоў ён тут шматлікія вёскі і хутары, спыняючыся на пэўны час у каго-небудзь з мясцовых жыхароў, каб па іх заказу зрабіць роспіс у хаце, знакамітыя сёння дываны-маляванкі. Жыў з гэтай працы.

Жнівень і верасень 1935 г. Язэп Драздовіч правёў пад Шаркаўшчынай, пабываў у Пілацкім бары, каля Новага Пагоста. Пасля вандровак пад Новы і Стары Пагост мастак адправіўся ў Германавічы. Напісаў некалькі пейзажаў: «Ноч над возерам», «Зіма», «Германаўская роўнядзь», «Зіма ў вёсцы». У Германавічах затрымаўся надоўга. Адправіўся ў Летнікі. Схадзіў да брата ў Юркава, забраў фарбы, а па дарозе назад, пераходзячы ўброд раку Лучайку, застудзіў ногі. Пару тыдняў не знаходзіў месца ад болю. Першы раз моцна задумаўся над тым, што без здароўя, без уласнага кутка можна зусім загінуць.

Паправіўшыся, у канцы верасня 1935 г. мастак пайшоў працаваць у бок Красоўшчыны. Ішоў праз Германавічы. Тут якраз быў кірмаш. Лён урадзіў, і сяляне хацелі яго прадаць. Купцы скуплялі яго за бесцань. Мастак з жалем думаў, што сяляне не ўмеюць гартавацца ў кааператывы, каб разам бараніцца ад беднасці, ад розных перакупшчыкаў, ліхвяроў.

Аб сваім вандроўным жыцці Драздовіч пісаў у адным са сваіх вершаў (1936):

Я з вечна вандроўных,
бяздомных людзей,
што ўласнага куту не маюць,
што не маюць сям'і,
ні жон, ні дзяцей,
сіратліва сябе адчуваюць.
Адчуваюць сябе сіратой,
ні каня, ні машыны не знаюць,
па дарогах брыдуць пехатой,
з хатулём на плячах кавіняюць.

Па сваім настроі з гэтым вершам пераклікаецца другі:

Я па свету хаджу
Ды чужыя куты украшаю.
Я і свой бы куток разукрасіў,
Ды, на жаль, свайго куту не маю.

І хоць сябра-мастак Пётра Сергіевіч зваў Драздовіча ў Вільню, ён прадаўжаў жыццё мастака-вандроўніка.

Васіль Уладзіміравіч Рабіза, жыхар в. Шкунцікі, добра ведаў Язэпа Драздовіча і мог падоўгу слухаць касмічныя фантазіі мастака. «Мы лічылі яго пералётнай птушкай, — успамінае Васіль Уладзіміравіч. — На адным месцы доўга жыць не мог. Прыйдзе, пагасціць, пабывае з намі на вечарынках, раскажа аб сваіх задумах, творах, а потым зноў у вандроўку па роднай Беларусі. Перад вайной моладзь нашай акругі любіла збірацца на хутары ў Янцэвічаў. Гэта было вельмі прыгожае месца за невялікім ляском амаль каля самага вусця Мнюты, насупраць Жукоў Ложных. Гэты маляўнічы куток быў у баку ад вока паліцыі. Тут праходзілі беларускія вечарыны, на якіх моладзь чытала вершы любімых беларускіх паэтаў, спявала забароненыя песні. Няраз прыходзіў сюды і Язэп Драздовіч. Любіў ён гэтыя мясціны над

Мнютай. У мяне захаваўся здымак моладзі над Мнютай і разам з намі Язэп Драздовіч, які нешта цікавае нам расказваў і адначасова любаваўся цудоўным краявідам».

У аднастайным жыцці найбольш запаміналіся святы. Найлепей святкавалася Язэпу Драздовічу ў Летніках, у хаце Янкі Пачопкі. Новы 1936 г. сустракалі разам з паэтам Міхасём Машарам. Чыталі старыя рукапісы Янкі Пачопкі, пісаныя ў часы Грамады ў Вільні. Але святы хутка праходзілі. Ішлі будзённыя дні. Даводзілася часта перабірацца з адной вёскі ў іншую. Папкі, Баяршчына, Ліпаўскія, Гуркаўскія хутары — дзе толькі не прыходзілася пабываць. Аднойчы працаваў Язэп Драздовіч пад Шаркаўшчынай. «Прыгожыя мясціны ды без вады», — уздыхаў мастак па рэчцы свайго маленства Мнюце, якую ласкава называе Мнюціцай. Тутэйшую ручку Янку і блізка не мог параўнаць з крыштальнымі водамі Мнюты.

Аднойчы Язэпу Драздовічу прыйшлося праехаць на лодцы па Дзісёнцы ад Навапалля да Таболаў, дзе жыў Міхась Машара. Падарожжа зрабілі з Мар'янам Янцэвічам. «А ўсё ж такі наша Дзісёнка — адна з найпрыгажэйшых рэк Беларусі, — робіць вывад мастак. — Якія пекныя строма-высокія берагі. Так і здаецца, плывучы ёю, што ты плывеш... ракою нейкай невядомай горнай краіны, дзе берагі ракі месцамі, што высокія сцены муроў».

У в. Ляскова ў пачатку лета 1936 г. было створана адно з самых радасных палотнаў Язэпа Драздовіча — «Ляскова». Лета 1936 г. было гарачым. Ад самай вясны не выпадала дажджу. Зямля высахла, патрэскалася. Гарэлі, дымелі імхі. На папарах ні травінкі. Павысыхалі сажалкі і ручаі, гароды пуставалі. На яблынях завязь абсыпалася. Ільняное насенне спяклося ў раллі. Адно жыта сіратліва калыхалася на загонах. На яго і было крыху надзеі. «Ці прырода ў гневе на нас, ці сонца занадта наш край улюбіла? Сухата, пекота небывалая. Як быццам у нейкай афрыканскай пустыні», — пісаў Язэп Драздовіч 23 чэрвеня 1936 г. у дзённіку.

З Ляскова Язэп Драздовіч перабраўся ў Сталіцу, а потым у Германавічы, дзе наведаў магілу маці. Шкадаваў, што не можа выкупіць у Путраніцы пліту на матчыну магілу.

14 кастрычніка 1938 г. мастак сустрэў сваё 50-годдзе ў маленькай хатцы на Пушчавіках, недалёка ад Лужкоў, у сям'і пляменніка Уладзіслава.

Беларускія газеты і часопісы ў Польшчы адзначылі 50-годдзе Язэпа Драздовіча. У часопісе «Калоссе» быў надрукаваны артыкул Пётры Сергіевіча, у якім ён падводзіў вынікі 25-гадовай працы мастака.

У 1939 г., пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР, Язэп Драздовіч вучыўся на настаўніцкіх курсах і ўжо ў 1940 г. працаваў настаўнікам малявання і батанікі ў Глыбокім і Лужках. Ён арганізоўваў экскурсіі для вучняў па родным краі, займаўся археалагічнымі раскопкамі. Частка яго знаходак трапіла ў Полацкі краязнаўчы музей.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны Язэпа Драздовіча не пакідала вера ў недалёкі час, калі чалавек ступіць на бліжэйшыя ад Зямлі планеты. У яго была патайная дум-

Дарога на Германавічы. 1917 г. Малюнак Я. Драздовіча.

ка: там на Месяцы, іншых планетах ён убачыць тыя краявіды, якія падказала яму жывая фантазія і якія намаляваў на сваіх карцінах. У 1947 г. Язэп Драздовіч напісаў акварэль «З жыцця на Месяцы», што ўяўляе сабой дзіўны краявід з высокімі кратэрамі, пальмавым лесам і шарам Зямлі на гарызонце.

У 1948—1950 гг. Язэп Драздовіч напісаў манаграфію «Тэорыя рухаў у касмалагічным значэнні» (у пытаннях і адказах). Гэта плён яго чвэрцьвекавых роздумаў над гармоніяй руху планет. У 1948—1952 гг. ім напісаны шматлікія артыкулы на касмічныя тэмы: «Экліптыка», «Як утварылася наша сонечная сістэма», «Аб тэлескапічным і мікраскапічным Сусвеце», «Эфір і безэфір'е», «Чым можа служыць абсалютная пустата ў сусветным руху для нябеснай механікі», «Паходжанне самаверцячыхся планет» і іншыя.

Язэп Драздовіч не дажыў да пачатку касмічнай эры. Мучыла застарэлая язва, набытая ў вечных вандроўках. Цяжка захварэў на вочы. Гэта перашкаджала яму займацца жывапісам і чытаць кнігі.

Памёр Язэп Драздовіч у 1954 г. Пахаваны ў Ліплянах, недалёка ад засценка Пункі, дзе нарадзіўся.

«Маленькі беларускі Леанарда да Вінчы. Усё мог, за што ні браўся», — сказаў аб Драздовічу Пётра Сергіевіч.

Творы Язэпа Драздовіча з'яўляюцца гімнам роднаму краю і яго культуры.

17 мая 1979 г. у Палацы мастацтваў у Мінску адкрылася першая выстаўка твораў Язэпа Драздовіча. Гэта было вялікае дасягненне мастакоў-энтузіястаў, у першую чаргу Аляксея Марачкіна, Яўгена Куліка, Віктара Маркаўца. Яны занава адкрылі, адрадзілі з забыцця творчасць вялікага мастака беларускай зямлі. У 2002 г. пабачыў свет мастацкі альбом «Язэп Драздовіч».

К.А.Кожан.

З лістоў Язэпу Драздовічу

15.1.1922 г.

Беларускае Выдавецкае Таварыства
Вільня, Віленская, д. 33, кв. 1.
Паважаны Пане!

У адказ на Вашае пісьмо за 4.1.1922 г. у справе друку Вашае тэрміналёгіі па анатоміі і фізіялёгіі Таварыства гэтым просіць Вас прыслаць яму рукапіс, спадзеючыся, што будзе мець магчымасьць у недалёкім часе надрукаваць яе. Спадзяёмся такжа, што здалеем прынамсі ў нейкай меры, згодна з устаноўленымі Таварыствам нармальнымі стаўкамі, аплаціць Вашу працу.

З павагай Старшыня таварыства
Антон Луцкевіч.

Бібліятэка імя Я.Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ф. 2. Воп. 1. Спр. 44. Л. 3.

27.1.1923 г.

Даражэнькі сябра!

Маю можнасьць пусьціць у друк адну якую-небудзь з Вашых кніжак. Пастарайцеся прыслаць мне Вашы творы і напісаць, якія з іх насамперш Вы хацелі б выдрукаваць.

Да Вашых кніжак я хацеў бы, каб Вы далі Вашы рысункі. Чакаю скорага адказу і твораў.

Ваш Будзько.

Бібліятэка імя Я.Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ф. 2. Воп. 1. Спр. 44. Л. 4.

15.8.1923 г.

Паважаны грамадзянін Драздовіч!

Усе лісты, якія будуць прыходзіць на адрас Сакратарыяту, для сакратарыяту альбо для Беларускага Пасольскага Клюбу, давайце на прагляд і на рашэньне гр. Тарашкевіча.

Ці заказаў Вам гр. Тарашкевіч партрэты Купалы і Коласа? Ён меўся гэта зрабіць.

У хуткім часе прадбачацца перамены кватэрныя на Віленскай, 12-б. Даведаецеся аб гэтым ад Радзевіча і Тарашкевіча. Прышыкуйце адпаведныя надпісы і рабіце ўсё, як скажа Вам Тарашкевіч.

Прывядзіце ў парадак цемнаваты пакой, дзе начуеце. Там, пасьля рэформаў кватэрных, мае быць адміністрацыя газеты «Наш Сьцяг». Займіцеся ў вольны час рысаваньнем ілюстрацый да казак Сержпутоўскага, якія выбірае для друку Палута. Я мысьлю, яна ўжо прасіла Вас аб гэтым.

Што да карэкты «Вялікай шышкі», дык станоўча прапанаваў бы я Вам ня ўмешавацца ў работу Касьцевіча, каб не зьмяніць і не папутаць у самым друку Вашага твору тэй адналітнасьці арфаграфіі, якую ўсюды моцна праводзіць М.К.: паглядзіце, як акуратна цяпер газэта з

боку карэкты, — міла чытаць. Надта раіў бы Вам пакласьціся на знаньне мовы Касьцевічам; пры гэтым і самая кніжка шыбчэй пабачыць сьвет. На ўсякі выпадак падаю мой цяперашні адрэс: Poczta Radoszkowicze ziemi Wilenskiej. Wies Maksimowka.

З пашанай.

Бібліятэка імя Я.Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ф. 2. Воп. 1. Спр. 44. Л. 6.

Язэп!

Пасылаю табе на дарогу 10 000 000 марак, каб ты прыехаў у Вільню, ёсьць магчымасьці табе прыстроіцца. Прыязджай абавязкова. Калі варункі не спадабаюцца, дык дарогу назад вазьмём на наш кошт. Прыязджай. Болей табе скажаць Лабуцька. Усяго лепшага. Чакаем.

Янка Пачопка.

Бібліятэка імя Я.Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ф. 2. Воп. 1. Спр. 44. Л. 7.

14.11.1938 г.

Дарагі калега Язэп!

Прымі ад мяне прывітаньне калежанскае ў 50-я ўгодкі твайго жыцця і маю сэрдэчнаю зычлівасць табе. Шкада, што не магу асабіста пажаць тваю працавітую руку і пабяседаваць за чаркай супольна ў юбіленым годзе тваім.

Дзякуй, што ты мяне адведаў, будучы ў Вільні, але мая віна, што не пашукаў цябе на заўтра на кірмашы, так пагана маральна чуўся, яшчэ і цяпер не саўсім маюся добра.

Дарагі Язэпка, ты на мяне і гневаўся нечага, пісаў да мяне ліст з жалем неякім, братка, не варта, каб мы здорылі, многа тут гэтага жыцьця. А галоўна мы калегі, працуючы ў аднэй галіне, і так нас мала, павінны супольна трымацца. Якая шкада, што мы ня можам жыць тут, у Вільні, усё ж трэба мастаку сякая-такая мастацкая атмасфера. Мне здаецца, што ты там, на вёсцы, яе не маеш, толькі мусіш з сябе даваць, праўда, багатаю, крыніцу народнага творства і тэматыку маеш, з каторай можыш бэзпасрэдна чэрпаць. А я, братка, па-старому не кідаю пэндзля з рук. Летам здараецца праца па касьцёлах, у восень і зіму працую над партрэтам і кампазіцыяй, стараюся цяпер больш заканчываць рэч не шкіцова падхадзіць. Не задаваляіць мяне цяпер рэч не закончаная, на палавіне дарогі пакіненая. Цяпер што не намалюю, усё не задаволены, а гэта, братка, па Рыме як пабачыў клясыкаў — во дзе працавітасьць людзкая ў малярстве, ах, Язэпка, каб ты пабачыў, найбольш захоплены ў Фларэнцыі галерэяй Уфіцы, можна, ведаеш, кінуць саўсем маляваць, пабачыўшы тыя рэчы, але чалавек яшчэ капціць свет, думае што яшчэ на свой манер адкрыць Амэрыку.

Учора быў у мяне вечар паэтыцкі, Танк чытаў свае творы, дыскутавалі, пілі водку і гарбату і танцавалі, было чалавек 17, было шмат новых дзяўчат-студэнтак, быў Яхімовіч і Глякоўскі, шкода, што цябе не было, было б каму паваражыць, дзяўчаты да мяне лезуць, я пробую на ладонь махліваць, у што, разумеецца, і сам ня веру.

Язэпка, калі будзеш мець час і ахвоту, напішы мне аб сабе, пра сваё жыццё-быцё, буду вельмі рад.

Ведаеш, падабаўся мне твой твор паэтыцкі пра старыну, чытаў яго ў Глякоўскага.

Тым часам бывай здароў.

Твой Пецька (Пётра Сергіевіч).

Бібліятэка імя Я.Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ф. 2. Воп. 1. Спр. 60. Л. 1.

ТАКІМ ЁН БЫЎ

З успамінаў Ірэны Качан, жыхаркі в. Наваполле

Успаміны пра дзядзьку Язэпа — гэта перш за ўсё ўспаміны пра маё ўласнае дзяцінства. Мой дзед Янцэвіч Іван, звалі яго яшчэ Яськам або Янкам, меў дом на пагорку, якраз насупраць таго месца, дзе Мнюта заканчвала свой бег і ўлівалася ў Дзісну. Тут часта бываў дзядзька Язэп.

У дзеда было восем сыноў, а апошняй, самай малодшай, была Амілечка, мая цётка. У дваццаць чацвёртым годзе раптоўна памерла бабка, маці яе. Дзевяцёра засталіся, лічыце, сіротамі. Тады Амілечцы было недзе гадоў сем. Падрасла, вучылася добра. Закончыла школу і была гаспадыняй.

Драздовіч яе вельмі паважаў, і яна яго гэтак сама вельмі жалела. Ён як прыйдзе, дык яна яму і бялізну памые, і накорміць, і яму яшчэ з сабой дасць на дарогу чаго-небудзь. Дык ён у сваіх кніжках часта ўспамінаў пра яе.

Драздовіч нарысаваў яе і надпісаў: «Амілечка». Нарысаваў сіротку ў васіль-

ковым вяночку... Ой, аж плакаць хачу, як успомню. Стаіць яна ў васільковым вяночку, а за ракой на бугарку могілкі і крыж вялікі. Насупраць дома дзеда за ракой стаяла в. Жукі, і могілкі там былі. Сіроцкую долю нарысаваў — цяжкі крыж. І сапраўды, жыццё ў цёткі Амілечкі было цяжкім. Апынулася яна ў Канадзе, працавала там у кафэ, посуд мыла. На пенсію выйшла. Амаль поўнасцю страціла зрок.

У доме дзеда быў такі альбом, у ім партрэты ўсіх васьмі сыноў нарысаваны. І былі саматканыя дываны, на якіх Драздовіч нарысаваў усякія віды. Вот зіма. Месяц свеціць. Дрэвы заінеўшыя. Маляваў і замкі старынныя над азёрамі. Дужа прыгожыя былі.

Я добра памятаю шафу старой работы, можа, маёй бабулі была, стаяла ў хаце. На дзверцах яе з унутранай стараны наклеена была карціна — партрэт беларускага паэта Міхася Машары. Ён з маёй мамай хадзіў у школу разам і потым адведваў. Яго Драздовіч і нарысаваў...

Адзін раз прыйшоў, сонца ўжо заходзіла. Кароў з поля прыгналі. Вось мама падаіла, а карова лягла, закінула хвост на спіну і ляжыць. А ён кажыць: «Ну, Юзэфка, здымай бялізну з вяровак, бо ўначы дождж пойдзе». А маці кажа: «Ай, Драздовіч, што вы, гэткая пагода» — «Я табе кажу» — «Дык адкуль жа вы ведаеце?» — «А вось будзеш жыць, дык ведай: лягла карова, хвост паклала на спіну — знай, што дождж».

Ну, і праўда. Якраз недзе з паўночы пачаўся дождж, і назаўтра дзень дажджлівы быў. Дык мы ўсе тады, малыя, як увідзілі, што карова лягла і хвост на спіну, крычалі: «Драздовіч казаў, што дождж будзе».

Усялякіх прыкмет такіх ён ведаў многа, усё жыццёвае ў яго было. У нашай сям'і было тры сястры і брат. Прыйдзе Драздовіч да нас, пакуль бацькі ўпраўляюцца па гаспадарцы, ён з намі гаворку вядзе. На мяне гаворыць: «Вось ты цяпер ладнейшая за ўсіх, а пад старасць будзеш ад усіх некрасівая, але характар у цябе добры і павагу будзеш мець». А брату гаварыў: «У цябе чало высокае, лоб у цябе высокі, і будзеш ты камбінат, камбінацыя ў цябе ў жыцці будзе, ты пойдзеш далёка...» І праўда, брат вучыўся на доктара і цяпер працуе доктарам у санаторыі ў Польшчы.

Дзеці любілі яго. Як стаў ён часцей прыходзіць да нас, мы, збачыўшы яго, беглі яму насустрач, а потым ідзем, за яго палатняны сурдут учапіўшыся, хто за рукаў, хто за палу.

...Вось такім ён быў. Прыходзіў, жартаваў, беларускія вершыкі расказваў, казкі, розныя пацешкі.

Вучыў нас песні спяваць, а іншы раз і падзадорваў: «Ай, галаскі ў вас не надта, вы ж ля кустоў жывяце, над рэчкай, каб, як салаўі, спявалі...» А мы смяемся тады.

Вядома, бацькі нас адмалку да работы прывучалі. Мне восем-дзевяць гадоў было, а я ўжо на прутках рукавіцы вязала і свэтары з рознымі ўзорамі. І дзядзька Язэп любіў паўтараць: каб пасля кожнага дня якая-небудзь польза была чалавеку, каб не пралежаў, не прасядзеў, каб чым-небудзь займаўся.

Ён і сам працаваў. Калі канчаліся фарбы, ён нешта пісаў. Па гаспадарцы ён і хацеў бы дапамагчы, але меў слабае здароўе, жалудак мучыў яго. Толькі калі сена памагчы павярнуць у пракосах.

Любіў ён з моладдзю бываць. Тады яе многа было і ў нашай вёсцы, і ў навакольных. Вечарынкі спраўлялі. Месца такое — Гліняная гара называлася. Прыязджалі

Вёска Германавічы. 1923 г. Малюнак Я.Драздовіча.

музыканты з Вендзялова, на ўсю акругу славіліся. Усё вакол грыміць. Ну, і татавы браты ігралі, хто на скрыпцы, хто на мандаліне, і кларнет у іх быў, а ў нас дома цымбалы былі. Мой старэйшы брат з дзяцінства ўмеў на іх іграць, таксама туды хадзіў. Такія звучныя цымбалы былі. І я таксама на іх навучылася потым іграць.

На гэтых вечарынках і Драздовіч паяўляўся. Весяліў моладзь, расказваў, вучыў, як красіва сябе паводзіць.

Сярод моладзі ў дзядзькі Язэпа многа сяброў было. Мой дзядзька Мар'ян, Франц Касевіч, Валодзя Прыстаўка. Іх і арыштоўвалі за тое, што беларускія песні спявалі ці святы наладжвалі.

З дзедам асаблівая дружба была. Дзед быў граматны чалавек. Недзе ў сястры яго пашпарт і іншыя дакументы, дык там запісана, што валодае трыма мовамі: расейскай, польскай і нямецкай. Ён і мяне ад пяці гадоў навучыў чытаць і пісаць.

Дзед у маладым веку застаўся ўдаўцом, а такі гаваркі быў, любіў пагаварыць. І вось ідзеш да дзеда, а яны сядзяць з Драздовічам пад хатай, аб нечым бясконца гавораць. Вакол красіва было, бэзам абсаджана, акацыямі, каштанамі і ляшчынай, ліп было многа. А цераз дарогу лясок быў. Шэсць гектараў. Лес ухожаны, ані сукоў там, як парк. Прыгожыя мясціны былі, і вось застаўся толькі адзін дуб, адна памяць засталася ад маёй дзедаўшчыны. Ну, як ужо разагналі сям'ю дзеда, запісалі ў кулакі, дык усё выкарчавалі, і сад, і дрэвы павысякалі, на ферме спалілі, цяпер і зааралі, дзе і фундамент стаяў. Адзін гэты дуб стаіць на памяць — і ўсё...

Друкуецца па кн.: Дзвіна. Віцебшчына літаратурная. Альманах. Выпуск 3. Віцебск, 2000. С. 177—180.

ЯЗЭП ДРАЗДОВІЧ (ДА 50-ГОДДЗЯ НАРОДЗІН МАСТАКА)

Сёлета мінула 50 год ад народзін беларускага мастака Язэпа Драздовіча. Адзначаючы гэты юбілей, падамо тут кароткія весткі з жыцця і дзейнасці на народнай ніве гэтага прадстаўніка нашага старэйшага пакаленьня...

...У 1926—1927 гадах, знаходзячыся то ў Вільні, то ў Радашковічах, Язэп Драздовіч закладае пры мясцовых беларускіх гімназіях мастацкія майстроўні і арганізуе тры мастацкія выстаўкі: у Радашковічах, у Вільні і ў Навагрудку. Ад 1927 да 1930 года працуе настаўнікам у Наваградзкай Беларускай Гімназіі і зьбірае памятнікі беларускай старасветчыны; у гэтым часе выязджае ў Трокі, Меднікі, Крэва, Гальшаны, Ліду і выконвае там з натуры рысункі замчышчаў (Гедыміна, Кейстута); таксама ў гэтым часе ўтрымлівае культурную сувязь і карэспандэнцыйны кантакт з прафесарам Браніславам Эпімах-Шыпілам і Беларускай Акадэміяй Навук у Менску (у Менск высылае матэрыялы — слоўнікавыя, з дзераўлянае архітэктуры, народнай вопраткі і г.д.).

Ад 1930 года Драздовіч праз некалькі год астаецца безработным, ад 1935 года працуе ў Дзісьненшчыне, як вандроўны народны мастак, зарабляючы сабе на кусок хлеба.

Язэп Драздовіч, апроч мастацкай і педагагічнай, працаваў і на літаратурнай ніве. Замілаваны ў беларускай старасветчыне, добры патрыёт, шчыры і ахвярны працаўнік, на ніве адраджэння роднай культуры. Заўсёды дасціпны і ў гумары, чалавек з добрымі асабістымі якасцямі, скончыў наш мастак 50 год свайго працавітага жыцця. Радасна вітаем яго з гэтымі ўгодкамі. Многія леты!

Я.Ш.

Калосьсе. 1938. № 3(16). С. 183—185.

Падрыхтаваў К.А.Кожан.

З ДЗЁННІКАВЫХ ЗАПІСАЎ ЯЗЭПА ДРАЗДОВІЧА

1933 г.

СТУДЗЕНЬ

1

З Новым годам!

Прыйдзі, Новы Годзе, і не крыўдзі мяне нэндзай-бядою, так як папярэднія — старыя...

Прынясі мне добрыя памысныя варункі жыцця дзеля працы маёй на карысць людзём праз навуку, праз прыгожае слова і прыгожыя творы мастацтва!

Праз увесь дзень сяджу дома. Сам зварыў сабе есці — падабедаў і пішу... Пішу — заканчваю свае лунныя падарожжы — «На Арыаполь».

3

Распачаў пісаць новае апавяданне з жыцця на Месяцы: «У лабірынтах Чорнай Лопаўкі»...

А працы на хлеб — ніадкуль нідзе не чуваць, сам не ведаю, як жыць, што далей будзець. А крэдытаў ніадкуль нідзе ніякіх.

Закончыў план луннага горада Трывежа.

4

«У лабірынтах Чорнай Лопаўкі» дапісаў аж да сям'і пяшчорных лунідаў.

Грошы пазастаецца ўсяго як схадзіць у сталоўку на два абеды, прыходзіцца перайсці на хлеб з вадою.

5

Пагода хмарная, акно нізкае, у хаце цёмна і цесна. Думаў узяцца за малявідлы, ды немагчыма. Дзень каротак, ды і той нельга выкарыстаць.

Схадзіў у «Базыльяны» да сталяроў, прынёс ад іх сабе кошык адпілкаў на дровы, на якіх зварыў сабе рандэлак бульбянога супа з васьмушкай кілбасы. І паабедаў смачней рэстарана — танней.

Сягодня бачыў ужо вандруючых па гораду прыгожа ўмаскіраваных «круляў». Да «Лабірынту Чорнай Лопаўкі» за ўвесь вечар дапісаў толькі дзве старонкі. Ах, праўда, шмат часу аддаў на тэкст тлумачэння да плану «Лунны горад Трывеж і ягоныя аколіцы».

6

Святочны дзень прайшоў сідзя дома. Няма куды і да каго схадзіць. Знаёмых маю каля тысячы, паспявай толькі раскланівацца ды вітацца, а пагасціць няма дзе, няма ў каго... А хіба ж я такі адзін?..

«Лабірынт» дапісаў аж да Арэны.

7

Дзень прайшоў дамасідна. Знайшлося мо куды схадзіць, пакалядаваць, — ды няма ў чым. Касцюм незавідзен, а галоўнае — гэта боты... цякуць...

«У лабірынтах Чорнай Лопаўкі» — дапісана аж да гары-кратэру «Сыгнал» і падкратэрнага вылеву — ракі.

Зварыўшы сабе абед-вячэру, пакапаўся крыху ў Ластоўскага «Бібліі» (кнігі кніг беларускіх)[1], — пекная кніга, але... Добра было і калісь, — але ня ўсім...

13. Пятніца.

Закончыў і здаў свайму суседу Валазьку, як аматару, у пераплёт сваю лунную вандроўку па лабірынтах чорных скал кратэравастага горнага цырку... Раблю гэта не дзеля забавы і тшчэслаўя, а дзеля навукі. Хто гэтаму не верыць, хай праверыць праз тэлескопы, і я пэвен, што бальшыну таго, што мной апісана, убачаць, як на далоні...

17

Сягодня атрымаў ад Дыр[эктара] Музея Беларускага навук[овага] Т[аварыства] за апошнюю, другую, рату за праданы для музею мой альбом «Мір» за сорак злотых, і ўсё... А далей немаведама адкуль і што дзе зарабіць. Паэканомлюся з гэтымі дваццацю залатоўкамі да канца месяца, авось работа знойдзецца.

Купіў сабе булку хлеба, паўкілі сыпучага цукру, махоркі пачку і топленага шмальцу, ды для малярства і пісання тагосяго на пара залатовак.

САКАВІК

5

Учора з вечара я атрымаў запросіны паехаць у Беласток на працу...

6

Рэчы спакаваны — еду...

КРАСАВІК

14

Закончыў працу над дэкараваннем сцэны Т.Б.Ш. і памог устанавіць яе на сцэне ў заарандаванай на 16/IV зале на Ружанскай.

16

Адбыўся пры маіх дэкарацыях спектакль-вечарына. На сцэне ставілася п'еса Крапіўніцкага «Пашыліся ў дурні». Сайгралі як найлепей. Сама сцэна з маімі дэкарацыямі мела выгляд надта прыстойны, ды на вялікі жаль цаніцеляў на ўсё гэта не хапала. Публікі было шмат. Моладзь уборная, франтаватая, але эстэтычна слаба развітая. Танцы...

22

Распачаў і яшчэ адно велічэзнае пано — тыльнік «Пушча» на казеінавым грунце... Аж цэлае кілё свежага харошага сыру тварожнага пусціў на розбараксаваны клей — аж шкода чаму б мне самому яго не з'есці — замест бы на палотны ды на абрус, у талеркі...

23

Прастуда і недаедкі... Халоднае і да крайнасці сырое (з мокрымі сутарэннымі мураванымі сценамі) памяшчанне, а побач з гэтым посніца і недаедкі зусім падарвалі мне маё здароўе... Ой, хоць бы хутчэй цяпло ды заробленыя грошы на дарогу, каб выехаць адгэтуль...

ЧЭРВЕНЬ

12

Голад...

[1]Ластоўскі В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. Коўна, 1926.

Праз увесь дзень дасадаваў, што няма чаго курыць, ды і кончыліся прадукты харчоў, але на вечар напаткаў знаёмага чалавека, які ўгасціў мяне, з запасам, тытунём. Адзін з сяброў Т-ва прынёс мне ўнеспадзеўкі паўбулкі хлеба з чвэрцяй кілі кілбасы, а на заўтрае запрасіў мяне к сабе на абед. Дай бог яму здароўя.

13

Хадзіў да аднаго з фотаграфаў, якому было патрэбна дэкаратыўнае пано — «Мора», за якое я быў умовіўшыся 12 зл. Думаў ужо прыступіць да працы, але, як на ліха, той, які мне гэтую працу нараіў і для якога я раней, як для сябра Т.Б.Ш., аж тры дэкарацыі намаляваў за ўгосціны — бясплатна (Б-віч), аказаўся тут супольнікам — усю мне справу папсуў, узноў жадаючы задарма... Хоць я і галодны, але плюнуў... Даволі з маёй бяды гэтых вызыскаў...

14 і 15

Закончыў два алоўкавых, з натуры, партрэты — п.п. Лізы і Гені (д[очкі] каменачоса на Выгодзе) — Геню ў профіль, а Лізу ў анфас, апошняй партрэт выйшаў вельмі прыгожым — прыгажэйшым за самую натуру.

Узноў сяджу, як той у мора чакаючы пагоды, і сам не ведаю, чаго дачакаю. Замаджуліла мяне ў гэтым Беластоку, застраў, як у тым бучы рыба...

18

Заняўся са свежай ахвоты (у каменачоса) скульптурай. Вылепіў з гліны для цэментовых нагроб[ных] памятнікаў прыгожанькую галоўку вясёленькага анёлка.

22

Ужо цэлы тыдзень часу як працую — скульптурую (раблю мадэлі анёлкаў на памятнікі ды адліваю фармоўкі) для аднаго каменачоса задарма, толькі за сталаванне, а ўсё праз тое, што не маю ад Т.Б.Ш. на ад'езд...

ВЕРАСЕНЬ

2

Вось я і нібыта ў родным куце, у Антаполлі, дзе родны старшы брат Канстанты з пляменнікамі — сынамі нябожчыка Гераніма, падстаршага брата, трымаець участак зямлі на запашку. Бяда, не маючы свайго ўласнага кута. А тым болей на старасці лет і з падупаўшым здароўем. Яму ўжо каля 70 лет і моцна церпіць праз удушша — кашаль ды кашаль.

Адзін з пляменнікаў, старшы, Уладзюк — у войску, аж у Познані, а сярэдні, Стасюк, і малалетні, Янка, дома. Стасюк арэць і косіць, Янук на пасту ганяець, а Ядвіся пахвароўваець на нагу. Хата са старой вараўні з дзівосна невялічкімі вокнамі, у ёй цесна і цёмна. Сярод хаты стаіць напаўзбітая старая машына-ваўначоска, набытая з год таму братам, вымененая на каня і старую самадзельную арфу — веялку. Кліентаў з часаннем воўны надта мала, бо канкурэнцыя, кругом па некаторых вёсках маюць свае ваўначоскі і канкуруюць.

14

Цэлы дзень прайшоў на грабіве і складанні віламі ў капешкі за некалькі дзён скошанага аўса каля ляснічоўкі.

Як гэта добра ідзець на здароўе ўмеркаваная фізічная праца. Ох, як смачна есці і як прыемна аддыхаецца пасля яе.



Засценак Пункі. 1924 г. Малюнак Я.Драздовіча.

15

Сягодня мы з братам былі сведкамі, косячы авёс каля лесу, як нагла завірылася, змяніўся ля лесу вецер, што веяў з поўдня, ды паўночным халодным, і раптам імглістыя хмары, што плылі з поўдня на поўнач, з імглістым дажджом, вярнуліся і шпарка панесліся к поўдню... А праз нейкую гадзіну — холад і золь.

17

Адведаў аднаго з нашых суседзяў па Антаполлю, для сям'і якога калісь, гады 3 таму, маляваў партрэты і разьбаваў...

Велікалепнага выгляду партрэты ў пекна выразьбаваных рамах, за тры гады нявіджання, паказаліся мне нашмат прыгажэйшымі, як у часы малявання...

Чужым раблю за бясцэнак, проста за пражыццё на час працы, а сваім так і не парабіў, нават свайго ўласнага партрэта не маю... Жаль... Не маю часу...

18

Схадзіў пехатою ў Залессе...

Прыгожая мяйсцовасць — гэтае Залессе. Колькі мастацкай красы ў гэтых азёрах, што расцягнуліся ланцугом — адно за адным — серабрыстымі плямамі між узгоркаў. А вунь і бор, увесь у старадаўнейшых магілках-валатоўках, а па-за ім, над узбярэжжам апошняга возера на шапкавастай гары, ніўе распаханага з-за няпамятных часоў, калісь абведзенага кругом тэрасамі пад'езду і агароджанага частаколамі ды замётамі мейсца старадаўнейшага гарадзішча.

На атрыманыя грошы дапаручыў брату Кастусю набыць ад брата Стафана з Падоркі хоць пяць пудоў новай пшаніцы на прыварак для хаты...

19

Схадзіў у лес пашукаць грыбоў, а замест грыбоў прывалок дамоў цэлае бярэма з лесу з рознага дрэва нарэзаных кіёў.

20

Цэлы дзень прасядзеў над абалваніваннем кіявых рукаятак у рознавыглядныя галоўкі людзей і звяркоў, ад няма чаго рабіць.

Не маю ані палатна, ані фарб, ані адпаведнага мейсца для працы — каб маляваць. Дык мушу хоць гэтаю дробязгліваю разьбою заняцца.

22. Пятніца

Сягодняшні дзень прайшоў на працу з братам Кастусём і пляменнікам Стасюком на ўтаптаванне глінянай падлогі (конямі і тумбай) у новай хаце, дабудаванай да той варыўні, дзе мы жывём — на Мішкавым хутары каля Антапольскага лесу. Стасюк вазіў калёсамі з поля гліну. Кастусь паганяў кругом сябе парку сівак, якія, дабрадушна і ахвотна пафыркваючы, патопавалі сабе, ходзячы ўкругавую. А я з рыдлёўкаю ў руках раскідваў, разраўнікаў гліну — дзе не маглі даходзіць коні — прытрамбоўваючы яе калодкай.

23. Субота

Праз увесь дзень, з прычыны добрай, яснай, сланечнай пагоды з цёплым южным вецярком, ад самага рання аж да позняга вечара работаў на полі пад лесам і збіраў ярыну — авёс скошаны. Я з віламі, брат з граблямі, а пляменнік з канём у рэдалох — зграблі і звязлі. А ці будзець хоць якая карысць з гэтага аўса — невядома. Надта ж мізэрны, ды і той напоўз'едзены бяссовесным Десніковым канём, «Мікітай».

Няўдзячная праца земляроба, а тым болей запашніка...

24. Нядзеля

Чатыры лісты напісаў: адно закрытае ў Познань пляменніку Владзюку (у войску) і 3 адкрыткі — адну Улад[ыславу] Паўлюкоўскаму (барада), дзе пазаставіў свае мастацкія і пісьменніцкія рэчы, другую адвакату С., а трэцюю мастаку Сергіевічу. У самога нуда, скука, поўная адарванасць ад свету.

Хацелася б нешта распачаць, ды матэрыяльных сродкаў не хапаець на гэта...

27—28

Сядзеў дома, аддаючыся разьбе з дрэва. Чатыры кіі з рознага дзерава (ясеня, застырніку і сухадрэўкі) з разьбаванымі галоўкамі адрабіў і адпаліраваў. А між іншым і 5-ты, тоўсты з ракіціны для брата, з курнасаватаю дзявочаю галоўкай.

29

Бараніў ад вільгаці з грунту старую і новую хату, у якую яшчэ не перайшлі, абводзячы іх каля завалень, па падстрэшшу глыбокімі равамі...

Штосьці не зусім здаровіцца. Па вечарах ніяк не магу заснуць. Хата са старой варыўні. У хаце сырасць. Земляная падлога знізу, з грунту, падмакаець. У паветры, знаць, вугальнай кіслі перамножылася, ад якой тут, сплючы, акунець можна, аж у вушах шуміць.

30. Субота

Сягодня я змушан работаць і пісаць не праваю, а леваю рукой, бо правая ранена —

дзяржу на тальмаку. Пайшоў з раніцы ў лес насеч сабе дзеля разьбы кіёў на ляскі. Толькі што распачаў работу, пачаў высякаць тапаром з ляшчынавага куста кій, і здарылася няшчасце... Зваліўся нож, удзёўбся чаранкамі стоць у зямлю, а я, не заўважыўшы гэтага, махнуў тапаром і разсадзіў далонь на тырчэўшы нож. Кроў брызнула, а ў сярэдзіне стала горача-горача і млосна. Я сарваў з куста некалькі ляшчынавых лісцінак і, заціснуўшы імі рану, падазваў да сябе з непадалёку незнаёмага мне мальчыка, які тут наразаў сабе ляшчынікавае пруццё. Мальчык перавязаў мне па зменену лісцю рану шнурочкам.

КАСТРЫЧНІК

7. Субота

На астатку дажджы з ветрам з поўначы як быццам уняліся, нарабіўшы тут нам нямала шкоды і на полі, бо не далі бульбу выбіраць, і дома, бо праз недабудаваны плотнікамі шчыт, убок поўначы залілo нам у новай хаце і столь, і гліняную падлогу, на якую мы з братам так шмат працы паклалі, і цэлых два тыдні патраціліна прасушку. Хоць яна хата і чужая, але ўсё ж ткі на зіму кватэра.

Брат Канстанты паехаў на млын у Плісу, павёз мяшок купленай мною пшаніцы на муку, на прыварак. Рука мая раненая патрошку папраўляецца, хоць разьбаваць ею яшчэ і не ў сілах, але затое ўжо нават і пісаць не магу, ды папраўляць старыя даўнейшыя мае незакончаныя рысункі.

Сягодня ўдава-братавіха, жонка нябожчыка брата — Гаручыха, вядомая яшчэ з-за жыцця свайго мужа сваёю прыдзірлівай сварлівасцю, вечным «княганнем» і нараканнем у тым, у чым сама вінавата — на другіх, скандал мне ўстроіла. Але, ведама, баба. Баб'ё — гэта такія істоты, якія добрымі, чырствымі, разумнымі і цярплівымі на свой язык толькі ў дзявочыя леты бываюць. Нездарма і пасловіца кажыць: «З добрай нявесткі — благая свякроў». З добрых дзевак ды ніякія бабы.

8. Нядзеля

Іду ў Летнікі да Янкі Пачопкі. Ён чалавек хатні... Пайду к яму пагукаць, пачытаць, падзяліцца. Нудна... Хай дзённік мой дома застаецца...

13. Пятніца

Прабыўшы ў Летніках каля 4 дзён (з прычыны дажджоў), вяртаючыся дадому, ідучы ўдоўж каля рэчкі Лучайкі, цэлы ахапак хмелю назбіраў, прынёс брату на лякарства. А сегодня праз увесь дзень правазіўся з тапаром, пілой ды гэблямі — хачу зрабіць сабе масіўны, моцны стол на калодзе для разьбы.

Стол зроблен. Хваляць, што прыгожы. Харошы для разьбы, бо крэпак, але для пісання замалы. Няма як на ім локці размясціць. Але пішу на ім, бо старэнькі стол аднаножны прыгожай братняй Болюсявай работы, на якім напісана мной «Вялікая шышка», на назе не трымаецца.

14. Субота

Сягодня дзень Пакрова, па ст[арому] ст[ылю] 1 акцябра Дзень майго ўраджэння (у з[асценку] Пунька, на пушчы Цытавізна, 1/10 ст[арога] ст[ылю] — 1888 г.). Рад быў бы памянуць гэты дзень, ды не маю з чым. І ці прыйдзецца мне калі хоць бы раз ды адзначыць па-людску — як дзень нараджэння, як дзень асабістага свята майго?.. Беднасць... Дастаткі не пазваляюць...

1934 г.

ЛЮТЫ

З рысункаў за люты месяц — анічога не зрабіў, з малюнкаў — таксама, як і ў папярэднія месяцы. Не маю кватэры на гэта адпаведнай... Пыл, чад, куры, цесната... Толькі з разьбы — з пару крушынавых кіёў з паненкамі, убранымі па старасвецкай модзе, да з грушавага дзерава (не заканчываючы) у футаральчык для свайго дзённіка (у «лунным» стылю), пару табакерак, сценку для календара з Месяцам і падпёрнік для пісьменнага прыбору «Чорны кароль» — з чорнага дуба — і ўсё.

Па заканчэнні дэкаратыўна-малярскай працы на сценных дыванах у Тупічыне, пазастаўляю свае маляўніцкія прылады на засценку Сіпаліна, а сам з прычыны набліжаючых Каляд (у пятніцу, 21/XII) валю скрозь пушчу нацянькі ў Юркава да брата і пляменніка — на свята. У брата ваўначоска, а пляменнікі занімаюцца дзеля зімовага часу: днём у лесе дровы сякуць, а вечарамі вайлакі на ногі людзям валюць — па заказу.

Надвор'е ўжо болей тыдня марознае, галалёдзіца. Слізка, бясснежна — не кутым канём ані на дарогу. Кавалям заработак.

Апошняя праца мая (па людзях) у гэтым (1934) годзе — рознаквяцісты на чорным фоне, з месячнаю ноччу на асяродку, вялікі сценны дыван для панны Мальві-

ны ў Сіпаліне, які закончыў у вечар перад Новыя Годам.

Лета і восень старога года патраціў на вандроўкі ад вёскі да вёскі, ад хаты да хаты — малюючы, дзеля ратавання сябе ад безрабоцця, для вясковых дзяўчатак і кабет сценныя дываны, а ў прамяжутках часу, калі не меў заказаў, то туды, то сюды да малалікай радні ды знаёмых.

Што дасць Новы мне год — не згадаю...

Адзежа знашываецца, бялізны ўбываець, а набыць новую — няма за што, безрабоце. А калі і была калі дзе якая работа па дэкаратыўнаму малярству, як дываны, якіх я ў мінулым годзе намаляваў каля трыццаць штук, па тры і па чатыры злотых за штуку (гледзячы па велічыні), то ўсё гэта пайшло на ліхвярскай цаны махорачнае курэнне і самі маляўніцкія матэрыялы. Адно толькі тое, што ў часы працы харчы і кватэра нічога не каштавалі, дзе раблю, там і харчуюся. А кончыўшы працу, калі няма тут жа зараз новай, ідзі куды хочаш — хочаш «дамоў», якога не маеш, хочаш на госці за вёрст дваццаць ці трыццаць, калі ёсць куды і да каго, калі здароўе на пераходы пазваляець. А ці пазваляець, ці не пазваляець — усё роўна мусіш, бо няма дзе хварэць ані выпачыць — бяздом'е...

Уся мая надзея на закуп Беларускім у Вільні музеем маіх рэзьбаў, якія я яму адвёз мінулаю вясной, і на выйгрыш суда з Навагрудзкай гімназіяй — за кручаныя ёю мне грошы за працу. Але й тут няпэўнасць. Музей жмецца, што грошы не мае. А гімназія (ці праўдзівей ейны дырэктар, цераз якога я цярплю безрабоцце), якая заапеліравала напоўвыграную мной завочна ў Навагрудзкім гарадскім судзе справу, сама зліквідавалася. На апеляцыі я ўзноў справы выйграў, ды падыскаць выйгранае няма з каго. Едыны позыск з rzadu...

Але пакуль сонца ўзыдзе — раса вочы выесць.

Хацелася б папрацаваць і дзеля навук ды чыстага мастацтва, ды няма чым забяспечыць час на гэта.

А вось і падрахунак усяго таго, што я мог зрабіць у працягу апошняга лета: паўкапы сценных дываноў, дэкаруючы імі вясковыя ды засцянковыя хаты, навокал Лужок і Улінскай пушчы. Каля дзесятка алоўкавых партрэтаў і партрэцікаў з натуры, для людзей. І калі паўсотні мадэлізаваных лекцыяў з астраноміі для няведаючых, што такое неба, звёзды, Сонца і Месяц, а асабліва фазы Месяца — вольнымі ад працы вечарамі. Паставіш, бывала, запаленую лямпу на стол, паставіш аднаго, а то і некалькі са слухачоў сярод хаты, возьмеш у руку што-небудзь з круглага (маларослы жоўценькі круглы гарбуз, клубок белых нітак, а то проста яйцо), абнясеш яго справа налева, як кажуць, «пад сонца», кругом пастаўленых сярод хаты слухача ці слухачоў — вось табе тут «паўната», «ветах», «маладзік» і «зацьменне» — і ў пару мінут лекцыя гатова, як найзразумелей.

1935 год

М[еся]ц январ правёў у трох мяйсцовасцях. Пачатак у Юркаве пры брату і пляменніках, адкуль, з прычыны няважнага (цёмнага, сырога і цеснага) у старэнькай хатцы памяшкання, перабіраюся дзеля працы, разам з рэчамі ў в[ёску] Летнікі да Янкі («Башкіра») П[ачоп]кі. Пляменнік Стась адвозіць. Тут я (у працягу аднаго тыдня) падгатаўліваю экранчыкі для сваіх абразоў і на адным з іх малюю (простымі дэкаратыўнымі фарбамі) пейзаж з прыроды суседняга найбліжэйшага ад нас завоблачнага міра пад назваю «Argentonia» ды ўжыў нявыпрабаванага бела-празрыстага алею ў фарбы, так што праз некалькі тыдняў, вярнуўшыся з працы на отдых (з Верацей), — знайшоў яе зусім нясохнучай і мусіў паўторна папрацаваць, перакрываючы ільняным алеем.

Канец января і першую, большую, палавіну лютага правёў на пахатняй працы ў в[ёсцы] Верацеях, малюючы для тамтэйшых дзяўчат дываны, гонячы пад агульны фіранкавы стыль, з пейзажамі на асяродку. Для Веркі — чырвоныя фіранкі з месячнай ноччу. Для Марылі — зялёныя фіранкі з зімоваю вуліцай вёскі. Для Соні і Любы — таксама зялёныя, толькі для першай з раніцай над возерам, а для другой — з зімоваю дарогаю, з абіневацелымі бярозамі Лужыцкага тракту. На астатку для А.Т. — сінія фіранкі з Віленскай замкаваю гарой на асяродку. Зрабіў невялічкі дыванчык і для А.Роўды, які з прыяцельскіх пачуццяў зацягнуў мяне сюды ў Верацеі на заробак. На астатку надакучыла мне гэтая работа — з дня ў дзень тарчэць стоймя каля распятых на сцяну насцілак, даводзячы сябе гэтак аж да адран-

твення карку ад задзірання галавы ды прыглядання, а тым больш перанёсшы ў часе працы чатырохдзённую боль галавы ад нейкай эпідэмічнай інфлюэнцыі — «перабіранкі», як яе тут называюць. Кінуўрынуў і пайшоў у Летнікі на колькідзённы выпачынак. А страўнікавае расстройства, якое нажыў ад бесперарыўнай працы на нагах, а разам з гэтым і сэрцавыя ненармальнасці — не пакідаюць...

У Летніках распачаў адзін экранчык, ды не закончыў, зрабіўшы толькі адну падмалёўку, з панарамай будучага «Артаполіса».

Па вечарах, змрокі, як кажуць, «шэраю гадзінай», калі неяк анічога рабіць, раблю з найменшаю дачушкай гаспадара, Зойкай, невялічкія шпацыроўкі па праталінах на ўзбярэжжах перапоўненай верхаводдзем тутэйшай рачулкі Лучайкі, любуючыся бегам і шумам ейнай вады. Вясной павяваець.

Рад быў бы і яшчэ аддыхаць, ды некалі... Клічуць узноў на работу — гэта добра, што яна ёсць. Але блага, што я на ёй вельмі мала зарабляю. Нават па паўзлота на дзень, калі адлічыць на фарбы і табаку, не выходзіць. Узноў мне прыйдзецца ў старым, лапленым хадзіць, бо не будзець з чаго апрануцца.

І ці пабагацею я калі-небудзь? Хоць бы адзецца па-людску...

* * *

...Трэба шанаваць здароўе. Бо як для мяне матэрыяльна незабяспечанага, вандроўнага, бяздомнага, пражываючага з рук працы сваёй ды і то толькі дарыўча, не даючай ані якой магчымасці заэканоміць на час безрабоцця — здароўе і бодрасць духа гэта самы найбольшы дастатак. Захварэць — гэта значыць адкінуць усялякую працу і злегчы ў пасцель, но дзе? у чыю? і на якія сродкі...

Панядзелак. 28 верасня.

Іду працаваць праз Германовічы ў бок Красоўшчыны па Пазадзісенне.

У Германовічах, як заўсёды ў панядзелак, — кірмаш. З'язджаюцца людзі на рынак і чуць не ў кожнага з іх на вазе — вязкі свежага лёну на продаж. У людзей безграшоўе. А сёлета лён урадзіў аж занадта. Лёнам рынкі завалюць, а безграшоўя свайго не папоўняць, бо жыды за лён плоцяць «э!» — што ласка. І дзівуюся я, чаму гэта нашыя сяляне не згуртуюцца ў льняную гуртоўню — сваю, уласную, а то ў розніцу, хто па сабе — без пары, за бясцэнак.

У Германовічах, мімаходам, каб не пазастацца на зіму без цёплай адзежы, набраў сабе паўсукна на штаны і, між іншым, новы світэр жаночы, у якім перашыю гузікі і перараблю яго гэтым на мужчынскі.

Нядзеля, 12 кастрычніка.

Пагода з працягу апошняга тыдня надзвычай добрая, цёпла і сонечна. Людзі заканчываюць збірацца з ярынай, парадкаваюць лён-семя і прынімаюцца за гародніну — бульбу выбіраюць. А ў цветніках каля хат, якіх даўней трудна было дзе ў вёсках спаткаць, хібо толькі на фальварках ды засценках, ды і то калі былі там паненкі, нягледзячы на ўжо познюю восенскую пару — красуюцца, цвіцяць прыгожыя кветкі астры, юргіні, наперсцянкі, а побач з імі найпазнейшыя кветкі-мароз. Па вечарах яшчэ чуцен запах мацейкі.

Прыгожая і добрая восень, калі добра, памысна жывецца, асабліва пры добрым здароўі. Сягодня я чуюся добра, ламата, несцярпімая рэзь і сутаргі ног, якія мучалі мяне ў працягу перадапошняга тыдня — успакоіліся, толькі дзякуючы сухому і цёпламу, спанню, прыніманню ў нутро Kal. Bromati, а павярхоўна абстрыкаванню балючых ног бесцэрамонна крапівой-жыгучкай. Прызнаю, што крапіва-жыгучка пры прастудных болях у цягніках — самае найлепшае, самае пэўнае адусегаючае срэдства. Як абстрыкаеш балючыя ногі жыгучкай, ды так, каб уся скура на іх занялася ваўдыркамі, дык і нязнесная, бяручая аж за сэрца боль прыціхнець, у параўненні з якой — абжога ад жыгучкі — толькі прыемная шчокаць.

Прошлы тыдзень правёў на хутарах у Строліцы (каля Белага Двору, пад Красоўшчыну), маляваў у дзяўчатак, дзе праспаўшы некалькі начэй у зімным неатопленым пакоіку, нанава прастыў і шмат дзён пасля гэтага прамучыўся ўзноў нагамі.

Цяпер узноў я завярбован у Ложныя Жукі праз дзяўчат, малюю ім упадабаныя імі чырвона-фіранкавыя дываны. Днём малюю ў Жуках, а начаваць хаджу на печ у Навапопле.

Да сёлетняга году зусім мала хто з нашых вяскоўцаў ведаў аб існаванні дзесь у цёплым краі ад нас на поўдзень аж у Афрыцы — краіне чорных хрысціян,

Абісініі, як і калісь аб бурах, аб Кітаі ды да 1904 г. аб Японіі. Але... Але неакілзаная нагласць аднаго чалавека — дыктатара, бязлітаснага да жыцця і здароўя яму падуладных, дасягла свайго... І пайшла разьня за здабычу чужога... «Абісінцы баронящца... Абісінскі негус (цар) вайны не хацеў... Абісінцы вайны не хацелі... Абісінцы яшчэ дадуць сабе раду, адаб'юцца...» — пачалі талкаваць на далёкай ад гарачай Афрыкі, паўночнай са снежнымі зімамі краіне Беларусі жыхары нашых вёсак. Вайна Абісінію зрабіла вядомай... І хто б аб ёй ведаў, каб не вайна.

«Калі не жаль табе чужых абісінцаў, то пажалеў бы ты сваіх італьянцаў!» Вайна, неўмалот!.. Італію голад чакаець!.. А калекі, калекі, калекі!!!

Калі ў гэтай вайне Абісінія пераможыць Італію, то яна гэтым зробіцца не толькі слаўнай, але і магутнай, там у Афрыцы, чым Японія ў Азіі. Вайна натаўкнець яе на пуць еўрапейскай цывілізацыі.

Узноў працую ў Жуках. Сабраў свае катомкі і ўжо направіўся пайсці — шукаць працы ў іншым раёне, але на дарозе жукоўскія бабы ды дзеўкі мяне затрымалі і пачалі чарніць — фарбаваць свае посцілкі на «малёўку» на дываны і я затрымаўся... Па чатыры залатоўкі за штуку, трацячы па тры дні часу на кожны... І пераважна ў бяднейшых, якія самі ходзяць па наймах і гэтых грошай крыху падзарабілі, на якія і стараюцца хоць насценнымі дываны падпрыгожыць сваё бядацкае жыццё і маладосць. Усё гэта добра, што вясковая моладзь імкнецца да красы, да экстэтыкі, мастацтва. Толькі адно тое нядобра — гэта мне. Як не працуй на ўпрыгожанне другіх, а на ўпрыгожанне самога сябе ніяк не заробіш. Людзям жыццё ўпрыгожаю, а сам хаджу чуць не лахудрам. Ніяк не збяруся на тое, каб набыць сабе новую прылічную адзежу...

Да ліста к дырэктару Беларускага музею ў Вільні

...Яшчэ. Маю (на руках) каля двух дзесяткаў экземпляраў прылад каменнага веку, прадназначаных для Беларускага музею. Але шкада, што Беларускі музей па мне, як аб сваім супрацоўніку, які так шмат чаго цікавага яму даставіў, забываецца... А я тут (выйграўшы суд з Навагрудзкай гімназіяй, але ўжо па часе, па зачыненні апошняй і пазастаўшыся з нічым) б'юся, як тая рыба аб лёд — за кватэру ды страву для людзей працую. А на новую вопрадку (на паліто і хоць бы танны касцюмчык) ніяк не ўзбяруся, а яшчэ й кавалер, змог бы й счасце знайсці праз жанімства, ды не маю ў чым да людзей паказацца. А гады бягуць, набліжаючы ўбогую старасць. Рад быў бы, каб музей аба мне не забываўся ды, на колькі магчыма, што-небудзь купіў з маіх прац. А гэта ўжо было б для мяне добрай падпорай.

Каб кожны нас відзеў
І не жадаў благога.
Каб нас ніхто не крыўдзіў,
І каб мы нікога.

Махнуўшы рукой на ўсіх «дабрадзеяў», якія, будучы кіраўнікамі беларускімі грамадскімі культурнымі ўстановамі ў сталіцы наша краю — Вільні, і абладаючы такімі-сякімі матэр'яльнымі сродкамі для ўтрымання гэтых устаноў, лічуць куплю маіх мастацкіх прац як за нейкую для мяне ласку, нешта ў родзе «jalmuznego»[1], прынімаюся за ашчаднасць і заваджу сабе зберагальную кніжку Р.К.О.[2], мо хоць гэтым пастараюся даць сам сабе раду і абыйдуся без іхняе ласкі...

Ад восені да Каляд я ўжо маю заашчаджаных на кніжцы (на паліто і летні гарнітур) дваццаць залатовак. Як гэта не ўбога, але пры маёй бядзе і гэта грош — на вопратку.

А вось і Каляды...

Ад восені аж да самых Каляд працаваў без пярэрвы, дэкаруючы сялянскія хаты сажанных памераў маляўнічымі дываномі ў раёне сяля Шкунцікаў. І намаляваў за ўвесь гэты час каля дзесятка штук т[ак] зв[аных] «каўроў». Адзін для Ніны Чарнявай. Адзін для Ніны Чырвонай у Шкунціках. Адзін для Ніны Малой («Анулькі»). Адзін для Ніны Белакурай. Адзін для Надзі Цыблястай. Два для Надзі Акруглястай. Адзін для Людзі «Ай не дурэй». Адзін для Скрозьдоннай. Адзін для Моні Падурослай (дачка Гаварлівай) і адзін для Фані Аснаваценькай. Чатыры з іх ружовымі, залацістамахрыстымі занавескамі (ручні-

[1]Падачкі.
[2]Дзяржаўнай ашчаднай касы.

камі) і пейзажамі. А рэшта з букетамі кветак і рознымі арнаментацыямі.

У Пашкох. Пашкоўцы народ прастадушны і не скупы. Падабалася мне ў іх тое, што яны не так, як іншыя — не таргуюцца так, як іншыя «каб дзешавей», а «за што людзям, за тое і нам». А ганарар плацілі не ў той дзень, калі я адходзіў, кончыўшы работу, к другому, а адсылаючы праз дзень два загадзя і акуратна. У міжчасе, карыстаючыся з бясснежжа, зрабіў марш аж у Юркава праз Лужкі адведаць свайго найстаршага брата Канстанціна і занёс яму, як хвораму тое-сёе з прысмакаў — гасцінца... А разам гэтым аднёс для панны Броні Шынялянкі ейны заказ — квятлісты, з начным пейзажам на асяродку — сценны дыванік.

1936 год

ТОЕ-СЁЕ

Цікава, што жыхароў нашай Дзісеншчыны людзі бывалыя шмат дзе на свеце залічаюць да самых уборных, франтавых у сэнсе мод і наогул еўрапейскага касцюма, асабліва гэта добра кідаецца ў вочы на фэстах. Да вайны, таксама Лепельшчына, Дзісеншчына, сучасная Браслаўшчына, часткова Дрысеншчына і Полаччына, найбольш выдзяляліся між беларускіх паветаў сваім франтаўствам, а асабліва сваёй упражжу як родзіна найбольш удобнай лёгкай упражы — зімой санкамі-«вазкамі», а летам «лінейкамі», якімі не карыстаюцца ані расейцы, ані літвіны аднааглабельнікі, ані палякі са сваімі палукашкамі і дышлямі, ані нават немцы са сваімі цяжкаважкімі дышлявымі лямачнымі панарадамі, якія ім служаць на ўсё — і да вазоў, і на вылюддзе. Нездарма немцы падчас акупацыі нашага краю не маглі надзівіцца, нацешыцца спраўнасцю і лёгкасцю нашай тутэйшай упражы. А польскія асаднікі, якія папрывазілі з сабою разам з коньмі і сваю ўпраж, за адзін год закінулі сваю і прыняліся за нашую, тутэйшую. Пакінулі сваю не дзеля таго, што тутэйшыя людзі з яе смяюцца, а дзеля таго, што тутэйшая ўпраж на многа талкавейшая. Што да ўбранства, то трэба сказаць, што мы тут, дзісенцы, даўно не помнім, калі вывеўся наш уласны беларускі нацыянальны касцюм, калі быў ён, то хіба яшчэ за прыгонам, а дзеля гэтага карыстаемся з агульнага еўрапейскага касцюма.

Адно што з перадваенных часоў, гадоў за дзесяць перад вайной, калі яшчэ можна было знайсці і купіць па 15 капеек за пуд ліпавых лык на лапці, хадзілі каля працы вясковыя людзі летам у белых кужальных сарочках і ў адных ісподніх кужальных ды зрэбных белых штанах, босымі. Лык на лапці не шкода, туды ім і дарога, але што акінулі летам хаджэнне ў адной ісподняй бялізне — гэта троху шкада з пункту гледжання гігіены. Бо што ёсць лепшага, найздаравейшага ў гарачую летнюю пару, як не белы кужаль?

Кажуць людзі, што калі кінуцца туды за Пастаўе, пад Літву і на Вілейшчыну — то яшчэ і цяпер можна пукі ліпавых лык знайсці на рынку — лапці водзяцца.

Што да ўпражы і земляробных прылад — павозкі даўней былі: і тачанкі, карафашкі, каркі, калёсы гнойныя, калёсы сенныя або возавыя.

Павозкі цяпер: лінейка на рысорах без дошкі, лінейка на дошцы з рысорамі. Лінейка на дошцы пачала выводзіцца. Каркі — яшчэ водзяцца. Калёсы гнойныя — водзяцца. Калёсы сенныя (для сена пад жэрдзь) — пачынаюць выводзіцца і замяняцца рэдалямі.

Зімовая ўпраж бадай што мала змянілася: «вазок — санкі легкавыя». Развольні, радзей лагожы — апошнія найболей у жыдоў, што цялят скупліваюць. Сані дроўныя і да іх падсанкі.

Кол-звённікаў і палазоў-капанёў не ўбачыш. Іх замяняюць гнутыя ясеневыя абоды і ясеневыя або бярозавыя гбаныя палазы.

Земляробчыя прылады: плуг пачаў замяняць сабою саху прыблізна з канца XIX ст., тачней ад 1895 і 1900 гг. Спачатку быў паявіўшыся плуг, літы з чыгуна — «чыгуннік», але ненадоўга. Ужо ў 1901 г. яго выціснулі «зялезнікі» з дзераўляным дышлем і рукаяткамі — рыжскай фірмы «Шварцгоф», памалёваныя на светла-ультрамарынавы колер. Гадоў жа 7 спусця з'явіліся і зялезнадышлевыя, спачатку параконныя, а пазней і адзіночныя. А па-за імі «спружынаўкі» і т.д. і т.д.

Да 1900 г. як на вёсках, так і на дварах малаціліцапамі ў асецях сушанае дабро. А лён мялі рукамі ў мяліцы (на дзве нагі з каранёў, а трэцяя апора — пень з білом). Толькі ў некаторых дварах былі малатарні — тапчанкі, дзе на правадзе быў мост са сконам, на які валоў узганялі. Толькі каля 1900 г. на Дзісеншчыне з'явіўся нейкі май-

стра — механік па прозвішчу Гамулка — той першы пачаў рабіць па дварах дзераўляныя малатарні («баявыя») з кулачнымі прывадамі — круціць упрэжанымі дзвюма а то і трыма паркамі коней. З перадачаю праз махавае кола на барабан дзе скураным, а дзе пяньковым пасам. Такая малатарня надта звонка гудзела, а салому разбівала — мякчыла, як кажуць, «на пух». Гамулкава работа ішла на расхват. Гамулку двары нанімалі і гарэлкай паілі, каб толькі малатарку мець і з цапом распрашчацца. Ужо ў 1904 і 1905 гг. пачалі паяўляцца малатарні-чыгункі, але без прывадаў, ручныя. А прывады да іх пачалі дастраіваць самі малацільшчыкі, замест кулачнага кола, рамёны з віламі, а замест паса — таўшчэзны пяньковы канат на гэных вілах соўгаўся.

Што да машын лёнамялак — таксама там ды сям былі пробы, але вельмі на прымітыўных асновах: валкавасты круглы мост, як кружнік Сатурна. На ім рассцілалі сушаны лён — а па гэтай пасцелі лёну кацiліся вальцы, націснутыя скрыняй з каменнем, умацаванай на дышлі, які цягнулі ўпрэжаныя коні або валы.

Першую машынную лёнацёрку, або «мялку», як яе брат назваў — састрапаў у 1902 г. мой старшы брат Канстанцін Нарцызавіч. Яна была ўся спрэс дзераўляная, з бярозавага дзерава, за вылукай некаторых змацовак і шрубаў зялезных ды восяў. Складалася яна са стайна, трох вальцаў, дзвюх бярозавых спружын-нагнятачоў, ці націскачоў, двух махавых кол, барабана і прыпола, або прыстолка. Сярэдні валец быў таўсцейшы — каля паўтара аршына ў абойме. А рэшта два — верхні і ніжні — трохі цянейшыя, даўжынёй каля двух аршын з палавінай. І верхні, і ніжні прыціскаліся да серадушчага спружынавымі націскачамі. Жмені сушанага лёну, у дзве пары, раз па разу пушчаліся пад верхні валец, а вярталіся назад на прыпалак з-пад серадушчага з ніжнім, адкуль падавальнік хапаў і кідаў іх у дзве рукі разам пад верхні, а так праараблялася датуль аж, пакуль жменькі не мякчэлі. А змякчэўшыя злучаліся з чатырох у дзве і ўжо цяпер кідаліся па дзве разам, а па адной — то левай, то правай рукою.

Спачатку гэтая ягоная мялка была ручной, у два круцільнікі. А пазней пачалі да яе прымяняць і прывод з конямі.

Пазней мой брат зрабіў і яшчэ пару такіх машын на продаж. Цяпер жа абразец гэтых, прыдуманых і ўдасканаленых маім братам Канстанцінам лёнамялак вельмі шырока распрасторыўся. І прызнаецца як за самую найпрактычнейшую, удобную, простую і недарагую машыну.

Цікава, што якія майстры дзе як не робяць, а новага да яе анічагусенькі ніхто не дадаў, як да трохвальцавай. Давялося мне ўжо пасля вайны ўбачыць нейчыю і чатырохвальцавую недзе, але яе не хваляць.

Плуг выціснуў саху з поля, но на гародах яна пазасталася. І бадай што няма ніводнага парадачнага гаспадара, які б не меў, не захоўваў сахі дзеля гародаў, дзеля саджэння пад саху бульбы, дзеля «ганяння» лех і абкучвання бульбы сахою ў «рассыпку» і «абсыпку». Саха тут дзеля ўзбрання гародаў незамянімая прылада.

Двойні (лапата з дзвюма нарожкамі), якімі даўней кідалі на адвоз хляўны гной, вывяліся з паяўленнем стальных фабрычных віл.

Асець (сушня) была пры току, у гумне, бадай што ў кожнага гаспадара, пакуль не з'явілася малатарня, а малацілася цапамі, бо малатарня малоціць і сырое, нясушанае, — цэпам жа, не высушыўшы добра ў асеці, не змалоціш.

Цяпер жа з пераходам на хутары асецяў зусім не будуюць. А на сушку лёну — лазня замяняець. Лазня таксама змянілася. Даўней яна была без гродак для лёну. Складалася з уласцівай лазні, дзе была печкаменка і палок для парання, там жа і мыліся, і прылазніка, дзе раздзяваліся. А ваду награвалі ў карытах напаленым каменнем. У цяперашніх жа лазнях ваду грэюць або катлом, умураваным, або трубой з кадзі ў печ і наадварот.

Тутэйшы беларус жыць без лазні, як і есці на непакрытым стале абрусам або пачынаць абед без кіслага супу, — не можыць. І калі яму дзе прыходзіцца будавацца на адзіне навасельлем, то першым доўгам, раней чым пабудаваць хату, капаець студню і будуець лазню. У лазні (цяпліцы) ён мыецца, у лазні ён парыцца, у лазні ён дызенфекцыруець (прудзіць) сваю бялізну і адзежу.

Сесці ж есці за голы, непакрыты абрусам, стол ён лічыць за вялікае свінства.

А паабедаць без двух супаў, кіслага і прэснага (кіслы на пачатку, прэсны на кан-

чатку, а пасярод, між імі, нешта сытнейшае), ён лічыць за недаедак. Сесці ж абедаць без хлеба, а пры адной бульбе, як гэта водзіцца ў немцаў, — гэта для яго ўжо голад... Бясхлебіца.

Колькі слоў аб ежы...

Кіслыя супы — зімой: з квашанай капусты, з квашаных буракоў з расолам, з квашанай расчыны (поліўка). Вясной: з квашаных маладых траў: шніткі, боршчу, крапівы, асоту, трапутніку і шчавеля. Летам: халаднікі са шчаўя, з агуркоў, з бацвіння. Восенню: бацвінне і капуста.

Прэсныя супы: з ячных круп, як перловікі, дранікі і лянуха. З мукі — клёцкі, зацірка, макароны. З бульбы — булён, клёцкі-дранікі з душамі і без душ.

Каша крупяная — ячная, каша бульбяная — таўчонка, бульба-тушонка.

Сярэдняе: бліны, сырнікі, яечня — голая і мучная, бульба смажонка і г.д.

1937 год

ПАМІЖ МНЮТАЙ І АУТАЙ

Месяц люты правёў на пушчы Цытавізна, на родзіне сваёй, пазастаўляючы там для сваіх з радні сваякоў два партрэты — адзін свёкра пляменніцы Яніны Д[раздавічан]кі, а другі ейнага бацькі Стафана ў Азёрках. Хай пазастануцца на памятку ўнукам. Адтуль махнуў на наш «Байкал» — возера Доўгае, дзе меў прыемнасць, праходзячы яго на лёдзе, дзівуючыся ягонымі чыста горнага характару маляўнічымі берагамі, аднайшоў на ім, пры вытоках з яго на маравастага выгляду возера Сшо старадаўнейшае калісь, знаць, умацаванне людское сялішча на астравіне перакрытага насыпным гарадзішчанскім валам гарадзішча Псуя, на якім у пазнейшыя часы звіла гняздо сабе тут сялібішча апшарніцкага двору.

Марац м[есяц] правёў на Зароўі, малюючы на тутэйшых шляхоцкіх сялібах экраны сценных упрыгожанняў — адзін для Стася, другі для Яна Карчэўскіх, а трэці — для «цёткі Мар'яны» — Марусі Цяхаўшчанкі, з якой мы і дружым, і сварымся.

Красавік м[есяц] правёў на працы (на дзяўчацкіх макатэрыях-«цадзілках») у Навінах — у хаце швачкі Уладыславы М-кі з цэлым сям'ішчам вучаніц-падмасцерак, з цёзкай мне Юзатай на чале. Вясёлая сямейка. Далей у Стральцове — для Максімавічанкі.

Пасху па н[оваму] ст[ылы] як свята спатыкаў вясны правёў у ўбогата выгляду хатцы на курыных ножках — у Юркаве, у сваякоў-пляменнікаў. Там жа для дому «Домценькі» — Д.Няміры і пляменніка Уладука, а таксама пляменніцы Ядвіні зрабіў некалькі пейзажаў.

Другую «старую» (праваслаўную Пасху, ужо як сапраўды спатканую вясну) правёў у Летніках, у Янкі Башкіра, но ўжо як маёўку. Са шпацырам у лес... Там было й некалькі прыехаўшых гасцей са стараны на самакатках або ровэрах, як іх цяпер пачалі называць. Быў тут прадстаўнік з кааператыўнага торгу гр. Дунец і цэглянай прамысловасці Павульскі, дачка гаспадара з Дзісенскай гімназіі «Лінка-журавінка» і наш «вялікі і родны», як яго Янка Башкір называецць, «беспадобна звінячы» Міхась Машара, з якім Башкір нас сіліўся, за прашлагоднюю нашую сварку, пераміряць, і як «сем'янітаў роднае багемы» і ўжо перамірыў, ды на астатку «ўзноў Міхась узбураны ад'ехаў».

М[есяц] май правёў на Бушавічах, на хутары Плавінскіх, на пейзажах. Дзе між іншым меў прыемнасць заняцца любімымі маімі доследамі над старасветчынай.

На крынічна-дрыгвістым лугу ў далі не рэчкі Ауты знаходзіцца паросшы дрэвамі ўзгорак-астравок, а калі я, разуўшыся, дабраўся па зыбучай дрыгве да гэтага астраўка, то аказалася, што тут было калісь фармальнае старасвецкае людское сялішча — гарадзішча. Даўжыня яго ад краю да краю штучна абладжаных адкосаў каля 75-ці крокаў, а шырыня каля 25-ці.

Але самае найцікавейшае, што мяне моцна здзівіла: чаму іх тут так густа?.. У Падавутах, непадалёку возера Ауты, на т[ак] зв[анай] Замкавай гары — адно. Між азёрамі Дварцом і Качаноўкай над р[акой] Аутай — другое. Вярсты дзве па той самай рэчцы ніжэй, на Зароўі — трэцяе, а ў паўвярсты ад апошняга — на табе — і чацвёртае.

У пачатках вясны правёў пару тыдняў за працай у Мамонаўцы і на Распашшы, дзе зрабіў адзін экран насценны і адзін пейзаж для п. Шыпілянкі, адзін пейзаж для п. Гайдамовічыхі і адзін пейзаж для Коўзана.

У канцы мая і пачатку чэрвеня цярплю на безрабоцце. Канец жа чэрвеня іду (па запросінах з фэсту ў Баброўшчыне) туды,

дзе частку дзяцінных гадоў сваіх праводзіў, на вытокі ракі Ауты, а іменна ў Падауты.

Вяртаючыся з Баброўшчыны ў бок Свіла, меў прыемнасць знайсці каля баброўшчыны на засеяным лубінам полі, каля дарогі, прыгожанькі, экземпляр урочча з каменнага веку, а іменна малюсенькі далатавасты каменны ножык, які й рашыў з сабою насіць у кішэні.

Непадалёку Брыкіцёў знаходзіцца некалькі курганоў-валатовак. У адной такой валатоўцы, якая была напаўскопанай каля Гваздоўскай дарогі — тры выразных попелавых памінальных на трызне слаі. З гэтага відаць, што гэтая валатоўка была не ваенная, а з дахрысціянскіх часоў памінальная магіла.

Мейсцамі слова або назва «гарадзец» ужываецца проста замест слова «гарадзішча або «гарадок».

Гарадзец над Мнютай каля Лужок — трохкутнае гарадзішча вышэй млыну ля двору Гарадца. Тут жа, насупраць гэтага гарадзішча, — высачэзны курган-валатоўка, сярод поля ля дарогі, а на ёй мураваная капліца з фігурай Хрыста пад крыжам. Кажуць, што гэтую валатоўку — адны кажуць «французскія», а другія — «шведскія» салдаты халявамі ды шапкамі насыпалі, а ўласнік двара Гарадца, пазаставіўшы па сабе нядобрую славу тырана, Жаба, ваявода капліцу ўзнёс, узбудаваў. Магчыма, што гэтая валатоўка і ёсць курганом на полі пабоішча нападаючага на Полацак літоўскага князя Мінгайла, супраць якога тут выступалі «палкі мужоў Полацкай рэспублікі», «Мінгайла зжог горад імянуемый Гарадцом» — як гэта ўпамінаецца ў кнізе Шчакаціхіна «Гісторыя бел[арускага] мастацтва»[1]. І праўда. Я рабіў некаторыя доследы ў 1931 г. над гэтым Гарадцом. Ад валаў гэтага гарадзішча пазасталася толькі адна сцяна ад поля, а рэшту р[эчка] Мнюта разрушыла. Толькі ў двух мейсцах пазасталіся абрыўкі гэтых валаў. На адным з іх расла, навісаючы над берагавым рачным абрывам бяроза, а ў карэннях ейных відалася нара з попелам і буйным дубовым вуголлем, знаць, ад спаленых сцен з вежамі. Я запусціў руку ў гэты попел з вуголлем і дастаў абломак трохакруглястай тоўшчы — галёнкавую чалавечую косць з пераломам. Косць была чыстая, белая, як папера, і без ніякіх прызнакаў раскладу. Каля сямісот гадоў прайшло ад часу пажару гэтага гарадзішча, а выгляд косці ў попеле меў быццам год таму назад была закапанай у попел. У тую хвіліну, калі я браў у рукі гэтую косць, з-пад бярозы — мне чудзіўся ў шуме дрэў суседніх бяроз шум, гоман, гойканне і вой, які можна чуць толькі ў пажар.

Гарадзец Лужыцкі над Мнютай...

Гарадзец Пагосцкі — непадалёку Новага Пагосту на Піладскім бары — гара-гарадзішча.

Гарадзец Свільскі — на Свільскай пушчы ля рэчкі Свіліцы, каля в[ёскі] Брыкіцёў — гара-гарадзішча.

І дзве астравіны над р[акой] Сошай[2] каля перавозу, без ніякіх прызнакаў, ясных, сведчучых аб гарадзішчы. Таксама завуцца Гарадцамі — Гарадзец Перавозскі і Гарадзец Маргаўскі.

Аднак жа ёсць прызнакі на старане в[ёскі] Перавозу, што тут было калісь старадаўняе сялішча. А побач, непадалёку на бары, у казённым лесе — мнагалікае курганнае копішча.

Пачатак лета спаткаў на вытоках ракі Ауты. А самое лета — між Мнютай і Аутай («Паміж Мнютай і Аутай»).

Тыдня з паўтара прабыў на з дзяцінных лет знаёмай мне мясціне ў Падаутах, там дзе з Кміт, будучы падросткам, першай грамаце вучыўся ў нелегальнай хатняй школцы, з Пацэвічанкай-настаўніцай на чале, у Адольфішанай хаце, што калісь стаяла ля агромністага ля дарогі каменя, на Стараселлі. Праходзячы міма гэтага каменя ў ясна цёплую сланэчную пагоду, я часта застанаўліваўся, каб на ім адпачыць-памячтаць, успамінаючы сваё даўным-даўно прапушчанае дзецтва. А ў апошні раз на прашчанне закапаў тут «на знак» (ля яго) кавалак фасоннага чыгуну і старыя кухонныя вілкі, якія знайшоў тут на хаціцшчы. Тут я, у Падауце, хоць пры недахопе некаторых фарб, такіх, як кобальт, якога тут у тутэйшых мястэчках і не знаюць — «ультрамарына ім на ўсё» — намаляваў лясное азярцо (пейзаж) для Астроўскага [зяця швагеркі майго брата Канстанціна (s.p.),

[1]Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Мн., 1928. Т. 1. С. 280.
[2]Шошай.

Перхурошчыхі, Міхаліны Гурычанкі, выхаванкі (s.p.) інтэлігентнага дзядзькі Юзэфа Гурскага, сталага кавалера]. Тут жа меў магчымасць адвячоркамі слухаць Менск праз самадзельнае радзіё, састрапанае Астроўскім. Зрабіў і Забараўшчанцы дыван на экране, з начным пейзажам і зёлкамі паабапал. Нішто, дабравата мне было ў Падауце, праз увесь час меў магчымасць у возеры купацца ды на сонейку апякацца, што рэдка калі дзе так здараецца. А яшчэ к таму, што і не адзін, а ў кампаніі, падружыўшыся з дзвюма дзяўчукамі — п. Рузяй і Грушчаначкай...

З Падаут перасяляюся ў найбольшую паміж Мнютай і Аутай уцалелую ад расхутарызавання вёску Крывічы, дзе і затрымліваюся аж на цэлага паўтара месяца, пераходзячы з хаты ў хату, ад дзяўчыны да маладзіцы, ад маладзіцы да дзяўчыны. Каля цэлага тузіна ім зрабіў рознаўзорыстых насценнікаў з вазонамі ды букетамі, без пейзажу. Бо крывіцкія кабеты любяць толькі зёлкі з кветкамі, ані на якіх там пейзажах не знаёмся. Крывічы — гэта адна з найвялікшых вёсах паміж Мнютай і Аутай на Дзісеншчыне. У ёй аж цэлых 70 хат. Належала яна калісь у 16 ст. (згодна з праф. Сапуновым) да двара Плісы (баяр пялацкіх Путехоў), якому тады 12 талок у год адраблялі (за нешта). А пазней да Шэпелева... Узбудавана гэтае сяло Крывічы на досыць высокай жвірыстай гары ў адну нешырокую вуліцу. Сярод сяла — узгорысты стары магільнік, на якім ужо каля капы гадоў як ніхто не хаваецца. Часць магільніку адышла пад будоўлю, а на рэшце яго ўзвышаюцца таўшчэзныя рагатыя сухія тры сасны. На адной з іх — гняздо, бацянава. Гэта цэнтр сяла, які замяняець сабою сквер, пляц-зборышча, на ім пастаўлены нават качэлі.

Ёсць тут і новы магільнік на Сідаравай гары, у бок Плісы. А паміж гэтай гарой і сялом некалькі мокрых крынічных лужаек, а перак іх — памінальныя кладкі сцяной, як памяткі па нябожчыках, з павырэзьбаванымі на іх фігурамі чалавечых слядоў. А на некаторых нават напісы (грамадзянкай) імён і прозвішчаў памёршых. Цікавы, арыгінальны старадаўнейшы тут звычай памінання.

Ёсць тут і яшчэ адзін найстарэйшы магільнік, на якім калі хто хаваўся — ніхто не помніць. На ім захаваўся яшчэ адзін і крыж каменны. Было іх і болей, але хіжнікі назвазілі іх на пастройку чыгункавага мосту на Сошы. Цікаў гэты магільнік тым, што ён, як хрысціянскі, заснаваўся на старым дахрысціянскім, валатовачным (паганскім), бо вылажаныя каменнем хрысціянскія магілы перамешаны з валатоўкамі. Відаць, што дзяды пахаваных тут хрысціян хаваліся як не хрысціяне, у валатоўках, а іхнія ўнукі, ахрысціўшыся, не захацелі пасля смерці расставацца са сваімі дзядамі і на іхнім жа магільніку нехрысціянскім завялі і свой хрысціянскі. Падобны магільнік мне ўжо даводзілася аглядаць на пушчы Цытавізна, каля засценку Любава (Галубіцкая гміна).

Непадалёку Крывіч і ўспомненага тут магільніку знаходзіцца напаўспушчанае возера Старына, на якім, як і на гэтым найстарэйшым крывіцкім магільніку, людзям зданкі здаюцца і ходзяць розныя легенды. Кажуць, што на гэтым найстарэйшым магільніку шмат каму здаваліся зданкі. Тут відзелі старадаўніх людзей у старадаўніх вопратках. Вось адна з іх: сышлі поўднем, летам, з магільніку два нейкіх старасвецкіх старычкі, адзетыя па-даўнейшаму, шапкі з «аглоблямі», вушлатыя, а пры боку ў кожнага з іх на раменях карзінкі (каліты). Сышліся ды й гавораць: «Ці помніш ты, як на гэтым мейсцы даўней прахадзіў на Полацак бойкі-бойкі гасцінец?»

Тры разы паўднём я бываў тут на гэтым магільніку, але ніякіх зданак тут не відзеў. Толькі адно я тут заўважыў, што адна на ім мясціна на ўзгорку ад Крывіч, дзе знаходзіцца ў ядлаўцовых кустах ухаваная акладанымі каменнямі валатоўка, нешта чуецца. Першы раз, як падышоў я да яе, пачало ў вачах мітусіцца, і агарнула мяне быццам нейкай трывогай. А ў наступныя разы — станавілася ўваччу неяк весела, весела.

Крывічанцы — народ прастадушны і як трэба прыветлівы і гасцінны, але бедакаваты, рэдка каторы з іх хлеб не дакупліваець. Зямля малаўрадлівая, уся на жвірах ды пясках. Кабеты іхнія — са сваёй вёскі паходжаннем, захавалі болей, як у іншых вёсках, свой чыста славянскі тып беларусак, ясных блёндынак. Валасы светлыя, як лён, з лёгкім залаціста-саломенным вадценнем, асабліва ў маладых, да 25-летняга ўзросту.

Мова іхняя крыху мешаная. Ёсць некалькі хат, якія ў тварыцельным падзяжы

канцоўку «ы» ўжываюць: «Добрымы, ладнымы, самымы» і г. д. Але, як выяснілі мне самі крывічане: «У нас тут гэтак гаворуць толькі некалькі хат, адна фамілія, Садохі, якіх у часе прыгону з двара Шэпелева аднекуль да нас, у Крывічы, пасялілі».

Тон гутаркі тутэйшых, мяйсцовага паходжання кабет, досыць прыгожы, лагодны, плаўны, пявучы, сардэчны, так што па тону гутаркі можна лёгка распазнаць, каторая з іх родам мяйсцовая, а каторая не. Каторая з іх гаворыць, як малатком касу клеціць — цвёрда, бойка, або харабравата — будзьце пэўны, што яна родам не крывічанка.

Кругом вёскі, на палях, шмат дробных, пад рознымі назовамі б[ыўшых] сялішчаў. А найбольшае і найстарэйшае з іх знаходзіцца ў паўтары вярсты адлегласцю ад вёскі, на зямлі высечанай і распаханай пушчы Старына ля ўзбярэжжа напаўасушанага імшарнага возера Старыны...

Друкуецца па кн.: Памяць. Глыбоцкі раён. Мн., 1995. С. 147—161.

Падрыхтаваў Б.В.Ульянка.

ДА ЖЫЦЦЯ НОВАГА, САВЕЦКАГА

17 верасня 1939 г. тэрыторыя нашага раёна была вызвалена ад польскай улады. Баёў тут не было. У небе з'явіліся самалёты з чырвонымі зоркамі на крылах, па дарогах з Шаркаўшчыны на Германавічы, Ёды рухаліся калоны савецкіх войскаў, танкі.

Вось як апісвае падзеі таго дня наш зямляк пісьменнік Міхась Машара.

«З высокага ўзгорка гасцінец быў відзен як на далоні. Па ім вялікімі і малымі абозамі ўцякалі на захад паны і паўпанкі! Уцякалі паспешліва, улегцы, не мелі часу захапіць з сабой маёмасць і жывёлу. Ніхто ад абозу не адлучаўся да раскінутых каля дарогі хутароў. Праз нейкі час гэтыя абозы пачалі радзець. Потым з перапынкамі рухаліся па дзве-тры фурманкі. Неўзабаве і яны зніклі, і на гасцінцы запанавала цішыня...» (Машара М. Старонкі летапісу. Мн., 1975. С. 20.)

Камендант польскай паліцыі ў Шаркаўшчыне, як расказвае М.Машара, перад тым, як пакінуць мястэчка, перадаў усю маёмасць пастарунка, зброю, а таксама спісы падпольшчыкаў, складзеныя дэфензівай, і спісы правакатараў, агентаў паліцыі, разам з ключамі ад пастарунка мясцовым камуністам. Намеснік каменданта паліцыі Счэхула, спрабаваў на матацыкле ўцячы на захад па дарозе на Ёды, аднак падпольшчыкі яго злавілі.

Працоўныя Шаркаўшчыны радасна сустракалі байцоў Чырвонай арміі. «Усе былі прыбраныя па-святочнаму, — піша М.Машара. — Людзі неслі шмат восеньскіх кветак і два транспаранты з белых ручнікоў, на якіх чырвонымі літарамі было напісана: «Прывітанне братам з Усходу!», а на другім — «Няхай жыве Чырвоная армія — вызваліцельніца!»

Мы выйшлі на гасцінец якраз тады, калі па ім праходзіла новая калона савецкіх танкаў. На версе іх сядзела многа ўзброеных байцоў. Яны саскоквалі з танкаў, абдымаліся і цалаваліся з намі. Дзяўчаты дарылі ім кветкі. За танкамі ішлі бронетранспарцёры і артылерыя. Мы стаялі і прывітальна махалі рукамі. Небывалая радасць напаўняла нашы грудзі». (Машара М. Старонкі летапісу. Мн., 1975. С. 23.)

У былым пастарунку паліцыі ў Шаркаўшчыне (а гэты быў дыхтоўны, спецыяльна пабудаваны дом на ўскраіне мястэчка пры гасцінцы, які вёў на Глыбокае) размясціўся штаб начальніка Шаркаўшчынскага гарнізона Чырвонай арміі. Невялікі гарнізон (каля дзесяці чалавек) быў пакінуты для дапамогі мясцоваму насельніцтву ў станаўленні савецкай улады і перабудове жыцця на новы лад. Прадстаўнікі Чырвонай арміі адразу ж правялі ў Шаркаўшчыне нараду з актывістамі

падполля. У першыя дні пасля вызвалення ў Шаркаўшчыне, ў вёсках і мястэчках былі створаны Часовыя ўпраўленні. Старшынёй управы ў Шаркаўшчыне стаў Міхаіл Маркавіч Шаблоўскі. Яшчэ пры царызме ён працаваў настаўнікам у Шкунціцкай народнай школе. У час польскай акупацыі не настаўнічаў (беларускіх школ не было, у польскую не ўзялі), жыў у Шаркаўшчыне. Стварыў тут беларускі кааператыў «Зорка». Быў паважаным чалавекам сярод мясцовых жыхароў.

На сходах жыхароў паўсюдна выбіраліся органы новай улады — сельскія і валасныя сялянскія камітэты. Яны праводзілі актыўную работу па арганізацыі перадачы зямель памешчыкаў і асаднікаў беззямельным парабкам або малазямельным сялянам, бралі на ўлік і захоўвалі ад раскрадання маёмасць, інвентар, жывёлу, запасы збожжа. 3487 бедняцка-серадняцкіх гаспадарак набылі зямлю, 1128 атрымалі коней, 380 — кароў.

Для аховы грамадскага парадку былі арганізаваны ў сельскай мясцовасці дружыны сялянскай міліцыі, у мястэчках — атрады рабочай гвардыі.

Асабліва плённа працаваў часовы аддзел школ, якім кіраваў М.Машара. Яму дапамагалі вопытныя настаўнікі: Вячаслаў Лукіч Катовіч, звольнены 5 гадоў таму з польскай школы, і Валяр'ян Кандратавіч Латышонак. Былі вернуты на работу ў школу ўсе настаўнікі-беларусы. Падручнікі былі атрыманы з Мінска. Праз месяц пасля вызвалення пачалі працаваць школы.

У абстаноўцы палітычнага ўздыму працоўных 22 кастрычніка 1939 г. адбыліся выбары ў Народны сход Заходняй Беларусі.

Наш зямляк пісьменнік Міхась Машара на сходзе працоўных Шаркаўшчыны быў вылучаны кандыдатам у дэпутаты Народнага сходу, а ў дзень выбараў людзі прагаласавалі за яго. 28—30 кастрычніка 1939 г. адбыўся Народны сход у Беластоку, на якім М.Машара разам з іншымі дэпутатамі — настаўнікам Ф.Д.Манцэвічам, сялянамі А.Л.Сінкевічам, А.М.Арцімёнак, Невядомскім — прадстаўляў тагачасны Дзісенскі павет.

Народны сход прыняў шэраг рашэнняў гістарычнага значэння: аб устанаўленні савецкай улады, аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР і СССР, аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель і прызнанні ўсёй зямлі ўсенароднай уласнасцю, аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Народны сход выбраў дэлегацыю ў складзе 66 чалавек, якія пасылаліся ў Маскву ў Вярхоўны Савет СССР з просьбай аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад Савецкага Саюза. Сярод іх быў і М.Машара.

Нечарговая 5-я сесія Вярхоўнага Савета СССР 1-га склікання прыняла 2.11.1939 г. Закон аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і аб аб'яднанні яе з БССР, а Нечарговая 4-я сесія Вярхоўнага Савета БССР (адбылася 12—14.11.1939) пастанавіла прыняць Заходнюю Беларусь у склад БССР і аб'яднаць тым самым беларускі народ у адзінай дзяржаве — БССР.

Уводзіўся новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. 4.12.1939 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі ўтвораны Баранавіцкая, Беластоцкая, Брэсцкая, Віленская і Пінская вобласці. 15.1.1940 г. замест паветаў у заходніх абласцях Беларусі быў утвораны 101 раён, у т.л. Шаркаўшчынскі, які ўвайшоў у Вілейскую вобласць.

У склад раёна ўвайшлі: былая Шаркаўшчынская воласць, частка Германавіцкай і Лужэцкай валасцей Дзісенскага, частка Ёдскай і Новапагосцкай валасцей Браслаўскага паветаў. Было ўтворана 14 сельсаветаў і адзін гарпасялковы Савет. Тэрыторыя раёна складала 1129 квадратных кіламетраў з насельніцтвам 38 647 чалавек.

Згодна са статыстычнымі данымі таго часу, нацыянальны склад насельніцтва раёна выглядаў наступным чынам: пераважная большасць — беларусы, у Беладворскім сельсавеце — 25 працэнтаў палякаў, у Каўшэлеўскім — каля 20 працэнтаў, у Германавіцкім — каля 25 працэнтаў палякаў; яўрэяў у раёне было каля 3 працэнтаў, рускіх — 2 працэнты. (Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 7050. Воп. 1а. Спр. 5.)

Значную дапамогу ў пераадоленні эканамічнай і культурнай адсталасці заходніх раёнаў Беларусі, у т.л. і Шаркаўшчыны, аказалі саюзныя рэспублікі СССР. Дастаўлялася абсталяванне, тавары шырокага ўжытку. Шмат вопытных партыйных, савецкіх работнікаў, кваліфікаваных спецыялістаў народнай гаспадаркі з усходняй Беларусі ўзначалілі адказныя ўчасткі вытворчасці. Свой вопыт работы яны перадавалі мясцовым кадрам.

У красавіку — маі 1940 г. была праведзена рэарганізацыя былых павятовых камітэтаў партыі. У сакавіку 1940 г. раённая партыйная арганізацыя налічвала 28 членаў і 7 кандыдатаў у члены партыі, у снежні — 67 камуністаў. Былі створаны 4 пярвічныя партыйныя арганізацыі і 2 кандыдацкія групы. Вясной 1940 г. прайшла 1-я раённая партыйная канферэнцыя, на якой быў абраны Шаркаўшчынскі райком партыі і рэвізійная камісія. Першым сакратаром райкома партыі стаў Зелічонак. Адначасова з партыйнымі арганізацыямі пачалі ўзнікаць камсамольскія. Першыя пярвічныя камсамольскія арганізацыі былі створаны ў вёсках Полава, Рымкі, Пятровічы, Алашкі, Агальніца, Кушталі, Жданы і некаторых іншых. Першымі камсамольцамі былі, як правіла, актыўныя, энергічныя юнакі і дзяўчаты. Сярод іх Генадзь Лысёнак, Віталь Райчонак, Сямён Лашыш, Іосіф Гінько, Уладзімір Бабылёнак, Анфіса Гінько, Марыя Януш, Ксенія Касарэўская, Міхаіл Сікора, Лявон Аляхновіч, Мікалай Райчонак, Фёдар Мурзёнак.

Камсамольская арганізацыя вяла плённую ідэйна-палітычную і выхаваўчую работу сярод моладзі, дапамагала партыйным, савецкім органам у стварэнні калгасаў.

Як сведчаць статыстычныя даныя, у раёне на 1 лютага 1941 г. былі 8022 сялянскія гаспадаркі, з іх — 5841 на хутарах.

У гэты час у раёне былі створаны 5 калгасаў, якія аб'ядналі 229 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. У калгасы ўвайшлі 96 гаспадарак былых батракоў, 94 гаспадаркі беднякоў і 49 — сераднякоў. Першыя калгасы мелі 1695 гектараў зямлі, 329 гектараў лугоў, 187 коней, 49 галоў буйной рагатай жывёлы. (Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 7050. Воп. 1а. Спр. 5. Л. 1—3.)

У раёне была створана МТС, якая размясцілася ў былым фальварку Красны Двор. З райцэнтрам яна была звязана тэлефоннай сувяззю. З'явілася першая тэхніка: 8 трактароў, адна 24-радковая сеялка, конная малатарня, ільноцерабілка, 2 аўтамашыны — грузавая і легкавая. З ліку мясцовых жыхароў было падрыхтавана 35 трактарыстаў, у тым ліку 7 жанчын.

Значная ўвага ўдзялялася развіццю прамысловасці раёна. З кожным месяцам павялічвалі свае магутнасці 4 заводы па вырабе цэглы: у Полаўскім, Пялікаўскім, Юзафоўскім, Ёдскім сельсаветах. У Куштальскім сельсавеце чарапічны завод выпускаў 5 тысяч штук чарапіц. На 1941 г. намячалася павялічыць яе выпуск да 25 тысяч штук у год. Будаваліся млыны, прымаліся захады па павелічэнні магутнасці электрастанцыі.

Шмат увагі надавалася развіццю адукацыі і культуры. Быў утвораны раённы аддзел адукацыі, загадчыкам якога быў прызначаны М.Машара.

У раёне адкрыліся 54 школы: 46 пачатковых, 8 няпоўных сярэдніх. У

1940 г. працавалі каля 83, у якіх займалася 5200 дзяцей і працавала 130 настаўнікаў, з іх 60 чалавек з ліку мясцовых жыхароў. Многія прайшлі падрыхтоўку на кароткатэрміновых курсах у 1940 г.

Разгортвалася работа па ліквідацыі непісьменнасці. У раёне налічвалася 3200 непісьменных і 4000 малапісьменных. Працавалі вячэрнія школы і курсы ліквідацыі непісьменнасці для дарослых. За кароткі час, усяго за 1 год і 9 месяцаў, у раёне практычна было ажыццёўлена ўсеагульнае пачатковае навучанне.

Паступова пашыралася сетка культурна-асветных устаноў: у Ёдскім, Полаўскім, Германавіцкім, Шкунціцкім і іншых сельсаветах адкрыліся хаты-чытальні, пры якіх меліся бібліятэкі — да 300 кніг у кожнай. Адкрылася бібліятэка пры парткабінеце, дзе налічвалася 1500 кніг. Разгарнулася работа гурткоў мастацкай самадзейнасці. Былі тэлефанізаваны гарпасялковы і 5 сельскіх Саветаў. Працаваў раённы радыёвузел на 250 кропак.

Першыя крокі былі зроблены ў арганізацыі аховы здароўя. Пачалі працаваць 2 бальніцы на 65 ложкаў: 40 ложкаў у райцэнтры і 25 — у Германавічах. Адкрыліся ў Шаркаўшчыне амбулаторыя, у Ёдах — медпункт, у Більдзюжскім, Полаўскім, Каўшэлеўскім сельсаветах — фельчарска-акушэрскія пункты. Медыцынская дапамога насельніцтву аказвалася бясплатна.

Значныя сацыяльна-эканамічныя і культурныя пераўтварэнні мянялі аблічча вёсак, стваралі ўмовы для далейшага іх развіцця.

Л.М.Лабачэўская.

Гэта не забываецца

1 верасня 1939 г. фашысцкая Германія напала на Польшчу. Ва ўсе вёскі нашага краю прыйшла бяда. Гаротным надрывам рыпелі сялянскія калёсы, вязучы на вайну маладых хлопцаў і мужчын. Жаночы і дзіцячы плач невыказнай тугой пранікаў у душу і плыў удалячынь сумным рэхам над ціхай рачулкай Янкай...

А праз два дні ў вёску з'явіўся паліцэйскі і загадаў здаць радыёпрыёмнікі. У нашай в. Шыці тады, здаецца, было пяць маленькіх дэтэктарных прыёмнікаў, якія можна было слухаць толькі, праз навушнікі. Быў такі прыёмнік і ў нас. Слухалі мы, у асноўным, перадачы з Мінска і Масквы. Польскія радыёстанцыі дрэнна праслухоўваліся, ды і ўся ўвага наша была скіравана на ўсход. Мой старэйшы брат Сяргей гэты прыёмнік аднёс у Ёды і здаў пад распіску ў гміннае ўпраўленне.

У вёсцы стала ціха. Людзі былі заняты ўборкай ураджаю. Ніякай інфармацыі не паступала. Адзіная газета «Навіны» прыходзіла ў вёску са спазненнем.

17 верасня быў ціхі і цёплы асенні дзень. З раніцы на ўсходзе пачулі мы аддаленае гудзенне. Апоўдні ў небе з'явіліся самалёты. Яны скідвалі недзе лістоўкі, але да нас яны не даляталі. Потым нехта са знаёмых прыйшоў з Шаркаўшчыны і сказаў, што ідзе Чырвоная армія.

Сяргей пабег у Ёды і прынёс наш маленькі прыёмнік. Мы слухалі апошнія навіны маскоўскага радыё. У навушніках зноў гучала «Кацюша» і іншыя знаёмыя нам і ўжо стаўшыя роднымі песні.

У школах закончыліся заняткі, і мы, хлапчукі, пабеглі за 5 кіламетраў на тракт Шаркаўшчына — Ёды сустракаць Чырвоную армію. Каля дарогі і на некаторых хатах былі вывешаны чырвоныя сцягі. Людзі радаваліся, абдымаліся. Па дарозе рухалася шмат тэхнікі: машыны, трактары, танкі. Ехалі на машынах і ішлі запыленыя байцы. Мы ўздымалі рукі, віталі іх, а яны ў адказ нам таксама махалі і ўсміхаліся. Нашай радасці не было мяжы. У Ёдах праходзілі шматлюдныя мітынгі. Устанаўлівалася савецкая ўлада. Праз пэўны час быў утвораны Шаркаўшчынскі раён, у склад якога ўваходзіла і наша в. Шыці. Пачалі працаваць школы. Польскі настаўнік, беларус па нацыянальнасці, Кан-

станцін Лаўрыновіч адразу ж перабудаваў сваю работу. Урокі праводзіліся на беларускай мове. Зямля раздавалася сялянам. Памятаю, як у Шаркаўшчыне быў створаны раённы аддзел народнай адукацыі. Загадчыкам аддзела стаў тады вядомы беларускі паэт, наш зямляк, Міхась Машара. Я да гэтага часу ўжо чуў пра яго, нават ведаў на памяць некалькі вершаў. На яго вершы моладзь, памятаю, тады распявала песню:

Сонца — наша мэта,
Мы жывём агнём.
Новую мы гэта
Беларусь куём.

Усё гэта кіпучае, бурлівае жыццё паступова ўваходзіла ў звычайную каляіну. Але адначасова пачаліся арышты многіх сумленных людзей. Асабліва яны ўзмацніліся вясной 1941 г., многіх савецкіх актывістаў не стала тады ў вёсцы.

П.Касцюкевіч.

З'явілася надзея

З успамінаў Франца Лук'янавіча Мікшты, ветэрана вайны і працы

У 1930-я гады я быў падлеткам і добра памятаю, як нас палохалі за слова, сказанае не так, як трэба, у адрас Пілсудскага, за нядобры позірк на яго партрэт: «Што, захацеў у пастарунак?» Баяліся трапіць у Лукішкі. Але знаходзіліся і смельчакі.

Мае бацькі жылі тады на хутары каля в. Забор'е. Гэта недалёка ад Шаркаўшчыны. Памятаю, як у 1934 г. на хутар прыйшла вестка, што ў першамайскую раніцу шаркаўчане, прыезджыя сяляне ўбачылі на будынку пастарунка чырвоны сцяг. Людзі здзіўляліся, радаваліся, некаторыя ціхенька плакалі.

Пасля ўжо даведаліся, што ўзнялі сцяг мясцовыя падпольшчыкі. Было так. Нехта прынёс газету, атрыманую з Усходу. Чыталі, як працоўныя ў Савецкім Саюзе рыхтуюцца да Першамая. «І ў нас трэба адзначыць свята», — вырашылі шаркаўшчынскія падпольшчыкі Міхаіл Аўсюкевіч, Міхаіл Вашталёнак і Зейф Лейба. Глыбокай ноччу яны вывесілі над пастарункам чырвонае палотнішча.

Нядоўга трапятаў сцяг над мястэчкам. Паліцэйскія ўспалашыліся, нават з Глыбокага прыязджаў нейкі чын. Сцяг знялі. Але за той час, што ён палымнеў над Шаркаўшчынай, у людзей з'явілася надзея: нешта зменіцца ў жыцці.

Дакументы сведчаць

ДЭКЛАРАЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ ПА ПЫТАННІ АБ УВАХОДЖАННІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў СКЛАД БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ

29 кастрычніка 1939 г.

г. Белосток

Сельскія Саветы атрымалі распараджэнне выявіць на сваёй тэрыторыі так званых кулакоў. Крытэрыямі аднясення да кулацкай гаспадаркі былі скарыстанне наёмнай працы і наяўнасць непрацоўных даходаў. Але такія гаспадаркі, галоўным чынам памешчыцкія, былі ліквідаваны яшчэ да вайны. Таму каб выканаць «план па кулаках», сельсаветы сталі адносіць да кулацкіх усе больш-менш заможныя сялянскія гаспадаркі, якія мелі 5 і болей гектараў зямлі, сельгасмашыны і некалькі галоў жывёлы. Наёмнай сілай у кулацкіх гаспадарках часта аказваліся падлеткі-пастухі, што пасвілі жывёлу ўсёй вёскі, ці блізкія родзічы, якія дапамагалі збіраць ураджай.

Да паёмных рабочых часцей адносілі тых, хто адпрацоўваў дні ў так званых кулакоў за выкарыстанне іх сельгасмашын і коней. Да кулацкіх гаспадарак улады адносілі таксама ўсе сем'і былых служачых «самаховы» і Арміі Краёвай.

Кулацкія гаспадаркі абкладаліся павышанай стаўкай сельгаспадатку (75—100% ад даходу). Ім таксама даводзіўся павышаны план лесанарыхтовак (у 3—5 разоў вышэйшы, чым іншым гаспадаркам). Узрост не з'яўляўся падставай для змякчэння заданняў ці пакарання за іх невыкананне. За зрыў планаў лесанарыхтовак або за нявыплачаны сельгаспадатак заводзілася судовая справа. Людзі пазбаўляліся волі з канфіскацыяй усёй маёмасці і потым іх яшчэ каралі высылкай на некалькі гадоў і трохгадовым пазбаўленнем правоў, у тым ліку і права на пенсію. Так, напрыклад, былі засуджаны Дзмітрый Марціпавіч Багачоў з в. Ляды 1-я, Сяргей Ціхапавіч Кушнер з в. Каралёва за нявыплату сельгаспадатку за 1948 г., Баляслаў Ігнатавіч Зубко з в. Баяры за нявыплату сельгаспадатку за 1949 г., Уладзімір Васільевіч Кліманскі з в. Пашкі за невыкананне дзяржпаставак, і яго дачка Валянціна Уладзіміраўна Кліманская — за невыкананне плана лесавывазак.

Да 1949 г. жорсткія меры пакарання выкарыстоўваліся адносна рэдка. Масавыя судовыя працэсы паступілі з пачаткам калектывізацыі. Часта ўся маёмасць асуджанага не пакрывала нядоімку па падатку. Напрыклад, 17 верасня 1948 г. была апісана маёмасць так званага кулака Бенядзікта Бярнардавіча Басікірскага з в. Качаны за нявыплату падатку за 1948 г. (нядоімка ў суме 6524 руб. 70 кап.). Усяго было апісана маёмасці на суму 4960 руб. Маёмасць ацэньвалася камісіяй па вельмі заніжаных цэнах, таму рэалізаванай маёмасці не хапала, каб пакрыць суму падатку і нядоімкі. Сям'я Б.Б.Басікірскага, жонка Алена, н. у 1915, сыны Багдан, н. у 1943, Анатоль, н. у 1945 г., была асуджана народным судом Шаркаўшчынскага раёна на 6 гадоў.

Праўда, пазней вышэйстаячымі арганізацыямі гэта рашэнне было адменена. Але ж гаспадарка, па сутнасці, была разгрублена, а людзям нанесены матэрыяльны і маральны ўрон.

Большасць скаргаў пакрыўджаных сялян — не была задаволена. Разарэнне іх гаспадарак працягвалася. Полацкі абласны суд рэгулярна адхіляў касацыйныя скаргі асуджаных «ворагаў народа». Сем'і, з якіх у турму трапілі муж, а потым жонка за адно і тое ж «злачынства», не былі рэдкасцю ў нашым раёне. Не дзіўна, што сяляне, якія трапілі ў лік кулакоў, шукалі ратавання ў суседніх Літве і Латвіі, дзе законы не былі такія жорсткія. Многія хаваліся ў родзічаў ці знаёмых у суседніх раёнах, каб бліжэй быць ад дому і час ад часу мець магчымасць тайна наведваць сваю хату, калі яна яшчэ не была прададзена.

7 красавіка 1952 г. была прынята пастанова Савета Міністраў БССР № 436 аб высылцы кулакоў за межы Беларусі ў «аддаленыя раёны краіны».

Жменька збожжа, вядро бульбы, прынесеныя дадому з калгаснага поля, каб накарміць дзяцей, лічыліся «крадзяжом дзяржаўнай маёмасці», за што, паводле Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 1947 г., прадугледжвалася пазбаўленне волі на тэрмін ад 3 да 10 гадоў.

Дзесяткі моцных, працавітых гаспадароў, якія маглі б карміць свае сем'і і краіну, былі раскулачаны, асуджаны, вывезены і больш, як правіла, не вярнуліся ні ў родныя мясціны, ні да працы на зямлі.

К.Л.Кожан, У.К.Ляскоўкі.

Ураджэнцы і жыхары Шаркаўшчынскага раёна, якія падверглісь палітычным рэпрэсіям у 1944—1950-я гады і пазней былі рэабілітаваны

БЕЙНАРОВІЧ Віктар Антонавіч, н. у в. Важы, працаваў на свае́й гаспадарцы. Арыштаваны 29.12.1944. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Памёр 19.6.1947. Рэабілітаваны пасмяротна.

ВАЙТКЕВІЧ Віктар Антонавіч, н. у 1895 у Латвіі, жыў на хут. Фралова, шавец-саматужнік. Арыштаваны 29.12.1944. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.12.1992.

ГАДУЦЭВІЧ Антон Вікенцьевіч, н. у 1899 у в. Гулаты, селянін. Арыштаваны 29.12.1944. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.12.1989.

ЕЎДАКІМАЎ Фёдар Варсанофавіч, н. у 1922 у в. Валожанкі, пісар у будбатальёне. Арыштаваны 15.3.1947. Асуджаны на 7 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 14.10.1966.

ЕЎДАКІМАЎ Цярэнцій Васільевіч, н. у в. Вя-

лікае Сяло, навучэнец Глыбоцкага педвучылішча. Арыштаваны 10.2.1947. Асуджаны на 25 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 20.11.1992.

ЗУБОВІЧ Антон Восіпавіч, н. у 1890 у в. Палялсёлкі, працаваў святаром у Мінскай вобласці. Арыштаваны 14.7.1945. Асуджаны на 7 гадоў ППЛ і 4 гады пазбаўлення правоў. Знаходзіўся ў Іркуцкай вобласці. Рэабілітаваны 16.2.1990.

КЛІМАНСКІ Гардзей Уладзіміравіч, н. у 1928 в. Пашкі, навучэнец педвучылішча. Арыштаваны 10.3.1947. Асуджаны 16.6.1947. Рэабілітаваны 29.11.1991.

ЛАГУНЕНАК Валянцін Віктаравіч, н. у 1925 у в. Вялікас Сяло, навучэнец Пастаўскага педвучылішча. Арыштаваны 15.2.1947. Асуджаны на 25 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.10.1992.

ЛАТЫШОНАК Андрэй Мікалаевіч, н. у в. Маркі, працаваў сакратаром Ручайскага сельсавета. Арыштаваны 30.12.1944. Асуджаны на 5 гадоў ППЛ, знаходзіўся спачатку ў лагеры, а потым у доме інвалідаў. Рэабілітаваны 24.12.1992.

МАРОЗАЎ Сава Фёдаравіч, н. у 1894 у в. Марціняты, працаваў настаўнікам у Тадулінскай школе. Арыштаваны 29.12.1944, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.8.1956.

МІЛЕЎСКАЯ Ганна Казіміраўна, н. у 1889, працавала на сваёй гаспадарцы ў в. Лонск. Арыштавана 30.12.1944. Выселена на Поўнач. Вызвалена.

МЫШКО Афанасій Васільевіч, н. у 1892 у в. Корніца, працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 29.12.1944, асуджаны на 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.11.1992.

НЕДЗВЕДЗЬ Антон Пятровіч, н. у 1915 у в. Семянішкі, працаваў рабочым у г.п. Шаркаўшчына. Арыштаваны 31.12.1944. Асуджаны на 7 гадоў ППЛ. Знаходзіўся ў Пячорлагу, 18.9.1948 перададзены ў Польшчу. Рэабілітаваны 18.10.1989.

НЕСЦЯРОВІЧ Лідзія Восіпаўна, н. у 1928 на хут. Стафанполле, пражывала ў в. Буды, вучаніца 10-га класа Глыбоцкай сярэдняй школы. Арыштавана 10.3.1947. Асуджана на 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітавана 30.10.1992.

ПАЛЯГОШКА Валянціна Восіпаўна, н. у 1909 у в. Антанова, пражывала ў в. Высокае. Арыштавана 25.7.1950. Асуджана на 5 гадоў ППЛ. Знаходзілася ў Брацку ў Азерным лагеры. Рэабілітавана 18.11.1992.

СЕДЗЮКЕВІЧ Алена Восіпаўна, н. у 1910 у в. Вытаркі, працавала на сваёй гаспадарцы ў вёсках Радзюкі і Бусўшчына. Арыштавана 15.5.1945. Асуджана на 5 гадоў высылкі ў Краснаярскі край з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітавана 10.9.1990.

ЦЯРЭШКА Баляслаў Ігнатавіч, н. у 1896 у в. Баяры, шавец. Арыштаваны 25.6.1949. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Вызвалены 8.9.1956. Рэабілітаваны.

ШАБЛОЎСКІ Леў Міхайлавіч, н. у 1925 у м. Шаркаўшчына. Ваеннаслужачы, радавы 58-га вучэбнага палка 47-й стралковай дывізіі. Арыштаваны 13.10.1947. Асуджаны на 3 гады ППЛ. Рэабілітаваны 22.9.1992.

ШЭЎЧЫК Міхаіл Вікенцьевіч, н. у 1930 у в. Забор'е, селянін, працаваў на сваёй гаспадарцы. Арыштаваны 18.1.1946. Асуджаны на 6 гадоў ППЛ. Знаходзіўся ў Варкутлагу. Вызвалены 23.10.1950. Рэабілітаваны 17.11.1961.

Даныя ўзяты з картатэкі Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

Падрыхтаваў У.К.Ляскоўскі.

* * *

БІЛЬДЗЮЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КУБЕЛЕЎШЧЫНА

МІШТОЎТ Ігнат Герасімавіч, н. у 1929, каваль калгаса «Маладая гвардыя». Арыштаваны 25.8.1950, зняволенне адбываў да 3.8.1955. Рэабілітаваны 22.3.1993.

ГЕРМАНАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГЕРМАНАВІЧЫ

КАСЕВІЧ Іван Францавіч, н. у 1919. Арыштаваны 26.2.1949, асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 14.5.1986.

ВЁСКА ЛЯСКОВА

КРАСОЎСКІ Людвіг Георгіевіч, н. у 1920. Арыштаваны 11.10.1944. Асуджаны на 15 гадоў ППЛ. Вызвалены 27.8.1955. Рэабілітаваны 19.4.1982.

ВЁСКА ЮЗАФОВА

ЦЯРЭШКА Станіслаў Баляслававіч, н. у 1926. Арыштаваны 21.6.1949. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Вызвалены 14.7.1956. Рэабілітаваны 8.9.1956.

ЛУЖКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГАРАДЗЕЦ

РУДАК Антон Восіпавіч, н. у 1904, селянін-аднаасобнік. Арыштаваны 5.6.1950. Асуджаны на 25 гадоў пазбаўлення волі. Вызвалены 23.11.1955. Рэабілітаваны 27.5.1993.

ВЁСКА ЛУЖКІ

КОНАН Мікалай Уладзіміравіч, н. у 1929. Асуджаны 15.7.1948 на 10 гадоў пазбаўлення волі. Вызвалены 4.8.1955. Рэабілітаваны 17.8.1992.

МУЛЯРОНАК Валянцін Антонавіч, н. у 1930, сталяр-саматужнік. Арыштаваны 13.5.1950. Асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі. Вызвалены 21.1.1955. Рэабілітаваны 14.9.1992.

САВІК Станіслаў Восіпавіч, н. у 1928. Арыштаваны 29.4.1948. Зняволенне адбываў у ППЛ на Поўначы. Вызвалены 22.5.1954. Рэабілітаваны 11.3.1990.

САСНОЎСКІ Георгій Восіпавіч, н. у 1923. Арыштаваны 29.9.1947. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Вызвалены 6.10.1954. Рэабілітаваны 17.11.1995.

ВЁСКА ЛУЧАЙКА

КРЫЎКА Ігнат Вікенцьевіч, н. у 1908. Арыштаваны 3.3.1950. Асуджаны да пазбаўлення волі ў ППЛ. Вызвалены 29.2.1956. Рэабілітаваны 29.2.1956.

РУЧАЙСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАТЫ

МАЛЯЎКА Мікалай Юльянавіч, арыштаваны 21.9.1950, асуджаны. Зняволенне адбываў у турме № 1 г. Маладзечна. Вызвалены 6.4.1955. Рэабілітаваны 17.1.1956.

ВЁСКА КАЎШЭЛЕВА

ЛЯСКОЎСКАЯ Ганна Андрэеўна, н. у 1902, калгасніца. Арыштавана 29.8.1950. Вызвалена 5.4.1955. Рэабілітавана 17.5.1993.

ВЁСКА ПІЛАТЫ

МАЛЯЎКА Антаніна Антонаўна, н. у 1912. Арыштавана 10.10.1950. Вызвалена 6.4.1955. Рэабілітавана 12.2.1993.

МАЛЯЎКА Расціслаў Юльянавіч, н. у 1935, калгаснік. Арыштаваны 21.9.1950. Асуджаны на 10 гадоў ППЛ. Вызвалены 28.7.1954. Рэабілітаваны 18.8.1992.

СТАНІСЛАВОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЛАШКІ

РАЙЧОНАК Алег Пятровіч, н. у 1936. Арыштаваны 18.4.1951. Асуджаны на высылку ў Сібір. Вызвалены 19.6.1958. Рэабілітаваны 8.12.1965.

РАЙЧОНАК Ганна Міхайлаўна, н. у 1902. Арыштавана 18.4.1951. Асуджана на высылку ў Іркуцкую вобласць. Вызвалена 9.6.1958. Рэабілітавана 19.5.1958.

РАЙЧОНАК Павел Пятровіч, н. у 1935. Арыштаваны 18.4.1951. Асуджаны на высылку ў Сібір. Вызвалены 9.6.1958. Рэабілітаваны 8.12.1965.

РАЙЧОНАК Пётр Максімавіч, н. у 1902. Арыштаваны. Асуджаны на высылку ў Сібір 18.8.1951. Рэабілітаваны.

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК ШАРКАЎШЧЫНА

БУРЭЛЬ Антон Вікенцьевіч, н. у 1922. Арыштаваны 14.1.1948. Асуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 26.11.1993.

ЗАБЕЛА Мікалай Аркадзьевіч, н. у 1926, вайнаслужачы. Арыштаваны 22.6.1949. Асуджаны да турэмнага зняволення. Знаходзіўся ў турме № 17 Усходне-Казахстанскай вобласці. Вызвалены 13.10.1955. Рэабілітаваны 28.6.1956.

ПУКА Пётр Ігнатавіч, н. у 1924, чырвонаармеец 58-га вучэбна-стралковага палка 47-й вучэбна-стралковай дывізіі. Арыштаваны 5.9.1944. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 17.3.1992.

ПЯТРОВІЧ (ВЫЖЫКОЎСКАЯ) Акуланія Восіпаўна, н. у 1930, калгасніца. Арыштавана 6.6.1951. Асуджана на 8 гадоў пазбаўлення волі. Знаходзілася ў Самарскай вобласці. Вызвалена 25.2.1955. Рэабілітавана 29.6.1992.

ПЯТРОВІЧ Марыя Восіпаўна, н. у 1928. Асуджана 11.7.1951 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалена 11.7.1955. Рэабілітавана 22.5.1992.

Падрыхтавала Л.М.Лабачэўская.

Жыхары Шаркаўшчынскага раёна, асуджаныя ваенным трыбуналам войскаў МУС Полацкай вобласці, гаспадаркі якіх былі аднесены да кулацкіх (1948—1951)

АДЗІНЕЦ Уладзімір Адамавіч, в. Рэчкі.
АЛЯХНОВІЧ Антон Антонавіч, в. Радзькі.
АНДЗІЛЕЎКА Іван Рыгоравіч, в. Вялікае Сяло.
АПАЛЬКА Іван Ларывонавіч.
АЎСЮКОЎ Васіль Ціханавіч, в. Нізіна.
БАГАЧОЎ Дзмітрый Марцінавіч, в. Ляды.
БАГОВІЧ Браніслава Аўгусцінаўна, в. Малыя Азеркі.
БАЛТОЎСКІ Мікалай Іванавіч, в. Гарбуны.
БАРШЧЭЎСКІ Мікалай Анатольевіч, в. Сямёнавічы.
БОНДАР Аляксандр Рыгоравіч, в. Балбекі.
БОНДАР Васіль Емяльянавіч, в. Балбекі.
БРУЙКА Леанід Іпалітавіч, в. Папкі.
БРУЙКА Павел Герасімавіч, в. Папкі.
БУЙКА Міхаіл Міхайлавіч, в. Астраўляне.
ВАШТАЁНАК Аляксей Аляксандравіч, в. Малонка Казлоўская.
ВОЙТАЎ Васіль Рыгоравіч, в. Пукі.
ВЯЗІЦКІ Міхаіл Мікалаевіч, в. Папкі.
ВЯСНА Антон Сцяпанавіч, в. Шылкі.
ВЯСНА Сцяпан Сцяпанавіч, в. Шылкі.
ГАЎРУТА Восіп Адамавіч.
ГІМБАР Мікалай Купрыянавіч, в. Пятровічы.
ГЛУШОНАК Ніканор Пятровіч, в. Балбекі.
ГРАБОЎСКІ Іван Іванавіч, м. Германавічы.
ГРАНОЎСКІ Мікалай Аляксеевіч, в. Кантора.
ГРЫГАРОВІЧ Антон Фёдаравіч, в. Папкі.
ГУГНАРОВА Еўдакія Іванаўна.
ДАЛЕЦКІ Мікалай Сямёнавіч, в. Сасноўцы.

ДАРГЕЛЬ Марыя Іванаўна, в. Пушалаты.
ДЗЕМІДЗЕНКА Васіль Ігнатавіч.
ДЗЯМІДКА Піліп Вікенцьевіч, в. Рыссвічы.
ДЗЯНІСАЎ Іван Самсонавіч, в. Пукі.
ДУЛІНЕЦ Антон Васільевіч, в. Дуліна.
ЕЎДАКІМАЎ Іван Фядосавіч, в. Зарэчча.
ЕЎДАКІМАЎ Мацвей Сямёнавіч, в. Вялікае Сяло.
ЖУК Іван Вікенцьевіч.
ЗАБЕЛА Мікалай Аркадзьевіч, в. Маркі.
ЗНОРКА Леанід Сямёнавіч, в. Навасёлкі.
ЗУБКО Алена Тамашаўна, в. Малыя Азеркі.
ЗУБОВІЧ Мікалай Васільевіч, в. Малонка Казлоўская.
ЗУЙ Канстанцін Вікенцьевіч, в. Боўкалы.
ЗУЙ Сямён Пятровіч, в. Боўкалы.
ІВАНОЎ Арсен Дзмітрыевіч, в. Шкялі.
ІВАНОЎ Лявон Яўлампавіч, в. Рускае Бясснас.
ІВАНОЎ Пётр Цімафеевіч, в. Рускае Бясснас.
ІВАНОЎ Цімафей Няфёдавіч, в. Залессе.
КАВАЛЁНАК Станіслаў Станіслававіч, в. Сталіца.
КАЗАК Антон Міхайлавіч, в. Пішчалёўка.
КАЗАК Канстанцін Сцяпанавіч, м. Германавічы.
КАЗЛОЎСКАЯ Галіна Альфонсаўна, в. Усполіўшчына.
КАЗЛОЎСКАЯ Леакадзія Альфонсаўна, в. Усполіўшчына.
КАСЦЮКЕВІЧ Аркадзь Ксенафонтавіч, в. Казакі.
КАТОВІЧ Восіп Восіпавіч, в. Жукі Ложныя.
КАТОВІЧ Восіп Іванавіч, в. Жукі Ложныя.
КАТОВІЧ Іван Адольфавіч, в. Глінаўка.
КАТОВІЧ Канстанцін Канстанцінавіч, в. Багута.
КАТОВІЧ Канстанцін Юльянавіч, в. Багута.
КАТОВІЧ Уладзімір Піліпавіч, в. Багута.
КАЧАН Аляксандр Іванавіч, в. Жукі Горныя.
КОЖАН Аркадзь Францавіч, в. Балбекі.
КОЖАН Іван Кліменцьевіч, в. Зачысцікі.
КЛІМЗА Іван Мікалаевіч, в. Пестуны.
КРУКОЎСКІ Уладзімір Лявонцьевіч, в. Багі.
КРУПКО Пётр Ягоравіч, в. Пялікі.
КРЭМІС Уладзімір Андрэевіч.
КУКУЦЬ Таццяна Восіпаўна, в. Бслазоры.
КУРЫЛОВІЧ Канстанцін Станіслававіч, в. Курылавічы.
КУШНЕР Восіп Сяргеевіч, в. Каралёва.
ЛАБУЦЬ Ізот Аляксандравіч, в. Васюкі.
ЛАГУН Адам Юльянавіч, в. Баяры 2-я.
ЛАГУН Альфрэда Францаўна, в. Мікіцснкі 1-я.
ЛАГУН Іван Аляксандравіч, в. Стрэліца.
ЛАГУНЁНАК Аляксандр Іванавіч, в. Зачысцікі.
ЛАГУНЁНАК Васіль Уладзіміравіч, в. Зачысцікі.
ЛАГУНЁНАК Вера Ігнатаўна, в. Бондары Тулаўскія.
ЛАГУНЁНАК Вячаслаў Іванавіч, в. Падолле.
ЛАГУНЁНАК Ганна Восіпаўна, в. Балбекі.
ЛАГУНЁНАК Іван Міхайлавіч, в. Балбекі.
ЛАГУНЁНАК Пётр Іларыёнавіч, в. Бахіры.
ЛАСТАЎКА Іван Іванавіч, в. Жукі Ложныя.
ЛАСТАЎКА Пётр Восіпавіч, в. Жукі Ложныя.
ЛАТЫШОНАК Аляксандр Рыгоравіч, в. Паянычы.
ЛАТЫШОНАК Уладзімір Іванавіч, в. Малонка Казлоўская.
ЛАЎРЫНОВІЧ Павел Фадзеевіч, в. Прошкі.
ЛІЗУНОЎ Міхаіл Феакціставіч, в. Залессе.
ЛІПСКАЯ Марыя Максімаўна, м. Старая Шаркаўшчына.
ЛЫСЁНАК Арсен Андрэевіч, в. Лукашоўка.
ЛЯСНЕЎСКІ Фама Мікалаевіч, в. Снегі.
МАЛЯЎКА Павел Юльянавіч, в. Пілаты.
МАЛЯЎКА Расціслаў Юльянавіч, в. Пілаты.
МАРОЗАВА Паўліна Паўлаўна.
МАРОЗАЎ Васіль Купрыянавіч.
МАСКАЛЁНАК Антаніна Андрэеўна.
МІСЬКО Павел Восіпавіч, м. Шаркаўшчына.
МІХАЙЛАЎ Купрыян Савельевіч, в. Гальяшоўка.
МЫШКО Ганна Апанасаўна, в. Крыніца.
МЯДЗВЕДСКАЯ Ганна Лявонаўна, в. Бслазоры.
МЯДЗВЕДСКІ Зянон Адамавіч, в. Снегі.
МЯДЗЕЛЕЦ Альберт Аляксандравіч, в. Навасельцы.
МЯДЗЕЛЕЦ Марцін Іванавіч, м. Германавічы.
МЯДЗЮХА Расціслаў Аркадзьевіч, в. Лабуці.
МЯДЗЮХА Фёдар Антонавіч, в. Зямцы.
НЕМЧАНКА Маўра Сямёнаўна, в. Краснае.
НІКАЛАЕЎ Нічыпар Васільевіч, м. Германавічы.
ПАВІНІЧ Валянціна Аляксееўна, в. Кукаўка.
ПАВІНІЧ Марыя Аляксееўна, в. Кукаўка.
ПАЛЯГОШКА Сяргей Кандрацьевіч, в. Высокае.
ПРОНЬКА Іван Сцяпанавіч, в. Азэта.
ПРЫСТАЎКА Вячаслаў Мікалаевіч, в. Дубавое.
ПРЫСТАЎКА Генадзь Андрэевіч, в. Рацькі.
ПУГАЎКА Ювеналій Адольфавіч, в. Падрэчкі.
ПЯТКУН Павел Паўлавіч, в. Маёраўцы.
ПЯЦЬКО Аляксей Іванавіч, в. Ліпава.
ПЯЧОНКА Генадзь Аляксандравіч, в. Багута.
ПЯЧОНКА Канстанцін Рыгоравіч, в. Багута.
РАБІЗА Анатоль Адамавіч, в. Пашкі.
РАДЗІШЭЎСКІ Казімір Антонавіч, м. Шаркаўшчына.
РАЙЧОНАК Лявон Антонавіч.
РУБНІКОВІЧ Вацлаў Валяр'янавіч, в. Бяляны.
РЫБНІКАЎ Агей Трафімавіч, в. Дубавое.
РЫМДЗЁНАК Васіль Адамавіч, в. Балбекі.
РЫМДЗЁНАК Марыя Адамаўна, в. Балбекі.
РЫМДЗЁНАК Сяргей Аляксандравіч, в. Пашкі.
РЫМШОНАК Станіслаў Канстанцінавіч, в. Альхоўцы.
РЫМШОНАК Яўген Канстанцінавіч, в. Альхоўцы.
РЫНКЕВІЧ Ванда Францаўна, в. Бардзенцы.
РЫНКЕВІЧ Восіп Фермантавіч, в. Бардзенцы.
РЭДЗЬКА Восіп Усцінавіч, в. Буды.

САПОНЬКА Міхаіл Дзмітрыевіч, в. Вялікае Сяло.
СВЯЦКІ Іван Васільевіч, в. Аўдзсічыкі.
СІДАРАЎ Васіль Іванавіч, в. Шкялі.
СІДАРАЎ Ігнат Іванавіч, в. Маскалюкі.
СІКОРА Іван Аляксандравіч, в. Асіннікі.
СТАНКЕВІЧ Адольф Адольфавіч, в. Агаполь.
СТАНКЕВІЧ Мар'ян Адольфавіч, в. Агаполь.
СТРЫЁНАК Дзмітрый Сцяпанавіч, в. Пятровічы.
СТРЫЁНАК Уладзімір Мікалаевіч, в. Пятровічы.
СЯМЁНАЎ Іван Агур'янавіч, в. Варонка.
СЯМЁНАВА Палінарыя Сямёнаўна, в. Семянішкі.
ТАБОЛА Віктар Аляксандравіч, в. Бруйкі.
ТАРАРАКА Валерый Восіпавіч, в. Грыгараўшчына.
ТАРАРАКА Рыгор Іванавіч, в. Грыгараўшчына.
ТАРАРАКА Юльян Юльянавіч, в. Грыгараўшчына.
ТАТАРОВІЧ Серафім Сямёнавіч, в. Малонка Казлоўская.
ТАТЫРЖА Аляксандр Мікалаевіч, в. Кантора.
ТРАБА Восіп Антонавіч, в. Дубнікі.
ТРАПАЧКА Алег Аляксандравіч, в. Шкунцікі.
ФЁДАРАЎ Пётр Нічыпаравіч, в. Тулава.
ФЁДАРАВА Алена Аляксееўна, м. Германавічы.
ХАДАНЁНАК Восіп Ягоравіч, в. Альхоўцы.
ХАДАНЁНАК Леанід Андрэевіч, в. Казакі.
ХАДАНЁНАК Міхаіл Венядзіктавіч, в. Альхоўцы.
ХАДАНЁНАК Уладзімір Канстанцінавіч, в. Александрова.
ХАДАНЁНАК Усцін Міхайлавіч, в. Альхоўцы.
ХАДАНЁНАК Ягор Францавіч, в. Альхоўцы.
ХАТКЕВІЧ Андрэй Лявонавіч, в. Прамяны.
ЦВЯТКОЎ Дзяменцій Альфёравіч, в. Зябліны.
ЦІТОВІЧ Яфім Піліпавіч, в. Астраўляне.
ЦЯЛЕЖНІКАЎ Міхаіл Малафеевіч.
ЦЯРЭШКА Лідзія Сямёнаўна, в. Сталіца.
ШАТЫБЕЛКА Іпаліт Аўгусцінавіч, в. Бяседнае.
ШАТЫБЕЛКА Усцін Вікенцьевіч, в. Сутоцкія.
ШКУНЦІК Вячаслаў Сямёнавіч, в. Бахіры.
ШУДЗЕЛЬ Уладзімір Віктаравіч, в. Багута.
ШЫШКО Юстын Францавіч, в. Шышкі.
ЮРКЕВІЧ Юзэфа Вікенцьеўна, в. Савуткі.
ЯКІМОВІЧ Аляксандр Мікалаевіч, в. Клушына.
ЯКІМОВІЧ Уладзімір Мікалаевіч, м. Шаркаўшчына.
ЯКУБЧОНАК Сяргей Іванавіч, в. Вялікае Сяло.

Зацальны дзяржаўны архіў у г. Глыбокае. Ф. 1998. Воп. 2л. Спр. 39—53.

Падрыхтаваў К.А.Кожан.

Дакументы сведчаць

ЗВЕСТКІ АБ КОЛЬКАСЦІ І КОШЦЕ МАЁМАСЦІ, ПАКІНУТАЙ ГРАМАДЗЯНАМІ, ЯКІМ УЛАДЫ ДАЗВОЛІЛІ ВЫЕХАЦЬ У ПОЛЬШЧУ

	Кол.	Кубатура	Сумма	Исправ. фин. орг.
1. Жилые дома	64	12 769	160 091	—
2. Сени	19	1065	8507	—
3. Гумна	65	17 061	74 576	40 576
4. Сараи	56	7449	41 255	100 225
5. Амбары	20	1530	12 550	20 550
6. Погреба и ледники	5	57	1032	—
7. Склады	8	449	2210	—
8. Пристройки	10	357	2401	—
9. Навесы	12	1204	6870	10 870
10. Бани	13	608	4904	8904
11. Стройматериалы	—	252	1573	—
12. Прочие строения	7	296	4294	43967
Итого:	279	—	321 263	400 363

Посевы:
1. Рожь — 25,90
2. Яровые — 19,19
3. Картофель — 3,26
4. Технические — 1,75
5. Бобовые — 1,72
6. Травы — 4,86
7. Прочие посевы — 3,64

Итого: 56,32

Зав. райфо Прокопенко

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 1657. Воп. 1. Спр. 05—3. Л. 16.

РАШЭННЕ ВЫКАНКОМА ШАРКАЎШЧЫНСКАГА РАЙСАВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ АБ ВЫКАРЫСТАННІ БЫЛЫХ ПАНСКІХ ДВАРОЎ

6 красавіка 1947 г.

1. Дома в бывшем имении Радюки (Зеленая Лонка, Хвастово, Антоново, Козяриха, Савицкие, Ясево) в количестве 20 штук на сумму 26 919 рублей продать совхозу Шарковщинского района согласно прилагаемого акта...

2. Хозяйственные постройки находящиеся в этих имениях передать безвозмездно животноводческому совхозу и предложить директору указанные постройки на общую сумму 17 575 рублей взять на баланс совхоза.

3. Предложить директору совхоза тов. Сахно добиться перед обл. трестом совхоза по Полоцкой области отпуска средств для оплаты по предъявленному счету.

Пред. исполкома Клопов

И.о. секретаря Петько

Занальны дзяржаўны архіў у г. Глыбокае. Ф. 1657. Воп. 1. Спр. 05—3. Л. 17.

З МАТЭРЫЯЛАЎ СПРАВЫ УЛАДЗІМІРА ВОСІПАВІЧА КУРЫЛОВІЧА, ЖЫХАРА ВЁСКІ АЗЭТА

ВЫПІСКА З РАШЭННЯ ВЫКАНКОМА ШАРКАЎШЧЫНСКАГА РАЙСАВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

16 верасня 1947 г.

Слушали: Председателя Ручейского с/сов. т. Райченок об утверждении кулацким хозяйство Куриловича Владимира Иосифовича, прож. д. Азэта Ручейского с/с Шарковщинского района.

Исполком райсовета депутатов трудящихся

Решил:

1. Руководствуясь признаком по определению кулацких хозяйств, указанных в постановлении Совета Министров БССР от 6 сентября 1947 г. № 1200 «О налоговом обложении кулацких хозяйств западных областей БССР», отнести хозяйство Куриловича В.И. к кулацким хозяйствам, ежегодно пользуется сезонными работниками, во время уборки урожая 1947 г. работало пять женщин, которым уплачивал за один рабочий день 8 кг ржи, а также имеет пастуха, которому уплачивает два пуда ржи.

Председатель Исколкома Шарковщинского райсовета депутатов трудящихся С.Клопов

Секратерь исполкома Шарковщинского райсовета депутатов трудящихся

* * *

Семья: Курилович Владимир Иосифович, глава, 1895 г.

Курилович Анна Васильевна, жена 1897 г.

Курилович Лариса Владимировна, дочь, 1931 г.

Площадь земли: пашни 14 га, огорода 0,10, сада 0,05 га, луга 0,10 га. Лошадь — 1, молодняк — 1, коров — 2, молодняк — 2, овец — 10, в т.ч. перезимовавших 4, свиней 2. Имеет конную молотилку. Имел наемных 2 женщины, 4 дня по 16 кг зерна за день. Сын Курилович Геннадий был в самоохове, бежал с немцами...

ВЫКАНАЎЧЫ ЛІСТ НАРОДНАГА СУДА 1948 г.

Именем Белорусской Советской Социалистической Республики Народный суд Шарковщинского района Полоцкой области рассмотрев 23 сентября 1948 г. в м. Шарковщина дело по иску Райфинотдела к Куриловичу Владимиру Иосифовичу о взыскании сельхозналога

Решил:

Взыскать с Куриловича В.И. недоимку по сельхозналогу в сумме 5259 р. 60 к. Взыскание обратить на описанное имущество Куриловича В.И.

АКТ РЭАЛІЗАЦЫІ КАНФІСКАВАНАЙ МАЁМАСЦІ

1 кастрычніка 1948 г.

Изъято у недоимщика Куриловича В.И. 1 шкаф на 2 дверки, цвет красный 250 р.

РАХУНАК КАЛГАСУ «1 МАЯ» СЛАБОДСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

2 кастрычніка 1948 г.

Шарковщинский райфинотдел предлагает Вам внести сумму в Госбанк за реализованное имущество, взятое по решению нарсуда за неуплату сельхозналога: лошадь гнедая — 2000, 2 овцы старые и одна молодая — 300 р., корова рябая — 1000 руб.

Зав. Райфо Прокопенко

Ст. н/инспектор Шкунтик Ю.Ю.

АКТ ВОПІСУ МАЁМАСЦІ

4 лістапада 1948 г.

Описано сарай, хлев, амбар, сено, солома, сани, сечкарня, стол желтый, канапа деревяная, зеркало в черной оправе — на сумму 4105 р.

Не включено в опись: дом, сени, варовня, сена 1 т, стол один, лавки 3.

З АКТА РЭАЛІЗАЦЫІ КАНФІСКАВАНАЙ МАЁМАСЦІ

1 ліпеня 1949 г.

...реализованы: сарай 1 — 1000 р., амбар 1 — 400 р.

З ВЫКАНАЎЧАГА ЛІСТА НАРСУДА ДА КУРЫЛОВІЧА У.І.

26 кастрычніка 1949 г.

Взыскать 11 990 руб...

З АКТА РЭАЛІЗАЦЫІ КАНФІСКАВАНАЙ МАЁМАСЦІ

4 лістапада 1949 г.

...реализованы: хлев, амбар, сарай — на сумму 2200 руб.

З АКТА АБ СПАГНАННІ НЯДОІМКІ З КУРЫЛОВІЧА У.І. ЗА 1948—1951 гг. У ПАМЕРЫ 18 775 РУБ.

12 верасня 1951 г.

Имущество реализовано на погашение недоимки. Жена и дочь с 1948 года проживают в д. Лесково Дисненского района, налогом не облагались. В настоящее время объектов обложения не имеется, так как хозяйство полностью ликвидировано.

Зав. райфо И.Чудовский

Занальны дзяржаўны архіў у г. Глыбокае. Ф. 1998. Воп. 2. Спр. 17. Л. 1—2; Спр. 140. Л. 11, 16, 18, 21; Спр. 120. Л. 23, 25, 28, 30, 32.

ЗАЯВА ЖЫХАРА ВЁСКІ АЎДЗЕЙЧЫКІ СЛАБОДСКАГА СЕЛЬСАВЕТА ІВАНА ВАСІЛЬЕВІЧА СВЯЦКАГА СТАРШЫНІ ШАРКАЎШЧЫНСКАГА РАЙВЫКАНКОМА

5 кастрычніка 1947 г.

Прошу рассмотреть мое заявление и отменить неправильно поданную сельсоветом характеристику хозяйства о зачислении моего хозяйства в категорию кулацких. По моему мнению мое хозяйство не принадлежит к этой категории, оно состоит из 14 1/2 га земли, 1 лошади, 1 коровы, 3-х свиней, 3-х овец и 1 улья пчел. Семейство мое состоит из 3-х душ — я, жена и сын. Мне 58 лет, потерял к тяжелому труду здоровье, о чем прикладываю при сем заявлении справу из комиссии. Жене 68 лет, сыну 17-й год. Из наемной силы содержу пастуха, т к. живу на хуторе. Пастуху 35 лет, он инвалид, Залынский Игнатий Осипович, к тяжелому труду не способен. Ежели райисполком найдет нужным, прошу дать разрешение пропустить его, а также и меня через комиссию ВТЭК. Правда, я прибегаю к наемной силе, но я добросовестно рассчитываю каждого по его соглашению.

Дальше складаю свою автобиографию. Выхожу я из семьи середняка. Нас было четверо детей, я и три сестры. Отец мой имел 14 десятин земли. Тогда мы жили в деревне. Но когда мы выросли, хозяйство свое мы обрабатывали своим трудом, к наемной силе не прибегали. Когда мне исполнилось 20 лет в 1910 году, против отцовской воли я уехал в Ригу, где прожил 2 года. Работал в качестве столяра на литейно-прокатном заводе. Из Риги я переехал в Ленинград и жил там до 1919 года. Работал на заводе Русского Акционерного общества в качестве

столяра, на что имею от завода удостоверение, которое прилагаю при сем. В революцию боролся за Советскую власть, состоя в партии большевиков, ходил в караулы, был три дня на фронте против Корнилова, где был легко ранен в правую ногу. В конце 1918 года я вернулся домой. Вел здесь большевистскую пропаганду, организовал районную кооперацию в 1919 году. Когда пришли поляки в 1920 году, мою кооперацию ликвидировали как большевистскую организацию. Остальное время как при поляках, так и при немцах я в никаких организациях участия не принимал, трудился мирно на своем хозяйстве, что могут подтвердить товарищи Ваштай Михаил Илларионович м. Шарковщизна и Забелло Александр Николаевич из д. Марки, заместитель председателя сельсовета. В заключение прошу райисполком снять с моего хозяйства кулацкую категорию. Я никогда не был кулаком и не буду и не могу морально этого переживать. Я есть честный патриот Советского Союза. В чем и подписываюсь.

Святский

Прошу при рассмотрении моего заявления, разрешить присутствовать мне лично.

Занальны дзяржаўны архіў у г. Глыбокае. Ф. 1998. Воп. 3. Спр. 30. Л. 3–4.

ЗАКЛЮЧЭННЕ ПА ПРАВЕРЦЫ СКАРГІ ГРАМАДЗЯНІНА ІВАНА ВАСІЛЬЕВІЧА СВЯЦКАГА, ПРАЖЫВАЮЧАГА Ў ВЁСЦЫ АЎДЗЕЙЧЫКІ СЛАБОДСКАГА СЕЛЬСАВЕТА ШАРКАЎШЧЫНСКАГА РАЁНА, ПА ПЫТАННІ НЯПРАВІЛЬНАГА АБКЛАДАННЯ ЯГО ГАСПАДАРКІ ЯК КУЛАЦКАЙ

Обследование на месте произведено заведующим Шарковщинским райфинотделом Прокопенко Григорием Севостьяновичем 7 декабря 1948 года.

Проверкой на месте установлено:

1. Состав семьи: Святский Иван Васильевич, глава семьи, 1889 г. рождения.
2. Святская Варвара Семеновна, жена, 1879 г. рождения.
3. Святский Леон Иванович, сын, 1930 г. рождения.

В хозяйстве имеется: земли пахотной 11 га, сенокоса 1 га. Лошадей рабочих – 1, корова – 1, нетель – 1.

Предприятий и промыслов в хозяйстве Святского И.В. не имеется.

Сельхозмашин в хозяйстве не имеется.

Применение наемного труда. В хозяйстве Святского И.В. в качестве постоянного наемного рабочего с 1943 года по 1947 год работал Залынский Игнатий Иосифович, 1908 года рождения, уроженец Ветринского р-на Полоцкой области, который использовался на всех работах. Другой наемной работницей в данном хозяйстве работала Михалева Ольга Филипповна, лет 45–50. Плата за труд определялась продуктами питания и одеждой. За время оккупации хозяйство Святского занималось скупкой и перепродажей разных товаров. Других признаков и особенностей данное хозяйство не имеет.

Выводы: Хозяйство Святского И.В. по признакам систематического использования в своем хозяйстве постоянной наемной силы на основании постановления Совета Министров БССР от 6 сентября 1947 г. к числу кулацких хозяйств отнесено правильно.

Зав. Шарковщинским РАЙФО Прокопенко

Занальны дзяржаўны архіў у г. Глыбокае. Ф. 1998. Воп. 3. Спр. 30. Л. 5.

РАШЭННЕ ВЫКАНКОМА ШАРКАЎШЧЫНСКАГА РАЙСАВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ АБ АДНЯСЕННІ ГАСПАДАРКІ ВАРВАРЫ СЯРГЕЕЎНЫ СВЯЦКАЙ, ЖЫХАРКІ ВЁСКІ АЎДЗЕЙЧЫКІ СЛАБОДСКАГА СЕЛЬСАВЕТА, ДА ЛІКУ КУЛАЦКІХ

Слушали: Председателя Слободского сельсовета тов. Шпак о решении исполкома сельсовета по отнесению хозяйства Святской В.С. к числу кулацких по признакам применения постоянной и сезонной наемной силы. Гражданка Святская В.С. в период с 1946 по 1949 год эксплуатировала двух батраков: Залынского Игнатия Иосифовича 1908 года рождения и Михайлову Ольгу 1905 года рождения. Работали в хозяйстве Святской В.С. на всех сельскохозяйственных работах.

Решил:

1. Утвердить решение исполкома Слободского сельсовета по отнесению хозяйства Святской В.С. к числу кулацких, как соответствующего постановлению Совета Министров БССР № 1200 от 6.IX.1947 г.

2. Предложить райфинотделу начислить сельхозналог на 1949 год на хозяйство Святской В.С. с процентной надбавкой.

Председатель Шарковщинского исполкома райсовета депутатов трудящихся Манкович
Секретарь Баранов

ПРАКУРОРУ ШАРКАЎШЧЫНСКАГА РАЁНА ТАВ. САФРОНАВУ
АД ШАРКАЎШЧЫНСКАГА РАЙФІНАДДЗЕЛА

В соответствии с Постановлением Совета Министров БССР от 6 сентября 1947 г. № 1200 решением исполкома Шарковщинского райсовета депутатов трудящихся от 19.IX.1947 г. хозяйство гражданки Святской Варвары Сергеевны, проживающей в д. Авдейчики Слободского сельсовета, было утверждено кулацким хозяйством. Главой хозяйства в 1947 г. был ее муж Святский Иван Васильевич. В 1949 г. гражданин Святский И.В. осужден и главой хозяйства исполком райсовета депутатов трудящихся своим решением от 8 августа 1949 года утвердил его жену Святскую Варвару Сергеевну.

В 1947 году на основании решения исполкома райсоветав депутатов трудящихся райфинотделом был начислен сельхозналог в сумме 11 221 руб., которые уплатил гражданин Святский И.В. полностью.

В 1948 г. его хозяйству был начислен сельхозналог 17 928 руб., которые также уплатил полностью. В 1949 г. хозяйству гражданки Святской Варвары Сергеевны был начислен сельхозналог 14 675 р. 40 коп. К уплате гражданка Святская В.С. не приступила и скрылась.

Из членов семьи никого не осталось. Из хозяйства ничего не осталось. Таким образом за хозяйством гражданки Святской В.С. до настоящего времени числится недоимки 14 675 р. 40 коп.

Райфинотдел просит прокурора Шарковщинского района тов. Сафронова привлечь гражданку Святскую В.С. к уголовной ответственности за злостное уклонение от уплаты государственных налогов.

Зав. Шарковщинским райфинотделом Гудовский
Старший налоговый инспектор Свиридова

ДАВЕДКА СЛАБОДСКАГА СЕЛЬСАВЕТА АД 13 ЛЮТАГА 1952 г.

Выдана Шарковщинскому райфо в том, что Святский И.В. осуждён за неуплату государственного налога, Святская Варвара Сергеевна сбежала, имущества в её хозяйстве не осталось, за исключением жилого дома и сарая. Наследников оставшегося дома и сарая не осталось.

Председатель Слободского сельсовета
Секратерь

* * *

У характарыстыцы гаспадаркі за 6 жніўня 1949 года ўказана, што галава сям'і Свяцкі Іван Васільевіч асуджаны за невыкананне плана лесавывазу ў 1949 годзе (яму было тады 60 гадоў).

Занальны дзяржаўны архіў у г. Глыбокае. Ф. 1998. Воп. 3. Спр. 30. Л. 7, 11, 23, 27.

Падрыхтаваў К.А.Кожан.

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

Трывожны чэрвень 1941 г.

З першага дня вайны Беларусь стала арэнай вялікіх бітваў. Непасрэдна па яе тэрыторыі наступала буйнейшая нямецкая група армій «Цэнтр» у складзе 4-й і 9-й палявых армій, 2-й і 3-й танкавых груп — усяго 50 дывізій, у тым ліку 15 танкавых і матарызаваных, 2 матарызаваныя брыгады. Яе падтрымліваў 2-і паветраны флот — 1,6 тыс. баявых самалётаў. Нягледзячы на гераічнае супраціўленне байцоў Чырвонай арміі, войскі Заходняга фронту не маглі стрымаць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якія імкліва рваліся на ўсход. Афіцыйна пра пачатак вайны на Шаркаўшчыне стала вядома з выступлення па радыё намесніка старшыні СНК СССР В.М.Молатава 22 чэрвеня 1941 г.

* * *

Была прыгожая, празрыстая чэрвеньская раніца, якія бываюць толькі ў пачатку лета ў нас на Беларусі — росная, свежая і светлая-светлая. Пад адчыненым акном нашага пакоя квітнеў вялізны куст язміну, яго пахам было настоена паветра. Мы з дырэктарам (Германавіцкай школы. — *Склад.*) толькі напіліся чаю.

Раптам з рэпрадуктара на сцяне пачуўся ўсхваляваны голас народнага камісара замежных спраў Молатава, які паведамляў савецкаму народу аб вераломным нападзе фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз.

Пад'язджаючы да Шаркаўшчыны, я пачуў з усходу гучны гул з завываннем самалётных маторaў. Спыніўся пад прыдарожнай бярозай і пачаў, задраўшы галаву, узірацца ў сіняе неба. Хутка нада мною, на невялікай вышыні, пранесліся тры самалёты. Выразна былі відны пад крыламі чорныя крыжы. Я слаба разбіраўся ў той час у самалётах і спачатку падумаў, што гэта нашы лётчыкі спяшаюцца на граніцу, бо ляцелі яны з усходу, і вельмі здзівіўся, калі яны, пралятаючы над чыгуначнай станцыяй у Шаркаўшчыне, пачалі яе бамбіць. Бамбілі нядоўга, скінулі па бомбе і знікли... Бомбы ўпалі крыху лявей чыгункі, на ўскрайку альховага гаю, які чамусьці мястачкоўцы называлі «Звярынцам»... вясрам узнялася высока чорная зямля і апала, заслаўшы наваколле дымам.

Прамова Молатава і тут жа бамбёжка чыгуначнай станцыі ў Шаркаўшчыне выклікалі сярод насельніцтва збянтэжанасць і трывогу. Як патрывожаныя пчолы, загулі людзі. Яны збіраліся групамі і абмяркоўвалі на ўсе лады гэту жахлівую і нечаканую падзею — пачатак вайны.

Пасля паўдня ў гэты ж дзень вялікі абоз нагружаных фурманак рушыў на ўсход. Ад'язджалі сем'і савецкіх служачых. Гэта яшчэ больш устрывожыла мясцовае насельніцтва. Папаўзлі розныя антысавецкія крыватолкі і хлуслівыя меркаванні.

Райваенкомам абвясціў мабілізацыю ў раёне на другі дзень.

Начамі амаль ніхто не спаў. Адчувалася трывога, жах і неспакой. Адных захлынула вялікае гора, другіх — раптоўная радасць, надзея на вызваленне ад бальшавікоў. Пачалі збірацца мабілізаваныя людзі. Зборачным пунктам была прызначана сярэдняя школа, праз дарогу насупраць маёй кватэры. Хутка вялізны двор школы быў набіты людзьмі. Цэлы дзень стаялі яны на санцапёку школьнага двара, чакаючы адпаведнага загаду. І перапачавалі тут, а ніякага загаду не было. Нарэшце пад вечар другога дня нібыта прыйшло распараджэнне распусціць усіх па хатах. Разыходзіліся неахвотна — розныя нядобрыя думкі запалі ў сэрцы людзей. Яшчэ праз ноч эвакуіраваліся ўсе савецкія служачыя — жанчыны і мужчыны сталага ўзросту. З устаноў не было чаго эвакуіраваць, вывезлі толькі банкаўскія справы ды сейфы.

...Я даведаўся, што першы сакратар райкома і амаль усе камуністы раёна, не прызваныя ў Чырвоную армію, застаюцца на месцы для арганізацыі партызанскага руху, што раённыя грузавыя аўтамашыны завозяць у Пілацкі бор і іншыя вялікія лясы зброю і харчовыя прадукты для першых партызанскіх баз.

...Пад'язджаючы да Германавіч, мы ўбачылі ў небе цэлую эскадрылля варожых самалётаў. Яны ляцелі з усходу на невялікай вышыні і вельмі спакойна адчувалі сябе, нібы ў сваім небе. Бамбіць не бамбілі, свой смертаносны груз скінулі недзе раней. Толькі для панікі абстрэльвалі кожную фурманку або статак жывёлы.

У Германавічах каля сельсавета тоўпіўся народ. Гэта былі мясцовыя служачыя або проста актывісты, якія сабраліся сюды з усяго сельсавета шукаць парады, што рабіць далей. Яны не ведалі, на што рашыцца, — уцякаць ад фашыстаў ці заставацца тут. Да дому іх прывязвалі сем'і і такая-сякая гаспадарка, жывёла. Аднак яны ведалі і фашысцкія адносіны да мірнага насельніцтва. Шмат хто з мясцовых жыхароў служыў у польскім войску і бачыў сваімі вачыма драпежніцкія ўчынкі, што тварылі гэтыя нелюдзі над палякамі, як руйнавалі польскія гарады і вёскі.

У Лужках была зусім іншая карціна. Усё мястэчка было забіта вайсковымі фурманкамі і чырвонаармейцамі. Адчувалася ва ўсім мітусня — бегалі камандзіры, пяспышна вялася пераклічка, чуліся паасобныя каманды, а парадку ва ўсім гэтым не вельмі было.

Хадзілі панічныя чуткі, што фашысты занялі Глыбокае і Дзісну. На доўгі час у Лужках ніхто не спыняўся. За вёскай пацягнуўся амаль суцэльны абоз вайскоўцаў з іх гаспадаркай. Ад'ехаўшы кіламстраў дзесяць, вайскоўцы рэзка павярнулі: адны управа, другія — улева...

Друкуецца па кн.: М а ш а р а М. Старонкі летапісу. Мн., 1975.

З успамінаў Ігната Пятровіча Ясінскага, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, жыхара в. Більдзюгі

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна мне было 15 гадоў, на той час я пасвіў сяляпскіх кароў па дагаворным пайме. Трэба было зарабляць на хлеб. Жылі мы ў вёсцы Карчы Мількаўскія — гэта на мяжы Шаркаўшчынскага і Браслаўскага раёнаў. Памятаю той ціхі, цёплы ранак, які абяцаў спякотны, гарачы дзень.

Вестку аб пачатку Вялікай Айчыннай вайны мне прынесла разам з ядой у поле маці. Яна хадзіла на пабажэнства ў касцёл вёскі Барадзінічы Браслаўскага раёна і там пачула, што «немец пайшоў вайной на Савецкі Саюз». Роспач, прадчуванне трывогі і няпэўнасці панавала сярод людзей: што ж будзе далей і як усё будзе?

Запомніліся эпізоды адступлення байцоў Чырвонай арміі, якія невялічкімі групамі ішлі днём і поччу і ўсё дапытваліся ці далёка да Дзвіны.

Адзін выпадак асабліва ўрэзаўся ў памяць. Гэта было на другі дзень вайны. Кароў я ўжо больш не пасвіў, а паколькі меў вольны час, адправіўся ў лес у грыбы. Назбіраў іх шмат: баравікоў, падасінавікаў, лісічак і сыраежак. Прынёс дамоў, разам з маці перабралі, пачысцілі. Маці адварыла іх, прыгатавала грыбны суп у самым вялікім катле, які меўся ў «кухоннам арсенале». Адвячоркам завіталі ў хату адступаючыя байцы, змучаныя, галодныя, чорныя ад поту і пылу: «Хозяюшка, может найдется что-нибудь перекусить?» — запыталі яны. І маці частавала іх грыбным супам. Яны па чарзе заходзілі ў хату. Перадыхнуўшы і шчыра падзякаваўшы за гасціпасць, чырвонаармейцы працягвалі шлях на ўсход.

Немцы ў нашых мясцінах з'явіліся дзесьці па трэці дзень вайны.

Першымі нямецкімі салдатамі, якіх мне давялося ўбачыць, былі дазорныя матацыклісты, якія з закасанымі рукавамі гімнасцёрак і з самаўпэўненымі ўхмылкамі ехалі па дарогах.

Зрэдку можна было бачыць у небе пралятаючыя нямецкія самалёты, якія ішлі звычайна звёнамі па тры, дзевяць. Паветраных баёў над нашай тэрыторыяй я не назіраў.

Бацька мой ледзь не паплаціўся жыццём у перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі за тое, што быў актывістам пасля прыходу бальшавікоў у 1939 г. Застацца жывым дапамог выпадак: калі вялі расстрэльваць, сустрэў знаёмага, які служыў намеснікам каменданта ў Браслаўскай камендатуры і той вызваліў яго.

Кожны дзень акупацыі застаўся ў маёй памяці. Арышты, здзекі, пастаянныя расстрэлы людзей — усё гэта прынеслі ў наш край нямецка-фашысцкія захопнікі.

Дакументы сведчаць

З ПРАМОВЫ ПА РАДЫЁ НАМЕСНІКА СТАРШЫНІ САВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ СССР В.М.МОЛАТАВА АБ НАПАДЗЕ ГІТЛЕРАЎСКАЙ ГЕРМАНІІ НА САВЕЦКІ САЮЗ

22 чэрвеня 1941 г.

Граждане и гражданки Советского Союза!

Советское правительство и его глава тов. Сталин поручили мне сделать следующее заявление:

Сегодня в 4 часа утра, без предъявления каких-либо претензий к Советскому Союзу, без объявления войны, германские войска напали на нашу страну, атаковали наши границы во многих местах и подвергли бомбежке со своих самолетов наши города — Житомир, Киев, Севастополь, Каунас и некоторые другие, причем убито и ранено более двухсот человек. Налеты вражеских самолетов и артиллерийский обстрел были совершены также с румынской и финляндской территорий.

Это неслыханное нападение на нашу страну является беспримерным в истории цивилизованных народов вероломством. Нападение на нашу страну произведено, несмотря на то, что между СССР и Германией заключен договор о ненападении и советское правительство со всей добросовестностью выполняло все условия этого договора. Нападение на нашу страну совершено, несмотря на то, что за все время действия этого договора германское правительство ни разу не могло предъявить ни одной претензии к СССР по выполнению договора. Вся ответственность за это разбойничье нападение на Советский Союз целиком и полностью падает на германских фашистских правителей.

Уже после совершившегося нападения германский посол в Москве Шуленбург в 5 часов 30 минут утра сделал мне, как Народному Комиссару Иностранных Дел, заявление от имени своего правительства о том, что германское правительство решило выступить с войной против СССР в связи с сосредоточением частей Красной Армии у восточной германской границы.

В ответ на это мною от имени советского правительства было заявлено, что до последней минуты германское правительство не предъявляло никаких претензий к советскому правительству, что Германия совершила нападение на СССР, несмотря на миролюбивую позицию Советского Союза, и что тем самым фашистская Германия является нападающей стороной.

По поручению правительства Советского Союза я должен также заявить, что ни в одном пункте наши войска и наша авиация не допустили нарушения границы и потому сделанное сегодня утром заявление румынского радио, что якобы советская авиация обстреляла румынские аэродромы, является сплошной ложью и провокацией. Такой же ложью и провокацией является вся сегодняшняя декларация Гитлера, пытающегося задним числом состряпать обвинительный материал насчет несоблюдения Советским Союзом советско-германского пакта.

Теперь, когда нападение на Советский Союз уже совершилось, советским правительством дан нашим войскам приказ — отбить разбойничье нападение и изгнать германские войска с территории нашей родины.

Эта война навязана нам не германским народом, не германскими рабочими, крестьянами и интеллигенцией, страдания которых мы хорошо понимаем, а кликой кровожадных фашистских правителей Германии, поработивших французов, чехов, поляков, сербов, Норвегию, Бельгию, Данию, Голландию, Грецию и другие народы...

Правительство призывает вас, граждане и гражданки Советского Союза, еще теснее сплотить свои ряды вокруг нашей славной большевистской партии, вокруг нашего советского правительства, вокруг нашего великого вождя тов. Сталина.

Наше дело правое. Враг будет разбит. Победа будет за нами.

Друкуецца па кн.: СССР — Германия. 1939—1941: Сборник документов. Вильнюс, 1989. С. 24—25.

З ПАСТАНОВЫ ЦК КП(б)Б «АБ ЗАДАЧАХ І МЕРАПРЫЕМСТВАХ У СУВЯЗІ З ВЫСТУПЛЕННЕМ ПА РАДЫЁ НАМЕСНІКА СТАРШЫНІ СНК СССР В.М.МОЛАТАВА» АД 22 ЧЭРВЕНЯ 1941 г.

...Созвать в Минске и в других областных городах партийные активы для мобилизации партийных организаций на разрешение задач, вытекающих из военной обстановки...

На всех предприятиях, в колхозах, совхозах, учреждениях провести митинги.

Обязать все обкомы, горкомы и райкомы, советские, комсомольские и профсоюзные организации принять меры к организованному переводу работы промышленности и транспорта на нужды Красной Армии.

Секретарь ЦК КП(б)Б П.К.Пономаренко

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 1.

З ДЫРЭКТЫВЫ СНК СССР І ЦК ВКП(б) АД 29 ЧЭРВЕНЯ 1941 г. ПАРТЫЙНЫМ І САВЕЦКІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ ПРЫФРАНТАВЫХ АБЛАСЦЕЙ

...4) При вынужденном отходе частей Красной Армии угонять подвижной железнодорожный состав, не оставлять врагу ни одного паровоза, ни одного вагона, не оставлять противнику ни килограмма хлеба, ни литра горючего. Колхозники должны угонять скот, хлеб сдавать под сохранность государственным органам для вывозки его в тыловые районы. Все ценное имущество, в том числе цветные металлы, хлеб и горючее, которое не может быть вывезено, должно, безусловно, уничтожаться.

5) В занятых врагом районах создавать партизанские отряды и диверсионные группы для борьбы с частями вражеской армии, для разжигания партизанской войны всюду и везде, для взрыва мостов, дорог, порчи телефонной и телеграфной связи, поджога складов. В захваченных районах создавать невыносимые условия для врага и всех его пособников, преследовать и уничтожать их на каждом шагу, срывать все их мероприятия.

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944): Документы и материалы. Мн., 1967. Т. 1. С. 50—51.

З ДЫРЭКТЫВЫ ЦК КП(б)Б АД 1 ЛІПЕНЯ 1941 г. ПАРТЫЙНЫМ, САВЕЦКІМ І КАМСАМОЛЬСКІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ ПА РАЗГОРТВАННІ ПАРТЫЗАНСКАЙ ВАЙНЫ Ў ТЫЛЕ ВОРАГА

...2. Все местности Белоруссии, занятые врагом, должны немедленно покрыться густой сетью партизанских отрядов, ведущих непрерывную ожесточенную борьбу на уничтожение врага.

3. В районах и селах создаются подпольные партийные и комсомольские ячейки, главная задача которых — мобилизация народа на беспощадную расправу с врагом. Для этой цели все коммунисты и комсомольцы, способные носить оружие, остаются на территории, занятой врагом.

4. Подпольные организации и партизанские отряды должны иметь явочные квартиры, адреса которых сообщить военному отделу ЦК. Эти явки помогут держать связь, объединять (подпольщиков) и направлять (им) директивы и помощь.

5. Твердо помнить, что партизанская борьба не имеет ничего общего с выжидательной пассивной тактикой. Она имеет боевой наступательный характер. Не надо ждать врага — надо его искать и уничтожать.

6. Задачи партизан: уничтожать всякую связь в тылу врага, взрывать и портить мосты, дороги, поджигать склады горючего и продовольствия, автомашины, самолеты, устраивать крушения поездов. Уничтожать врагов, не давать им покоя ни днем ни ночью. Убивать их всюду, где застигнешь, убивать чем попало: топором, косой, ломом, вилами, ножом. Объединить несколько партизанских отрядов, нападать неожиданно на отряды противника и уничтожать. Особенно важно напасть ночью на аэродромы, сжечь самолеты, перебить летчиков.

7. Нельзя ждать ни минуты, начинать действовать сейчас же, быстро и решительно.

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941—июль 1944): Документы и материалы. Мн., 1967. Т. 1. С. 53—54.

Акупацыйны рэжым

Падрыхтаваць захопленыя землі для нямецкай каланізацыі — такая была мэта акупацыйнага рэжыму. Ідэалагічнай яго асновай з'яўлялася тэорыя нацыстаў пра расавую перавагу нямецкай нацыі над іншымі народамі, пра неабходнасць пашырэння жыццёвай прасторы для немцаў і права на сусветнае панаванне «Трэцяга рэйха» — вялікай германскай імперыі. Асобныя яго палажэнні былі выкладзены Гімлерам у сакрэтным мемарандуме «Некаторыя думкі пра абыходжанне з насельніцтвам на Усходзе» ад 25 мая 1940 г., у плане «Барбароса» (кастрычніцкі варыянт выкладзены ў дырэктыве вярхоўнага галоўнакамандавання ўзброеных сіл ад 18.12.1940 г.), які вызначаў стратэгію і тактыку нападу на СССР, генеральным плане «Ост» — праграме каланізацыі тэрыторыі, германізацыі, высялення і знішчэння народаў Усходняй Еўропы, у тым ліку і беларусаў. Гэтыя асноўныя іх палажэнні дапаўняліся загадамі, інструкцыямі галоўнакамандавання ўзброеных сіл і іншых ведамстваў гітлераўскай Германіі, у якіх жорсткі тэрор, вынішчэнне насельніцтва, ліквідацыя ідэалагічных і палітычных асноў дзяржавы ўзводзіліся ў ранг дзяржаўнай палітыкі.

Віцебская вобласць, у тым ліку і Шаркаўшчына, была аднесена да так званай вобласці армейскага тылу групы армій «Цэнтр». У сваю чаргу — яе тэрыторыя, як і іншыя, падзялялася на акругі (гебіты). Тэрыторыя Шаркаўшчыны ўваходзіла ў Глыбоцкую акругу, якую ўзначальваў гебітскамісар Яўген Карл (забіты партызанамі ў кастрычніку 1943 г.), пазней Паўль Гахман.

Раённую ўправу ўзначальваў бургамістр. На тэрыторыі былых сельсаветаў былі створаны воласці на чале з валасным старшынямі, у вёсках прызначаліся старасты, солтысы, войты.

Шматлікія карныя арганізацыі і спецыяльныя часці — служба бяспекі (СД), зондэркаманды, тайная палявая паліцыя (ГФП), фельдкамендатуры, ортскамендатуры, паліцыя, жандармерыя, ахоўныя паліцэйскія часці — усё было кінута супраць нашых людзей.

Асобную ролю ў сістэме ваенна-фашысцкага акупацыйнага апарату на тэрыторыі «вобласці армейскага тылу» выконвала тайная палявая паліцыя (ГФП). У ГФП набіраліся супрацоўнікі гестапа, нямецкай паліцыі і іншых карных органаў. Каманды ГФП пры мясцовых камендатурах і ахоўных дывізіях дзейнічалі ў кантакце з паліцыяй бяспекі і СД, палявой жандармерыяй і іншымі карнымі органамі.

Уся сістэма адміністрацыйнага кіравання будавалася паводле прынцыпу «фюрэрства», што давала неабмежавую ўладу акупантам у дачыненні да цывільнага насельніцтва.

Для падтрымання «новага парадку», масавага крывавага тэрору, была створана сістэмы нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў, а таксама апорных пунктаў дапаможнай паліцыі службы парадку, у якую ўваходзілі мясцовыя жыхары, што пайшлі на службу да акупантаў.

На тэрыторыі раёна ў найбольш буйных населеных пунктах размяшчаліся нямецка-паліцэйскія гарнізоны: у г.п. Шаркаўшчына (220 чалавек, акрамя гэтага там было 90 чалавек літоўцаў), у м. Ёды (60 чалавек), гарнізон БКА у маёнтку Чырвоны Двор (600 чалавек), у в. Казінцы (180 чалавек), у в. Гнілое Балота (150 чалавек), у в. Казакі (80 чалавек), у в. Бардзенцы (35 чалавек), у в. Грыгараўшчына (45 чалавек). (НАРБ. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 75. Л. 80—81.) У невялікіх вёсках апорай старастаў былі 2—3 мясцовыя паліцэйскія. Агульная колькасць узброеных гітлераўцаў і ім памагатых у раёне складала звыш 1500 чалавек.

Кола людзей, якія падвяргаліся тэрору, увесь час расшыралася. Фашысты знішчалі партыйна-савецкі актыў, асобныя сем'і, палілі вёскі разам з людзьмі. Насельніцтва было пазбаўлена ўсялякіх грамадзянскіх правоў, свабоды, усюды ўводзілася надзвычайнае становішча, сістэма заложнікаў.

У населеных пунктах пастаянна вывешваліся шматлікія загады і распараджэнні глыбоцкага гебітскамісара, начальніка паліцыі. Кожны загад утрымліваў бясконцыя «забараняецца», «не дазваляецца», «канфіскуецца», «смяротная кара».

Уводзілася вельмі многа падаткаў, якія павінна было плаціць насельніцтва. Акрамя асноўных былі і дадатковыя — падатак на дом, жывёлу, птушку і г.д. Сельскае насельніцтва абкладвалася акрамя падаткаў рознымі паборамі, прымусовымі пастаўкамі, працоўнымі павіннасцямі. Нарабаваныя прадукты і жывёлу акупанты пастаўлялі сваёй арміі і вывозілі ў Германію.

Моцна ахоўвалася чыгунка на перагоне Крулеўшчызна — Падсвілле — Зябкі — Полацк. Але, пяглядзячы на гэта, партызаны блакіравалі фашысцкія бункеры, забівалі вартавых. Пад стыкі рэек закладвалі толавыя шашкі. Грымелі выбухі, уверх узляталі кавалкі рэек і шпал. Фашысты, баючыся выходзіць з бункераў, каб не трапіць пад кулі партызан, вялі з кулямётаў недакладны агонь. Значных страт яны нам не наносілі. Так за адну ноч мы выводзілі са строю сотні рэек. Некалькі сутак затрачвалі гітлераўцы на рамонт чыгуначнага палатна. А гэта значыць, што на фронт не даходзілі эшалоны з жывой сілай і зброяй.

Асабліва кровапралітныя баі былі ў канцы 1943 г. і пачатку 1944 г. Карныя экспедыцыі накіроўваліся адна за адной.

...Брыгада ў гэты час знаходзілася на паўднёвым захадзе Галубіцкай пушчы разам з 1-й Антыфашысцкай брыгадай і брыгадай імя Суворава. У гэтыя цяжкія дні мы неслі вялікія людскія страты. Фашысты бамбілі з самалётаў лінію нашай абароны. Скідвалі кантэйнеры з дробнымі бомбамі, якія рваліся каля самай зямлі. Даводзілася зноў адыходзіць на новае месца дыслакацыі. Па пояс у вадзе, па балоце неслі параненых, боепрыпасы. Усю ноч вораг асвятляў тэрыторыю ракетамі, вёў агонь з кулямётаў. Аднак план гітлераўцаў знішчыць нас праваліўся. У гэты складаны час нам дапамагалі з-за лініі фронту. Самалёты з Вялікай зямлі бамбілі фашыстаў, а нам скідвалі аўтаматы, процітанкавыя ружжы (партызанам няраз даводзілася весці барацьбу з танкамі), боепрыпасы.

У адным з баёў мяне раніла ў плячо і руку. Тады таварышы ў атрадзе, калі я не вярнуўся з разведкі ў вызначаны час, палічылі мяне загінуўшым. А наогул, смерць хадзіла заўсёды побач з намі. Успамінаецца такі эпізод.

Разам з маладым партызанам Анатолем Ялахавым, вяртаючыся з задання, зайшлі на хутар паблізу Крукоў крыху адпачыць. І раптам бачым, што хутар акружаны паліцыяй.

Становішча было крытычным. Лес знаходзіўся літаральна побач. Аднак менавіта з гэтага боку вораг і чакаў нас. Таму прынялі рашэнне прарвацца там, дзе менш чакалі. Праз вароты перабраліся ў двор, адтуль папаўзлі ў поле, да ручча. Прыкмецілі фашысцкага памагатага. Падкраліся і прыгразілі зброяй, каб маўчаў. І толькі тады, калі мы адпаўзлі на дастатковую адлегласць, пачалі па нас страляць.

Ужо пасадоўга да вызвалення тутэйшых месцаў атрад знаходзіўся каля балота Багна-Мох. І ноў акружэнне, ноў дзень і ноч над галовамі «вісслі» фашысцкія самалёты, ірваліся міны і снарады. Па балоце ланцугамі ішлі немцы з сабакамі.

Было вырашана выходзіць з акружэння малымі групамі, па 7—10 чалавек, а потым збірацца ў дамоўленых месцах.

Партызаны выстаялі, а ў хуткім часе злучыліся з часцямі Чырвонай арміі. Многія з іх разам з чырвонаармейцамі пайшлі дарогамі вызвалення і перамог.

Рызыкуючы жыццём

З успамінаў Віктара Недзведзя, былога камсамольца-падпольшчыка

Разам з Генадзем Міляшцем, Іосіфам Багаткевічам і Іосіфам Райчонкам я ўваходзіў у адну падпольную камсамольскую групу. Мы дзейнічалі ў асноўным на тэрыторыі Ёдскага сельсавета.

Цяжкі лёс выпаў на долю Генадзя Міляшценя. Хлопец (а быў ён самым маладым з нас — 16 гадоў) застаўся сіратой. Яго бацькі, браты і сястра загінулі ў час карнай экспедыцыі, калі фашысты разам з людзьмі спалілі іх родную вёску Кусталі. Генадзь цудам уцалеў. Ён схаваўся пад печ у доме, які занялі фашысты. Больш сутак яны тут балявалі. А потым, абрабаваўшы вёску, падпалілі яе. Палыхнула агнём і хата, дзе знаходзіўся Генадзь. Хлопцу ўдалося выскачыць з агнявога пекла. Потым прабраўся да партызан. У маладога патрыёта быў свой вялікі рахунак да немцаў, і ён стаў помсціць ворагам: хадзіў у разведку, мінраваў дарогі, збіраў звесткі аб фашыстах.

Іосіф Багаткевіч з дапамогай сакратара падпольнага РК ЛКСМБ Генадзя Канстанцінавіча Лысёнкі ўстанавіў сувязь з ксяндзом касцёла ў вёсцы Новы Пагост. Той даваў некаторыя звесткі аб ворагу, якія своечасова іх перадавалі партызанам. Генадзь Лысёнак і Іосіф Багаткевіч пасылалі некаторым паліцаям праз іх родных, сваякоў запіскі, каб яны апамяталіся, што трэба пераходзіць на бок партызан, у адваротным выпадку іх будуць судзіць як здраднікаў Радзімы. Гэта давала пэўныя вынікі.

Адпойчы ў вёсцы Глісцёнкі паліцаі падпалілі дом камсамольца Аляксандра Трабы, здзекаваліся з яго родных. Адзін паліцай, Апанас Цярэнцьеў, з якім падпольшчыкі да гэтага праводзілі работу, адмовіўся ўдзельнічаць у расправе. Перайсці на бок партызан Цярэнцьеў усё ж не рашыўся і праз некаторы час застрэліўся. Яго брат, жыхар вёскі Варонка, пайшоў у партызаны.

Пасля вайны Генадзь Міляшцей працаваў у Шаркаўшчыне на чыгунцы, казаў, што трэба адпаўляць тое, што ў час вайны даводзілася разбураць.

Іосіф Багаткевіч загінуў пры вызваленні Польшчы. Іосіф Райчонак пасля вайны працаваў у калгасе ў роднай вёсцы Алашкі.

Я быў разведчыкам. Даводзілася бываць у нямецкіх гарнізонах. Добра ведаў польскую мову, і гэта дапамагала ў разведвальнай і агітацыйнай рабоце.

У красавіку 1944 г. немцы праводзілі мабілізацыю насельніцтва ў так званую Беларускую краёвую абарону. Падпольныя райкомы партыі і камсамола, камандаванне партызанскіх брыгад накіравалі ў населеныя пункты сваіх прапагандыстаў, каб растлумачыць насельніцтву аб сапраўдных планах ворага. У выніку масавая мабілізацыя была сарвана. Але батальён БКА у Шаркаўшчыне ворагам удалося стварыць.

Па заданні Генадзя Лысёнкі я быў накіраваны ў гарнізон у Шаркаўшчыну. Батальён БКА размяшчаўся ў былым маёнтку Чырвоны Двор (за 1 км ад цэнтра Шаркаўшчыны). Ён ахоўваў Шаркаўшчыну з паўночнага боку, заходнюю частку ахоўваў літоўскі батальён, усходнюю і паўднёвую — самаахоўцы, паліцаі, немцы. Генадзь Канстанцінавіч здабыў мне мабілізацыйны ліст. Мяне залічылі салдатам 3-й роты БКА. Тут знаходзіліся ў асноў-

ным мае аднавяскоўцы і жыхары суседніх вёсак. Вёў сярод іх растлумачальную работу. Большасць з іх не хацела служыць ворагу, але баяліся за свае сем'і. Неаднойчы я ім зачытваў зводкі Саўінфармбюро, расказваў аб наступленні Чырвонай арміі. Відаць, наша прапаганда зрабіла сваю справу, бо многія мабілізаваныя вярнуліся дамоў.

Вясной 1944 г. партызаны нашай брыгады разграмілі самаахову ў вёсках Астраўляне, Казакі, Галіпова, Камароўшчына, Навасёлкі і іншых. Потым напалі на батальён БКА у Чырвоным Двары. Пасля гэтага дэзерцірства з краёвай абароны пашырылася. Некаторыя мабілізаваныя, каб не служыць ворагу, наўмысна рабілі сябе інвалідамі. Так, жыхар вёскі Яцкаўшчына (прозвішча не памятаю) адсек сабе пальцы на правай руцэ. У канцы красавіка 40 чалавек з 3-й роты БКА перайшлі да партызан і ўліліся ў брыгаду «За Радзіму».

Да вайны адзін год я працаваў настаўнікам, вёў калег у рэпс. Многія з іх дапамагалі мне потым у разведвальнай рабоце. Шмат дапамог былы школьны інспектар Хвашчынскі (імя не памятаю). Калі я знаходзіўся ў гарнізоне, ён дапамагаў мне матэрыяльна, даваў некаторыя звесткі аб ворагу.

У партызанскай брыгадзе даводзілася мне весці не толькі агентурную работу. Хадзіў таксама ўзрываць чыгунку ў Літву (Дукшты — Турмонты), на іншыя аб'екты.

Многія партызаны брыгады «За Радзіму» аддалі жыццё ў барацьбе з фашысцкімі захопнікамі. Раскажу пра некаторых разведчыкаў.

Восенню 1943 г. трос партызан вярталіся з разведкі ў атрад. У вёсцы Корніца іх аружылі. Разведчыкі ўступілі ў няроўны бой. Патроны ў іх скончыліся. Адзін партызан забіты, другі цяжка паранены. Разведчыку Антону Пятровічу Мядзведзю з вёскі Буеўшчына ўдалося прарвацца праз кальцо ворага. Але яго таксама цяжка паранілі. Фашыстам не ўдалося яго ўзяць жывым, ён узарваў пад сабой гранату. Антона Пятровіча партызаны пахавалі на могілках у Юдыцыне. Пасля вайны яго астанкі былі перанесены ў Шаркаўшчыну.

Кожны раз цікавыя звесткі аб ворагу прыносіў камандаванню брыгады Міхаіл Фёдаравіч Мінаў. Але аднойчы каля вёскі Ганова ён трапіў у засаду. Партызан не разгубіўся. Даўшы некалькі чэргаў з аўтамата па праціўніку, ён ускочыў у канаву і вырваўся з акружэння. У хуткім часе фашысты самі патрапілі на партызанскую засаду.

1 мая 1944 г. з Шаркаўшчыны ў бок вёскі Ёды накіраваўся атрад фашыстаў. Разведчык Ігнат Лаўрыновіч (жыхар в. Парэчча) паспеў папярэдзіць партызан, але сам загінуў каля в. Касцюкі. Сястра Лаўрыновіча Раіса, пасля вайны Дубашынская, у той час 11—12-гадовая дзяўчынка, знаходзілася ў партызанскім лагеры, часта пад выглядам сіраты хадзіла ў разведку па вёсках.

Вясной 1944 г. партызанам паведамілі, што па дарозе Шаркаўшчына — Міёры рухаецца абоз немцаў і паліцыі. Народныя мсціўцы напалі на абоз. Некалькі немцаў і паліцэйскіх, у тым ліку здраднік радзімы Ляўкінь Фокаў, былі ўзяты ў палон.

Жыхары вёсак дапамагалі партызанам весці разведку, забяспечвалі прадуктамі харчавання, нярэдка рамантавалі абутак, вопратку.

Вельмі дапамагаў нам настаўнік Мікалай Іванавіч Яблонскі, які дастаўляў разведданыя аб нямецкіх гарнізонах (ён валодаў нямецкай мовай). Шмат адказных даручэнняў камандавання брыгады выконалі падпольшчыкі Іван, Сяргей і Рыгор Яблонскія, Сцяпан Іосіфавіч Яблонскі, яго сын Іван, Уладзімір Рыгоравіч Дарашчонак і яго бацька Рыгор Фёдаравіч Дарашчонак, Пётр Лявонавіч Дарашчонак, Вікенцій Каспаравіч Шатыбелка, Уладзімір Ходзюш, Міхаіл і Іосіф Лысёнкі, Генадзь Голуб.

Скрозь агонь і смерць

З успамінаў П.М.Баранава, былога камандзіра аддзялення партызанскага атрада «За перамогу» брыгады імя С.М.Кароткіна, жыхара Шаркаўшчыны

Наша брыгада была створана ў чэрвені 1942 г. на базе асобных партызанскіх атрадаў «Мсціўец», «Грозны» і імя К.Я.Варашылава. Да лютага 1943 г. яна называлася партызанскай брыгадай Сіроцінскай, затым да чэрвеня таго ж года — партызанскай брыгадай імя Ф.Э.Дзяржынскага.

С.М.Кароткін да вайны працаваў рэ-

дактарам шумілінскай раённай газеты. Калі ўжо быў камандзірам брыгады імя Ф.Э.Дзяржынскага, загінуў у час пералёту за лінію фронту. У памяць аб ім і была названа тады наша брыгада.

Мы дзейнічалі на акупіраванай тэрыторыі Сіроцінскага, Расонскага, Полацкага, Ушацкага, Пліскага, Шаркаўшчынскага і Міёрскага раёнаў.

Партызаны праводзілі дыверсіі на чыгунках Полацк — Маладзечна, Віцебск — Полацк, Гарадок — Невель, на шашэйных і грунтавых дарогах. Разграмілі варожыя гарнізоны на станцыях Язвіна і Лоўша Сіроцінскага, у вёсках Гута, Янчыкава, Званас і Балдышы Полацкага і Азерцы Пліскага раёнаў.

На працягу ўсяго 1943 г. партызаны брыгады актыўна ўдзельнічалі ў разбурэнні чыгуначных камунікацый праціўніка. Толькі ў жніўні 1943 г., калі пачалася «рэйкавая вайна», на чыгунцы Полацк — Маладзечна народныя мсціўцы нашай брыгады падарвалі больш за 2 тысячы рэек. Здаралася так, што некалькі гадзін запар ляцелі ў паветра варожыя камунікацыі. «Рэйкавая вайна» не спынялася да злучэння партызан з часцямі Чырвонай арміі.

У пачатку верасня 1943 г. праціўнік з гарнізона в. Зябкі ў колькасці да 100 чалавек увайшоў у навакольныя населеныя пункты. Фашысты грабілі людзей, прымусова забіралі маладых хлопцаў і дзяўчат на катаржныя работы ў Германію. Разведка паведаміла, у які час яны будуць вяртацца ў гарнізон. Нашым атрадам была зроблена засада каля чыгуначнай станцыі Зябкі. Падпусціўшы захопнікаў метраў за 100, мы адкрылі моцны агонь. У баі было забіта 15 гітлераўцаў і 20 параненa.

У гэтым жа месяцы дыверсійнай групай атрада «Грозны» на чыгунцы Полацк — Маладзечна, каля раз'езда Баравое, былі спалены лесапільны завод і вялікая колькасць гатовай лесапрадукцыі і сыравіны. Гэтай жа групай на рацэ Шоша, каля станцыі Падсвілле, быў узарваны чыгуначны мост.

У сакавіку 1944 г. перад нашай брыгадай, а таксама брыгадамі імя І.В.Сталіна, імя К.Я.Варашылава, 1-й антыфашысцкай была пастаўлена задача — сарваць рух паяздоў па чыгунцы Полацк — Маладзечна і вузкакалейцы Параф'янаў — Беразіно. Сотні метраў рэек адначасова ўзляцелі ў паветра, рух на чыгунцы Полацк — Маладзечна быў спынены на 9 сутак. Не паспявалі гітлераўцы закончыць рамонт пуцей, як партызаны зноў выходзілі на чыгунку і разбуралі яе.

У канцы 1943 г. фронт наблізіўся да паўночных граніц Полацка-Лепельскай партызанскай зоны. Каб пазбавіць ад партызан свае тылы, гітлераўцы ў снежні 1943 — лютым 1944 гг. некалькі разоў імкнуліся прарваць абарону лясных салдат. Аднак усе іх атакі праваліліся. Вясной 1944 г. праціўнік арганізаваў карныя экспедыцыі «Свята вясны» і «Імжысты дождж». У 60-тысячную групоўку карнікаў уваходзілі франтавыя часці і спецыяльныя падраздзяленні. На ўзбраенні гітлераўцаў было 235 гармат, 137 танкаў, каля 75 самалётаў, два бронепаязды. Тады мы не ведалі дакладна аб варожай сіле. Гэтыя лічбы я прыводжу з успамінаў У.Е.Лабанка, камандзіра партызанскага злучэння Полацка-Лепельскай зоны.

Наша брыгада знаходзілася паблізу вёскі Празаркі і станцыі Зябкі. Трымалі абарону ад вёскі Асінаўка ўздоўж возера Шо і па правым беразе ракі Шоша. Супраць кароткінцаў была кінута групоўка злачынцы Вятвіцкага ў колькасці 5 тысяч чалавек, 26-ы паліцэйскі полк і асобы полк СС. 25 дзён мы вялі няспынныя баі, адбіваючы жорсткія атакі ўзброенага да зубоў ворага, забяспечанага танкамі, цяжкімі гарматамі, авіяцыяй. Дарагой цаной даставалася праціўніку кожная пядзя зямлі. Партызаны біліся з незвычайнай храбрасцю, вымагаючы сілы ворага, знішчаючы яго тэхніку.

Праціўнік спрабаваў выціснуць нас з гэтай мясцовасці і заняць шашу, якая вяла да мястэчка Кублічы, прарвацца ў тыл партызанскім брыгадам. Камандаванне аддало загад — разарваць кальцо блакады, а яно тады звузілася да 8 кіламетраў. Пад вечар 4 мая аспоўныя партызанскія сілы занялі выгадны зыходны рубеж на поўдзень ад вёскі Забораўна ў Матырынскім лесе. У ноч з 4 на 5 мая абарона праціўніка была прарвана, гарнізоны вёсак Папярына і Новае Сяло разгромлены. Партызаны арганізавана выйшлі ў лясны масіў на ўсход ад гарпасёлка Ушачы. З блакады было выведзена і каля 15 тысяч мірных жыхароў.

Камандаваў брыгадай Уладзімір Мануілавіч Талаквадзе, а камбрыгам быў Адольф Браніслававіч Эрдман.

Самалёты прылятаюць апоўначы

З успамінаў Б.Р.Макавейчука, былога начальніка партызанскага аэрадрома

Неяк вечарам у апошніх днях сакавіка 1944 г. мяне выклікалі ў штаб 4-й Беларускай брыгады, які размяшчаўся ў вёсцы Чырвоны Луг. Там мне ўручылі загад аб арганізацыі аэрадрома для прыёму самалётаў. Гэтым загадам я быў назначаны начальнікам пасадачнай пляцоўкі.

Выбар свой я спыніў на возеры Ельня, што ў самым цэнтры непраходнага балота Багна-Мох. Тут, на астраўку, адзіны будынак — маленькая хатка і хляўчук. Партызаны жартам называлі гэта месца вострава Рабінзона.

На гэты маленькі востраў можна было дабрацца толькі зімой. Тут жыў адзін стары. Звалі яго Фёдар Буда. Зімой ён нарыхтоўваў сабе прадукты, летам лавіў рыбу, і так перабіваўся да маразоў.

Ужо 4 красавіка я з групай партызан, выдзеленых у памочнікі, падрыхтаваўся да прыёму першых самалётаў з Вялікай зямлі. Напярэдадні звязаўся з аэрадромам, дзе знаходзілася гвардзейская авіячасць, якая абслугоўвала партызан. Дамовіліся аб сігналізацыі і прыёмцы самалётаў.

І вось на партызанскі аэрадром на возеры Ельня прызямліўся першы савецкі самалёт. Лётчык Тарасаў потым яшчэ неаднаразова прылятаў да нас. Кожную ноч самалёты рабілі па некалькі рэйсаў.

Вясна ўступала ў свае правы. Гэты аэрадром аказаўся ўжо непрыгодным. Трэба было падрыхтаваць новы.

Будаваць новую пасадачную пляцоўку дапамаглі мясцовыя жыхары. Кожны дзень было занята на гэтай рабоце па 250—300 чалавек з розных населеных пунктаў. Працавалі з сярэдзіны красавіка да 7 мая 1944 г. Але з-за нізкай воблачнасці, пастаянных дажджоў не было магчымасці прымаць самалёты.

Пад вечар 9 мая вырашыў з'ездзіць у вёску Шаптырова, дзе знаходзіўся партызанскі шпіталь, праведаць хворых і параненых. Там мяне засыпалі пытаннямі, калі прыляцяць самалёты для адпраўкі людзей на Вялікую зямлю на лячэнне. Нічога канкрэтнага на гэта адказаць не мог. Толькі 12 мая дзень выдаўся надзвычай сонечны. Усе мы, як кажуць, вочы прагледзелі, чакаючы самалётаў. Яшчэ раз вызначылі напрамак ветру. Сігнальныя кастры размясцілі літарай «Г». Загадзя зрабілі каўпакі з чорнай бляхі на выпадак, калі варожыя самалёты выявяць кастры. Гэтымі каўпакамі можна было хутка закрыць агонь.

17 мая апоўначы нарэшце пачуўся гул самалётаў. Загарэліся кастры, абазначаючы лініі пасадкі. Дзесяць вінтакрылых машын прызямліліся на аэрадроме.

Забраўшы параненых і хворых партызан, самалёты вылецелі на Вялікую зямлю.

...23 мая наш аэрадром прыняў чатыры самалёты. Яны даставілі партызанам боепрыпасы, медыкаменты, свежыя газеты. У дзве гадзіны ночы самалёты ўзялі курс назад. А раніцой прыляцелі яшчэ два самалёты. Лётчыкамі былі Барыс Папоў і Васіль Васільеў. Ноччу яны вярнуліся на сваю базу.

Праз некалькі дзён гітлераўцы наладзілі другую карную экспедыцыю супраць партызан. Пасадачную пляцоўку прыйшлося замаскіраваць, закідаць галлём, а потым і наогул пакінуць яе. Самалётаў больш мы не чакалі. Кола блакады з кожным днём сціскалася ўсё мацней. Партызаны пад націскам ворага адышлі далей на балота Багна-Мох.

Подзвіг ратны, подзвіг працоўны

З успамінаў П.Н.Максіменкі, былога камандзіра атрада «Паўночныя»

У другой палове верасня 1943 г. мяне адклікалі з Паўночна-Заходняга фронту ў распараджэнне Наркамата дзяржбяспекі, які знаходзіўся тады ў Падольску. Шчыра кажучы, не вздаў, што стала прычынай гэтага. Прайшло двое сутак. І толькі потым паведамілі, што мяне накіроўваюць у тыл ворага. Неабходна было прыкладна да 20 кастрычніка скамплектаваць групу з сямі васьмі чалавек, у якой павінны быць радыст, падрыўнікі, разведчыкі.

Створаную групу назвалі «Паўночныя».

Раён яе дзеянняў — паўночны захад Віленскай вобласці, а дакладней, Докшыцкі, Глыбоцкі, Шаркаўшчынскі, Плісскі і Дуніловіцкі раёны. Перад намі стаяла трыадзінная задача: разведка, дыверсіі, контрразведка.

...Аператыўны работнік Сенічаў пайшоў на заданне 6 лістапада, а вярнуўся 9. Вярнуўся не адзін, а з высокім, армейскай выпраўкі маладым чалавекам.

Сенічаў коратка далажыў аб выкананні задання і назваў свайго спадарожніка. Ім аказаўся Аляксей Лук'янавіч Танканог, начальнік разведкі партызанскага атрада імя Г.К.Жукава брыгады імя ЦК Кампартыі Беларусі. Танканог зняў шынель, і мы ўбачылі на грудзях яго ордэн Леніна.

...33-я армія Заходняга фронту змагалася пад Вязьмай у акружэнні вось ужо каля трох месяцаў. Боепрыпасы на зыходзе, харчоў амаль няма, асабовы склад арміі змучаны бесперапыннымі абарончымі баямі. Камандаванне арміі распрацоўвала план выхаду з акружэння. На прарыў ударныя падраздзяленні ішлі цераз раку Угра. А.Л.Танканог у гэтых баях камандаваў ротай.

Ва ўзнагародным лісце Аляксея Лук'янавіча таго часу адзначана: «За час баёў з нямецкімі акупантамі тав. Танканог А.Л. праявіў сябе як мужны і адважны камандзір, адданы справе Леніна-Сталіна.

У баях за вёску Шыпуны (Вяземскі раён) тав. Танканог А.Л. першы ўварваўся ў вёску: ва ўпор расстрэльваў фашыстаў з ручнога кулямёта. У баях 20—21 сакавіка 1942 г. за в. Хмельнікі, калі да вёскі ўшчыльную падышлі 6 танкаў, тав. Танканог ва ўпор страляў па танках ворага з ПТР, падбіў адзін, знішчыў двух танкістаў. Два танкі былі подбіты разам з байцамі.

У час другой атакі тав. Танканог, знаходзячыся з байцамі, патхняў іх, вёў знішчальны агонь у абароне і асабіста знішчыў чатырох фашыстаў».

Заключэнне Вайсковага Савета арміі: «Дастойны ордэна Леніна».

Камандуючы 33-й арміі генерал-маёр М. Яфрэмаў.

За члена Вайсковага Савета палкавы камісар А. Уладзіміраў.

Загадам па Заходнім фронце ад 28 сакавіка 1942 г. А.Л.Танканог узнагароджаны ордэнам Леніна.

Аднак не пашанцавала Аляксею Лук'янавічу. Праз некалькі дзён яго цяжка кантузіла, і ён трапіў у палон да фашыстаў. Апрытомнеў у Полацку ў лагеры для ваеннапалонных. Але захаваў і пасіў пры сабе дарагую ўзнагароду — ордэн Леніна і пасведчанне.

Трэба было вырвацца з лагера чаго б гэта ні каштавала. Аляксей Лук'янавіч распрацаваў план знішчэння аховы і ўцёкаў. Аднак ваеннапалонных раздзялілі на групы і вывезлі ў розныя месцы на работы. Танканог папаў у вёску Замошша, што за некалькі кіламетраў ад вузлавой станцыі Круляўшчызна. Тут ён арганізаваў групу з 5 чалавек і паставіў задачу рыхтавацца да ўцёкаў. Мясцовыя жыхары тайком перадалі ім некалькі гранат. Даведаўшыся, што акупанты рыхтуюцца да пейкага свята, Танканог назначыў ажыццяўленне свайго плана на гэты дзень.

Калі фашысты сабраліся пад тэнтам грузавой машыны і пачалі папойку, Танканог падаў сігнал да захопу зброі, якая знаходзілася ў кабінах машын. Немцы лічылі, што галодныя, змучаныя непасільнай працай ваеннапалонныя не змогуць уцячы і дапусцілі памылку: пакінулі каля машын толькі аднаго вартавога. Ён найграваў на губным гармоніку пейкую мелодыю і чакаў свасй чаргі папасці пад тэнт.

Байцы падкраліся да вартавога і рэменем сціснулі горла. Гітлераец нават крыкнуць не паспеў. Адзін з ваеннапалонных схапіў гармонік і стаў выконваць нямецкую песню.

— Усім да машын! Захапіць у кабінах зброю і бягом да балота! — скамандаваў Танканог, сціскаючы ў руцэ аўтамат нямецкага вартавога.

Толькі потым, калі сціхла музыка і ваеннапалонны быў ужо сярод сваіх, фашысты адкрылі стральніну.

Пад раніцу група выйшла з балота да хутара. У жанчыны, якая працавала каля дома, спыталі пра партызан. Яна вынесла з хаты бохан хлеба і гладыш кіслага малака, пачаставала. Потым да іх падышоў сівы чалавек і без усякіх роспытаў узяўся праводзіць іх да партызан.

Так папаў Аляксей Лук'янавіч Танканог у атрад імя Г.К.Жукава, дзе пасля ўдзелу ў некалькіх баявых аперацыях яго назначылі камандзірам узвода. Многія з гэтых аперацый былі вельмі дзёрзкія. Напрыклад, вывад з памесця Безымполле больш за 500 галоў буйной рагатай жывё-

лы і каля 2000 авечак, якіх фашысты адабралі ў насельніцтва.

9 лістапада 1943 г. А.Л.Тапканог быў залічаны ў групу «Паўночныя», а праз нскалькі дзён накіраваны ў Шаркаўшчынскі раён для арганізацыі сувязі з падпольшчыкамі.

З 1953 г. звыш трыццаці гадоў Аляксей Лук'янавіч узначальваў калгас імя Гагарына. Працоўныя будні старшыні адзначаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны» і шматлікімі медалямі.

У ваколіцах вёскі Ёды

З успамінаў Ігната Ільіча Пятрова, камандзіра атрада «Спартак»

...Для организации разведки мною была послана группа в 12 человек под руководством лейтенанта Василькова. Вслед за разведкой двинулся отряд. Старший разведовательной группы доложил, что в Иодах происходит учет военнообязанных и что войт и комендант выехали в направлении Шарковщины или Браслав с донесением о том, что по м. Иоды двигается большое соединение партизан.

Оставив засаду на краю местечка со стороны Шарковщины и Браслава, мы вошли в м. Иоды и подошли к дому, где была размещена гмина. Там нами были сожжены все документы по учету военнообязанных и другие документы, взломан денежный ящик, а деньги в очень большом количестве мы забрали себе.

После разгрома гмины мы направились на квартиру войта, где, захватив предметы обмундирования, 20 литров спирта, 12 пудов меда, 3 пуда колбас, направились к выходу из местечка. Выходя из местечка, мы получили сообщение разведки, что нам навстречу двигается большой отряд немцев и полицейских. Мы приняли боевой порядок. Немцы начали нас обстреливать. Бой длился 1,5 часа. В результате боя, по словам населения, убито 8 немцев, 15—17 полицейских. Убитых немцев вывозили на 6 подводах. Наши потери — один убитый, 2 раненых, 2 пр. б. в.

Спустя несколько дней после операции в м. Иоды, на наш лагерь было совершено нападение крупным отрядом немцев, полицейских в количестве более 500 человек. О продвижении этого отряда нас предупредил житель д. Озероцы по имени Коля.

Получив эти данные, я послал разведку в количестве 12 человек и засаду из 7 человек по направлению к д. Озероцы. Одновременно мною был собран отряд для движения навстречу противнику.

Выйдя на опушку леса, я расположил отряд со сторон направления движения отряда противника на расстоянии 20—30 метров один боец от другого и дал приказание не открывать огня без команды. Подпустив противника примерно на 70 метров от расположения отряда, мною был дан сигнал к открытию огня. Такая обстановка для противника оказалась неожиданной и он в панике бежал, не дав ни одного выстрела.

В результате боя нами захвачено 15 французских винтовок, 20 бельгийских, один ручной немецкий пулемет, три ящика немецких патронов, около 100 гранат и 12 парных подвод с грузом.

Сожжены три немецкие грузовые автомашины. Как потом выяснилось, немцы увезли своих убитых и раненых на 12 подводах, количество не установлено.

Наш отряд в бою потерь не имел, за исключением того, что младший лейтенант Гумаров поранил себя в 37 местах им же брошенной гранатой. После этой операции мелкие гарнизоны немцев и полицейских выехали в Поставы, Шарковщину и Браслав. Наши действия ограничились организацией засад по большакам и дорогам.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 63. Л. 4.

Адважная разведчыца

...Девушка старалась идти бодро, не показывая усталости, хотя она прошла с чемоданом не менее двадцати километров. Вначале путь казался легким, хоть и приходилось преодолевать густые заросли кустарника, обходить топкие места болот. А вот сейчас даже ровный городской тротуар казался крутым подъемом в гору. Но

надо быць бодрой. Этого требует дело, об этом строго напоминал комиссар партизанского отряда, провожая в путь и вручая чемодан, в котором, как он шутливо выразился, лежал «пирожок с начинкой».

И вот конец пути — большое здание. Настя бросила быстрый взгляд на вывеску, на которой поверх слов уродливо корчилось изображение свастики. С беспечной улыбкой подала пропуск часовому, и, получив разрешение, скрылась за входной дверью.

Поговорив с секретарем-машинисткой по какому-то пустяковому вопросу, она, как бы в забывчивости, оставила чемодан в темном углу помещения и вышла на улицу, снова беспечно улыбнувшись часовому. В оставленном чемодане лежал грозный груз — мина замедленного действия. Это и был тот «пирожок с горячей начинкой».

Мина сработала в положенное время. Так было взорвано помещение немецкой жандармерии в городе Глубокое. На счету отважной разведчицы Бельской прибавилось еще 12 убитых гитлеровцев.

Анастасия Давыдовна Бельская родилась 20 июня 1923 года в селе Орехово Начского сельского Совета Полоцкого района в семье крестьянина. Семья была очень большая, и детям с раннего возраста приходилось много работать.

Настя отличалась исключительным трудолюбием как в школе, так и дома. Она была первой помощницей матери — пасла свою и соседских коров, выполняла различную работу по дому, присматривала за младшим братом Костей, сестрами Соней и Варей.

Окончив семилетку, по совету своего старшего брата Иосифа, который в это время работал учителем, Анастасия решила стать учительницей и поступила в Полоцкое педагогическое училище. Приезжая на летние каникулы домой, она не собиралась отдыхать, а сразу включалась в работу. Работала вместе с колхозниками на прополке, на сенокосе. Всегда ее ставили в пример другим.

На втором курсе всех студентов отправили в военные лагеря. Там студенты изучали военное дело. Анастасия была одним из лучших стрелков.

В 1940 году в связи с тем, что в области не хватало учителей начальных классов, более способным студентам предложили пойти работать, а училище кончить заочно. Анастасия согласилась. Она была направлена в деревню Звонь Ушачского района на начальную школу, где с большим интересом и усердием стала воспитывать молодое поколение. Когда фашистская армия вступила на белорусскую землю, Анастасия без всякого колебания пошла в партизанский отряд.

Анастасия стала разведчицей в партизанских подразделениях, которые дислоцировались в лесах бывших Плисского и Дисненского районов.

...У полицаев и эсэсовцев Анастасия была на особом счету. Враг считал ее неуловимой и крайне опасной диверсанткой-разведчицей. Друзья-партизаны видели в этой невысокой худенькой девушке особый талант проникать в самые опасные места.

Шло лето 1943 года. Народные мстители своими боевыми операциями активно помогли Красной армии гнать врага на запад. Гитлеровцы цеплялись за каждый укрепленный район, создавая там усиленные гарнизоны.

Размещался такой гарнизон на центральной усадьбе совхоза «Городец». Партизаны решили разгромить гарнизон врага. Нужно было определить его силу, выявить слабые места. И вот в разведку вместе с двумя товарищами пошла отважная Анастасия Бельская.

Но удача, не раз сопутствовавшая ей в самых рискованных вылазках против врага, на этот раз изменила. Разведчица наткнулась на засаду. Настю тяжело ранили в ногу. Но она, истекая кровью, продолжала отстреливаться. Вот выпущена последняя пуля, потом схватила гранату, чтобы взорвать себя, но не сдаться живой в руки врага. Но не успела...

Ее доставили в гарнизон в Городце. Под усиленной охраной продержали два дня в местной больнице, а затем бросили в каменный подвал здания штаба гарнизона.

Здесь в подвале Настя встретила свою подругу Аню Краснякову. Аня была схвачена фашистами как связная партизан и невольно стала свидетельницей тяжелых испытаний, которые выпали на долю Анастасии.

По десять раз в сутки вызывали на допрос. Допрос вел изменник Родины, начальник гарнизона Иван Ветвицкий. На столе перед ним всегда лежали плетка и пистолет. Тут же стоял графин с водкой. Водку он пил стакан за стаканом.

Напрасно старались палачи выведать у Анастасии, где находятся партизаны, какое задание она выполняла, пробираясь в Городец. Девушка молчала. После допроса ее, избитую до потери сознания, бросали снова в подвал.

Несколько раз возили ее на допрос в Глубокое. Но так и не узнали от девушки ровно ничего.

Партизаны сделали попытку вырвать из лап врага свою лучшую разведчицу. Они заманили фашистов в лес и навязали им бой. Двадцать шесть убитых и десятки раненых увезли с поля боя каратели. Но разгромить гарнизон и освободить Настю не удалось. Ее расстреляли.

Это произошло 27 апреля 1944 года. В центре парка в Городце гитлеровцы собрали все население деревни. Конвой вывел Настю из подвала и ударами прикладов погнал к ранее вырытой могиле. Раненая, изуродованная пытками, она и сейчас на-

водила страх на фашистов. Ее сопровождали двадцать вооруженных солдат, хотя от подвала до могилы было 30—35 метров. Партизанка шла с гордо поднятой головой. Она пела. Когда разведчица подошла к могильной яме, она повернулась и крикнула:

— Стреляйте, гады! Все равно всех не перестреляете! За мою голову вы дорого заплатили!

Выстрел оборвал голос отважной партизанки...

Жители Городца, Лужков чтут память Анастасии Бельской. На ее могиле высится обелиск, ее именем названа улица в Лужках.

В Лужковской средней школе по многолетней традиции 27 апреля — в день гибели Анастасии Бельской — проходит день ее памяти.

З фонда музея баявой славы Лужкоўскай сярэдняй школы.

Ішлі ў разведку хлапчукі

У 1960—1970-я гады, калі я працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў Шаркаўшчынскай сярэдняй школе, мы шмат увагі ўдзялялі пошукавай рабоце. Вучні сустракаліся з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, запісвалі іх успаміны. Вялі перапіску з былымі камандзірамі і камісарамі партызанскіх брыгад і атрадаў, якія змагаліся з фашыстамі на тэрыторыі Шаркаўшчынскага раёна. Гэтыя нсацэнныя сведчанні сэрцаў чалавечых адыгрывалі вялікую ролю ў выхаваўчай рабоце.

У 1978 г. наш клас, у якім я была класным кіраўніком, атрымаў ліст ад былога камісара партызанскай брыгады імя Суворава Мікалая Ягоравіча Усава, у якім ён расказваў пра ляспых гаўрошаў Жэню Кухарэнку, Сяргея, Аляксея і Ваню Слабухаў.

З Жэнем Кухарэнкам Мікалай Ягоравіч пазнаёміўся ў партызанскай брыгадзе. Хлопчык год чатырнаццаці, апрануты ў лёгкую куртку, на галаве — чырвонаармейская пілотка, на грудзях — нямецкі аўтамат. Сапраўдны партызан. Па гаворцы адчувалася, што ён не мясцовы жыхар, па сумных вачах няцяжка было вызначыць — паспытаў гора.

Цяжкі лёс у Жэні Кухарэнкі. Прыехаў ён з маці і двума малодшымі братамі з Ленінграда пагасцяваць да дзядулі Антона ў вёску Громаўку Дрысенскага раёна. Тут яго і застала вайна.

Аднойчы ў вёсцы з'явіліся фашысты, пачалі патрабаваць зерне, якое было схавана ў зямлі. Дзядуля супраціўляўся, яго спачатку білі, а потым застрэлілі. Бачыў Жэня, як згарэлі ў хаце яго браты — Алег і Толя, а цяжка параненую маці забралі некуды фашысты.

Жэня пайшоў у партызанскі атрад. Адвага і знаходлівасць здзіўлялі нават бывалых партызан.

Аднойчы Жэня вяртаўся з разведкі з мястэчка Шаркаўшчына. Недалёка ад вёскі Казачкі неспадзявана наткнуўся на фашысцкую засаду. Немцы былі зусім блізка, але агню не адкрывалі, відаць, разлічвалі захапіць юнага разведчыка ў палон. Не страляў і Жэня. Маўляў, адзін супраць некалькіх гітлераўцаў. Аўтамат тут не дапаможа. Уся надзея на гранаты, якія ляжаць за пазухай.

Фашысты, якія заўважылі, што хлопчык не збіраецца страляць, асмялелі, сталі набліжацца. Калі падышлі блізка, Жэня выхапіў гранату і кінуў у гітлераўцаў, а сам упаў на зямлю. Выкарыстаўшы паніку ў радах ворага, юны разведчык непрыкмет-

на зпік. Толькі выпаходлівасць і смеласць выратавалі яму жыццё.

А праз тыдзень пасля гэтага здарэння Жэня разам з партызанамі прабраліся ў Шаркаўшчыну, дзе размяшчаўся варожы гарнізон, і без адзінага выстралу абязброілі вартавых, а потым адправілі іх у штаб брыгады...

За баявыя заслугі перад радзімай ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Толькі праз дваццаць год узнагарода знайшла героя. А уручаў яе ў Ленінградзе на ўрачыстым зборы ў Палацы піянераў былы камісар партызанскай брыгады імя Суворава Мікалай Ягоравіч Усаў. У гэты ўрачысты момант піянеры як бы зноў прымалі яго ў свае рады. А чырвоны гальштук павязаў партызанскаму разведчыку яго сын.

Ваню Слабуху было 14 гадоў. Ён мужна пераносіў цяжкасці партызанскага жыцця. Быў выпаходлівым і кемлівым разведчыкам. Ваня заўважыў, што ў час бою, калі ў варожым тыле загараліся белыя ракеты, немцы заўсёды адступалі. Умоўны гэты сігнал ці проста выпадковасць?

Адпойчы ў час бою, калі для партызан склалася крытычная сітуацыя, ён вырашыў праверыць свае назіранні. Прабраўся ў тыл ворага і пусціў белыя ракеты. Фашысты адступілі. Доўга ламалі партызаны галаву, што ж здарылася? І толькі тады адкрыў сакрэт Ваня Слабуха. Камандзір атрада перад строем расцалаваў юнага героя.

Л.В.Праннік, былая настаўніца
Шаркаўшчынскай сярэдняй школы.

Сталелі ў баях

З успамінаў П.Касцюкевіча, былога разведчыка партызанскай брыгады «Спартак»

У кожнай разведцы штаба партызанскай брыгады «Спартак» я быў самым маладым. Было мне ў той час 17 гадоў. Начальнік разведкі Віктар Зуеў, былы кадравы кавалерыст, дапамог хутка авалодаць верхавой яздой у сядле. Многаму мяне вучылі і дапамагалі мае старэйшыя таварышы Юльян Мацук, Веня Лук'янаў і Сямён Міляшэвіч, які пасля гібелі В. Зуева стаў нашым начальнікам разведкі.

Перад намі была пастаўлена задача: як можна больш даведацца пра ворага, яго баявую моц, пра перамяшчэнне войскаў і паліцэйскіх атрадаў.

Па няходжаных сцяжынках, па балотах і прасёлачных дарогах мы непрыкметна прабіраліся ў самыя аддаленыя вёскі, падыходзілі да варожых гарнізонаў і праніклі іншы раз у іх.

Вясной 1944 г. нам паведамілі, што з боку Полацка супраць партызан будзе накіравана варожая групоўка. Камандаванне брыгады адправіла групу разведчыкаў у складзе пяці чалавек на ўсход, да Дзісны, пад Полацк, каб упэўніцца ў гэтым. У склад гэтай групы ўваходзіў і я. Старшым групы быў назначаны вопытны разведчык Іван Макарэнка. Па бяспечных месцах мы ехалі днём, па небяспечных — поччу.

Было гэта ў канцы мая. Стаяла ціхая зорная ноч. Мы перасяклі бальшак Шаркаўшчына — Новы Пагост і звярнулі на прасёлачную дарогу. З абодвух бакоў дарогі чарнелі дахі хутароў. І раптам злева і справа раздаліся аўтаматныя чэргі. Трасіруючыя кулі кінжальным агнём разрэзалі сінь ночы. Конь правадніка ўздыбіўся, праваднік зваліўся ў канаву, а нашы ва ўсю сілу кінуліся наперад. Кіламетры чатыры, не чуючы пад сабой зямлі, імчалі нас коні.

Спыніліся на ўзлеску бярозавага гаю. Слава богу, усе жывыя і цэлыя, толькі плячо майго пінжака кранула куля.

Вяртаючыся з разведкі, мы даведаліся, што ў тую ноч на дарозе з Шаркаўшчыны на Новы Пагост рухаўся буйны фашысцкі абоз пад узмоцненай аховай гітлераўцаў і іх памагатых. Абоз, звярнуўшы з дарогі, спыніўся на начлег. Вартавыя пасты абозу і абстралялі нас. Пазней абоз гэты быў разбіты партызанамі Міёршчыны.

Гітлераўскі гарнізон у вёсцы Васевічы прыносіў нашай брыгадзе нямала непрыемнасцей. Амаль кожны дзень фашысты адкрывалі мінамётны агонь па ўзлеску. Міны рваліся недалёка ад лагера нашага другога атрада. Камандаванне брыгады вырашыла знішчыць варожы гарнізон. Патрэбна было вывучыць усе падходы да вёскі Васевічы і па магчымасці выявіць размяшчэнне агнявых кропак ворага.

Гэта нялёгкае заданне клалася на плечы

разведкі. Пад вёскай Васевічы мне давялося тры разы хадзіць у разведку: з Аняй Зелянковай і два разы з начальнікам разведкі Сямёнам Міляшцэвічам. Ноччу выпаўзлі на адкрытае месца, заляглі ў канаву і зрабілі некалькі адзіночных выстралаў з аўтаматаў. Калі з боку вёскі ўдарыў шквальны агонь, мы хуценька адпаўзлі ў іншае месца і з-за кустоў назіралі ў бінокль, адкуль вядзецца агонь. З гэтага месца мы пайшлі толькі тады, калі пацямнела і фашысты амаль спынілі страляніну. Нам удалося выявіць, дзе больш за ўсё знаходзіцца ворагаў.

У ноч на 20 чэрвеня 1944 г. гарнізон у Васевічах быў разгромлены. У гэтым баі загінулі і нашы баявыя таварышы, цудоўныя хлопцы, сярод якіх быў мой старэйшы сябра Веня Лук'янаў, самы малады камісар 4-га атрада нашай брыгады. Было яму 20 гадоў.

Незабыўны сорак другі

З успамінаў П.В.Гур'янава, былога камісара партызанскага атрада № 4 брыгады «Спартак»

У 1942 г. лагер партызанскага атрада, на базе якога потым вырасла партызанская брыгада «Спартак», знаходзіўся прыблізна за два кіламетры ад прымыкаючых да Казянскіх лясоў хутароў вёскі Азерава і за 300 метраў ад так званай журавоўскай копанкі. Так мясцовыя жыхары называлі канаву, якая працягнулася ад Азерава да вёскі Замошша Браслаўскага раёна.

Гэтая, заўсёды напоўненая вадой глыбокая канава як бы раздзяляла на дзве часткі вялізны масіў Казянскіх лясоў, які стаў раёнам дыслакацыі брыгады «Спартак».

Восень 1942 г. была сухой, цёплай. Першыя замаразкі выдаліся непрацяглымі і лёгкімі, што давала магчымасць партызанам да пачатку нямецкай карнай экспедыцыі (да 22 лістапада) жыць у шалашах. Толькі штаб атрада размяшчаўся ў невялікім драўляным доміку.

Партызанскія разведчыкі, якіх узначальваў Фёдар Копышаў, устанавілі, што ў склад карнай экспедыцыі ўваходзілі даволі вялікія сілы розных відаў войскаў. Але, пагледзячы на гэта, народныя мсціўцы не панікавалі, а спакойна рыхтаваліся да арганізаванага адыходу. Усё трэба было зрабіць так, каб і ворагу нанесці значныя страты, і сваіх людзей зберагчы.

І вось раніцой 22 лістапада пачалося. Карнікі ішлі да лесу, дзе размяшчаўся партызанскі лагер. Падняўшыся па трывозе, партызаны зрабілі некалькі групавых залпаў па ворагу. Тым самым далі зразумець фашыстам, што іх чакае сур'ёзнае супраціўленне. Вядома, сілы былі няроўныя. Прыняць сустрэчны бой — азначала загубіць увесь атрад. Таму, выкарыстоўваючы некаторую разгубленасць у фашысцкіх радах, партызаны здолелі імгненна адарвацца ад непрыяцеля, перабраўшыся цераз копанку. Варожыя танкі спыніліся, а пехацінцы праследаваць народных мсціўцаў без падтрымкі тэхнікі пабаяліся.

Камандаванне партызанскага атрада вечарам гэтага ж дня вырашыла вывесці людзей у больш недаступны па свайму забалочанасці раён у Казянскіх лясах — у Жураўліпае балота. Яно размяшчалася паміж вёскамі Журавоўшчына і Свілы. Пад покрывам ночы партызаны выйшлі на ўскраек лесу. Адсюль было відаць мноства пажараў. Гітлераўцы спальвалі ўсе прымыкаючыя да лесу хутары і вёскі.

Партызаны, прыбыўшы на новае месца дыслакацыі, збудавалі некалькі зямлянак, таму што пачалі ўзмацняцца маразы. Дрэнна было з харчаваннем. Усё гэта прымушала больш дасканала прадумваць пытанні будучай зімоўкі. Было прынята рашэнне часова пакінуць раён Казянскага лесу і, раздзяліўшыся на невялікія групы, перабрацца ў Расонскі раён. Леанід Жабін павёў адну групу. Мікалай Сцяпанаў узначаліў групу, у якую ўвайшлі камандзір узвода Іван Шафранскі, кулямётчык Аркадзь Озераў і яго брат Пётр, Васіль Голубеў, я і іншыя партызаны, усяго 12 чалавек. Астатнія групы павялі таксама найбольш вопытныя партызанскія камандзіры.

Наша група ішла ноччу, а днём спынілася на двух хутарах, што знаходзіліся за 13 кіламетраў ад Шаркаўшчыны. Размясціліся і ляглі спаць, выставіўшы вартавога. Але дзесьці каля дзвюх гадзін дня ён разбудзіў нас крыкам «Паліцэйскія!». Мы ўсе імгненна ўскочылі, разабралі зброю. З боку невя-

лікага пераліску кароткімі перабежкамі набліжаліся фашысцкія памагатыя.

Давялося выбірацца з хаты праз кухоннае акно і ўсе прыцэлыны агонь у адказ. Пасля бою, які працягваўся паўтары гадзіны, паліцэйскія адступілі. Іх страты склалі 15 чалавек. Раніліў калены сустаў Васіля Голубева.

У час нашага рэйду прыйшлося пераходзіць раку Заходняя Дзвіна, на якой лёд яшчэ быў даволі тонкі. Сустракаліся і цяжкасці іншага характару.

4 снежня наша група выйшла ў Рассонскі раён і ўзяла курс на вёску Якубова.

Заўсёды заставаўся камісарам

З успамінаў Ф.А.Конышава, былога намесніка камандзіра партызанскай брыгады «Спартак»

Міхаіл Купрэевіч Ігнацьеў нарадзіўся у 1904 г. у вёсцы Юркавічы Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці, аднак большую палову свайго жыцця працаваў на Шаркаўшчыне.

У 1931 г. ён уступіў у рады Камуністычнай партыі. Працаваў на савецкай і партыйнай рабоце. З 1939 г. у Чырвонай арміі. Быў намеснікам камандзіра роты па палітычнай часці. Прымаў удзел у вызваленні Заходняй Беларусі. Потым — савецка-фінляндская вайна. За актыўныя баявыя дзеянні Міхаіл Купрэевіч быў удастоены медаля «За адвагу».

Страшная вестка аб пачатку Вялікай Айчыннай вайны застала Міхаіла Купрэевіча на Гарадоччыне. На трэці дзень Ігнацьеў быў у радах Чырвонай арміі на пасадзе камісара батальёна. Давялося перажыць і адступленне, і акружэнне. Так атрымалася, што застаўся на тэрыторыі, акупіраванай ворагам. Ён збіраў вакол сябе людзей: камандзіраў Чырвонай арміі, салдат, якія трапілі ў акружэнне, а таксама жыхароў вёсак.

Словы праўды камісара, яго пястрымнае жаданне помсціць ворагу пасялялі веру ў сэрцы кожнага, у непераможнасць савецкага народа.

Людзі верылі камісару, ахвотна далучаліся да партызанскай барацьбы. У пачатку 1942 г. Міхаіл Купрэевіч з групай сваіх таварышаў прыбыў у 2-ю Беларускую партызанскую брыгаду імя П.К.Панамарэнкі, якая дыслацыравалася на тэрыторыі Гарадоцкага раёна. Крыху пазней Ігнацьеў быў накіраваны на мяжу трох брацкіх рэспублік: Беларусі, Літвы і Латвіі для выканання асабліва важнага задання.

Тэрыторыю Вілейскай вобласці ён прайшоў, калі можна так сказаць, на пасадзе палітрука. З яго актыўнай дапамогай была створана партызанская брыгада «Спартак», камісарам якой ён і стаў.

Міхаіл Купрэевіч быў душой партызан. У час бясў і выкананні самых складаных аперацый камісар заўсёды быў наперадзе, знаходзіў патрэбныя словы, якія падбадзёрвалі народных мсціўцаў у самыя цяжкія хвіліны. Ён умеў разумець кожнага. Заўсёды, як бы ні было цяжка на душы, са шчырай усмешкай, з бацькоўскім клопатам сустракаў і праводзіў на заданні таварышаў па барацьбе. Партызаны адказвалі свайму важаку ўзаемнасцю.

Ігнацьеў не любіў затрымлівацца ў штабе. Ён заўсёды быў там, дзе чакалі яго дапамогі і падтрымкі. Праводзіў сходы, зачытваў зводкі Саўінфармбюро. І людзі, якія так чакалі вызвалення, услухоўваліся ў кожнае слова камісара, верылі ў блізкую перамогу.

Памятаю, як напярэдадні гадавіны Вялікага Кастрычніка мы разам з камісарам навсдвалі вёскі Дуброўка, Якшты, Сямёнавічы, Азерава. У хатах, дзе праходзілі сходы, заўсёды збіралася шмат сяльчан. Прамоўца ён быў здольны. Гаварыў заўсёды горача, пераканана, праўдзіва. Вельмі часта бывала, што адразу пасля сходу камісар прыводзіў у атрад папаўненне.

Цяжка, з болем у сэрцы Міхаіл Купрэевіч успрымаў весткі аб смерці баявых таварышаў. Ён першым ірваўся ў бой. І заўсёды, у кароткія хвіліны перапынку, калі партызаны здзіўляліся яго храбрасці, ён ціха адказваў:

— Трэба помсціць за смерць нашых таварышаў.

Восенню 1942 г. Міхаіл Купрэевіч з атрадам партызан граміў варожыя гарнізоны ў вёсках Ёды і Пятровічы.

У сакавіку 1944 г. камісар вёў ляскіх салдат на варожы гарнізон, які быў раз-

мешчаны ў Відзах. Аперацыя была праведзена паспяхова.

За баявыя заслугі Міхаіл Купрэевіч быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, медалямі.

Пасля злучэння з часцямі Чырвонай арміі ў 1944 г. ён быў накіпуты на савецкай рабоце ў Шаркаўшчынскім раёне. Аднаўляў разбураную гаспадарку. Да баявых узнагарод прыбавіліся ордэн «Знак Пашаны», медалі, граматы.

І на пенсіі Міхаіл Купрэевіч праводзіў значную работу па патрыятычнаму выхаванню моладзі. Ён бываў у калгасах, саўгасах, школах, на прадпрыемствах. Заўсёды заставаўся камісарам.

Мы часта сустракаліся пасля вайны.

Узрыў электрастанцыі

Дыверсіі на энергааб'ектах паралізоўвалі мясцовую прамысловасць, якую гітлераўцы прыстасоўвалі для забеспячэння патрэб арміі. Ахову такіх аб'ектаў нясслі ўзмоцненыя падраздзяленні.

Я падбіраў людзей і праводзіў інструктаж па падрыхтоўцы дыверсій. Нам неабходна было ўзарваць электрастанцыю, якая знаходзілася за кіламетр ад Шаркаўшчыны ў пасёлку Чырвоны Двор. Даў заданне Антону Станіслававічу Болтычу, які ваяваў у складзе «Паўночных», і перадаў яму магнітныя міны. Па даных разведчыкаў, на электрастанцыі ішлі рамонтныя работы.

Дамовіліся, што ён, Болтыч, разам з мясцовым жыхаром Генадзем Антонавічам Гардзіенкам пасдуць у Чырвоны Двор малоць зерне і пры адпаведных абставінах узарвуць электрастанцыю. Млын прымыкаў да электрастанцыі, а начальнікам гэтых двух прадпрыемстваў быў адзін і той жа чалавек. Антон Станіслававіч улічыў, што начальнік вельмі любіў выпіць і за чарку спіртнога мог плюнуць нават на інтарэсы «вялікай Германіі», якой, зрэшты, даволі спраўна служыў.

Не даязджаючы да млына, Болтыч і Гардзіенак спынілі падводу насупраць электрастанцыі і сталі слёзна прасіць ахоўнікаў выклікаць начальніка па вельмі важнай справе. Суровая ахова за дзесятак яек выканала просьбу. А праз некаторы час з'явіўся начальнік.

Болтыч стаў настойліва прасіць, што яму і напарніку да зарэзу трэба змалоць некалькі мяшкоў зерня. Начальнік не пагаджаўся. Болтыч мітусіўся, папраўляў клункі ў санях і не пераставаў упрошваць. Нічога не дапамагала. Але вось пад рукой Болтыча штосьці бразнула, і з-пад саломы быццам выпадкова паказалася бутля, заткнутая пакуллем. Начальнік адразу павесялеў, стаў больш лагодным. Болтыч заўважыў такую крутую перамену. Ён без цырымоній прапанаваў выпіць і тут жа дастаў сала, хлеб, цыбулю. Начальніку хацелася хутчэй пахмяліцца і ён пабег шукаць шклянкі. Зразумеўшы, што здзелка адбылася, ахова пайшла ад варот.

Выкарыстаўшы зручную хвіліну, Антон Станіслававіч шмыгнуў унутр машыннай залы электрастанцыі. Міну прыляпіў да паліўнага бака дызеля. Імгненна выбег назад, абышоў сані, паправіў вупраж.

У гэты час начальнік электрастанцыі запрасіў яго ўвайсці ў службовае памяшканне. Болтыч прыхапіў клунак з закускай, бутлю з самагонкай і пакрочыў у кантору.

Пакуль Болтыч бавіў час з начальнікам, Гардзіенак змалоў зерне і незаўважна прыляпіў другую міну на генератары.

Зрабіўшы сваю справу, Болтыч і Гардзіенак хуценька селі ў сані і без аглядкі памчаліся прэч ад Чырвонага Двара.

Міны спрацавалі. З 19 студзеня 1944 г. амаль месяц электрастанцыя бяздзейнічала. Спыніўся па млыне памол зерня для гітлераўскай арміі.

Пасля гэтай дыверсіі гітлераўцы ўзмацнілі ахову на энергааб'ектах. Зноў узарваць электрастанцыю не ўдалося.

Л.Л.Танканог, былы партызан атрада імя Г.К.Жукава.

Чатыры меткі вайны

З успамінаў І.В.Гінько, былога начальніка разведкі партызанскай брыгады «Спартак»

Нялёгкі час выпаў на маё жыццё. Аб гэтым сведчаць чатыры меткі вайны. Роўна столькі варожых куль спрабавалі дастаць маё сэрца, забраць жыццё.

Аднойчы атрымаў заданне даставіць сакрэтны дакумент у Відзы, які потым падпольшчыкі перададуць камандзіру. Але ў гарадскім пасёлку нечакана быў схоплены гітлераўцамі. Галоўнае, што непрыкметна ўдалося выкінуць у кусты пакет з сакрэтным данясеннем.

Допыт быў кароткі, моцна білі. Памятаю, як па вуліцы, каля сквера, пямецкі афіцэр выпусціў у мяне абойму з пісталета. Фашыст, відаць, вырашыў, што я мёртвы. Ноччу я апрытомнеў. З усіх ран цадзілася кроў. Мне неяк удалося ўстаць і пайшоў туды, куды глядзелі вочы. Выратаваў стары літовец. Прывёў на хутар, перавязаў раны, накарміў...

З партызанскага атрада мяне накіравалі ў шпіталь у Маскву. Шэсць месяцаў урачы змагаліся за маё жыццё. Хірургі дасталі з цела чатыры кулі. Залечваў раны аж да дня Перамогі.

Дні барацьбы і страт

З успамінаў Фёдара Кірылавіча Юрчанкі, камандзіра партызанскай брыгады «Кастрычнік»

...Побач з аснoўнай задачай умацавання ўчастка абароны, адведзенага нам Ушацкай аператыўнай групай, брыгада «Кастрычнік» грамiла фашысцкія гарнізоны, удзельнічала ў рэйкавай вайне. Акрамя Лужкоў, Празарок, Зябак, Плісы, Падсвілля і Галубіч у Пліскім раёне дабавіўся яшчэ адзін гарнізон праціўніка ў вёсцы Чарневічы. Акупанты павялічылі іх колькасны састаў. Апаясалі акопамі, дзотамі, бліндажамі. Густа абнеслі калючым дротам. Замініравалі найбольш магчымыя падыходы. Была ўзмоцнена і ахова чыгункі Полацк — Маладзечна. Па абодва бакі чыгуначнага палатна таксама дабавіліся абарончыя збудаванні.

Адчуваючы сілу партызанскіх удараў, непрыяцель стаў дэманстраваць сілу сваіх гарнізонаў. Гэта наглядалася ў Падсвіллі і Зябках, нават пры падтрымцы танкаў. Асабліва шмат было варожых салдат у Галубічах і Падсвіллі. Падчас у суседніх з гэтымі гарнізонамі вёсках кватаравалі запасныя палкі праціўніка.

У пачатку 1944 г. гітлераўскае камандаванне арганізавала ў Галубічах васннае навучанне салдат малодшага ўзросту, толькі што прызваных у армію. Для аховы сваіх падлесткаў фашысты стварылі дадатковыя гарнізоны ў вёсках Бараўцы і Ольшчына. Гарнізон у Бараўцах уключаў 80 чалавек з узбраенiем: два ротныя міна-мёты, два станковыя і сем ручных кулямётаў, шмат аўтаматаў.

Праверыўшы разведданыя і стан непрыяцельскіх гарнізонаў ва ўсіх трох населеных пунктах, камандаванне брыгады распрацавала план правядзення аперацыі па разгрому фашысцкага гарнізона ў вёсцы Бараўцы. У аперацыі ўдзельнічалі першы, другі і чацвёрты атрады.

Сяляне Варонкаўскага сельсавета прыступілі да палявых работ. Па сельсавету да сяўбы падрыхтавана 300 га зямлі. Селянін вёскі Амбросенкі Міхаіл Палягошка падрыхтаваў і зараў 0,70 гектара пад авёс. Таксама прыступілі да сяўбы сяляне вёскі Лысёнкі — В.Мядзьведзь і вёскі Лазоўка — А.Тарасёнак. Яны засеялі ад аднаго да двух гектараў зернявых.

Пачаўся сезон па навігацыі лесаматэрыялу. На навігацыі працуе 62 чалавекі. За красавік спушчана на ваду 5000 кубаметраў драўніны, дастаўлена на месца назначэння 2500 кубаметраў.

* * *

Ва ўсіх арганізацыях, установах, сельсаветах, сярод сялян вядзецца азнаямленне з Законам аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1946—1950 гг. Па раёну па гэтаму пытанню працуе больш 200 агітатараў і камсамольцаў.

ЗА ДОБРУЮ СЯЎБУ

Да веснавой сяўбы рыхтавацца я пачаў яшчэ зімой. Адрамантаваў плуг, бароны і другі неабходны інвентар. Насенне лепшага гатунку засыпаў з восені і захоўваў яго ў добра абсталяваным свірне. Ранняй вясной я вывез на поле гной. З надыходам спрыяючых умоў надвор'я я распачаў палявыя работы. Цяпер у мяне падрыхтавана ўся пахатная зямля. У гэтым годзе я засяваю плошчу на 2 гектары больш, чым у мінулым. У мяне не пустуе ні адзін метр зямлі. Праўду сказаць, я сустрэўся з цяжкасцю, таму што не маю свайго каня. Але мне аказалі дапамогу суседзі. Ужо засеяна 0,30 гектара ячменю, 0,50 гектара аўса. У хуткім часе закончу сяўбу зернявых, а затым прыступлю да пасадкі бульбы і іншых культур.

В.Кукоўскі, селянін вёскі Пятровічы Пялікаўскага сельсавета.

14 мая

БУДАЎНІЦТВА ЦАГЕЛЬНА-ЧАРАПІЧНЫХ ЗАВОДАЎ

Прайшлі страшэнныя знішчальныя гады вайны. Наступіў час залячыць нанесеныя раны. Аднавіць, адбудаваць як мага хутчэй усё тое, што было знішчана, разбурана. Вялікае значэнне для будаўніцтва маюць цагельныя заводы.

Прымяненне цэглы і чарапіцы дазволіць стварыць добрае і выгаднае жыллё для працоўных. Без цэглы нельга пабудаваць вялікіх будынкаў, без цэглы нельга аднавіць фабрыкі і заводы. Цэгла зэканоміць значную плошчу лясоў. Яшчэ ў 1945 годзе было пачата будаўніцтва двух цагельна-чарапічных заводаў на тэрыторыі Шаркаўшчынскага раёна. На працягу ўсяго года праводзілася падрыхтоўчая работа. Было загатоўлена і вывезена 135 кубаметраў будаўнічага лесаматэрыялу, вывезены бутавы камень для закладкі гофманаўскай печы. Пачалі будаваць 8 сушыльных навесаў, устаноўлена дзве глінамясілкі.

Але гэта толькі пачатак будаўніцтва. Цэглы і чарапіцы як не было, так і няма. Нягледзячы на тое, што колькасць пастаянных рабочых, а таксама сезонных даволі значная, будаўніцтва падзвігаецца вельмі марудна.

Дырэктары заводаў т.т. Беглікаў і Трашчанкоў не могуць правільна арганізаваць расстаноўку рабочай сілы на будаўніцтве. Самі яны не адчуваюць належнай адказнасці за працу. Працуючы без планаў і графікаў. На заводах адсутнічае працоўная дысцыпліна сярод рабочых і служачых. Дрэнна, вельмі дрэнна так неахайна адносіцца да даручаных абавязкаў.

В.Лісюк.

22 чэрвеня

ШКОЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

Пачынаючы з 1 ліпеня 1946 года ў нашым раёне пачнуць працаваць дзве дзіцячыя аздараўленчыя пляцоўкі. Ужо падабраны для іх памяшканні ў Шаркаўшчынскай сярэдняй школе, другая ў Збядоўскай школе Навасёлкаўскага сельсавета. Тут будуць адпачываць дзеці загінуўшых воінаў, партызан, інвалідаў Айчыннай вайны, а таксама дзеці рабочых, служачых і сялян. Пляцоўкі разлічаны на 150 чалавек.

* * *

19 чэрвеня 1946 года выехала першая чарга піянераў у абласны піянерскі лагер г. Глыбокае. Усяго выехала 10 піянераў. На працягу 20-дзённага жыцця ў лагерах яны культурна і жыццерадасна правядуць свой час.

1947 г.

25 верасня

ВЫПУСК СЛУХАЧОЎ РАЙПАРТШКОЛЫ

У гэтым месяцы адбыўся выпуск слухачоў раённай партыйнай школы. За перыяд работы школы слухачы поўнасцю вывучылі праграмны матэрыял.

Праверка ведаў паказала, што за выключэннем малой колькасці слухачоў, праграмны матэрыял усвоены. Глыбокія веды на выпуску паказалі Ігнацьеў, Красько, Міронава, Рабцаў і іншыя. З 26 слухачоў 20 выпушчана, 6 пакінута на паўторны курс.

Цяпер укамплектаваны новы састаў слухачоў райпартшколы колькасцю 29 чалавек, якая пачне працаваць у гэтым месяцы.

1948 г.

9 верасня

АДКРЫТЫ ДЗІЦЯЧЫЯ ЯСЛІ

З 6 верасня ў м. Шаркаўшчына пачалі функцыяніраваць дзіцячыя яслі. У першы дзень прынялі 18 дзяцей. Памяшканне ясляў дабротна абсталявана. Чыста і ўтульна ў пакоі для адпачынку... Кожнае дзіцё забяспечана адзеяльцам, простынькамі, падуш-

кай, палаценцам. Для дзяцей адпушчаны самыя лепшыя прадукты харчавання.

Для догляду за дзецьмі падабраны выхавацельніцы. Медыцынскі нагляд за станам здароўя дзяцей ажыццяўляе медсястра, якая ўвесь час знаходзіцца пры яслях. Апрача гэтага спецыяльна вылучаны ўрач, які штодзённа будзе наведваць дзяцей.

17 верасня

РАСПАЧАТА БУДАЎНІЦТВА ГІДРАЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ

Па ініцыятыве раённага радыёвузла і сялян распачата будаўніцтва невялікай гідраэлектрастанцыі на рэчцы каля вёскі Малыя Алашкі. Ужо закладваецца плаціна. Гідраэлектрастанцыя абслужыць радыёвузел пры Полаўскім сельсавеце і дасць электрасвет для сялян вёскі.

КУЛЬТУРА І БЫТ

Для абслугоўвання культурных запатрабаванняў працоўных на вёсцы адкрыта 13 хат-чытален, 38 чырвоных куткоў, 2 клубы. 13 сельскіх Саветаў тэлефанізавана, радыёфіцыраваны райцэнтр, МТС, 2 калгасы.

Маецца 2 клубы, бібліятэка, 2 кінаперасоўкі, а ў райцэнтры — Дом соцкультуры, раённая бібліятэка, кінатэатр.

АСВЕТА

Зараз на тэрыторыі раёна працуе 64 школы. З іх сярэдніх — 2, няпоўных сярэдніх — 10. У гэтым годзе ахоплена навучаннем больш чатырох тысяч дзяцей.

14 кастрычніка

АДНОЎЛЕНЫ СМАЛАКУРНЫ ЗАВОД

Сіламі промарцелі «Чырвоны сцяг» адноўлены і пушчаны ў дзеянне смалакурны завод у Беладворскім сельсавеце. На днях завод даў першую прадукцыю. 100 кілаграмаў скіпідару, 700 кілаграмаў калёснай мазі, 50 кілаграмаў абутковага дзёгцю і тону драўлянага вуглю атрымалі смалакуры з адной печы... У гэтым годзе завод дасць спажыўцам яшчэ каля 400 кілаграмаў шкіпідару, 2800 кілаграмаў абутковага дзёгцю.

29 кастрычніка

РАДЫЁФІЦЫРАВАНА ТРЫ НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ

Сіламі камсамольцаў і моладзі Варонкаўскага і Більдзюгскага сельсаветаў да 30-годдзя ВЛКСМ зроблена 28 дэтэктарных радыёпрыёмнікаў і радыёфіцыравана тры населеныя пункты.

9 снежня

АДКРЫТА СУКНАВАЛКА

Адноўлен і пачаў працаваць пры Шаркаўшчынскім райпромкамбінаце сукнавальны цэх. Прапускная здольнасць яго 250 метраў сукна ў суткі. Днямі з цэха выйшла першая прадукцыя. Якасць зваленага сукна добрая.

Лічбы і факты

У 1949 г. на тэрыторыі раёна 539 населеных пунктаў. Прамысловасць была прадстаўлена шэрагам дробных прадпрыемстваў. Працавалі два цагельныя заводы, чатыры млыны: у вёсках Чырвоны Двор, Шкунцікі, Падоршчына, Радзюкі. Прамысловая арцель у г.п. Шаркаўшчына мела абутковы цэх (10 чалавек), швейны цэх (10 чалавек), кавальскі (6 чалавек), цэх апрацоўкі воўны (4 чалавекі), фатаграфію і цырульню.

Невялікія маслазаводы, размешчаныя ў Шаркаўшчыне, Ёдах, Германавічах, выпускалі масла, сыр, казеін і марожанае.

У сталярнай майстэрні ў вёсцы Дуліна выраблялі сталы, табурэты. Была тут і калёсная майстэрня (3 чалавекі).

У вёсцы Палялейкі працавала скураная майстэрня (3 чалавекі).

У 1949 г. аўтамабільны парк раёна меў 10 грузавых аўтамабіляў і адну спецыяльную машыну ГАЗ-АА.

У 1949 г. працавалі 2 сярэднія, 10 сямігадовых, 42 пачатковыя школы, якія наведвалі 4726 дзяцей.

У 1949 г. меліся 3 бальніцы на 70 ложкаў, 11 урачоў, 50 чалавек сярэдняга медыцынскага персаналу.

У 1949 г. у раёне было 13 партыйных арганізацый і адна кандыдацкая група, у якіх налічваліся 104 члены і 28 кандыдатаў ВКП(б). У 36 камсамольскіх арганізацыях налічваліся 954 члены ВЛКСМ.

Па матэрыялах Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Глыбокае. Ф. 1980. Воп. 1. Спр. 1. Л. 1—5; Ф. 1996. Воп. 1. Спр. 6. Л. 1—39; Ф. 2011. Воп. 1. Спр. 3. Л. 7; Ф. 2015. Воп. 1. Спр. 3. Л. 1—20.

Падрыхтаваў З.Н.Раслевіч.

За годам год...

У пачатку 1950-х гадоў адбыліся значныя змены ў народнай гаспадарцы раёна. Была завершана работа па ўзбуйненні калгасаў. На 1 студзеня 1955 г. налічваліся 32 калгасы. Плошча сельскагаспадарчых угоддзяў складала 54 488 га. Намаганні калгаснага сялянства накіроўваліся на павелічэнне ўраджайнасці палёў, аднак да 1955 г. яна ўсё яшчэ заставалася нізкай. Ураджайнасць збожжавых складала 3 ц, ільнасемя — 2,4, бульбы — 40,1 ц з гектара. Валавы збор зерня складаў 19,2 тыс. ц.

У калгасах укараняўся радковы і перакрыжаваны спосаб сяўбы зерневых, квадратна-гнездавы спосаб пасадкі бульбы, выкарыстоўваліся дасягненні навукі і практыкі лепшых калектываў.

На 1 студзеня 1960 г. у раёне дзейнічалі 27 калгасаў і 1 саўгас. Дзяржава ў 1960 г. атрымала ад сельскіх працаўнікоў раёна 7 298 086 л малака, 9358 кг воўны, 11358 ц мяса.

Нарошчвалі магутнасці райпрамкамбінат, раймаслапром, арцель «Чырвоны сцяг», якімі было выраблена ў 1960 г. валавой прадукцыі на 110 021 тыс. рублёў.

Развіццё эканомікі стварала аснову для далейшага павышэння жыццёвага ўзроўню працоўных.

Расшыралася сетка медыцынскіх устаноў, умацоўвалася іх матэрыяльная база, яны папаўняліся новымі работнікамі. У 1955 г. дзейнічала раённая бальніца, 3 урачэбныя ўчасткі, 9 фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Працавалі 8 урачоў і 56 чалавек сярэдняга медыцынскага персаналу.

У 1950-я гады атрымала далейшае развіццё народная адукацыя. На пачатак 1955 г. было адкрыта 6 сямігадовых школ для сельскай і рабочай моладзі. Наведвалі гэтыя школы 120 навучэнцаў. Усяго у 1955 г. налічвалася 70 школ, з іх 6 сярэдніх, 21 сямігадовая і 43 пачатковыя. У іх навучаліся 6082 вучні. У 1960 г. ужо працавала 90 школ, заняткі вялі 684 настаўнікі, з іх 226 з вышэйшай адукацыяй. Узводзіліся новыя школы, дамы культуры і інш. Павялічылася жыллёвае і культурна-бытавое будаўніцтва як у г.п. Шаркаўшчына, так і ў сельскай мясцовасці.

Да пачатку 1960 г. налічваліся 63 клубныя ўстановы. Хуткімі тэмпамі ішла радыёфікацыя і электрыфікацыя населеных пунктаў.

На падставе Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 17 красавіка 1962 г. Шаркаўшчынскі раён быў скасаваны і аднавіў сваю дзейнасць у 1966 г.

У 1966 г. у раёне дзейнічалі 27 калгасаў і 4 саўгасы. Агульная пасяўная плошча складала 39 919 га. Валавы збор зерневых склаў 41 659 ц, бульбы — 201 400 ц. Працавала мясцовая прамысловасць: маслазавод, камбінат бытавога абслугоўвання, агароднінасушыльны завод, прамкамбінат, райаб'яднанне «Сельгастэхніка».

Разам з развіццём сельскай гаспадаркі і прамысловасці развіваліся народная адукацыя і культура. Дзейнічалі 50 масавых бібліятэк з кніжным фондам 224 648 экзэмпляраў, 58 школьных бібліятэк з кніжным фондам 82 980. Працавалі 33 клубныя ўстановы, 21 калгасная бібліятэка.

Значныя сацыяльна-эканамічныя змены адбыліся ў раёне за 1970-я гады. Расшырылася і ўмацавалася матэрыяльнатэхнічная база калгасаў і саўгасаў, павысілася спецыялізацыя і канцэнтрацыя сельскагаспадарчай вытворчасці.

Асноўныя вытворчыя фонды сельскагаспадарчага прызначэння да канца 1970-х гадоў дасягнулі 61,4 млн. рублёў — у 4,3 раза вышэй узроўню 1966 г. Амаль поўнасцю быў абноўлены машынна-трактарны парк. Энергетычная магутнасць гаспадарак павялічылася з 46 тыс. да 156 тыс. конскіх сіл і складала 21 конскую сілу на аднаго працуючага. Капітальныя ўкладанні ў меліярацыйнае будаўніцтва ўзраслі ў 6,1 раза.

У 1980 г. пад пасевы сельскагаспадарчых культур выкарыстоўвалася 15 560 га асушанай ворнай зямлі. З кожным годам павялічвалася ўраджайнасць збожжавых культур, бульбы, ільну, расла прадукцыйнасць працы ў жывёлагадоўлі. У калгасах з'явіліся даяркі-чатырохтысячніцы. Пастаянна нарошчвалася вытворчасць мяса.

Асабліва высокія паказчыкі ў сельскагаспадарчай галіне былі дасягнуты ў 1976 г. Ураджайнасць збожжавых і зернебабовых культур склала па раёне 34 ц з гектара, а ў калгасах імя Гагарына, імя Леніна, саўгасе «Шаркаўшчынскі» больш за 40 ц.

Былі атрыманы ў гэтых гаспадарках і высокія ўраджаі бульбы, кармавых каранеплодаў і льну.

Валавы збор збожжа ў 1976 г. склаў 72 267 т, бульбы — 19 407, ільновалакна — 2723, ільнасемя — 1839 т. Гэтыя паказчыкі не былі перасягнуты ў наступныя гады, а некаторыя з іх зменшыліся да пачатку 1980-х гадоў у 2—3 разы.

Паглыбляўся працэс канцэнтрацыі і спецыялізацыі ў жывёлагадоўлі. Эфектыўна працавалі жывёлагадоўчыя комплексы па вытворчасці малака ў калгасе «Іскра», па адкорме буйной рагатай жывёлы ў калгасе «Маяк», па адкорме свіней у саўгасе «Гарадзец».

Спецыялізаванае развіццё жывёлагадоўлі запатрабавала стварэння адпаведнай кармавой базы. У дастатковай колькасці вялася нарыхтоўка для грамадскай жывёлы сена, сенажу, сіласу, караняплодаў. Забяспечанасць на адну ўмоўную галаву складала каля 24 ц кармавых адзінак, што дазваляла ў асноўным паспяхова развіваць жывёлагадоўлю. У 1976 г. вытворчасць малака на 100 га сельгасугоддзяў склала 450,2 ц, мяса 108,8 ц.

Аб'ёмы прамысловай вытворчасці ў 1976 г. у параўнанні з 1966 г. узраслі ў 3,5 раза. За 4 гады дзесятай пяцігодкі выпушчана прадукцыі на суму 9 млн. 731 тыс. рублёў. Звышпланавы паказчык склаў 170 тыс. рублёў. На 102,3% забяспечана выкананне плана рэалізацыі прамысловай прадукцыі.

Дасягненні ў эканоміцы 1970-х гадоў далі магчымасць дзяржаве выдзяляць значныя сродкі на развіццё культуры і адукацыі. Толькі на народную адукацыю ў 1979 г. выкарыстана 1 млн. 500 тыс. рублёў. На выхаванне аднаго дзіцяці ў дашкольных установах раёна было выдаткавана 320 рублёў. Жыхары мелі ў асабістым карыстанні 367 легкавых аўтамабіляў, 2877 матацыклаў. Грашовыя ўклады насельніцтва склалі 16,5 млн. рублёў.

З распадам СССР у 1990-я гады пачаўся спад аб'ёмаў вытворчасці прамысловай прадукцыі ў раёне. У 1990 г. было выраблена 4120 тыс. штук цэглы, у 1996 г. — 3230, у 2000 г. — 1089 тыс. штук.

Зменшылася выпечка хлеба. Калі каўбасных вырабаў у 1990 г. выпускалася 233 т, то ў 1996 г. — 30 т (найбольш нізкі паказчык).

У 1990-я гады знізіліся аб'ёмы вытворчасці на кансервава-агароднінасушыльным заводзе. У 1990 г. прадпрыемства выпусціла 154 т. сушанай агародніны, 4640 тубаў кансерваванай прадукцыі. У 1996 г. гэтыя лічбы адпаведна склалі 4 т і 1107 тубаў. У 2002 г. завод спыніў выпуск сушанай агародніны.

У 2002 г. адзначаецца рост аб'ёмаў вытворчасці прамысловай прадукцыі ў параўнанні з 1995—1996 гг.

Сёння ў прамысловы комплекс раёна ўваходзяць 4 прадпрыемствы: гэта унітарнае прамысловае прадпрыемства «Кансервава-агароднінасушыльны завод», унітарнае прамысловае прадпрыемства «Камбінат кааператыўнай прамысловасці», унітарнае кааператыўнае прадпрыемства «Камбінат будматэрыялаў», унітарнае прамыс-

У швейным цэху камбіната бытавога абслугоўвання г.п. Шаркаўшчына.

лова-нарыхтоўчае прадпрыемства «Каапнарыхтпром».

На прамысловых прадпрыемствах працуе 335 чалавек, або 4,9 % ад усіх, занятых у народнай гаспадарцы раёна (даныя на 1.1.2003).

У апошнія гады прадпрыемствы пачалі павялічваць выпуск прадукцыі. Аб'ём вытворчасці за 2002 г. склаў 185% да ўзроўню 1995 г. Павялічыўся аб'ём вытворчасці спажывецкіх тавараў: 170 % да ўзроўню 1995 г.

У 2002 г. у раёне было выраблена 1355 тыс. штук цэглы. Выпечка хлеба і хлебабулачных вырабаў склала 1492 т, абнавіўся асартымент, прыкметна палепшылася якасць хлеба. У 2002 г. выпушчана 112 т кандытарскіх вырабаў. Камбінат кааператыўнай прамысловасці асвоіў у 1996 г. выраб макароны (было выпушчана 46 т). У 2002 г. магутнасць прадпрыемства склала 68 т макаронных вырабаў.

Павялічыў выпуск прадукцыі і кансерва-агароднінасушыльны завод: у 2002 г. прадпрыемства выпрацавала 1833 тубы кансерваў (агароднінных і мясных).

У раёне дзейнічаюць 2 будаўнічыя арганізацыі: перасоўная механізаваная калона № 68 і прадпрыемства «Рамонтнік», ёсць дарожна-рамонтная эксплуатацыйная арганізацыя, унітарнае прадпрыемства меліярацыйных сістэм «Шаркаўшчынскае ПМС».

Штогод у раёне будуецца каля 40 кватэр, пераважна ў сельскай мясцовасці. У 2002 г. пабудаваны 42 дамы агульнай плошчай 4891 м². Падрадным спосабам узведзены 12 дамоў агульнай плошчай 1228 м².

Буйнейшы будаўнічы аб'ект — бальнічны гарадок у Шаркаўшчыне. У 2002 г. здадзены ў эксплуатацыю лячэбна-дыягнастычны блок, працягваецца будаўніцтва палатнага корпуса.

Працаўнікі аграпрамысловага комплексу прыкладваюць усе намаганні, каб вывесці раён на ранейшыя пазіцыі. У яго ўваходзяць 15 сельскагаспадарчых кааператываў і 2 сельгаспрадпрыемствы, аграпрамтэхсэрвіс, 35 фермерскіх гаспадарак. У іх працуюць 3272 чалавекі, у тым ліку 390 спецыялістаў сельскай гаспадаркі.

Агульная плошча сельгасугоддзяў складае 70 959 га, з іх меліяраваных зямель — 36 603 га, ворнай зямлі — 45 775 га. Асноўнай прадукцыяй аграпрамысловага комплексу з'яўляюцца мяса, малако, збожжа, лён, бульба, кармавыя культуры.

У аграрным сектары налічваецца 736 трактароў розных марак, 283 аўтамашыны, 155 збожжаўборачных камбайнаў, шмат іншай тэхнікі, 25 953 галавы буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 8000 кароў, 11 040 свіней.

У 2002 г. вытворчасць валавой прадукцыі на аднаго работніка сельскай гаспадаркі складала 4585 рублёў. На 100 га сельгасугоддзяў атрымана 386 ц малака, 64 ц мяса. У сярэднім ад каровы надойваецца па 2491 кг малака, сярэднясутачныя прывагі буйной рагатай жывёлы складаюць 350 г.

Гандлёвае абслугоўванне насельніцтва ажыццяўляе раённае спажывецкае таварыства

Новая вуліца ў СВК «Жаранка».

ства. У яго ўваходзяць 68 гандлёвых прадпрыемстваў (з гандлёвай плошчай 7119 м²), 32 прадпрыемствы грамадскага харчавання на 1614 пасадачных месцаў. 22 сталовыя з гэтага ліку абслугоўваюць школьнікаў.

У сферы рознічнага гандлю спажывецкай кааперацыі і грамадскага харчавання працуе 75 чалавек.

За апошнія гады змяніўся знешні выгляд многіх магазінаў спажывецкай кааперацыі, укараняюцца сучасныя формы гандлёвага абслугоўвання, пашыраецца асартымент тавараў. Па-сучаснаму выглядаюць сёння пераабсталяваныя магазіны «Снежынка», «Універсам» у Шаркаўшчыне. Ёсць 2 фірменныя магазіны: «Гаспадыня» і «Каравай».

Не адмовіліся ў раёне і ад праверaных часам дамоў сацыяльных паслуг у аддаленых вёсках, дзе арганізаваны гандаль таварамі першай неабходнасці для вяскоўцаў. У вызначаныя дні дастаўляюць тавар у вёскі 5 аўтамагазінаў.

Акрамя гэтага, за апошні час у раёне адкрылася 16 прыватных магазінаў.

Бытавыя паслугі жыхарам ажыццяўляе камбінат бытавога абслугоўвання, які мае ў вёсках 16 комплексных прыёмных пунктаў. У гэтай сферы працуе 68 чалавек. Камбінат аказвае насельніцтву сёння 12 відаў паслуг.

1 студзеня 1996 г. адбылася рэарганізацыя раённага вузла сувязі, былі ўтвораны вузел паштовай сувязі і вузел электрычнай сувязі. Паслугі электрычнай сувязі аказваюць насельніцтву 23 аўтаматычныя тэлефонныя станцыі ёмістасцю 4550 нумароў. Устаноўлена 4637 тэлефонных апаратаў, у тым ліку 2446 па гарадской, 2191 па сельскай тэлефоннай сетцы. Маецца 6487 радыётрансляцыйных кропак.

Паслугі паштовай сувязі аказваюць 20 сельскіх аддзяленняў сувязі і ўчастак аграцоўкі пошты ў райцэнтры. Тыраж рэспубліканскіх друкаваных выданняў складае 14 621 экзэмпляр, у тым ліку па індывідуальнай падпісцы 13 509 экзэмпляраў; тыраж абласных выданняў — 1414, з іх па індывідуальнай падпісцы — 1316. Раённую газету «Кліч Радзімы» выпісвае каля 2000 чалавек.

Маецца ў раёне адно аўтатранспартнае прадпрыемства — філіял Глыбоцкага АТП № 16. Аб'ём грузавых перавозак невялікі, адпаведны і грузавы аўтапарк — 3 аўтамабілі. Пасажыраў перавозіць 17 аўтобусаў, якія курсіруюць на 11 прыгарадных маршрутах.

У асабістым карыстанні жыхароў раёна маюцца 2234 легкавыя аўтамабілі, 107 грузавых аўтамашын, 3 аўтобусы, 2016 матацыклаў.

Сістэма адукацыі Шаркаўшчынскага раёна ўключае ў сябе 24 агульнаадукацыйныя школы (9 сярэдніх, 15 базавых), 8 пачатковых, 1 школу-сад, 10 дзіцячых дашкольных устаноў, цэнтр пазашкольнай работы, цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання, дзіцяча-юнацкую спартыўную школу.

У школах навучаюцца 3439 юнакоў і дзяўчат, дашкольныя ўстановы наведваюць 446 дзяцей. Установы адукацыі раёна, абапіраючыся на лепшыя традыцыі педагогікі

Жывёлагадоўчая ферма ў СВК «Жвіранка».

і творча ўкараняючы сучасныя падыходы да навучання, ствараюць аптымальныя ўмовы для развіцця творчай актыўнасці настаўнікаў і вучняў. У апошнія гады ў раёне прайшлі апрабацыю і далі станоўчыя вынікі цікавыя рэспубліканскія і абласныя эксперыменты. Навучаннем і выхаваннем падрастаючага пакалення займаецца 649 педагогаў.

З 1998 г. ідзе апрабацыя мадэлі агульнаадукацыйнай школы з 12-гадовым тэрмінам навучання ў Лужкоўскай школе. Па эксперыментальнай праграме «Крок за крокам» працуюць у шаркаўшчынскай СШ № 1; па праграме «Першы крок» — у дашкольнай установе № 1. У шаркаўшчынскай СШ № 2 і Германавіцкай СШ апрабіруецца мадэль выхаваўчай работы з улікам рэгіянальных асаблівасцей. Эксперыментальная работа працягваецца ў дашкольных установах № 3 і № 5.

Ва ўстановах адукацыі працуюць 16 гурткоў тэхнічнай творчасці, 17 экалагічных, 51 эстэтычны, 16 літаратурных, 13 турысцка-краязнаўчых, 30 спартыўных, 48 дэкаратыўна-прыкладной творчасці, 6 інтэлектуальных, у якіх займаецца амаль 3 тыс. дзяцей. Пры школах адкрыта 8 музеяў, аформлена 10 краязнаўчых куткоў на базе чатырох сярэдніх школ, працуе ДЮСШ (242 вучні).

Сфера аховы здароўя прадстаўлена Шаркаўшчынскім тэрытарыяльным медыцынскім аб'яднаннем, у якое ўваходзяць цэнтральная раённая бальніца на 135 ложкаў, Германавіцкая ўчастковая бальніца на 25 ложкаў, Лужкоўская ўчастковая бальніца на 75 ложкаў, Ёдская сельская ўрачэбная амбулаторыя, 19 фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Працуюць 37 урачоў, 188 работнікаў сярэдняга медыцынскага персаналу. 60 % урачоў і столькі ж работнікаў сярэдняга медперсаналу маюць кваліфікацыйную катэгорыю. У 1997 г. пачата будаўніцтва новай цэнтральнай раённай бальніцы.

Участковая бальніца ў в. Лужкі.

Сетка ўстаноў культуры раёна ўключае 25 клубаў і дамоў культуры, 28 бібліятэк, 2 музеі, 2 дзіцячыя школы мастацтваў, Цэнтр рамёстваў. Пры ўстановах культуры дзейнічаюць 82 калектывы мастацкай самадзейнасці. Шасці калектывам прысвоена званне народных і ўзорных. Гэта хор «Спадчына», цыркавы калектыў «Мара», клуб народных майстроў і самадзейных мастакоў «Талака», калектыў народнай песні «Лужкоўскія песняры», фальклорны калектыў «Купалінка», літаратурна-музычнае аб'яднанне «Світанак».

Візітнай карткай раёна стала свята «Яблычны Спас — усяму час». У традыцыю ўвайшлі раённыя святы «Прыдзісненскія крыніцы», «Вандроўнік, акрылены Богам», «Ільін фэст».

У 2003 г. раённы фестываль дзіцячай і юнацкай творчасці «Каляровыя сны» адзначыў сваё дзесяцігоддзе.

Паслугамі бібліятэк у раёне карыстаюцца больш за 14 тыс. чалавек. Пры бібліятэках працуе 19 аматарскіх аб'яднанняў.

У раёне маюцца 57 калектываў фізкультуры, працуюць 170 спартыўных клубаў і секцый, у якіх займаюцца 3614 юнакоў і дзяўчат. Да іх паслуг 16 спартыўных залаў, 5 стралковых ціраў, 31 прыстасаванае для заняткаў спортам памяшканне. Спартыўную работу вядуць 26 інструктараў па спорце.

У раёне падрыхтаваны 2 майстры спорту, 12 кандыдатаў у майстры, 14 спартсменаў 1-га разраду, 380 спартсменаў масавых разрадаў.

Працуюць 2 маладзёжныя цэнтры — у мікрараёне ДБУ-26 і ў сельгаскааператыве «Вялікае Сяло». Уведзены ў строй стадыён на 1000 пасадачных месцаў у сельгаспрадпрыемстве «Гарадзец».

Дзіцяча-юнацкая спартыўная школа працуе па двух профілях: таэквандо і лёгкая атлетыка. Займаюцца ў ёй 280 юных спартсменаў.

Л.М.Лабачэўская.

Верны клятве Гіпакрата

Памятаюць у раёне ўрача Васіля Усцінавіча Забродскага. Многія з нашых землякоў абавязаны яму жыццём.

Нарадзіўся Васіль Усцінавіч у 1918 г. у Віцебску, закончыў Віцебскі медінстытут, Свярдлоўскую ваенна-медыцынскую акадэмію.

Выдатнік аховы здароўя СССР, заслужаны ўрач БССР — так радзіма адзначыла яго працу. У 1948 г. і 1968 г. быў узнагароджаны граматамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

У Вялікую Айчынную вайну партызанскі доктар Васіль Усцінавіч Забродскі ў брыгадзе асобага прызначэння імя Леніна ўзначальваў санітарную службу.

У зямлянцы пры святле газоўкі рабіў ён аперацыі. Часта замест наркозу параненаму давалі шклянку самагону. Не хапала аперацыйнага інструменту. Нават звычайная піла ішла часам у ход. І параненыя пасля аперацыі выжывалі.

Даводзілася партызанскаму доктару ўдзельнічаць і ў дыверсійных аперацыях, трапляць пад бамбёжкі, прарывацца праз варожую аблогу. А аднойчы выводзіў з акружэння групу партызан без карты, толькі па компасе. Лясы ён ведаў нядрэнна. Аднаго разу доктар сам узначальваў аперацыю, у час якой адбілі ў немцаў жывёлу, прызначаную для адпраўкі ў Германію.

Нялёгкім было і пасляваеннае жыццё спустошанай ворагамі зямлі. На 32 тыс. жыхароў раёна было тады толькі 2 дактары.

У 1946 г. В.У.Забродскага прызначаюць галоўным урачом Шаркаўшчынскага раёна. Былы панскі дом у Базымполлі прывялі ў належны стан, арганізавалі 5 аддзяленняў. Няпроста ўсё было: без святла, без тэлефона, у цеснаце, транспарт — толькі коні.

Забродскі правёў шмат аперацый, больш за 10 тыс. толькі паласных.

Побач з ім заўсёды была жонка — аперацыйная сястра Бася Сямёнаўна, былая медсястра ваеннага шпіталя. Радаваліся калі ў бальніцы ўпершыню загарэліся электрычныя лямпачкі, калі атрымалі першую санітарную машыну. Потым адзначыў наваселле радзільны дом. Выраслі новыя карпусы тэрапеўтычнага, дзіцячага, туберкулёзнага, інфекцыйнага аддзяленняў.

І ва ўсё гэта ўкладзены клопаты Васіля Усцінавіча, таленавітага хірурга, добрага арганізатара, чулага чалавека.

Прыязджалі на работу ў раён і маладыя медыкі, лягчэй стала працаваць і галоўнаму ўрачу, бо гэта была дастойная змена.

Не забывалі Васіля Усцінавіча старыя партызанскія сябры, асабліва тыя, каго ён лячыў, ратаваў.

Васіль Усцінавіч гатовы быў аддаць сваю душу кожнаму хвораму, якому зрабіў аперацыю, мог гадзінамі сядзець каля хворага, мог ноччу прыйсці яго наведаць. Ён з гонарам прайшоў па жыцці, ні разу не парушыўшы клятвы Гіпакрата.

За гады сваёй медыцынскай працы выратаваў тысячы чалавечых жыццяў, падрыхтаваў вопытных урачоў, якія працягваюць яго высакародную справу.

А.Э.Райчонак.

Аўтограф на зямлі

Нарадзіўся Леанід Аляксандравіч Асташонак у 1936 г. у вёсцы Більдзюгі, дзе і цяпер жыве. Дзецьмі вайны называюць яго пакаленне. Памятае, як галасіла маці, праводзячы бацьку на вайну. У школу пераросткам пайшоў. Не адзін такі быў. Надта хацелася вучыцца. Як ні цяжка было, а сем класаў закончыў. У 1949 г., калі ў тутэйшых мясцінах праходзіла калектывізацыя, пачаў працаваць учотчыкам у калгасе. Але цягнула да тэхнікі. Назіраў ён гадзінамі за работай механізатараў, вадзіцеляў, майстраваў мадэлі самалётаў, параходаў. І дзве прывязанасці вясковага хлопца — зямля і тэхніка — дапамаглі зрабіць выбар.

Леанід сабраў патрэбныя даведкі, падаўся ў Германавіцкую МТС. Каля старэйшых тэхнічнай грамаце вучыўся. Два гады давялося папрацаваць на трактары, які ледзь тры плугі цягнуў. Потым 5 гадоў служыў на караблі на Балтыйскім флоце.

У 1955 г. дэмабілізаваўся і вярнуўся ў родную вёску. У першы ж вечар бацька, звычайна строгі і спакойны, расчуліўся ў

Л.А.Асташонак.

час застолля, і адбылася ў іх мужчынская размова.

— Ты, сын, ведаеш цану хлеба, зароблена га ўласным мазалём. Даражы нашым родам і памятай: дзед твой любіў зямлю. На ёй працаваў і я. Твой лёс, відаць, таксама тут.

Так яно і атрымалася. Па накіраванні праўлення гаспадаркі паехаў Леанід на вучобу ў Браслаўскае (цяпер Відзаўскае) СПТВ. Там давялося пазнаёміцца з новай тэхнікай грунтоўна. І вось спачатку ў час заняткаў, а потым у напружаныя дні сяўбы і ўборкі прыйшло перакананне — прафесія механізатара сапраўды робіць яго патрэбным на зямлі.

І вось больш за 30 гадоў ён адпрацаваў механізатарам у калгасе імя Кутузава. Разам з сонцам пачынаўся працоўны дзень Леаніда Аляксандравіча. У любую пару года, у любое надвор'е ён спяшаўся на машынна-трактарны двор, а потым — самая розная работа. Дагаджаў зямлі: вазіў арганіку, араў, сеяў і ўбіраў хлеб, даглядаў бульбу, нарыхтоўваў кармы. Узарэ, бывала, — ні прарэшка, ні згібу, пасее — да зярнятка ў норму ўкладзецца. Леанід Аляксандравіч памятаў: каласок — гэта паўжмені мукі, з якой можна спячы духмяны праснак.

Маладыя механізатары пыталіся ў яго: чаму нярэдка бываюць паломкі новых камбайнаў? На гэта пытанне ён так адказваў:

— Найбольш верагодная прычына — адносіны да машыны. Часта даводзіцца назіраць, як некаторыя камбайнеры ў пагоні за лішнім гектарам працуюць на павышанай хуткасці там, дзе густая збажына. Забіваюцца зжатай масай шнэк, матавіла, нейкая дэталь і не вытрымлівае, ламаецца. На ліквідацыю няспраўнасці ідзе нямала часу. Вось у што абходзіцца «лішні гектар».

Калі размова заходзіла аб стратах на ўборцы, Леанід Аляксандравіч зазначаў:

— У кожнага механізатара свой почырк у рабоце. Адзін імкнецца зжаць большую плошчу і працуе на павышанай хуткасці; зрэз атрымліваецца высокі, застаюцца нязжатыя сцёблы. Здаецца, нямнога іх, а калі падлічыць, то да цэнтнера страт прыходзіцца на гектар. Нізкі зрэз асабліва патрэбен, калі збажына палеглая. Апрача гэтага, я раблю няпоўны захват жняяркай: вяду камбайн так, каб 3—5 крайніх яе зубоў не захоплівалі сцёблаў, бо апошнія ўсё роўна не зразаюцца. Трэба сачыць і за ўшчыльненнем фартуха, каласавога і зерневага шнэкаў. Важна яшчэ правільна адрэгуляваць іншыя агрэгаты. Вось і насыпаюцца тады ў бункер дадатковыя цэнтнеры зерня.

Л.А Асташонак у гаспадарцы — прызнаны майстар намалотаў. Былі гады, што ставіў сапраўдныя рэкорды, адзначаны дзяржаўнымі ўзнагародамі — ордэнамі Леніна і «Знак Пашаны». Ён, старэйшы механізатар, ведаў, што на яго будуць раўняцца. Быў такі выпадак. На жніве Л.А.Асташонак заняў першае месца ў спаборніцтве камбайнераў гаспадаркі. На наступны год на машынным двары з'явіўся новы камбайн. Ніхто б і не падумаў крыўдзіцца, калі б ён дастаўся Леаніду Аляксандравічу. Заслужыў гэта сваім стараннем, беражлівымі адносінамі да тэхнікі. Мог бы ўзяць новы, але ўступіў таварышу па рабоце.

— Магу і на старым яшчэ папрацаваць, — зазначыў ён.

Спрабавалі падказаць «дабрадзеі», маўлялі, дарэмна адмовіўся. Лягчэй было б.

А ён, усміхнуўшыся, супакоіў дарадцу:

— У цябе вось штаны на гузіках. Ну каму хочацца іх рабіць? Дробязь такая. Штаны пашыць — куды выгадней. А вось на чым яны будуць трымацца?

Апошнія словы прагучалі пад смех механізатараў. Асташонак ніколі не імкнуўся туды, дзе лягчэй, не любіў «сядзець» у прэзідыумах. Для яго галоўнае — праца на зямлі.

І.К.Баразна.

Наш настаўнік

У 1950-я гады дырэктарам і настаўнікам матэматыкі ў Венсампольскай сямігодцы працаваў Дзмітрый Якаўлевіч Скорабагатаў. Ён пакінуў добры ўспамін аб сабе ў дзяцей і дарослых. Што датычыць мяне, то гэта ён паўплываў на мой выбар прафесіі, я таксама стала выкладаць матэматыку.

Дзмітрый Якаўлевіч родам з вёскі Братаўка Разанскай вобласці. Былы франтавік, партызан. Да вайны закончыў педагагічнае вучылішча, працаваў настаўнікам. У 1940 г. быў прызваны ў Чырвоную армію. У 1941 г. ваяваў на фронце ў складзе 39-га артылерыйскага палка 3-й стралковай брыгады на востраве Эзель (Эстонія), там трапіў у палон. У чэрвені 1942 г. уцёк, дабраўся да партызан. З 2 кастрычніка 1942 г. стаў начальнікам штаба партызанскага атрада, які дзейнічаў на тэрыторыі былога Дзісенскага і Міёрскага раёнаў. Як толькі тэрыторыя Беларусі была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, Дзмітрый Якаўлевіч вярнуўся да настаўніцкай працы. 1 верасня 1944 г. ён сустрэў у Дзісенскай СШ, дзе працаваў да сакавіка 1945 г. А потым трапіў на фронт. У складзе 217-га стралковага палка ўдзельнічаў у баях на 1-м Беларускім фронце, у тым ліку ў баях за ўзяцце Берліна.

Дзмітрый Якаўлевіч быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» і «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.». З арміі дэмабілізаваўся ў снежні 1945 г. і вярнуўся на беларускую зямлю. Працаваў настаўнікам на Дзісеншчыне, дырэктарам Венсампольскай сямігадовай школы быў прызначаны ў 1951 г., працаваў да 1 верасня 1965 г. У 1969 г. Дз.Я.Скорабагатаў памёр.

Я.Б.Чэрвінская.

Захопленасць плюс творчасць

Першы настаўніцкі верасень заслужанага работніка адукацыі БССР, дырэктара Лужкоўскай сярэдняй школы Мілеція Антонавіча Андзілеўкі адбыўся ў 1969 г. Спачатку М.А.Андзілеўка працаваў у Падорскай сямігодцы (цяпер Верацееўская базавая школа).

Ён лічыць, што ў настаўніка свой каляндар. Пачатак года — у букетах восеньскіх кветак, у дапытлівых дзіцячых вачах, якія вераць табе, настаўніку. А заканчэнне... Вядома ж, не апошні званок падводзіць вынік працы педагога. Свой экзамен ён здае ўсё жыццё праз лёсы сваіх вучняў. Педагог павінен быць творцам, лічыць Мілецій Антонавіч. Думаецца, дастаткова заглянуць у кабінет біялогіі і школьны музей прыроды, каб пераканацца, як творча працуе настаўнік. Дзейнасць педагога — гэта не толькі ўрокі, але і значная доследная работа па заданні вучоных Беларускага навукова-даследчага інстытута земляробства. Навінкі селекцыі, калі так можна выказацца, з прышкольнага ўчастка трапляюць на землі мясцовага саўгаса «Гарадзец». Вучнёўская вытворчая брыгада дапамагае хлебаробам.

З 1993 г. Мілецій Антонавіч працуе дырэктарам школы. Шмат чаго неабходна ведаць, умець рабіць, каб набыць павагу выхаванцаў, іх бацькоў, калег па працы, каб яны ўбачылі ў кіраўніку таго, хто клапоціцца аб дзецях, аб школе. Мілецій Антонавіч заўсёды аддае перавагу спагадлівай патрабавальнасці. Вучні цэняць яго шчырасць і дабрыню.

Мілецій Антонавіч — часты госць у хлебаробаў. Ён адзін з лепшых лектараў, агітатараў раёна, неаднаразова выбіраўся дэпутатам раённага Савета. Яго партрэт змяшчаўся на абласной Дошцы гонару і раённай Галерэі славы. Прымаў удзел у 7-м з'ездзе настаўнікаў БССР і ва Усесаюзным з'ездзе работнікаў народнай асветы.

Творчыя адносіны да справы Мілеція Антонавіча адзначаны ўдзячнасцю і прызнаннем вучняў, павагай калег, ордэнам «Знак Пашаны», медалём Францыска Скарыны, бронзавым медалём ВДНГ, шматлікімі граматамі, знакам «Выдатнік асветы БССР», прысваеннем званняў «Заслужаны работнік адукацыі БССР» і «Настаўнік-метадыст».

І.К.Баразна.

Позірк у нядаўняе мінулае

З успамінаў І.М.Гудоўскага, былога старшыні калгаса «Герой працы»

16 сакавіка 1956 г. мяне выбралі старшынёй калгаса «Герой працы» Ручайскага сельсавета. Калгас гэты, як тады казалі, ляжаў на баку. У першы ж дзень аказалася, што няма чым карміць жывёлу. Ураджайнасць збожжавых была 6—8 ц з гектара. Палі засявалі зернем напалову з пустазеллем. Мяса на 100 га сельгасугоддзяў атрымлівалі па 5 ц, малака — па 37 ц, надой ад каровы складаў 750 кг у год. Не было пасеваў канюшыны і іншых кармавых траў. А натуральных сенажацей не хапала. Калгаснікі крычалі: «Накармі нас, старшыня! Дай на працадзень па 1 кг збожжа і па 5 рублёў грошай, і мы да канца жыцця будзем цябе на руках насіць». Людзей у калгасе было многа, асабліва моладзі. Дастаткова сказаць, што толькі на адным сходзе было прынята ў камсамол 45 юнакоў і дзяўчат. Аднак не ўсе прыхільна глядзелі на гэта. Алу Гапанёнак бацькі збілі за тое, што яна ўступіла ў камсамол. Многія яшчэ жылі мінулым, усё новае выклікала недавер і нават супраціўленне.

Каб накарміць людзей, набылі на Украіне і прывезлі вагон пшаніцы, 60 т. І гэта нас выратавала ад голаду. А для жывёлы атрымалі сена з Глыбоцкай сенабазы.

У першы год майго старшынёўства ўзялі па 9 ц з гектара збожжавых. Засыпалі добрае насенне, разлічыліся з дзяржавай. Людзі атрымалі па 1,5 кг збожжа і па 5 рублёў грошай на працадзень. Калгаснікі пачалі верыць у тое, што будуць перамены да лепшага.

Вясной мы пасеялі канюшыну і гэтым падмацавалі калгасную кармавую базу. Больш ужо не набіраліся з кармамі.

Лён мы здавалі добрымі нумарамі: трасту ад 1,5 да 2,75. Выручылі шмат грошай, хапіла па 5 рублёў на працадзень калгаснікам і на іншыя плацяжы. Нават пагасілі частку пазыкі, што бралі ў дзяржавы.

Пачалі будаваць клуб для моладзі, і 9 мая 1957 г. ён адкрыўся. Хлопцы і дзяўчаты бясконца радаваліся гэтаму.

І ў наступныя гады раслі на палях добрыя ўраджаі збожжавых, удосталь нарыхтоўваў калгас кармоў для жывёлы, добра расла канюшына і іншыя сеяныя травы. Кармоў хапала для грамадскага статка і для ўласнай жывёлы калгаснікаў. Нават дапамагалі суседнім калгасам, такім як «Вялікае Сяло», імя Даватара, «Буравеснік». Раслі надоі малака. Для гэтага мы займаліся паляпшэннем статка. Закуплялі ў Латвіі высокапрадукцыйных кароў. На Шчумялёўскай ферме, дзе працавала моладзь, быў статак чорна-пярэстых кароў, надойвалі ў сярэднім па 4000 кг малака ад каровы ў год. Тут працавалі даяркамі Людміла Фёдараўна Аляксандровіч, Глафіра Уладзіміраўна Вярховіч (у будучым — старшыня сельскага Савета), Даната Антонаўна Бураўская, Ірына Францаўна Папярадзень. Усе калгаснікі радаваліся поспехам.

У 1974 г. калгас атрымаў 36,6 ц збожжавых і зернебабовых з гектара. Раслі прадукцыйнасць жывёлы, вытворчасць мяса і малака.

Успамінаецца гісторыя аб'яднання нашай гаспадаркі з калгасам «Маяк». Да аб'яднання калгас «Герой працы» атрымліваў па 660 ц малака і па 100 ц мяса на 100 га сельгасугоддзяў. Грашовы даход складаў да 1 млн. рублёў. Калгас не меў запазычанасцей, былі ў гаспадарцы і свабодныя грошы.

І вось мяне і старшыню суседняга калгаса «Маяк» Івана Мікалаевіча Чэкана выклікаў сакратар Шаркаўшчынскага раённага камітэта КПБ Анатоль Георгіевіч Шманцар і прапанаваў аб'яднацца. Мы былі супраць. Нашу думку не ўлічылі. Новы калгас назвалі «Маяк».

«Маяк» да аб'яднання меў крэдыт, дзяржаўную пазыку. Яе мы пагасілі адразу ж пасля аб'яднання. Так новая гаспадарка, як і былы наш «Герой працы», стала свабодная ад даўгоў перад дзяржавай.

Работа ў новай гаспадарцы пасля аб'яднання калгасаў наладжвалася. Раслі грашовыя даходы гаспадаркі. Аднак раённае кіраўніцтва не дазваляла разгарнуць у калгасе будаўніцтва, заасфальтаваць дарогі ў населеных пунктах і да ферм. У той час папулярнай была палітыка ўраўнілаўкі. Вось і кіраўнікі раёна хацелі дзяліць грошы нашай гаспадаркі паміж іншымі калгасамі, якія працавалі нерэнтабельна.

На размову аб раздзеле нашых грошай паміж нерэнтабельнымі калгасамі мяне выклікаў старшыня райвыканкома Мікалай Андрэевіч Таратута. Ён сказаў, што бюро райкома КПБ прапаноўвае грошы калгаса «Маяк» раздзяліць паміж адстаючымі гаспадаркамі. Я быў катэгарычна супраць. Сказаў, што мы іх зарабілі, мы іх і выкарыстаем па сваім меркаванні. Такі адказ быў расцэнены як дзёрзкасць. Нас прымусілі сабраць агульны сход, дзе было пастаўлена пытанне аб раздзеле грошай. Калгаснікі, вядома, далі бой. Тады нам навязалі будаўніцтва жывёлагадоўчага комплексу. Ідэя гэта належала першаму сакратару райкома КПБ Анатолю Георгіевічу Шманцару і начальніку ўпраўлення сельскай гаспадаркі Леаніду Іванавічу Новіку. У выніку былі выкарыстаны калгасныя грошы, амаль чатыры з паловай мільёны рублёў, неэфектыўна. Яны не далі аддачы. Сама практыка будаўніцтва такіх комплексаў не апраўдала сябе ні ў эканамічным, ні ў гаспадарчым, ні ў экалагічным плане. А мы ж маглі прымяніць гэтыя грошы з вялікай карысцю і для гаспадаркі, і для нашых працаўнікоў.

Успамінаецца і такое. Неяк, яшчэ ў 1968 г., я ездзіў у Германію і, праязджаючы вясной па палях, бачыў, як немцы рамантуюць пасевы, па-гаспадарску клапоцяцца аб тым, каб не пуставала зямля. Гэты метад укаранілі і мы ў сваім калгасе. Ранняй вясной, як толькі сыходзіў снег і зямля толькі падсыхала, мы па азімай пшаніцы ўпоперак радкоў пускалі гусенічны трактар з сеялкай і падсявалі па 160—180 кг ячменю. Ён хутка прарастаў, даваў усходы і паспяваў разам з пшаніцай. Атрымлівалася добрая фуражная сумесь. А прыбаўка да ўраджаю складала 15—20 ц з гектара пры найменшых затратах. Гэты метад спадабаўся раённаму кіраўніцтву, быў укаранёны і цяпер прымяняецца ва ўсім раёне.

У ліпені 1976 г. наш калгас наведаў першы сакратар ЦК КПБ Пётр Міронавіч Машэраў. Ён высока ацаніў наш метад павышэння ўраджайнасці збожжавых, падарыў калгасу аўтамашыну «Волга».

У гаспадарцы былі высокія, стабільныя ўраджаі льну, збожжавых, бульбы. Агранам нашай гаспадаркі Марыя Іванаўна Чульба атрымала ордэн Леніна. Добрыя паказчыкі былі і ў жывёлагадоўлі.

На сродкі калгаса былі пабудаваны: Палац культуры, жывёлагадоўчы комплекс, механізаваныя майстэрні, склад мінеральных угнаенняў і ядахімікатаў, пункт тэхнічнага абслугоўвання, жывёлагадоўчыя памяшканні, пракладзены грунтавыя дарогі і асфальтавыя пад'езды да ферм і іншых вытворчых і сацыяльна-культурных аб'ектаў. Старанна працавалі на рыштаваннях будаўнікі Карнелій Мікалаевіч Рымдзёнак, Барыс Фёдаравіч Баговіч, Юрый Ларывонавіч Аліпаў, Антон Ігнатавіч Кажан, Іван Іванавіч Апалька, Леанід Рыгоравіч Латышонак, Фёдар Аляксандравіч Пяцько.

У жывёлагадоўлі добра працавалі Іосіф Адамавіч Шышко, які першым у раёне арганізаваў начны выпас жывёлы, а таксама даяркі Марыя Іванаўна Пяткевіч, Даната Антонаўна Вялічка, Хрысціна Францаўна Вязіцкая, Ірына Францаўна Папарадзень, Лёдзя Васільеўна Зінкевіч, цялятніцы Марыя Уладзіміраўна Кажан, Яніна Іосіфаўна Вялічка, Рэгіна Міхайлаўна Пронька, Ангеліна Сцяпанаўна Прыстаўка, Марыя Антонаўна Кліманская, Вольга Рыгораўна Латышонак.

У раслінаводстве стараннай працай вызначыліся Георгій Паўлавіч Яленскі, Пётр Пятровіч Жынгель, Міхаіл Віктаравіч Пяткевіч, Сяргей Аляксандравіч Шпец, Пётр Савельевіч Кашытаў, Ганна Фёдараўна Вязіцкая, Мікалай Фёдаравіч Кліманскі, Сяргей Іванавіч Шамшур.

Калі я пачынаў працаваць, у калгасе не было ніякай тэхнікі. Трактары ад МТС атрымалі толькі ў 1958 г. Былі ўласныя маламагутныя трактары Т-12, на якіх працавалі Мікалай Нікандравіч Табола, Мілецій Міхайлавіч Вязіцкі, Дзмітрый Ларывонавіч Аліпаў. М.Н.Табола заўсёды быў першым у працы: і на вырошчванні кукурузы, і на апрацоўцы глебы, на сяўбе і ўборцы збожжавых. На цярабленні лёну даводзіў плошчу апрацоўкі да 12—16 га. Добра працавалі трактарысты Фёдар Пятровіч Бруйка, Генадзь Сцяпанавіч Вялічка, Нікадзім Аляксандравіч Грыгаровіч, Андрэй Аляксеевіч Грыгор'еў, Франц Францавіч Рубніковіч, Мамерт Францавіч Хаданёнак, Іван Ігнатавіч Кожан, Алег Валяр'янавіч Лагунёнак, Іван Станіслававіч і Валерый Станіслававіч Александровічы.

У 1950-я гады ў калгасе была адна толькі аўтамашына ГАЗ-51. Шафёрам быў

Мікалай Мікалаевіч Вязіцкі, працаваў на ёй за цэлы аўтапарк. Са станцыі Шаркаўшчына перавозіў грузы, робячы па 12—15 рэйсаў у дзень, ды яшчэ па бездарожжы. А колькі на ёй перавезлі збожжа, сена, жывёлы і іншых грузаў дзяржаве і ўнутры калгаса. Яна ў нас была на ўсе выпадкі. Добра працавалі пазней у калгасе вадзіцелі Мікалай Антонавіч Бураўскі, Мілецій Мікалаевіч Баговіч, Нікандр Пятровіч Баговіч, Віктар Міхайлавіч Пяткевіч, Генадзь Мікалаевіч Гарбачонак, Часлаў Іванавіч Лапыр, Веньямін Фёдаравіч Пяцько і многія іншыя.

Праўленню калгаса дапамагаў у рабоце дырэктар Грыгараўшчынскай пачатковай школы Сяргей Фёдаравіч Міронаў. Гэта быў чалавек моцнай волі, нястомны працаўнік, сапраўдны патрыёт. У рэвалюцыю ён быў камандзірам Сямёнаўскага палка — яго выбралі салдаты. Атрымаў воінскае званне капітана. У Вялікую Айчынную вайну быў гаспадарнікам, забяспечваў войскі абмундзіраваннем і харчаваннем. Меў шматлікія дзяржаўныя ўзнагароды, у тым ліку ордэны Чырвонага Сцяга і Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Актыўнымі памочнікамі старшыні былі член праўлення калгаса Іван Вікенцьевіч Бобіч, брыгадзір з вёскі Грыгараўшчына Браніслаў Кліменцьевіч Абаровіч, сакратар партыйнай арганізацыі Мікалай Мікалаевіч Бурэнь і іншыя калгасныя актывісты і спецыялісты. Многія з іх самі потым узначалілі гаспадаркі ў раёне.

Перабіраючы гады і дзесяцігоддзі ў памяці, адно магу сказаць — гэта былі гады сумленнага служэння Айчыне, сумленнай працы на зямлі.

Вызначыліся працай

АРДЭНАНОСЦЫ[1]

Узнагароджаны ордэнам Леніна

АЛЕКСІНА Соф'я Васільеўна, жывёлавод саўгаса «Гарадзец».

АСТАШОНАК Леанід Аляксандравіч, механізатар калгаса імя Кутузава. Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны».

БАЛАЙ Пётр Аляксеевіч, старшыня калгаса «Вялікае Сяло». Узнагароджаны таксама ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны».

БАРАНАЎ Пётр Макаравіч, старшыня калгаса імя Ільіча. Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

П.М.Баранаў.

ДАРАШЧОНАК Галіна Сямёнаўна, жывёлавод калгаса «Сасноўцы».

ДРАГУН Вячаслаў Уладзіміравіч, механізатар калгаса «Шлях Леніна». Узнагароджаны таксама ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ЗЯЛЁНКА Лія Уладзіміраўна, даярка калгаса імя Ільіча.

ЛАТЫШОНАК Лідзія Мікалаеўна, даярка саўгаса «Шаркаўшчынскі».

ЛЫСЁНАК Дзмітрый Венядзіктавіч, трактарыст калгаса «Іскра».

ПАД'ЕЛЬСКІ Пётр Віктаравіч, механізатар саўгаса «Верацеі». Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

РУБНІКОВІЧ Эдуард Станіслававіч, механізатар саўгаса «Буравеснік». Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

РЭУТ Восіп Францавіч, механізатар саўгаса «Гарадзец». Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ТАЛАПІЛА Яніна Іванаўна, даярка калгаса імя Калініна.

ТАНКАНОГ Аляксей Лук'янавіч, старшыня калгаса імя Гагарына. Узнагароджаны таксама ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

[1]Пасада і назва арганізацыі ўказаны тыя, якія былі на момант узнагароджвання.

Г.С.Дарашчонак.



В.У.Драгун.

Л.У.Зялёнка.

Дз.В.Лысёнак.

А.Л.Танканог.

С.В.Урбановіч.

М.І.Чульба.

Ч.К.Шышко.

УРБАНОВІЧ Станіслаў Вацлававіч, механізатар калгаса «Свабода». Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны».

ЧУЛЬБА Марыя Іванаўна, аграном калгаса «Маяк». Узнагароджана таксама ордэнам «Знак Пашаны».

ШМАНЦАР Анатоль Георгіевіч, першы сакратар райкома партыі. Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ШЫШКО Часлаў Карлавіч, трактарыст калгаса «Вялікае Сяло». Узнагаро-

Э.С.Рубніковіч у час сустрэчы з дзецьмі.

В.А.Барсук.

В.У.Краснадубскі.



М.І.Курыловіч.

П.П.Хрол.

Ф.Б.Атрашкевіч.

Ф.В.Бука.

джаны таксама ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, некалькімі медалямі.

Узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі

БАРСУК Веньямін Аляксандравіч, механізатар калгаса імя Ільіча. Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ВАСЮЦЁНАК Восіп Іванавіч, брыгадзір калгаса імя Гагарына.

ГУДОЎСКІ Іван Мікалаевіч, старшыня калгаса «Маяк». Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны».

КАБАК Любоў Антонаўна, даярка калгаса «Вялікае Сяло». Узнагароджана таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

КРАСНАДУБСКІ Васіль Усцінавіч, аграном саўгаса «Верацеі». Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

КРУПКО Франц Сцяпанавіч, трактарыст калгаса «Камінтэрн». Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

КУРЫЛОВІЧ Міхаіл Іванавіч, механізатар калгаса «Шлях Леніна». Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ХРОЛ Пётр Пятровіч, механізатар калгаса «Прагрэс». Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны».

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга

АЛЯХНОВІЧ Восіп Юльянавіч, механізатар калгаса «Іскра».

АНІСЬКОВІЧ Фёдар Уладзіміравіч, механізатар калгаса «Свабода».

АТРАШКЕВІЧ Фларыян Браніслававіч, намеснік старшыні калгаса «Камсамолец».

БАГОВІЧ Аляксандр Аляксандравіч, дырэктар саўгаса імя Маркава.

БРУЙКА Леанід Дзям'янавіч, галоўны інжынер калгаса «Маяк».

БУЙКА Георгій Аляксандравіч, трактарыст калгаса імя Даватара. Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны».

БУКА Фларыян Вацлававіч, механізатар саўгаса імя Маркава.

БУЛАХ Віктар Уладзіміравіч, аграном калгаса імя Ільіча.

БУРАЎСКАЯ Франя Антонаўна, жывёлавод калгаса «Маяк».

БУРЧЫЦ Міхаіл Васільевіч, старшыня калгаса імя Кутузава.

БУТАР Іван Пятровіч, механізатар калгаса «Іскра».

БЯДРЫЦКІ Віктар Мікалаевіч, старшыня раённага выканаўчага камітэта, узнагароджаны двойчы.

ВАЛЕЎКА Ганарата Клаўдзіўшаўна, даярка калгаса імя Кутузава.

ВЕРТАШОНАК Васіль Ігнатавіч, механізатар саўгаса «Гарадзец».

ВЯЗІЦКАЯ Крысціна Францаўна, жывёлавод калгаса «Маяк».

ВЯРХОВІЧ Глафіра Уладзіміраўна, галоўны заатэхнік калгаса «Маяк». Узнагароджана таксама ордэнам «Знак Пашаны».

ГЛЕБКА Кацярына Геранімаўна, палявод калгаса імя Калініна.

ГОВАРАЎ Іван Рыгоравіч, механізатар калгаса імя Кутузава.

ДАРАШЧОНАК Фёдар Фёдаравіч, механізатар калгаса імя Леніна.

ДУЛІНЕЦ Міхаіл Іванавіч, механізатар калгаса імя Ільіча.

ДУЛІНЕЦ Нарберт Бярнардавіч, механізатар саўгаса імя Маркава.

ЖВІРБА Ніна Міхайлаўна, жывёлавод калгаса «Свабода».

ЗАЙЦАЎ Іван Сцяпанавіч, 2-і сакратар райкома партыі. Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны».

ЗЯНОК Уладзімір Усцінавіч, старшыня калгаса імя Жданава.

КАЗЛОВА Яніна Данатаўна, даярка калгаса імя Гагарына.

КАРАБЕЙНІКАЎ Уладзімір Дзянісавіч, старшыня калгаса «Камінтэрн».

КАЧАН Георгій Дзмітрыевіч, механізатар калгаса імя Ільіча.

КАЧАН Станіслаў Станіслававіч, механізатар саўгаса імя Маркава.

КОНАН Ніна Уладзіміраўна, даярка саўгаса «Гарадзец». Узнагароджана двойчы, а таксама ордэнам «Знак Пашаны».

КРУКЛІНСКАЯ Яніна Адамаўна, палявод калгаса імя Калініна.

КРЫЎКА Васілій Уладзіміравіч, механізатар саўгаса «Гарадзец». Узнагароджаны двойчы, а таксама ордэнам «Знак Пашаны».

КУЛЕШ Яўгенія Антонаўна, жывёлавод саўгаса «Гарадзец».

КУРЫЛОВІЧ Міхаіл Іванавіч, механізатар калгаса «Шлях Леніна».

КУРЫЛОВІЧ Раман Станіслававіч, механізатар калгаса «Шлях Леніна».

ЛАГУН Разалія Баляславаўна, жывёлавод калгаса імя Калініна.

ЛАГУНЁНАК Леаніла Аляксандраўна, жывёлавод калгаса імя Ільіча.

ЛАТЫШОНАК Лідзія Мікалаеўна, даярка саўгаса «Шаркаўшчынскі».



В.У.Булах.

Г.У.Вярховіч.

С.С.Качан.

Г.А.Буйка (злева).

Т.К.Мілянцей.

С.І.Пармон.



Н.Я.Протас.



Р.П.Рабіза.

А.В.Ружа.

ЛАТЫШОНАК Мікалай Андрэевіч, механізатар калгаса «Маяк».

ЛАЎРЫНОВІЧ Міхаіл Станіслававіч, механізатар калгаса «Камінтэрн».

ЛАЎРЫНОВІЧ Станіслаў Канстанцінавіч, механізатар калгаса «Буравеснік».

ЛІПСКІ Міхаіл Аляксандравіч, трактарыст саўгаса «Шаркаўшчынскі».

МІЛЯНЦЕЙ Таццяна Кузьмінічна, слесар-зборшчык райаб'яднання «Сельгастэхніка».

МІХАЙЛАЎ Фёдар Яўграфавіч, механізатар калгаса імя Ільіча.

МЫШКО Людміла Уладзіміраўна, брыгадзір калгаса «Камінтэрн».

МЯЦЕЛІЦА Серафім Трафімавіч, механізатар калгаса імя Ільіча.

НАВІЧОНАК Афінаген Васільевіч, механізатар калгаса імя Фрунзе.

НЯВЕРЧЫК Веньямін Пятровіч, механізатар калгаса «Маяк».

ПАДАРОЎСКІ Павел Паўлавіч, галоўны аграном саўгаса «Шаркаўшчынскі».

ПАДОБА Фабіяна Антонаўна, даярка саўгаса «Шаркаўшчынскі». Узнагароджана таксама ордэнам «Знак Пашаны».

ПАЗНЯК Іван Іванавіч, механізатар перасовачнай механізаванай калоны № 51.

ПАЛЯК Мікалай Пятровіч, механізатар калгаса імя Ільіча.

ПАРМОН Сцяпан Іосіфавіч, старшыня калгаса «Шлях Леніна». Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны».

ПРОТАС Нікадзім Якаўлевіч, кіраўнік райаб'яднання «Сельгастэхніка».

ПРЫСТАЎКА Тэафілія Пятроўна, старшыня Ручайскага сельскага Савета.

ПУХАЛЬСКІ Казімір Альфрэдавіч, механізатар калгаса імя Фрунзе.

ПЯТРАНІС Павел Юзафавіч, механізатар калгаса «Буравеснік».

ПЯЦЬКО Алена Пятроўна, даярка калгаса «Маяк».

РАБІЗА Іраіда Паўлаўна, даярка калгаса імя Ільіча. Узнагароджана таксама ордэнам «Знак Пашаны».

РАБІЗА Расціслаў Пятровіч, галоўны аграном калгаса «Вялікае Сяло».

РАЙЧОНАК Алег Георгіевіч, старшыня калгаса «Буравеснік».

РУБІС Пётр Васільевіч, механізатар калгаса імя Леніна.

РУЖА Антон Войцавіч, старшыня калгаса «Іскра».

РЫМДЗЁНАК Галіна Міхайлаўна, жывёлавод калгаса «Вялікае Сяло».

РЭДЗЬКА Рэгіна Восіпаўна, свінарка калгаса імя Фрунзе.

САВІЧ Нікадзім Казіміравіч, працаўнік райаб'яднання «Сельгастэхніка».

СВЯЦКІ Васіль Піліпавіч, шафёр райаб'яднання «Сельгастэхніка».

СЕЗЯНЕЎСКІ Мечыслаў Часлававіч, дырэктар саўгаса «Гарадзец».

СІЛЬМАНОВІЧ Ганна Усцінаўна, жывёлавод калгаса імя Леніна. Узнагароджана таксама ордэнам «Знак Пашаны».

СОЙКА Віталь Міхайлавіч, працаўнік калгаса імя Леніна.

ТАРАРАКА Леанід Мікалаевіч, механізатар калгаса імя Леніна.

ТАРАТУТА Мікалай Андрэевіч, начальнік раённага аграпрамысловага аб'яднання. Узнагароджаны таксама ордэнам «Знак Пашаны».

ТАТАРОВІЧ Іван Якаўлевіч, механізатар саўгаса «Шаркаўшчынскі».

ТАХТУРОНАК Мікалай Мікалаевіч, работнік калгаса «Маяк».

ТОЛКАЧ Генадзь Васільевіч, механізатар калгаса імя Ільіча.

ХАДАНЁНАК Марыя Фляр'янаўна, даярка калгаса «Свабода».

ХАДАСЕВІЧ Мікалай Аляксандравіч, жывёлавод калгаса імя Леніна.

ХАЦЕЙКІНА Алена Мікалаеўна, брыгадзір калгаса імя Ільіча.

ЦШАЛОВІЧ Фёдар Нічыпаравіч, механізатар калгаса «Усход».

ШУДЗЕЛЬ Мікалай Фаміч, жывёлавод калгаса імя Гагарына.

ШЭЎЧЫК Алег Восіпавіч, механізатар калгаса імя Кутузава.

ЯНУШКЕВІЧ Ілья Лявонавіч, жывёлавод калгаса «Усход».

Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы II ступені

ЗУЕЎ Ніфан Мікалаевіч, механізатар калгаса «Камінтэрн». Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнай славы III ступені.

КРЫШТАЛЕВІЧ Ірына Іванаўна, механізатар калгаса імя Фрунзе. Узнагароджана таксама ордэнам Працоўнай славы III ступені.

ШПЕЦ Тэрэза Казіміраўна, жывёлавод саўгаса імя Маркава. Узнагароджана таксама ордэнам Працоўнай славы III ступені.

Узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені

АНДЗІЛЕЎКА Георгій Мікалаевіч, механізатар калгаса «Буравеснік».

АСТАНОЎКА Антон Казіміравіч, механізатар калгаса «Буравеснік».

БАГДАНЁНАК Уладзімір Іванавіч, механізатар калгаса імя Энгельса.

БАНДАРЭНКА Эвеліна Браніславаўна, даярка калгаса «Шлях Леніна».

БОГУШ Іван Мар'янавіч, трактарыст райаб'яднання «Сельгасхімія».

А.В.Шэўчык.

І.І.Крышталевіч.

БОХАН Іван Іванавіч, механізатар райаб'яднання «Сельгасхімія».

БРЫЛЁВА Рэгіна Рыгораўна, жывёлавод калгаса «Вялікае Сяло».

БЯЛЯЙ Любоў Дзмітрыеўна, даярка калгаса імя Калініна.

ДЗЯГЕЛЕЎ Раман Мартынавіч, механізатар калгаса «1 Мая».

ДРАБА Леанід Восіпавіч, механізатар калгаса імя Гагарына.

ЖЫНГЕЛЬ Леанід Восіпавіч, галоўны ветурач саўгаса «Гарадзец».

ІВАНОЎ Георгій Васільевіч, трактарыст калгаса «Усход».

КАЧАН Ганна Васільеўна, жывёлавод калгаса імя Гагарына.

КОЖАН Марыя Уладзіміраўна, жывёлавод калгаса «Маяк».

КУРЫЛЁНАК Яўгенія Фёдараўна, свінарка саўгаса «Гарадзец».

ЛАГУН Ядвіга Восіпаўна, даярка калгаса імя Калініна.

ЛАЎРЫНОВІЧ Дзмітрый Уладзіміравіч, механізатар калгаса «Шлях Леніна».

ЛЫСЁНАК Мікалай Мікалаевіч, вадзіцель калгаса «Камінтэрн».

ЛЯСНЕЎСКІ Іван Аляксандравіч, механізатар калгаса «17 Верасня».

МАРАТ Восіп Альфрэдавіч, механізатар райаб'яднання «Сельгасхімія».

МІХАЙЛАВА Ульяна Фёдараўна, жывёлавод калгаса «Усход».

МІХЕЕНКА Рамуальд Сяргеевіч, механізатар райаб'яднання «Сельгастэхніка».

НЕДЗВЕДЗЬ Аляўціна Мікалаеўна, жывёлавод калгаса «Камінтэрн».

НЕСЦЯРОВІЧ Браніслаў Восіпавіч, механізатар калгаса «Шлях Леніна».

І.А.Аношка.



Э.Г.Балай.

НЕСЦЯРОВІЧ Восіп Восіпавіч, механізатар калгаса «Шлях Леніна».

ПАЛЯГОШКА Міхаіл Антонавіч, шафёр калгаса «Камінтэрн».

ПАПЕРАДЗЕНЬ Ірына Францаўна, жывёлавод калгаса «Маяк».

ПУКА Даната Вацлаваўна, даярка калгаса імя Гагарына.

ПУКА Пётр Вацлававіч, трактарыст калгаса імя Гагарына.

ПУНДЗІС Дзям'ян Францавіч, механізатар калгаса «Буравеснік».

ПЯТКЕВІЧ Мікалай Іванавіч, шафёр калгаса імя Ільіча.

РУДАК Аляксандр Мікалаевіч, шафёр калгаса «Прагрэс».

СЕДЗЮКЕВІЧ Васіль Пятровіч, трактарыст калгаса «Усход».

СЯТКОЎСКАЯ Соф'я Валяр'янаўна, даярка калгаса імя Ільіча.

ТАТАРОВІЧ Анатоль Серафімавіч, механізатар саўгаса «Шаркаўшчынскі».

УРБАНОВІЧ Антон Кліменцьевіч, механізатар калгаса імя Калініна.

ФЁДАРАЎ Кірыла Іванавіч, трактарыст калгаса «Камінтэрн».

ШЭНДА Даната Іванаўна, даярка калгаса «Буравеснік».

ЮРКЕВІЧ Галіна Іванаўна, даярка саўгаса імя Маркава.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны»

АЛЕКСАНДРОВІЧ Станіслаў Часлававіч, трактарыст калгаса «Маяк».

АЛЬШЭЎСКІ Антон Антонавіч, брыгадзір калгаса «Прагрэс».

АНАНІЧ Ала Уладзіміраўна, даярка калгаса імя Гагарына.

АНОШКА Ірына Аляксандраўна, сакратар райкома партыі.

АНТОНАВА Яўгенія Леанідаўна, даярка калгаса імя Кутузава.

АРДЫНСКІ Георгій Паўлавіч, механізатар калгаса імя Энгельса.

АСТРОЎСКАЯ Валянціна Уладзіміраўна, калгасніца калгаса «1 Мая».

БАГОВІЧ Пётр Ільіч, работнік саўгаса імя Маркава.

БАДЗЯЕВА Яўгенія Яфрэмаўна, работнік саўгаса імя Маркава.

БАЛАЙ Эльвіра Гераімаўна, галоўны аграном калгаса «Іскра».

БЕЛЬСКАЯ Анфіса Антонаўна, палявод калгаса імя Гагарына.

БУЙКА Тамара Аляксандраўна, жывёлавод калгаса імя Энгельса.

БУЛЫКА Пётр Піліпавіч, галоўны заатэхнік саўгаса «Гарадзец».

БУТКЕВІЧ Іван Восіпавіч, механізатар калгаса «Вялікае Сяло».

БУЧЭЛЬ Іван Раманавіч, механізатар калгаса «Буравеснік».

БЯГУН Лідзія Аляксандраўна, брыгадзір паляводчай брыгады саўгаса «Гарадзец».

ВАЙЦЯШОНАК Расціслаў Паўлавіч, механізатар ПМК-51.

ВАСЮК Мечыслаў Іванавіч, механізатар калгаса «Шлях Леніна».

ВЯНГЕРАВА Наталля Фёдараўна, палявод калгаса імя Гагарына.

ГАНЕБНАЯ Яўгенія Дзмітрыеўна, калгасніца калгаса імя Калініна.

ГАРБАЧОНАК Уладзімір Антонавіч, механізатар калгаса імя Кутузава.

ГРЫГАРОВІЧ Яўген Юльянавіч, палявод калгаса імя Ільіча.

ДЗЯНІСАВА Анастасія Сямёнаўна, жывёлавод, калгаса імя Фрунзе.

ДЗЯНІСАВА Праскоўя Цімафееўна, жывёлавод саўгаса «Гарадзец».

ЖЫЛКО Аляксандр Сяргеевіч, сакратар парткома саўгаса «Гарадзец».

ЗІНЬКО Вера Канстанцінаўна, даярка саўгаса «Гарадзец».

ЗУЙ Антаніна Васільеўна, жывёлавод калгаса імя Ільіча.

ЗУЙ Пётр Міхайлавіч, калгаснік калгаса «Шлях Леніна».

ЗЯЛЁНКА Леаніда Рыгораўна, жывёлавод саўгаса імя Маркава.

ІВАНОЎ Георгій Пятровіч, сакратар парткома саўгаса «Шаркаўшчынскі».

КАЛТЫЖАНКА Мікалай Панцялеевіч, механізатар калгаса «Маяк».

КАСАРЭЎСКАЯ Марыя Пятроўна, даярка калгаса «Іскра».

КАСАРЭЎСКІ Аркадзь Іпалітавіч, калгаснік калгаса «Шлях Леніна».

КАСЕВІЧ Іван Уладзіміравіч, механізатар.

КАТОВІЧ Зінаіда Фёдараўна, калгасніца калгаса «Шлях Леніна».

КАЧАН Андрэй Кліменцьевіч, механізатар райаб'яднання «Сельгастэхніка».

КАШЭЛЬ Уладзімір Васільевіч, трактарыст калгаса імя Леніна.

КОРСАК Марыя Піліпаўна, жывёлавод калгаса «Вялікае Сяло».

КРАВЕЦ Уліта Васільеўна, жывёлавод саўгаса «Гарадзец».

КРАСІЛЬШЧЫКАВА Анфія Міхайлаўна, жывёлавод калгаса «Вялікае Сяло».

КРЫЎКА Валянціна Міхайлаўна, жывёлавод калгаса «Свабода».

КУРЫЛОВІЧ Уладзімір Аляксеевіч, трактарыст калгаса «Шлях Леніна».

КУРЭЦ Фёдар Ігнатавіч, трактарыст калгаса «1 Мая».

ЛАБАНОЎСКІ Панцеляймон Антонавіч, механізатар калгаса «Камінтэрн».

ЛАБУЦЬ Фаіна Анатольеўна, жывёлавод калгаса «Шлях Леніна».

ЛАГУН Іван Баляслававіч, механізатар калгаса імя Кутузава.

ЛАЗОВІК Іван Аляксандравіч, галоўны аграном калгаса імя Ільіча.

ЛАПАЦКІ Генадзь Уладзіміравіч, трактарыст калгаса «Прагрэс».

ЛАПКОЎСКІ Венядзікт Міхайлавіч, шафёр калгаса імя Ільіча.

ЛАСОЎСКІ Часлаў Іванавіч, калгаснік калгаса імя Энгельса.

ЛАЎРЫНОВІЧ Вацлаў Фабіянавіч, брыгадзір калгаса «Буравеснік».

ЛАЎРЫЧОНАК Ала Іванаўна, старшыня калгаса «Вялікае Сяло».

ЛЕРМАНТАЎ Мікалай Мікалаевіч, жывёлавод саўгаса імя Маркава.

ЛІПСКАЯ Вера Фёдараўна, палявод калгаса «Маяк».

ЛІПСКАЯ Людміла Міхайлаўна, жывёлавод саўгаса «Шаркаўшчынскі».

ЛУК'ЯНЁНАК Віктар Васільевіч, трактарыст калгаса «Шлях Леніна».

ЛУК'ЯНЁНАК Серафім Уладзіміравіч, старшыня калгаса імя Фрунзе.

ЛУК'ЯНСКІ Флегант Рыгоравіч, механізатар калгаса імя Энгельса.

ЛЯЎШЫЦКАЯ Любоў Рыгораўна, жывёлавод калгаса «Прагрэс».

МАЛАТОЎНІК Алег Аркадзьевіч, механізатар калгаса імя Ільіча.

МАРКОВІЧ Фаіна Васільеўна, даярка саўгаса «Шаркаўшчынскі».

МАРОЗАЎ Васіль Дзмітрыевіч, работнік райаб'яднання «Сельгастэхніка».

МАЦКЕВІЧ Яніна Станіславаўна, даярка калгаса «Свабода».

МІХАЙЛАЎ Агей Нікітавіч, жывёлавод калгаса «Усход».

МУРЗЁНАК Тамара Сяргееўна, даярка калгаса «Іскра».

МЯДЗВЕДСКІ Вадзім Кузьміч, брыгадзір райаб'яднання «Сельгастэхніка».

МЯДЗЕЛЕЦ Ірына Іванаўна, палявод калгаса «Буравеснік».

МЯДЗЕЛЕЦ Канстанцін Фёдаравіч, механізатар калгаса імя Калініна.

МЯТЛА Іван Восіпавіч, трактарыст калгаса імя Калініна.

МЯТЛЁНАК Кацярына Васільеўна, даярка калгас «Свабода».

НАВІЧОНАК Клаўдзія Аляксандраўна, калгасніца калгаса імя Калініна.

НАВУМЕНКА Віктар Уладзіміравіч, трактарыст калгаса «Прагрэс».

НЕДЗВЕДЗЬ Уладзімір Аляксеевіч, брыгадзір калгаса «Вялікае Сяло».

ПАВУЧОНАК Альфрэд Вікенцьевіч, механізатар калгаса імя Фрунзе.

ПАЛОНСКАЯ Эвеліна Браніславаўна, працаўнік калгаса «17 Верасня».

ПАЛЯКОЎ Анатоль Васільевіч, механізатар саўгаса «Гарадзец».

ПЕСТУН Вера Восіпаўна, даярка калгас імя Леніна.

ПЛОСКАЯ Ніна Антонаўна, даярка калгаса імя Даватара.

ПЛОСКІ Мяфодзій Васільевіч, шафёр калгаса імя Фрунзе.

ПУГАЎКА Ангеліна Мацвееўна, даярка калгаса «Вялікае Сяло».

РАБІЗА Міхаіл Іванавіч, шафёр калгаса «Буравеснік».

РАБІЗА Надзея Піліпаўна, галоўны аграном калгаса імя Ільіча.

РАЛАВЕЦ Зянон Пятровіч, рабочы саўгаса імя Маркава.

РЫМДЗЁНАК Марыя Пятроўна, жывёлавод саўгаса «Шаркаўшчынскі».

Н.П.Рабіза.

Я.В.Странчэўская.

К.Дз.Дабравольскі.

САПОЦЬКА Надзея Міхайлаўна, жывёлавод калгаса «Вялікае Сяло».

СКАВЫРКА Мікалай Аляксандравіч, старшыня Пялікаўскага сельскага Савета.

СТАНЮШ Венядзікт Іванавіч, механізатар калгаса «Іскра».

СТРАНЧЭЎСКАЯ Ядвіга Восіпаўна, даярка саўгаса імя Маркава.

СЯЛЮК Анастасія Аляксандраўна, працаўнік калгаса «Маяк».

СЯМЁНАЎ Арсен Іванавіч, працаўнік калгаса «Камінтэрн».

СЯТКОЎСКІ Валянцін Валяр'янавіч, трактарыст калгаса імя Ільіча.

ТАЎКІНЬ Пётр Мечыслававіч, жывёлавод калгаса «Вялікае Сяло».

ТРАБА Матрона Савельеўна, жывёлавод калгаса «Усход».

ХАДАНЁНАК Браніслаў Ігнатавіч, жывёлавод калгаса «Буравеснік».

ХАЛЯВА Васса Фёдараўна, даярка калгаса «Буравеснік».

ЦЫТОВІЧ Серафім Іванавіч, механізатар калгаса імя Леніна.

ЧАБАТАРОНАК Пётр Пятровіч, галоўны інжынер калгаса «Усход».

ЧАРНЕВІЧ Эдмунд Віктаравіч, механізатар калгаса «17 Верасня».

ЧАРНЯЎСКІ Раман Восіпавіч, жывёлавод калгаса імя Фрунзе.

ШАБЛОЎСКАЯ Алена Лук'янаўна, жывёлавод саўгаса «Шаркаўшчынскі».

ШПАКОВІЧ Іван Уладзіміравіч, механізатар калгаса «Іскра».

ШУДЗЕЛЬ Уладзімір Восіпавіч, калгаснік калгаса «Маяк».

ШУЛЬГА Анатоль Іпалітавіч, брыгадзір калгаса «Усход».

ШЧАБОЛ Часлаў Восіпавіч, механізатар калгаса імя Калініна.

ШЧАСНЫ Канстанцін Арсенавіч, жывёлавод саўгаса «Верацеі».

Кавалер трох ордэнаў Працоўнай славы

ДАБРАВОЛЬСКІ Канстанцін Дзмітрыевіч, нарадзіўся 7.2.1941 г. у в. Галінова. У 1948 г. пайшоў вучыцца ў Казакоўскую сямігадовую школу. Закончыў 5 класаў. Далей вучыцца не меў магчымасці, трэба было працаваць, дапамагаць у сям'і. У 1956 г. пачаў працаваць прыцэпшчыкам у калгасе імя Леніна і з гэтага часу звязаў сваё жыццё з тэхнікай. У арміі закончыў курсы трактарыстаў. У снежні 1963 г. вярнуўся ў родную гаспадарку, дзе працягваў працаваць трактарыстам.

Любоў да тэхнікі, старанне, працавітасць прынеслі першыя поспехі маладому механізатару. 14.2.1975 г. К.Дз.Дабравольскі быў узнагароджаны ордэнам Працоўнай славы III ступені.

У 1976 г. ён атрымаў ордэн Працоўнай славы II ступені, а ў 1986 г. — ордэн Працоўнай славы I ступені. Неаднаразова ўзнагароджваўся Ганаровымі граматамі, дыпломамі, каштоўнымі падарункамі.

Л.М.Лабачэўская.

ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Заслужаны работнік адукацыі

АНДЗІЛЕЎКА Мілецій Антонавіч (гл. артыкул «Захопленасць плюс творчасць»).

Заслужаныя настаўнікі

БУЛАН (ГОМАНАВА) Марыя Іванаўна, нарадзілася 18.4.1924 г. у в. Дубі-

ніна Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1967). Закончыла Аршанскае педагагічнае вучылішча (1948). Працавала будаўніком, кладаўшчыком у калгасе на Віцебшчыне. З 1945 г. загадчыца Сасноўскай пачатковай школы. Памерла 24.10.2000 г. Пахавана ў в. Верацеі.

ЖУГЕР (МІХАЙЛОЎСКАЯ) Леаніла Сямёнаўна, нарадзілася 4.1.1936 г. у в. Чарневічы Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1981). Закончыла Празароцкую сярэднюю школу (1953), фізіка-матэматычны факультэт Полацкага педагагічнага інстытута (1957). Працавала настаўнікам фізікі, намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Лужкоўскай сярэдняй школы. У гэтай школе настаўнічала 35 гадоў. У 1978 г. узнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

ЗАРЭЦКАЯ (СІКОРА) Праскоўя Іванаўна, нарадзілася 20.3.1934 г. у в. Алашкі. Заслужаны настаўнік БССР (1976). Закончыла Пастаўскае педвучылішча (1954), Брэсцкі педагагічны інстытут (1960). Працавала настаўніцай у Навасёлкаўскай сямігадовай, Слабодскай сярэдняй школах. Выдатнік народнай асветы, узнагароджана бронзавым медалём ВДНГ СССР.

КРАПОШЫНА Таццяна Ільінічна, нарадзілася 5.12.1924 г. у в. Самсоны Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1968). Закончыла Аршанскае педагагічнае вучылішча (1948). Працавала настаўніцай у Ёдскай, Углоўскай школах. З 1950 г. — настаўніца Шаркаўшчынскай васьмігадовай школы, дзе працавала амаль 40 гадоў.

МЯДЗЕЛЕЦ Алена Аркадзьеўна, нарадзілася 15.10.1950 г. у в. Ёды. Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь (1997). Закончыла Шаркаўшчынскую сярэднюю школу, Віцебскі дзяржаўны пединстытут (1971). Працавала настаўніцай матэматыкі ў Васюкоўскай васьмігадовай, Ёдскай сярэдняй школах, завучам па вучэбна-выхаваўчай рабоце Ёдскай СШ. Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю настаўніка, выдатнік народнай асветы, узнагароджана граматамі Міністэрства адукацыі рэспублікі (1982, 1987, 1997) .

МЯЦЕЛІЦА Галіна Антонаўна, нарадзілася ў 1932 г. у в. Лугаўцы. Заслужаны настаўнік БССР (1974). Закончыла Лужкоўскую сярэднюю школу (1950), Маладзечанскі настаўніцкі інстытут (1952), Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут (1960). Узнагароджана граматамі раённага, абласнога аддзелаў адукацыі, Міністэрства асветы БССР.



М.І.Булан.

Л.С.Жугер.

П.І.Зарэцкая.

Т.І.Крапошына.

А.А.Мядзелец.



Г.А.Мяцеліца.

ХАТКЕВІЧ (ХРУЦКАЯ) Любоў Міхайлаўна, нарадзілася 10.6.1929 г. у в. Замошша Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаны настаўнік БССР (1972). Закончыла Ёдскую сярэднюю шко-

В.М.Чабатаронак.

Л.І.Пракапенка.

лу (1949), Віцебскі настаўніцкі інстытут (1954), Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут (1969). Працавала настаўніцай у Сакалоўшчынскай пачатковай, Ёдскай сярэдняй школах.

ЧАБАТАРОНАК Васа Міхайлаўна, нарадзілася 29.4.1927 г. на хут. Халопаўшчына, што знаходзіўся побач з в. Мельніца. Заслужаны настаўнік БССР (1967). Закончыла Пастаўскае педвучылішча. Працавала ў Жарскай васьмігадовай школе. З 1950 г. — настаўніца пачатковых класаў у Слабадской сярэдняй школе, выдатнік народнай асветы.

Заслужаны работнік гандлю

ПРАКАПЕНКА Любоў Ісакаўна, нарадзілася ў 1922 г. у Дрысенскім раёне (цяпер — Верхнядзвінскі раён) на Віцебшчыне. Заслужаны работнік гандлю БССР (1975). У маладыя гады працавала ў гаспадарцы бацькоў на сваёй радзіме. У час Вялікай Айчыннай вайны (1943—1944) разведчыца партызанскага атрада імя Варашылава брыгады «За Радзіму», якая дзейнічала на тэрыторыі Дрысенскага, Ветрынскага і Шаркаўшчынскага раёнаў. Узнагароджана медалём «За баявыя заслугі». Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкай акупацыі жыла і працавала ў г.п. Шаркаўшчына. У 1944—1948 гг. — тэхнічны сакратар райкома партыі. З 1951 г. працавала ў гандлі: загадчыцай магазіна ў г.п. Шаркаўшчына, прадаўцом, старшым прадаўцом, загадчыцай аддзела універмага. Узнагароджана ордэнам Леніна. Памерла ў 2003 г.

Заслужаны работнік культуры

АНОШКА Іраіда Аляксандраўна, нарадзілася ў 1927 г. у в. Навалока Міёрскага раёна Віцебскай вобласці. Заслужаны работнік культуры БССР (1976). Закончыла партыйную школу пры ЦКУ КПБ (1956). Працавала ў Міёрскім, Падсвільскім, Пастаўскім райкомах партыі. З 1966 г. па 1983 г. — сакратар Шаркаўшчынскага райкома КПБ. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі

АЛЬСЕВІЧ Эдмунд Антонавіч, нарадзіўся 6.3.1936 г. у в. Дмітрыеўшчына Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Залескую сярэднюю школу ў 1953 г. Працаваў у Карэліі ў леспрамгасе. Пасля службы ў арміі закончыў Друйскае сельскае прафесіянальна-тэхнічнае вучылішча, дзе атрымаў спецыяльнасць машыніста экскаватара. Восем гадоў працаваў у Навадруцкай перасоўнай механізаванай калоне меліярацыі машыністам экскаватара. Завочна закончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Больш за 5 гадоў працаваў прарабам Навадруцкай ПМК меліярацыі. У 1971 г. прызначаны начальнікам Шаркаўшчынскага будаўніча-мантажнага ўпраўлення (пазней — ПМК № 51 меліярацыі). Узначальваў калектыў меліяратараў 27 гадоў. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў.

Славутыя землякі

САДАВОД, ВУЧОНЫ, АГРАНОМ

СІКОРА Іван Паўлавіч, нарадзіўся 19 верасня 1885 г. у беднай мнагадзетнай сялянскай сям'і ў вёсцы Алашкі Малыя Шаркаўшчынскага раёна. З дзяцінства захапляўся прыродай і вельмі любіў чытаць кнігі. Бліскуча закончыў Полаўскае пачатковае вучылішча, затым Краснагорскую двухгадовую настаўніцкую школу.

Абавязковую ваенную службу Іван Паўлавіч праходзіў у 124-м Усходне-Сібірскім палку ў Хабараўскім краі. У час службы Сікора пацвердзіў свае веды на годнасць настаўніка ў Хабараўскай гімназіі і некалькі гадоў вучыў дзяцей у пасёлку

Самарка-Арлоўка. Там жа ўпершыню пачаў займацца садоўніцтвам.

У 1-ю сусветную вайну салдат Сікора быў на фронце.

Вярнуўшыся дадому, ад бацькі атрымаў надзел зямлі ў 1/8 валокі. Прысядзібных будынкаў не меў. Разам з жонкай Марыяй Паўлаўнай працавалі на гэтым маленькім кавалку зямлі, не маючы ніякіх збераженняў. Паступова абзаводзіліся гаспадаркай.

У 1925 г. Сікора закончыў Кракаўскія двухгадовыя настаўніцкія курсы. Пачаў працаваць настаўнікам у Глыбоцкім раёне. Але праз год быў звольнены з работы за тое, што вёў заняткі на беларускай мове. Пасля некалькіх прашэнняў польскім уладам яго прызначылі настаўнікам у вёску Сямёнавічы, але ж зноў праз год звольнілі па той жа прычыне.

Маленькі надзел зямлі, які меў Іван Паўлавіч, безумоўна, не дазваляў яму праводзіць шырокія даследаванні па садоўніцтву. Таму Сікора пайшоў служыць садоўнікам да графа Пшаздзецкага ў Варапаева.

Тут Іван Паўлавіч Сікора пачаў весці даследчую працу, заклаў плодапітомнік, у якім вырошчваў многія сарты яблынь. Доследы працягваў і на ўласным надзеле зямлі ў Алашках. Пачаў перапіску з вядомымі польскімі вучонымі-садаводамі — пастаянным прадстаўніком Польшчы на міжнародных кангрэсах па садаводству доктарам В.Філевічам, прафесарамі С.Галчынскім, С.Заліўскім, інжынерам Я.Слязкім. Доктар В.Філевіч і прафесар С.Галчынскі двойчы прыязджалі ў Малыя Алашкі, каб азнаёміцца з працай Сікоры, вывучыць метады яго работы. Неаднаразова ён атрымліваў ад іх прапанову пераехаць працаваць у інстытут садаводства пад Пулавамі. У сваіх кнігах па садоўніцтву доктар Філевіч высока ацэньваў метады работы Сікоры.

У 1935—1939 гг. у выданнях на польскай мове і беларускіх выданнях «Самапомачы» з'яўляюцца артыкулы І.П.Сікоры, у якіх ён вельмі даступна апісваў свае прыёмы работы ў садзе, даваў кансультацыі сялянам па развядзенні садоў, падбору сартоў. І.П.Сікора імкнуўся заахвоціць садоўніцтвам сваіх землякоў. Ён шчодра дзяліўся з сялянамі саджанцамі вырашчаных ім лепшых сартоў. Пры гэтым заўсёды правяраў, ці правільна пасаджана дрэва, які за ім догляд. Ён выпрацаваў і прымяніў новыя метады лячэння старых пладовых дрэў.

Значны ўплыў на лёс Сікоры аказаў вялікі знаўца прыроды і раслін пісьменнік М.М.Прышвін, у прыватнасці, яго кніга «Удобрение полей и лугов». «Гэта кніжка, — успамінаў Сікора ў пісьмах да жонкі пісьменніка, — зрабіла мяне садаводам».

Пазнаёміўшыся з працамі былога прафесара, загадчыка кафедры факультэта садаводства Пецярбургскага ляснога інстытута А.С.Грабніцкага, аўтара кнігі «Догляд фруктовага саду» і унікальнага «Атласа пладоў», Іван Паўлавіч заводзіць перапіску з вядомым вучоным. Адам Станіслававіч Грабніцкі многім дапамог садаводу-аматару.

І.П.Сікора абследуе мясцовыя сады, пашырае лепшыя сарты пладовых дрэў, атрыманыя ад А.С.Грабніцкага, выводзіць свае, новыя. На яго невялічкім кавалку зямлі сабралася цэлая калекцыя пладовых і дэкаратыўных раслін.

Кветкі цвілі ў яго садзе з вясны да позняй восені. Дрэвы раслі нават ля сцен памяшканняў. Садавод-самавук высаджваў розныя сарты вінограду, парэчкі, агрэст, лімоннік, жэньшэнь, ружы, бэз і мноства іншых раслін. Вывучаючы мясцовыя лясы, праводзіў адбор ляшчыны, скрыжоўваў, атрымліваў гібрыды.

З прыходам савецкай улады ў 1939 г. пастановай урада БССР у садзе І.П.Сікоры быў арганізаваны Паўночны апорны пункт Беларускага навукова-даследчага інстытута бульбаводства, пладаводства і



І.П.Сікора.

агароднінаводства. Іван Паўлавіч стаў загадчыкам апорнага пункта. Датай адкрыцця яго лічыцца 15 красавіка 1941 г. На гэтай пасадзе І.П.Сікора працаваў і пасля Вялікай Айчыннай вайны, практычна да канца свайго жыцця.

Нават у гады вайны Іван Паўлавіч не спыніў сваёй работы па садоўніцтву. Восенню 1943 г. ён высаджвае сад, рэгулярна вядзе феналагічныя і метэаралагічныя назіранні. Партызаны забяспечвалі яго кавалкамі шоўку ад нямецкіх парашутаў, каб садавод мог пашыць з іх ахоўныя мяшэчкі для штучнага апылення і працягваць работу над новымі сартамі. Іван Паўлавіч з'яўляўся сувязным партызанскай брыгады «За Радзіму».

У час карнай экспедыцыі фашыстаў былі знішчаны амаль ўвесь архіў і бібліятэка І.П.Сікоры. У вайну памерла яго ўнучка, без весткі прапаў на фронце сын Пётр.

Пасля вызвалення раёна ад нямецкай акупацыі апорны пункт зноў пачаў працаваць. Праўда, Івана Паўлавіча падсцерагалі новыя ўдары лёсу. Памерла жонка Марыя Паўлаўна, сын Віктар быў рэпрэсіраваны і асланы ў лагер у Бадайбо. Вучонага ратавала любімая работа.

Беларуская доследная станцыя дасылала Сікору тэматычныя планы навуковадаследчай работы. Ён добрасумленна выконваў усе заданні. Адначасова вёў назіранні і абагульняў вынікі выпрабаванняў разнастайных сартоў пладова-ягадных і агародных культур, саджанцы і насенне якіх дасылалі яму з іншых доследных станцый краіны. Самастойна працаваў над вывядзеннем новых сартоў, гібрыдаў. Пасля выпрабавання сартоў, на што патрабаваліся гады ўважлівых назіранняў і ўпартай працы, ён імкнуўся адабраць такія, якія ў кліматычных, глебавых умовах рэгіёна не толькі б давалі значны эканамічны эфект, але і радавалі людзей сваім цвіценнем вясной, выглядам пладоў улетку, багаццем дароў сада і агарода ўвосень.

Іван Паўлавіч аднаўляе сувязі з інстытутам імя Мічурына, вядзе актыўную перапіску з вучоным гэтага інстытута Барысаглебскім, з кіраўнікамі і навукоўцамі батанічных садоў краіны. Цеснае сяброўства і актыўная перапіска з 1945 г. узніклі і працягваліся многа год з дырэктарам Алтайскай доследнай станцыі Міхаілам Афанасьевічам Лісавенкам. У ліку карэспандэнтаў Сікоры былі вядомыя вучоныя, акадэмікі Якаўлеў, Кісялёў, Яблыкаў, Пятроў, прафесар Дарафееў і іншыя. І.П.Сікора атрымліваў пісьмы ад пісьменнікаў М.Прышвіна і Л.Лявонава. Быў добра знаёмы з Я.Купалам, М.Лыньковым, паэтамі М.Калачынскім, Н.Гілевічам, Г.Бураўкіным. Шматгадовае сяброўства звязвала яго з М.Машарам. Адно з лепшых сваіх палотнаў — партрэт І.П.Сікоры — стварыў вядомы беларускі мастак П.Сергіевіч.

Значны ўклад І.П.Сікоры ў развіццё садоўніцтва ў Віцебскай вобласці і ў Беларусі. За гады сваёй работы ён распаўсюдзіў сярод насельніцтва звыш 60 тыс. сеянцаў і 50 тыс. саджанцаў.

Сікора адным з першых у Еўропе, як гэта адзначыў доктар В.Філевіч, распрацаваў метады лячэння і амаладжэння пладовых дрэў.

Цімірязеў называў арэхі «хлебам будучага», бо яны багатыя бялкамі і іншымі незаменнымі ў харчаванні чалавека кампанентамі. Івану Паўлавічу Сікору ўдалося стварыць разнастайныя формы ляшчыны. Многія яе сарты здзіўлялі нават такіх вядомых вучоных, як акадэмік А.С.Яблыкаў. Сікораўская ляшчына расце ў калекцыях многіх батанічных садоў былога СССР. Селекцыйна-доследную работу над арэхамі І.П.Сікора працягваў да апошніх дзён свайго жыцця.

Вялікую цікавасць праяўляў ён да развядзення і распаўсюджвання розных сартоў рэмантантных суніц, якія цвітуць і пладаносяць з канца мая да пачатку зімы. Адным з першых у Беларусі ён заняўся «прыручэннем» раслін-экзотаў з Далёкага Усходу: лімонніка амурскага, араліі, элеўтэракока, ляўзеі, войлачнай вішні і іншых.

За 58 гадоў, прысвечаных садоўніцтву, Іван Паўлавіч Сікора выпрабаваў каля 500 гатункаў яблынь, каля 100 гатункаў груш, 119 форм ляшчыны. Пасля шматгадовай праверкі на практыцы ў мясцовых умовах каля паўсотні найбольш зімаўстойлівых, урадлівых і добрых па якасці гатункаў пладовых дрэў атрымалі пастаянную прапіску.

Больш чвэрці стагоддзя Сікора займаўся гібрыдызацыяй. Пылок паўднёвых гатункаў ён атрымліваў з Нікіцкага батанічнага саду, Крымскай пладова-ягаднай станцыі і Сочынскай доследнай станцыі.

У яго на выпрабаванні было звыш 6 тыс.

гібрыдных сеянцаў пладовых дрэў. Сікора вывеў некалькі ўласных сартоў вінограду. Ён меў у сваім садзе 54 разнавіднасці бэзу. Выведзеныя ім сарты дэманстраваліся на многіх еўрапейскіх выставах і атрымалі высокую адзнаку. Яго калекцыя руж у 1930-я гады была адной з лепшых у Еўропе.

У Паўночным Казахстане энтузіяст і нястомны даследчык мясцовай расліннасці Б.В.Любімаў прывіў чаранкі сікораўскага бэзу на мясцовым хмызняку, размножыў у гадавальніку і высадзіў у ахоўную паласу 70 тыс. кустоў, якія спынілі наступленне пяскоў пустыні. Кусцік бэзу з Казахстана, які атрымаў Любімаў і назваў «Галінка Сікоры», дачка Івана Паўлавіча Лідзія Іванаўна пасадзіла на магіле бацькі.

Сікора вывеў буйнаплодны агрэст, які зусім не хварэе сфератэкай, позні гатунак маліны, рана паспяваючую вішню, тры гатункі чарэшні, некалькі гатункаў сліў, больш дзесятка гатункаў фундуку, вельмі добрых па якасці і ўраджайнасці. Вяршыняй яго селекцыйнай дзейнасці стаў гібрыд № 1377, плады якога садаводы вобразна назвалі «яблыкамі XXI стагоддзя». Пасля смерці Івана Паўлавіча сорт атрымаў назву «Памяць Сікоры».

Для развіцця садоўніцтва ў многіх рэгіёнах былога СССР вялікае значэнне мелі артыкулы І.П.Сікоры, якія публікаваліся ў цэнтральных і мясцовых галіновых і масавых часопісах і газетах. Па настойлівых парадах акадэмікаў Кісялёва, Якаўлева, Лісавенкі, дактароў навук Яблыкава, Барысаглебскага і іншых Іван Паўлавіч, нягледзячы на велізарную занятасць работай у садзе, начамі садзіўся за пісьмовы стол. Лаканічна, даступна і мудра перадаваў ён свой багаты практычны вопыт у брашурах «Садаводства», «Веснавыя работы ў садзе па барацьбе з хваробамі і шкоднікамі», «Наш вопыт пасадкі садоў».

Навуковая праца І.П.Сікоры цяжка паддаецца ўліку. Штогод ён вёў даследаванні па 15—20 розных тэмах і кірунках, якія вызначаў інстытут. Акрамя таго, працягваў весці назіранні і ставіць доследы па ўласнай ініцыятыве. Гадавыя або выніковыя справаздачы па выніках даследаванняў займалі да 300 і больш рукапісных старонак. Феналагічныя назіранні, запісы аб паказаннях тэмператур Сікора дбайна і скрупулёзна вёў на працягу многіх гадоў, што дазваляла яму вызначаць кліматычныя заканамернасці, улічваць іх у практычнай рабоце.

За поспехі ў развіцці айчыннага садаводства Іван Паўлавіч узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, Ганаровай граматай Міністэрства сельскай гаспадаркі і Вялікім сярэбраным медалём ВДНГ СССР. У 1956 г. яму было прысвоена ганаровае званне «Заслужаны аграном БССР».

Асоба Івана Паўлавіча Сікоры — адна з унікальных у гісторыі садоўніцтва. Падзвіжніцкай была яго дзейнасць не толькі як садоўніка, вучонага-даследчыка, які пакінуў нашчадкам каштоўную спадчыну, але і як педагога, прапагандыста кнігі, ведаў. Яго жыццё з'яўляецца яркім прыкладам авалодання высокімі духоўнымі каштоўнасцямі шляхам упартай стваральнай працы, самаадукацыі і самаўдасканальвання.

Памёр І.П.Сікора 26 верасня 1966 г.

Г.І.Сікора.

І.П.Сікора і Л.М.Талстой

Завочнае знаёмства Івана Паўлавіча Сікоры з Львом Мікалаевічам Талстым адбылося пад час вайсковай службы маладога Сікоры, якую ён праходзіў у Хабараўскім краі.

Іван Сікора, як самы пісьменны сярод папаўнення, быў прызначаны палкавым пісарам. Адзінай радасцю ў шэрым казарменным жыцці, напоўненым знясільваючай муштрой і знявагамі, было яго захапленне прыродай: ён прыглядаўся да мясцовай флоры і папаўняў сваю калекцыю насеннем новых пародаў дрэў і раслін. Саслужывец Сікоры, радавы, звольнены раней яго ў запас, аднойчы прыслаў яму пісьмо з Яснай Паляны. Ён пісаў, што часта бачыць Льва Мікалаевіча Талстога, і раіў Сікору пачаць перапіску з вялікім пісьменнікам — расказаць яму аб салдацкім жыцці. Іван Сікора — шчыры паклоннік таленту Талстога — прыняў прапанову з удзячнасцю.

Вось як расказвае аб гэтым эпізодзе свайго жыцця, які, несумненна, адыграў выключную ролю ў станаўленні Сікоры як інтэлігента, мысліцеля, сам Іван Паўлавіч у сваім пісьме да С.Л.Талстой, дырэктара Дзяржаўнага музея Л.М.Талстога, датаваным 14 студзеня 1951 г.:

«Царская казарма з яе дэспатызмам, бяспраўем салдат здалася катаргай. Убачыў у казарме тое, чаго да гэтага часу ніколі нідзе не бачыў і не ўяўляў. Хацелася хоць у чым-небудзь знайсці душэўную падтрымку. Найлепшым сябрам тут магла быць кніга. Але яе не было дзе ўзяць. У ротных бібліятэках, акрамя 10—12 брашур пра цара-бацюхну ды іншай бязглуздзіцы, нічога не было. У гарадскіх бібліятэках браць кнігі салдату не дазвалялася. Знаходзячыся на вайсковай службе, я не пераставаў думаць пра настаўніцтва ў будучым. Але тут перада мной паўстала складанае пытанне: чаму вучыць і ў якім духу выхоўваць сваіх вучняў? У выніку дум-перажыванняў я зразумеў, што дапамагчы мне могуць добрыя кнігі. Я тады ўжо ведаў, што найвялікшым пісьменнікам зямлі рускай з'яўляецца Л.М.Талстой. Прыйшла думка... напісаць пісьмо Льву Мікалаевічу. У адказ атрымаў па даручэнні Льва Мікалаевіча ад В.Г.Чарткова (сакратара Л.М.Талстога) каля дзесяці невялікіх кніжачак, у іх ліку «Исповедь», «Земельный вопрос», «О непротивлении злу» і іншыя. Атрыманыя і прачытаныя кнігі зрабілі вялікі пераварот у маёй свядомасці.

За атрыманыя кнігі ад усёй душы, як умеў, выказаў удзячнасць Л.М. і В.Г.Чарткову і прасіў прабачэння за свой неабдуманы ўчынак. У адказ на гэта пісьмо атрымаў ад Гусева (сакратара Л.М.Талстога) партрэт Льва Мікалаевіча з такім яго ўласнаручным надпісам: «И.П.Сикоре. Лев Толстой. 9 октября 1907 г.» і пісьмо Гусева. Пісьмо гэта загінула ў часе карнай экспедыцыі восенню 1943 г., калі загінуў мой архіў па садоўніцтву за 40 год і вялікая бібліятэка...»

«Партрэт Льва Мікалаевіча берагу як самае дарагое, каштоўнае для мяне. Бессмяротныя творы яго пакінулі на ўсё маё жыццё незабыўны, глыбокі след. Усё, што ёсць у ва мне добрага, прыстойнага, цвярозага, чалавечага, яно ў большасці народжана і замацавана творамі вялікага Льва Мікалаевіча», — пісаў І.П.Сікора М.Бяспалаву, дырэктару Дзяржаўнага музея Л.М.Талстога ў жніўні 1961 г.

Партрэт Льва Мікалаевіча Талстога з даравальным надпісам вісеў на сцяне ў хаце Івана Паўлавіча Сікоры на пачэсным месцы. А побач была паліца з кнігамі вялікага пісьменніка.

І.П.Сікора і М.М.Прышвін

М.М.Прышвін аказаў рашаючы ўплыў на лёс Сікоры. У дзяцінстве Іван Паўлавіч прачытаў кніжку Прышвіна-агранома «Удобрение полей и лугов». Вось што пісаў ён аб гэтым у лісце да пачынаючага літаратара Марыяны Палянінай:

«Я даўно знаёмы з яго творамі і захапляюся імі. Яго кніжка «Удобрение лугов и полей», прачытаная мной у дзяцінстве, зрабіла мяне садоўнікам. Калі б не гэта кніжка, магчыма, я рыхтаваўся б да іншай спецыяльнасці, да якой аказаўся б зусім няздольным, нічога добрага не змог зрабіць і выйшаў бы з мяне чалавек абібок...»

Івана Паўлавіча Сікору і Міхаіла Міхайлавіча Прышвіна звязвала моцная дружба, заснаваная на духоўнай роднаснасці, на вялікай любові гэтых людзей да прыроды. З Прышвіным, з яго жонкай І.П.Сікора вёў актыўную перапіску ўсё жыццё.

Іван Паўлавіч Сікора любіў словы Міхаіла Прышвіна: «Каб лес стаў як кніга, трэба спачатку не па вершалінах глядзець, а нагнуць галаву і ўнікнуць у драбніцы. Гэта не вельмі лёгка, таму што хочацца глядзець на вершаліны».

У Дуніне, на сядзібе М.М.Прышвіна, расце блакітны махровы бэз, названы «Дар Сікоры». А на магіле Міхаіла Прышвіна пасаджаны куст сікораўскай ляшчыны.

Падрыхтавала Л.М.Лабачэўская.

З успамінаў дырэктара Беларускага навукова-даследчага інстытута земляробства Уладзіміра Паўлавіча Самсонава

Дзейнасць Івана Паўлавіча можна з поўнай адказнасцю назваць навуковай. Ён марыў бачыць Беларусь, пакрытую садамі, і многае рабіў для гэтага. Выключная працавітасць дазволіла яму інтрадукаваць значную колькасць раслін, якія да яго не вырошчваліся ў рэспубліцы. Сарты яблынь, груш, ляшчыны, якія вывеў ён адзін, зрабілі б гонар любой доследнай станцыі. Сорт яблыні «Памяць Сікоры» да гэтага часу з'яўляецца лепшым па смакавых і тэхналагічных уласцівасцях сярод беларускіх

сартоў. А ляшчынай, на жаль, пакуль ніхто сур'ёзна не займаецца, хаця каштоўнасць гэтай культуры, перспектывы культурнага развядзення арэхаў відавочныя.

Іван Паўлавіч валодаў дарам прадбачання, разумеў непазбежнасць урбанізацыі і прадбачыў цягу гараджаніна да прыроды, зямлі, саду. Спецыяльна для маленькіх садовых участкаў у яго былі формы яблынь, якія займалі мала месца.

З дзённіка І.П.Сікоры

1957

4 снежня. Канчаю чытаць М.М.Гусева «Лев Николаевич Толстой», 914 старонак. Вялікі Талстой усё сваё жыццё шукаў праўду. А іншы юнак у наш час мяркуе, што ўсё зведаў і не жадае вучыцца... Мароз 16 градусаў. За акном гурбы снегу. Алашкі патанулі ў снягах. Раскрываю Прышвіна — і ўжо цвітуць лугі, калышуцца травы...

1958

16 сакавіка. Словы Ф.М.Дастаеўскага «Прыгажосць выратуе свет» запалі мне ў душу з дзяцінства. Але толькі цяпер, на восьмым дзесятку, пачынаеш разумець, якую высокую праўду сказаў пісьменнік.

26 кастрычніка. Амаль месяц не лічуся на службе (выйшаў на пенсію), а спачыну не ведаю. Экскурсіі, сустрэчы, лекцыі... Многа часу забіраюць адказы на пісьмы.

Прыбылі з Мінска («Кніга — поштай») зборнікі вершаў Вяземскага, Мерзлякова, Казлова, Трэфалева. Атрымаў таксама «Вершы, артыкулы, фельетоны» Васіля Курачкіна, «Апавяданні, фельетоны, аповесці» Міх. Зошчанкі, «З успамінаў» Карнея Чукоўскага, яго ж «Людзі і кнігі», а таксама трохтомнік апавяданняў Маркі Ваўчок. Хопіць на ўсю зіму.Чытанне — мой лепшы адпачынак.

1959

15 лютага. Сёння радасны дзень. Атрымаў добрыя пісьмы: ад акадэміка Акадэміі сельскагаспадарчых навук М.А.Лісавенкі, масквіча В.П.Паляніна і яго дачкі Марыяны і іншыя. Міхаіл Апанасавіч бадзёры і энергічны, хаця гады напружанай працы адбіліся на яго здароўі. Перапісваюся з ім гадоў дваццаць. Асабіста не сустракаліся, а пасябравалі моцна.

Зайздрошчу масквічам: палацы, тэатры, бібліятэкі. Але ў вёсцы ёсць свая радасць, прыгажосць.

Марыяна піша: «Дзіцячае пачуццё захаплення ахапляе мяне, як прачытаю хоць бы назву любімай кнігі»! Гэта святое пачуццё не пакідае і мяне ўсё жыццё. Добрая кніга прыносіць шчасце.

20 лютага. Нядаўна, пасля хваробы, пачаў складаць каталог маіх кніг. Жахліва: работы — на тыдзень! Кніг жа тысячы!

Гэта чацвёртая бібліятэка. Тры загінулі ў розны час.

Першая — даўно, як жыў на Далёкім Усходзе, у Хабараўску і на Амуры, за трыццаць кіламетраў ад горада. Жыў там сем гадоў, працаваў настаўнікам. Нажыў добрую бібліятэку. 4 мая 1912 года паехаў на летнія настаўніцкія курсы ў Пецярбург. Па дарозе даведваемся, што хтосьці загадаў курсы закрыць, і я павярнуў у Алашкі, да бацькоў. Думаў, на кароткі час, аказалася — назаўсёды. Закахаўся, ажаніўся. Ніхто не прыслаў з Хабараўска ніводнай кнігі.

Потым настаўнічаў у родных мясцінах і стварыў новую бібліятэку. Настаў 1917 год. Народ пацягнуўся да кніг. Бібліятэкі ў нашай мясцовасці не было. Прапанаваў аднавяскоўцам свае паслугі. Усе прыходзілі і бралі. А вярталі не ўсе. Іншы прыносіў толькі вокладку ды з дзесятак выпадковых старонак. «Навошта старонкі вырваў?». «Нічога, — кажа, — кніга тоўстая. Табе таксама хопіць».

А самая вялікая бібліятэка загінула ў мяне восенню 1943 года, калі пабывалі ў нас фашысцкія карнікі. Было ў ёй шмат выдатных айчынных і замежных выданняў.

1960

6 лістапада. Лета праляцела хутка, у клопатах. Пенсіянер, але супакою няма. Амаль штодня прыязджаюць экскурсанты. З раніцы да вечара так нагаворышся, што языком потым ледзь варочаеш. Атакуюць карэспандэнты. Кожнаму трэба паказаць, растлумачыць, расказаць. У жніўні пяць чалавек з Мінскай студыі тэлебачання тры дні здымалі сад для тэленарыса. Яго паказвалі ўжо мінчанам. Кажуць, добра атрымалася.

Па-ранейшаму атрымліваю шмат пісем. За тры месяцы (жнівень, верасень, кастрычнік) прыйшло 522 пісьмы! На трыста не паспеў даць адказ. Адны просяць парады, другія — насення, трэція — сеянцаў.

Бібліятэка мая папаўняецца. Чытаю «Далёкое близкое» І.Я.Рэпіна. Учора пошта прыйшлі «Крестоносцы» Генрыха Сянкевіча. Яго раманы захапляючыя. Чытаў яшчэ да рэвалюцыі. Два гады таму назад у Польшчы выйшла 50-томнае выданне Сянкевіча. Летам прачытаў «Русский лес» Леаніда Ляонава. Днямі атрымаў кнігу «Антон Чехов» (974 старонкі), Літаратурная спадчына, том 68, выданне Акадэміі навук СССР.

1961

5 верасня. Пісьмо! Як прыемна старому атрымаць пісьмо! Дарагая Марыяна! Вы так хораша апісалі Чорнае мора, што мне здалося, быццам я сам пабываў у падарожжы! З такім захапленнем чытаеш хіба толькі далёкаўсходняга падарожніка У.К.Арсеньева. Ля мора ніколі не быў. Бачыў Дняпро і Волгу, Заходнюю Дзвіну і Віслу, Іртыш і Лену, Енісей і Амур, Усуры... У Амуры тры разы тапіўся. Назаўсёды застаўся ў памяці прыгажун Байкал. А мора — сорам прызнацца! — не бачыў.

7 верасня. Лета праляцела хутка. Многа бяды прынеслі буры, град, ліўні. Пладоў у садзе мала, яны ўсе пакалечаны, непрыгожыя. Толькі кветнік радуе: пышна цвітуць вяргіні, гартэнзіі, гладыёлусы...

9 верасня. Восень уступае ў свае правы. Буслы паляцелі ў вырай, ластаўкі таксама. Ключамі мкнуць на поўдзень журавы. Збожжа з палёў сабрана. Раніцай моцна пахне бульбоўнікам.

18 кастрычніка. Апошні раз быў у лесе. Надвор'е яснае, звонкае. Чуцен кожны крок, кожны лісток, што падае з дрэва. Грыбоў не знайшоў. Пахадзіў на ўзлессі, патаптаў апалае лісце, памарыў. Адыходзячы, зняў шапку і развітаўся з лесам да вясны...

30 кастрычніка. Запоем чытаю «Дары русского леса» Дам. Зуева. Шчодрая ж зямля руская на прыгажосць і пачастункі! Не забываюся і на Фета — яго люблю з ранняга юнацтва. Вершы яго — вялікая радасць у маім жыцці.

1 лістапада. Стаяць густыя туманы. Неба зацягнула хмарамі. Імжыць дожджык. Прачытаў кнігу Бубновай «Повесть о поэте» (пра Нікіціна). Чытаю Багаслоўскага «Тургенев». Шчаслівая сёння моладзь! Перад ёю столькі дарог! І кнігі, кнігі. Раней так не было.

19 лістапада. Не люблю такі час: то густы туман і дождж, то марозік і снег. Хутчэй бы зіма! Пад акном паставіў кармушкі для птушак. Часцей за ўсё паяўляюцца сініцы, чырванагрудыя снегіры, аўсянкі, ну і, вядома, забіякі вераб'і. Часам залятае лясны доктар — дзяцел.

Люблю зіму! Столькі прыносіць яна цудоўнага. Добра пахадзіць па мяккім снезе, а яшчэ лепш — па шэрані. Пасля зімовай прагулкі адчуваеш сябе такім бадзёрым. Шмат успамінаецца... Колькі павандраваў я па тайзе ў зімовы час, калі настаўнічаў у пасёлку Самарка, ля Хабараўска! Снег там глыбокі, пышны. Адлігі не бывае і шэрані таксама. Але мы ўсё роўна са школьнікамі хадзілі нацянькі. Строіліся ланцужком — уперадзе настаўнік, за ім самыя смелыя вучні, а ззаду меншыя. Апошнія ў ланцужку — двое дужых хлопцаў. Гэта, каб ніхто не адстаў. Аднойчы ішла з намі маленькая дзяўчынка Вулька. Яе чамусьці Вавёрачкай звалі. Бяды нам было з гэтай Вавёрачкай: абула валёнкі з чужой нагі і губляе ў снезе то правы, то левы. Ды яшчэ вецер падхапіўся — злосны, калючы. Сцежку замяло. Давялося браць Вульку на рукі і несці вярсты са дзве. Нядаўна гэтая Вулька (цяпер пенсіянерка Ульяна Назараўна Арол) пісьмо прыслала. Піша, што выпадак, як валёнкі губляла, да гэтага часу памятае...

1962

4 ліпеня. Хадзіў у грыбную разведку, хаця грыбоў яшчэ няма. Па кветках бачыш, як ідзе час. Даўно адцвілі нарцысы і цюльпаны. Наступіла пара дзівосных півонаў (дванаццаць гатункаў!). Расцвілі чараўніцы лілеі — даурская і белая. Далікатныя крэмавыя кветкі язміну разліваюць наўкола водар. У кветках — маё юнацтва. Па некалькі разоў на дні абыходжу кветнік. Кажуць, у горадзе можна пражыць за кошт кветак. А тут шукаешь, каму б падарыць букет...

Летам чытаю тое, што лягчэй: «Шерлок Холмс» Конан Дойля, «Лунный камень» Уілкі Колінза. Зімой буду грызці «філасофскія» творы. Толькі што атрымаў з Мінска поўны збор вершаў С.З.Надсана (выданне 1962 года). З імі знаёмы даўно, але кожны раз па-новаму адчуваеш задуму аўтара і адценні яго душы.

20 снежня. Хварэю. У мокры дзень працаваў у садзе, спацеў. Сеў пад яблыняй адпа-

чыць — прастыў. У маладосці прастуда лёгка сыходзіла з рук, цяпер — іншая справа.

Ужо тры дні «крестьянин торжествуя, на дровнях обновляет путь». Стаяць невялікія маразы. Навокал бела і светла. На сэрцы лёгка і весела. У дні хваробы прачытаў раман Л.М.Ляонава «Вор», першы і другі том падпіснога выдання Вольгі Форш, два тамы твораў забытага пісьменніка В.Т.Нарэжнага, успаміны сучаснікаў аб У.Г.Караленку і «Судебные речи» (вядомых рускіх юрыстаў, 872 старонкі).

22 снежня. Стварыў для сябе і для наведвальнікаў мікрагалерэю — з маляўнічых паштовак. Іх накапілася тры альбомы: лепшыя творы айчынных і зарубежных мастакоў. Глядзіш, і сэрца поўніцца гонарам. Атрымаў аднатомнік вершаў і паэм паэта мінулых год К.М.Фофанава. Чакаю такі ж аднатомнік К.К.Случэўскага. Прыйшоў першы том шасцітомнага выдання «Краткая литературная энциклопедия».

Думаецца пра многае. Хочацца многа чытаць. Прага ўсё ведаць, усё ўмець...

1963

30 кастрычніка. Учора было маё свята: масквіч Палянін і яго дачка Марыяна прыслалі набор цудоўных пласцінак. Рускія народныя песні, класічныя п'есы, творы пісьменнікаў і галасы птушак. Яны і не здагадваюцца, якім багаццем мяне ўзнагародзілі! Ажыла наша радыёла, і дом напоўніўся музыкай. Суседзі ідуць патокам.

Якое шчасце — разумець музыку! Шкада, што з дзяцінства гэтаму не навучылі. Нас было пяцёра ў бацькоў: чатыры сыны і дачка. Я быў самы малодшы і адзіны пісьменны. У настаўніцкай школе (семінарыі) нас вучылі спяваць. Хорам кіраваў безгалосы, заўсёды п'янаваты дзяк.

1964

11 лютага. Часта бываю ў лесе, слухаю дыханне прыроды. У зімовую сцюжу ў душнай хаце ўспомніш пра лес — і раптам адчуеш яго пах — бадзёры, гаючы...

Заўважаю: здароўе ўсё больш ад надвор'я залежыць. Дні пасвятлелі, выглянула сонейка — на душы лягчэй стала. Дзіўна: нічога не баліць, а сіл меншае. Работы па-ранейшаму непачаты край. Днём адказваю на пісьмы, уначы чытаю.

14 лютага. На стале цвіце лімон — час павярнуў на вясну. «Сельский календарь» на 1964 год надрукаваў мой артыкул «Крылатые защитники урожая». Атрымаў шмат пісем ад моладзі. Пішуць аматары прыроды, сябры птушак, раслін.

15 красавіка. Жывая прырода — лепшы доктар. Лечыць, выхоўвае, робіць лепшым... Вясна! Вяртаюцца з выраю птушкі. Шырока разліліся рэкі. Лугі пакрыліся вадой. Палі чорныя. У глыбокіх ярах бялее снег. На градках паказаліся жоўта-зялёныя язычкі шматгадовых кветак. У арэшніку цвітуць пралескі. Гадоў дваццаць назад прынёс з лесу і пасадзіў кветку, а цяпер іх — цэлая плантацыя. Кожную вясну радуюць пралескі сваімі раннімі кветкамі і ледзь прыкметным водарам... Увесь дзень прабыў у садзе. Сама прырода кліча да працы.

Уначы за акном чулася курлыканне журавоў.

1 чэрвеня. Нарэшце паехала брыгада з кінастудыі (пяць чалавек). Закончылі веснавыя здымкі для фільма «Сказ пра садавода» (сцэнарый М.Калачынскага). Калі верыць, два кіламетры плёнкі «папсавалі». Пракляў галоўнага аператара і яго памочнікаў. На старасці год робяць з мяне артыста! Хай даруюць старому. Сам ведаю: без гэтага нельга.

6 чэрвеня. Няма большай уцехі, як сустрэць добрага чалавека. Пісьмо сябра! З чым параўнаць яго? Са срабрыстымі струменямі крыніцы? З маладой лістотай бярозкі?.. Рад, што вы, Марыяна, узяліся за Прышвіна. Пясняр прыроды Прышвін — у сэрцы маім. Чытаю кнігу Т.Хмяльніцкай «Творчество Михаила Пришвина».

1965

25 лютага. Супрацоўніца часопіса «Садоводство» В.Новікава піша: «Напісала апавяданне «Каб сад стаў як кніга». Ідэя навеяна радкамі з «Хаджи-Мурата» Л.М.Талстога (некаторы перафраз) і з Прышвіна «Каб лес стаў як кніга». Пытаецца пра дату майго нараджэння. Нарадзіўся ў Алашках 27 жніўня 1885 года (па старому стылю).

27 лютага. Гаварылі пра артыстаў. Прыгадаў прыезд сталічнага тэатра на Далёкі Усход (1907 або 1908 год). Як іграла В.Ф.Камісаржэўская! Выступала ў «Грозе» і «Бесприданнице», у п'есах скан-

дынаўскіх аўтараў. Месц свабодных ніводнага. Білеты былі прададзены за шмат дзён наперад. Тэатр дрыжэў ад воплескаў... У Хабараўску мне давялося слухаць і Собінава. Сустрэчы запомніліся на ўсё жыццё...

30 сакавіка. Міністэрства прапануе ехаць у санаторый. Вельмі прыемна. А як падумаеш, што гэта будзе ў разгар веснавых работ у садзе, — трывожна на сэрцы. Хочацца зрабіць больш і больш. Для мяне шчасце — праца, іншага не ведаю.

Літаратура і мастацтва. 1965. 21 вер.

НОВАЕ ПРА СІКОРУ

Францішак Віславух — былы камандзір роты батальёна, які дыслацыраваўся ў 30-я гады XX стагоддзя ў Беразвеччы, каля Глыбокага. Вайсковец — з адукаваных афіцэраў, аўтар 3 кніг, некалі вельмі захапляўся прыродай. Гэтыя яго нататкі былі надрукаваны на польскай мове ў Лондане. І расказваецца ў іх пра знакамітага нашага земляка-садавода Івана Паўлавіча Сікору.

Такі выпадак адбыўся ў Варапаеве. Выпала мне аказія паехаць у лясы Пастаўскага павета, належачыя пану Праздзецкаму з Варапаева. Лясы гэтыя былі велізарныя і зусім бязлюдныя. Удзел у паездцы са мною прымаў таксама інжынер лесу — сімпатычны чалавек, які дасканала ведаў тэрытою і лясы, падпарадкаваныя яму.

Пасля агляду лясного аб'екта вярталіся мы праз вялікае сяло. Раптам інжынер запытаў, ці хачу я ў маліны? Ад такіх прапаноў не адмаўляюцца, бо хто не любіць лясных пахучых ягад, тым больш, што час нам дазваляў яшчэ адно задавальненне. Я выказаў згоду, але здзівіўся, калі інжынер прыпыніў брычку каля невялікай хаткі, злез і запрасіў мяне. Вакол раслі густа насаджаныя маладыя таполі, якія служылі дадатковай агароджай саду і агароду. У гэтым зацішшы раскінуўся агромністы сад з садавінай, парэчкамі і малінамі.

Інжынер пайшоў да гаспадара, а я разглядваў ягады. Ніколі і нідзе не бачыў такіх. Гронкі парэчак густа звісалі, іх кісці мелі ў даўжыню некалькі сантыметраў і былі аблеплены ягадамі памерам у грашовую манету. Галінкі згіналіся пад цяжарам ягад з вялікі напарстак. Не мог паверыць уласным вачам. З хаткі ў глыбіні саду выйшаў мужчына, апрануты ў саматканае адзенне. Гэта быў гаспадар.

Павітаўся са мной па-руску і сказаў: «Калі ласка, у маліны!». З усмешкай шырокім жэстам указаў на чырвоныя ад ягад кусты. «Калі ласка, не шкадуйце для сябе, іх шмат, я не ведаю, што з імі рабіць. Другая справа парэчкі, я раблю з іх віно».

Добра, што я і інжынер размаўлялі па-руску, бо маглі б не дамовіцца. Мужчына паведаміў, што некалькі год таму прыехаў сюды ў якасці школьнага настаўніка ў Варапаева, але пасля вайны быў звольнены, бо не гаварыў па-польску. Каб як-небудзь жыць, заняўся садоўніцтвам і агародніцтвам. Дапамог яму пан Праздзецкі. Даходаў ад саду і агароду хапае на жыццё, навучанне дачкі ў вышэйшай аграномічнай школе ў Варшаве, а таксама на расходы, звязаныя з доследамі над саджанцамі яблынь. Гаспадар сказаў: «Вы частуйцеся, а я прынясу кнігу, якая вас зацікавіць».

Мы з радасцю патанулі ў малінах. Ягады былі пышныя, не тое, што лясныя. Садоўнік прыйшоў з вялікай кнігай у руках. Была яна аб флянсах пладовых дрэў. Выдадзена ў Германіі. Ён паказаў старонкі з указаннем месцаў, дзе працуюць над саджанцамі навукова. Названы тры, дзе праводзяцца доследы: мясцовасць каля Парыжа ў Францыі, каля Франкфурта ў Германіі і ў Варапаеве — у Польшчы. Калі мы чыталі, садоўнік быў вельмі задаволены нашым здзіўленнем. І адразу ж сказаў: «Рады, што прыехалі да мяне, таму што зможаце мне дапамагчы. Сяло ідзе на раздзел, і мой сад будзе належаць іншаму гаспадару. Я атрымаю новы ўчастак. Мая праца знікне, бо трэба шмат гадоў, каб стварыць новы сад. Нічога не магу зрабіць, староства супраць мяне. Прычапіліся, што пішу ў Маскву і атрымліваю адтуль карэспандэнцыю. Мне дасылаюць матэрыялы, якія тычацца маёй працы, і толькі. Што дрэннага, калі карыстаюся і рускай мовай? Мяне падазраюць у камуністычных поглядах. Паліцыя пастаянна сочыць за мной і выпытвае аб кантактах з людзьмі, а маіх тлумачэнняў ім не хапае. Праца мая прападзе».

Гледзячы на сад, я прызнаваў, што садоўнік правы, разумеў яго скаргі на непаразуменні, створаныя, магчыма, толькі бюракратыяй. Узяўся гэту справу высветліць і дапамагчы чалавеку, тым больш, што са мной быў сведка — дэлегат ваяводства (інжынер), і я вырашыў гэта скарыстаць. Мы абышлі ўсе дрэвы. Колькі працы ў іх

укладзена! Некаторыя яблыні не мелі даўно ўжо свайго пня, а раслі за кошт прышчэплівання, іх галінкі былі абсыпаны яблыкамі антонавак. Я сказаў садоўніку, што ў Пірковічах на Палессі памятаю яблыню, якая з аднаго пня мела тры розныя гатункі — і ўсе здзіўляліся. Ён адказаў, што гэта звычайная справа і вельмі лёгкая для здзяйснення. Аднак ён канцэнтруе ўвагу на вырошчванні антонавак, яблынь найбольш прыстасаваных да халоднага клімату паўночнай Віленшчыны.

Перад вяртаннем у Гродна я затрымаўся ў Вільні і наведаў палкоўніка Бацянскага. Ведаў яго добра — разам працавалі. Калі паведаміў аб паездцы ў маліны, той здзівіўся. Зацікавіўся справай садоўніка і адразу ж патэлефанаваў старасту пастаўскаму. Той адказаў, што не ведае добра ўсіх абставін, аднак дасведчаны аб іх начальнік бяспекі. Дадаў, што староства падазрае садавода ў камунізме. Была тэлефонная размова і з начальнікам бяспекі. Ваявода Бацянскі сказаў: «Справу высветлю асабіста і неадкладна».

Я спакойна вяртаўся ў Гродна. Праз некалькі дзён патэлефанаваў ваявода: «Дзякуй за справу садоўніка з Варапаева. Быў я ў яго сам, у малінах. Ён застанецца на сваім участку, і дадзім яму яшчэ два гектары. За яго заслугі ва ўзняцці культуры сяла прадстаўлю яго да ўзнагароды залатым крыжам».

Народнае слова. 1996. 29 кастр.

Падрыхтаваў І.Зямчонак.

НЕЗАБЫЎНЫЯ СУСТРЭЧЫ

Упершыню мне пашчасціла пазнаёміцца з Іванам Паўлавічам Сікорам у 1936 г.

А здарылася гэта так. Быў я тады малады. Марыў заняцца якой-небудзь вельмі карыснай справай. І больш за ўсё душа ляжала да садоўніцтва. Але як пачаць? У каго павучыцца?

І вось дачуўся я пра такога казачнага садоўніка, як Іван Паўлавіч Сікора. Працаваў ён тады ў графа Пшаздзецкага ў Варапаеве, што на Пастаўшчыне. Вядома, да Варапаева дарога няблізкая, але жаданне было такое вялікае, што адправіўся я да Івана Паўлавіча пехатою. Выйшаў з дому ранічкай, як толькі ўзышло сонца, а ў Варапаеве з'явіўся толькі к вечару...

Іван Паўлавіч, нягледзячы на позні час, яшчэ працаваў у садзе. Сустрэў ён мяне ветліва. Спытаў:

— Што вы, малады чалавек, хочаце?

— Хачу быць добрым садоўнікам, — адказаў я.

Яму, відаць, адказ спадабаўся. Ён запрасіў мяне ў хату. Хата была маленькая, і жыў ён у ёй адзін.

— Жонка Марыя Паўлаўна з дзецьмі ў Алашках Малых, — сказаў Іван Паўлавіч. — У вёсцы. А я — тут.

У сціплым пакойчыку, на паліцах, было шмат кніг. Мастацкіх і па садоўніцкай справе. Іван Паўлавіч прапанаваў мне паглядзець «Атлас пладоў» Грабніцкага. Гэту унікальную кнігу сёння ў бібліятэках проста немагчыма ўбачыць.

Пакуль я гартаў кнігу, Іван Паўлавіч згатаваў чай. Заварыў яго на мясцовых зёлках. Які гэта быў чай! Я памятаю яго і сёння, а мінула ж больш паўстагоддзя.

Калі папілі чаю, перакусілі, Іван Паўлавіч запрасіў мяне ў сад і пачаў знаёміць з пладовымі дрэвамі, якія раслі там. Асабліва прыкоўваў увагу да тых, якія былі лепшымі для нашых кліматычных умоў: белага наліву, малінаўкі, ананаса Бержанецкага, пепіна літоўскага, антонаўкі звычайнай і іншых. І чым больш Іван Паўлавіч мне паказваў і расказваў, тым больш у мяне ў душы разгараўся агеньчык. Мне захацелася застацца тут і працаваць простым рабочым. Не вытрымаў, сказаў Івану Паўлавічу:

— Вазьміце мяне на працу!

Ён раптам змоўк, зірнуў на мяне скоса, а потым прамовіў:

— Я сам тут дабываю апошнія дні. Панскі хлеб агорк ужо. Вярнуся ў сваю родную вёску Алашкі Малыя, у сваю хату, на свой кавалачак зямлі. Там лягчэй будзе дыхацца. А чорны кавалак хлеба дасць сілы і бадзёрасць працаваць дзеля свайго народа, а не паноў. І будзе гэты чорны хлеб смачнейшы, чым панская булка...

Доўга мы гаварылі яшчэ ў той вечар. Я застаўся начаваць у Івана Паўлавіча. А раніцою, пасля сняданку, ён даў мне патрэбныя кнігі па садоўніцтву, і адправіўся я назад дадому. З глыбокай верай душы, што здолею штосьці зрабіць карыснае.

Пад канец мая наступнага года пашчасціла мне ў другі раз наведаць Івана Паўлавіча. Быў ён тады ў вёсцы Алашкі Малыя.

Працаваў на сваім невялічкім кавалку зямлі. Хату Івана Паўлавіча не трэба было шукаць. Яна вылучалася садам. Тут быў незвычайны парадак і прыгажосць. Сад цвіў. Цвілі кветкі — браткі, цюльпаны, нарцысы. Спявалі ў садзе птушкі. Для іх былі ўстаноўлены дуплянкі і шматпавярховыя шпакоўні. Мне здалося, што тут быў сапраўдны квітнеючы зямны рай.

Была нядзеля, але Іван Паўлавіч працаваў. Ён займаўся апыленнем пладовых дрэў. Вельмі ўзрадаваўся, калі ўбачыў мяне. Яму патрэбен быў памочнік.

Калі закончылі апыленне дрэў, прыселі на лаўцы пад квітнеючым бэзавым кустом. І хоць Іван Паўлавіч быў дужа сціплы і негаваркі, ён у той дзень крыху расказаў пра сябе. Пра тое, як быў яшчэ да Кастрычніка ў Хабараўскім краі. Якія там добрыя дружныя людзі. Як не змог без радзімы. Вярнуўся ў Беларусь і трапіў пад белапольскую акупацыю. Быў настаўнікам у вёсцы Мікулічы, што пад Глыбокім. Але нядоўга. Польскія нацыяналісты палічылі яго нядобранадзейным настаўнікам і вызвалілі ад займаемай пасады. І вось тады заняўся садоўніцтвам.

Вельмі падрабязна расказаў Іван Паўлавіч аб паездцы да вядомага садавода, прафесара Адама Станіслававіча Грабніцкага.

— Я даўно чуў пра Грабніцкага, чытаў яго кнігі, — пачаў Іван Паўлавіч. — І мне захацелася з ім сустрэцца. Напісаў яму аб гэтым ліст. Неўзабаве атрымаў запрашэнне. Адправіўся з братам да Грабніцкага восенню, калі ў садах спелі яблыкі. Прыехалі ў вёску Рай, дзе знаходзіўся тады прафесар. Бачым старога нейкага, падобнага на Льва Талстога. Барада вялікая, сівая. Сам — у саламяным капелюшы, нацыянальнай вопратцы. Я і пытаюся ў гэтага старога: «Дзе можна бачыць Адама Станіслававіча Грабніцкага?». Стары ўсміхнуўся: «Грабніцкі — гэта я». Узрадаваліся, што трапілі, сустрэлі. Адам Станіслававіч распытаў, адкуль я, якую маю адукацыю па садоўніцтву, колькі зямлі і якія планы. Адказаў яму, што зямлі амаль няма, і тут жа паведаміў пра свае планы. Адам Станіслававіч быў дужа здзіўлены і абрадаваны. «Я вам дам, — сказаў ён, — самыя лепшыя зімастойкія гатункі, якія ў нас ніколі не вымярзаюць: ананасу, антонавак, белага наліву прыбалтыйскага». Ён паказаў таксама свой сад, у якім раслі пладовыя дрэвы з многіх краін Еўропы, а таксама мічурынскія гатункі. І хоць па дарозе назад зламалася кола ў возе, і хоць прамоклі да ніткі пад халодным дажджом, я быў натхнёны...

Слухаць расказ Івана Паўлавіча Сікоры было адно задавальненне. Але паўтараю, надта негаваркі ён быў чалавек. Пачаставаць цябе — іншая рэч. І на гэты раз запрасіў мяне ў сялянскую хату. У хаце было чыста, многа кніг. А на сцяне вісеў партрэт Льва Мікалаевіча Талстога з надпісам «И.П.Сикоре — Л.Н.Толстой. 1907 г.». Іван Паўлавіч заўважыў, што ён з 1905 г. вёў перапіску з Львом Мікалаевічам Талстым, раіўся з ім. Мог бы я, канечне, і больш падрабязна тады даведацца, чым дзяліўся Іван Паўлавіч у лістах да вялікага настаўніка, але вельмі зацікавіў сад Сікоры.

Іван Паўлавіч пазнаёміў мяне з навейшымі гатункамі. Паказаў яблыні «дубовікі».

— Яны лічацца лепшымі, — сказаў, — але наша задача — вывесці яшчэ лепшыя, каб яблыкі маглі зімаваць да самай вясны, бо яны валодаюць лячэбнымі ўласцівасцямі.

Мяне да глыбіні душы ўразіла, як Іван Паўлавіч на такім маленькім кавалку зямлі праводзіў навукова-даследчую і эксперыментальную работу. Яму дапамагала ў гэтым уся сям'я — жонка Марыя Паўлаўна, дзеці — Лідзія, Пётр, Віктар.

У сувязі з гэтым не магу не расказаць яшчэ пра адзін выпадак. Справа ў тым, што ў 1928—1929 гг. былі вялікія маразы і многія сады павымярзалі, або былі пашкоджаны. Вядомыя польскія вучоныя Галчынскі і Слязкі, якія выдалі нямала кніг па садоўніцтву, звярнуліся за дапамогай да прафесара Грабніцкага. Адам Станіслававіч на гэта сказаў ім:

— Ёсць у нас садавод-самавук. Але надзейны. Іван Паўлавіч Сікора. Едзьце да яго, у Алашкі Малыя.

Польскія вучоныя паслухаліся. Яны прыехалі ў вёску Алашкі Малыя і, калі пабачылі сад Сікоры, пазнаёміліся з яго метадамі барацьбы з хваробамі дрэў, былі здзіўлены надзвычайна. Яны сталі прасіць у адзін голас, каб Іван Паўлавіч пераехаў працаваць да іх на навуковую станцыю. Абяцалі вялікія грошы.

Іван Паўлавіч адказаў на гэта:

— Не. Не магу. Родны кут, зямля, свой народ — мне даражэй багацця. Я іх ніколі не пакіну. І колькі сіл будзе, буду працаваць тут.

Потым я не раз яшчэ наведваўся да Івана Паўлавіча. І часта — за дапамогай. К таму часу працаваў на чыгунцы і даводзілася раіцца з Іванам Паўлавічам, чым абсаджваць яе, каб снягі не замяталі зімой і каб летам таксама прыемна было па ёй ехаць. Іван Паўлавіч заўсёды дапамагаў.

Захавалася ў мяне шмат лістоў Івана Паўлавіча. З іх бачна, як ён любіў садоўніцтва, як не шкадаваў ні сіл, ні здароўя для таго, каб квітнелі сады на Беларусі.

Доктар навук з Польшчы В.Філевіч у сваёй кніжцы «Новыя метады ў садах і гадавальніках» адзначае, што Іван Паўлавіч Сікора дабіўся ў садоўніцтве такіх вынікаў, якіх не змаглі дасягнуць на доследных станцыях ЗША, Англіі, Францыі, Італіі...

П.Гапанёнак, пенсіянер.

З матэрыялаў музея І.П.Сікоры.

НАСТАЎНІК СІКОРЫ

Іван Фаміч Атрахімовіч — адзін з першых настаўнікаў І.П.Сікоры ў садоўніцкай справе.

Знаёмства гэтых людзей адбылося недзе ў 1920 г. Іван Паўлавіч Сікора к гэтаму часу канчаткова асеў у Малых Алашках, непадалёку ад Шаркаўшчыны, дзе меў невялікі кавалак зямлі, і вырашыў сур'ёзна заняцца садоўніцтвам. Іван Фаміч Атрахімовіч тады ўжо быў вядомы ў акрузе эксперыментатар і ўмелы садоўнік.

Калі Іван Фаміч прыехаў у госці да свайго цесця ў Малыя Алашкі, да яго звярнуўся малады мужчына з просьбай навучыць прыёмам догляду дрэў. Ён спадабаўся Івану Фамічу. Паміж імі завязалася перапіска.

Захаваўся першы ліст Сікоры да Івана Фаміча. У ім ён дзякуе садоўніку за навуку і просіць пакінуць яму саджанцы яблынь некаторых сартоў для будучага саду. У наступных лістах да Атрахімовіча Іван Паўлавіч дзеліцца навінамі, планамі, першымі вынікамі сваёй доследнай работы. І вопытны садоўнік дапамагае парадамі, высылае саджанцы, чаранкі.

Калі Сікора шырока і смела пачаў праводзіць эксперыменты, заняўся селекцыяй пладовых і ягадных культур, паміж настаўнікам і вучнем наладзілася больш цеснае супрацоўніцтва. Пад час сваіх паездак па плодагадавальніках Іван Паўлавіч не забываў пра Атрахімовіча і набываў новыя сарты на яго долю. Гэтак жа і Іван Фаміч дасылаў яму штосьці з навінак.

Аднак у 1939 г. перапіска паміж імі па невядомай прычыне абарвалася.

Дык што за чалавек быў гэты забыты настаўнік знакамітага садоўніка і як склаўся яго лёс?

Іван Фаміч Атрахімовіч нарадзіўся ў вёсцы Баравыя 24 верасня 1872 г.

У яго бацькі, Фамы Карлавіча, было не надта многа зямлі, а калі яе падзяліць на чатырох сыноў, то кожнаму выходзіла зусім патроху. Зямлю прыйшлося дакупіць у вёсцы Каралёва, што за пяць кіламетраў ад Германавічаў. Туды перабраліся ў 1908 г. сем'і Івана Фаміча і брата бацькі. Тут і ажыццявілася мара мець свой кавалак зямлі, каб пасадзіць новы сад. Праз 7 год у ім было ўжо 813 дрэў.

Увесь час і ўсю душу аддаваў Атрахімовіч саду. Яго цікавіла ўсё, што было звязана з пладовымі дрэвамі. Ён вёў перапіску з многімі садаводамі, набываў кнігі па садоўніцтву.

Шкада, што ні бібліятэка, ні значная частка яго архіваў не захаваліся. Але нават тое, што засталося з яго спадчыны, сведчыць аб сур'ёзнай навуковая працы. Нават нешматлікія запісы даюць уяўленне аб штодзённай творчай рабоце Івана Фаміча на працягу многіх гадоў.

Сярод папер садоўніка зберагліся два яго дзённікі. У адзін ён запісваў усё, што датычылася саду, і толькі зрэдку ў ім трапляліся ўспаміны аб найбольш значных падзеях у грамадскім жыцці: змена ўлады ў 1939 г., пачатак вайны, расстрэлы, рабаўніцтва. Сярод такіх запісаў чытаем: «Вясна 1943, на могілках у Каралёве пасадзілі бярозы...», «Вясна 1943, у Каралёве пасаджаны чаранкі вінаграду...»

А ў другі дзённік ён пісаў пра падзеі ў асабістым жыцці або жыцці сям'і. І зноў жа ледзь не ўсе падзеі, занатаваныя ў гэтым дзённіку, звязаны з садам. Інакш, відаць, і не магло быць, бо сад з'яўляўся асновай жыцця сям'і. Набыць саджанцы, яблыкі, ягады да Івана Фаміча з'язджаліся людзі з усяго навакольля. Іван Фаміч на зіму і для доследаў пакідаў нямнога, час-

тку саду здаваў у арэнду яўрэйскім прадпрымальнікам. Так было да 1939 г.

Каб не запісалі ў кулакі, Івану Фамічу прыйшлося адпісаць зямлю на сыноў. Для сябе пакінуў толькі сад, які хутка, нават нягледзячы на жаданне ўлад стварыць на яго аснове ўзорны плодагадавальнік, прыйшоў у заняпад.

У 1940 г. Іван Фаміч склаў спіс сартоў яблынь свайго саду. У ім было каля 100 назваў. Было тады ў ім і шмат незвычайнага — кітайская таполя, розныя ягадныя кусты, кветкі, вінаград.

Спрабаваў Іван Фаміч выводзіць новыя сарты пладовых дрэў. У яго дзённіках сустракаюцца запісы: «Садзілі саджанцы ўласнай пароды...» Але хутчэй за ўсё гэтыя дрэўцы загінулі, бо больш пра іх ніякіх вестак пакуль не знойдзена.

Пасля смерці Івана Фаміча (20.4.1946) яго саду, без належнага догляду, а магчыма і з-за вялікіх падаткаў на дрэвы і кусты, не стала.

М.А.Райчонак.

Яны нарадзіліся ў раёне

ТВОРЦЫ

ДУБАШЫНСКІ Павел Піліпавіч, нарадзіўся 14.3.1931 г. у в. Гарбуны, акцёр. Народны артыст Беларусі (1989). Пасля заканчэння Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1955, педагог Л. Мазалеўская) працаваў у Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача, з 1967 г. у тэатры імя Я.Купалы. Спачатку выконваў ролі герояў і характарныя. Сярод іх: Лявон, Федзя («Папараць-кветка», «Над хвалямі Серабранкі» І.Козела), Валодзя («Юныя мсціўцы» А.Гутковіча, У.Хазанскага), Адась («За лясамі дрымучымі» А.Вольскага і П.Макаля) і інш. Сярод лепшых роляў: Шпекін («Рэвізор» М.Гогаля), Прысыпкін («Клоп» У.Маякоўскага), Серада («Як гартавалася сталь» паводле М.Астроўскага), Караколь («Горад майстроў» Т.Габэ), Ярцаў («Па закліку сэрца» М.Анава, Я.Штэйна), Аляксей («Дзяўчына з вяснушкамі» А.Успенскага), Ленц («Бумеранг» А.Татарскага). Дакладнасць малюнка, выразная пластыка, выкарыстанне гратэску, эксцэнтрыкі ўласцівы камедыйным ролям, створаным артыстам у тэатры імя Я.Купалы. Значнага поспеху дасягнуў у нацыянальным рэпертуары: Пракоп («Рудабельская рэспубліка» паводле С.Грахоўскага), Ціхан, Кваліфікатар святога судзілішча («Адкуль грэх?», «Напісанае застаецца» А.Петрашкевіча), Добрых «Амністыя» М.Матукоўскага), Камендант, Ломцеў, Міністр фінансаў («Трыбунал», «Таблетку пад язык», «Святая прастата» А.Макаёнка), Дабрыян («Брама неўміручасці» К.Крапівы), Язэп Карыта («Ажаніцца — не журыцца» паводле Далецкіх і М.Чарота), Кузьма Прыбыткаў («Плач перапёлкі» паводле І.Чыгрынава), Шаргаёў («Парог» А.Дударава). З роляў класічнага рэпертуару: Князь К... («Дзядзечкаў сон» паводле Ф.Дастаеўскага), Земляніка («Рэвізор» Гогаля), дон Пабла дэ Альварус («Каменны гаспадар» Л.Украінкі) і інш.

В.А.Ракіцкі.

П.П.Дубашынскі.

Г.І.Кірылаў.

П.П.Касцюкевіч.

КІРЫЛАЎ Герман Іларыёнавіч, нарадзіўся 15.12.1937 г. у г.п. Шаркаўшчы-

П.П.Касцюкевіч. Партызаны ў весцы.

на. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (1991). Закончыў Шаркаўшчынскую сярэднюю школу (1954), аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта. Працаваў у шаркаўшчынскай раённай газеце, 2-м, 1-м сакратаром Шаркаўшчынскага райкома камсамола, намеснікам рэдактара міёрскай раённай газеты «Сцяг працы». З 1.12.1965 г. назначаны намеснікам рэдактара полацкай газеты «Сцяг камунізму». З 1976 г. па 1995 г. працаваў уласным карэспандэнтам абласной газеты «Віцебскі рабочы» ў Полацку. З 1995 г. па 1999 г. карэспандэнт шматтыражнай газеты «Трудовая смена» Полацкага вытворчага аб'яднання «Шкловалакно».

Друкуецца з 1974 г. У 1975 г. у часопісе «Беларусь» пабачыла свет апавяданне «Татава пілотка», у тым жа годзе ў часопісе «Маладосць» — апавяданне «Адажыо», у 1981 г. (у скарачэнні) аповесць «Сонца тваіх вачэй». У 1983 г. у выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшла першая кніжка апавяданняў «Падлётак». Большасць з іх — пра вайну. І гэта зразумела: аўтар належыць да таго пакалення, дзяцінства якога было абпалена вайной. У 1989 г. у выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшаў раман «Пах жыта» (кніга 1-я). У часопісе «Полымя» за 2000 г. надрукавана аповесць «Піраміда». Г.І.Кірылаў жыве ў Полацку.

К.А.Кожан.

КАСЦЮКЕВІЧ Пётр Пятровіч, нарадзіўся 27.7.1926 г. у в. Шыці. Мастак, літаратар. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1939 г. закончыў Шаркаўшчынскую сямігодку. Вучыўся ў мастацкай студыі малюнка і жывапісу Карэльскага Дома народнай творчасці (Петразаводск), на аддзяленні выяўленчага мастацтва пры Усесаюзным Доме народнай творчасці імя Крупскай (Масква). Працаваў мастаком у Доме палітасветы ў Петразаводску. Аўтар карцін «Партызанскае юнацтва», «Партызанскі пост», «Партызаны ў вёсцы», «За пакетам у штаб брыгады», «Разгром гарнізона ў Відзах», партрэтаў М.Танка і М.Машары. Друкаваў вершы ў Карэліі ў рэспубліканскіх газетах і калектыўных зборніках.

Звязаны лёсам з Шаркаўшчынай

ВОРАНАЎ Мікола (Мікалай Гаўрылавіч), беларускі пісьменнік. Нарадзіўся 13.12.1936 г. у в. Віры Гарадоцкага раёна. Працаваў у раённым друку, у тым ліку доўгі час у шаркаўшчынскай раённай газеце «Кліч Радзімы». Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцей «Ветраны дзень» (1976), «Перад адлігай» (1984), аповесцей «Завея» (1979), «Вадалазы» (1981), рамана «Маланка паліць жыта» (1990).

М.І.Ермаловіч.

Р.С.Кудрын.

М.А.Машара.

ЕРМАЛОВІЧ Мікола (Мікалай Іванавіч), беларускі гісторык, літаратуразнавец. Нарадзіўся 29.4.1921 г. у в. Малыя Навасёлкі Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (1992). Закончыў Мінскі педагагічны інстытут (1947). Настаўнічаў у 1940—1941 гг. Працаваў загадчыкам педкабінета Шаркаўшчынскага раённага аддзела адукацыі. Выкладаў беларускую літаратуру ў Маладзечанскім настаўніцкім інстытуце (1948—1954), працаваў у Маладзечанскім абласным інстытуце ўдасканалення настаўнікаў (1955—1957). Аўтар кніг «Дарагое беларусам імя» (1970), «Па слядах аднаго міфа» (1989, 1991), «Старажытная Беларусь. Полацкі і Навагрудскі перыяды» (1990), «Старажытная Беларусь. Віленскі перыяд» (1994), «Беларуская дзяржава. Вялікае княства Літоўскае» (2000). Памёр у 2000 г.

КУДРЫН Раман Сцяпанавіч, нарадзіўся 24.7.1916 г. у Зарэчча Клінцоўскага раёна Бранскай вобласці. Закончыў няпоўную сярэднюю школу ў 1930 г., потым школу ФЗН у г. Клінцы. Працаваў слесарам, рахункаводам у калгасе. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з ліпеня 1941 г. Камандзір батальёна 82-га стралковага палка 33-й стралковай дывізіі 1-га Беларускага фронту. Капітан Кудрын 7.3.1945 г. умела арганізаваў баявыя дзеянні пры авалоданні г. Голнаў у Польшчы. Батальён вызначыўся ў баі за адзін з населеных пунктаў у Германіі. Камандзір быў цяжка паранены, але застаўся кіраваць боем. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 31.5.1945 г. З 1946 г. у запасе. З 1948 г. на партыйнай і савецкай рабоце. Жыве ў г.п. Шаркаўшчына. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кутузава III ступені, Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

ЛІС Арсень Сяргеевіч, вядомы беларускі літаратуразнавец і фальклярыст. Нарадзіўся ў в. Вётхава Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. Доктар філалагічных навук (1997). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі 1986 г. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1956). Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Шаркаўшчынскай сярэдняй школе (1956—1957), працаваў рэдактарам выдавецтва. З 1962 г. у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай АН Беларусі. Аўтар кніг «Браніслаў Тарашкевіч» (1966), «Мікола Шчакаціхін» (1968), «Купальскія песні» (1974), «Вечны вандроўнік» (1984), «Валачобные песні» (1989), «Паэзія беларускага земляробчага календара» (1992) і інш.

МАШАРА Міхась (Міхаіл Антонавіч), беларускі паэт. Нарадзіўся 18.11.1902 г. на хут. Падсосна Пастаўскага раёна. Удзельнік савецка-польскай вайны 1920 г., нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі працаваў загадчыкам Шаркаўшчынскага райана (1939—1941). Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны». Аўтар зборнікаў вершаў «Малюнкі» (1928), «Напрадвесні» (1935), «З-пад стрэх саламяных» (1937), «Беларусі» (1944), «Выбраная лірыка», «Мая азёрная краіна» (1962) і інш., раманаў «Крэсы змагаюцца» (1966), «Сонца за кратамі» (1968), «Лукішкі» (1970), кнігі ўспамінаў «Старонкі летапісу» (1975). Памёр 7.6.1976 г.

З ВЕРШАЎ МІХАСЯ МАШАРЫ

* * *

Падае, падае лісце,
жоўтае лісце бяроз.
Еду... дарога імгліцца.
Слухаю песню калёс.

Межы і вузкія гоні, —
радасць і сум мужыка, —
зжатыя... Пуста і гола.
Сэрца сціскае туга.

Каля самотнага гаю
паша і статак кароў.
Хлопец прысеў, вывучае
спеў тэлеграфных слупоў.

Мо перакажа калісьці
гэты чароўны напеў...
Жоўта-чырвонае лісце
падае, падае з дрэў.

1932

НА РАЛЛІ

У кашулі белай палатнянай
з сяўнёй я выйшаў на раллю
і над ажыўшымі палямі
аўсяным золатам званю.

Як цень, брыдзе за мною следам
сялянскі конь у баране
і з цёплым ласкавым прыветам
ледзь-ледзь махае грывай мне.

А сонца лезе без патрэбы
у вочы, твар і валасы;
і поле пахне свежым хлебам
і хмелем першае расы.

1936

ПРАЎДЗІН Віктар Аляксандравіч, беларускі пісьменнік. Нарадзіўся 11.5.1955 г. у г. Ліда. У 1957 г. разам з бацькамі пераехаў у в. Лужкі Шаркаўшчынскага раёна. Дзяцінства прайшло ў в. Дзіўная. З 1969 г. жыў у г.п. Шаркаўшчына. У 1972 г. закончыў Шаркаўшчынскую сярэднюю школу і працаваў рабочым піларамы ў Шаркаўшчынскай міжраённай будаўнічай арганізацыі. Закончыў Мінскую вышэйшую школу МУС (1981). Працаваў у праваахоўных органах Беларусі (1976—1994), намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Нёман» (1996—2000), намеснікам старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў (2001—2002), намеснікам галоўнага рэдактара часопіса

В.А.Праўдзін.

«Полымя» (2002—2003). З 2004 г. галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Аўтар кніг «Візіцёр з Поўначы» (1991), «Боль, альбо Споведзь міліцыянера» (1996), «Эксгумацыя» (1997), «Шлях да Галгофы» (2003) і інш., раманаў «Вяртанне з апраметнай» (1999), «Танцавальны марафон» (2001), «Нелюбімыя гінуць» (2003).

ЗГАДВАЮЧЫ МАЛЕНСТВА

З эсэ Віктара Праўдзіна

* * *

Я чую, як маці шморгае нагамі, тупае каля кватэры, абтрасаючы з гумовікаў смецце і вулічную гразь, потым павольна і незадаволена рыпяць дзверы, і яна стомлена ўздыхае, калі пераступае праз высакаваты парог, счасаны пасярэдзіне абцасамі, і цяжка дзвюма рукамі ставіць вядро з вадой на нізкі ўчарнелы ад часу зэдлік, што туліцца каля печы. Праз край вядра на падлогу праліліся празрыста-бліскучыя вясёлыя лужынкі, і ў іх з вакна адразу нырнуў, быццам зваліўся з неба, весні ярказалаты агеньчык-промень. І адразу пасвятлела ў пакоі, я нават вочы прыжмурыў, назіраючы за патрывожанымі скразняком серабрыстымі іскрыстымі пылінкамі, што мітусліва віхурыліся ў паветры. Яны здаюцца жывымі і адчайна вясёлымі, сёння яны з самай раніцы гаспадараць у двух пакоях нашай кватэры на другім паверсе старога графскага дома. Шырэй адхінуў фіранку, і промень імкліва нырнуў за стол, высвеціў белую, як малако, павуціну. Ведаю, што павуцінне мяккае, а калі дакрануцца пальцамі — ліпучае, а яшчэ ў ім жыве чорны павучок. Ён сонца не любіць, імкліва ад

яго хаваецца, але яшчэ больш павук чамусьці не любіць, калі я кідаю на павуцінне крошкі хлебнага мякішу, і тады ніколі са свайго сховішча не паказваецца. Затое ён заўсёды жвава выкульваецца з расшчэліны ў сцяне, калі ў трапяткое плеціва трапляецца муха. Канешне, за сталом, каля ягонага жытла мухі не лётаюць, іх для павучка лаўлю я, і толькі тады, калі ў кватэры нікога няма, бо руплівая маці ні павукоў, ні павуціння не любіць і, калі прыбірае, заўсёды шморгае венікам не толькі па падлозе, але і па кутках і нават па высокай столі. А мне павучка шкада, калі выбіраць, дык лепш ён, чым надакучлівыя мухі, якія і ў кубак з малаком спікіруюць, і ў талерку з супам запаўзуць, і што горш за ўсё — раніцай, на самым досвітку, разбудзяць. Адно кепска: мой павучок нейкі малы, ніяк не дачакаюся, калі ён вырасце і пераловіць усіх прыліпал мух. Мо паспрабаваць прыкарміць кавалачкамі катлет, як Мішкавага Дымка? Яшчэ ўзімку быў шчанюк, па лесвіцы на другі паверх ускарабкацца не мог, а цяпер не дагнаць.

Да лужынкі на падлозе, спадмануты зыркім святлом, з печы скокнуў маленькі шэры кот. Яго так і клічуць: Шэры. Ён ўсю раніцу гуляў з тоўстай калматай шпагацінай, прывязанай да квадратнага цвіка з бліскучай шляпкай. На шпагаціне месцамі засталася ўсохлая залацістая луска леташняй цыбулі, і кот усю раніцу цікуе за ёй. Я таксама некалі, ухапіўшыся рукамі і падціснуўшы ногі, калыхаўся на гэтай шпагаціне, але тое было даўно, калі вокны ў хаце былі прыгожа размаляваныя Дзедам Марозам. Пра Дзеда мне расказаў бацька, толькі маці не дазваляла доўга сядзець каля вакна і разглядваць тыя дзіўныя малюнкі, яна ўвесь час баіцца нейкай прастуды. Ды й не хочацца мне на печ, і шпагаціна абрыдзела, цяпер самае цікавае — за вакном на двары...

— Віця, сынок, нашых там не відаць? — пытаецца маці і, падсунуўшы табурэтку да печы, садзіцца і пачынае пальцамі выкалупваць гліну паміж цаглінамі.

— Не-а, — адказваю я і прыліпаю лбом і носам да халоднага шкла.

Нашы — гэта бацька і старэйшы брат, і ў мяне адказнае заданне: дачакацца, калі яны прыедуць на абед і сказаць маці, каб выцягвала чыгункі з печы. Мне зусім не хочацца выконваць гэтае заданне, лепш бы, як заўсёды, лічыць варон, чым зноў убачыць, як бацька падхопіць на рукі і здыме з трактара брата, які абавязкова ўгледзіць мяне ў вакне і пакажа язык ці, яшчэ горш, з-за бацькавай спіны торкне дулю. Да слёз крыўдна чуць кожны дзень, што ты яшчэ малы і трэба падрасці, каб ездзіць з бацькам на трактары. А я вырас і ўжо, стоячы на печы, галавой да столі дастаю...

А на дварэ якраз пад вокнамі цвіце бэз і нават на другім паверсе чуваць ягоны прыемны пах. Учора суседка Танька зламала пахучую гронку, шукала ў ёй спарышы і высмоктвала. Казала, калі трапіцца пяць пялёсткаў і іх высмактаць, будзеш шчаслівы. Я знайшоў разоў дзесяць па пяць, старанна высмактаў, нейкія нават пражаваў, але шчаслівым не стаў, сёння бацька зноў узяў з сабой брата, а не мяне.

Абыходзячы велікаватую лужыну, да свайго хлева пратэпаў сусед з першага паверха дзядзька Міша і праз некалькі хвілін выйшаў з зацiснутым пад пахай вялікім белым гусаком. Гусак вырываецца і, цікуючы за вольнай дзядзькавай рукой, каб ушчыпнуць, круціць доўгай шыяй. Гэта яму ўдаецца, але толькі адзін раз. Мне дзядзьку шкада, бо ведаю, які брыдкі і злы гэты гусак, нікога не прапусціць, на кожнага шыпіць. Сусед злаўчыўся, ухапіў гусакову галаву і зацiснуў у далоні чырвоную дзюбу. Вось бы дзядзька Міша гэтак сама зацiснуў яшчэ і дзюбу ў пеўня цёткі Моры, які ўжо два разы мяне даганяў, валіў на зямлю і балюча дзюбаў у галаву. Бацька прасіў Мору прадаць пеўня ці памяняць, але не пагадзілася цётка, сказала, што яе певень добра курэй топча. Дзіўная гэтая цётка, курэй не шкадуе. Ды што казаць, каб яе самую певень патаптаў, ды хоць бы адзін раз дзюбнуў у галаву — адразу б з яго суп зварыла.

Гусак пад пахай у дзядзькі Мішы не здаецца, лупіць крыламі, тузаецца, шкрабе паветра лапамі, вырываецца ды так моцна, што з дзядзькавай галавы нават фуражка зляцела. Гэтая валтузня суседу надакучыла і, відавочна, разлавала, бо ў наступнае імгненне ён пастапіў гусака на зямлю каля плоту, а сам усеўся на яго верхам, зацiснуўшы крылы паміж ног. Цяпер абедзве рукі ў дзядзькі Мішы вольныя, і ён пачынае накручваць гускову шыю вакол штакеціны. Раз, другі, трэці і шыя закончылася. Мне зверху відаць, як сусед тузае да сябе гусакову галаву і адначасова ўціскае птушку

ў зямлю. З-пад калена выбілася белая крыло і часта-часта стукае па зямлі, ажно старое лісце і пясок разлятаюцца ва ўсе бакі, нават мне відаць, што гусак ужо просіцца ў дзядзькі і хоча, каб яго адпусцілі. А расчырванелы ад напругі дзядзька Міша і не бачыць, і не чуе, што птушцы баліць, ён насядае на гусака зверху і з нейкім, як мне здаецца, шаленствам цягне, тузае ягоную галаву і дзюбу, ажно ўвесь плот ходарам ходзіць. Цяпер мне шкада гусака, і ад гэтай шкадобы па шчоках цякуць слёзы...

Матэрыялы рубрыкі «Звязаны лёсам» падрыхтаваў М.З.Башлакоў.

М.І.Андылеўка.

Загінуў у Афганістане

АНДЫЛЕЎКА Мікалай Іосіфавіч, нарадзіўся 22.5.1944 г. у в. Путраніца. Бацькі працавалі ў калгасе. У 1961 г. закончыў Лужкоўскую сярэднюю школу, ваеннае танкавае вучылішча ў 1965 г. Пасля 10 гадоў службы паступіў у Ваенную акадэмію імя М.В.Фрунзе, якую закончыў у 1978 г. Пасля вучобы быў накіраваны ў Казахстан, потым ваенным саветнікам у Афганістан.

Падпалкоўнік М.І.Андылеўка загінуў 13.10.1980 г. Пахаваны на радзіме, у в. Путраніца. За мужнасць і гераізм узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі.

Л.М.Лабачэўская.

З пісем М.І.Андылеўкі родным

25 ліпеня 1980 г.

Здравствуйте, мои родные!

Извините, что письмо было так быстро и незакончено написано... Письма от нас доставляют раз в неделю. Я пришел с задания, а машина уже уходила, и поэтому несуразно получилось. Еще раз, мои родные, большое спасибо за письма. Ведь от них здесь большая радость. Только через письма можно поговорить, увидеть вас, поделиться мыслями. Вот друг у меня, Володя, с которым мы вместе приехали, получил только от жены семнадцать писем, а я? Зоинька, пиши почаще. Ведь в Союзе, когда я уезжал в командировку, может быть, это было и не так значительно, а здесь, среди чужих людей, с горсточкой наших, я ощутил на своей шкуре совсем другое. Зоя, Леночка, Светочка, если приехала, и мама! Вы, может, и не поверите, но здесь становишься другим человеком. Даже то, что седины появилось больше, что пища сказывается на желудке, что не знаешь, что будет завтра, да и сейчас, сию минуту. Все это говорит о многом. Да! Отсюда можно приехать и иметь больше, чем мы с тобой нажили за нашу совместную жизнь, но не хотел бы я этого, а скорее бы увидеть вас, родных моих, и быть только вместе, не ссориться, учить детей, работать, при возможности отдыхать...

* * *

Мама, здравствуй!

Сообщаю, что у меня все покуда нормально. Ты спрашиваешь, я с семьей или один. Я здесь один. Сроком на два года. В отпуск приеду, если будет все хорошо, на будущий год где-то в это время. Конечно, очень скучно да и небезопасно. Я здесь работаю советником. Пиши, что нового, как со здоровьем. Ну, а так, в общем, писать нечего. О себе буду сообщать вот такими короткими письмами, не обижайся...

З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ

Помнікі палацава-паркавага будаўніцтва

Сядзібны дом у г.п. Шаркаўшчына. У парку на беразе р. Дзісна. Пабудаваны ў пачатку XX ст. Сядзібны дом — прамавугольны ў плане аднапавярховы аб'ём пад пакатым вальмавым дахам. На галоўным фасадзе асіметрычна размешчаны чатырохкалонны порцік з трохвугольным франтонам, на дваровым — выступае пяцігранны эркер. Пластыку фасадаў узбагачаюць нішы, ліштвы прамавугольных аконных праёмаў, прафіляваны антаблемент. У інтэр'еры часткова захаваліся ляпныя разеткі і карнізы.

Сядзібны дом — помнік архітэктуры неакласіцызму.

А.М.Кулагін.

Сядзіба ў в. Дзіўная. Сфарміравалася на працягу XVIII—XIX ст. Уключае палац, парк, жылыя і гаспадарчыя пабудовы, капліцу. Кампазіцыйным цэнтрам сядзібы з'яўляецца палац. Пабудаваны ў канцы XVIII ст. з цэглы ў стылі класіцызму. У пачатку XX ст. часткова перабудаваны, зменены аздабленне фасадаў і ўнутраная планіроўка, але захавана агульная кампазіцыя. Выцягнуты аднапавярховы будынак мае двухпавярховую цэнтральную частку, вылучаную чатырохкалонным порцікам. Фасады аздоблены прафіляванымі ліштвамі аконных праёмаў, на 2-м паверсе — дадаткова пілястрамі і сандрыкамі. У цэнтральнай частцы 1-га паверха размяшчалі-

Сядзібны дом у г.п.Шаркаўшчына.

ся вестыбюлі і парадная зала з выхадам на тэрасу, на 2-м — жылыя пакоі. Бакавыя часткі мелі калідорную планіроўку.

Тры крутыя выгіны ракі Мнюта ўдала выкарыстаны для стварэння пейзажнай кампазіцыі парку і штучных сажалак. За ракой па восі палаца — паляна з маляўнічымі групамі бяроз. Парк абсаджаны дрэвамі лісцевых парод з паасобнымі елкамі. У дэндралагічным складзе трапляюцца елка калючая блакітная, вярба белая ніцая, лістоўніца еўрапейская і дэкаратыўныя кусты — спірэя, шыпшына, бэз і інш.

Гаспадарчыя будынкі зроблены ў 2-й палове XIX ст. з бутавага каменю, аздоблены цагляными лапаткамі, ліштвамі. Арнаментальныя ўстаўкі з бутавага каменю ўпрыгожваюць уязную браму.

Сядзіба — помнік палацава-паркавага будаўніцтва, адметны арганічнай сувяззю архітэктуры і ландшафту.

У. В. Алісейчык.

Сядзіба ў в. Германавічы. На паўночна-заходняй ускраіне вёскі, на беразе р. Дзісна. Пабудавана ў канцы XVIII ст. Мае рэгулярную планіроўку, уключае мураваны дом, парк і гаспадарчыя пабудовы. Цяпер тут размешчана школа.

Сядзібны дом — прамавугольны ў плане двухпавярховы будынак. Другі паверх галоўнага фасада вылучаны трохчвэртнай каланадай тасканскага ордэра, 1-ы — рустоўкай. Фасады фланкіраваны рызалітамі з трохвугольнымі франтонамі. У адным з рызалітаў — уваход у будынак, які афармлены двухкалонным прыстаўным порцікам. Такі ж порцік упрыгожвае процілеглы рызаліт. Вось сіметрыі галоўнага фасада адзначана прамавугольным атыкам. Цэнтр дваровага фасада вылучаны рызалітам.

Планіроўка будынка анфіладная. Паверхі злучаны тарцовымі трохмаршавымі лесвіцамі. Першапачатковае ўпрыгожанне інтэр'ера не захавалася.

У парку прамавугольныя ўчасткі сада, партэр, сажалкі. Групы дрэў і крывалінейныя алеі складаюць пейзажную зону. Гаспадарчыя пабудовы размешчаны на паўночны ўсход ад дома, мураваныя, дэкарыраваны ўтрыраванымі элементамі архітэктуры класіцызму.

Сядзіба — помнік архітэктуры класіцызму.

А. М. Кулагін.

Вадзяны млын у в. Лужкі. Каля плаціны па правым беразе р. Мнюта. Пабудаваны ў XIX — пачатку XX ст. Прамавугольны ў плане трохпавярховы будынак пад высокім двухсхільным дахам. Цокальны паверх з бутавага каменю. Прафіляваны карніз аддзяляе 2 верхнія паверхі, надбудаваныя ў 1912 г. з цэглы. Унутры на кожным паверсе вылучаны 3 памяшканні: вялікае цэнтральнае і 2 вузкія тарцовыя. Унізе заходняй часткі будынка (у камеры) устаноўлены 2 турбіны. У цэнтральным памяшканні цокальнага паверха змацаваны механізмы перадачы і рэгулявання руху турбін. На 2-м паверсе ўстаноўлены жорны і прыстасанні для сарціроўкі мукі. Адсюль па транспарцёры мука падаецца на 3-і паверх.

Млын — помнік прамысловай архітэктуры.

Друкуецца па кн.: Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Віцебская вобласць. Мн., 1985. С. 455, 456, 458, 459, 461.

Культавае дойлідства

ПРАВАСЛАЎНЫЯ ХРАМЫ

Свята-Успенская царква ў в. Германавічы. У цэнтры вёскі, на правым беразе р. Дзісна. Пабудавана ў 1900 г. з дрэва як стараверская.

Помнік народнага дойлідства. Прамавугольны ў плане зруб пад 2-схільным дахам. Над галоўным фасадам, вылучаным ганкам, узвышаецца вежа-званіца (васьмярык на чацверыку), якую завяршае фігурная галоўка. Алтарная частка ўвянчана цыбулепадобным купалам на гранёным барабане. Абразы XIX ст.: «Успенне Багародзіцы», «Маці Божая Адзігітрыя», «Жыціе Ільі Прарока», «Маці Божая Адзігітрыя Ціхвінская», «13 Святаў», «Раство Прасвятой Багародзіцы», «Маці Божая Адзігітрыя», «Тройца новазапаветная», «Святы Мікола».

Свята-Успенская царква ў в. Варонка. На могілках. Пабудавана ў 1914 г. з дрэва як стараверская.

Твор народнага дойлідства. Вырашана прамавугольным зрубам пад 2-схільным

дахам з шатровай вежай над галоўным фасадам. Над алтарнай часткай устаноўлена невялікая 8-гранная вежа з цыбулепадобнай галоўкай. Абразы XIX ст.: «Неапалімыя купіны Прасвятой Багародзіцы», «Іван Багаслоў», «Архангел Міхаіл».

Свята-Ільінская царква ў в. Ёды. У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1945 г. з дрэва на месцы ранейшага храма (упамінаецца ў 1880). Дзейнічае.

Помнік народнага дойлідства. Працяглы прамавугольны зруб пераходзіць у 3-сценную апсіду, над якой 2-схільны гонтавы дах пераходзіць у вальмавае пакрыцё. Галоўны плоскасны фасад завершаны 3-вугольным франтонам з фігурнай шалёўкай і слыхавым аконным праёмам па цэнтры. Гарызантальна ашаляваныя фасады расчлянёны прамавугольнымі аконнымі праёмамі з аканіцамі.

Унутры перагародкай вылучаны вузкі прытвор, апсіда — драўляным 1-ярусным іканастасам простай работы, царскія вароты якога маюць 4 авальныя клеймы з выявамі евангелістаў. Абразы: «Святы Сімяон Богапрыемец», «Святы Васіль і Аляксандр Неўскі», «Архангел Гаўрыіл» і «Архангел Міхаіл» (канец XVIII — пачатак XIX ст.).

Свята-Успенская царква ў в. Германавічы.

Свята-Раства-Багародзіцкая царква ў в. Лужкі. На вул. Дзісенскай. Пабудавана ў 1794 г. з цэглы на сродкі полацкага ваяводы Валерыяна Жабы. У 1831 г. і 1889 г. гарэла.

Помнік архітэктуры пераходнага перыяду ад барока да класіцызму. Прамавугольны ў плане аб'ём малітоўнай залы пераходзіць у 3-сценак апсіды, накрыты агульным вальмавым дахам, завершаным цыбулепадобным купалам на 8-гранным барабане. У 1934 г. прыбудаваны прытвор з 2-яруснай 4-граннай званіцай над ім, завершанай шатровым дахам з макаўкай на барабане. Сцены расчлянёны высокімі арачнымі аконнымі праёмамі з дугамі-броўкамі і крапаваны пілястрамі, апяразаны прафіляваным карнізам.

У залу над шырокім арачным праёмам адкрываюцца хоры. Абразы XVII—XVIII ст.: «Раство Хрыстова», «Раство Багародзіцы», «Ісус Хрыстос, які бласлаўляе дзяцей», «Маці Божая Адзігітрыя» (1794), «Святы Мікола» (сярэбраная залачоная рыза выканана ў 1794 лужкоўскім злотнікам Янам Жыгелем), фератрон «Святы Мікола» і «Маці Божая Адзігітрыя», іканастас. Пад царквой крыпта.

Свята-Успенская царква ў г. п. Шаркаўшчына. На паўднёвай ускраіне пасёлка, на беразе р. Дзісна. Пабудавана ў 1912 г. з дрэва (праект 1907 губернскага епархіяльнага архітэктара Шпакоўскага). Паводле загаду Імператарскай археалагічнай камісіі папярэдні драўляны храм 1639 г. быў захаваны і перанесены на новае месца.

Помнік архітэктуры стылю мадэрн. Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя 4-часткавая: прытвор са званіцай, бабінец, малітоўная зала, 5-гранная апсіда з бакавымі рызніцамі. Асноўны аб'ём завершаны 8-гранным светлавым барабанам, накрытым шатром з галоўкай. Чатыры грані барабана завершаны невялікімі шатрамі на трапецападобных франтонах з дыяганальнымі сцяжкамі. Званіца выступае на франтальным фасадзе неглыбокім рызалітам, мае вертыкальна выцягнутыя прапорцыі і завершана макаўкай. Прамавугольны праём

галоўнага ўвахода завершаны 2-схільнай навіссю на фігурных брусчатых кранштэйнах. У афармленні фасадаў выкарыстана разнастайная шалёўка: вертыкальная ва фрызавай і цокальнай частках, гарызантальная — на цэнтральнай плоскасці. Высокія праёмы аформлены фігурнымі рознымі ліштвамі.

Абразы XVIII—XIX ст.: «Маці Божая Адзігітрыя», «Маці Божая Усіх Смуткуючых», «Збавіцель», «Уседзяржыцель на троне», «Апостал Павел», «Апостал Пётр», «Святы Мікола», «Узнясенне Гасподне», «Маці Божая з дзіцем», «Уваскрэсенне Хрыстова», «Праабражэнне», «Пакроў Прасвятой Багародзіцы», «Успенне Багародзіцы», «Віленскія пакутнікі», «Раство Хрыстова», «Сашэсце Святога Духа на апосталаў».

Царква Усіх Смуткуючых Радасць у г.п. Шаркаўшчына. У цэнтры пасёлка. Пабудавана ў 1897 г. з цэглы на месцы драўлянага храма 1841 г. У Вялікую Айчынную вайну паўзруйнавана. У 1970-я гг. у ёй быў размешчаны Дом культуры. Першапачатковы выгляд храма вядомы па фотаздымку Я.Балзункевіча 1910—1914 гг. Дзейнічае.

Помнік архітэктуры рэтраспектыўнарускага стылю, 4-часткавую аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю фарміруюць 2-ярусная (васьмярык на чацверыку) шатровая званіца з макаўкай, кароткая трапезная, кубападобны аб'ём малітоўнай залы, паўкруглая апсіда. 4-схільны дах асноўнага аб'ёму завершаны цыбулепадобным купалком на 8-гранным барабане. У архітэктурнадэкаратыўным афармленні помніка выкарыстаны матывы старажытнарускага дойлідства: кілепадобныя броўкі над арачнымі аконнымі праёмамі, аркатура, руставаныя вуглавыя лапаткі. Уваход вылучаны арачным парталам.

Свята-Ільінская царква ў в. Шкунцікі. На паўднёвай ускраіне вёскі. Пабудавана ў 1825 г. з цэглы як касцёл. Пераасвячоны ў праваслаўную царкву пасля 1863 г.

Помнік архітэктуры класіцызму, які ў 2-й палове XIX ст. набыў рысы рэтраспектыўна-рускага стылю. Вырашана прамавугольным у плане аб'ёмам пад 2-схільным дахам. Па баках да апсіды далучаны нізкія рызніцы пад 1-схільнымі пакрыццямі. Трохі пашыраны прытвор завершаны 2-яруснай васьмерыковай шатровай званіцай з макаўкай і 2 бакавымі цыбулепадобнымі галоўкамі на высокіх 8-гранных барабанах. Фасады крапаваны пілястрамі, алтарная сцяна ўмацавана бакавымі магутнымі контрфорсамі.

Малітоўная зала перакрыта драўляным латковым скляпеннем. Над прытворам на 2 пілонах размешчаны хоры. Іканастас, абразы XIX ст.: «Зняцце з крыжа», «Уваскрэсенне Хрыстова», «Святы Мікола», «13 святаў», «Уседзяржыцель на троне», «Хрыстос з гладышом».

Друкуецца па кн.: К у л а г і н А.М. Праваслаўныя храмы на Беларусі. Мн., 2001. С 34, 58, 80, 116, 208—210.

Падрыхтаваў Б.В.Ульянка.

Капліца ў в. Дзіўная. Пабудавана ў канцы XVIII ст. з цэглы (ніжні цокальны ярус з валуноў і драблёнага чорнага граніту). Уяўляе сабой квадратнае ў плане трох'яруснае збудаванне (вышыня 10 м). Два ніжнія ярусы — глухія, грані верхняга прарэзаны паўцыркульнымі арачнымі праёмамі, вуглы франкіраваны паўкалонамі. Завершана развітым карнізам і чатырохсхільным дахам. Прыклад архітэктуры малых форм.

Друкуецца па кн.: Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Віцебская вобласць. Мн., 1985. С. 459.

КАТАЛІЦКІЯ ХРАМЫ

Касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў в. Германавічы. У цэнтры вёскі. Пабудаваны ў 1787 г. з цэглы па фундацыі ўладальніка маёнтка Ігнація Зрыні-Шырына. Размешчаны насупраць сядзібна-паркавага ансамбля на беразе р. Дзісна. У 1940-я гг. закрыты. Вернуты вернікам у 1988 г.

Помнік архітэктуры «віленскага барока». Храм падоўжанай сіметрычна-восевай ярусна нарастаючай кампазіцыі, якую фарміруюць прамавугольны ў плане неф і акруглая апсіда з нізкімі бакавымі сакрысціямі. Франтальны фасад вырашаны пластычнай архітэктурнай кулісай вертыкальна накіраванай кампазіцыі. Ажурнасць і скульптурнасць 5-ярусных чацверыковых вежаў дасягаецца выкарыстаннем скразных лучковых і арачных праёмаў, круглых люкарнаў, вуглавых лапатак, увагнутымі гранямі верхніх ярусаў. Паміж вежамі размешчаны высокі фігурны шчыт з пілястравым порцікам. Пластычна насычаны галоўны фасад кантрастна спалучаецца з

плоскаснымі сценамі асноўнага аб'ёму храма. У архітэктурным дэкоры выкарыстаны лучковыя сандрыкі, рустыка, фігурныя філёнгі, тонкапрафіляваныя карнізы. Уваход аформлены порцікам.

Унутры неф храма перакрыты цыліндрычным скляпеннем на падпружных арках з люнетамі высока ўзнятых лучковых аконных праёмаў, пераходзіць у прастору 5-граннай алтарнай часткі. Па перыметры залы праходзіць прафіляваны антаблемент, дэкарыраваны ляпнымі выявамі галовак пуцці, раслінным арнаментам. Сцены расчлянёны канеліраванымі пілястрамі. Над вузкім нартэксам на 2 слупах, аркадзе і крыжовых скляпеннях узнесены выгнутыя дугой хоры, дэкарыраваныя канеліраванымі пілястрамі, паміж якімі ракайльнае пано з ляпнымі выявамі музычных інструментаў. Убранне інтэр'ера дапаўняе арнаментальна-раслінная размалёўка верхняй часткі сцен і падпружных арак.

Касцёл Святога Міхаіла Архангела ў в. Лужкі. У паўднёва-ўсходняй частцы

Касцёл Святога Міхаіла Архангела ў в. Лужкі.

вёскі. Пабудаваны ў 1744—1756 гг. з цэглы пры кляштары піяраў. Кляштар існаваў у 1741—1832 гг. Заснаваны ўладальнікам Лужкоў полацкім кашталянам Валерыянам Жабам, які ахвяраваў ім фальварак Віснік, пляц пад кляштар і калегіум (у яго гонар называўся Валерыянаўскім), парк і школу (дзейнічала з 1744 г., пазней вучылішча). Жонка Жабы ахвяравала на калегіум 1000 злотых. У 1832 г. кляштар валодаў 13 вёскамі і 330 сялянамі.

У 1843 г. касцёл перабудаваны пад праваслаўную царкву і абкружаны бутавай агароджай. Пасля Вялікай Айчыннай вайны закрыты. У 1988 г. вернуты вернікам, адноўлены і дзейнічае.

Помнік архітэктуры позняга барока, вызначаецца дынамічнасцю вытанчанай вертыкальна накіраванай кампазіцыі, багаццем аб'ёмнай і дэкаратыўнай пластыкі. 2-вежавы 1-нефавы храм з выцягнутай акруглай апсідай, да якой па баках сіметрычна далучаны нізкія сакрысціі. Тарцы 2-схільнага даху аформлены фігурнымі шчытамі. 4-ярусныя чацверыковыя вежы павернуты вуглом да цэнтральнай увагнутай плоскасці галоўнага фасада, які прафіляванымі цягамі падзелены на 3 ярусы, інтэнсіўна крапаваныя пілястрамі. Пабеленыя вуглавыя і прасценачныя пілястры акаймоўваюць архітэктурныя масы і надаюць будынку графічную выразнасць. Разнастайныя праёмы з лучковымі, паўцыркульнымі і фігурнымі арачнымі завяршэннямі аформлены тонкапрафіляванымі ліштвамі, хвалістымі броўкамі. Дэкаратыўнае вырашэнне ўзбагачаецца 2-колернай тынкоўкай сцен і ордэрнай пластыкай.

У інтэр'еры неф і апсіда перакрыты цыліндрычнымі скляпеннямі з распалубкамі. Сцены раскрапаваны паўкалонамі на высокіх пастаментах і з капітэлямі з лісця аканта, валют і галовак пуцці. Адхілы высокіх арачных аконных праёмаў, прасценкі, скляпенні ўпрыгожаны арнаментальнай размалёўкай. Пластыка-дэкаратыўныя акцэнты інтэр'ера — 3 ракайльныя 2-ярусныя стукавыя алтары, упрыгожаныя драўлянай скульптурай. Над уваходам — хоры, абмежаваныя хвалістым парапетам.

Друкуецца па кн.: К у л а г і н А.М. Каталіцкія храмы на Беларусі. Мн., 2000. С. 88—89.

Нам засталася спадчына

Вялікай і разнастайнай фальклорнай спадчынай багаты Шаркаўшчынскі край. Выклікаюць павагу і ўдзячнасць складальнікі і захавальнікі, выканаўцы і распаўсюджвальнікі народных песень. Сярод іх мае родныя бабуля, Мышко Алена Кліменцьеўна (1892—1974) з вёскі Корніца, і маці, Януш Таццяна Сямёнаўна (1910—1976), з вёскі Галінова, ад якіх у свой час запісаў гэтыя і іншыя песні, казкі, прымаўкі, частушкі.

Проста і бясхітрасна апавядаюць яны пра паўсядзённае жыццё селяніна, святы, абрады. Народная паэзія Шаркаўшчынскага краю характарызуецца вялікай разнастайнасцю песень земляробчага календара, якія непасрэдна звязаны з працай чалавека:

Ніўка, ніўка!
А я цябе жала, жала, не ляжала,
Снапочкі вязала, у бабкі стаўляла.
А я цябе палола, палола
І ручкі накалола.

Або:

Рада, рада шэра перапёлка,
Што лета даждала.
Рада, рада наша гаспадынька,
Што жыта дажала.

Багаццем зместу і адметнасцю форм вызначаюцца многія сямейна-абрадавыя песні, песні аб каханні, якія раскрываюць багаты духоўны свет, высокія пачуцці, глыбокія перажыванні маладых:

Да адна ягадка ў садочку расцець,
А другая адна на прымежачку,
Адна з другой скаціліся,
Іван з Мар'яй злюбіліся.

Другая песня пачынаецца:

За ракою, над вадою,
Адзінокі куст стаіць,
Яго ветры не шатаюць,
На ім лісце не шуміць.
Хто любовікі не знае,
Таго сэрца не баліць.

Найбольш шматлікімі з'яўляюцца вясельныя песні. Аб глыбокім роздуме маладой дзяўчыны перад адказным выбарам апавядае гэтая песня:

Парадзь, матулька,
Што мне рабіці:
Ці замуж ісці,
Ці дзеўкай быці?
Замуж зайшоўшы — вялікае гора,
А дзеўкай быці — людская мова.

Аб няпростай долі маладой у чужой сям'і расказваецца ў наступных песнях, бо свякруха ніколі не заменіць маці:

У каморы Мар'я ўмывалася,
З свайго лічыка дзівавалася:
Лічыка, ты маё бяленькае,
Ці будзеш такое ў свякроўкі,
Як цяпер у матулькі?

Або:

Ды як жа мне свякровачку назваці?
Назваць яе матулечкай — жаль будзе,
Назваць яе свякровачкай — гнеў будзе.

У песнях ушаноўваецца ўсё добрае, адвечнае. На першае месца ставіцца не багацце, а розум:

...Другі брацік павучае малайца:
Як паедзеш, мой брацік, у новы двор,
Там пасадзяць трох паненак на выбор.
Не бяры тую, што ў золаце, фарсліва,
А бяры тую, што ў розуме шчасліва.

А ў гэтай песні падкрэсліваецца працавітасць жанчыны, сапраўднай майстрыхі:

Хваліўся сват сваёй жоначкай,
Што яго жоначка — рукадзельніца,
Выткала красёнцы трыма ўзорамі...

Нярэдка сустракаем у песнях трапныя эпітэты, нават гіпербалізацыю:

Умная, разумная Мар'я
Па павуціне сіняе мора перайшла...

Частка песень складзена пра сірот, іх цяжкі лёс і нядолю:

У мяне ў доме не топлена хатка, не родная матка,
Не пытае: ці баляць ручкі, ці баляць плечкі?
А пытае: ці многа саджала, ці многа нажала?

А вось песня аб маёмаснай няроўнасці:

...Па багатую сястру трох паслоў пасылалі,
А беднай, гаротнай праз суседа наказалі.

Цяжка стрымаць слёзы, не ўзрушыцца душой, калі чытаеш, як перажывалі і аплаквалі страчаных блізкіх людзей:

Пайшла яна (Мар'я) ў чыстае поле
На магілачку да матулечкі:
— Прашу цябе, мамка, на вяселле,
Да сябе на благаслаўленне.
— Ды не магу, маё дзіцятка, не магу:
Мне сасновыя дошкі сціснулі ножкі — не ўстану.
Сырая зямелька на грудзі злягла — не дыхну,
Сыры пясочак вочы засыпаў — не гляджу.

І тут гучыць зварот дачкі да ўсемагутных, чарадзейных сіл прыроды:

Узыйдзіце, буйны ветры, узыйдзіце,
Разнясіце жоўтыя пяскі па полю,
Пашчапайце сасновыя дошкі на крошкі,
Падыміце маю матульку на ножкі!

У песнях падкрэсліваецца даравітасць беларусаў, іх годнасць, прыгажосць. Пры гэтым адзначаецца, што галоўны ў сям'і — мужчына:

Ды чый гэта двор
(вастракол каля вокан, цясовыя вароты)?
Ды чый гэта сын па двару ходзіць, золата носіць.

І яшчэ:

Не калышыся, кляновы лісток, над вадой,
Там паедзіць млады Ванечка з грамадой.
Па лугу едзіць — луг зелянеіць ад яго,
Па садзе едзіць — сад расцвітаіць ад яго.

Выдзяляюцца сваёй дасціпнасцю, тонкім гумарам, павучальным зместам жартоўныя песні:

— Светачка-лялечка,
Дзе была, дзе ездзіла?
Што чула, што відзела?
— Таргавала братовачку:
Старгавала за 100 рублёў,
А купіла за тры грошы,
Бо мой брацітка — харошы.

Багатая фальклорная спадчына краю — не толькі гістарычная каштоўнасць, але і крыніца вобразаў, тэм, матываў для сучасных творцаў, неад'емная частка духоўнага жыцця людзей.

І.Ю.Януш.

Народныя калектывы Шаркаўшчыны

Хор «Спадчына» Шаркаўшчынскага раённага Дома культуры. Створаны ў 1986 г., калі была паказана гледачам на раённай сцэне невялічкая праграма з некалькі музычных твораў. Першае выступленне было даволі паспяховым, і гэта натхніла ўдзельнікаў, выклікала ў іх жаданне і далей спяваць. Любоў да песні аб'яднала ў хоры людзей самых розных прафесій і ўзростаў.

Ветэраны хору: салістка Клаўдзія Дзмітрыеўна Скрыпачова, якая працуе ў сферы райспажыўкааперацыі, работнік аддзела адукацыі Васіль Яўгенавіч Пастушкоў, дырэктар музычнай школы Іван Казіміравіч Курто, рабочая Людміла Леанідаўна Казлоўская. Сярод удзельнікаў хору ёсць навучэнцы, служачыя, рабочыя.

Калектыў налічвае 30 чалавек. У пачатку свайго існавання спяваў у акадэмічнай манеры, зараз — і ў народнай манеры.

Вялікая заслуга ў станаўленні калектыву належыць яго першаму мастацкаму кіраўніку Паўлу Бярнардавічу Сафончы-

Будынак Шаркаўшчынскага раённага Дома культуры.

ку (сёння яго ўжо няма ў жывых). Дзякуючы яго мастацкаму і арганізатарскаму таленту хор «Спадчына» дасягнуў таго ўзроўню, які дазволіў яму стаць народным калектывам. Званне народнага было прысвоена хору 28 снежня 1992 г.

Рэпертуар народнага хору «Спадчына» складаюць больш як 30 харавых твораў. Калектыў выконвае ў асноўным беларускія народныя песні ў сучаснай апрацоўцы А.Яцкевіча, У.Карызны, М.Сіраты, А.Абразевіча, Г.Цітовіча, рускія і беларускія вакальна-харавыя кампазіцыі.

У рэпертуары хору пастаянна з'яўляюцца новыя песні. Гэта — «А я бачыў, бачыў», «Ой, дзе я гуляла», «А ў полі дуб зялёны», «Ой, у бары-бары тры дарожанькі» і іншыя.

Акампаніятарская група ўключае 2 баяны, цымбалы, скрыпку, бас. Асобны рэпертуар мае жаночая і мужчынская групы хору.

«Спадчына» вядзе актыўную канцэртную дзейнасць. Хор добра ведаюць у раёне і вобласці. У 2002 г. калектыў прымаў удзел у Рэспубліканскім кірмашы «Дажынкі-2002» у Полацку, пастаянна ўдзельнічае ў раённых святах «Прыдзісенскія крыніцы», «Ой, рана на Івана», «Яблычны Спас» і іншых. Падрыхтавана вакальна-харавая кампазіцыя «Поле памяці».

Як правіла, хор рыхтуе для жыхароў горада і раёна да 10 канцэртаў у год, выступае з канцэртнымі праграмамі ў Глыбокім, Паставах, Браславе.

Мастацкім кіраўніком народнага хору «Спадчына» з'яўляецца Жанна Леанідаўна Русак.

Г.А.Русачонак.

Вакальны калектыў «Лужкоўскія песняры». Налічвае 12 чалавек. У 1981 г. вакальны мужчынскі калектыў створаны па ініцыятыве тагачаснага дырэктара Лужкоўскага сельскага Дома культуры Садоўскага.

У рэпертуар калектыву ўваходзяць беларускія, рускія, украінскія народныя песні ў сучаснай апрацоўцы.

Удзельнікі народнага калектыву прымаюць удзел у калядных і валачобных абрадах, народным свяце «Купалле», дзе гучаць купальскія песні.

Народны калектыў вядомы не толькі ў в. Лужкі. Яго выступленне бачылі і жыхары вёсак Верацеі, Гарадзец, Лапунова. Народны калектыў прымае ўдзел у раённых святах «Прыдзісенскія крыніцы», «Спас — усяму час» і многіх іншых.

У жніўні 2002 г. «Лужкоўскія песняры» пацвердзілі званне народнага калектыву. У рэпертуар гурта ўвайшлі песні: «Ой, у лузе», «Братка беларус», «За гарамі, за лясамі», «Ой, там на ганку», «Ты нясі, мой косю», «Як імчаў мяне гняды мой конь», «Ой, доля мая», «Ой, дзе ж ты была», «Купалінка», «Карамысел дугой гнецца», «Ехалі казакі», «Жыта ў полі».

С.М.Грыдзюшка.

Калектыў «Купалінка» пры Каўшэлеўскім сельскім Доме культуры. Аб'ядноўвае 20 чалавек. Удзельнікі народнага калектыву займаюцца канцэртнай дзейнасцю, а таксама распрацоўкай і пастаноўкай народных святаў і абрадаў. У рэпертуары «Купалінкі» ёсць пэўны запас калядных і шчадроўных песень, якія калектыў вы-

На сцэне вакальны калектыў «Лужкоўскія песняры».

Народны фальклорны калектыў «Купалінка».

карыстоўвае пры правядзенні абрадаў калядавання і шчадровак, валачобнага абраду. Многа песень у «Купалінкі» на жніўную тэму. Песенны матэрыял сабраны ад мясцовых жыхароў і цалкам належыць або адпавядае нашай мясцовасці. «Купалінка» выкарыстоўвае фальклорную спадчыну для правядзення абрадаў «Дажынкі» і «Зажынкі». Ёсць у рэпертуары мясцовыя прыпеўкі.

Удзельнікамі «Купалінкі» нямала зроблена для вывучэння старажытных карагодаў і крутух. Вывучаны такія крутухі, як «Заінька шэры», «Ой, на гары каліна» і інш., карагоды «Каценька», «Кавалёчак», «На гары Ваня стаіць». На аснове вывучаных карагодаў калектыў «Купалінкі» паставіў на сцэне свайго клуба, на сцэне Радзюкоўскага сельскага Дома культуры і на раённай сцэне свята Карагоду. Зараз самадзейныя артысты вывучаюць народны абрад «Багач» — свята збору ўраджаю і пачатку сяўбы азімых.

Назву калектыў «Купалінка» атрымаў ад свята Купалля. Менавіта летняй купальскай парой утварыўся калектыў. Ніводнае свята Купалля не абыходзіцца без удзелу «Купалінкі». Купальскія песні, якіх шмат у рэпертуары калектыву, і пачынаюць свята, і заканчваюць яго, і гучаць лейтматывам на працягу ўсёй праграмы.

Спецыяльна для канцэртаў распрацавана некалькі танцавальна-песенных кампазіцый з выкарыстаннем найбольш яркіх і запамінальных народных танцаў і народных песень. Гэта кампазіцыі «Запрашае матчына песня», «А не ўсё па гору плакаць», «Ой, зайграйце, музыкі!».

У сваёй дзейнасці калектыў «Купалінка» кіруецца адной мэтай — збор і развіццё мясцовага песеннага і танцавальнага фальклору.

Н.І.Вайцюль.

З гісторыі музеяў раёна

Германавіцкі музей мастацтва і этнаграфіі імя Язэпа Драздовіча. Музей створаны былой настаўніцай рускай мовы і літаратуры Германавіцкай сярэдняй школы Адай Эльеўнай Райчонак. Вялікую дапамогу ў стварэнні музея аказалі вучні школы, сын А.Э.Райчонак Міхась Райчонак, многія жыхары Германавічаў і навакольных вёсак. Размешчаны музей у сядзібным палацы XVIII ст. (1782). З 1 лютага 1992 г. музей стаў дзяржаўным. Першы дырэктар музея А.Э.Райчонак.

Галоўнай задачай музея з'яўляецца вывучэнне, папулярызацыя і захаванне гістарычнай спадчыны нашага краю, а таксама вяртанне асобы беларускага мастака Язэпа Драздовіча ў айчынную культуру.

У музеі 4 невялікія пакоі і падвальнае памяшканне.

У пакоі этнаграфіі на першым паверсе

знаходзяцца рэчы традыцыйнага сялянскага побыту, прылады працы (драўляны плуг XIX ст., саха, хамут, аброоць, шумёлы), вырабы з саломы і лазы (кублы, лубкі, гарнец), старадаўнія гадзіннікі, прасы і іншае.

У пакоі ткацтва на першым паверсе сабраны прылады па апрацоўцы лёну і вырабы з яго. Тут мы бачым кросны, мялку, трапло, шчоткі, нажы, матавіла, нітоўку, калаўроты і іншыя прылады.

У падвальным памяшканні выстаўлена вялікая калекцыя глінянага посуду (збаны, слаі, гладышы, глякі, спарышы, гаршчкі, міскі і інш.), вырабы з дрэва (шуфлі, чарпакі, калатоўкі, граблі, каромыслы, хлебныя лапаты, цапы, вілы, ступы, бочкі, лыжкі).

У бакавых нішах невялікага калідора размешчаны скульптурныя партрэты Міхася Машары і Генадзя Цітовіча, якія выканаў скульптар Ігар Голубеў.

На сценах калідора размешчаны карціны сучасных мастакоў з відамі Германавічаў. У цэнтры калідора скульптурная кампазіцыя работы Ігара Голубева «Вечны вандроўнік».

На другім паверсе два музейныя пакоі.

Заходзім у першы пакой. Тут сабраны матэрыялы аб жыццёвым і творчым шляху мастака Язэпа Драздовіча, а таксама матэрыялы пра яго сяброў Янку Пачопку і Міхася Машару. Тут жа знаходзім цікавыя звесткі пра Івана Паўлавіча Сікору, Пятра Ластаўку, Пятра Касцюкевіча, Германа Кірылава, Фаму Рамашку, іншых вядомых нашых землякоў.

У другім пакоі размешчаны дываны-маляванкі і карціны Язэпа Драздовіча: «Германавіцкая роўнядзь», «Касцёл у Лужках», «Над Мнютай. Хутар Кожана І.Ф. у Мар'янполлі», «Засценак Янцэвічаў», макаткі, партрэты Сапонькі, Франца Рагавога і іншыя.

Тут жа знаходзяцца ксеракопіі фантастычных аповесцей Язэпа Драздовіча: «Жыццё на Марсе», «Жыццё на Сатурне», «Жыццё на верхнім кружніку Сатурна», «Жыццё на асяродкавым кружніку Сатурна», «У мурах Трывежа», «Аурыя», «Пушча Заурыдзія», а таксама ксеракопіі многіх графічных работ мастака.

Усяго ў музеі захоўваецца 6125 экспанатаў, сярод іх 210 твораў Язэпа Драздовіча, 745 этнаграфічных матэрыялаў.

Музей арганізуе выставы, сустрэчы з цікавымі людзьмі, віктарыны, ранішнікі. Сумесна з рэдакцыяй газеты «Кліч Радзімы» праведзена краязнаўчая віктарына «Ці ведаеш ты свой край?» Разам з Германавіцкай сярэдняй школай быў праведзены вечар памяці «Край над Дзісёнкай у сэрцы маім», прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння Міхася Машары. У школах супрацоўнікі музея чытаюць лекцыі: «Гісторыя мястэчка Германавічы», «Помнікі архітэктуры ў Германавічах», «Культурна-асветніцкая дзейнасць Язэпа Драздовіча ў Германавічах і ваколіцах», «Язэп Драздовіч і Космас», «Мястэчка Лужкі — старажытны гандлёвы цэнтр», «Загадка горада Гарадца над Мнютай» і іншыя.

Выдадзены буклеты «Музей мастацтва і этнаграфіі імя Я.Драздовіча» і «Касцёл Перамянення Гасподняга».

Л.К.Корсак.

Гарадзецкі музей мастацтва і этнаграфіі. У вёсцы Гарадзец 21 лістапада 1982 г. быў адкрыты музей мастацтва і этнаграфіі (цяпер філіял Германавіцкага музея мастацтва і этнаграфіі імя Язэпа Драздовіча). Размешчаны ў будынку былога лютэранскага храма XIX ст.

Музей узнік, дзякуючы намаганням энтузіястаў з Беларускага саюза мастакоў, найперш Аляксея Марачкіна, кіраўніцтва саўгаса «Гарадзец», вучняў Лужкоўскай сярэдняй школы. У музеі дзве залы (плошча экспазіцыі 150 м^2).

У першай зале прадстаўлена выяўленчае мастацтва Беларусі. Ганаровае месца займаюць творы Язэпа Драздовіча. Сярод іх карціны мастака «Набыўцы кніг у друкарні Ф.Скарыны», «Касмічны краявід», «Партрэт Міхайлоўскага», «Успаміны на руінах», «Дух цемры», «Касцёл у Беразвеччы», дываны-насценнікі «Ноч над возерам», «Звяры-музыкі».

З твораў вядомага мастака Пятра Сергіевіча прадстаўлены партрэт Янкі Пачопкі, карціны «Тыпы паўстанцаў», «Усяслаў Полацкі» і іншыя.

Экспанатамі з'яўляюцца карціны А.Марачкіна «Кастусь Каліноўскі», «Бяроза», «Бацькава яблынька», М.Сеўрука «Жнівень», В.Цвіркі «Над ракою», а таксама творы У.Басалыгі, Я.Ціхановіча.

Другая зала — этнаграфічны аддзел. Прадстаўлены матэрыялы археалагічных раскопак гарадзішча над ракой Мнюта каля вёскі Гарадзец (крамянёвыя нажы,

старажытная зброя, каменная ліцейная форма, жаночыя ўпрыгожанні, калекцыя манет), прадметы побыту і матэрыяльнай культуры беларусаў, творы народнага ганчарства, кавальства, ткацтва, вырабы з лазы і саломкі (жаночая сумка, кораб, мухалоўка, сявенькі), фрагменты тканін са слуцкіх мануфактур (XVIII), музычныя інструменты (скрыпка, цымбалы, гармонік мясцовага майстра Я.Лютынскага).

Л.Г.Войцік.

Гісторыка-краязнаўчы музей Германавіцкай сярэдняй школы. Адкрыты ў 1985 г. у гонар 40-й гадавіны перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Мае 1500 экспанатаў. Вялікі ўклад у арганізацыю музея ўнеслі былыя вучні школы, удзельнікі пошукавай работы. Міхась Алегавіч Райчонак, Марына Аляксандраўна Жылко, Наталля Казіміраўна Катовіч, Юлія Казіміраўна Катовіч, Наталля Уладзіміраўна Красько пад кіраўніцтвам класнага кіраўніка Ады Эльеўны Райчонак.

Музей займае два пакоі і складаецца з двух экспазіцыйных раздзелаў. Самы вялікі з іх — гісторыка-краязнаўчы, дзе размешчаны экспазіцыі: «Гісторыя вёскі Германавічы», «Рэвалюцыйны рух і грамадзянская вайна», «Партызанскі рух у Шаркаўшчынскім раёне ў 1941—1944 гадах», «Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны — нашы землякі», «Нашы знакамітыя землякі Міхась Машара і Пётр Касцюкевіч», «Маўклівыя сведкі мінулай вайны».

У другім пакоі прадстаўлена гісторыя 1406-га зенітна-артылерыйскага палка і 166-й стралковай дывізіі, якія вызвалялі вёску Германавічы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у ліпені 1944 г. Тут сабраны запісы ўспамінаў ветэранаў, фотаздымкі, якія былі зроблены ў час сустрэч з былымі воінамі, іх асабістыя рэчы і дакументы.

На базе музея дзейнічае гурток «Спадчына». Гурткоўцы праводзяць экскурсіі, удзельнічаюць у рэспубліканскіх, абласных і раённых краязнаўчых конкурсах, пошукавых экспедыцыях. На аснове матэрыялаў музея вучні пішуць творчыя работы па краязнаўству («Вёска Германавічы у XX стагоддзі», «Наша мясцовасць у гады Вялікай Айчыннай вайны», «Жыццё і творчасць Міхася Машары», «Пётр Касцюкевіч — паэт і мастак» і інш.), выступаюць з лекцыямі.

Штогод гісторыка-краязнаўчы музей Германавіцкай сярэдняй школы наведваюць каля 1000 экскурсантаў.

І.С.Пучынская.

Мемарыяльны музей Івана Сікоры. Мемарыяльны музей садавода-селекцыянера І.П.Сікоры быў створаны ў 1988 г. у вёсцы Алашкі. У 1999 г. будынак музея капітальна адрамантаваны.

У музеі працуе творчы, зладжаны калектыў у складзе навуковага супрацоўніка Сяргея Дзмітрыевіча Райчонка, галоўнага захавальніка фондаў Віктара Сяргеевіча Сікоры, агранома Алега Георгіевіча Сікоры, дырэктара Ірыны Іванаўны Паўлоўскай.

Музей збірае і захоўвае матэрыял аб жыцці і дзейнасці садавода-селекцыянера. Прадстаўлена 11 раздзелаў: развіццё садоўніцва ў Беларусі; кабінет І.П.Сікоры; бібліятэка І.П.Сікоры; М.Прышвін, Л.Лявонаў у лёсе І.П.Сікоры; перапіска І.П.Сікоры з доктарам навук, прафесарам М.А.Лісавенкам; навукова-даследчая праца І.П.Сікоры; П.Сергіевіч, М.Машара (шматгадовае сяброўства звязвала Івана Паўлавіча з гэтымі людзьмі); А.К.Шчаслівы (фатаграфіі, ксеракопіі, арыгіналы пісем вучонага); энтузіясты садоўніцтва; І.П.Сікора і юныя натуралісты; дары садоў.

На тэрыторыі музея размешчаны пладаносны сад агульнай плошчай 3 гектары, колькасцю 245 дрэў, і малады сад (356 дрэў). Супрацоўнікамі музея абсталяваны гадавальнік для саджанцаў пладовых дрэў.

У 2002 г. было прывіта 240 сажанцаў, з іх 100 штук — гатунку «Памяць Сікоры», 100 штук — «Беларуская малінаўка», 20 — «Сікораўская антонаўка», 20 — белы наліў. Пасаджана 150 кустоў чорных парэчак. Саджанцы, вырашчаныя супрацоўнікамі музея, рэалізоўваюцца насельніцтву.

Для прыцягнення моладзі да развіцця садоўніцтва пры музеі створаны і працуе клуб садаводаў-аматараў.

Супрацоўнікі музея публікуюць матэрыялы пра музей і садавода-селекцыянера І.П.Сікору на старонках раённай газеты, а таксама прапаноўваюць насельніцтву кансультацыі па садоўніцтву.

У музеі вядзецца пошуковая, навукова-даследчая праца. Наладжана перапіска з людзьмі, якія добра ведалі І.П.Сікору, з мэтай папаўнення музейных фондаў матэ-

рыяламі аб жыцці і дзейнасці знакамітага садавода.

Арганізуюцца выставы «Умелыя рукі» (дзе прадстаўлены посуд з лазы, для збору і захавання пладоў), «Я выгадую свой сад» (літаратура па пытаннях садоўніцтва, кветкаводства і агародніцтва).

Кожны год праходзіць рэгіянальнае свята «Светлы яблычны Спас — сікораўскай душы часцінка». Арганізоўваюцца выставы пладоў сікораўскага саду.

І.М.Шынкевіч.

Справе продкаў — новае жыццё

5 кастрычніка 2001 г. гасцінна расчыніў дзверы раённы Цэнтр рамесстваў, які ўзяў на сябе клопат аб захаванні і далейшым развіцці традыцыйных народных рамёстваў, характэрных для Шаркаўшчынскага раёна.

Адкрыццё Цэнтра рамёстваў — гэта крок да пошуку новых талентаў на Шаркаўшчынскай зямлі. І гэтыя таленты ёсць, бо майстры і кіраўнікі гурткоў імкнуцца не толькі самі плённа працаваць, але і перадаюць сакрэты свайго майстэрства дзецям.

Асноўнымі напрамкамі дзейнасці Цэнтра рамёстваў з'яўляюцца зберажэнне і захаванне самабытнай мастацкай культуры, вывучэнне, адраджэнне і прапаганда рамёстваў і промыслаў у раёне, арганізацыя работы з дзецьмі, абслугоўванне насельніцтва праз выставы, гурткі, стварэнне ўмоў працы для майстроў.

Маецца філіял Цэнтра рамёстваў у в. Германавічы, а таксама створаны клуб народных майстроў і самадзейных мастакоў «Талака», які нядаўна пацвердзіў званне народнага.

У Цэнтры рамёстваў і яго філіяле аматары развіваюць 10 відаў традыцыйных рамёстваў.

Добра вядома за межамі нашага раёна імя Сяргея Рымдзёнка. Ён працуе загадчыкам філіяла, вядзе заняткі ў гуртках ганчарных вырабаў і глінянай цацкі.

Ганна Загорская — кіраўнік гуртка станочнага ткацтва, дзе займаюцца 12 дзяцей, якія авалодваюць тэхнікай ткацтва кілімаў, ручнікоў, сурвэтак.

Пачаў працаваць гурток ткацтва габеленаў. Ён налічвае 12 чалавек (кіраўнік Аксана Калеснікава).

У гуртку разьбы па дрэве «Бабраня» (кіраўнік Аляксандр Цітовіч) займаюцца 10 чалавек.

З задавальненнем дзеці (8 чалавек) наведваюць гурток выцінанкі «Дамавёнак» (кіраўнік гуртка Людміла Казіцкая). У пачатку года была арганізавана выстава «Казка з паперы» ў фае Цэнтра рамёстваў. Выстава работ Людмілы Казіцкай «Ажурныя фантазіі» экспанавалася ў Корніцкай бібліятэцы.

Вырабы аматараў разьбы па дрэве.



На занятках у гуртку «Бабраня».

Пляценне саламяных вырабаў — цікавы і своеасаблівы від народнай творчасці. Кіраўнік гуртка «Саламяная кветка» (займаюцца тут 10 чалавек) Святлана Брэская імкнецца зрабіць гэты від творчасці даступным для дзяцей, яна вучыць іх правільна выбраць матэрыял, пазнаць уласцівасці саломкі, прывівае мастацкі густ, знаёміць з творчым вопытам старэйшых пакаленняў і нашых сучаснікаў у галіне саломапляцення.

Кружкоўцы авалодваюць тэхнікай ткацтва.

Кіраўнік гуртка малявання дываноў (такіх, якія ствараў у свой час Я.Драздовіч) Людміла Мікалаеўна Маяк пераняла тэхніку выканання маляванага дывана ад вядомай майстрыхі Ганны Мікалаеўны Курыловіч, якая ўсё сваё жыццё займалася «маляванкай». Людміла Мікалаеўна імкнецца адрадзіць гэты від народнай творчасці, прывіць любоў да яго. Свае лепшыя работы дзеці выстаўлялі ў час «Калядна-га кірмашу» ў раённым Доме культуры.

З задавальненнем займаюцца дзяўчынкі рознага ўзросту ў гуртку фларыстыкі, які вядзе Святлана Заіка. Прыгожыя пано з сухіх кветак, арыгінальныя букеты з прыроднага матэрыялу, своеасаблівыя вазы з баршчавіка яны прадстаўляюць на выставе «Жывыя колеры».

Усяго ў гуртках Цэнтра рамёстваў і яго філіяла ў Германавічах займаюцца больш за 100 чалавек.

Цэнтр рамёстваў вядзе актыўную выставачную дзейнасць. Ладзяцца выставы народных майстроў Шаркаўшчынскага і суседняга, Глыбоцкага раёнаў, гурткоўцаў Цэнтра рамёстваў.



На выставе вырабаў Цэнтра рамёстваў.

Традыцыяй стала ў час Велікодных свят праводзіць выставу-конкурс «Яйка-пісанка». Удзел у ёй прымаюць гурткоўцы Цэнтра рамёстваў, вучні школ раёна, а таксама выхаванцы школы мастацтваў аддзялення скульптуры. Пераможцы ўзнагароджваюцца граматамі і сувенірамі, выкананымі ў ганчарнай майстэрні.

Выставачная зала Цэнтра рамёстваў у Шаркаўшчыне адзіная, таму, акрамя выстаў вырабаў народных майстроў, тут экспануюцца таксама і работы мастакоў.

Адметнай з'явай стала выстава мастакоў — удзельнікаў пленэра «Шляхамі Язэпа Драздовіча», на якой было прадстаўлена амаль 30 твораў. Сярод іх работы А.Марачкіна, І.Марачкіна, М.Купавы, У.Сулкоўскага, В.Маркаўца, С.Цімохава, А.Цыркунова, І.Барадулінай, А.Шыенка і іншых сяброў Беларускага саюза мастакоў. У час правядзення выставы прэзентаваўся альбом-манаграфія «Язэп Драздовіч: жыццё і творчасць». Гэтыя мерапрыемствы былі наладжаны да чарговага дня нараджэння дзядзькі Язэпа.

Ганчарныя вырабы Цэнтра рамёстваў.

Прайшлі выставы ўшацкага мастака М.Казіцкага «Святло праваслаўя», выстава лазерных копій работ М.К.Рэрыха «Рускі цыкл», прадастаўленая Беларускім фондам Рэрыхаў.

Традыцыйнымі сталі ў цэнтры выставы работ выпускнікоў мясцовай школы мастацтваў, а цяпер студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Беларусі.

Цэнтр рамёстваў наладжвае таксама выставы на пляцоўках горада ў час масавых мерапрыемстваў. Адна з іх — выстава дзіцячага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Свет маіх захапленняў» у час раённага свята «Прыдзісенскія крыніцы».

Добрай традыцыяй стала ў Шаркаўшчыне шанаванне памяці нашага слыннага земляка І.П.Сікоры. Наладжваюцца святочныя мерапрыемствы ў яго гонар. Адно з іх «Яблычны Спас — усяму час». Работнікі Цэнтра рамёстваў з'явіліся арганізатарамі правядзення конкурсаў-выстаў кулінарных вырабаў «Маладзільнае яблыка» і букетаў «Шаркаўшчынскі вянок прыгажосці».

Выставы-продажы сувенірных вырабаў арганізоўваюцца ў час святкавання Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь 3 ліпеня, а 25 снежня праводзіцца Калядны кірмаш.

Вялікая ўвага ўдзяляецца прапагандысцка-асветніцкай дзейнасці. Цэнтр рамёстваў праводзіць экскурсіі-лекцыі для вучняў школ, работнікаў культуры, жыхароў горада і раёна.

В.К.Дубоўская.

ГЕРМАНАВІЦКІ ФІЛІЯЛ ШАРКАЎШЧЫНСКАГА ЦЭНТРА РАМЁСТВАЎ

У в. Германавічы з 1996 г. працуе філіял раённага Цэнтра рамёстваў. Загадчык філіяла Сяргей Леанідавіч Рымдзёнак, кіраўнікі гурткоў Ганна Міхайлаўна Рымдзёнак і Ганна Альбертаўна Загорская.

Асноўныя кірункі дзейнасці філіяла — ганчарства і гліняная цацка, станковае і ручное ткацтва.

Майстры філіяла з'яўляюцца пастаяннымі ўдзельнікамі раённых выстаў і мерапрыемстваў «Масленіца», «Прыдзісенскія крыніцы», «Яблычны Спас» і г.д. Кожны год яны прымаюць удзел у фестывалі «Звіняць цымбалы і гармонік» у Паставах, у выставах-продажах на «Славянскім базары ў Віцебску» і інш., неаднаразова ўзнагароджваліся ганаровымі граматамі аддзела культуры райвыканкома, дыпломамі ўдзельнікаў кірмашу «Горад майстроў» на «Славянскім базары ў Віцебску».

К.А.Кожан.

Кветкі на кроснах жыцця

У Германавічах працуе ткацкая майстэрня. Адкрывалася яна калісьці пры мясцовым музеі Язэпа Драздовіча. Цяпер знаходзіцца ў веданні раённага Цэнтра рамёстваў, які імкнецца аб'яднаць усіх таленавітых народных майстроў нашага краю. У майстэрні, якая з'яўляецца адначасова школай ткацтва, працуюць таленавітыя, захопленыя майстрыхі. Кіраўнік школы Ганна Рымдзёнак, маладая ткачыха, якая дзякуючы свайму майстэрству з'яўляецца ўдзельнікам шматлікіх выстаў, фестываляў. Разам з ёй працуе Ганна Загорская. А ткацкай справе вучацца ў іх германавіцкія дзяўчаткі. Ткуцца на кроснах самыя разнастайныя вырабы: цудоўныя паясы, рушнікі, дываны... Любуюцца імі людзі на выставах, міжнародных і раённых, у якасці падарункаў, сувеніраў атрымліваюць іх шаноўныя госці раёна. Ганна Рымдзёнак з'яўляецца членам Беларускага саюза майстроў.

Тчэ само жыццё на старадаўніх кроснах цудоўныя кветкі, імя якім талент, майстэрства, прыгажосць і любоў да сваёй Радзімы.

Л.М.Лабачэўская.

Майстар з Будаў

Ёсць у Шаркаўшчынскім раёне вёска Буды. Мінуўшы Германавічы, трэба яшчэ некалькі кіламетраў праехаць па гравійцы. Паварот налева. І вось невялічкая непрыкметная вёсачка. Навокал маляўнічыя краявіды. Паблізу, на ўскрайку лесу, сядзіба Юльяна Іосіфавіча Анецькі.

Юльян Іосіфавіч памятае, як змалку

бачыў бацьку за пляценнем кашоў. Калі выдавалася вольная часіна, той садзіўся за справу, якая была па душы. Малы падыходзіў да бацькі, круціўся ля яго, просячы, каб даў паспрабаваць.

Неяк надакучыла бацьку, што сын чапляецца з такой просьбаю, саступіў яму. Даў паспрабаваць. Хлопцу спадабалася. Ён хутка асвоіў справу. Юнак мог гадзінамі плясці кашолкі. Потым прага да пляцення аслабела...

Прайшло шмат часу, пакуль зноў Юльян Іосіфавіч узяўся за закінутую справу. Рукі хутка ўспомнілі знаёмыя з дзяцінства рухі. Зрабіў некалькі кашоў сабе. Потым — суседзям. Як тут адмовіш? Прыйшлося засесці за пляценне. Сёння ў вёсцы Буды ў кожнага гаспадара маюцца вырабы мясцовага майстра. У раёне толькі ён робіць кашы з сасновай лучыны.

Юльяну Іосіфавічу 68 гадоў, але, нягледзячы на свой паважаны ўзрост, ён застаецца энергічным чалавекам. Гаспадары з навакольных вёсак ведаюць, што жыве майстар на ўсе рукі на хутары каля вёскі Буды, таму звяртаюцца да яго за дапамогай. Усяму калгасу Юльян Іосіфавіч робіць дугі, аглоблі, палазы, колы. Нікому не адмаўляе. Гаспадар з гаспадыняй заўсёды рады людзям, якія з рознымі просьбамі часценька завітваюць да іх.

А.І.Барыла.

Усё пачалося з лыжкі

Разьбой па дрэве Аляксандр Цітовіч заняўся ў 1984 г. У Ёдскім сельскім Доме культуры арганізаваў гурток. Прымаў удзел у выставах, якія былі арганізаваны на раённых святах «Прыдзісенскія крыніцы», «Грай, гармонік», «Масленіца», «Свята горада». Удзельнічаў у міжнародных фестывалях народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» у Паставах, «Славянскім базары», дзе тры апошнія гады запар атрымліваў дыпломы, у абласной выставе «Кругавы зварот» у Віцебску і міжнароднай выставе ў Смаленску.

На свяце-конкурсе «Дрэва жыцця», які праходзіў у Глыбокім, заняў першае месца ў намінацыі «Лыжка традыцыйнай формы».

На рэспубліканскім свяце-конкурсе «Дрэва жыцця» ў г.п. Мір таксама ягоную лыжку адзначылі вышэйшай узнагародай.

А.І.Барыла.

Радзюкоўская «Груца»

Клуб нацыянальнай кухні «Груца» быў створаны на базе Радзюкоўскага сельскага Дома культуры 1 снежня 1997 г.

Галоўная мэта клуба — захаваць традыцыі беларускай кухні, характэрныя для Шаркаўшчынскага раёна, данесці да сучаснікаў адметнасць і непаўторны каларыт старадаўніх мясцовых страў, разбудзіць цікавасць землякоў да здаровага харчавання, якое пераважала ў сялянскім побыце нашых дзядоў і прадзедаў.

Дарэчы, «Груца» — гэта назва стравы, якую спакон веку гатавалі ў Радзюках і навакольных вёсках.

Упершыню стравы па старадаўніх рэцэптах клуб нацыянальнай кухні «Груца» прадставіў на раённым свяце «Прыдзісенскія крыніцы» ў 1998 г. З праграмай «Смачна гатуем — гасцей частуем» выступілі на раённым заключным аглядзе-конкурсе калектываў мастацкай самадзейнасці, у рамках першага фестывалю «Беларусь — мая песня» (1998). У Дзень Рэспублікі, на «Беларускім панадворку» ў Мінску (1998) апранутыя ў нацыянальныя касцюмы ўдзельнікі калектыву частавалі камамі, дранікамі, грацай і іншымі прысмакамі жыхароў і гасцей сталіцы.

У аматарскае аб'яднанне ўваходзяць 14 чалавек рознага ўзросту, розных прафесій. Кіраўнік аб'яднання Людміла Афінагенаўна Лазовік і ўдзельніцы Ларыса Іванаўна Шпак, Альдона Генрыхаўна Папко, Галіна Іванаўна Пачкоўская, Ганна Пятроўна Ермакова актыўна прапагандуюць старадаўнія рэцэпты смачнай і здаровай ежы, складаюць летапіс клуба, збіраюць фотаматэрыялы. Сістэматычна папаўняецца фотаальбом, буклет «Радзюкоўская «Груца» і іншыя прысмакі».

Удзельнікі народнага клуба нацыянальнай кухні «Груца».

Калектыў «Груца» ўдзельнічае ў разнастайных святах і фестывалях, якія праводзяцца ў раёне.

Клуб аматараў кухні займаецца навукова-даследчай працай. Ідзе пошук, выяўленне рэдкіх старадаўніх рэгіянальных рэцэптаў прыгатавання страў. Ствараецца своеасаблівы фонд клуба. І, безумоўна, кожны рэцэпт у далейшым увасабляецца ў новую, а дакладней, добра забытую страву.

Вядзецца работа па стварэнні зборніка рэцэптаў традыцыйнай кухні нашага раёна па наступных кірунках: посныя масленічныя, велікодныя, калядныя стравы.

Л.У.Якубёнак.

Школе мастацтваў — 34 гады

Дзіцячая музычная школа была адкрыта ў Шаркаўшчыне 1 жніўня 1969 г. Яе арганізатарам і дырэктарам стаў Іван Казіміравіч Курто, які пасля заканчэння Маладзечанскага музычнага вучылішча быў накіраваны на работу ў Шаркаўшчыну. Школа мела тры аддзяленні: фартэпіяна, баян, акардэон. Акрамя Івана Казіміравіча, працавалі яшчэ два выкладчыкі: Галіна Мікалаеўна Прасаловіч і Аляксандр Аляксандравіч Ашла. Першы набор склаў 60 вучняў.

У станаўленне музычнай школы значны ўклад унеслі таксама яе выкладчыкі Вячаслаў Міхайлавіч Дунаеўскі (клас баяна), Мечыслаў Эмануілавіч Касцюк.

Паступова адкрываліся новыя аддзяленні: духавое (1978), скрыпкі (1981), мастацкае аддзяленне (1994), аддзяленне харэаграфіі (1995). У 1994 г. музычная школа была пераўтворана ў школу мастацтваў.

На мастацкім аддзяленні працуюць 3 выкладчыкі: член Беларускага саюза мастакоў Віктар Фёдаравіч Крук (загадчык аддзялення), Арсеній Іванавіч Пяткевіч, Марына Пятроўна Ліпская.

У раёне дзейнічае яшчэ адна школа мастацтваў — у Лужках. Кіруе ёй Юрый Ціханавіч Пазяйчук.

Усяго ў абедзвюх школах займаюцца 244 вучні па наступных спецыяльнасцях: фартэпіяна, струнна-духавыя і народныя інструменты, жывапіс і малюнак, тэатральнае мастацтва. Калектыў выкладчыкаў складаюць 24 чалавекі. У школах створаны 3 аркестры, 2 харавыя калектывы, фальклорны ансамбль, квартэт выкладчыкаў, ансамбль «Шаркаўшчынскія музыкі».

Многія выпускнікі музычнага аддзялення Шаркаўшчынскай школы мастацтваў сталі цяпер выкладчыкамі гэтай або іншых школ Беларусі. Шмат хто працягвае вучо-

Выступаюць члены «Світанка».

бу ў вышэйшых і сярэдніх музычных навучальных установах краіны. Сярод выпускнікоў мастацкага аддзялення школы ёсць студэнты Беларускай акадэміі мастацтваў, Віцебскага педуніверсітэта, Беларускага універсітэта культуры (мастацкія аддзяленні), Віцебскага тэхналагічнага універсітэта.

За гады існавання Шаркаўшчынскай школы мастацтваў адукацыю тут атрымалі амаль 400 выпускнікоў.

І.К.Курто.

«Світанак» збірае сяброў

У 1992 г. пры рэдакцыі раённай газеты «Кліч Радзімы» было створана літаратурнае аб'яднанне «Світанак». Першапачаткова ў яго ўвайшлі аўтары вершаў і прозы, чые творы змяшчаліся на літаратурнай старонцы «Світанак» у раённай газеце. Паступова калектыў расшыраўся, да яго далучаліся тыя, хто піша музыку, аўтарскія песні. «Світанак» перарос у літаратурна-музычнае аб'яднанне, якое працуе пры раённым Доме культуры. Эдвард Эдвардавіч Вялічка — прадпрымальнік, Ігар Славаміравіч Дземідовіч — настаўнік, Людміла Мікалаеўна Лабачэўская — намеснік рэдактара раённай газеты, Надзея Васільеўна Паляк — пенсіянерка, Віктар Ільіч Лагун — галоўны інжынер раённых электрасетак, Мілецій Мікалаевіч Кукуць — начальнік дзяржтэхнагляду. Усяго 15 чалавек. Кіраўніком літаратурнага аб'яднання «Світанак» з'яўляецца Кацярына Мар'янаўна Сосна — загадчыца сельгасаддзела рэдакцыі газеты «Кліч Радзімы».

Калектыў вядзе актыўную канцэртную дзейнасць. Выступае ў раённым Доме культуры, у клубных установах раёна, школах, з'яўляецца актыўным удзельнікам усіх свят, якія праводзяцца ў раёне.

Прайшлі творчыя вечары Віктара Лагуна «Плыў верш над берагам Дзісны», творчы вечар Кацярыны Сосна, вечар гумару Эдварда Вялічкі.

Пішуць вершы і музыку да іх, самі выконваюць песні Аляксандра Крупко, Ганна Цітовіч, Ала Клакоўская.

Стала ўжо традыцыяй 1 красавіка ў раённым Доме культуры праводзіць аўтарскі вечар «Дзень смеху з Эдвардам Вялічкам».

У 1997 г. Мілецій Кукуць выдаў кнігу «Адзін дзень і ўсё жыццё», Віктар Лагун — серыю кніг: «Маё шанаванне вам», «Дзень добры, мама», «Аднойчы...», «З нагоды», «Ведай нашых», «Калі гублялася надзея», «Смак балота», «Апраўданне надзей», «Ералаш-1», «Ералаш-2».

У 2002 г. у выдавецтве «Беларускі кнігазбор» выйшлі кніга Кацярыны Сосна «Імгненні жыцця» і калектыўны зборнік літаратараў Шаркаўшчынскага краю.

Л.М.Лабачэўская.

З гісторыі раённай бібліятэкі

Старажылы Шаркаўшчыны памятаюць, што да 1939 г. у мястэчку была публічная бібліятэка. Хутчэй за ўсё бясплатная. Трымалі яе польскія салдаты-рэзервісты. Для бібліятэкі арандавалі месца ў прыватным кінатэатры. Сярод кніг былі раманы Г.Сянкевіча «Патоп», «Крыжакі» і інш.

Прыходзілі людзі глядзець кіно, а заадно бралі кнігі. Кнігі шанавалі. Час ад часу іх перапляталі. Удзельнічалі ў гэтым школьнікі. Бывала, настаўнік прыносіў кнігі на ўрок, даваў вучням рамантаваць. А сам глядзеў, каб усё было зроблена як трэба. Так вучылі дзяцей адносіцца да кніг, як да вялікага багацця.

Лічыцца, што гэта невялічкая бібліятэка загінула ў 1939 г. Нехта з новых чыноўнікаў палічыў кнігі на незразумелай яму польскай мове шкоднымі.

У 1944 г. пасля вызвалення Шаркаўшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў па рашэнні райвыканкома была створана раённая бібліятэка. Першай загадчыцай яе была 17-гадовая Ірына Якаўлеўна Сініца, якая па ініцыятыве Анатоля Антонавіча Арэнта, інспектара райана, хадзіла па хатах жыхароў Шаркаўшчыны і збірала кнігі, каб у мястэчку быў створаны культурны цэнтр — бібліятэка.

Чытачоў і кніг у бібліятэцы было мала, не было аніякай мэблі, акрамя самаробных паліц і дзесьці знойдзенага стала. Але моладзь цягнулася да бібліятэкі, кожны вечар прыходзілі на агеньчык вучні старэйшых класаў. Частым госцем бібліятэкі быў Павел Дубашынскі (будучы артыст тэатра імя Янкі Купалы).

З 1945 г. бібліятэка пачала атрымліваць кнігі з Полацкага бібкалектара. Павялічылася колькасць чытачоў. У 1946 г. у штат бібліятэкі ўвялі другога бібліятэкара. Ім стала Валянціна Міхайлаўна Кіжло.

Маладой дзяўчынай прыехала ў 1947 г. у Шаркаўшчыну Юлія Мацвееўна Карнеева. Спачатку працавала дырэктарам Дома культуры, а 1 кастрычніка 1948 г. прыйшла ў бібліятэку і 33 гады нязменна была яе загадчыцай, а потым дырэктарам ЦБС.

Шмат гадоў прысвяцілі рабоце ў бібліятэцы Ларыса Іванаўна Марковіч, Марыя Вітольдаўна Цярэшка, Зінаіда Данілаўна Кожух, Клемянціна Антонаўна Латышонак.

Бібліятэцы належыць адметнае месца ў культурным жыцці раёна. Структура цэнтральнай раённай бібліятэкі ўключае наступныя аддзелы: бібліятэчнага маркетынгу, камплектавання і апрацоўкі літаратуры і арганізацыі адзінага фонду, аддзел абслугоўвання і інфармацыі, дзіцячую бібліятэку.

Кніжны фонд цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы налічвае 272 239 экземпляраў выданняў, раённай бібліятэкі — 42 424, дзіцячай бібліятэкі — 23 538 экземпляраў.

З 2001 г. у раённай бібліятэцы адкрыты публічны цэнтр прававой інфармацыі, кожны квартал ідзе абнаўленне ў базе даных.

З мінулага года адкрыты камерцыйны абанемент.

Аддзел камплектавання і апрацоўкі літаратуры і арганізацыі адзінага фонду з 1999 г. працуе ў аўтаматызаваным рэжыме.

Пры дзіцячай бібліятэцы адкрыты пакой казак і дзейнічае лялечны тэатр.

В.Э.Касевіч.

Помнікі на ўшанаванне памяці воінаў Чырвонай арміі, воінаў-землякоў, партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК ШАРКАЎШЧЫНА

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан на вул. Маякоўскага. У цэнтры пасёлка, у скверы, пахаваны 211 воінаў і 9 партызан, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941—1944 гг. Сярод іх — воіны 44-й мотастралковай брыгады 1-га танкавага корпуса 1-га Пры-

балтыйскага фронту, што загінулі1.7.1944 г. пры вызваленні г.п. Шаркаўшчына. У 1960 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

Помнік вызвалення. На вул. 17 Верасня. Шаркаўшчына была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх акупантаў 1.7.1944 г. воінамі 44-й мотастралковай брыгады 1-га танкавага корпуса пад камандаваннем гв. палкоўніка А.І.Халаева. У баях за Шаркаўшчыну прымалі ўдзел партызаны.

У гонар вызвалення пасёлка ў 1965 г. устаноўлена стэла.

БІЛЬДЗЮЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БІЛЬДЗЮГІ

Помнік землякам. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 25 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1969 г. устаноўлены абеліск.

ВАЛОЖЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АМРОСЕНКІ

Помнік землякам каля будынка клуба. На ўшанаванне памяці 23 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1975 г. ўстаноўлена стэла.

ВЁСКА НАВАСЕЛЛЕ

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 7 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1969 г. устаноўлена стэла.

ВЁСКА ПЯЛІКІ

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 26 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1975 г. устаноўлена стэла.

ВЁСКА САСНОЎЦЫ

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 32 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1969 г. устаноўлены абеліск.

ГЕРМАНАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЕЛЫ ДВОР

Помнік землякам. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 17 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1975 г. устаноўлена стэла.

ВЁСКА ВЯЛІКАЕ СЯЛО

Помнік землякам. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 17 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. устаноўлена стэла.

ВЁСКА ГЕРМАНАВІЧЫ

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Каля школы. Пахаваны 5 савецкіх воінаў, якія загінулі пры вызваленні вёскі Германавічы ў ліпені 1944 г. У 1986 г. на магіле ўстаноўлена стэла, у 1989 г. — гармата.

Помнік землякам. У цэнтры вёскі на ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941—1945 гг. У 1964 г. устаноўлена стэла.

ВЁСКА ДЗІКЕВА

Магіла Рагавога Валерыя Іванавіча. Работніка НКУС В.І.Рагавога забілі бандыты ў 1948 г. У 1950-я гг. на магіле ўстаноўлена стэла.

ВЁСКА ЖУКІ ЛОЖНЫЯ

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 9 савецкіх воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1958 г. на магіле ўстаноўлена стэла.

ВЁСКА ЗОРКА

Помнік землякам. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 32 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашыскіх захопнікаў. У 1969 г. устаноўлена стэла.

ВЁСКА СТАЛІЦА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці землякоў (21 чалавек), якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1975 г. устаноўлена стэла.

ВЁСКА ЮЗАФОВА

Помнік землякам. У скверы. На ўшанаванне памяці 23 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1975 г. устаноўлена стэла з барэльефнай выявай воінаў.

ЁДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КУЯЛЕЎШЧЫНА (не існуе)

Месца спаленай вёскі. Вёска знаходзілася за 1,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі Свілы. У лістападзе 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі яе разам з жыхарамі (24 чалавекі, 6 двароў). Пасля вайны не адрадзілася.

ВЁСКА ЛОНСКІЯ

Брацкая магіла савецкіх воінаў і мірных жыхароў. На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 16 воінаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, і 248 мірных жыхароў з вёсак Журавоўшчына, Кушталі, Куялеўшчына, Свілы, Строна, Трабаўшчына і хутароў Бялкова, Вязовец, Ігнацэва, Падрэзаўшчына, Пазава, Станіслава, Сухаборац, Сцяпаніха, Сялібка, загубленых нямецка-фашысцкімі захопнікамі 24.11.1942 г. У 1976 г. на магіле ўстаноўлены помнік — скульптура воіна ў жалобе і 3 стэлы.

ВЁСКА КОРНІЦА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 66 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1975 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА СТРОНА (не існуе)

Месца спаленай вёскі. Вёска знаходзілася за 1 км на поўнач ад вёскі Кушталі. У лістападзе 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі яе разам з жыхарамі (42 чалавекі, 4 двары). Пасля вайны не адрадзілася.

ХУТАР БЯЛКОВА (не існуе)

Месца спаленага хутара. Хутар знаходзіўся за 1,5 км на паўночны ўсход ад вёскі Свілы. У лістападзе 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі яго разам з жыхарамі (13 чалавек, 3 двары). Пасля вайны не адрадзіўся.

ХУТАР ВЯЗОВЕЦ (не існуе)

Месца спаленага хутара. Хутар знаходзіўся за 1,2 км на паўночны ўсход ад вёскі Трабаўшчына. У лістападзе 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі яго разам з жыхарамі (44 чалавекі, 7 двароў). Пасля вайны не адрадзіўся.

ХУТАР ІГНАЦЭВА (не існуе)

Месца спаленага хутара. Хутар знаходзіўся за 4 км на паўднёвы ўсход ад вёскі Свілы. У лістападзе 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі хутар (2 двары) разам з жыхарамі (14 чалавек). Пасля вайны не адрадзіўся. Увекавечаны ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».

ХУТАР ПАДРЭЗАЎШЧЫНА

Месца спаленага хутара. Хутар знаходзіўся за 3 км на поўдзень ад вёскі Свілы. У лістападзе 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі хутар (2 сядзібы) разам з жыхарамі (8 чалавек). Пасля вайны не адрадзіўся. Увекавечаны ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».

ХУТАР ПАЗАНА

Месца спаленага хутара. Хутар знаходзіўся за 1,5 км на паўночны захад ад вёскі Свілы. У лістападзе 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі яго разам з жыхарамі (9 чалавек, 2 двары). Пасля вайны не адрадзіўся.

ХУТАР СТАНІСЛАВОВА

Месца спаленага хутара. Хутар знаходзіўся за 1,5 км на паўднёвы захад ад вёскі Свілы. У лістападзе 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі яго разам з жыхарамі (4 чалавекі). Пасля вайны не адрадзіўся. Увекавечаны ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».

ХУТАР СУХАБОРАЦ

Месца спаленага хутара. Хутар знаходзіўся за 2,5 км на поўнач ад вёскі Свілы. У лістападзе 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі хутар разам з жыхарамі (29 чалавек, 3 двары). Пасля вайны не адрадзіўся.

ХУТАР СЦЯПАНІХА

Месца спаленага хутара. Хутар знаходзіўся за 800 м на паўднёвы захад ад вёскі Свілы. У лістападзе 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі яго разам з жыхарамі (18 чалавек, 3 двары). Пасля вайны не адрадзіўся.

ХУТАР СЯЛІБКА

Месца спаленага хутара. Хутар знаходзіўся за 2 км на паўднёвы захад ад вёскі Свілы. У лістападзе 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі хутар (2 двары) разам з жыхарамі (4 чалавекі). Пасля вайны не адрадзіўся. Увекавечаны ў мемарыяльным комплексе «Хатынь».

ЛУЖКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЕРАЦЕІ 1-я

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 36 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1972 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА ДВОРНАВА

Помнік землякам. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 63 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1967 г. устаноўлена стэла.

ВЁСКА ДЗІЎНАЯ

Магіла савецкіх ваеннапалонных і партызанкі. У цэнтры вёскі. Пахаваны 9 савецкіх ваеннапалонных, расстраляных нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1942 г., і партызанская разведчыца А.Д.Бельская, якая была захоплена гітлераўцамі ў палон і пасля жорсткіх здзекаў забіта. У 1957 г. на магіле ўстаноўлены стэлы і 2 абеліскі, якія ўшаноўваюць памяць пахаваных, побач — гармата.

Помнік землякам. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 49 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1975 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА ЛУЖКІ

Брацкая магіла савецкіх воінаў. У парку. Пахаваны 63 воіны, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. на магіле ўстаноўлены помнік — скульптура воіна.

ВЁСКА ПАРЭЧЧА

Магіла Церахава Міхаіла Цімафеевіча. На могілках. М.Ц.Церахаў — першы старшыня калгаса «Верацеі» быў забіты бандытамі ў 1945 г. У 1965 г. на магіле ўстаноўлена стэла.

РАДЗЮКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БОЎКАЛЫ

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 39 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1975 г. пастаўлены помнік — на 3 пастаментах скульптурныя выявы жанчыны і 2 воінаў.

ВЁСКА РАДЗЮКІ

Помнік землякам. Каля будынка канторы саўгаса імя Маркава. На ўшанаванне памяці 26 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1963 г. устаноўлены абеліск.

РУЧАЙСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГРЫГАРАЎШЧЫНА

Помнік землякам. Каля клуба. На ўшанаванне памяці землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1969 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА ЗАПРУДДЗЕ

Помнік землякам. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 9 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашыскіх захопнікаў. У 1969 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА ЗАЧЫСЦІКІ

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў.

ВЁСКА КАЎШЭЛЕВА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 14 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1969 г. устаноўлены абеліск.

СТАНІСЛАВОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЖУКОЎШЧЫНА

Помнік землякам. Каля клуба. На ўшанаванне памяці 72 землякоў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА МІШУТЫ

Помнік землякам. На ўскраіне вёскі. На ўшанаванне памяці 12 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1969 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА СТАНІСЛАВОВА

Помнік землякам. Каля адміністрацыйнага будынка выканкома Станіславоўскага сельсавета. На ўшанаванне памяці землякоў (21 чалавек), якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у 1975 г. устаноўлена стэла.

Друкуецца паводле кн.: Памяць. Беларусь: Рэспубліканская кніга. Мн., 1995. С. 220—223; Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Віцебская вобласць. Мн., 1985. С. 455—463.

Падрыхтавала Г.Ф.Волах.

З апісання ракі Дзісны і мясцовасці ў канцы XIX стагоддзя

Реки, орошающие Дисненский уезд — р. Двина и ея притоки: Дисенка, Волта, Мерица, Вята, Друйка... Река Дисенка (Дисна) берет начало в Новоалександровском уезде Ковенской губернии, из ю.-з. части оз. Дисна... проходит с севера на юг целую версту болотами, а затем сливает свои воды с оз. Диснище; войдя в это озеро на с.-в. Дисенка выходит из него на ю.-в. По выходе из оз. Диснище, Дисенка течет по местности довольно болотистой, имея направление к ю.-в., до м. Кочергишки, где направление ее изменяется на в.-ю.-в.; в этом направлении она течет до впадения р. Бирвиты, у д. Бирвицы, где делает довольно крутой поворот на с.-в. до впадения р. Голбейки у д. Рымки; отсюда Дисенка имеет направление на в. до с. Игумен, откуда поворачивает на с.-в.

Получая, таким образом, начало из Новоалександровского уезда Ковенской губернии, Дисенка протекает по границе этого уезда с Свенцянским уездом до с. Королица; отсюда течет на границе Свенцянского уезда с Дисненским до м. Козяны, а затем, вплоть до своего устья при г. Дисне,— течет в пределах Дисненского уезда.

...По официальным сведениям, длина ея 149 верст (от истока до устья Лучайки 50 верст, до устья р. Половицы 25, до м. Старая и Новая Шарковщина 13 верст, до своего устья 60 верст).

Ширина Дисенки в Ковенской губернии не превосходит 7 саж., но в Виленской доходит до 70 саж.

Глубина от 1,5 до 15 футов в среднюю воду, в малую ж 2—6 футов. Старожилы утверждают, что занос илом и зарастание Дисенки особенно усилилось в течение текущего столетия (XIX. — *Склад.*).

Берега Дисенки большей частью покрыты лесом; выше Шарковщины до Козян — берега чистые; выше Козян река поросши травой; вообще же берега Дисенки довольно высоки и обрывисты, но низменная часть их весною заливается версты на 3, и уровень воды в это время выше обыкновенного до 10 футов.

Плавание по Дисенке возможно только весною и в дождливую осень; летом же, по причине значительных камней и других препятствий, плавание прекращается. Главнейшие препятствия: от м. Козян до Шарковщины — мелководье и маленькие островки; верстах в 20 выше Шарковщины — колено Полова (у ф. Половo); ниже Шарковщины — головка Медведка; у д. Шкели, верстах в 5 ниже Шарковщины, — камень; у дер. Рачки (Радьки) — мелководье и большой камень; у дер. Таболы — мелководье и язы; ниже д. Болтрамеи (Бутрамеи) — язы, камни, мелководье и остров; у д. Великое Село — островок и забора (каменная гряда) Игуменова; у д. Жуки — островок и большое мелководье; у д. Пузаны — мелководье; выше и ниже Германович, до дер. Столица,— язы; у д. Бояры — головка и язы; от д. Бояры до мызы Больново, версты на три, — мелководье, забора и островок; у д. Курилово (Куриловичи) — большие камни, справа налево, и островок Островинка, ниже дер. Малыши (Малаши) и у самой деревни — камни; у дер. Черепы — мелководье, камни, забора; у ф. Шмигельского — колено и большой камень; ниже дер. Латушки более версты тянется забора Латушки; далее — головка Зеленкова и камень Золоторотник («здесь очень ловится рыба»); ниже Стефанполя — камни, самый большой — Соколова; за ним головка Мыщина на 1/2 версты, а затем головка Ениралиха...

В 1828 г., в виду соединения Дисенки с р. Вилией (о чем подробно будет сказано ниже), проектировано для Дисенки новое устье; канал длиною в 1700 с. с камершлюзами.

От м. Козяны Дисенка считается сплавною, а от м. Шарковщина — судоходною. Но эта река никогда не была особо судоходною. По Дисенке сплавляется в небольшом количестве зерновой хлеб, лен, льняное семя — на лайбах (такие же, как и на Двине); особенно много сплавляется леса. В конце XVIII века по Дисенке из Козян сплавлялись громадные партии строевого леса, даже мачт. В прежнее время сплав был в руках христиан, а ныне почти исключительно в руках евреев; христиане же, дисненские мещане, развозят по деревням на лайбах горшки.

Прежде Дисенка была довольно рыбная, теперь же рыбы очень мало; ловятся: цырта, щуки, сомы, налимы, плотка, угри, окуни, ерши, судаков почти нет.

Притоки Дисенки с правой стороны: Изабелинка, Бирвита, Половка, Голбеица (Голбейка), Березвица (Березвечь, Березовка), Пышкунка, Мнюта, Безыменная, Плавна, Иловка, Язница.

Притоки Дисенки с левой стороны: Равкета, Маруга, Абалинус, Дрисвята, Безыменная, Освятница, Янка, Папки, Береженка, Ямна, Еленка.

Друкуецца па кн.: Сапунов А. Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии. Витебск, 1886. С. 4—7.

Паданні аб паходжанні назваў Шаркаўшчыны

Калісьці вельмі даўно жыў-быў у нашай мясцовасці спрактыкаваны гаспадар. Такі ўжо чалавек удаўся, што і хвіліны спакойна не мог пасядзець, увесь час нешта рабіў. Людзі ўжо і пасмейваліся з яго:

— Што ж гэты ты, Ахрэм? Няхай бы хоць гадзіну якую перадыхнуў.

— А я як на цяжкай працы стамлюся, дык лягчэйшую пачынаю рабіць.

— І ў каго ты такі працавіты ды кемлівы ўдаўся?

— У дзеда.

— А чаму не ў бацьку?

— Не, у дзеда, бо менавіта ён мяне ўзгадаваў. Ён мяне усяму навучаў, дарогу ў жыццё даваў.

— Пазайздросціш табе... Такіх людзей не знойдзеш.

— Эх, браточкі, ды і вы такія ж, толькі сябе збоку не бачыце.

— І дзеці ў цябе, Ахрэм, да працы ненатольныя. Колькі памятаем, столькі яны табе дапамагалі.

— Гэта чыстая праўда, бо я іх прывучваў працаваць з калыскі. Не перагружаў работай, а даваў такую, якую маглі выканаць. Мала-памалу і мае сыночкі сталі мне вернай дапамогай.

— Што падмогай, то падмогай. Колькі не шукай, а такіх хлопцаў не знойдзеш.

— Ды і вашы дзеці не горшыя.

— Нашы таксама слухаюцца і дапамагаюць, але твае намнога болей. А косяць як... паглядзець толькі і застаецца, як яны адзін за адным ідуць, а ты наперадзе.

— Не, апошнім часам сам першы не іду. Сыны мяне ашчаджаюць і пакідаюць ззаду. Першым Сцяпан валіць, за ім Іван, за Іванам Фёдарка, мой малодшанькі, Шарачок. А я ўжо за ім...

— А чаму Шарачок?

— Гэта мы яго так паміж сабой завём. Вочы ў яго не чорныя, не блакітныя, а шэрыя. Таму і Шарачок...

Адным словам, зайздросцілі Ахрэму вяскоўцы, што сыны ў яго працавітыя, што сам ён няўломак, і за гэтым усім забываліся, што і жонка ягоная — Адэля — адыгрывала ва ўсім гэтым не апошнюю ролю.

Хлопцы падрасталі, а бацькі непрыкметна старэлі. Сыны нават здзівіліся, калі заўважылі, што бацька іхні ўжо сівы.

— Тата, а чаго гэта? — нібы малыя, задалі пытанне.

— А гэта, сыночкі, гады свае сляды пакідаюць.

— Яны ўсіх так сярэбраць?

— Так, перад імі ніхто не ўтрывае. Якім бы асілкам хто ні быў, якім бы храбрым ці трывалым, але перад імі не ўстаіць. Яны заўсёды сваё возьмуць. Спачатку не так, а потым накінуцца, прыгнуць галаву ніжэй, горб на спіне з'явіцца, ногі-рукі трымцець стануць. Потым і смерць запануе...

— Што ты, тата, кінь пра такое і думаць.

— Пажэніцеся, свае сем'і пазаводзіце, потым і пастарэеце, а вашы дзеці на змену прыйдуць. Так спакон вякоў цягнецца. Нічога людзі не могуць зрабіць, бо гэта не ў іхняй уладзе. Усю ад Бога, дзеці, на зям-

лі і на ўсіх нас ягоныя законы размяркоўваюцца.

Не часта пра такое гаварыў Ахрэм з сынамі, але цяпер ужо тыя болей увагі удзялялі бацькам, а працаваць дык увогуле амаль нікуды не бралі.

— Сядзіце дома, па гаспадарцы калупайцеся, а ў полі мы ўсё самі паробім. Няма чаго вам туды сунуцца. Такія ўжо з вас памочнікі...

Ахрэм спачатку крыўдаваў, але Адэля супакоіла яго. Болей таго, яшчэ і слушную параду дала:

— Зямлю ўсю, чалавеча, трэба зараней падзяліць, каб пасля нашай смерці яны не надумаліся за чубы хапацца ды людзі каб з іх не смяяліся.

— Нашы не такія.

— Хто яго ведае, што можа здарыцца. На людзей, кажуць, часінамі находзіць, таму не трэба цягнуць. Давай, Ахрэмка, збяром сыноў вечарам ды падзелім усё пароўну, пакуль мы жывыя і пры памяці.

На тым і парашылі. Селі на прызбе і сталі чакаць хлопцаў з поля.

Павячэралі усе разам, і бацька адразу ж распачаў гамонку:

— Ведаю, сыночкі, што натаміліся вы моцна, што не да гэтага вам зараз, але мы з матуляй параіліся і рашылі лепей усё зараней зрабіць, каб потым позна не было.

— Не разумеем, — пераглянуліся сыны.

— А вы паслухайце, не перабівайце. Хочам мы зараз увесь наш нажытак на вас траіх падзяліць. Таксама і зямлю падзелім, каб потым у вас ніякіх спрэчак-боек не ўзнікала.

— Ды мы...

— Не спяшайцеся перабіваць. Вы выдатна ведаеце, што наша зямля, сенакос, ды палоска лесу цягнецца, нібы пуга якая, на тры вярсты ў даўжыню і на сорак сажняў у шырыню. Таму цяжка дзяліць яе, але...

— Неяк пареб'ёмся.

— Але думаю, сыночкі, — працягваў бацька, — што не пакрыўджу вас.

Сыны маўчалі, прыціхлі і бацькі. Потым гаспадар запытаўся:

— Чаго замаркоціўся, Шарачок?

— Хачу вам выйсце падказаць, але баюся, што пакрыўдзіцеся.

— Гавары, сынку, ніхто тут крыўдзіцца на цябе не будзе. Мы ж сабраліся, каб параіцца.

— Тут, тата, такая справа. Давайце, калі вы ўжо дзяліць задумалі, то не рэжце на кавалкі, а падзяліце ўздоўж. Як яно ёсць, так і дзяліце.

— Але ж вузенька, сынку, атрымаецца.

— Так, — пагадзіліся і астатнія, — павярнуцца канём не будзе як...

— Затое без крыўды, без нянавісці. Лічу, што толькі так можна падзяліць. І марокі ніякай, і сварыцца мы не будзем.

— Шарачок праўду кажа, па яго, тата, і дзялі. Нам жа зямля дастаецца, не камунебудзь іншаму.

Так і падзяліў Ахрэм усю сваю зямлю, сенажаць ды лес, удоўжкі. Атрымалася кожнаму недзе ўсяго па дзесятку сажняў, затое ў даўжыню — на чатыры вярсты, ажно стомішся, пакуль да канца дойдзеш. Браты яшчэ і жэрабя пацягнулі, каму які надзел, і Шарачок апынуўся паміж братамі.

— Мы за табой прыглядваць будзем, — пажартаваў старэйшы брат.

— Каб не хітраваў, — дадаў сярэдні.

— Жывіце, дзеткі, дружна, — папрасіла матуля. — Нам ужо мала засталося, то вы не паганьце наша імя, спраўна зямлю апрацоўвайце, каб людзі на вас ніколі пальцамі не паказвалі і не смяяліся.

Прайшло колькі часу. Памёр Ахрэм, пахавалі сыны і сваю матулю. Самі ўжо сем'ямі абзавяліся, дзеці ў іх пайшлі. Зямлі, здавалася, і дастаткова ад бацькі перапала, але, калі на тыя раты раскінуць, то ледзьве канцы з канцамі зводзілі. Ды не губляліся. Працавалі дзе толькі маглі, падзарабляліся. Рыбу хадзілі лавіць, звяроў біць. І з мясам былі, і з пер'ем. Жанкі іхнія ды дзеці ў лес па грыбы-ягады бегалі. Так і ішла справа. Былі, як кажуць, радасці, але былі і ліхія часіны. Такое яно жыццё, каб людзі надта не расслабляліся, памяталі пра тое, што нехта ўладарыць над іхнімі лёсамі.

Шарачку пашанцавала крыху болей за братоў, бо ў яго, прама на палетку, забруілася крыніца. І вось як гэта здарылася.

Неяк узяў ён свайго старэйшага сыночка на ніву, каб той яму хоць коніка павадзіў. Нічога, што слабы памочнік, але ж намнога весялей, чым самому, унурыўшыся, шчыраваць. Хадзіў-хадзіў хлапчук і, ведама ж, стаміўся і стаў прасіцца адпачыць.

— Ідзі, сынку, вунь пад той кусцік, што наперадзе, і там пасядзі, адпачні. Я яшчэ пару кругоў прайду і да цябе далучуся. Палуднаваць будзем.

Яначка пакіраваў да таго кусціка, прысеў і пачаў корпацца ў пясочку. Ведама ж

— дзіця. Бацька хадзіў за сахой, а хлопчык гуляў і раптам закрычаў:

— Татка! Татка!

Шарачка як падкінула! Падумаў, што, можа, на гадзюку напароўся ці яшчэ што страшнае здарылася. Паляцеў, нібы на крылах, а хлопчык усё не пераставаў крычаць:

— Татачка! Татачка!

Ужо бацька зусім блізка. Падляцеў, слова сказаць не можа, так перапалякаўся ды засопся, толькі прыціскаў сына да сябе.

— Што тут, Яначка? Што, сынку? Я з табой...

— Глядзі, што я там знайшоў...

— Дзе?

— Пад самым кусцікам...

Гаспадар упёрся поглядам пад кусцік, але нічога там не заўважыў.

— Ты лепей паглядзі, — сказаў Яначка, выкруціўся ад бацькі і падскочыў да кусціка. — Глядзі...

Шарачок заміргаў вачыма.

— Вада? Адкуль яна тут?

— А яна, татка, з зямлі выбівае...

— З зямлі? Сыночак, Яначка, дык гэта ж крынічка! Вада сцюдзёная заўсёды ў нас пад рукой будзе. Не трэба з дому браць і потым цёплую піць.

Бацька з сынам выбралі вольны час, прыехалі спецыяльна да крынічкі, расчысцілі яе дно, паглыбілі яго, а вакол збудавалі дубовы зруб. Павесілі на кусце конаўку, каб было чым піць ваду, адтуль усё і павялося.

Працуюць, працуюць сяляне ды сялянкі, а потым нехта разагнецца і прамовіць:

— Пайшлі да Шаракоўшчыны. Там вадзіцы пап'ём...

Так тая крынічка і служыла людзям. Доўгія гады, нават стагоддзі гэта ўсё працягвалася. Ніколі да яе не зарастала сцяжынка.

Дзякуючы таму, што некалі маленькі Яначка пакорпаўся ў пясочку і дапамог вадзе выбіцца наверх, бруілася тут чысцюткая крыніца. Поле тое людзі называлі парознаму, хто Шаракоўшчынай, хто Шаркаўшчынай. Так і вялося. Таму і ў нашы дні можна пачуць усялякія назвы, але лепей за ўсё гучыць Шаркаўшчына, хоць мясцовыя жыхары прамаўляюць і Шаркоўшчына.

КАЗАКІ

Гэтыя падзеі здарыліся пры прыгоне. Паны-памешчыкі лютавалі, служкам сваім над сялянамі здзекавацца дазвалялі, але і апошнія, часам, не вытрымлівалі — паўставалі. Тады ўжо помсцілі да апошняй кроплі крыві, нікога не шкадавалі — ні паноў саміх, ні іхніх жонак, ні дзяцей.

У нашых мясцінах быў адзін надзвычай люты пан. Звалі яго Звяздоўскі. Хто яго ведае, дзе карані радаводу гэтага памешчыка былі. Адно людзі ведалі дакладна: што прыехаў ён сюды ці то з польскай, ці то з рускай службы. Як пасяліўся, дык адразу пачаў свае парадкі наводзіць. Ледзь толькі што не па-ягонаму атрымаецца, то загарлае:

— Слугі! Да мяне!

Тыя ляцяць, баяцца, каб на іх саміх панскі гнеў не выліўся.

— Кіруйце па палетках, па нівах-сенажацях ды назірайце, як мужыкі працуюць. Не шкадуйце іхніх спін, на жальцеся над жонкамі ды дзецьмі, бо яны такія самыя мужыкі, не паспееце адвярнуцца — яны назло што-небудзь учыняць.

— Выканаем, шаноўны пане, — адказвалі тыя і імчалі выслужыцца перад лютым гаспадаром.

Сам Звяздоўскі звычайна заставаўся ў маёнтку і там загадваў катаваць самых непаслухмяных вяскоўцаў. Сам абавязкова пры пакаранні прысутнічаў ды яшчэ і здзекаваўся:

— Чаго ж ты, родненькі, крычыш? Ты спявай, спявай!

А двум здаравенным служкам, якія за ім, нібы здані, паўсюдна хадзілі і ўсе ягоныя загады выконвалі, казаў:

— А вы яму дайце добра. Дайце, каб мала не падалося.

Тыя стараліся. Так давалі, што за якіх пару хвілін душа з беднага сялянскага цела адлятала высока, у недасягальную для Звяздоўскага мясціну, бо, каб мог, то ён бы і душы людскія катаваў.

Так працягвалася, казалі, гадоў дваццаць. Сяляне трывалі, маліліся, каб Бог забраў хутчэй з гаротнай зямлі гэтага вылюдка, але Усявышні не надта спяшаўся выконваць людскія просьбы: ці то якія справы яшчэ больш неадкладныя былі, ці то не меў сілы звесці яго з зямлі. Як бы там ні было, але памешчык адчуваў сябе на гэтай самай зямлі галоўнай істотай.

І вось неяк вяскоўцы з аднае невялічкае вёсачкі сабраліся ў прыцемках (баяліся днём, каб хто з панскіх паслугачоў не

заўважыў ды не падслухаў, а потым гаспадару не данёс) і давай раіцца, што далей рабіць, бо болей так жыць не маглі.

— Няхай ужо лепей усіх, разам з жонкамі і дзецьмі, закапаюць жывымі ў зямлю, чым так пакутаваць.

— Да каня ці да вала намнога лепей адносяцца, чым пан да нас. Мала таго, што лупцуюць кожны дзень, дык на сваю сям'ю не даюць магчымасці папрацаваць.

— На памешчыка гнешся, а сваім дзецям і з'есці няма чаго.

— Трэба, браткі, нешта рабіць.

— А што тут зробіш?

Усе замаўчалі. Ведалі, што далей трываць нельга, але і пэўнага выйсця не бачылі. І тут раздаўся адчайчы голас:

— Чаго сцішыліся? Што, зноў пагамонім і разыдземся, а ён будзе па-ранейшаму над намі здзекавацца?

— Чаго ты крычыш?

— Бо надакучыла маўчаць!

— То прапануй.

— Я і хачу сказаць — давайце бунтавацца!

— Не выйдзем на працу, ці што?

— Не, у лес падамося.

— А сем'і?

— З сабой забяром.

— А жывёлу: коней, каровак, авечак?

— А многа іх у нас? Што тычыцца будынкаў, то іх спалім, каб у ліхія рукі не дасталіся. А ў лесе... У лесе не будзем сядзець спакойна, а прыгадаем панам ды падпанкам, як яны з нас здзекваліся.

— Во гэта справа! На такое мы згодны!

Калі памешчыку данеслі, што згарэла цэлая вёска і жыхароў нідзе няма, дык ён, асабліва не задумваючыся, адказаў:

— А туды ім і дарога.

Але праз некаторы час пачаў шкадаваць, што не разабраўся, не даў веры, бо ўсе навакольныя маёнткі згарэлі. Паноў-падпанкаў мноства перабілі, перавешалі. І ягоных слуг амаль не засталося. Калі Звяздоўскі пачынаў патрабаваць, каб сяляне больш спраўна працавалі, то сяляне ўжо не схілялі моўчкі галовы, адусюль чуліся, праўда, яшчэ не ў поўны голас, гнеўныя галасы:

— Пачакай, пачакай, і на цябе яшчэ казакі знойдуцца...

І знайшліся такія. Падпільнавалі лясныя жыхары ліхога пана, калі той ля рачулкі прагульваўся. Нават і піскнуць не паспеў, як ужо калыхаўся на высокай асіне.

Лягчэй стала сялянам жыць, бо тыя паны, якія пазней сюды прыязджалі, ужо не так люта адносіліся да людзей.

А жыхары той вёсачкі, якія ўцяклі, так і засталіся жыць сярод адвечнага лесу, а пра іхняе адважнае мінулае нагадвала толькі дзіўная назва, якая назаўсёды засталася з імі, — Казакі.

КУКАЎКА

На месцы, дзе цяпер наша вёска стаіць, даўней раслі адвечныя, таўшчэразныя дубы, якія здзіўлялі падарожных ды праезджых людзей сваёй таўшчынёй і вышынёй. Як ні дапытваліся мы, у чым прычына, сяляне часцей за ўсё маўчалі, а калі і адказвалі, то з гэтых адказаў нічога нельга было зразумець, адчувалася нейкая недамоўленасць.

Найбольш кемлівыя пачыналі дапытвацца цішэй:

— Калі не хочаце, то і не кажыце, раз вы ўжо гэтую таямніцу нам адкрыць баіцеся. Дубы вашы ад гэтага меншыя не зробяцца, і вам горай не стане...

— Стане, — выдыхалі тады местачкоўцы.

— Незразумела гаворыце...

— Справа ў тым, што мы свае дубы... слязьмі і крывёю пастаянна паліваем...

— Слязьмі і крывёю?

— Так. Толькі паблізу ад нашых мясцін нікому пра тое, што зараз пачуеце, не распавядайце, каб наш памешчык не даведаўся, бо тады канец усім нам будзе.

— Што, такі суровы?

— Нават не тое слова...

І расказалі звычайна адно і тое ж паданне, ці, дакладней, відаць, гісторыю.

Усімі навакольнымі абшарамі валодаў мясцовы памешчык. Мала таго, што ён быў люты і сквапны, дык яшчэ і сляпы, праўда, не ад нараджэння. З тым вылюдкам спрабаваў было адзін адчайны чалавек разлічыцца, ды не атрымалася да канца, толькі зроку ваўкалака пазбавіў.

Была ў таго хлапчыны каханая. Прыгожая дзяўчына, працавітая. Не адзін на яе заглядаўся, але яна да пчаляра мясцовага хінулася, да Мартына. Так яны і сябравалі, так і хадзілі ўсюды ўдваіх. Збіраліся пажаніцца. А пан наш, ён тады таксама малады быў, увёў такі закон: дзяўчына, якая замуж выходзіць, павінна першую ноч не з мужам правесці, а з памешчыкам. І людзі выконвалі і маўчалі, бо паспрабуй голас падаць — галава на плячах не ўтрымаецца.

Калі пачуў пан, што Мартын жэніцца і бярэ сабе ў жонкі тую самую прыгажуню, якую ён даўно на прыкмеце меў, то ажно зарагатаў і нагамі затупаў ад задавальнення:

— Нарэшце... Нарэшце... Значыцца, сёння я з ёю ўсю ноч пацешуся...

Ягоны рогат падтрымалі шматлікія слугі, і панесліся дзікія крыкі ды рогат за вокны жахлівага палаца.

— Збегайце, папярэдзьце яе, каб не марнавала час, крыху раней прыходзіла. Шапніце, што я даўно жадаю яе. Калі будзе мяне слухацца, дык багатыя падарункі атрымае. Зямлі дам, лесу... Азалачу. Так і скажыце.

Слугі пабеглі, а з памешчыкам застаўся толькі верны войт.

— Што вы, пане? Навошта ёй гэтулькі багацця даваць?

— А хто дае?

— Дык вы ж...

— Я? Эй, войце, адно слова — сказаць, а зусім іншая справа — выканаць. А ты падумаў...

— Было, пане.

Ізноў абодва зарагаталі. Але смяяліся яны, як аказалася, рана. Неўзабаве прыбеглі слугі і яшчэ ад парога залапаталі наперабой:

— Пане... Пане... Не слухаецца...

— Хто? — ажно прыўстаў гаспадар.

— Дзяўчына. Сказала, што і чуць пра вас не жадае, не тое што з вамі спаць.

— Прывалаклі б сюды адразу!

— Там гэты... Як яго...

— Мартын? І вы збаяліся?

— Ён біцца пачаў.

— Звязаць і абодвух да мяне ў пакоі! Я ім пакажу, ганарліўцам, як мае загады не выконваць! Яны ў мяне паскачуць!

На гэты раз колькасць слуг была значна большай, і праз некаторы час Мартына з каханай прывалаклі ў палац.

— Дык, кажаш, са мной спаць не жадаеш?

— Не!

— Зараз я пры тваім жаніху зраблю сваю справу і ніхто мне не перашкодзіць, — прамовіў пан і падаўся да дзяўчыны.

Тая адчайна баранілася, крычала, але нічога зрабіць не змагла... Гаспадар, задаволены, узняўся і прамовіў:

— Вось і ўсё. Адпусціце іх.

Маладых адпусцілі, але, як аказалася, зрабілі гэта зарана, бо Мартын выхапіў здаравенную паходню з рук аднаго са слуг і скочыў да памешчыка. Задушыць пана ён не паспеў, але здолеў выпаліць злыдню вочы. І сам загінуў у палацы. А ягоная каханая ўцякла.

Пасля таго як аслеп, памешчык прызвычаіўся хадзіць на паляванне. Дзіўна, але страляў трапна, па слыху.

Так ён паляваў на птушак, а да людзей ужо не чапляўся, за імі сачылі падпанкі. Але неяк да яго прывялі жанчыну і сказалі, што гэта тая самая каханая Мартына.

Усхадзіўся пан:

— На гэты раз ты ў мяне паскачаш!

— Не палохай. Не баюся я цябе, — горда прамовіла жанчына.

— Пабачым!

— Ты ўжо не пабачыш.

Загадаў памешчык той жанчыне залезці на дуб як мага вышэй і кукаваць, а сам адышоўся на патрэбную яму адлегласць і стрэліў у тым напрамку. Жанчына мёртвай упала з дуба.

Але знайшлося ліха і на памешчыка. Аднаго разу, калі ён павёў у лес сваю чарговую ахвяру, здаравенная галіна дуба ўпала прама на злыдня. Там ён і загінуў, ніхто яго не даставаў.

Мясцовасць тую назвалі Кукаўкай. Пазней там вёска ўзнікла, наша вёска.

ЛУЖКІ

Пад час вайны 1812 года праз нашы мясціны баявыя дзеянні пракочваліся двойчы: першы раз, калі рускія адступалі, а другі раз, калі ўжо адступалі французы. Дык ад таго самага першага разу засталася назва невялічкага паселішча, якое ўзнікла якраз там, дзе стаяла вялізнае войска Напалеона. Паслухайце, як усё адбывалася.

Пра тое, што пачалася вайна, мясцовыя жыхары даведаліся са спазненнем. Па-ранейшаму займаліся гаспадарчымі справамі, ды неяк і не заўважылі, што глухія іхнія мясціны, куды і за месяц ніякі вершнік ці экіпаж не праязджаў, зрабіліся больш ажыўленымі. Сталі з'яўляцца вайсковыя вершнікі, якія, праўда, не гаманілі ні з кім, а толькі пілі, разгарачаныя, ваду са сцюдзёнай крыніцы і праз імгненняў колькі да слыху даносіўся звонкі пошчак капытоў. Ніякіх буйных атрадаў ці партый тут пакуль што не наглядалася. Усе тыя ганцы былі адзіночныя.

Сядзелі неяк вяскоўцы на прызбе і гаманілі. Дзень яны адпрацавалі, нарабіліся ўволю, і зараз быў самы той момант, калі

можна было даць адпачынак стомленаму целу. Гаворка лянотна перакочвалася з адной тэмы на другую, заціхала і зноў ускіпала. Мужчыны разыходзіцца не спяшаліся. Не надта часта выпадалі такія хвіліны, каб сабрацца разам ды перакінуцца словам-другім. Вось тут і прагучала нечаканае пытанне:

— А што гэта вершнікі ўсё ездзяць праз нашу вёску?

— Ага, мае дзеці кароў пасвілі, дык гаварылі, што ў іх коннік дарогі пытаўся...

— Наш ці што?

— Не тое, каб наш, але расеец, бо дзеці ж зразумелі пытанне.

— Нешта тут не тое робіцца... Каб было ў каго запытацца...

— У нас тут і людзей такіх няма.

— Чаму няма? Ёсць.

— Хто?

— Ды салдат... Той, што некалі да нас прыбіўся пасля заканчэння службы.

— Думаеш, ён нешта ведае?

— Ён жа былы вайсковец, можа, пра нешта і здагадваецца...

— А дзе ён зараз?

— Ля хаты корпаецца. Калі я сюды ішоў, то вітаўся з ім, — адказаў адзін вясковец.

Натоўп паволі пасунуўся ў накірунку патрэбнай сялянам хаціны. Сапраўды, салдат яшчэ не закончыў сваю працу і падладжваў плот. Заўважыўшы людзей, кінуў усё і стаў чакаць.

— Слухай, братка, — звярнуўся да яго той самы селянін, які задаваў пытанне пра вершнікаў, — чаго гэта вершнікі тут так часта насіцца сталі?

— Каб жа я ведаў...

— Бачыш, і ён нічога не ведае, — азваліся астатнія.

— Але ж ты ў войску служыў. Павінен хоць нешта адчуваць адносна ўсяго гэтага...

— Адчуваць? Ды вы сядайце, чаго стаіце. Паспрабуем разам разабрацца, што тут магло здарыцца.

— А ты, чалавеча, мяркуеш, што нешта здарылася?

— Хутчэй за ўсё. Ганцы проста так не сталі б насіцца.

— І якая можа быць прычына? — асцярожна запытаўся стары дзед.

— Вайна, можа, дзе пачалася, — выдыхнуў салдат і зацягнуўся едкім дымам з глінянай трубачкі.

— Вайна?

— Яна, браце. Калі дзе якая бітва ці войска ідзе, то веставых-коннікаў не злічыць.

— З кім жа вайна ў нас можа быць?

— Ды ці мала з кім. Ім не сядзіцца, а салдацкі гаротныя кроў сваю праліваюць.

— Ракою... — прамовіў салдат і вочы ягоныя затуманіліся, відаць, прыгадаў сяброў-таварышаў, якія засталіся на шматлікіх палях бітваў.

— Як жа ўсё ж даведацца?

— Калі сюдою войскі пойдуць, то адразу даведаемся, а калі не, то пашанцуе.

— Чаму?

— Бо спаляць, вынішчаць усё. Там жа не сотня-другая людзей пройдзе, а дзесяткі тысяч. Можаце ўявіць, што тут будзе рабіцца...

— А што ж нам рабіць, салдат, каб уратавацца?

— Давайце зараз усе разам і вырашым. Я прапаную перайсці жыць куды ў іншае месца. Самі выратуемся і сем'і свае выратуем. Жывёлу пазабіраем, а ўсё, што ў хацінах лепшага ёсць, пахаваем. Можа, будынкі не будуць паліць, а калі і спаляць, дык адбудуем. Галоўнае, каб людзі жывыя засталіся.

— Ведама што. Так і зробім.

Перабраліся людзі пасля тае размовы жыць у глухую пушчу. Месца выбралі такое, што і сам чорт не знайшоў бы, не тое, што чужынцы. Паступова супакоіліся, прызвычаіліся. Есці было што, а да астатняга сялянам не прывыкаць. Потым нехта данёс чутку, што вайна пачалася. Нават у пушчу цягнула дымам.

— Усё навокал паляць. Добра, што мы здагадаліся ўцячы, а то і нам такое ж было б.

Паслалі разведчыкаў праверыць, ці ёсць вораг на месцы былой вёскі. Тыя неўзабаве вярнуліся і сказалі, што агромністы лагер стаіць якраз там, дзе некалі любілі касіць сена, — на лугах. Калі французаў прагналі, то вяскоўцы выбраліся з лесу, але пасяліліся не на старым паселішчы, а там, дзе быў лагер непрыяцеля, бо надта многа ўсялякага дабра, патрэбнага ў гаспадарцы, пакідалі там французы. А вёску тады назвалі Лужкамі, што між лугоў стаіць.

ЛЯДНІКІ

Жылі-былі дзед і баба. Так ужо здарылася, што пабраліся яны тады, калі ў дзеда жонка памерла, а ў бабы той муж сканаў.

Таму было ў іх двое дзяцей, дзве дачкі: бабіна — Насцёна і дзедава — Алёна. Яны імкнуліся кожны свайму дзіцяці дапамагаць, і неяк незаўважна баба пачала ў хаце гаспадарыць. Дзедава дачка стала ёй упоперак горла, з-за таго і сварыліся, бо дзед ведаў сваю Алёну, што ніякая яна не лайдачка, а ўжо прыгажуня — то пашукаць яшчэ такую ж.

Баба ўпікала дзеда:

— Як ты сваю дачку любіш. Хвіліны не пройдзе, каб не пахваліць. Але было б каго.

— А то не?

— Выросла нейкая караўка...

— На сваю паглядзі лепей.

— Мая самая што ні на ёсць прыгажуня!

— Ага, толькі людзей надвячоркам і палохаць такой прыгажуняй...

— Затое мая працавітая! Вось!

— Я ж табе ўжо казаў, якая яна працавітая.

— Давай тады праверым!

— Давай.

Неяк, паспрачаўшыся, вырашылі дзед з бабай адправіць дачок у лес, па чарніцы, і паглядзець, хто больш спраўны да працы.

Павячэралі і ляглі спаць. Але гаспадыня яшчэ доўга не спала, было чуваць, як яна пра нешта шапталася з Насцёнай. Суцішыліся толькі тады, калі дзед спецыяльна кірхануў.

З самага рання гаспадар сказаў дзяўчатам:

— Пойдзеце па чарніцы ў лес. Хочам паглязець, хто з вас больш увішная да працы, а то ў нас спрэчкі з-за гэтага ўзнікаюць. Праверым раз і назаўсёды.

— Пойдзем, — адказалі дочкі і моўчкі сталі збірацца.

Дзіўна было, што Насцёна, якая звычайна супрацівілася, аднеквалася, тут маўкліва пагадзілася.

Стары, праўда, нічога не сказаў, толькі глянуў на Алёну, маўляў, дакажы, даражэнькая, не падвядзі. Дачка прыжмурыла вочы і ўсміхнулася. Гаспадару адразу ж стала лягчэй на сэрцы, бо дачка зразумела ўсё правільна. Гаспадыня, дык тая прамовіла, да Насцёны звяртаючыся:

— Не забудзь, дачушка, што я табе вечарам казала...

— Не, матуля, усё памятаю і ўсё так зраблю.

Пайшлі дочкі ў лес і зайшлі даволі далёка. Туды, куды не хадзілі вясковыя жанчыны браць чарніцы, бо баяліся, каб лесавік іх там не закружыў ці каб якое іншае ліха не здарылася. Гэтым жа двум хацелася натрапіць на нябраныя ягады.

Нарэшце знайшлі такія ягады — буйныя, як боб, толькі і бяры. Алёна як узялася, дык адразу ў пасудзіне палова стала, а Насцёна — адну ягадзіну ў рот, а адну ў пасудзіну.

Час ляцеў непрыкметна, і недзе адразу пасля поўдня Алёна сказала:

— Мне ўжо час дамоў вяртацца.

— Чаго гэта так рана?

— Ды браць няма куды болей. Поўную каробку сваю набрала, трэба вяртацца.

Тут Насцёна зразумела, што прайграла, але прыгадала тое, чаму яе навучыла матуля.

— Не спяшайся, давай пасядзім крыху. Адпачнём і потым дамоў рушым, усё роўна яшчэ ранавата.

— Давай, — пагадзілася Алёна.

Каб жа яна ведала, што задумала зласліўка Насцёна, дык ніколі на такое не пагадзілася б. Селі яны ля сцяжынкі і вырашылі падрамаць якіх з паўгадзінкі. Алёна заснула, а Насцёна лупянула яе па галаве цурбалкам і зарагатала:

— Вось і ўсё табе! Цяпер не будзе выхваляцца твой татачка, што ты намнога лепшая за мяне. Не будзе скаліць зубы, што я лайдачка ды няўмека. Цяпер табе зямля сырая вочы закрые...

Мала гэтага, перасыпала ягады з Алёнчынай каробкі ў сваю і паджгала дахаты.

Маці яе ўзрадавалася:

— Вось бачыш, якая мая дачушка?

— А дзе ж Алёна, — пачаў дапытвацца бацька.

— Ды яна са мной не хадзіла. Асобна падалася, відаць, каб мяне перагнаць. Толькі не атрымалася, я больш спраўнай аказалася...

Паснулі ўсе ў хаце, а стары гаспадар не спаў, ніяк не ішоў да яго сон, усё здавалася, што нешта тут не тое. Але дзе ж ты станеш шукаць дачку, калі навокал бяскрайнія лясы? Прачнуўся на досвітку і ў двор выскачыў, ды нікога не было. Так і прапала яго Алёна.

Але Бог злітаваўся над ёю, дапамог дзяўчыне ў цяжкую хвіліну. Не забіла яе зласліўка да смерці, толькі моцна аглушыла. Апрытомнела дзяўчына, але ўзняцца не магла, толькі застагнала ціхенька. І тут пачула нейкі голас:

— Хто ж цябе так? Давай я табе дапамагу.

Болей нічога не пачула дзяўчына, бо страціла прытомнасць.

Прыйшла ў сябе ў невялічкай, чысцюткай хацінцы. За сцяною было чуваць, як стогне-галосіць вецер, хлюпоча дождж.

— Дзе гэта я?

— У мяне ў гасцях, — пачуўся зычны голас, і дзяўчына ўбачыла здаравеннага чалавека са светлай бародкай, вочы якога іскрыліся смехам.

— А ты хто?

— Я? Я — Змітрык. Жыву ў гэтай глухамані адзін. Калі быў яшчэ зусім малы, дык пошасць вымарыла ўсю нашу вёску і, злякаўшыся, збег я, куды вочы глядзелі. Неяк тут апынуўся. Далей дарогі не мог знайсці, ды, шчыра кажучы, і не шукаў. Застаўся. Так і жыву. Прызвычаіўся да лесу. Цяпер і не ўяўляю сябе без яго. А ты доўга не адыходзіла, — нечакана перавёў гаворку Змітрык. — Заставайся тут, са мной. За жонку мне будзеш.

Так і вырашыліся ўсе пытанні ў жыцці дзяўчыны. Сталі яны ў лесе жыць. Дзеці ў іх пайшлі. А калі старэйшы хлопчык падрос, то Алёна запрасілася ў мужа:

— Давай сходзім да той вёскі, адкуль я родам. Хачу глянуць, ці жывы тата, ды і людзям праўду трэба расказаць.

— Давай. З раніцы пойдзем, да вечара вернемся назад.

Так і зрабілі. Падышлі яны да знаёмай хаціны, і хлопчык зайграў на дудачцы:

Іграю, дзедка, памалу,
Каб не закрануць у мамкі рану,
Бо яе сястрыца ледзь не загубіла —
Цурбалкам па галаве біла...

Як пачуў гранне гаспадар, дык адразу ж да іх выскачыў. Забралі яны яго з сабой жыць. Стары ўсё дапытваўся, як жа гэта яны ў лесе выжылі. На што яму Змітрык адказваў:

— Мы ляда здаровае раскарчавалі...

Тады дзед толькі і паўтараў:

— Ляднікі вы мае... Ляднікі вы мае дарагія...

Так тое паселішча пасярод лесу дрымучага і назвалі потым.

Друкуецца па кн.: Н е н а д а в е ц А.М. Віцебшчына. Назвы населеных пунктаў паводле легендаў і паданняў. Мн., 2000. С. 438—453.

З гісторыі населеных пунктаў

ШАРКАЎШЧЫНА, гарадскі пасёлак, цэнтр раёна, на р. Дзісна, за 197 км ад Віцебска. Чыгуначная станцыя на лініі Крулеўшчына — Друя. Вузел аўтадарог на Браслаў, Глыбокае, Дзісну, Міёры.

У пісьмовых крыніцах упершыню ўпамінаецца ў 1503 г. як маёнтак Зяновічаў у складзе ВКЛ. Пазней уласнасць Сапегаў, Дамброўскіх, Лапацінскіх. У 1753 г. князь Аляксандр Сапега, ваявода Полацкі адкупіў Шаркаўшчыну ў Дамброўскіх і прадаў яе ваяводзе Брэст-Літоўскаму Мікалаю Фадзею (Тадэвушу) Лапацінскаму, які ўжо валодаў Ёдамі. У маёнтку 14 700 дзесяцін зямлі, 2000 мужчынскіх душ.

Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у складзе Расіі, мястэчка Дзісенскага павета Мінскай, з 1842 г. — Віленскай губерні. У 1861 г. сумежна існавалі 2 мястэчкі — Старая Шаркаўшчына і Новая Шаркаўшчына. У 1863 г. адкрыта народнае вучылішча (настаўнік Іван Насевіч). У 1886 г. у Новай Шаркаўшчыне каля 500 жыхароў, малітоўны дом, царква, 6 крам, карчма. У Старой Шаркаўшчыне каля 150 жыхароў, царква, 2 капліцы, 2 карчмы. У пачатку XX ст. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета. Размяшчаліся непадалёку адзін ад аднаго 3 населеныя пункты: мястэчка Шаркаўшчызна, каля 160 жыхароў; сяло Старая Шаркаўшчызна, 134 жыхары, 76,5 дзесяціны зямлі, і маёнтак Багуцкіх Старая Шаркаўшчызна, 7 жыхароў, 333 дзесяціны зямлі. З 1921 г. у складзе Польшчы, цэнтр гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 1 дом, 17 жыхароў. З 15.1.1940 г. цэнтр Шаркаўшчынскага раёна Вілейскай вобласці, з 12.10.1940 г. гарадскі пасёлак. У Вялікую Айчынную вайну з 30.6.1941 г. па 1.7.1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія загубілі ў Шаркаўшчыне больш за 800 жыхароў. З 20.9.1944 г. у Полацкай, з 18.1.1954 г. у Маладзечанскай, з 20.1.1960 г. у Віцебскай абласцях. З 17.4.1962 г. да 13.7.1966 г. у Міёрскім раёне, потым зноў цэнтр раёна. У Шаркаўшчыне дзейнічаюць кансервавы завод, хлебазавод, малочны

завод, камбінаты будаўнічых матэрыялаў і кааператыўнай прамысловасці, 2 сярэднія, спартыўна-юнацкая, музычная школы, дзіцячая школа мастацтваў, 4 дашкольныя ўстановы, 2 масавыя бібліятэкі (дзіцячая і для дарослых), паліклініка, бальніца, Дом быту, гасцініца, Дом сувязі, Дом культуры, цэнтр рамёстваў, кінатэатр, аграметэастанцыя, універмаг, шэраг іншых магазінаў і гадлёвых кропак, некалькі помнікаў гісторыі і культуры. На 1.1.2003 г. каля 8 тыс. жыхароў.

АБАЛОНЬ, хутар у Станіславоўскім сельсавеце, на р. Дзісна. У пачатку XX ст. пад назвай Абалонь у Пастаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні знаходзілася побач 2 паселішчы: хутар, 6 жыхароў, 20 дзесяцін зямлі, і цагельны завод, 8 жыхароў, 10 дзесяцін зямлі. У 1921 г. калонія Пастаўскай гміны Дунілавіцкага павета Віленскага ваяводства, 2 дамы, 10 жыхароў. На 1.1.2003 г. 2 двары, 3 жыхары.

АГАЛЬНІЦА, вёска ў Станіславоўскім сельсавеце, на р. Дзісна. У пачатку XX ст. у Пастаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 110 жыхароў, 192 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Пастаўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 29 дамоў, 137 жыхароў. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 20 жыхароў.

АДАМАВА, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце. Назва ўтворана ад імя Адам ці ад прозвішча, якое дадзена ад гэтага імя. У пачатку XX ст. уяўляла сабой фальварак Мікалаеўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 5 жыхароў. Фальварак належаў Кокаравым, меў 85 дзесяцін зямлі. На 1.1.2003 г. 2 двары, 2 жыхары.

АЗЭТА, вёска ў Ручайскім сельсавеце. Вядома з пачатку XX ст. як засценак Азэта Здраеўскіх Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 10 жыхароў. З 1921 г. у Шаркаўшчынскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 5 дамоў, 5 жыхароў. На 1.1.2003 г. 2 двары, 9 жыхароў.

АЛАШКІ, вёска ў Станіславоўскім сельсавеце, каля воз. Алашкі. У 2-й палове XIX — пачатку XX ст. у Пастаўскай воласці Дзісенскага павета. У 1888 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У 1905 г. каля 150 жыхароў, 193 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Пастаўскай гміне Дунілавіцкага павета Віленскага ваяводства, 36 дамоў, 209 жыхароў. Ёсць магазін. На 1.1.2003 г. 41 двор, 68 жыхароў.

АЛЕКСАНДРОВА, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце. Вядома з пачатку XX ст. як фальварак Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 16 жыхароў. З 1921 г. фальварак Шаркаў-

Агульны выгляд цэнтральнага сквера ў Шаркаўшчыне.

шчынскай гміны Дзісенскага павета, 3 дамы, 34 жыхары. На 1.1.2003 г. 223 жыхары.

АЛЬХОЎЦЫ, вёска ў Валожынскім сельсавеце. Вядома з пачатку XX ст. У 1905 г. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 44 жыхары, 71 дзесяціна зямлі. З 1921 г. засценак у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 1 дом, 6 жыхароў. На 1.1.2003 г. 33 двары, 80 жыхароў.

АЛЯКСАНДРАВА, хутар у Станіславаўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

АМБРОСЕНКІ, вёска ў Валожынскім сельсавеце, на р. Янка, за 20 км на паўночны захад ад гарадскога пасёлка Шаркаўшчына, на аўтамабільнай дарозе Шаркаўшчына—Ёды. У XIX — пачатку XX ст. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета. У 1905 г. 156 жыхароў, 239 дзесяцін зямлі. Апрача земляробства і жывёлагадоўлі развіваліся хатнія промыслы — прадзенне, ткацтва, лоўля рыбы і ракаў, збор ягад, грыбоў, лекавых траў, пляценне кошыкаў і лапцей, якія былі ўласцівы амаль для кожнай сялянскай сям'і. У 1921 г. у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 25 дамоў, 144 жыхары. На 1.1.2003 г. 32 двары, 64 жыхары.

АНТАНОВА, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце. Назва ўтворана ад імя Антон ці ад прозвішча, якое дадзена ад гэтага імя. Вядома па пісьмовых крыніцах з пачатку XX ст. як фальварак Антонава Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, уласнасць Багінскіх. У 1905 г. 9 жыхароў. На 1.1.2003 г. 40 двароў, 81 жыхар.

АСІНАЎКА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. Па пісьмовых крыніцах вядома з пачатку XX ст. У 1905 г. у Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 33 жыхары, 66 дзесяцін зямлі. З 1921 г. у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 8 дамоў, 39 жыхароў. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 27 жыхароў.

АСТАНОЎКА, вёска ў Більдзюжскім сельсавеце. У XIX—пачатку XX ст. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 166 жыхароў, 248 дзесяцін зямлі. У 1921 г. 26 дамоў, 180 жыхароў. У вёску Астаноўка ў 1960 г. перасялены жыхары з в. Ладуніха. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 25 жыхароў.

АСТРАЎЛЯНЕ, вёска ў Валожынскім сельсавеце. У XIX—пачатку XX ст. у Новапагосцкай воласці Дзісенскага павета. У 1889 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У 1905 г. 164 жыхары, 150 дзесяцін зямлі.

У 1921 г. 31 двор, 137 жыхароў, у фальварку 10 двароў, 70 жыхароў, у складзе Новапагосцкай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства. Радзіма прафесійнага рэвалюцыянера, савецкага дзяржаўнага дзеяча Аляксандра Міхайлавіча Буйко. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 14 жыхароў.

АТОКІ, вёска ў Германавіцкім сельсавеце. Паводле пісьмовых крыніц XIX — пачатку XX ст. у Дзісенскім павеце Віленскай губерні. Як паведамляе «Слоўнік геаграфічны каралеўства Польскага» (Т. 7, 1886), у вёсцы было 5 дамоў, 93 жыхары. Належала Шырыным. У пачатку XX ст. каля 80 жыхароў, 120 дзесяцін зямлі. У 1921 г. у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета, 16 дамоў, 86 жыхароў. На 1.1.2003 г. 20 двароў, 50 жыхароў.

АЎЛАСЫ, хутар у Більдзюжскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 5 жыхароў.

АХВАТКА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце, пры р. Мнюта. У пачатку XX ст. вядома як засценак Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 16 жыхароў, 18,5 дзесяціны зямлі. З 1921 г. у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 4 дамы, 32 жыхары. На 1.1.2003 г. 2 двары, 2 жыхары.

БАБОЎЕ, вёска ў Валожынскім сельсавеце. Назва дадзена ад наймення ўрочышча, у якім узнікла паселішча. У пачатку XX ст. вядома як засценак Фірса і Міхеева Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 36 жыхароў, 44 дзесяціны зямлі. З 1921 г. у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 3 дамы, 22 жыхары.

БАГАТЫРОВА, былая вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. З пачатку XX ст. вядома як засценак Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 70 жыхароў, 155 дзесяцін зямлі. Па суседству з засценкам знаходзілася вёска Багатыроўка, 28 жыхароў, 27 дзесяцін зямлі. У 1921 г. Багатырова 1-е і Багатырова 2-е ў Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, у якіх разам налічвалася 20 дамоў, 71 жыхар. У 1990 г. знята з уліку.

БАЛБЕКІ, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце. У пачатку XX ст. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 95 жыхароў, 126 дзесяцін зямлі. У 1921 г. у Германавіцкай гміне Дзісенскага ваяводства, 21 дом, 140 жыхароў. На 1.1.2003 г. 39 двароў, 88 жыхароў.

БАРАВОЕ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. Назва ўтворана ад наймення лясного ўрочышча Баравое, у якім узнікла паселішча. Вядома з пачатку XX ст. як вёска Залескай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 20 жыхароў, 55 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Залескай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 3 дамы, 22 жыхары. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 7 жыхароў.

БАРДЗЕНЦЫ, вёска ў Ручайскім сельсавеце. У пачатку XX ст. засценак Бародзенцы Міхайлава Новапагосцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 28 жыхароў, 77 дзесяцін зямлі. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 39 жыхароў.

БАРОК, вёска ў Більдзюжскім сельсавеце. Назва ўтворана ад наймення лясного ўрочышча Барок. У пачатку XX ст. сумежна знаходзілася 3 паселішчы з назвай Барок — лясная старожка Незабытоўскіх, 3 жыхары, хутар Рудаміна, 2 жыхары, і хутар Шыбекі, 5 жыхароў. Усе яны ўваходзілі ў склад Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. Паводле перапісу 1921 г., лясніцтва Барок Ёдскай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства. У Барок сселена в. Васілева. На 1.1.2003 г. 7 двароў, 14 жыхароў.

БАРСУКІ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. Вядома з пачатку XX ст. У 1905 г. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 50 жыхароў, 70,5 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 13 дамоў, 79 жыхароў. На 1.1.2003 г. 3 двары, 4 жыхары.

БАРСУЧЫНА, вёска ў Ручайскім сельсавеце. Назва дадзена ад наймення ўрочышча, у якім заснавана паселішча. Вядома з пачатку XX ст. як хутар Барсучына Шырынаў Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 6 жыхароў, 28 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., асада Германавіцкай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 1 дом, 5 жыхароў. На 1.1.2003 г. 22 двары, 46 жыхароў.

БАЎТРАМЕІ, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце, на р. Дзісна. У пачатку XX ст. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 132 жыхары, 75 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., 21 дом, 117 жыхароў. На 1.1.2003 г. 24 двары, 47 жыхароў.

БАЯРЫ, вёска ў Германавіцкім сельсавеце, на р. Дзісна. У пачатку XX ст. у Стэфанпольскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 180 жыхароў, 137 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 35 дамоў, 185 жыхароў. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 17 жыхароў.

БАЯРШЧЫНА, вёска ў Германавіцкім сельсавеце, на р. Дзісна. Вядома з пачатку XX ст. як вёска Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1895 г. тут адкрыта школа царкоўнай граматы. У 1905 г. 180 жыхароў, 118 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 14 дамоў, 114 жыхароў. На 1.1.2003 г. 7 двароў, 12 жыхароў.

БЕЛЫ ДВОР, вёска ў Германавіцкім сельсавеце. У пачатку XX ст. упамінаецца як сяло і як вёска Белы Двор Стэфанпольскай воласці Дзісенскага павета. У 1905 г. сяло, 157 жыхароў, 860 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 35 дамоў, 235 жыхароў. З 12.10.1940 г. да 16.7.1954 г. цэнтр сельсавета. Ёсць магазін. На 1.1.2003 г. 30 двароў, 53 жыхары.

БЕЛЯІ, вёска ў складзе Радзюкоўскага сельсавета. У XIX — пачатку XX ст. у Залескай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1901 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У пачатку XX ст. 253 жыхары, 234 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Дзісенскім павеце Віленскага ваяводства, 203 жыхары. На 1.1.2003 г. 29 двароў, 49 жыхароў.

БЕРАЗНЯНКА, вёска ў складзе Лужкоўскага сельсавета. Да 1965 г. вядома як вёска Заграўе. На 1.1.2003 г. 4 двары, 5 жыхароў.

БІЛЬДЗЮГІ, вёска, цэнтр сельсавета. За 17 км на паўночны захад ад г.п. Шаркаўшчына, за 11 км ад чыгуначнай станцыі Новы Пагост. Вядома з пачатку XX ст. У 1901 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У 1905 г. 241 жыхар, 175 дзесяцін зямлі. Побач з вёскай знаходзіўся фальварак Більдзюгі, 25 жыхароў, 52 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 40 дамоў, 200 жыхароў. З 12.10.1940 г. цэнтр сельсавета. У Більдзюгі сселены вёскі Спакойнасць (1957) і Аўгустоўка (1954). У 1970 г. 83 двары, 337 жыхароў. Цэнтральная сядзіба сельгаскааператыва, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, ветэрынарны пункт, комплексны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, сярэдняя школа, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, клуб, масавая бібліятэка, магазін, фельчарска-акушэрскі пункт. На 1.1.2003 г. 201 двор, 494 жыхары.

БЛІЗНІЦА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце, на р. Мнюта. У пісьмовых крыніцах пачатку XX ст. сустракаецца пад назвай Блізняцы Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 40 жыхароў, 42,5 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 10 дамоў, 54 жыхары. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 9 жыхароў.

БЛІНОЎШЧЫНА, вёска ў Ёдскім сельсавеце, на р. Янка. Вядома па пісьмовых крыніцах пачатку XX ст. У 1905 г. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 30 жыхароў, 89 дзесяцін зямлі. Непадалёку знаходзіўся фальварак Зубкова, 30 жыхароў, 89 дзесяцін зямлі. Існавалі промыслы: ткацтва, прадзенне, пляценне лапцей і кошыкаў, збор ягад, грыбоў, лекавых раслін, лоўля рыбы і ракаў. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 9 дамоў, 53 жыхары. На 1.1.2003 г. 4 двары, 11 жыхароў.

БОНДАРЫ СТАРЫЯ, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце. У пачатку XX ст. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 40 жыхароў, 69 дзесяцін зямлі. У 1921 г. у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 9 дамоў, 57 жыхароў. На 1.1.2003 г. 4 двары, 7 жыхароў.

БОНДАРЫ ТУЛАЎСКІЯ, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце. У пачатку XX ст. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета, 73 жыхары, 84 дзесяціны зямлі. З 1921 г. да 1939 г. у складзе Польшчы, потым у БССР. Паводле польскага перапісу 1921 г., вёска ў Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 16 дамоў, 90 жыхароў. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 17 жыхароў.

БОЎКАЛЫ, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце. Размешчана на р. Дзісна, за 7 км на ўсход ад раённага цэнтра Шаркаўшчына, на шашэйнай дарозе Шаркаўшчына — Герма-

навічы. У XIX — пачатку XX ст. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 189 жыхароў, 225 дзесяцін зямлі. Існавалі промыслы: прадзенне, ткацтва, пляценне кошыкаў і лапцей, збор ягад, грыбоў, лекавых траў, лоўля рыбы і ракаў, сплаў лесу па р. Дзісна. Паводле перапісу 1921 г., у Шаркаўшчынскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 30 дамоў, 166 жыхароў. У 1970 г. 74 дамы, 197 жыхароў. Сядзіба сельскагаспадарчага калектыву, механічныя майстэрні, ветэрынарны ўчастак, фельчарска-акушэрскі пункт, базавая школа, клуб, магазін. На 1.1.2003 г. 87 двароў, 206 жыхароў.

БРЫЦІКІ, хутар у Радзюкоўскім сельсавеце. Паводле перапісу 1921 г., у Шаркаўшчынскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 10 дамоў, 55 жыхароў. На 1.1.2003 г. 1 двор, 2 жыхары.

БУДА БЛІЖНЯЯ, вёска ў Ёдскім сельсавеце. У 1905 г. 63 жыхары, 145 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 8 дамоў, 40 жыхароў. У 1940 г. 12 двароў, 60 жыхароў.

БУДА ДАЛЬНЯЯ, вёска ў Ёдскім сельсавеце. У пачатку XX ст. вядома як вёска Буда-Меншая Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 60 жыхароў, 112 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 13 дамоў, 78 жыхароў. У 1940 г. 17 двароў, 90 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну спалена нямецка-фашысцкімі акупантамі (кастрычнік 1943). На 1.1.2003 г. 14 двароў, 30 жыхароў.

БУДЫ, вёска ў Германавіцкім сельсавеце. У пачатку XX ст. у Стэфанпольскай воласці Дзісенскага павета, каля 160 жыхароў, 157 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета, 21 дом, 131 жыхар. На 1.1.2003 г. 25 двароў, 48 жыхароў.

БУЕЎШЧЫНА, вёска ў Ёдскім сельсавеце, цэнтр сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Буеўшчына». Вядома па пісьмовых крыніцах у XIX — пачатку XX ст. У 1905 г. 219 жыхароў, 242 дзесяціны зямлі. У 1921 г. у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 42 дамы, 230 жыхароў. На 1.1.2003 г. 64 двары, 171 жыхар.

БУЙКІ, вёска ў Валожынскім сельсавеце. Размешчана на р. Густатка, пры аўтамабільнай дарозе Шаркаўшчына — Ёды, за 3 км на паўночны захад ад раённага цэнтра. У XIX — пачатку XX ст. вядома як вёска Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета. У 1900 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У пачатку XX ст. каля 200 жыхароў, 120 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Шаркаўшчынскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 21 дом, 105 жыхароў. У 1970 г. 32 двары, 89 жыхароў. Знаходзяцца майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, ветэрынарны пункт, пачатковая школа, аддзяленне сувязі, магазін. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 36 жыхароў.

БУКІ, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце, на р. Бярозаўка. У пачатку XX ст. у Луцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 150 жыхароў, 182 дзесяціны зямлі. Побач з вёскай знаходзілася сядзіба Букі Кондрата і Лаханскага, 5 жыхароў, 1 дзесяціна зямлі. У 1921 г. у Дзісенскім павеце Віленскага ваяводства. На 1.1.2003 г. 7 двароў, 8 жыхароў.

БЯЛЯНЫ, хутар у Германавіцкім сельсавеце. У пачатку XX ст. Бяляны вядомы як фальварак Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 30 жыхароў, 66 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., калонія ў Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 11 дамоў, 74 жыхары. На 1.1.2003 г. 7 двароў, 14 жыхароў.

БЯРНАТЫ, вёска ў Ёдскім сельсавеце. У пачатку XX ст. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 120 жыхароў, 210 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 17 дамоў, 100 жыхароў. На 1.1.2003 г. 2 двары, 8 жыхароў.

БЯСЕДНАЕ, вёска ў Валожынскім сельсавеце. Па пісьмовых крыніцах вядома з пачатку XX ст. як засценак Бяседнае Федаровічаў Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 15 жыхароў, 120 дзесяцін зямлі. Сумежна з засценкам знаходзіліся аднайменныя — хутар Ананічаў, 8 жыхароў, 4 дзесяціны зямлі, і фальварак Івановых, 11 жыхароў, 81 дзесяціна зямлі. Побач знаходзіліся засценкі Бяседнае 1-е і Бяседнае 2-е, у якіх было 9 дамоў, 59 жыхароў. На 1.1.2003 г. 4 двары, 4 жыхары.

ВАЛОЖЫНКІ, вёска, цэнтр сельсавета. У пачатку XX ст. у Ёдскай воласці

Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 95 жыхароў, 47 дзесяцін зямлі. З 1921 г. у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства 15 дамоў, 93 жыхары. З 1993 года цэнтр сельсавета. Ветэрынарны ўчастак, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, магазін, аддзяленне сувязі, клуб, масавая бібліятэка. На 1.1.2003 г. 65 двароў, 161 жыхар.

ВАРОНКА, вёска ў Ёдскім сельсавеце, за 23 км на паўночны захад ад раённага цэнтра Шаркаўшчына. Вядома па пісьмовых крыніцах з XIX — пачатку XX ст. Уласнасць Лапацінскіх. У 1886 г. мястэчка, 41 жыхар, 2 лаўкі, карчма. У 1900 г. каля 130 жыхароў, 105 дзесяцін зямлі, праваслаўная царква з дрэва. Працавала школа царкоўнай граматы. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне, 22 дамы, 163 жыхары. З 12.10.1940 г. да 16.7.1954 г. цэнтр сельсавета. Магазін, царква — помнік драўлянага дойлідства пачатку XX ст. (на могілках). На 1.1.2003 г. 44 двары, 98 жыхароў.

ВАСІЛЕВА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце, на р. Мнюта. Вядома па пісьмовых крыніцах з пачатку XX ст. як вёска Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 60 жыхароў, 67 дзесяцін зямлі. Акрамя земляробства і жывёлагадоўлі развіваліся хатнія промыслы: ткацтва, прадзіва, пляценне кошыкаў і лапцей, лоўля рыбы, збор ягад і грыбоў і іншыя. У 1921 г. 17 дамоў, 95 жыхароў. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 21 жыхар.

ВАСІЛЬКОВА, вёска ў Германавіцкім сельсавеце. Паводле перапісу 1921 г., у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 13 дамоў, 83 жыхары. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 21 жыхар.

ВАСЮКІ, вёска ў Станіслававуўскім сельсавеце, цэнтр сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Васюкі», на р. Дзісна. Упамінаюцца ў пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX ст. У 1893 г. 10 дамоў, 120 жыхароў. У 1898 г. 190 жыхароў, 250 дзесяцін зямлі, адкрыта школа царкоўнай граматы. Існаваў сплаўны промысел. У вёсцы ветэрынарны ўчастак, майстэрня па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, магазін, аддзяленне сувязі, базавая школа, клуб, масавая бібліятэка. На 1.1.2003 г. 71 двор, 172 жыхары.

ВАЎЧКІ, вёска ў Більдзюжскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 23 жыхары.

ВЕНСАМПОЛЕ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. Паводле перапісу 1921 г., фальварак у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 2 дамы, 13 жыхароў. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

ВЕРАЦЕІ 1-я, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце, за 39 км на ўсход ад раённага цэнтра, за 34 км ад чыгуначнай станцыі Глыбокае. Паводле пісьмовых крыніц XIX — пачатку XX ст., вёска ў Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета. У 1898 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У пачатку XX ст. каля 370 жыхароў, 505 дзесяцін зямлі. У 1921 г. у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства. У 1970 г. 61 дом, 134 жыхары. У вёсцы механічныя майстэрні, ветэрынарны ўчастак, магазін, клуб, масавая бібліятэка, базавая школа, дзіцячыя яслі-сад, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, сталовая, помнік-абеліск (1972) на ўшанаванне памяці 36 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На 1.1.2003 г. 106 двароў, 272 жыхары.

ВЕРАЦЕІ 2-я, вёска ў Лужскоўскім сельсавеце. Вядома з першай чвэрці XX ст. Паводле перапісу 1921 г., у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 37 дамоў, 200 жыхароў. На 1.1.2003 г. 40 двароў, 80 жыхароў.

ВЕСЯЛОВА, вёска ў Ёдскім сельсавеце. У 1905 г. 60 жыхароў, 45 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 8 дамоў, 35 жыхароў. На 1.1.2003 г. 2 двары, 7 жыхароў.

ВІНЦЭНТАВА, хутар у Германавіцкім сельсавеце. У 1905 г. фальварак Люцінскіх Стэфанпольскай воласці Дзісенскага павета, 8 дамоў, 50 жыхароў. Паводле перапісу 1921 г., у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 1 дом, 15 жыхароў. На 1.1.2003 г. 3 двары, 9 жыхароў.

ВІШНЯВЕЦ, вёска ў Більдзюжскім сельсавеце. Да 1962 г. была вядома пад назвай Пашы. У пачатку XX ст. у Новапагосцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 80 жыхароў, 102 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Новапагосцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 13 дамоў, 71 жыхар. На 1.1.2003 г. 28 двароў, 65 жыхароў.

ВОЛКАЎШЧЫНА, вёска ў Ёдскім сельсавеце, за 16 км на паўночны захад ад

г.п. Шаркаўшчына. У XIX — пачатку XX ст. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета. У 1884 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У 1905 г. 82 жыхары, 72 дзесяціны зямлі. У 1921 г. у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 11 дамоў, 71 жыхар. У 1970 г. 18 двароў, 58 жыхароў. Знаходзіцца сядзіба сельгаскааператыва, пачатковая школа, ветэрынарны ўчастак, механічныя майстэрні, магазін, клуб, масавая бібліятэка, млын. На 1.1.2003 г. 15 двароў, 37 жыхароў.

ВУГЛЫ, вёска ў Германавіцкім сельсавеце, на р. Мнюта. Паселішча заснавана на ўчастку зямлі, які меў форму некалькіх вуглоў, таму яно і атрымала такую назву. У пачатку XX ст. у Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 90 жыхароў, 56 дзесяцін зямлі. У 1921 г. у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 18 дамоў, 89 жыхароў. На 1.1.2003 г. 2 двары, 2 жыхары.

ВЫТОРКІ, хутар у Радзюкоўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

ВЯЛІКАЕ СЯЛО, вёска ў Навіцкім сельсавеце, цэнтр сельскагаспадарчага вытворчага калектыву «Вялікае Сяло». Размешчана на левым беразе р. Дзісна, за 16 км на паўночны ўсход ад г.п. Шаркаўшчына, на аўтамабільнай дарозе Шаркаўшчына — Германавічы. Паводле пісьмовых крыніц XIX — пачатку XX ст., вёска ў Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета. У 1888 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У 1905 г. — 374 жыхары, 358 дзесяцін зямлі. У 1921 г. 74 двары, 401 жыхар. У 1970 г. 249 двароў, 721 жыхар. Ёсць механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, магазін, сярэдняя школа, клуб, масавая бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, дзіцячыя яслі-сад. На 1.1.2003 г. 148 двароў, 363 жыхары.

ГАЛАВА, вёска ў Валожынскім сельсавеце, на р. Дзісна. Вядома з пачатку XX ст. У 1905 г. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 13 жыхароў, 24 дзесяціны зямлі. Побач з вёскай знаходзіўся аднайменны фальварак Рамановічаў, 14 жыхароў, 260 дзесяцін зямлі. На 1.1.2003 г. 2 двары, 4 жыхары.

ГАЛІНОВА, вёска ў Валожынскім сельсавеце. У пачатку XX ст. засценак Незабытоўскіх Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 10 жыхароў, 172 дзесяціны зямлі. З 1939 г. вёска. На 1.1.2003 г. 33 двары, 73 жыхары.

ГАРАДЗЕЦ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. На р. Мнюта, за 33 км на ўсход ад г.п. Шаркаўшчына, за 32 км ад чыгуначнай станцыі Падсвілле, каля шашы Глыбокае — Дзісна. У канцы XVIII ст. пабудаваны мураваная капліца і палац, закладзены пейзажны парк. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) увайшла ў склад Расіі, маёнтак ці сядзіба Дзісенскага павета Мінскай, а з 1842 г. Віленскай губерні. У 1902—1905 гг. на р. Мнюта пабудавана першая ў паўночна-заходнім краі гідраэлектрастанцыя. Яе пабудаваў граф Плятэр для забеспячэння электрычнасцю ўласнага палаца і спіртзавода. Пасля Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. у складзе Польшчы. Паводле перапісу 1921 г., фальварак у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 31 двор, 207 жыхароў. З 1939 г. у складзе БССР. У 1969 г. Гарадзец быў перайменаваны ў Дзіўную. У 1971 г. 189 гаспадарак, 653 жыхары. У вёсцы размешчаны ветэрынарны ўчастак, механічныя майстэрні, спіртзавод, сярэдняя школа, масавая бібліятэка, клуб, сталовая, аддзяленне сувязі. З 1993 г. зноў называецца Гарадзец. На 1.1.2003 г. 223 двары, 548 жыхароў.

ГАРБАЧОНКІ, хутар у Більдзюжскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

ГАЎРЫЛЕНКІ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце на р. Мнюта. У пачатку XX ст. засценак у Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 48 жыхароў, 24 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., засценак Лужкоўскай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 6 дамоў, 38 жыхароў. На 1.1.2003 г. 2 двары, 2 жыхары.

ГЕРМАНАВІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета, на р. Дзісна. За 18 км на паўночны ўсход ад Шаркаўшчыны. Упершыню ўпамінаецца ў 1563 г. пад назвай Ерманавічы як сяло ВКЛ на мяжы з Полацкім ваяводствам. Верагодна, належалі да маёнтка Сапегаў з цэнтрам у Іказні. З 1565 г. у Браслаўскім павеце Віленскага ваяводства. У 1739 г. Юзаф Станіслаў Сапега за 12 тыс. талераў прадаў мястэчка Германавічы з фальваркам Шабалаўшчына інфлянцкаму пану Яну фон Экель Гілзену. З гэтага часу Германавічы — цэнтр асобнага маёнтка, які ахоплівaў вёскі Атокі, Белы Двор, Марыямпаль, Перамены, Пузаны, Рэчкі, Юзафоў.

З 1782 г., калі Юзаф Гілзен (мсціслаўскі ваявода) прадаў Германавічы за 2 млн. злотых Ігнацыю Шырыну, да 1939 г. мястэчка было ўласнасцю роду Шырынаў. Ігнацы Шырын заснаваў тут касцёл, запісаўшы яму 15 валок зямлі, яго сын Юстын заснаваў капліцу. Насельніцтва в. Германавічы і навакольных вёсак стварала каталіцкі масіў ва уніяцкім, пазней праваслаўным асяроддзі. З 1793 г. у складзе Расійскай імперыі, у Дзісенскім павеце. Пасля скасавання прыгоннага права ў 1861 г. — цэнтр воласці Дзісенскага павета; за панскім маёнткам засталося больш як 10 тыс. дзесяцін зямлі. У канцы XIX ст. 300 жыхароў, вінакурны завод, млын, крама, карчма. З 1921 г. у складзе Польшчы, цэнтр гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства. У 1927 г. казна купіла за 35 тыс. злотых шырынаўскі палац для школы. З 1939 г. у БССР, з 12.10.1940 г. цэнтр сельсавета. У Вялікую Айчынную вайну ў 1941—1944 гг. акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1970 г. было 649 жыхароў, 209 двароў. Цэнтр сельскагаспадарчага калектыва «Германавічы», сярэдняя школа, дзіцячы сад, бібліятэка, Дом культуры, бальніца, аддзяленне сувязі, 7 магазінаў. Працуюць Германавіцкі музей мастацтва і этнаграфіі імя Я.Драздовіча, школьны гісторыка-краязнаўчы музей.

ГЕРНУТЫ, вёска ў Більдзюжскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1 двор, 2 жыхары.

ГІЗАЎШЧЫНА, вёска ў Ёдскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. як вёска Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 184 жыхары, 141 дзесяціна зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 21 дом, 108 жыхароў. На 1.1.2003 г. 3 двары, 3 жыхары.

ГЛІНАЎКА, вёска ў Германавіцкім сельсавеце. Назва ўтворана ад наймення ўрочышча, дзе ўзнікла паселішча. Вядома з пачатку XX ст. У 1905 г. у Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 41 жыхар, 35 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 7 дамоў, 39 жыхароў. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 15 жыхароў.

ГЛІСЦЁНКІ, вёска ў Валожынскім сельсавеце. У XIX — пачатку XX ст. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 152 жыхары, 191 дзесяціна зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 26 дамоў, 125 жыхароў. На 1.1.2003 г. 29 двароў, 56 жыхароў.

ГРЫБАЎШЧЫНА, вёска ў Більдзюжскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 13 жыхароў.

ГРЫБЛЫ, вёска ў Станіславоўскім сельсавеце, каля воз. Алашкі. Вядома з пачатку XX ст., 150 жыхароў, 302 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Пастаўскай гміне Дунілавіцкага павета Віленскага ваяводства, 39 дамоў, 264 жыхары. На 1.1.2003 г. 20 двароў, 33 жыхары.

ГРЫГАРАЎШЧЫНА, вёска ў Ручайскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1898 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У 1905 г. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 159 жыхароў, 132 дзесяціны зямлі. Сумежна з вёскай знаходзіўся аднайменны выселак Ігнація Тараракі, 21 жыхар, 38 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Шаркаўшчынскай гміне Дзісенскага павета Віленскай губерні, 29 дамоў, 140 жыхароў. На 1.1.2003 г. 26 двароў, 51 жыхар.

ГРЫДЗЮШКІ ВЯЛІКІЯ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. У 1905 г. у Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 190 жыхароў, 230 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 38 дамоў, 200 жыхароў. На 1.1.2003 г. 42 двары, 74 жыхары.

ГРЫДЗЮШКІ МАЛЫЯ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. як вёска Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 172 жыхары, 181 дзесяціна зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 31 дом, 149 жыхароў. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 46 жыхароў.

ГУЗАВАТКА, хутар у Германавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

ГУРКІ, вёска ў Ручайскім сельсавеце, за 8 км на паўночны ўсход ад раённага цэнтра, каля аўтамабільнай дарогі Шаркаўшчына—Германавічы. Вядома з пачатку XX ст. як засценак Гуркі, ці Калоша Здраеўскіх Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 7 жыхароў, 45 дзесяцін зямлі. У 1971 г. 45 двароў, 145 жыхароў. Базавая школа, магазін,

механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, масавая бібліятэка, клуб. На 1.1.2003 г. 64 двары, 162 жыхары.

ДВОРНАВА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. У пачатку XX ст. вядома як засценак Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 54 жыхары, 249 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., ваколіца Лужкоўскай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 13 дамоў, 77 жыхароў. Магазін. На 1.1.2003 г. 66 двароў, 190 жыхароў.

ДВОРЫШЧА, вёска ў Більдзюжскім сельсавеце. У 1866 г. у Дзісенскім павеце Віленскай губерні, 8 дамоў, 128 жыхароў. У пачатку XX ст. у Новапагосцкай воласці. Побач знаходзіліся 2 вёскі з назвай Дворышча, у якіх разам было каля 240 жыхароў, 218 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Новапагосцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 21 дом, 118 жыхароў. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 13 жыхароў.

ДЗІКЕВА, вёска ў Германавіцкім сельсавеце, на аўтамабільнай дарозе Германавічы — Новы Пагост, за 25 км на паўночны ўсход ад раённага цэнтра. Вядома з сярэдзіны XIX ст. як вёска Дзісенскага павета. У 1866 г. 47 жыхароў. У 1881 г. 5 дамоў, 50 жыхароў. Побач з вёскай знаходзіўся фальварак Дзікева. У пачатку XX ст. у Мікалаеўскай воласці, 68 жыхароў, 69 дзесяцін зямлі. У 1921 г. 14 дамоў, 78 жыхароў. У 1971 г. 51 дом, 153 жыхары. У вёсцы знаходзяцца механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, базавая школа, магазін, клуб, масавая бібліятэка. На 1.1.2003 г. 42 двары, 104 жыхары.

ДРАВАСЕКІ, хутар у Більдзюжскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

ДУБАВОЕ, вёска ў Валожынскім сельсавеце. Назва ўтворана ад наймення лясного ўрочышча, у якім расло шмат дубоў. Вядома з пачатку XX ст. як пасёлак Незабытоўскіх Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 5 жыхароў, 140 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., засценак Ёдскай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 2 дамы, 15 жыхароў. На 1.1.2003 г. 7 двароў, 16 жыхароў.

ДУБАЎКА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. У 1866 г. засценак, 3 дамы, 21 жыхар. У пачатку XX ст. у Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 120 жыхароў, 217 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 34 дамы, 185 жыхароў. На 1.1.2003 г. 34 двары, 58 жыхароў.

ДУБНІКІ, вёска ў Ёдскім сельсавеце. У сярэдзіне XIX ст. вядома як засценак Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, уласнасць Лапацінскіх. У 1866 г. 1 дом, 11 жыхароў. У пачатку XX ст. вёска Дубнікі, 69 жыхароў, 103 дзесяціны зямлі, і засценак Дубнікі, ці Навінка Лапацінскіх, 20 жыхароў, 22 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., вёска Дубнікі, 10 дамоў, 62 жыхары, і засценак Дубнікі-Навінка, 3 дамы, 19 жыхароў. На 1.1.2003 г. 3 двары, 4 жыхары.

ДУБОЎКА, вёска ў Більдзюжскім сельсавеце, на аўтамабільнай дарозе Шаркаўшчына — Друя. У 1866 г. 5 дамоў, 51 жыхар. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 6 жыхароў.

ДУЛІНА, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце за 11 км на поўдзень ад раённага цэнтра. У 1866 г. засценак Богінскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 2 дамы, 17 жыхароў. У 1905 г. засценак Броўэр-Плятэра, 3 жыхары, 10 дзесяцін зямлі. У 1954 — 1988 гг. цэнтр сельсавета. У 1959 г. у Дуліна сселены жыхары в. Антонішкі. У 1971 г. 54 двары, 144 жыхары. Ветэрынарны ўчастак, базавая школа, масавая бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін. На 1.1.2003 г. 28 двароў, 52 жыхары.

ЁДЫ (ІЁДЫ), вёска, цэнтр сельсавета, сельгаскааператыва на р. Густатка, за 18 км на паўночны захад ад раённага цэнтра, на аўтамабільнай дарозе Шаркаўшчына — Браслаў. Гэта чацвёрты па велічыні населены пункт раёна. Сваю назву м. Іёды атрымала ад літоўскага слова «jodas», якое азначае «чорны лес». Яшчэ ў XVIII ст. тут былі вялікія лясы. Здаўна маёнтак Іёды быў уладаннем князёў Сапегаў. У 1701 г. Сапегі аддалі яго пад залог Дыянісію Масальскаму. У 1742 г. Іёды набыў Мікалай Лапацінскі. Потым ён уступіў паселішча свайму малодшаму брату Ігнацыю Лапацінскаму, пісару скарбоваму ВКЛ.

У 1754 г. Ігнацы і Юдыта Лапацінскія заснавалі ў Іёдах уніяцкую царкву. Юдыта, акрамя таго, у зноў заснаваным фальварку Юдыцын адкрыла каталіцкую капліцу.

У 1794 г. маёнтак Іёды, які налічваў 24 000 дзесяцін зямлі (або 1200 валок), быў

падзелены на чатыры часткі паміж сынамі Ігнацыя Лапацінскага. Цэнтр маёнтка з мястэчкам Іёды, мураваным палацам, царквой дастаўся Марціну Лапацінскаму, які займаў пасаду шамбеляна і падкаморыя дзісенскага. Юзэф, ротмістр кавалерыі, у сваёй частцы заклаў фальварак, які ў імя яго жонкі Паўліны быў названы Паўлінава. Ксёндз Рафал Свянціцкі, канонік смаленскі, яго цётачны брат, у частцы Юзэфа заклаў другі фальварак, які ў імя яго названы Рафалава. У сваёй вёсцы Барадзінічы, далучанай пазней да Рафалава, Юзэф Лапацінскі заснаваў каменны касцёл св. Юзэфа. Потым ён стаў месцам пахавання фундатараў. Тадэвуш Лапацінскі ў сваёй частцы маёнтка Іёды заснаваў два фальваркі, якія ў імя яго і яго жонкі былі названы Тадуліна і Ганна-двор-Мікалай (Ганава). Малодшы з братоў Мікалай Лапацінскі ў маёнтку Юдыцын заснаваў фальварак Мікалаёва.

У 1793 г. цэнтр воласці Дзісенскага павета Мінскай, з 1842 г. Віленскай губерні. Паводле «Слоўніка геаграфічнага каралеўства Польскага», у 1866 г. з назвай Ёды сумежна былі мястэчка і вёска, у якіх разам мелася 15 дамоў, 179 жыхароў. У першай палове 1880-х гг. каля 420 жыхароў, праваслаўная царква, валасное праўленне, земскае народнае вучылішча, карчма, лаўка, за 5 вёрст — вінакурны завод. Ёдскі праваслаўны прыход налічваў каля 1300 вернікаў. У 1886 г. у земскім народным вучылішчы займалася 58 дзяцей, з іх толькі 2 — дзяўчынкі, настаўнікам працаваў Мікалай Каваленка. У пісьмовых крыніцах 1905 г. Ёды ўпамінаюцца як сяло, 379 жыхароў, 193 дзесяціны зямлі. У 1921 г. цэнтр гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 74 дамы, 479 жыхароў. Непадалёку быў фальварак Ёды, 5 дамоў, 42 жыхары. З 12.10.1940 г. да 15.10.1960 г., потым зноў з 17.7.1964 г. — цэнтр сельсавета. У 1940 г. 125 двароў, 975 жыхароў. У Вялікую Айчынную вайну нямецка-фашысцкія акупанты спалілі Ёды, загубілі 510 жыхароў (кастрычнік 1943). У 1971 г. 124 двары, 357 жыхароў, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, ветэрынарны пункт, сярэдняя школа, бальніца, аптэка, Дом культуры, масавая бібліятэка, Дом быту, аддзяленне сувязі, ашчадная каса, аўтаматычная тэлефонная станцыя, сталовая, дзіцячыя яслі-сад, 3 магазіны, царква, некалькі спартыўных пляцовак. На 1.1.2003 г. 180 двароў, 453 жыхары.

ЖАРСЦВЯНКА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. Вядома з канца XIX ст. У 1905 г. у Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 150 жыхароў, 97 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 21 дом, 109 жыхароў. На 1.1.2003 г. 14 двароў, 18 жыхароў.

ЖДАНЫ, вёска ў Станіславоўскім сельсавеце на р. Дзісна. У XIX — пачатку XX ст. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 230 жыхароў, 206 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у вёсцы 28 дамоў, 147 жыхароў, у фальварку Жданы 6 дамоў, 30 жыхароў. Ёсць магазін. На 1.1.2003 г. 64 двары, 128 жыхароў.

ЖОЎНІЦА, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце. У пачатку XX ст. вядома як маёнтак Луцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 2 жыхары, 516 дзесяцін зямлі. На 1.1.2003 г. 25 двароў, 36 жыхароў.

ЖУКІ ГОРНЫЯ, вёска ў Германавіцкім сельсавеце. У XIX — пачатку XX ст. у Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 159 жыхароў, 152 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., 32 дамы, 171 жыхар. На 1.1.2003 г. 17 двароў, 35 жыхароў.

ЖУКІ ЛОЖНЫЯ, вёска ў Германавіцкім сельсавеце, на р. Дзісна. У пачатку XX ст. вядома як вёска Жукі-Ладзяныя Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 343 жыхары, 307 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 59 дамоў, 358 жыхароў. На 1.1.2003 г. 41 двор, 82 жыхары.

ЖУКОЎШЧЫНА, вёска ў Станіславоўскім сельсавеце, на правым беразе р. Дзісна, за 25 км на паўднёвы захад ад раённага цэнтра, за 5 км ад чыгуначнай станцыі Полава, аўтамабільнай дарогай злучана з Шаркаўшчынай. Вядома з XIX ст. як вёска Пастаўскай воласці Дзісенскага павета. У 1897 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У пачатку XX ст. 120 жыхароў, 147 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Пастаўскай гміне Дунілавіцкага павета Віленскага ваяводства, 23 дамы, 141 жыхар. У 1971 г. 40 двароў, 121 жыхар. У вёсцы майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, ветэрынарны ўчастак, сярэдняя

школа, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, клуб, масавая бібліятэка, магазін, дзіцячыя яслі-сад, помнік — абеліск (1967) на ўшанаванне памяці 72 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На 1.1.2003 г. 76 двароў, 190 жыхароў.

ЖЫТАПОЛЛЕ, хутар у Валожынскім сельсавеце. Назва ўтворана ад наймення палявога ўрочышча (Жытняе поле), на якім было заснавана паселішча. Вядома з пачатку XX ст. як засценак Лапацінскіх Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 10 жыхароў, 34 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 2 дамы, 13 жыхароў. На 1.1.2003 г. ніхто не жыве.

ЗААЗЕРЦЫ, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце. У пачатку XX ст. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 38 жыхароў, 50 дзесяцін зямлі. З 1921 г. у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 8 дамоў, 37 жыхароў. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 6 жыхароў.

ЗАБОР'Е, вёска ў Ручайскім сельсавеце. У пачатку XX ст. засценак Новапагосцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 9 жыхароў, 21 дзесяціна зямлі. З Забор'ем аб'яднана вёска Богаўшчына (да 1957). На 1.1.2003 г. 36 двароў, 74 жыхары.

ЗАГОРНАЕ, вёска ў Валожынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 11 жыхароў.

ЗАЛЕСІНКІ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. як вёска Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета. У 1905 г. 214 жыхароў, 243 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 29 дамоў, 174 жыхары. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 30 жыхароў.

ЗАЛЕССЕ, вёска ў Ёдскім сельсавеце. Заснавана каля леса (за лесам), таму і атрымала такую назву. У XIX — пачатку XX ст. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета, уласнасць Лапацінскіх. У 1905 г. 104 жыхары. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета, 22 дамы, 133 жыхары. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 30 жыхароў.

ЗАПОЛЛЕ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. Вядома з пачатку 1920-х гадоў. Паводле перапісу 1921 г., у Язненскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 12 дамоў, 73 жыхары. На 1.1.2003 г. 4 двары, 12 жыхароў.

ЗАПРУДДЗЕ, вёска ў Ручайскім сельсавеце. У пачатку XX ст. былі 2 засценкі пад назвай Запруддзе ў Новапагосцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. Адзін належаў Ляскоўскім, другі — Яфімавым. Працавала школа царкоўнай граматы (адкрыта ў 1896). У абодвух засценках было 25 жыхароў, 112 дзесяцін зямлі. У Запруддзе сселена вёска Ляндэрня (1963). На 1.1.2003 г. 50 двароў, 111 жыхароў.

ЗАРЭЧЧА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 2 двары, 2 жыхары.

ЗАРЭЧЧА, хутар у Валожынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 9 двароў, 22 жыхары.

ЗАЧЫСЦІКІ, вёска ў Ручайскім сельсавеце, на р. Маціца. У пачатку XX ст. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 40 жыхароў, 58 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 10 дамоў, 50 жыхароў. На 1.1.2003 г. 25 двароў, 48 жыхароў.

ЗОРКА, вёска ў Германавіцкім сельсавеце, каля р. Дзісна. У 1964 г. тры сумежныя вёскі — Астбожы, Рэдзькі, Сініцы былі аб'яднаны ў адну і названы Зорка. Помнік — стэла (1969) на ўшанаванне памяці 32 землякоў, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. Сярэдняя школа, магазін. На 1.1.2003 г. 71 двор, 200 жыхароў.

ЗЯБЛІНЫ, вёска ў Ёдскім сельсавеце, на р. Янка. У пачатку XX ст. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 76 жыхароў, 43 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 19 дамоў, 106 жыхароў. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 41 жыхар.

ЗЯМЦЫ, вёска ў Станіславаўскім сельсавеце, на р. Дзісна. У пачатку XX ст. у Пастаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 110 жыхароў, 97 дзесяцін зямлі, дзейнічала школа царкоўнай граматы (адкрыта ў 1901). Паводле перапісу 1921 г., у Пастаўскай гміне Дунілавіцкага павета Віленскага ваяводства, 24 дамы, 133 жыхары. На 1.1.2003 г. 36 двароў, 59 жыхароў.

ІВАНАВА, вёска ў Германавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 21 двор, 42 жыхары.

ІВАНАВА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. Да 1965 г. вядома пад назвай Гаданы. На 1.1.2003 г. 31 двор, 48 жыхароў.

ІВАНСКІЯ, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце. Вядома з пачатку 1920-х гадоў. Паводле перапісу 1921 г., калонія Шаркаўшчынскай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства Польшчы, 21 дом, 135 жыхароў. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 22 жыхары.

ІЗАБЕЛІНА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. У XIX — пачатку XX ст. у Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета. У 1905 г. 96 жыхароў, 72 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 13 дамоў, 69 жыхароў. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

КАВАЛЁВА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. Вядома з XIX ст., у Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета, уласнасць Чапскіх. У 1905 г. 121 жыхар, 9 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 11 дамоў, 70 жыхароў. На 1.1.2003 г. 2 двары, 4 жыхары.

КАВАЛІ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце, на р. Мнюта. У пачатку XX ст. пад назвай Кавалі было 2 вёскі Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 70 жыхароў, 82 дзесяціны зямлі. Працавала школа царкоўнай граматы (адкрыта ў 1901). Паводле перапісу 1921 г., вёска, 8 дамоў, 43 жыхары, і асада, 2 дамы, 26 жыхароў. На 1.1.2003 г. 4 двары, 6 жыхароў.

КАДРЫШКІ, вёска ў Ручайскім сельсавеце. У пачатку XX ст. вядома пад назвай Кадарышкі ў Новапагосцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 78 жыхароў, 112 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Новапагосцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 13 дамоў, 81 жыхар. У Кадарышкі сселена вёска Астраўкі (да 1957). На 1.1.2003 г. 3 двары, 5 жыхароў.

КАЗАКІ, вёска ў Валожынскім сельсавеце. У 1884 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У пачатку XX ст. засценак Багуцкіх Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета, 6 жыхароў, 60 дзесяцін зямлі. На 1.1.2003 г. 26 двароў, 51 жыхар.

КАЗАЧКІ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. Вядома з XIX ст. як вёска і хутар Казачкі Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета. У 1897 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У 1905 г. 190 жыхароў, 215 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 25 дамоў, 162 жыхары. На 1.1.2003 г. 23 двары, 55 жыхароў.

КАЗЛОЎШЧЫНА, хутар у Радзюкоўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1двор, 2 жыхары.

КАНАВАЛАВА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. У пачатку XX ст. фальварак Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 25 жыхароў, 124 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 4 дамы, 29 жыхароў. На 1.1.2003 г. 4 двары, 9 жыхароў.

КАНАШОЎКА, хутар у Більдзюжскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

КАРАЛЕВА, вёска ў Германавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 35 двароў, 77 жыхароў.

КАРАЛІНАВА, хутар у Радзюкоўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

КАРЧЫ МІЛЬКАЎСКІЯ, хутар у Більдзюжскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1 двор, 2 жыхары.

КАРШУНКІ, вёска ў Ёдскім сельсавеце, на р. Ёдская. Вядома з пачатку XIX ст. У 1905 г. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 73 жыхары. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 13 дамоў, 76 жыхароў. На 1.1.2003 г. 20 двароў, 40 жыхароў.

КАСЦЮКІ, вёска ў Валожынскім сельсавеце. У пачатку XX ст. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 225 жыхароў, 247 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 31 дом, 164 жыхары. На 1.1.2003 г. 4 двары, 4 жыхары.

КАТЫ, вёска ў Ручайскім сельсавеце. У 1905 г. у Новапагосцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 87 жыхароў, 185 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Новапагосцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 14 дамоў, 78 жыхароў. У Каты сселена вёска Лучкі (да 1957). На 1.1.2003 г. 10 двароў, 14 жыхароў.

КАЎКІ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. Вядома з пачатку XX ст. як засценак Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 42 жыхары, 51,5 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у

Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 5 дамоў, 26 жыхароў.

КАЎШЭЛЕВА, вёска ў Ручайскім сельсавеце, цэнтр сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва, за 18 км на паўночны ўсход ад раённага цэнтра, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Зоры. Вядома па пісьмовых крыніцах з XIX ст. У 1891 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У пачатку XX ст. каля 200 жыхароў, 176 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Новапагосцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства. З 12.10.1940 г. да 16.7.1954 г. — цэнтр сельсавета. У 1971 г. 59 двароў, 172 жыхары. Цэнтральная сядзіба, ветэрынарны пункт, механічныя майстэрні, базавая школа, клуб, масавая бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін. На 1.1.2003 г. 97 двароў, 242 жыхары.

КІСЯЛЁЎКА, хутар у Радзюкоўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1 двор, 2 жыхары.

КЛІНАВОЕ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. У дакументах XIX — пачатку XX ст. сустракаецца як вёска пад назвай Клёнавае ў Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета. У 1905 г. 167 жыхароў, 196 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 29 дамоў, 166 жыхароў. На 1.1.2003 г. 18 двароў, 21 жыхар.

КЛЯНЫ, хутар у Радзюкоўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 4 двары, 5 жыхароў.

КОРНІЦА, вёска ў Ёдскім сельсавеце, на р. Корынка, за 15 км на паўночны захад ад г.п. Шаркаўшчына. У XIX — пачатку XX ст. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета. У 1883 г. 16 дамоў, 155 жыхароў. У 1884 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У пачатку XX ст. 187 жыхароў, 295 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 39 дамоў, 210 жыхароў. У 1954—1964 гг. — цэнтр сельсавета. У 1971 г. 51 дом, 147 жыхароў. Знаходзяцца майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, ветэрынарны ўчастак, магазін, клуб, аддзяленне сувязі, масавая бібліятэка, помнік — абеліск (1975) на ўшанаванне памяці 66 землякоў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. На 1.1.2003 г. 33 двары, 85 жыхароў.

КРАПЎНІКІ, вёска ў Германавіцкім сельсавеце. Вядома з 2-й паловы XIX ст. як вёска Новапагосцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1866 г. 6 дамоў, 49 жыхароў. Паводле перапісу 1921 г., фальварак Германавіцкай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 2 дамы, 18 жыхароў. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 24 жыхары.

КРАСНАЕ, вёска ў Більдзюжскім сельсавеце. Вядома з пачатку XX ст. як вёска Новапагосцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 70 жыхароў, 308 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Новапагосцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 31 дом, 158 жыхароў. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 21 жыхар.

КРАСНАЯ ГАРА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце, на р. Дзісна. Вядома з XVI—XVII ст. як маёнтак Вазгірдаў. З пачатку XX ст. у Стэфанпольскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 119 жыхароў, 566 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Дзісенскім павеце Віленскага ваяводства, 6 дамоў, 88 жыхароў. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 17 жыхароў.

КРАСНАЯ ГОРКА, хутар у Германавіцкім сельсавеце. Паводле перапісу 1921 г., лясніцтва Германавіцкай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 1 дом, 8 жыхароў. На 1.1.2003 г. 1 дом, 3 жыхары.

КРАСОЎШЧЫНА, вёска ў Германавіцкім сельсавеце. Паводле перапісу 1921 г., фальварак у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 12 двароў, 76 жыхароў. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 47 жыхароў.

КРЫЎКІ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. У пачатку XX ст. вядома як вёска Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета. У 1900 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У 1905 г. 219 жыхароў, 227 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 27 дамоў, 125 жыхароў. На 1.1.2003 г. 47 двароў, 91 жыхар.

КУБЕЛЕЎШЧЫНА, вёска ў Більдзюжскім сельсавеце, за 15 км на поўнач ад раённага цэнтра, паблізу ад аўтамабільнай дарогі Шаркаўшчына—Браслаў (0,5 км). У пачатку XX ст. у Новапагосцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 43 жыхары, 84 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Новапагосцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 17 дамоў, 66 жыхароў. У 1972 г. 30

двароў, 96 жыхароў. Ветэрынарны пункт, механічныя майстэрні, клуб, масавая бібліятэка, магазін, аддзяленне сувязі. На 1.1.2003 г. 69 двароў, 166 жыхароў.

КУКАЎКА, хутар у Германавіцкім сельсавеце. У XIX ст. вядомы як фальварак Стэфанпольскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 24 жыхары, 172 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 6 дамоў, 34 жыхары. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 17 жыхароў.

КУЛАГІ, хутар у Валожынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 2 дамы, 3 жыхары.

КУРЫЛАВА, вёска ў Германавіцкім сельсавеце, на р. Дзісна. У пачатку XX ст. у Стэфанпольскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 70 жыхароў, 39 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 6 дамоў, 23 жыхары. На 1.1.2003 г. 12 двароў, 20 жыхароў.

КУРЫЛАВІЧЫ, вёска ў Станіслаўскім сельсавеце, на р. Дзісна. У пачатку XX ст. у Ігуменаўскай гміне Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 30 жыхароў, 46 дзесяцін зямлі. У 1921 г. у Шаркаўшчынскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 7 дамоў, 41 жыхар. На 1.1.2003 г. 39 двароў, 61 жыхар.

КУШЛЕВА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце, на р. Мнюта. У пачатку XX ст. вядома як ваколіца ў Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 20 жыхароў, 89 дзесяцін зямлі. У 1921 г. у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 10 дамоў, 62 жыхары. На 1.1.2003 г. 12 двароў, 28 жыхароў.

КУШТАЛІ, вёска ў Ёдскім сельсавеце, на р. Янка. У XIX — пачатку XX ст. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета. У пачатку XX ст. 130 жыхароў, 112 дзесяцін зямлі. У 1921 г. 27 дамоў, 121 жыхар. У 1940 г. 26 двароў, 98 жыхароў. У лістападзе 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску і загубілі 48 жыхароў. З 20.9.1944 г. да 16.7.1954 г. цэнтр сельсавета. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 8 жыхароў.

КУЯЛЕЎШЧЫНА, былая вёска ў Ёдскім сельсавеце. У 1940 г. 6 двароў, 31 жыхар. У лістападзе 1942 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску разам з яе 8 жыхарамі. Пасля вайны не адрадзілася.

ЛАБУЦІ, вёска ў Станіслаўскім сельсавеце. У пачатку XX ст. была вядома пад назвай Лубаты Луцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 70 жыхароў, 125 дзесяцін зямлі. На 1.1.2003 г. 32 двары, 73 жыхары.

ЛАЗОВІКІ, вёска ў Германавіцкім сельсавеце. Паводле перапісу 1921 г., у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 12 дамоў, 71 жыхар. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 24 жыхары.

ЛАЗОЎКА, вёска ў Валожынскім сельсавеце. Вядома з пачатку XX ст. як засценак Лапацінскіх Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 13 жыхароў, 30 дзесяцін зямлі. Непадалёку ад яго знаходзіўся другі засценак з гэткай жа назвай, 14 жыхароў, 28 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 7 дамоў, 28 жыхароў. На 1.1.2003 г. 6 двароў, 12 жыхароў.

ЛАКІНАЎЦЫ, вёска ў Ёдскім сельсавеце, на р. Ёдская. У пачатку XX ст. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета, уласнасць Лапацінскіх. У 1905 г. 122 жыхары, 107 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., 16 дамоў, 94 жыхары. На 1.1.2003 г. 16 двароў, 41 жыхар.

ЛАМАЧЫНА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце, на р. Мнюта. У пачатку XX ст. у Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета. У 1905 г. 157 жыхароў, 119 дзесяцін зямлі. У 1921 г. у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 19 дамоў, 119 жыхароў. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 40 жыхароў.

ЛАПУНОВА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце, на р. Мнюта. У пачатку XX ст. у Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 139 жыхароў, 174,5 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 31 дом, 187 жыхароў. На 1.1.2003 г. 19 двароў, 40 жыхароў.

ЛАТЫШЫ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. У пачатку XX ст. існавалі 3 фальваркі пад назвай Латышы ў Стэфанпольскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, разам каля 40 жыхароў, 166 дзесяцін зямлі. Адзін фальварак з'яўляўся ўласнасцю Кавалеўскіх, другі — Рабажэвічаў, трэці — Шышкаў. Паводле перапісу 1921 г., у Стэфанпольскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 4 дамы,

30 жыхароў. На 1.1.2003 г. 4 двары, 5 жыхароў.

ЛОНСК, вёска ў Валожынскім сельсавеце, на р. Дзісна. У пачатку XX ст. маёнтак Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 16 жыхароў, 499 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., фальварак у Шаркаўшчынскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 5 дамоў, 56 жыхароў. З 1939 г. — вёска. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 29 жыхароў.

ЛОНСКІЯ, вёска ў Ёдскім сельсавеце, за 23 км на паўночны захад ад раённага цэнтра, на р. Янка і аўтамабільнай дарозе Шаркаўшчына — Ёды. У пачатку XX ст. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета. У 1866 г. 9 дамоў, 124 жыхары, уласнасць Лапацінскіх. У пачатку XX ст. 173 жыхары, 214 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 34 дамы, 159 жыхароў. У 1972 г. 63 двары, 183 жыхары. Знаходзяцца механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, магазін, клуб, фельчарска-акушэрскі пункт, базавая школа, аддзяленне сувязі. На 1.1.2003 г. 33 двары, 60 жыхароў.

ЛУГІ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце, на р. Мнюта. Паселішча было заснавана ў сенакосным урочышчы Лугі, таму яно так і названа. У пачатку XX ст. у Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 108 жыхароў, 95 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 15 дамоў, 79 жыхароў. На 1.1.2003 г. 3 двары, 6 жыхароў.

ЛУЖКІ, вёска, цэнтр сельсавета, за 30 км на ўсход ад раённага цэнтра, на р. Мнюта. Вядома з XVI ст. як маёнтак. Уласнасць Сапегаў, Жабы, а прыкладна з 1840 г. Чапскіх. У 1744 г. заснаваны калегіум піяраў, які дзейнічаў да XX ст. Пабудаваны Міхайлаўскі касцёл з цэглы (1744—1756). Паводле каралеўскага прывілея ад 14 студзеня 1745 г., мястэчка. З 1793 г. цэнтр воласці Дзісенскага павета Мінскай, з 1842 г. Віленскай губерняў. У 1794 г. пабудавана праваслаўная царква Раства Багародзіцы (у 1831 і 1885 пашкоджана пажарамі, у 1934 прыбудаваны бабінец і двух'ярусная званіца над ім). У 1861 г. 639 жыхароў. У 1862 г. адкрыта земскае народнае вучылішча. У 1886 г. 77 двароў, 924 жыхары, вадзяны млын, конная паштовая станцыя, малітоўны дом, народнае вучылішча, піваварны завод, 14 крам. У 1901 г. адкрыта царкоўна-прыходская школа. У 1905 г. 1357 жыхароў, 617 дзесяцін зямлі. Непадалёку ад мястэчка размяшчаўся маёнтак Лужкі Зіберг-Плятэраў, 111 жыхароў, 5191 дзесяціна зямлі. Паводле перапісу 1921 г., мястэчка — цэнтр гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 212 дамоў, 1362 жыхары. З 12.10.1940 г. цэнтр сельсавета. Сярэдняя школа, ветэрынарны пункт, амбулаторыя, аддзяленне сувязі, аўтаматыч-



Новы пасёлак у Лужках.

ная тэлефонная станцыя, магазін, некалькі помнікаў архітэктуры, гісторыі і культуры. На 1.1.2003 г. 381 двор, 870 жыхароў.

ЛУЧАЙКА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. У 1884 г. 18 дамоў, 207 жыхароў. У пачатку XX ст. каля 320 жыхароў, 307 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 45 дамоў, 242 жыхары. На 1.1.2003 г. 24 двары, 32 жыхары.

ЛЮДВІНОВА, вёска ў Германавіцкім сельсавеце, на р. Дзісна. У пачатку XX ст. маёнтак, які належаў Чаплінскім, Стэфанпольскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 9 жыхароў, 1639 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., фальварак Стэфанпольскай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 5 дамоў, 52 жыхары. На 1.1.2003 г. 33 двары, 61 жыхар.

ЛЯДНІКІ, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце, на р. Дзісна. У пачатку XX ст. у Дзісенскім павеце Віленскай губерні, 30 жыхароў, 43 дзесяціны зямлі. На 1.1.2003 г. 23 двары, 39 жыхароў.

ЛЯДЫ, хутар у Більдзюжскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1 двор, 4 жыхары.

ЛЯСКОВА, вёска ў Германавіцкім сельсавеце. У 1921 г. 11 дамоў, 80 жыхароў. На 1.1.2003 г. 14 двароў, 28 жыхароў.

МАЛІНАВА, вёска ў Ручайскім сельсавеце. У пачатку XX ст. у Мікалаеўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 38 жыхароў, 52 дзесяціны зямлі. На 1.1.2003 г. 3 двары, 4 жыхары.

МАЛОНКА МОСАРСКАЯ, хутар у Радзюкоўскім сельсавеце. У пачатку XX ст. у Дзісенскім павеце Віленскай губерні, каля 180 жыхароў, 199 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Шаркаўшчынскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 25 дамоў, 157 жыхароў. На 1.1.2003 г. 7 двароў, 8 жыхароў.

МАРГІ, хутар у Германавіцкім сельсавеце. У 1885 г. 4 дамы, 32 жыхары. У пачатку XX ст. засценак Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 20 жыхароў, 52 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 8 дамоў, 47 жыхароў. На 1.1.2003 г. 3 двары, 5 жыхароў.

МАРКІ, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце, на р. Дзісна. У пачатку XX ст. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 145 жыхароў, 78 дзесяцін зямлі. У 1921 г. 27 дамоў, 131 жыхар. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 16 жыхароў.

МАРЦІНЯТЫ, вёска ў Ёдскім сельсавеце. У пачатку XX ст. засценак Лапацінскіх Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 60 жыхароў, 87 дзесяцін зямлі. У 1921 г. 11 дамоў, 58 жыхароў. На 1.1.2003 г. 3 двары, 14 жыхароў.

МАР'ЯНПОЛЛЕ, хутар у Германавіцкім сельсавеце, на р. Мнюта. У 1905 г. фальварак Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 16 жыхароў, 75,5 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., калонія Германавіцкай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 5 дамоў, 38 жыхароў. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

МЕЛЬНІЦА, вёска ў Станіславоўскім сельсавеце, каля воз. Алашкі. У 1900 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У пачатку XX ст. у Пастаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 60 жыхароў, 82 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Пастаўскай гміне Дунілавіцкага павета Віленскага ваяводства, 16 дамоў, 98 жыхароў. На 1.1.2003 г. 24 двары, 37 жыхароў.

МЕТА, вёска ў Ёдскім сельсавеце. У канцы XIX ст. засценак Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1905 г. 57 жыхароў, 41 дзесяціна зямлі. Паводле перапісу 1921 г., вёска Ёдскай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 8 дамоў, 46 жыхароў. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

МІКАЛАЕЎКА, хутар у Більдзюжскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

МІКАЛАЁВА, вёска ў Ручайскім сельсавеце. У пачатку XX ст. маёнтак Шумана і Абаровічаў Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 32 жыхары, 350 дзесяцін зямлі. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 8 жыхароў.

МІШУТЫ, вёска ў Станіславоўскім сельсавеце. У пачатку XX ст. у Дзісенскім павеце Віленскай губерні, каля 90 жыхароў, 82 дзесяціны зямлі. На 1.1.2003 г. 26 двароў, 43 жыхары.

МЛЫНАРОВА, вёска ў Ёдскім сельсавеце. У 1921 г. 1 дом, 8 чалавек. На 1.1.2003 г. 3 двары, 9 жыхароў.

МУРАШЧЫНА, хутар у Германавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

НАВАСЕЛЛЕ, вёска, цэнтр сельскагаспадарчага вытворчага калектыву «Нава-

селле», у Валожынскім сельсавеце, за 4 км на поўнач ад раённага цэнтра, на аўтамабільнай дарозе Шаркаўшчына — Міёры. Да 1959 г. вёска вядома пад назвай Бяда. У пачатку XX ст. фальварак Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, уласнасць Ананіча. У 1905 г. 22 жыхары, 62 дзесяціны зямлі. Пазней фальварак ператвораны ў вёску. Механічныя майстэрні, ветэрынарны ўчастак, пачатковая школа, клуб, масавая бібліятэка, магазін, аддзяленне сувязі. На 1.1.2003 г. 116 двароў, 309 жыхароў.

НАВАСЕЛЛЕ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце, на р. Мнюта. У пачатку XX ст. у Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета. У 1905 г. 126 жыхароў, 134 дзесяціны зямлі. У 1921 г. 23 дамы, 130 жыхароў. На 1.1.2003 г. 2 двары, 2 жыхары.

НАВАСЕЛЬЦЫ, вёска ў Германавіцкім сельсавеце. У пачатку XX ст. у Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 240 жыхароў, 199 дзесяцін зямлі. У 1921 г. у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 41 дом, 209 жыхароў. На 1.1.2003 г. 30 двароў, 64 жыхары.

НЕПРЫНІКІ, хутар у Валожынскім сельсавеце. На 1998 г. мелася 9 двароў, 20 жыхароў. На 1.1.2003 г. 8 двароў, 11 жыхароў.

НІКІЦЁНКІ, вёска ў Германавіцкім сельсавеце. Паводле перапісу 1921 г., у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства Польшчы, 34 дамы, 185 жыхароў. На 1.1.2003 г. 15 двароў, 26 жыхароў.

ПАДБАРОК, вёска ў Більдзюжскім сельсавеце. У пачатку XX ст. засценак Падборац, ці Лыкавыя Ляды, Радзевічаў Новапагосцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 6 жыхароў, 9,5 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Новапагосцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 1 дом, 13 жыхароў. У Падбарок сселена вёска Малінаўка (да 1959). На 1.1.2003 г. 17 двароў, 31 жыхар.

ПАД'ЕЛЬЦЫ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. Паводле перапісу 1921 г., засценак Лужкоўскай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 9 дамоў, 39 жыхароў. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

ПАДЛІПКІ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. У пачатку XX ст. у Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 30 жыхароў, 35 дзесяцін зямлі. З 1921 г. да 1939 г. у складзе Польшчы, потым у БССР. Паводле перапісу 1921 г., у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 11 дамоў, 62 жыхары. На 1.1.2003 г. 12 двароў, 24 жыхары.

ПАДОБЫ, вёска ў Ёдскім сельсавеце, на р. Ёдская. У пачатку XX ст. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета. У 1905 г. 194 жыхары, 179 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 34 дамы, 198 жыхароў. На 1.1.2003 г. 20 двароў, 30 жыхароў.

ПАЛЯЛЕЙКІ, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце. У пачатку XX ст. у Луцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 210 жыхароў, 192 дзесяціны зямлі. На 1.1.2003 г. 23 двары, 57 жыхароў.

ПАПКІ, вёска ў Ручайскім сельсавеце. Размешчана каля р. Дзісна (3 км), за 10 км на ўсход ад раённага цэнтра, на аўтамабільнай дарозе Шаркаўшчына — Дзісна. У пачатку XX ст. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 60 жыхароў, 92 дзесяціны зямлі. У 1921 г. у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 13 дамоў, 78 жыхароў. Механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, магазін, клуб, масавая бібліятэка, аддзяленне сувязі, дзіцячыя яслі-сад. На 1.1.2003 г. 84 двары, 199 жыхароў.

ПАРЭЧЧА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце, на р. Мнюта. У пачатку XX ст. маёнтак Лужкоўская воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 10 жыхароў, 343 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., 2 фальваркі — Парэчча Старое і Парэчча Царкоўнае ў Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 11 дамоў, 74 жыхары. На 1.1.2003 г. 26 двароў, 49 жыхароў.

ПАШКІ, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце. Размешчана на правым беразе р. Дзісна, за 13 км на ўсход ад гарадскога пасёлка Шаркаўшчына. У 2-й палове XIX ст. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1864 г. уласнасць Пузынаў, 124 рэвізскія душы. У 1886 г. 24 дамы, 274 жыхары. У пачатку XX ст. 316 жыхароў, 375 дзесяцін зямлі. Пасля Рыжскага мірнага дагавора (1921) далучана да Польшчы. Паводле перапісу 1921 г., у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага

скага ваяводства, 66 дамоў, 381 жыхар. Ветэрынарны пункт, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, клуб, масавая бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін. На 1.1.2003 г. 95 двароў, 238 жыхароў.

ПАЯНЫЧЫ, вёска ў Валожынскім сельсавеце, на р. Янка. У пачатку XX ст. засценак Лапацінскіх Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 44 жыхары, 44 дзесяціны зямлі. Паводле перапісу 1921 г., фальварак Ёдскай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 4 дамы, 50 жыхароў. На 1.1.2003 г. 22 двары, 66 жыхароў.

ПЕСТУНЫ, вёска ў Більдзюжскім сельсавеце. У пачатку XX ст. засценак у Новапагосцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 18 жыхароў, 80 дзесяцін зямлі. У 1921 г. у Новапагосцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 10 дамоў, 73 жыхары. На 1.1.2003 г. 3 двары, 4 жыхары.

ПЕТКУНОЎШЧЫНА, хутар у Більдзюжскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1 двор, 2 жыхары.

ПЕТРУНОВА, хутар у Радзюкоўскім сельсавеце. У 1921 г. фальварак Верхнянскай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 2 дамы, 15 жыхароў. На 1.1.2003 г. ніхто не жыве, з уліку не зняты.

ПІЛАТЫ, вёска ў Ручайскім сельсавеце. У пачатку XX ст. у Новапагосцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 129 жыхароў, 178 дзесяцін зямлі. На 1.1.2003 г. 5 двароў, 8 жыхароў.

ПІШЧАЛЁЎКА, хутар у Германавіцкім сельсавеце. У пачатку 1920-х гадоў фальварак Германавіцкай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства. У 1921 г. 1 дом, 6 жыхароў. На 1.1.2003 г. ніхто не жыў, з уліку не зняты.

ПОГАРЫ, вёска ў Германавіцкім сельсавеце. У пачатку XX ст. вядома як засценак Багінскага Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 10 жыхароў, 50 дзесяцін зямлі. На 1.1.2003 г. 11 двароў, 16 жыхароў.

ПРАМЯНЫ, вёска ў Германавіцкім сельсавеце. Паводле перапісу 1921 г., калонія Германавіцкай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 21 дом, 133 жыхары. На 1.1.2003 г. 39 двароў, 103 жыхары.

ПРАЎДЗІНСКАЕ, вёска ў Ручайскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 14 двароў, 20 жыхароў.

ПУКІ, хутар у Валожынскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. ніхто не жыў. З уліку не зняты.

ПУНІШЧА, вёска ў Ёдскім сельсавеце. У пачатку XX ст. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 60 жыхароў, 77 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 11 дамоў, 71 жыхар. На 1.1.2003 г. ніхто не жыў. З уліку не знята.

ПУТРАНІЦА, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце. У XIX — пачатку XX ст. у Лужкоўскай воласці Дзісенскага павета. У 1905 г. 224 жыхары, 162 дзесяціны зямлі. У 1921 г. у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 38 дамоў, 193 жыхары. На 1.1.2003 г. 20 двароў, 30 жыхароў.

ПЯЛІКІ, вёска ў Валожынскім сельсавеце. Размешчана на левым беразе р. Дзісна, за 6 км на паўднёвы захад ад раённага цэнтра, на аўтамабільнай дарозе Шаркаўшчына—Казяны. У 2-й палове XIX — пачатку XX ст. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1864 г. 90 рэвізскіх душ, уласнасць Рамановічаў. У 1887 г. 15 дамоў, 156 жыхароў. У 1889 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У пачатку XX ст. 274 жыхары, 185 дзесяцін зямлі. У 1921 г. у Шаркаўшчынскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 44 дамы, 248 жыхароў. З 12.10.1940 г. да 23.10.1970 г. цэнтр сельсавета. Знаходзяцца майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, ветэрынарны пункт, магазін, аддзяленне сувязі, пачатковая школа, клуб, масавая бібліятэка. На 1.1.2003 г. 92 двары, 242 жыхары.

ПЯТРОВІЧЫ, вёска ў Валожынскім сельсавеце, на р. Дзісна. У пачатку XX ст. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 157 жыхароў, 224 дзесяціны зямлі. На 1.1.2003 г. 39 двароў, 94 жыхары.

РАДЗЮКІ, вёска, цэнтр сельсавета і сельгаспрадпрыемства. Размешчана за 5 км на паўднёвы ўсход ад раённага цэнтра, на аўтамабільнай дарозе Шаркаўшчына—Глыбокае, на р. Бярозаўка. У 1866 г. існавалі сумежна 2 фальваркі пад назвай Радзюкі, 15 і 25 жыхароў. Уваходзілі ў Ігуменаўскую воласць Дзісенскага павета Віленскай губерні. У пачатку XX ст. маёнткі — Радзюкі 1-я, 2 жыхары, 129 дзе-

сяцін зямлі, і Радзюкі 2-я, 18 жыхароў, 129 дзесяцін зямлі, належалі Бароўскім. З 1921 г. фальваркі — Радзюкі 1-я, 8 дамоў, 50 жыхароў, і Радзюкі 2-я, 5 дамоў, 31 жыхар, у Шаркаўшчынскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства. Механічныя майстэрні, ветэрынарны ўчастак, базавая школа, клуб, масавая бібліятэка, дзіцячыя яслі-сад, аддзяленне сувязі, магазін. На 1.1.2003 г. 244 двары, 563 жыхары.

РАЦЬКІ, вёска ў Ручайскім сельсавеце, на р. Дзісна. У пачатку XX ст. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, каля 40 жыхароў, 57 дзесяцін зямлі. Побач з вёскай быў маёнтак Кавалеўскага, 16 жыхароў, 342 дзесяціны зямлі. У 1921 г. калонія Германавіцкай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 16 дамоў, 76 жыхароў. На 1.1.2003 г. 2 двары, 2 жыхары.

РУБАШКІ, вёска ў Лужкоўскім сельсавеце, на р. Мнюта. У 1905 г. 201 жыхар, 173 дзесяціны зямлі. У 1921 г. у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 39 дамоў, 188 жыхароў. На 1.1.2003 г. 14 двароў, 24 жыхары.

РУЖАМПОЛЬ, хутар у Радзюкоўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 3 двары, 7 жыхароў.

РУЧАЙ, вёска, цэнтр сельсавета і сельгаскааператыва «Ручай». Знаходзіцца за 7 км на паўночны ўсход ад раённага цэнтра, на аўтамабільнай дарозе Шаркаўшчына — Дзісна. У 1888 г. 14 дамоў, 119 жыхароў. Паблізу размяшчаўся засценак Ручай, 1 дом, 9 жыхароў. У 1905 г. 198 жыхароў, 139 дзесяцін зямлі. У 1921 г. у Шаркаўшчынскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 32 дамы, 165 жыхароў. Клуб, механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, фельчарска-акушэрскі пункт, масавая бібліятэка, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, ашчадная каса, магазін. З Ручаём аб'яднана суседняя вёска Падсосна (1957). На 1.1.2003 г. 38 двароў, 80 жыхароў.

РЫМАРАЎШЧЫНА, вёска ў Більдзюжскім сельсавеце. У пачатку XX ст. у Новапагосцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 44 жыхары, 49 дзесяцін зямлі. У 1921 г. 8 дамоў, 49 жыхароў. На 1.1.2003 г. 10 двароў, 20 жыхароў.

РЫНПОЛЛЕ, хутар у Германавіцкім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1 двор, 2 жыхары.

РЭЧКІ, вёска ў Ручайскім сельсавеце. Знаходзіцца за 12 км ад чыгуначнай станцыі Шаркаўшчына. У 2-й палове XIX ст. засценак Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. У 1889 г. 1 дом, 7 жыхароў, дзейнічала капліца. У пачатку XX ст. засценак належаў Шуману і Абаровічам, 13 жыхароў, 140 дзесяцін зямлі. Паводле перапісу 1921 г., вёска, 11 дамоў, 70 жыхароў, і фальварак, 1 дом, 8 жыхароў, у Германавіцкай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства. У Рэчкі сселена вёска Залаты Барок (1939). На 1.1.2003 г. 10 двароў, 19 жыхароў.

САВАРЫНА, вёска ў Ручайскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 2 двары, 5 жыхароў.

САВІЦКІЯ, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце, на р. Бярозаўка. У пачатку XX ст. у Ігуменаўскай воласці Дзісенскага павета, 163 жыхары, 214 дзесяцін зямлі. У 1921 г. у Лужкоўскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 10 дамоў, 50 жыхароў. На 1.1.2003 г. 13 двароў, 25 жыхароў.

САВУТКІ, вёска ў Радзюкоўскім сельсавеце, на р. Бярозаўка. У пачатку XX ст. у Луцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 170 жыхароў, 186 дзесяцін зямлі. На 1.1.2003 г. 98 двароў, 198 жыхароў.

САСНОЎЦЫ, вёска ў Валожынскім сельсавеце, цэнтр сельгаскааператыва «Сасноўцы». Размешчана на р. Белая, за 9 км на паўночны захад ад раённага цэнтра, на аўтамабільнай дарозе Шаркаўшчына — Браслаў. У дакументах 2-й паловы XIX ст. сустракаецца як вёска Сасноўка ці Сасноўцы Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні. Паводле гаспадарчага перапісу 1865 г., 31 рэвізская душа, у 1890 г. 7 дамоў, 48 жыхароў. У 1896 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У пачатку XX ст. каля 250 жыхароў, 246 дзесяцін зямлі. У 1921 г. 40 дамоў, 227 жыхароў. У вёсцы цэнтральная сядзіба сельгаскааператыва, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, ветэрынарны ўчастак, пачатковая школа, клуб, масавая бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін; помнік — абеліск (1969) на ўшанаванне памяці 32 землякоў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікую Айчынную вайну. На 1.1.2003 г. 93 двары, 235 жыхароў.

СВІЛЫ, вёска ў Ёдскім сельсавеце, на р. Янка. У сярэдзіне XIX ст. у Ёдскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні,

уласнасць Лапацінскіх. У 1865 г. 45 рэвізскіх душ, у 1890 г. 100 жыхароў. У пачатку XX ст. існавалі 2 вёскі з назвай Свілы, 180 жыхароў, 140 дзесяцін зямлі. У 1921 г. у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 2 дамы, 15 жыхароў. Побач знаходзілася калонія Свілы, 21 дом, 116 жыхароў. На 1.1.2003 г. 7 двароў, 8 жыхароў.

СІПАЛІНА, хутар у Лужкоўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 2 двары, 3 жыхары.

СМЕЙНА, хутар у Германавіцкім сельсавеце. У пачатку XX ст. вядомы як фальварак Стэфанпольскай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні, 10 жыхароў, 126 дзесяцін зямлі, уласнасць Чаплінскіх. На 1.1.2003 г. ніхто не жыве, з уліку не зняты.

СНЕГІ, вёска ў Ёдскім сельсавеце. У 1905 г. 269 жыхароў, 233 дзесяціны зямлі. У 1921 г. у Ёдскай гміне Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 50 дамоў, 261 жыхар. На 1.1.2003 г. 24 двары, 60 жыхароў.

СОМЧЫНА, хутар у Лужкоўскім сельсавеце. На 1.1.2003 г. 1 двор, 1 жыхар.

СТАЛІЦА, вёска ў Германавіцкім сельсавеце, цэнтр сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Княж», на правым беразе р. Дзісна, за 26 км на паўночны ўсход ад раённага цэнтра Шаркаўшчына. У 1890 г. 19 дамоў, 258 жыхароў. У 1898 г. адкрыта школа царкоўнай граматы. У 1905 г. 423 жыхары, 362 дзесяціны зямлі. У верасні 1921 г. калонія Германавіцкай гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства, 80 дамоў, 462 жыхары. У вёсцы цэнтральная сядзіба сельгаскааператыва, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, ветэрынарны пункт, базавая школа, магазін, клуб, масавая бібліятэка, аддзяленне сувязі. На 1.1.2003 г. 121 двор, 322 жыхары.

